Віктар Супрунчук

# З ПЛОЦІ І КРЫВІ

Віктар Супрунчук

# З ПЛОЦІ І КРЫВІ

АПОВЕСЦЬ
РАМАН
АПАВЯДАННІ

Мінск
«Мастацкая
літаратура»

ББК 84Бел7
С89

Супрунчук В.

С 89 З плоці і крыві: Аповесць, раман, апавяданні.— Мн.: Маст. літ., 1991.— 336 с.

ISBN 5-340-00691-3.

Супрунчук В. Из плоти и крови: Повесть, роман, рассказы.

Галоўны герой аповесці В. Супрунчука «Банальны дэтэктыў» — начальнік раённага крымінальнага вышуку, капітан Ярусь. Ён расследуе, здавалася, «звычайнае», але небяспечнае злачынства, сумленна выконвае свой абавязак. Раман таксама напісаны ў вострасюжэтным жанры. У ім даследуюцца складаныя сацыяльныя, этычныя і маральныя праблемы, многія негатыўныя з'явы ў нашым грамадстве.

Апавяданні прысвечаны вострым, канфліктным сітуацыям, якія ўзніклі ў грамадстве на этапе перабудовы.

С $\frac{4702120201-125}{M302(03)-91}$ 25—91 ББК 84Бел7

Главный герой повести В. Супрунчука «Банальный детектив» — начальник районного уголовного розыска капитан Ярусь. Он расследует, казалось, «обычное», но опасное преступление, честно выполняет свой долг. Роман также написан в остросюжетном жанре. В нем исследуются сложные социальные, этические и моральные проблемы и многие негативные явления в нашем обществе.

Рассказы посвящены острым конфликтным ситуациям, которые возникли в жизни в связи с перестройкой.

ISBN 5-340-00691-3

© В. П. Супрунчук, 1991
© Афармленне. А. М. Грышкевіч, 1991

# Аповесць

## БАНАЛЬНЫ ДЭТЭКТЫЎ

### 1

Уранку, падняўшыся з ложка, Іван Шантыка не ўбачыў за акном сваіх сініх «Жыгулёў». У першае імгненне ён як здранцвеў, не мог паварушыць ні нагой, ні рукой: вочы, застылыя і перапалоханыя, глядзелі ў адну кропку, на тое месца, дзе павінна была стаяць машына. Ён быў настолькі ўражаны, што ў яго як усё роўна перахапіла дух, і не мог вымавіць нават слоўца, каб нешта сказаць жонцы, якая мармычучы сабе пад нос нейкую песню збірала на кухні сняданак. Іван заплюшчыў вочы, пастаяў так мо хвіліну, спадзеючыся убачыць машыну, але яе не было. Да яго спярша вярнулася здольнасць думаць: колькі ж поту праліў ён, колькі рэчаў не змог прыдбаць, адмаўляючы і сабе, і жонцы, і сыну — усё дзеля таго, каб мець гэтага сінягa ідала. І колькі праездзіў на ім — смеху варта: мо тыдзень які. Божа, што ж гэта робіцца на свеце, навошта гэтакі здзек з чалавека — проста ўдарыла ўрэшце думка, як нажом прасекла галаву і выклікала боль. Іван залямантаваў па-бабску, дзіка, дадаючы да слоў гневу мацюкі.

З кухні выскачыла пераляканая жонка Марыля, бо яшчэ ніколі такой лаянкі не чула ад мужа. А ён крычаў, галасіў, як па нябож-

чыку, і здавалася, зараз пачне ламаць, біць усё, што трапіць пад руку.

— Што з табой? — ледзь прамовіла Марыля, з цяжкасцю спыніўшы паток мужавых слоў.

— Што, што?! Глянь! — ён пальцам торкнуў у шыбу. І Марыля, пакуль не разумеючы ягонага гневу, падышла да акна.

Убачыўшы, што няма машыны, яна спалатнела і страціла прытомнасць.

Іван падняў жонку з падлогі, льючы на твар халодную ваду. Марыля вохкаць і крычаць не стала, умомант сабрала сябе і мужа, бо ён нават забыў пра куртку, а на дварэ хоць і стаяла лета, але каторы дзень ліў дождж,— і яны бегма, наколькі хапіла сіл, шыбанулі да бліжэйшага тэлефона-аўтамата. Пазванілі па 02 у міліцыю. Іх папрасілі тэрмінова пад'ехаць у райаддзел і зайсці да капітана Яруся.

А капітан Ярусь якраз пачаў займацца справай аб крадзяжы трох матацыклаў, заявы ад гаспадароў якіх паступілі недзе на працягу тыдня. І вось званок, што нехта пакваліўся і на «Жыгулі». Дагэтуль у іхнім раёне такіх крадзяжоў не было. Ярусь у газетах чытаў аб угонах матацыклаў і машын у буйных гарадах і ў душы спадзяваўся дый не раз гаварыў сваім калегам, што хоць такія справы іхні райцэнтр і раён абмінулі. Як кажуць, бог памілаваў. Але ж, бач, не, і да іх дапаўзла зараза.

Паўгадзіны назад Ярусь, якога сябры называлі Алесь, а афіцыйна — Алесь Пятровіч, завёў сына ў дзіцячы сад. Нешта малы кашляў, і ён думаў, што па-добраму трэба было б увечары звадзіць яго да ўрача, хай паслухае, бо ўсю ноч бухаў як у трубу. Жонка не магла з ім пайсці: у другую змену падмяняла сяброўку. Значыць, зноў трэба прасіць суседку забраць малога, а ўрача ўжо наведаюць заўтра.

Да матацыклаў, лічыў Ярусь, прыклалі рукі падлеткі гадоў пятнаццаці-семнаццаці. Яны цяпер матарызаванымі армадамі лётаюць па горадзе, бясконца важдаюцца з гэтымі матацыкламі, мяняюць іх, прадаюць, ну і, пэўна, адзін у аднаго і пазычаюць, як яны кажуць, а не крадуць. Праз колькі дзён матацыклы павінны былі з'явіцца на дарозе, і іх адразу заўважаць, тым больш што інспектары ДАІ ведаюць нумары, хоць можна, канечне, памяняць.

Алесь пазваніў уніз дзяжурнаму, каб прапусціў жонку і мужа Шантыкоў, а пакуль яны прыйдуць, вырашыў успомніць, хто з мясцовых здольны на такі ўчынак, але зноў думкі вярталіся да дзятвы, якая гойсала на матацыклах. Безумоўна, яна магла і цяпер спакусіцца на сінія «Жыгулі» Шантыкоў, якія ўсю ноч без нагляду стаялі ў двары. Але ж у тым двары былі яшчэ машыны, а ўзялі менавіта Шантыкоў. Мо проста выпадковасць, а мо і спецыяльна. Усе акалічнасці і варыянты пакуль трэба ўлічваць.

У дзверы пастукалі, і ў кабінет увайшлі паўнаваты з шырокай пляшынай мужчына гадоў сорак, бледны твар якога быў у кроплях поту, і жанчына недзе гэткага ж узросту, сімпатычная, з падфарбаванымі вейкамі і вуснамі, хоць шчокі таксама без адной крывінкі. Карацей, выгляд быў у гэтых людзей такі ж, як і ў многіх абкрадзеных, абрабаваных, з якімі даводзілася ўжо не раз сустракацца Ярусю. Ім ён спачуваў і заўсёды рабіў усё, што было ў яго сілах і здольнасцях. Але часам, на жаль, нічым не мог дапамагчы: канцы не сыходзіліся з канцамі, а маніпуляваць фактамі, як рабіў той-сёй з яго калег, ён не хацеў. У яго была думка, што гэткай працай робіцца двайная шкода: ашукваецца дзяржава, якую яны павінны ахоўваць, і людзі, чыя вера ў справядлівасць і аўтарытэт міліцыі выкасоўваецца, а можа, і знішчаецца. Ён прыйшоў у крымінальны вышук не дзеля якіхсьці выгод, вялікіх грошай, бо ведаў, што нічога гэтага не будзе. Проста, адслужыўшы ў пагранічных войсках, Ярусь унушыў сабе, што працаваць міліцыянерам — гэта якраз справа для мужчын. Пад якім і чыім уплывам прыйшла да яго гэная думка — невядома, але яна не пакідала яго, здаецца, ніколі. Ён помніў, як у дзяцінстве ў іхняй вёсцы не любілі ўчастковага Калеснікава, які заўсёды быў на падпітку і хадзіў са страхагентам Канавалавым па хатах і жлукціў самагонку. Гэта быў, на сённяшні Алесеў розум, маральны ўродзіна, якога б не варта і ўспамінаць, калі б часам не ўзнікалі і сярод новага пакалення міліцыянераў ягоныя браты па духу.

Слухаў Шантыкоў, і яму чамусьці вельмі хацелася, каб тыя, хто ўкраў матацыклы і «Жыгулі», былі адны людзі. Мо было б прасцей іх знайсці і хутчэй. Гэтыя бедалагі Шантыкі атрымалі б сваю машыну, калі яна яшчэ цэлая. Дзе-небудзь ляжыць у лесе абадраная.

Пры дэфіцыце запчастак украсці машыну маглі і дзялкі, якія яе разбяруць на часткі і прададуць асобна розным аўтаўладальнікам, што з радасцю купяць іх. А паспрабуй абследуй тысячы «Жыгулёў», якія з'яўляліся на дарогах, нібы грыбы ў лесе пасля дажджу. Яшчэ гады два назад столькі машын нават у райцэнтры не было. Цяпер, як казаў Алесеў бацька, кожны жук і жаба з апошняга пхнецца, а набудзе «жыгуля», хоць трэба ён яму ці не, пра гэта не думае. Вось калі злодзей украдзе, тады пачынаецца трагедыя. Пэўна, і гэтыя двое збіралі капейку да капейчыны, па іх відаць: на мужчыне штаны ледзь не свіцяцца і на жанчыне плашч, якому гадоў дзесяць, не менш. Скуль будуць вялікія грошы: ён — інжынер-тэхнолаг на рамонтным заводзе і яна — эканаміст у будаўнічым упраўленні. Якая зарплата — вядома, хіба мо бацькі, калі жывыя, з вёскі трохі дапамогуць, прадаўшы бычка ці парсюка. Хоць, можа, ужо і бацькоў не быць: абаім амаль па сорак.

Магчыма, канечне, што адзін і той жа чалавек падабраў і матыцыклы, і машыну, але ж у сапраўднасці — будзе відаць.

## 2

Дождж сціхаў, і, здаецца, нават пачалося ачышчацца неба ад хмар. Адразу пасвятлела ў пакоі, мо і спраўдзяцца прагнозы сіноптыкаў, якія кожны тыдзень абяцалі пацяпленне. Нядрэнна было б, каб урэшце так і здарылася. Мінае ўжо лета, а сонца на дварэ мала — усё сырасць, хоць і ў адпачынак не ідзі: праз тыдзень Ярусь збіраўся падаць рапарт на адпачынак. Але цяпер незалежна ад надвор'я, пакуль не скончыць справу з крадзяжом матацыклаў і машыны, наўрад ці пусцяць яго. Паехаць бы ўсёй сям'ёй на азёры на паўмесяца з палаткай і павудзіць рыбу, а вечарамі варыць юшку і слухаць, як дыхае, спявае лес. Мары, мары, уздыхнуў Ярусь.

Ён аформіў першыя паперкі справы № 625 і вырашыў, што трэба зайсці да начальніка райаддзела і даложыць свае меркаванні. Той якраз пра гэта яго прасіў. Хоць мала яшчэ фактаў, але ж нейкі план росшуку ў галаве ўжо нараджаецца. Падпалкоўнік Пазняк, які паўгода назад заняў пасаду начальніка райаддзела,

некалі кіраваў крымінальным вышукам у раёне, і, як помніў Ярусь, яго тады часта хвалілі на абласных нарадах, нават аднойчы ён ездзіў у Мінск на семінар абменьвацца вопытам. Алесю яшчэ не было чым абменьвацца: кожная справа давалася цяжка. Ці то злачынцы рабіліся больш разумныя, ці то ў яго кепска варыла галава. Адно з двух — іншага не магло быць. Гэтая думка ў яго ўзнікла мо паўгода назад, калі ён займаўся Ігнатам Казлом. Той абакраў уночы чатыры магазіны ў раёне, жыў праз некалькі дамоў ад Яруся, штораніцы з ім ласкава вітаўся, яны нават ціснулі адзін аднаму рукі як старыя знаёмыя. Некалі былі і ў адной кампаніі на дні нараджэння ў Кастуся Мігунца, Ярусевага земляка і аднакласніка, які з Казлом, а па пашпарце Іваноўскім, разам працавалі на аўтабазе.

Так, што сказаць начальніку райаддзела: матацыклы, пэўна, ўкралі падлеткі. Машыну — таксама, відаць, яны. Калі ж к абеду недзе на дарогах раёна ці ў лесе не будзе заўважана, можна лічыць, што да гэтага прыклалі рукі тыя, хто гандлюе запчасткамі. Ведаючы падпалкоўніка Пазняка, можна адразу здагадацца: ён спытае, якая асноўная версія, які галоўны варыянт росшуку ўсёй гэтай тэхнікі. Да абеду, пакуль не будзе звестак ад інспектара ДАІ, галоўнага варыянта ў яго не з'явіцца. Дый пасля, што раптам стане асноўным, а што дадатковым...

Ён завязаў папку з паперамі для даклада начальніку райаддзела, узняўся з-за стала. Тэлефонны званок спыніў Алеся ўжо ў калідоры, калі ён зачыняў за сабой дзверы. Падумаў: вяртацца ці не. Урэшце, калі каму патрэбны, знойдуць і ў начальніка. Але тэлефон роў, і Ярусь вярнуўся ў кабінет. З трубкі вылецеў, ажно захліпваючыся, голас дзяжурнага старшага лейтэнанта Бахаўца:

— Ярусь, з групай на выезд у вёску Бярозаўка. Абкрадзены магазін. Вартаўнік мёртвы.

Алесь зірнуў на гадзіннік: была ўжо палова дзесятай. Папку з дакладам кінуў у шуфляду стала, замкнуў яе. З сейфа дастаў пісталет, нават не думаючы, ці спатрэбіцца, але прывык, каб на аперацыі зброя была пры ім. Дый ці мала што можна чакаць наперадзе, якія ўзнікнуць нечаканасці.

Калі Ярусь спусціўся з трэцяга паверха ўніз, у машыне ўжо былі эксперт-крыміналіст Гурскі, следчы

Батура і сяржант Гусік з сабакам Маратам. Хацеў з імі паехаць і лейтэнант Куско, інспектар крымінальнага вышуку, падначалены Яруся, але Алесь загадаў яму пакуль быць у аддзеле. Той цяпер займаўся справай Фядоры Аляхневіч, якую тры дні назад абрабавалі проста ў хаце. Забралі дзвесце рублёў грашыма, залаты пярсцёнак і завушніцы. Цётка помніла толькі, што ў абодвух рабаўнікоў былі чорныя твары і яны не гаварылі, а шыпелі, як гадзюкі. Лейтэнант Куско два дні шукаў гэтых чарнатварых, але пакуль не знайшоў. І справа ўскладнілася яшчэ тым, што пяцідзесяцігадовая цётка раптам дадала да сваіх паказанняў тое, што яе не толькі абрабавалі, але і згвалцілі. Чаму адразу пра гэта не сказала? Маўляў, саромелася, але цяпер набралася мужнасці і прызналася ў гэтым. Ад суседзяў Куско даведаўся, што Фядора Аляхневіч цішком гнала і прадавала самагонку, хоць нейкіх слядоў гэтага лейтэнант не выявіў пакуль. Здавалася, справа вельмі простая і ясная, калі яна звязана з самагонкай. Няйнакш папрацавалі самі ж Фядорыны кліенты. І тады яна не можа іх не ведаць. Хіба што чорныя панчохі на тварах...

— Займайся Фядорай,— крыкнуў ужо з машыны Алесь лейтэнанту.

Да Бярозаўкі было кіламетраў трыццаць — дарога, разбітая грузавікамі ўшчэнт: адны калдобіны. Амаль ля вёскі быў кар'ер, адтуль вазілі пясок на цагельню. Ездзілі па дарозе ўсе, а вось падрамантаваць не знаходзілася гаспадара, не кажучы ўжо пра асфальт. Хоць, урэшце, мог бы гэта зрабіць і тутэйшы калгас, грошай у якога было больш, чым у іншых гаспадарках, не хацеў сам, дык няхай ужо разам з цагельняй. Колькі Алесь працаваў у райаддзеле, усе гады клялі дарогу ў Бярозаўку. І ён сам не раз пра яе казаў старшыні калгаса, але той лічыў, што кепская дарога перашкаджае маладым уцякаць у горад. Жартаваў ён ці казаў сур'ёзна — зразумець было цяжка.

— І так мала бензіну, ліміты, а яшчэ на гэткіх дарогах палім,— бурчэў вадзіцель.— Праз тыдзень, Алесь Пятровіч, не будзе ўжо на чым ездзіць. Пойдзем, як жабракі, да старшынь калгасаў прасіць бензін. Ужо ж прасілі.

— Пойдзем, а як жа, у цябе ж калодзежа няма,— сказаў следчы Батура.— Дакладней, пойдзеце... Я праз

тыдзень буду грэць жывот у Гаграх. Жонцы на рабоце сямейную пуцёўку вызначылі.

— Віншую! — прамовіў судмедэксперт Гурскі.— Не забудзьце там і нас. Мо і ў Беларусі надвор'е стане лагодным.

Ярусь, слухаючы гэтую спакойную гаворку, думаў, што апошнія тыдні надта напружаныя ў яго, не паспявае высветліць адну справу, як ужо другая, трэцяя... Проста нейкі паток злачынстваў. І гэта не толькі ў яго, а ўвесь аддзел зараз амаль зранку да ночы на нагах.

Гэтай ноччу тут, відаць, быў моцны дождж, і дарогу ажно заліло вадой. Добра, што ў машыны вядучы пярэдні мост, інакш яны наўрад ці даехалі б у Бярозаўку.

## 3

Ля магазіна, які знаходзіўся побач з канторай калгаса, іх ужо чакалі. Сярод купкі людзей, якія шумна абмяркоўвалі здарэнне, Алесь адразу вызначыў старшыню сельсавета Падгайскага, былога настаўніка гісторыі, якога выбралі кіраўніком толькі летась. Гэта быў высокі, паўнатвары мужчына з шырокімі рудаватымі вусамі. Убачыўшы міліцыянераў, ён першы ступіў насустрач Ярусю. Відаць было, што трохі разгублены, але спрабуе трымацца ўпэўнена, захоўвае аўтарытэт.

— Вось прадаўшчыца, Ніна Іванаўна, прозвішча Акулік,— сказаў ён і паклікаў заплаканую сярэдніх гадоў жанчыну ў белым халаце, якая ажно ламала пальцы, і здавалася, вось-вось залямантуе.

— Дзе вартаўнік? — спытаўся Ярусь.

— У магазіне з участковым,— адказаў старшыня сельсавета.

— Дык ён жывы?

— Нібыта ачуняў...

Вартаўнік, дзядок гадоў пад семдзесят, з перавязанай галавой, паўсядзеў-паўляжаў на двух крэслах ля ўвахода ў магазін. Па зале былі раскіданы тавары, ля прылаўка ляжала разбітая бутэлька з-пад каньяку. Трохзорачнага, грузінскага.

— Калі вы ўбачылі, што магазін абрабаваны? — спытаў Ярусь у прадаўшчыцы.

— А недзе а палове дзевятай ішла ад маткі, я ёй

насіла малако. Яна каровы не мае, вось я штораніцы і нашу. Іду, мне праз паўгадзіны магазін адчыняць, думаю, што гэта не відаць вартаўніка. Ён у нас звычайна да дзевяці ля магазіна. Не бачу яго, падходжу бліжэй і бачу...— заплакала прадаўшчыца,— і бачу: замка няма на дзвярах, а за дзвярыма дзед Міхась ляжыць, стогне.

— А чаму сігналізацыя ў вас не працуе?

— Ведаеце, некалі сапсавалася, усё збіраліся адрамантаваць, збіраліся, ажно пакуль унь...— зноў заплакала.

— Плачам ужо не дапаможаш,— сказаў следчы Батура.— Паглядзіце, што ўзялі... Пасля зробім рэвізію. Якіх тавараў не хапае?

— Я зараз, зараз...— заспяшалася прадаўшчыца, выцерла ражком хусткі вочы і пачала аглядаць магазін. Тым часам сабака нарэшце ўзяў след, бо каля магазіна ўжо досыць натапталі, і людзі не разыходзіліся, хоць участковы і старшыня сельсавета прасілі іх. След вывеў да дарогі і абарваўся. Колькі сабака ні скуголіў, скакаў, нюхаў, але далей ваколіцы Бярозаўкі не зрушыўся.

— Відаць, Алесь Пятровіч, што злодзей адбыў адсюль на матацыкле. Бач, след пратэктара,— паклікаў Алеся судмедэксперт Гурскі.— Зараз мы зробім адбіткі, а тое-сёе ў нас будзе.

Абышлі з прадаўшчыцай залу магазіна, склад. Яна ўсё пацiскала плячыма, твар, здаецца, пасвятлеў, і ў вачах не надта засталося сумоты. Проста павесялела жанчына.

— Узялі скрынку грузінскага каньяку... А таксама новы рухавік да матацыкла «Іж-юпітэр». І пару колаў. Ну і пяцьсот рублёў з касы,— яна ўсхліпнула.— Вырашыла сёння, калі збярэцца болей выручкі, аднесці на пошту. Гэта ж я перад закрыццём угандлявала ажно пяцьсот рублёў. Кіндзель Васіль з сынам тэлевізар купілі, і Пабяжынскі Іван узяў халадзільнік. Яшчэ той-сёй — па дробязі, і за гадзіну назбіралася паўтысячы. Якая я дурная...

— Пагаворым з вартаўніком, ён ужо, здаецца, ачуняў?! — павярнуўся Алесь да следчага.— Мо помніць што? Хоць і стукнулі яго па галаве моцна...

— А мне што рабіць, таварыш начальнік? — запыталася прадаўшчыца.

— Будзьце на месцы. Зараз пад'едуць вашы начальнікі: старшыні райпа і сельпа.

«Зноў матацыклы... Няўжо сляды адной банды? — думаў Ярусь.— Урэшце, адной ці не, але гэту справу мне весці цяпер».

Убачыўшы, што накіроўваюцца да яго, вартаўнік амаль роўна сеў на крэсле. Наўрад ці будзе дзядок працаваць ужо вартаўніком пасля такога здарэння, падумалася і Ярусю, і Батуру. Рукі ў старога дрыжалі дый, здаецца, і губы. Няшчасны чалавек. Як ні кажы, але мала прыемнага перажыць такое на старасці гадоў. А мо ён спаў, калі падышоў да магазіна злодзей? Мо праспаў, а цяпер дрыжыць, баіцца адказнасці? Ат, што за глупства лезе ў галаву. Калі б не спаў, што маладому чалавеку хворы стары. Пальцам кране і паваліць, як гнілую сухастоіну.

— Вы не ўспомніце, як усё гэта здарылася? — як мага далікатней спытаў Алесь вартаўніка.— Нам важна ведаць, які ў яго выгляд. Калі гаварыў, які голас? Што запомнілі, усё раскажыце, калі ласка.

— Што я запомніў...— марудна, кволым галаском сказаў дзядок.— Вялізны, здаровы, падышоў да мяне, спытаў запалку. Кажу, што не куру. І наогул знаходжуся на пасту і набліжацца да мяне нельга. Ён засмяяўся і кажа: дык кінь запалак. Я нічога не кінуў. Тады ён пытае: дзе дарога на райцэнтр? Я ўжо ўзлаваўся, што ён з мяне дурня робіць. А ён раптам як падскочыць і нечым цяжкім як ляпне па галаве! Я і асеў нібы мех. Больш нічога, таварыш начальнік, не запомніў, начыста вылецела з галавы пасля такога ўдару...

— Дык ён да вас не пад'ехаў, а падышоў?

— Падышоў, падышоў! Але трохі раней чуў я, як зароў недзе недалёка рухавік. Падумаў толькі, хто гэта давідна некуды сабраўся. А тут, бач, гэты бандыт з-за унь тых кустоў выходзіць, і дай яму запалак. Не ведаў, а то даў бы яму ражна ў зубы!

— Не запомнілі, які ў яго твар, мо ёсць вусы ці валасы даўгія, як цяпер у маладых па модзе? — спытаўся следчы Батура.

— Не... Знаеце што, цемнавата было, нядужа што і відаць. Дый дождж якраз пачаўся. Пэўна, дашчэнту сляды паганца змыў, га?

— Нічога, знойдзем,— усміхнуўся Алесь.— А вусоў у яго не было?

— Здаецца, не было. Хаця, чакайце, мо і былі. Точна, былі! Калі я яму даў запалкі, ён прыкурваў, і бачу: вусы. Вялікія вусы.

— Дык вы ж казалі, дзеду, што запалак яму не давалі,— уставіў зноў сваё слова следчы.— Дык давалі ці не? Успомніце, калі ласка?

— Ай, ай, што вы блытаеце мяне,— замахаў рукамі вартаўнік.— Я спакутаваны, паранены на пасту, з мяне шчэ здзекуецеся.

4

Абшукалі, здаецца, усё ў магазіне і вакол яго, але нічога адметнага, значнага не знайшлі, калі не лічыць парваную, зашмальцаваную пальчатку, якую судмедэксперт Гурскі падняў ля парога ўжо за дзвярыма. Прадаўшчыца не прызнала гэтай пальчаткі, маўляў, такіх у магазіне не было. Хоць мала, урэшце, люду ходзіць сюды, нехта мог прынесці з сабой і забыць альбо кінуць. Тут, ля парога магазіна? Следчы круціў пальчатку, ледзь не нюхаў, пасля вывернуў яе. Усе, хто быў зараз ля яго, прачыталі выразны надпіс, які застаўся ад штэмпеля: АРЗ № 5.

— Што значыць — аддзел рабочага забеспячэння № 5,— сказаў Батура.— Вы адтуль тавараў не атрымлівалі?

— Не, ні разу,— міргала, міргала вачыма, усё ніяк не магла супакоіцца прадаўшчыца.— У нас свая база, райпоўская. Мо гадоў пятнаццаць назад нешта і было. Але цяпер — не, ні разу. Прынамсі, за той час, што я тут раблю. А гэта ўжо дзевяць гадоў.

— Гэтая рукавіца яшчэ даволі новая,— заўважыў судмедэксперт.— Ведаючы якасць рабочай вопраткі і, у прыватнасці, пальчатак, калі яны пасля тыдня працы ператвараюцца ў анучу, мяркую: гэтай пальчаткай карысталіся найбольш дні тры-чатыры. Канечне, не выключаю і тое, што маглі атрымаць і месяц назад, але пачалі карыстацца ёю не раней. Урэшце, можам зрабіць экспертызу і высветлім, калі рукавіцу пашылі і нават дзе.

— Дык і зрабі, міленькі, і як найхутчэй,— ляпнуў Гурскага па плячы Батура.— А мы, думаю, Алесь Пятровіч, прыкінем з табой план дзеянняў, каб хутчэй завяршыць справу.

Так, канечне, але план планам, і без яго няможна, мільгнула ў галаве Яруся. Ён усё яшчэ не мог адысціся ад магазіна, хадзіў вакол яго, цешыў сябе, а раптам нешта знойдзе такое, што адразу зрушыць з месца ўвесь ход расследавання. Участковы аб нечым перамаўляўся з жанчынамі, і позірк Яруся нібыта спаткнуўся на ім і зачапіўся, як пацягнуў да яго.

— Лейтэнант, хадзі сюды! — гукнуў Алесь участковага, трохі разгубленага здарэннем, які, пэўна, прывык тут да спакойнага жыцця. Хоць наўрад і ў яго спакой, зараз усюды нешта адбываецца такое, што патрабуецца дапамога міліцыі. Па знешнім выглядзе ўчастковага, поўнага, ружовашчокага і нетаропкага, безумоўна, не скажаш, што ён не спіць уначы. З гэтым у яго, відаць, у парадку, ён сябе не крыўдзіць бяссоннем.

Пачуўшы словы Алеся, ён яшчэ хвіліну пастаяў, нешта адказваючы жанчынам, і толькі тады патупаў, па-мядзведжы, павольна, як шклянку вады на галаве нёс. Пасміхнуўся ў душы з яго Алесь, але злавацца не стаў, што марудзіць, мо такі ў чалавека характар. У рэшце рэшт кажуць: хто памалу едзе, той далёка вязе, а хто хутка едзе, той часта спатыкаецца.

Падышоў, стаў, трымаючы рукі за спіной, на твары пытанне, што скажа начальнік крымінальнага вышуку. А ён хоча казаць тое, што лейтэнант і сам мог здагадацца. Мог, але ж не здагадаўся, не трэба на яго злавацца, вучыць трэба. Амаль усе яны, участковыя, не прафесіяналы. Атрымалі па камсамольскай пуцёўцы пачатковую падрыхтоўку і надзелі мундзір з пагонамі.

— Лейтэнант, спытай у жанчын, мо хто з іх альбо з іхніх знаёмых бачыў увечары ці ўначы чужога чалавека на вуліцы.

## 5

Як і адчуваў Алесь, ніхто з жанчын чужога чалавека не ўспомніў. Маўляў, уначы яны спяць, а не ходзяць па вуліцы. Адна надзея заставалася толькі на пальчатку, якую знайшлі ля парога магазіна.

Пакуль вярнуліся ў райцэнтр, ужо і абед. Хоць і есці не хацелася, які апетыт, калі толькі і думаеш пра гэтыя матацыклы, машыну і магазін. Усё-ткі зайшлі ў сталоўку і перакусілі. Судмедэксперт Гурскі, відаць,

і не абедаў, бо ў кабінеце іх ужо чакалі вынікі экспертызы. Па заключэнні Гурскага дзеда-вартаўніка стукнулі па галаве няйнакш фомкаю, але білі шкадуючы, каб толькі аглушыць. Пальчаткі пашылі недзе прыкладна тры тыдні назад у хоцінскім быткамбінаце. Вялікая партыя пальчатак была завезена на склад аддзела рабочага забеспячэння № 5 леспрамгаса. Якраз зайшоў у кабінет лейтэнант Куско, у яго з Фядорай ужо было амаль усё ясна. Прынамсі, для яго, але ж гвалтаўнікоў яшчэ не знайшоў. Так, не знайшоў, іранізаваў следчы Батура з маладога лейтэнанта, які працаваў у аддзеле першы год пасля сярэдняй школы міліцыі.

— А вось якраз я іх і знайшоў, таварыш следчы,— урачыста абвясціў Куско.— Сама Фядора прызналася. Гэтыя хлопцы ў яе пілі, пілі, к ночы пайшлі, але, мусіць, па дарозе здалося мала, і вярнуліся. Спярша зноў запатрабавалі гарэлкі, а пасля ўжо ясна... Мне, здаецца, тут усё лагічна. Дык яна амаль тыдзень маўчала і толькі цяпер паведаміла, бо гэтыя хлопцы адмовіліся ёй даць грошай. Вось так, таварыш следчы!

— Ну што ж, віншуем з пачаткам росшукавай дзейнасці, лейтэнант Куско,— задаволена пасміхаўся Батура.— Значыць, мне менш засталося работы. Але ж што гэта з людзьмі адбываецца, Алесь Пятровіч? На маёй памяці гадоў дваццаць назад такіх Фядорыных спраў не было. Ідзе буйны росквіт...

Алесь лічыў: яму пашанцавала, што працуе з Батурам. Гэты следчы добра ведаў сваю работу, быў сумленны чалавек. Ен нават не марыў аб тым, што некалі пяройдзе ў вобласць альбо у сталіцу. Яго задавальняла месца і пасада, ён быў родам з гэтага раёна і, здаецца, больш нічога не хацеў, як толькі працаваць тут следчым.

Калі ўпершыню Алесь убачыў Батуру, знешне, па паводзінах, нібыта абыякавага да ўсяго, што не датычыла яго асабіста, не мог паверыць нават, што гэта следчы. Але чым часцей яны сутыкаліся па справе, тым больш Ярусь пераконваўся: Батура — следчы высокай кваліфікацыі і трэба ў яго вучыцца. Нават размове з людзьмі. Што, канечне, вельмі важна. Часам складана разгаварыць чалавека так, каб ён поўнасцю раскрыўся.

— Ну што ж, трэба нам праверыць версію з пальчаткай,— сказаў Алесь. Ен паглядзеў на следчага, той

згодна ківаў галавой.— Вы, Куско, едзьце зараз у аддзел рабочага забеспячэння. Паглядзіце, хто браў на складзе, якія арганізацыі. Хоць колькі людзей нам трэба праверыць, але нічога не зробіш. Іншага пакуль выйсця не бачу. Гэтая пальчатка пакуль для нас важная дэталь. Так, Яўген Іванавіч,— ён усё раіўся з Батурам.

— Так, так, Алесь Пятровіч. Як высветліце адрасы, нам званіце. Будзем адразу распрацоўваць іх. Ці мала што ўдумаюць гэтыя хлопцы заўтра...

— Чакайце, Куско,— затрымаў Ярусь лейтэнанта ўжо на парозе.— Папросім у начальніка машыну, каб трохі было хутчэй.

Але начальніка райаддзела на месцы не было, якраз ішла сесія Савета. І тады Ярусь, вырашыўшы, было не было, пазваніў дзяжурнаму, каб той паслаў з Куско машыну. Маўляў, дамоўленасць з кіраўніцтвам ёсць. За крымінальным вышукам быў замацаваны «Масквіч», але ён вось тры месяцы знаходзіўся на капітальным рамонце. Ярусь ужо збіраўся пад'ехаць на рамонтны завод, а раптам дапамогуць хлопцы з міліцыі. І быў упэўнены, што дапамогуць, бо колькі разоў звярталіся да яго калегі з іншых раёнаў, амаль ніколі не адмаўляў, абы гэта не было парушэннем закона. Надзіва дзяжурны сёння без спрэчак аддаў машыну Куско, хоць, пэўна, ведаў, што ніякай дамоўленасці з начальнікам райаддзела няма. Проста ўсе ўжо бачылі, што зараз найбольш клопату ў крымінальным вышуку. І на ранішняй пяцімінутцы начальнік райаддзела бы між іншым прамовіў, што, магчыма, хутка ім спатрэбіцца дапамога ўсяго калектыву, каб знайсці зладзеяў машыны і матацыклаў. Урэшце, інспектары ДАІ ўжо і займаліся гэтай справай, але звестак ад іх па-ранейшаму не было.

Батура пайшоў да сябе ў кабінет, а Ярусь застаўся адзін. З паўгадзіны яго ніхто асабліва не турбаваў. Пазваніла жонка, пацікавілася, ці зможа ён схадзіць з сынам да ўрача. Размова з ёй скончылася сваркай. Абвінавачванні былі як заўсёды: нічога па доме не дапамагае, сынам амаль не займаецца. Па шчырасці, жонка, вядома, мела рацыю, што ні казала, так яно і было. Але магла ўжо і зразумець: служба ў міліцыі — гэта ні дня ні ночы. У любы час чакай трывогі. Ніхто не прымушаў яго, сам такую службу выбраў. І калі

жаніўся, папярэджваў жонку. Хоць, канечне, яе таксама трэба зразумець. Яна пасварыцца, пасварыцца, але ж і сустрэне дома як найлепш. Усё-ткі размова з жонкай яго трохі разнервавала, зблытала ўсе думкі. Успомніў, што збіраліся з Батурам абмеркаваць план сваіх дзеянняў. Ладна, трэба пачакаць званка ад Куско. А раптам даведаецца нешта такое, што адразу зрушыць расследаванне з мёртвай кропкі. Бо фактычна, яны і застаюцца яшчэ на мёртвай кропцы. Што ў іх ёсць: дзядзька з вусамі ці без вусоў, парваная пальчатка... Матацыклы, якіх не знайшлі, і машына. Гэта ж не іголка, у стозе сена не схаваеш. Хоць бывае і такое. Летась у суседнім раёне ў начальніка ПМК меліярацыі ўкралі «Волгу», і ніякіх слядоў. Зусім выпадкова ў Літве — літоўская міліцыя рабіла вобыск на хутары ў аднаго дзядзькі, шукалі крадзенае золата з ювелірнага магазіна,— у стозе сена знайшлі гэтую машыну. Перафарбаваную, без нумароў. Так што, хто ведае, мо стаяць сінія «Жыгулі» Шантыкоў дзе-небудзь на лузе ў стозе сена, і калі надарыцца тая выпадковасць, якая верне машыну гаспадарам. Застаецца толькі шукаць...

## 6

Куско пазваніў раней, чым чакаў Алесь. Аж захлінаючыся ад радасці, пачаў дакладваць. Толькі Алесь адразу перапыніў і спытаў — яго ніхто не чуе?..

— Не, што вы! Я тут з кабінета начальніка аддзела кадраў. А ён зараз на сходзе. Значыць, так, Алесь Пятровіч, партыю пальчатак у колькасці тысячы штук аддзел рабочага забеспячэння набыў у хоцінскім быткамбінаце. Точна як вызначыў Гурскі. Атрымалі яны пальчаткі месяц назад. Загадчыца склада Марфа Канстанцінаўна Піраговіч сказала, а я праверыў усё па паперах. Пальчаткі выпісалі сабе Лысагорскае лясніцтва, будаўнічы ўчастак, цэх па вырабе мэблі, а таксама па асабістым распараджэнні дырэктара леспрамгаса — геалагічная партыя, якая нешта шукае ў Выганаўскім лесе. Я паказаў нашу пальчатку Піраговіч, і яна прызнала, што гэта, магчыма, з іхняга склада. Але ж маглі прыдбаць у хоцінцаў пальчаткі і іншыя арганізацыі. Я ўзяў для ўзору са склада яшчэ пальчаткі. Няхай Гурскі іх параўнае.

— Малайчына. Едзь сюды, папярэдзь кладаўшчыцу, каб нікому нічога,— загадаў Алесь.

Так, трэба неадкладна паслаць тэлеграму ў Хоцінск, хай там высветляць хлопцы, каму яшчэ збываў цэх пальчаткі гэтай партыі. І менавіта арганізацыям нашай вобласці. Не мог жа невялічкі цэх вырабіць надта шмат пальчатак. Ярусь ведаў аб'ёмы вытворчасці быткамбіната свайго раёна, і, магчыма, яны такія ж, што і ў Хоцінску.

Да вечара не паступіла ніякіх значных звестак і ад ДАІ. Толькі інспектар Гарахавец перадаў у райаддзел, што па яго знаку не спыніўся матацыкліст. Паспрабаваў дагнаць, але ён некуды знік у лесе. Гадзіну ездзіў Гарахавец па дарозе, якая прымыкала да гэтага ўчастка лесу, так нікога і не дачакаўся. Інспектар паспеў заўважыць, што за рулём матацыкла быў хлопец, мабыць, гадоў дваццаці пяці — дваццаці сямі. Апрануты ў чорную ватоўку. На нагах былі ў яго кірзавыя боты.

Ярусь запісаў інфармацыю ў блакнот, але падумаў, што наўрад ці гэта той, каго шукаюць яны. Ад інспектара ДАІ, бывае, уцякаюць і маладыя і старыя, і не толькі на матацыкле. Урэшце, хай гэты факт застанецца ў блакноце. Значыць, уцёк ён ад Гарахаўца на ўчастку дарогі паміж вёскай Мышкі і паваротках на Застаноўку. Куды ён мог знікнуць? Хіба махнуў цераз лес і выскачыў з другога боку ля вёскі Рэчыца. Магло так быць, а чаму ж і не? Ярусь злавіў сябе на тым, што думае пра матацыкліста, які ўцёк ад Гарахаўца. Проста спрацавала ў душы: любы факт, хоць нечым звязаны з расследаваннем, зберагчы і асэнсаваць у лагічным ланцужку, які пачаў складвацца. Гэты ланцужок можа быць вельмі доўгі і здольны рвацца не раз.

Пад вечар ад таго ж Гарахаўца зноў атрымалі паведамленне. За трыста метраў ад дарогі каля вёскі Застаноўка ў кустах знайшоў раму матацыкла «Іж-юпітэр». На раме нумар аднаго з украдзеных матацыклаў.

— Яўген Іванавіч, а Яўген Іванавіч? — звязаўся Алесь па селектарнай сувязі з Батурам.— Знайшлі раму матацыкла, мо пад'едзем на месца?

— Не супраць, толькі вазьмі і Гурскага. Хай будзе і ён.

Ну што ж, гэта ўжо і няблага. Хоць толькі рама,

але ўсё роўна след. Злачынец жыве ў вёсцы ці ў райцэнтры, пакуль не вызначыш, але ясна, што ён недзе тут, недалёка. Мо зараз едзе па вуліцы. Ярусь ажно агледзеўся: матацыклісты, машыны. Людзі едуць ужо, напрацаваўшыся, стомленыя, дахаты. А нехта з гэтай армады, можа, рыхтуе новае злачынства. І дзе яно здарыцца, ён, начальнік крымінальнага вышуку, на жаль, не вызначыць.

— Ты здагадаўся паслаць запыты ў Хоцінск наконт пальчатак? — спытаўся Батура ў Алеся.

— А як жа ж, адразу.

— Ведаеш, нешта не прыпомню ў нашым краі такога аматара матацыклаў. Прынамсі, з тых, хто адседзеў раней. Я ўжо і картатэку перагледзеў нашага «актыву», няма сярод іх такіх спартсменаў. Хіба мо хто з іх перакваліфікаваўся?.. Заходзіў да мяне начальнік райаддзела, у цябе не быў?

— Не, не быў...

— Кажа, пытаўся пра гэту справу першы сакратар райкома партыі. Маўляў, грамадскасць турбуецца. Крадуць матацыклы, машыны. Ледзь не банда дзейнічае. Я паабяцаў, што мы хутка зловім гэтага аўтааматара. А ён ужо і не толькі аўтааматар, а і рэцыдывіст. Знялі ўжо адбіткі пратэктара каля рамы. Аднолькавыя, што і ля магазіна. Значыць, сапраўды адна банда... Ведаеш, мяне зацікавіў факт уцёкаў матацыкліста ад Гарахаўца. Як ён табе?

— Здаецца, не надта...— пацiснуў плячыма Алесь.

— А я адчуваю сваім вопытным старым носам, штосьці тут ёсць,— Батура дастаў з партфеля бутэрброд.— Бяры еш, бо я яшчэ і не вячэраў.

— Не, дзякуй, не хачу. Я трохі перакусіў.

У партфелі Батуры бутэрброды былі заўсёды, як ён казаў, на выпадак трывогі. Не раз з гэтага партфеля падмацоўваўся скібкай хлеба з кілбасой альбо салам і Алесь. Толькі сёння яму есці не хацелася. На вуліцы, пакуль чакаў Батуру, праглынуў піражок з мясам і выпіў шклянку ліманаду.

Паглядзелі ў лесе раму ад матацыкла, Гурскі сфатаграфаваў, і забралі з сабой. За два крокі ад яе знайшлі ключ дванаццаць на чатырнаццаць, яшчэ новы, але з крыху збітымі краямі. Аднак, як ні дзіўна, ні на раме, ні на ключы не было адбіткаў пальцаў. Усё чыста, і следу няма, быццам папрацаваў прафесіянал

высокага класа. Няўжо рэцыдывіст-гастралёр, які доўга ў раёне не затрымаецца? Знікне гэтак жа нечакана, як і з'явіўся, калі толькі не паспеюць узяць яго. Знайшоў Гурскі і сляды, таксама зрабіў адбіткі: злачынца быў у кірзавых ботах сорак другога памеру. Мяркуючы па падэшве, боты былі яшчэ новыя, ледзь не са склада.

## 7

Ужо ўвечары сабраліся ў начальніка райаддзела. Падпалкоўнік паўтарыў, што казаў Батура: райком партыі патрабуе найхутчэй закончыць следства і, галоўнае, злавіць злачынцу. Праз дзень было запланавана свята раёна, і ўсе рыхтаваліся да яго. Чым парадуе людзей міліцыя? Пакуль нічым. Нават невядома — «свой» злодзей ці «турыст», дзе ён хавае крадзенае.

Столькі знікла матацыклаў, сінія «Жыгулі» (даплюсавалі, значыць, сюды і «Жыгулі», падумаў Ярусь), і нічога, акрамя рамы, не знайшлі. Трэба, нарэшце, абследаваць кожны квартал лесу, усе вёскі. Калі трэба — і гаражы. Зрабіць гэта ўсё па законе, каб ні чым не пакрыўдзіць сумленных людзей. Правесці аперацыю разам з грамадскасцю.

— У нас жа шмат значыцца на паперы дружыннікаў, хай дапамогуць леснікі. Яны лепш, чым хто, ведаюць сваіх людзей,— сказаў Батура.

— Ну што ж,— згадзіўся начальнік райаддзела,— я так і буду дакладваць першаму сакратару райкома партыі. Ён, дарэчы, папрасіў зайсці да яго ў дваццаць нуль-нуль, павінен вярнуцца з раёна. Будзем прасіць дапамогі грамадскасці, але з нас ніхто адказнасці не здымае. Калі ласка, як мага актывізуйце сваю дзейнасць.

Праз акно было відаць, што неба амаль ачысцілася ад хмар. Пасля стольких дзён дажджоў нарэшце, мусіць, дачакаліся і добрага надвор'я. Мо к адпачынку і зусім яно ўсталюецца, падумаў Ярусь. Хоць трохі на сонцы сына пагрэю. Абрыдла ўжо гэтая сырасць, дый палі ўсе ў вадзе. Зноў будзем, пэўна, у калгасе сена касіць і жыта сушыць уначы. «Шэфская работа — вельмі важная справа»,— скажа падпалкоўнік і яшчэ падыме ўгору палец, як гэта робіць першы сакра-

тар райкома партыі. Важная, канечне, але за нас лавіць зладзеяў не будзе ніхто.

Пагаварылі, атрымалі ўказанні, але што далей рабіць — ім вырашаць самім.

Вярнуўшыся ў свой кабінет, Алесь прысеў за стол. У гэты момант адчыніліся дзверы — зайшоў лейтэнант Куско.

— Дзе так доўга быў? — адразу спытаў яго, хоць і не варта было. Проста на душы сумота, і такі стан — не ведаеш, за што хапацца. А калі на свята здарыцца што-небудзь сапраўды? — Сядай, расказвай.

— Я ж не гуляў гэты час,— відаць, пакрыўдзіўшыся, сказаў Куско,— займаўся тым, што даручылі, Алесь Пятровіч.

— Ладна, не злуй...

— Значыць, так, Алесь Пятровіч. Маючы ў руках машыну, я паспеў ужо аб'ехаць будаўнічы ўчастак і цэх па вырабе мэблі. Як і сказала кладаўшчыца Піраговіч, яны атрымалі па дзвесце пяцьдзесят штук пальчатак. Прывезлі да сябе шаснаццатага, гэта значыць, на тым тыдні ў сераду. Там, на ўчастку, пальчаткі яшчэ ляжаць у складзе, усе ў наяўнасці. Двойчы пералічыў і нават склаў пратакол — зірніце, калі ласка... У цэху па вырабе мэблі трохі іншая справа. Там учора дзесяць пар пальчатак аддалі рабочым. Але, на наша шчасце, усе яны былі ў цэху. І я агледзеў кожную пару. Таксама склаў пратакол, пазнаёмцеся. На іх пальчатках былі пячаткі хоцінскага быткамбіната. Засталіся яшчэ Лысагорскае лясніцтва і геолагі. Вось і ўсё...

— Ну і малайчына, зрабіў нямала. Зараз пацікавімся наконт тэлеграмы ў Хоцінск.— Ярусь набраў нумар дзяжурнага па райаддзеле: — Васільевіч, ці не было нам тэлеграмы з Хоцінска?

— Якраз паўгадзіны як атрымалі,— гудзе з трубкі бас дзяжурнага, і Куско чуе ўсё, што ён кажа.— Так, так, вось... Магу прачытаць?..

— Чытай, чытай...

— Акрамя вашага раёна пальчаткі гэтай партыі адасланы ў Віцебскую вобласць: пяцьсот штук — Гарадоцкі раён і чатырыста — Лёзненскі. Па дамоўленасці паміж арганізацыямі. Зразумеў?

— Усё зразумеў. Дзякуй. Зараз тэлеграму забярэм.— Алесь паклаў трубку.— Вось так, даражэнькі. Уяўляеш, калі гэта «турыст»? Закапаемся ў гэтай спра-

ве. Чакаць, пакуль зноў сябе дзе-небудзь не раскрые?.. Вось што: заўтра з раніцы я сам з'езджу да геолагаў і ў Лысагорскае лясніцтва. Дарэчы, ты не ў курсе, колькі часу ўжо гэтыя геолагі ў нашым раёне?

— Здаецца, летась яны былі тут.

— А дакладна?

— Зараз успомню... У іх укралі падлеткі веласіпед, і я па вашым загадзе, Алесь Пятровіч, шукаў яго... Значыць, яны ў нашым раёне з красавіка мінулага года. На зіму ад'язджаюць дахаты. Яны трымаюць вартаўніка з суседняй вёскі Алешыны. Гэта — дакладна. У мяне нават дзесьці захаваўся блакнот. Пашукаць?

— Не, не трэба. О, палова дзевятай. Час ужо нам, братачка, і па хатах. Бо жонкі не пусцяць,— сказаў Ярусь і адразу з сумам падумаў, што не завёў сына да ўрача. А калі захварэе? Заўтра абавязкова трэба завезці, а мо жонка вызвалiцца з працы раней? Мо пазваніць ёй, ужо ж, пэўна, яна з сынам дома. Не, час ісці дахаты.

— Ну, дык пайшлі, Алесь Пятровіч,— падняўся з крэсла Куско.

## 8

Як і чакаў Ярусь, дзень пачынаўся прыгожы, светлы. На небе ні воблачка. Нават не верылася, што запар амаль два тыдні ліў дождж. Як адразу змянілася ўсё ў прыродзе: было пахмурна, цёмна, а цяпер зазіхацела, здалося, фарбамі вясёлкі, нават твары ў людзей сталі больш прыветныя і радасныя. Мо надвор'е паўплывала на настрой і жонкі, была яна лагодная і, як звычайна, не сварылася на Алеся. Святлей неяк было і ў яго на душы, хоць учарашні клопат не даваў надта і спакою. Уночы кепска спаў, усё думаў, прыкідваў у галаве розныя версіі і выехаў з дому рана: на вуліцах яшчэ былі рэдкія прахожыя. А гэтак рана ён сабраўся, таму што да Лысагорскага лясніцтва нямала часу ехаць, як-ніяк пяцьдзесят кіламетраў, а на дарогах вада. Дый летам людзі ў канторах надта не затрымліваюцца, да восені ўжо нядоўга, а зрабіць трэба яшчэ —ой, колькі, каб своечасова ўправіцца.

Яму з райаддзела не званілі. Калі б нешта важнае здарылася, патурбавалі б. Алесь вырашыў пазваніць дзяжурнаму альбо Куско адтуль з Лысагорскага ляс-

ніцтва. Прынамсі, лейтэнант быў у курсе, што ён спярша туды едзе, а потым — да геолагаў.

Зноў дарогай бурчэў вадзіцель, скардзіўся, што не хапае бензіну, на кепскі рухавік, які даўно трэба спісаць, каб нікому не псаваў нерваў. Але новую машыну абяцалі прыслаць толькі на схіле года, а гэта значыць — у пачатку будучага.

Мала-памалу, але за гадзіну дабраліся да лясніцтва. Пашанцавала: на месцы быў ляснічы дый астатнія людзі не паспелі раз'ехацца. Толькі што скончылася нейкая чарговая нарада. Хаця ўжо на шчыце вісела аб'ява: лекцыя аб міжнародным становішчы на сучасным этапе. Алесь толькі кінуў позірк на аб'яву, і ў памяці засталося прозвішча лектара. Спатрэбіцца гэты факт альбо не — Алесь, канечне, яшчэ не ведаў, але прывучыў сябе нават такія дробязныя, здаецца, дэталі запамінаць. Былі выпадкі ў ягонай практыцы, што менавіта дробныя факты пасля дапамагалі звязаць лагічны ланцужок у следстве.

Ён нічога не тлумачыў ляснічаму, пажыламу чалавеку, які, пэўна, прывык ужо ў жыцці да найневерагоднейшага, а адразу загаварыў пра пальчаткі. Той выклікаў з бухгалтэрыі жанчыну, і яны разам пайшлі ў невялічкі складзік-хлявок, у якім, мусіць, стаяў і конь, бо моцна пахла конскім потам. А ў кутку на сцяне віселі дзве пары лейцаў, адны з іх новыя, дуга і два хамуты. Адзін без супоні. Усё гэта паспеў заўважыць Ярусь, але больш за ўсё яго зараз цікавілі пальчаткі, з шэразялёнага брызенту, звязаныя ў тры таўставатыя стосікі.

— Колькі іх у вас? — спытаў ён у жанчыны.

— Роўна сто пяцьдзесят штук... Можаце пералічыць. Я нікому яшчэ не выдавала.— Нібыта прасіла яна прабачэння ў Яруся, пачырванела.— Мы пакуль не выкарысталі леташні запас. Але тут прапанавалі, дык думаю, чаму б не ўзяць.— Цяпер яна паглядзела на ляснічага. Ён кіўнуў галавой, падтрымліваючы яе. Калі б ведала жанчына, як узрадавала гэтымі словамі Алеся.

Яны пераглядзелі і палічылі пальчаткі хутка. І Алесь, падзякаваўшы за дапамогу, збіраўся ад'язджаць. Спытаў толькі, ці не званілі яму з райаддзела. Званкоў не было, але ў той момант, калі ён ужо стаяў ля машыны, яго паклікалі да тэлефона. Вяртаючыся назад, папікнуў сябе за тое, што сам думаў пазваніць

у аддзел, а не зрабіў гэтага. Сэрца ёкнула: мо што здарылася зноў. Ён асцярожна прыклаў трубку да вуха.

— Слухаю, капітан Ярусь. Хто? Нічога не чуваць,— гукнуў ён, бо чуў толькі пакуль хрып і шчоўканне.— Сувязь у нас, проста нерваў не хапае ўжо,— сказаў ён, і ляснічы паспачуваў яму, пахітаўшы галавой. Гэты маўчун гаварыў мала, Алесь пачуў ад яго за гадзіну, што знаходзіўся ў лясніцтве, толькі некалькі слоў.— Пэразваніце, калі ласка.— Ён паклаў на апарат трубку і пачаў чакаць.

На гэты раз Алесь выразна пачуў голас лейтэнанта Куско, які таропка сыпаў словамі, як гарохам. За адну хвіліну ён сказаў столькі, што проста ашаламіў Алеся:

— Тэрмінова выязджайце ў вёску Мышкі. У сярэднюю школу. Узламаны пакой зброі. Украдзены дробнакаліберныя вінтоўкі... Да нас выехаў начальнік аддзела крымінальнага вышуку абласнога ўпраўлення. Вось-вось павінен пад'ехаць намеснік начальніка ўпраўлення палкоўнік Казючыц. Дэталі — на месцы.

— Ясна, ясна,— толькі і прамовіў Ярусь, бо ад гэтай інфармацыі ажно кальнула ў сэрцы. Зброю ўкралі перад раённым святам, на якім будуць сотні людзей. А што ў гэтага бандыта ці банды ў галаве. А раптам...

Сеўшы ў «Масквіч», загадаў вадзіцелю ехаць як мага хутчэй. Той нешта буркнуў пра дарогі, старыя амартызатары, але Ярусь так зірнуў на яго, што вадзіцель змоўк і пагнаў машыну, нягледзячы ні на калдобіны, ні на лужыны.

Няўжо тыя самыя зладзеі, што і ўкралі матацыклы, «Жыгулі», абрабавалі магазін, думаў Алесь. Значыць, яны ці ён увесь час апярэджваюць нас, а мы бяжым, бяжым і не можам дагнаць. А калі гэта той матацыкліст? На матацыкле шась у адну вёску, назаўтра — у другую і на процілеглым баку раёна. Цікава, а як у суседніх раёнах? Няўжо ён лётае толькі па нашым? Не можа такога быць, раптам падумаў Ярусь. Ён жа, відаць, не дурань і разумее, што шанцаў трапіць у рукі міліцыі ў адным раёне больш, чым калі дзейнічаць у некалькіх. І гэта ўжо небяспечна, раз у ягоных руках зброя. Заўтра ж раённае свята, на якое запрасілі гасцей з Мінска, з вобласці і нават сяброў з Літвы. Жонка казала, што артысты з Мінска прыехалі. Павінен быць і Яраслаў Еўдакімаў, і «Песняры», і Святлана Кульпа. Грошы заплацілі, пэўна, немалыя, людзі рыхтуюцца.

Мо райком адменіць свята... А раптам... Невялікая ўсё-ткі падзея — раённае свята. Абвясціць, што ў сувязі з кепскім надвор'ем і што не скончана ўборка, свята адбудзецца ўвосень, разам са святам ураджаю. Урэшце, вырашаць першаму сакратару, кіраўніцтву раёна. А Ярусь, калі яго спытаюць, выкажа свае меркаванні.

У Мышках ля школы і ў пакоі, дзе захоўвалася зброя, ужо было з дзесятак міліцыянераў. Некаторыя ў цывільным. Начальнік райаддзела дапытваў немаладога вайскоўца, старшага лейтэнанта, злаваўся, а той ціха апраўдваўся. Хоць наўрад ці была тут ягоная віна. Пакой абсталяваны, як напісана ў інструкцыі, гэтак жа зроблена і ва ўсіх школах раёна, дзе выкладаецца пачатковая вайсковая падрыхтоўка. Нездарма людзі кажуць, што ад злодзея не ўратуешся ніякім замком. Канечне, трэба, каб была тут сігналізацыя. А яе няма альбо не працуе, як і ў магазіне. Дый, пэўна, праспаў школьны вартаўнік. Яго ж ломам не біў ніхто па галаве. Як здолеў гэтак незаўважна злачынец залезці ў пакой са зброяй?

Выпадак, канечне, быў вельмі сур'ёзны і небяспечны: зніклі чатыры дробнакаліберныя вінтоўкі, да іх паўтары тысячы патронаў і таксама дробнакаліберны пісталет. Тры вучэбныя аўтаматы злодзей пакінуў. Няйнакш вырашыў не траціць на іх час, ці мо які іншы матыў у яго быў, цяжка сказаць.

— Вы разумееце, таварыш капітан, складанасць сітуацыі?! — загрымеў, здалося, па ўсёй школе голас падпалкоўніка.— З-за вашай марудлівасці ўжо гэная банда атрымала зброю ў рукі. Разумееце, што гэта такое?! Час ідзе, а ў нас ніякіх змен ні па матацыклах, ні па магазіне... Мая думка: трэба перакрыць усе дарогі ў раёне і праверыць кожны матацыкл, кожную машыну. Інакшага выйсця не бачу. Да нас вось-вось пад'едуць таварышы з вобласці і рэспублікі. Як разумееце, крадзеж зброі — гэта не абы-што, пагроза грамадству, жыццю людзей. Зараз жа пачынаем аперацыю па праверцы ўсяго транспарту.

— Таварыш падпалкоўнік,— дачакаўшыся, калі начальнік райаддзела змоўкне, сказаў Ярусь.— Нам трэба пацікавіцца ў суседзяў, як у іх з крадзяжом матацыклаў, машын, па магазінах...

— Мы пра гэта ўжо гаварылі з намеснікам началь-

ніка абласнога ўпраўлення палкоўнікам Казючыцам. Ён мае такую інфармацыю. Акрамя таго, па ягоным загадзе да нас таксама едуць начальнікі райаддзелаў. Вось так... Урэшце апошняе: наша дзейнасць зараз на кантролі міністра ўнутраных спраў рэспублікі. Ёю цікавяцца ў ЦК. Так што, мяркую, таварыш Ярусь, пакажаце ўсім узор вышуковай работы.

Ён мармытнуў нешта сабе пад нос, убачыў задумлівы погляд Батуры, які сядзеў у кутку пакоя на табурэтцы. Відаць было, што чакаў, калі начальнік райаддзела скончыць сваю прамову.

— Ведаеце што,— прамовіў ён, па-ранейшаму чамусьці пільна гледзячы на Яруся.— Раз збіраецца такая сіла, дык мо зоймемся кожны сваёй справай?

— Што маеце на ўвазе? — перапыніў падпалкоўнік, нервова ўзмахваючы рукой.— Зараз тут будзе намеснік начальніка абласнога ўпраўлення...

— Ну і выдатна! — стаяў на сваім Батура.— Начальству лепш відаць, дзе яму быць. Я хачу вось пра што: усё-ткі нам трэба давесці да канца з пальчаткамі. Як я зразумеў, Ярусь толькі што з Лысагорскага лясніцтва. Засталіся толькі геолагі. Хай ён ужо скончыць праверку з гэтымі пальчаткамі.

— Ладна... Едзьце, Алесь Пятровіч,— падпалкоўнік чамусьці адразу згадзіўся з Батурам, хоць не любіў, калі яму нехта з падначаленых падказваў. Ён лічыў, што камандаваць павінен толькі начальнік. Да пенсіі заставалася гадоў пяць, і падпалкоўнік вельмі раўніва ставіўся да падначаленых.— Толькі ад геолагаў адразу ў райаддзел. Дзейнічайце аператыўна, зараз у нас кожная хвіліна будзе ацэнена ўверсе,— ён паказаў пальцам угору.

Ну што ж, падпалкоўніка можна зразумець як чалавека. А як міліцыянера...

Ён робіць усё правільна, і таксама няма яго за што ўпікнуць.

## 9

«Ай, усялякае ўжо было ў жыцці,— думаў Ярусь.— Высветлім нарэшце і тут. Высветлім... Вось толькі хутчэй...» У якія ён толькі не трапляў сітуацыі, але ж усё канчалася нармальна. Як яно будзе заўтра ці нават сёння праз гадзіну — ніхто не ведае. Унь тры месяцы

назад яго нават пахваліў міністр унутраных спраў, і прыёмнік «ВЭФ» стаіць як памяць пра тую аперацыю. А магло і не быць... Магло. Проста так атрымалася, што рэцыдывіст, які ўцёк з лагера, апынуўся ў іх раёне. Тады пазваніў сам палкоўнік Казючыц. Маўляў, зрабі што хочаш, але затрымай яго. Бандыт валодае прыёмамі самба. Некалі меў званне кандыдата ў майстры спорту, вельмі небяспечны пры затрыманні. Мянушка Хірург. Зараз у яго пашпарт на Карнеева Паўла Кузьміча, 1943 года нараджэння. Знаходзіцца ў вашым раёне, але дзе — невядома. Шукай і знайдзі!

Такое, канечне, бывае раз у жыцці. Прынамсі, не часта. Начальнік райаддзела разаслаў групы па месцах, дзе збіраліся звычайна аматары лёгкага жыцця, а ён вырашыў зазірнуць у гасцініцу. Нават і не думалі, што можа пайсці туды. Аднак гэты Хірург быў настолькі нахабны, што якраз пайшоў менавіта ў гасцініцу, якая была за два крокі ад райаддзела. Адразу за райкомам партыі. Псіхолагам быў, амаль дакладна ўлічыў, як будзе паводзіць сябе міліцыя, дзе яго шукаць. А яны пры абмеркаванні аперацыі так і не падумалі пра гасцініцу. Начальнік райаддзела катэгарычна заявіў, што Хірурга трэба шукаць на ўскраіне.

Усе групы раз'ехаліся па сваіх адрасах, і Алесь з Куско сабраліся ехаць. Але пазваніла жонка лейтэнанта, ёй раджаць якраз надышоў час. І бледны, перапалоханы Куско папрасіў хвіліну, каб завезці жонку ў бальніцу. Такі момант, ён, канечне, дазволіў. Мо ўсё-ткі і пачакае Хірург. Так і падумаў: пачакае. Наўрад ці будзе ён некуды бегчы зранку. Тым больш іхні раён у яго прамежкавы этап. Па інфармацыі з абласнога ўпраўлення, Хірург ішоў некуды на Украіну. Урэшце было ясна куды: да Чарнаўцоў, адкуль быў родам.

Куско памчаў на машыне па жонку, а Ярусь пахаджваў па вуліцы, нават не падумаўшы, што выкліча гнеў начальніка. І калі падумаў, якраз стаяў перад гасцініцай, старэнькай, яшчэ пасляваеннай пабудовы, адышоўшы трохі ад міліцыі. Прачытаў шыльду, у галаве нешта варухнулася, і ён пашыбаваў у будынiну. Адміністратарка Валя Швец, жончына аднакласніца, убачыўшы яго, усміхнулася:

— Мо Алена прагнала, у нас жыць будзеш?..

— Не, дзякую богу, не,— адказаў, а ў галаве ўжо,

як свярдзёлак, круцілася, проста цягнула да стосіка дакументаў, якія ляжалі справа ад Валі. Аднак ён авалодаў сабой і вельмі спакойна, амаль абыякава спытаў:

— Валечка, у цябе няма госця па прозвішчы Карнееў? Карнееў Павел Кузьміч.

— Зараз глянем,— пагартала, пагартала паперы і проста сказала: — Ёсць. Што, твой знаёмы?

— Мой, Валечка. Нават вельмі блізкі. У якім ён нумары?

— Пяты нумар. З ім жонка... Карнеева Соф'я Іванаўна. Гэта на другім паверсе, адразу злева...

...Канечне, так бывае раз у жыцці, падумаў Ярусь. Яны ўжо ехалі лесам. Вось што значыць пясочак: два тыдні ішоў дождж, а за якую ноч, як распагодзілася, падсохла, і дзень-другі — стане зусім суха. Да геолагаў яшчэ было кіламетраў дваццаць. Хоць бы на месцы яны былі. Калі б паслаў Куско, дык зараз сядзеў бы на нарадзе. І Куско ў геолагаў ведаюць... Якая розніца, праверу — і назад.

Ярусь прыплюшчыў вочы, і ў галаве зноў малюнак: Валя Швец за сталом, і ён радасна ўсміхаецца, пачуўшы, што Карнееў Павел Кузьміч на другім паверсе, у пятым нумары. І амаль інстынктыўна рука палезла пад пінжак да пісталета. У Карнеева быў пісталет «ТТ», некалькі абоймаў патронаў і нож. Яму чалавека забіць, што раз плюнуць і расцерці. Мо пазваніць у аддзел? Але ж там, акрамя дзяжурнага, мусіць, нікога няма. Усе на аперацыі. Ну, хіба нампаліт на месцы і яшчэ той-сёй.

— Нешта доўга спіць мой знаёмы,— сказаў ён Валі, зірнуўшы на гадзіннік: ужо была палова дзесятай.— Вось што. Ты пастой на вуліцы. Як пад'едзе лейтэнант Куско... Знаеш яго? Малады, бялявы?

— Ну, ведаю, ведаю...

— Кажы, хай ідзе сюды. А я пайду будзіць сябра,— прамовіў Алесь: яна зразумела, пра каго гаворыць ён.

— Ой, я баюся,— амаль прашаптала Валя, у яе пабялелі вусны.

— Спакойна, ідзі на вуліцу і чакай Куско.

Ён падняўся па скрыпучых драўляных прыступках на другі паверх. Амаль не дыхаючы, падышоў да дзвярэй пятага нумара. Як добра, што нікога не было ў калідоры, перашкаджалі б толькі. Спярша думаў раптоўна расчыніць дзверы і ўскочыць з крыкам: «Рукі ўго-

ру!» А калі Павел Кузьміч зараз сядзіць за сталом, а збоку — пісталет? Якая з ім жонка, зразумела. Такая ж, як і ён. Здалося, па ўсім калідоры чулася, як тахкае сэрца, пульсуе кроў. Напружаннем волі ён супакоіў сябе, і цела яго напялася, як спружына. Лёгенька крануўшы рукою дзверы, здзівіўся, што яны адразу скрануліся з месца. «Ай, малайчына, Камар!» — у думках падзякаваў ён начальніку камунгаса раёна за добра змазаныя дзверы і мацней націснуў на іх. І ледзь не зарагатаў, калі з пакоя пачуў магутны храп і тоненькі свіст. Тады Ярусь упэўнена адчыніў дзверы, у якіх з унутранага боку тырчэў ключ, але яны былі незамкнёныя. Відаць, гаспадары настолькі загулялі, што зусім забыліся пра небяспеку.

На стале сярод рэшткаў закусі стаялі пустыя і поўныя бутэлькі. Вопратка на падлозе, а гаспадары на ложку. Хірург — даволі малады яшчэ мужчына, белявы, з поўнымі ружовымі вуснамі. Ён спаў, раскінуўшы ўшыркі рукі, нібы збіраўся абхапіць імі ўсю прастору. Побач ляжала, падкурчыўшы пад сябе ногі, дзяўчына. Прыгожая, чарнавалосая. Як дзіцё прыцмоквала вуснамі і тоненька свістала. Стаяў над імі Ярусь і думаў, што, спаткаўшы іх на вуліцы, глядзеў бы з захапленнем, парадаваўся. Але ж, на жаль, унь як бывае ў жыцці. Ляжаць перад табой злачынец і яго сяброўка, якая, пэўна, таксама з гадзючай душою.

Ён засунуў руку пад падушку і намацаў пісталет. Так і ёсць — «ТТ». Пасля знайшоў нож, патроны. І толькі тады, звёўшы рукі ў Хірурга разам, зашчоўкнуў на іх наручнікі. Той нават не паварухнуўся, храп не зменшыўся. «Ладна, пасціце»,— падумаў з іроніяй і пайшоў з нумара ўніз...

Так, канечне, бывае раз у жыцці. А вось з матацыклістамі яшчэ нічога невядома пакуль.

— Колькі, Іван, засталося нам да геолагаў? — загаварыў да вадзіцеля, маладога сяржанта. У міліцыі ён з мая, адразу пасля арміі. Маўчыць усю дарогу, як вады набраў у рот.

— Кіламетраў чатыры, Алесь Пятровіч.

— Не надакучыла яшчэ міліцыя, Іван?

— Не, мала служу...— засмяяўся сяржант. Дарога завіхляла, замітусілася ўлева-ўправа, паваротка — і машына выскачыла на прасторную паляну. Пасярэ-

дзіне паляны тры вагончыкі, студня, і, здаецца, больш нічога. Не, метраў у трыццаці, ля соснаў, хлявок з аполкаў. Дзверы на чорным вялікім замку. Што яны там трымаюць? Відаць, нейкае абсталяванне. Хоць былі б на месцы. Калі няма, дзе ж ты іх зараз знойдзеш. Тады чакай да вечара. А ўвечары... Ага, здаецца, дзверы ў адным вагончыку адчыненыя. Точна адчынена. І ля акна нехта сядзіць. Сядзіць спіной. Павярнуўся, ага, ёсць людзі. Зусім добра, проста выключна, падумаў Ярусь, узрадаваны, што ўжо цяпер з пальчаткамі ён высветліць да канца.

## 10

У вагончыку было двое: малады, коратка падстрыжаны хлопец гадоў дваццаці пяці са светлымі вусікамі пад кірпатым носам і сівы ўжо дзядзька з барадой. Ён сядзеў за сталом і нешта пісаў, перамаўляючыся з маладым. Калі Ярусь стаў на парозе, у яго твар быў разгневаны, амаль раз'юшаны. Мо яны сварыліся, альбо старэйшы дакараў маладзейшага, але Ярусь не зразумеў, бо з яго з'яўленнем гаворка ў вагончыку спынілася. На яго глядзелі дзве пары насцярожаных вачэй. Хлопец усміхаўся толькі, а барадаты пазіраў нелюдзіма. Маўляў, што патрэбна, якое ліха прынесла цябе сюды. І Ярусь чамусьці ў апошні момант вырашыў адразу нічога не тлумачыць, ён прыветна павітаўся, пахваліўшы ўтульнасць жылля, і спытаў начальніка партыі.

— Ну я,— па-ранейшаму нелюдзіма прамовіў барадаты.— А што вам патрэбна?

— Мне б хацелася з вамі сам-насам,— сказаў Ярусь.

Мо гэтыя словы прагучалі нахабна ці абразліва, толькі барадаты незадаволена закрахтаў, ляпнуў стылом, але ўсё-ткі выйшаў з-за стала. Спыніўся пасярэдзіне вагончыка і рукой паказаў на дзверы.

— Выйдзі, Сяргей, калі ласка. З чалавекам пагаманіць трэба.

Калі хлопец пакінуў вагончык, зноў сеў за стол і, не гледзячы на Яруся, прабурчэў:

— Ну, слухаю. Хто вы такі?

Ярусь разгарнуў перад ім сваё пасведчанне. Барадаты доўга вывучаў і нібы палагоднеў, у яго пасвятлеў твар.

— Думаў, зноў якія рэвізоры з упраўлення. Абрыдлі яны мне во як... Маё прозвішча Насонаў Іван Яўсеевіч. Што хоча знайсці міліцыя ў нашай партыі?

«Нечым чалавек быў расхваляваны. Штосьці здарылася...— падумаў Ярусь.— У кожнага свае праблемы».

— Мне трэба высветліць адну драбязу, Іван Яўсеевіч,— сказаў ён,— зусім драбязу, але як найхутчэй. Каб у вас не займаць часу, ну і ў мяне яго няшмат. Як разумееце... Тыдні два назад ваша партыя атрымала ў аддзеле рабочага забеспячэння леспрамгаса пяцьдзесят спяцовак, пальчатак. Мне іх трэба пабачыць...

— Хм... Так, мы атрымалі гэтыя пальчаткі. Хоць забеспячэнне ў нас па сваёй лініі някепскае. Проста нам прапанавалі, мы і ўзялі.

— Я супраць гэтага нічога не маю. Проста хачу іх паглядзець. Яны ў вас у складзе ці на руках?

— Ведаеце, такой драбязой я амаль не цікаўлюся. Хоць, здаецца, яны ў складзе. Але на гэта нам лепш адкажа Сяргей. Унь што сядзеў тут. Ён у нас узрыўнік і па сумяшчальніцтве загадчык склада. А таксама — прафорг. Так сказаць, прадстаўнік грамадскасці. Можа, запросім яго сюды.

— Калі ласка, чаму не,— згадзіўся Ярусь.— Запрашайце.

Насонаў выйшаў з вагончыка і праз хвіліну вярнуўся з маладым. Той быў ужо ў брызентавай куртцы, у джынсах і ў кірзавых ботах. У руках — саламяны брыль.

— Адкажы, Сяргей, капітану, у яго да цябе ёсць пытанне.

— З задавальненнем. Пытайцеся,— Сяргей зняў з сябе брызентавую куртку і застаўся ў тонкай спартыўнай кашулі.

— Пакажыце, калі ласка, пальчаткі, якія атрымалі з аддзела рабочага забеспячэння леспрамгаса.

— І ўсё? — шчырае здзіўленне было на твары хлопца.— Пайшлі...

Ярусь думаў, што Насонаў застанецца ў вагончыку, але ж не, выйшаў з імі. І на яго твары, як і на твары ў Сяргея, было недаўменне і нават расчараванне. Ярусь у душы ўсміхнуўся, яму нечым раптам спадабаліся гэтыя людзі. Мо тым, што дзеля сваёй працы адмовіліся ад элементарных жыллёвых выгод і месяцамі

жывуць у гэтых вагончыках. Каб так жыць, трэба вельмі любіць справу, якой займаешся, быць адданым ёй.

Сяргей зняў замок з хлеўчука, расчыніў дзверы. Усярэдзіне было цёмна, толькі праз рэдкія шчыліны там-сям прасекліся танюсенькія сонечныя промні. Сяргей, відаць, думаў, што ён зойдзе ў хлеў, але Ярусь не пайшоў. Чакаў, пакуль той не вынес ахапак пальчатак да парога на святло.

— Вось пальчаткі, а вось накладная на іх,— стаў убаку, пазірае на Яруся і, пэўна, думае, што дажылася міліцыя. Замест таго каб лавіць зладзеяў і бандытаў, займаецца глупствам. Няйнакш гэтак жа мяркуе і барадаты Насонаў. Відаць па твары. Бяры вас халера, што хочаце, тое і думайце, а мы акуратна пералічым усё. Раз-два, раз-два, ужо дваццаць пяць, сорак. Так, сорак сем. Яшчэ раз палічым. Зноў сорак сем. Цікава, а дзе тры пары. Дзіўны чалавек, у людзей на руках.

Выпрастаўся Ярусь, хуценька аформіў пратакол. Потым паляпаў рукой па пальчатках.

— Вы атрымалі пяцьдзесят пар. Тут сорак сем, дзе тры пары?

— Дзе? У людзей, мабыць,— пацiснуў плячамі Насонаў.— Так?

— Канечне, у людзей,— сказаў Сяргей.— Людзям жа ў нечым трэба працаваць. Я і выдаваў.

— Каму? — абыякавым тонам пытаўся Ярусь.

— Каму, каму. Ці зараз успомніш? Гэта ж не свідравальны станок альбо не машына? Так, Іван Яўсеевіч?

— Ну, вядома, вядома,— падтрымаў яго той.

— Канечне, не машына,— казаў Ярусь,— але, калі ласка, успомніце. Гэта вельмі важна,— падумаў, казаць ім ці не, што па пальчатцы яны шукаюць злодзея. Вырашыў маўчаць, калі запытаюць, навошта яму гэтыя пальчаткі, скажа: па аддзеле рабочага забеспячэння міліцыя вядзе следства.

— Ну, магу ўрэшце...— пачухрыў патыліцу Сяргей.— Здаецца, прасіў Матузавец Анатоль пальчаткі, Іосіф Пальчук і... Хто ж гэта трэці. Чакайце, чакайце,— ён цмокаў, міргаў вачыма, а потым ляпнуў сабе па калене.— От галава, два вухі. Я ж сам адну пару браў. Вось і ўсё. Што, мо паказаць?

Ярусь кіўнуў галавой. Сяргей зноў нырнуў у змрок хлеўчука і вынес чорную ў бліскучых плямах мазуту

ватоўку. З кішэняў яе тырчэлі брызентавыя пальчаткі. Ярусь паглядзеў іх, амаль чыстыя. Пячатка тая ж, што і на ўсёй партыі. Цалюткія, працавалі ў іх мала. Ен вярнуў іх Сяргею.

— Дзякуй. А цяпер астатніх паглядзім...

Насонаў уздыхнуў, развёў рукамі. На яго твары ўжо было спачуванне.

— Іосіф Пальчук адсюль кіламетраў за пятнаццаць, а Матузавец — не менш як за трыццаць. І ў процілеглым баку.

— Што ж рабіць. Паехалі. У нас машына ёсць.

— Можна, Іван Яўсеевіч, я застануся тут,— сказаў Сяргей.— Мне трэба падрыхтавацца на заўтра. Самі ж казалі.

— Так, так... Рыхтуйцеся. Ну што ж, едзем... Здаецца, Алесь Пятровіч?

— Ужо трыццаць пяць гадоў, Іван Яўсеевіч,— весела казаў Ярусь. Як перад небяспекай у яго заўсёды ўзнімаўся настрой, так і чамусьці цяпер. Незразумела, небяспекай і не пахла. Ці не адчуваў ён сябе накшталт сабакі, які нарэшце вынюхаў след? Нават калі і гэтак, дык няблага. Проста ён па гэтым шляху ля фінішу. Добры настрой знікне пасля сустрэчы з Анатолем Матузаўцом. Калі ён, капітан Ярусь, застанецца ні з чым і пра гэта будзе дакладваць у райаддзеле палкоўніку Казючыцу. Якімі вачыма гляне начальнік райаддзела і што скажа пасля... Хай што хоча, тое і кажа. Вельмі разумны, начальнік... Ладна, спакойна.

Дарогай яны з Насонавым расказвалі адзін аднаму анекдоты. І нават маўчун сяржант рагатаў, ехаць было весела. Калі ўбачылі Іосіфа Пальчука, у таго пальчаткі былі на руках. Застаўся адзін Матузавец. Да яго ўжо дабіраліся моўчкі. Прыехалі на балота, дзе ён працаваў. Сонца ўзнялося высока і пякло, пякло. Здалося, лужыны высыхалі ўвачавідкі.

Матузавец сядзеў пад дрэвам і курыў, побач з ім былі яшчэ два дзядзькі. Відаць, рабочыя з тутэйшай вёскі. Убачыўшы машыну, ён узняўся з зямлі, высокі, худы, з доўгімі чорнымі ад загару рукамі. Няйнакш паспеў загарэць яшчэ перад дажджамі. У маі сонца было як у ліпені, нават там-сям прыпаліла азімыя. Раённая газета пра гэта пісала, а Ярусь чытаў кожны яе нумар уважліва.

— Дзе твае, дарагі Анатоль Антонавіч пальчаткі? —

папытаўся ў Матузаўца Насонаў, апярэдзіўшы Яруся.

— А што? — на твары здзіўленне. Відаць, ніяк не чакаў ад начальства гэткага пытання.

— Міліцыю цікавіць,— кіўнуў Насонаў на Яруся.

— А...— яшчэ болей здзівіўся Матузавец.— Унь, ляжаць.

Ярусь падняў пальчаткі і адразу ўбачыў, што гэта не леспрамгасаўскія: пашытыя з белай тонкай тканіны. У некалькіх месцах парваліся ўжо па шве. І ніякай пячаткі не было.

— А тыя, што вы атрымалі на мінулым тыдні? — Ярусь адчуў, як унутры ў яго ўсё напялася. Маўчаў Насонаў, кідаючы позіркам то на капітана, то на Мазузаўца.

— Брызентавыя? — хрыпла сказаў Матузавец. Ён кашлянуў, адвярнуўся і, адышоўшы назад да дрэва, сеў зноў на сваё месца.— Чорт іх ведае, дзе яны. Толькі дзень і папрацаваў. А потым як карова языком злізала. Хацеў папрасіць новыя ў Сяргея... Але ён такі жмінда, снегу зімой не дасць. Дык узяў вось старыя, знайшоў у вагончыку. Дачакаю, калі падыдзе тэрмін, і тады ўжо вазьму ў Сяргея. Клапоціцца аб грамадскай маёмасці наш прафорг. Цьфу,— плюнуў ён сабе пад ногі. І раптам ажно спалатнеў ці не спалохаўся нечага.— А што здарылася ўрэшце?..

## 11

— На месцы злачынства знойдзена ваша пальчатка,— сказаў Ярусь і змоўк, чакаючы, як адрэагуе Матузавец. Той апусціў галаву і ў руках усё камечыў пачак цыгарэт. Рукі прыкметна дрыжалі. Нарэшце ён узняў галаву, твар нібы пастарэў, глыбейшымі здаліся зморшчыны ад носа да барады.

— А чаму гэта мая пальчатка? Што, на ёй напісана?..

Ярусь нічога не адказаў, бо сапраўды на ёй не было прозвішча Матузаўца. Тое, што ў яго няма гэтых пальчатак, а адну з іх знайшлі ля парога абкрадзенага магазіна, канечне, яшчэ не доказ, што ён злодзей. Але менавіта з усёй партыі ў семсот штук пальчатак, якія завезлі ў раён, знікла адна. І яе меў Матузавец. Магчыма, у яго ўкралі гэтыя пальчаткі альбо проста ўзялі,

калі яны ляжалі ля вагончыка. Злодзею яны спатрэбіліся для сваёй аперацыі.

— Вы можаце, Анатоль, успомніць, дзе пакінулі пальчаткі? Тады, калі яны зніклі?

— Ведаеце, цяжка. Гэткая дробязь... I не звяртаеш увагі на яе.

— Гэта вельмі важна,— націснуў Ярусь,— вельмі.— I вам, і нам... Успамінайце, калі ласка.

— Што ж, паспрабую... Калі я вярнуўся з поля, пераапрануўся і, здаецца, спярша паклаў ватоўку і штаны на ганак вагончыка...

Відаць было, як ён спрабуе ўспомніць, як напружана думае. Да іх размовы прыслухоўваюцца гэтыя дзядзькі. Цікава, даўно яны працуюць з Матузаўцом? I дзе былі ў тую ноч, калі абрабавалі магазін. Ярусь падышоў да рабочых, яны падняліся з зямлі, сталі смірна па-салдацку. Мужчыны яшчэ не старыя, гадоў па трыццаць — трыццаць пяць, армію не забылі зусім, дый бяруць на перападрыхтоўку.

— Вы, хлопцы, даўно дапамагаеце таварышу Матузаўцу?

— Першы дзень, таварыш начальнік,— амаль дружна выгукнулі яны.

— Першы дзень...— паўтарыў услед за імі Насонаў.

— Ну, ладна. Ведаеце, Іван Яўсеевіч, можа, мы ўсе разам з'ездзім яшчэ ў ваш лагер. I няхай там нам Анатоль...

— Антонавіч,— падказаў Насонаў.

— Анатоль Антонавіч усё зноў раскажа і пакажа. Не супраць?

Насонаў перасмыкнуў плячыма, якое тут супраць. Па ўсім відаць, што трэба ехаць, навошта, каб чалавек дарэмна нерваваўся. Толькі падумаць, ягоная пальчатка на месцы злачынства. Але што можна зразумець па нейкай пальчатцы... Галоўнае, каб не пакрыўдзілі ні ў чым не вінаватага чалавека. Унь колькі цяпер пішуць пра міліцыю і якія чуткі толькі не ходзяць пра яе... Дыму без агню не бывае, а раптам ім трэба скончыць справу, патрабуе начальства — вось яны і шукаюць, на каго б пакласці злачынства. А мо не... Ведаю ж не адзін год Матузаўца. I на што ён здольны, думаў дарогай начальнік геалагічнай партыі Насонаў і ўсё паглядваў на Яруся. Нешта было сімпатычнае ў капітане, не падобна, што ён можа займацца фальсіфікацыяй, але

Насонаў спакваля настройваў сябе на спрэчку з ім. Вырашыў даказваць, што Матузавец не вінаваты. Аднак, пэўна, не ўяўляў, што гэткая думка ўжо ўзнікла і ў Яруся. Калі яны ішлі да машыны, ён, прыпыніўшы хаду, спытаў у Матузаўца, дзе той учора быў увечары і ўначы. У вагончыку. Хто пацвердзіць? Іосіф Пальчук. Яны жывуць разам. Дарэчы, учора, здаецца, гулялі да трох ночы ў шахматы. Можаце спытаць у Пальчука. Чаму помніць час? Таму што ў Пальчука спыніўся гадзіннік і ён уключыў радыё. Прыёмнік «ВЭФ», які стаіць у іхнім вагончыку.

Матузаўцу можна верыць, і, відаць, Пальчук пацвердзіць ягонае алібі. Але гэта яшчэ болей ускладняла Ярусю задачу. Ён уявіў, як зараз гневаецца падпалкоўнік, што няма пад рукой начальніка крымінальнага вышуку. Нічога, ёсць пад рукой Куско і ён ведае ўсе дэталі. Тым больш калі столькі ўжо наехала спяцоў з вобласці. І, пэўна, са сталіцы. Крадзеж зброі — гэта не жарт. А калі завязаны ён з матацыкламі, машынай, магазінам. Цікава, як у суседніх раёнах. Не можа гэты хітрун ці хітруны дзейнічаць толькі ў адным раёне. Гэта ты так думаеш, а як ён думае — невядома. І ўсё-ткі несумненна, што мае нейкае дачыненне да геолагаў. Пальчатка іхняя, менавіта з ёй хадзіў на магазін. Трэба тут усё агледзець, падумаць...

А сонца пякло, і вада з лужын знікала ў зямлю як праз сіта. Было парна ў машыне нават з адчыненымі вокнамі.

— Будзе дождж, мусіць,— сказаў Ярусь.

У лагеры Матузавец скінуў з сябе боты, зняў штаны і паклаў на ганак вагончыка. Потым ватоўку вынес з машыны. Пераадзеўся ў чыстае. Прысеў на ганак і закурыў.

— Вось так і было.

— Пальчаткі былі ў ватоўцы?..

— Так...

— Да вас хто падыходзіў, размаўляў?..

— Пальчук выйшаў з вагончыка. Стаяў ля мяне...

— І я з табой размаўляў,— пачуўся голас Сяргея, які аднекуль выскачыў раптам, нібы з-пад вагончыка.— Забыўся... Я таксама да цябе падыходзіў.

— Падыходзіў і размаўляў,— сказаў Матузавец.— Сапраўды, зусім забыўся.

— Не хвалюйцеся, вы не спяшайцеся,— супакойваў яго Ярусь.

— Ну, падходзіў яшчэ Іван Яўсеевіч,— азірнуўся Матузавец на Насонава.

— Мо і падходзіў,— нервова махнуў галавой той.— Усе ж мы тут адзін ля аднаго. Мо і таксама з Анатолем размаўлялі. Тут за дзень часам так нагаворышся, што забудзеш сваё імя, не толькі што...

— Таварыш капітан, таварыш капітан,— неспадзеўкі паклікаў Яруся вадзіцель, ён трымаў у руцэ трубку ад рацыі. Гэтая рацыя ў машыне пастаянна псавалася, і Ярусь нават не спадзяваўся на яе. К канцу года абяцалі на машыны новыя рацыі, нібыта больш дасканалыя. Вось так і зладзі злачынца: машына ледзь рухаецца, бензіну не хапае, і рацыя то хрыпіць, бы задушаная, то маўчыць зусім. Надзіва ясна ён пачуў з трубкі голас начальніка райаддзела.

— Ну што, знайшоў?

— Пальчатку?

— Злодзея!

— Пакуль не.

— Дык чаго там сядзіш. Едзь зараз жа сюды. Тут панаехалі і з Мінска, і з вобласці, што мне аднаму з імі цяжка. Хоць што высветліў? — дапытваўся ён.

— Тое-сёе. Калі прыеду, далажу. Праз паўгадзіны выязджаю.

— Не марудзь... Сёння ўначы абкралі магазін у Старых Пясках. Зразумеў?

— Зразумеў...— гэта навіна, канечне, уразіла Яруся, і ён спытаўся: — Шмат узяў?

— Амаль той самы асартымент, што і ўчора. Так што не затрымлівайся.

Цяпер ён можа ўпэўнена сказаць сабе, што гэта «свой» злодзей. Проста нейкая паталагічная цяга да матацыклаў. Няўжо гандлюе запчасткамі... Так, значыць, да Матузаўца падыходзілі і Пальчук, і Сяргей, Насонаў таксама. А як ягонае прозвішча? Чаму я не запісаў і не спытаў нават. Пальчатка засланіла ўсё святло ўваччу і забрала розум у чалавека. А дзе іхнія астатнія людзі? Хто быў яшчэ ў той вечар?

— Іван Яўсеевіч, а дзе вашы астатнія людзі?

— Яны, Алесь Пятровіч, ужо тыдзень начуюць ля Паслаўскага возера. Туды семдзесят кіламетраў...

— Гэта ведаю. Скажыце, Сяргей, як ваша прозвішча?

— А вы ж пісалі ў пратаколе, таварыш капітан...

— Сапраўды... Напомніце, запішу ў блакнот. Бо ўсіх запісаў, толькі пра вас забыўся.

— Калі ласка. Сяргей Аляксандравіч Нырко,— азваўся той.

— Ага, добра, добра...

Усё, трэба ехаць, нічога больш, чым сказалі, ён тут ужо не даведаецца. Ярусь акінуў вокам увесь лагер, падумаў, што зручнае месца выбралі геолагі. Рэчка блізка і лес вакол. Дарога побач.

— Мо хто з вас у той вечар бачыў у лагеры чужога чалавека? Гасцей не было? — спытаў ён.

Чужых у лагеры тады не было. Не бачыў нікога ні Насонаў, ні Сяргей, ні Матузавец. Аднак пальчаткі зніклі адсюль. І нехта ж іх занёс ажно ў вёску і згубіў ці спецыяльна кінуў ля магазіна. Пакуль было незразумела, хоць Ярусь ужо сябе ўпэўніў: трэба яшчэ па лагеры пахадзіць, пагаварыць з геолагамі. А раптам успомняць нешта важнае. Паабяцаўшы праз дзень-другі заехаць у лагер зноў, Ярусь рушыў ад геолагаў назад у райцэнтр.

## 12

У начальніка райаддзела ён даведаўся, што ў трох бліжэйшых да іх раёнах таксама былі крадзяжы ў магазінах. І там разам з астатнімі рэчамі бралі кожны раз, хоць дробязную, запчастку, якая мела дачыненне да матацыкла. Гэта былі рухавікі, бензабакі, гумавыя кіхі ў колы. Уначы ў магазіне ў вёсцы Старыя Пяскі ўзялі разам з каньяком, адэкалонам і двума мужчынскімі гарнітурамі матацыклетны ланцуг. І тут была сапсаваная сігналізацыя. У райпа нават і пальцам не паварушылі, каб наладзіць яе. Каб жа не ведалі, падумаў Ярусь, і званілі ім, і паперу паслалі, і ніякіх змен. Мо каму ў райпа выгадныя гэтыя крадзяжы, спісаць на іх хочуць свае ўласныя? Бывае і такое, некалі нават сам расследаваў выпадак, калі загадчыца магазіна крала ў сваім складзе, а потым падпаліла яго. Тут, канечне, іншая сітуацыя, зусім іншая...

У кабінеце начальніка райаддзела было некалькі палкоўнікаў і падпалкоўнікаў з абласнога ўпраўлення і з Міністэрства ўнутраных спраў рэспублікі. Седзячы з імі за адным сталом, Ярусь сябе адчуваў трохі ніякавата. Дый не па сабе было ад весткі, што загадам

міністра створаны групы пошуку злачынца, які ўкраў зброю са школы. Гэтым жа загадам аб'ядноўваліся сілы міліцыі чатырох суседніх раёнаў. Перакрыты ўжо ўсе дарогі, і патруляваць іх будуць і ўранку, і ўначы. Ярусь трапіў у групу палкоўніка Казючыца. Якая розніца каму падначальвацца, абы хутчэй злавіць злачынца. Столькі людзей сабралі, а тэхнікі! І ніякіх вынікаў: усё роўна як іголка ў стозе сена знікае. Пэўна, зараз стог перабралі б па травінцы, а іголку знайшлі б. А гэта чалавек і столькі рэчаў з ім.

— Далажыце, таварыш Ярусь, аб сваёй паездцы ў Лысагорскае лясніцтва і ў геалагічную партыю,— папрасіў палкоўнік Казючыц, які быў сёння ў цывільным гарнітуры і здаўся яшчэ даволі маладым чалавекам. Толькі сіваватыя былі скроні. Летась зімой ён узначальваў групу па арышце небяспечнага рэцыдывіста, які забіў жанчыну і, схаваўшыся ў кватэры, адстрэльваўся з абрэза. Казючыц быў тады паранены і месяцы два лячыўся ў шпіталі.

Ярусь, стоячы, хоць яму дазволілі сядзець, расказаў, як быў у леснікоў, а пасля ў геолагаў. Гісторыя з пальчаткамі Матузаўца ўсіх зацікавіла. Чарнявы незнаёмы падпалкоўнік абурыўся, чаму Ярусь не арыштаваў Матузаўца. Мауляў, нічога не здарылася б, каб трошкі той пасядзеў у камеры. Затое ўжо дакладна ведалі б, мае ён дачыненне да крадзяжу альбо не.

— Я магу і зараз сказаць, што Матузавец не вінаваты,— стаяў на сваім Ярусь.— У яго ёсць алібі. У той час, як быў абкрадзены магазін, ён быў у лагеры, і гэта могуць пацвердзіць сведкі.

— Так, так,— падтрымаў яго палкоўнік Казючыц,— я згодзен з Ярусем. Іншае, што з геолагамі яшчэ трэба папрацаваць. Лічу, хай Ярусь і вядзе іх далей. Тым больш мая група будзе дзейнічаць тут, у раёне...

— Капітан Ярусь вопытны супрацоўнік, у яго амаль няма нераскрытых спраў,— нечакана ўставіў слова і начальнік райаддзела. Не спадзяваўся гэтага пачуць ад яго Алесь, бо ён толькі крытыкуе крымінальны вышук. Бач, пахваліў на гэты раз. Прыемна пачуць і ад свайго начальніка, што ты вопытны супрацоўнік. Наконт нераскрытых спраў ён ужо занадта. Дагэтуль не знайшоў, хто абрабаваў зімой Аўгінню Петравец у двары яе ўласнага дома за сто метраў ад міліцыі. Ажно няёмка сустракацца з жанчынай. Горад невялікі, і хочаш ці не,

але калі-нікалі даводзіцца паглядзець ёй у вочы. Сорамна глядзець і тым больш размаўляць. Усю, мабыць, страціў ён павагу ў яе. Вось табе і вопытны супрацоўнік. На жаль, ёсць не менш вопытныя крымінальнікі, колькасць якіх не змяншаецца чамусьці. Адбудзе турму і — зноў за старое! А ты бегай за ім, высалапіўшы язык.

— Заўтра, Алесь Пятровіч, зноў вам да геолагаў. Яшчэ перагаварыце з усімі геолагамі. Бярыце з сабой лейтэнанта Куско. На сёння ўсё... Да ведама, таварышы. Раённае свята вырашана адзначыць трохі пазней. Разумееце, ахвяраваць людзьмі не маем права. Ніхто не гарантуе, што дробнакаліберныя вінтоўкі не выстраляць. У мяне ўсё.

Вось і дзень скончыўся, думаў Ярусь, ідучы ў кабінет. А зроблена шмат ці не надта — пакуль невядома.

— Алесь Пятровіч, капітан Ярусь,— пачуў ён крык дзяжурнага.— Жонка званіла і прасіла, каб раней пад'ехаў дахаты.

— Дзякуй. Абавязкова,— са свайго тэлефона пазваніў дамоў, але жонкі не было яшчэ. Значыць, і сын у дзіцячым садзіку. Мо ён захварэў, ці што з ім здарылася, занепакоіўся Ярусь. Урэшце паедзе ён і сапраўды дахаты. Усё роўна машына ўжо заведзена і за кожным магазінам у раёне назіраюць. Пабудзе дома з гадзіну, пераканаецца, што ўсё нармальна, і вернецца ў аддзел.

Ён паклаў пісталет у сейф, прыбраў туды ж са стала паперы. На вуліцы перад райаддзелам спыніўся, мяркуючы, хто б падкінуў яго дамоў на машыне. На двары пуста, усе машыны з патрулямі на дарогах. Вырашыў: пайду па вуліцы і мо хто знаёмы на машыне спаткаецца і падвязе. Да мікрараёна, дзе ягоная кватэра, ісці пешшу паўгадзіны, а то і ўсе сорак хвілін. Не менш. А яму праз дзве гадзіны таксама на патруляванне. Мо што з сынам ці жонкай, ці не патрэбна якая дапамога?

І ўсё-ткі яму шанцавала: пад'ехаў да райаддзела «Масквіч», у ім незнаёмы падпалкоўнік, пэўна, з камандзіраваных, і ці не з Мінска, бо амаль усіх у абласным упраўленні ведаў. За рулём маўчун сяржант. Падпалкоўнік пайшоў да гасцініцы, а Ярусь — да машыны. Куды едзеш? Нікуды, з вамі праз дзве гадзіны патрулюем дарогу Мышкі — Старыя Пяскі. Часам для радасці мала трэба, сеў у машыну, і, здаецца, зніклі перажыванні,

непрыемныя думкі. Праз колькі хвілін убачыць жонку і сына, пабудзе з імі хоць трошкі.

Як толькі пад'ехалі да дома, ён пачаў прагна ўзірацца ў постаці дзяцей, што гулялі на двары. Сына ўгледзеў ля пад'езда разам з такімі ж малымі. У яго руках была машынка, і ён гудзеў, надзьмуўшы шчокі. Жонка сядзела з суседкамі на лаўцы за тры крокі ад сына.

Дамовіўшыся з сяржантам, што праз колькі часу той забярэ яго, Ярусь застаўся з сям'ёй. Удзень жонка была з сынам ва ўрача, і яе супакоілі: страшнага нічога, трохі пачырванела горла. На ноч дасць малому цёплага малака з мёдам і таблетку стрэптацыду. Звычайна такое лячэнне дапамагала. Недзе, мабыць, прадзьмула скразняком.

Сёння жонка была лагодная і не сварылася, і Ярусь прыкмеціў, што яна пазірае на яго са спачуваннем. Канечне, шыла ў мяху не схаваеш. Няйнакш увесь раён толькі і гамоніць аб крадзяжы вінтовак са школы. Дый пра магазіны ведаюць людзі. Такая інфармацыя распаўсюджваецца надзвычай аператыўна.

Яны разам павячэралі, пасля Ярусь дапамог жонцы пакласці сына спаць. Пасядзеў ля яго, расказаў казку. Яшчэ перакінуліся слоўцам з жонкай, а за акном ужо засігналілі: сяржант быў пунктуальны, прыехаў хвіліна ў хвіліну.

Ужо ў машыне ўспомніў, што пісталет пакінуў у сейфе. Павагаўся: ехаць у аддзел ці не? Часу заставалася мала — ім хутка быць на дарозе. Калі паедуць яшчэ ў райаддзел, спозняцца. І толькі за горадам ён спытаў у сяржанта, ці той са зброяй. Не, не браў. Ладна, супакоіў сябе Ярусь, абыдземся.

Дарога Мышкі — Старыя Пяскі была такая ж, як і амаль усе дарогі ў раёне, паўразбітыя гравійка. Абапал яе рос лес. У гэтыя мясціны Ярусь з жонкай ездзіў летась у грыбы. Назбіралі два кашы баравікоў і паўвядра брусніц. Палову грыбоў пасушылі і ўсю зіму елі суп з грыбамі. Смаката, лепш за якія прысмакі. І сёлета няблага б назбіраць, калі будуць. Зрэшты, для грыбоў цяпер былі спрыяльныя ўмовы: вільгаці хапала і сонца прыгравала ўжо, не шкадуючы сваёй цеплыні. Яны ж не кожны год, хоць ёсць майстры, якія заўсёды прыязджаюць з лесу з поўнымі кашамі.

Яны памалу рухаліся па дарозе, і Ярусь пільна ўглядаўся ўперад, азіраўся па баках. Транспарту ўжо

амаль не было. Праехаў самазвал з калгаса імя Прытыцкага, паспеў Ярусь прачытаць надпіс на дзверцы кабіны. У кузаве было сена, зацягнутае з усіх бакоў вяроўкамі. Потым мільгнуў інвалідскі «Запарожац», дзядзька ехаў з цёткай. І надоўга сціхла дарога.

Сонца ўжо амаль села і чырвонай вялізнай плямай накрыла ля далягляду лес. І, здалося, ажно адтуль да дарогі ахапіла сваёй ружовасцю прастору.

Рухавік машыны працаваў роўна і ціха, у салоне яго ледзь чуваць. Ярусь высунуў з акна галаву, падставіўшы пад цёплае, вільготнае паветра. Неба было без хмар, цёмна-блакітнае і паказвала, што і назаўтра дзень можна чакаць без дажджу.

Яны былі ўжо недзе пасярэдзіне дарогі, як Ярусь убачыў справа прасеку ў лесе, шырынёй не менш метраў дзесяці — пятнаццаці. Яе зрабілі, мусіць, не надта даўно, спілаваныя дрэвы ляжалі на ёй упоперак, толькі без галін, амаль гатовыя бярвенні.

— Навошта гэта прасека? — сказаў сам сабе.

— Лінію электраперадач у 220 кілавольт будуць узводзіць,— адказаў на пытанне сяржант.

— А... Зразумела...

За вёскай Мышкі яны павярнулі і паехалі ўжо добра знаёмай дарогай назад. Хуткасць невялікая, кіламетраў сорак у гадзіну. Спяшацца пакуль не было куды. І Ярусь па рацыі пагаварыў з дзяжурным па райаддзеле. На ўсіх дарогах было спакойна, толькі ля Вайцяшына затрымалі нецвярозага матацыкліста. Працуе механізатарам у калгасе імя Кірава, узрост — пяцьдзесят гадоў. Забралі правы, аштрафавалі і адправілі дахаты. Гэтага яму дзяжурны не казаў, але Ярусь падумаў так.

— Слухай, спыніся. Пастаім трохі,— папрасіў сяржанта. Той затармазіў, і яны выйшлі з машыны. Колькі яшчэ разоў сёння праедуць ад Мышак да Старых Пяскаў і назад — палічыць цяжка. Цяпер да канца жыцця запомніць гэту дарогу. Зрэшты, так здаецца, бо міне крыху часу і штосьці іншае затлуміць галаву, мо больш значнае.

Заўтра на золаку ён паедзе да геолагаў, будзе апытваць іх. Анатоль Матузавец... Вочы ў яго былі напалоханыя, спачатку вельмі здзівіўся. Жанаты, двое дзяцей у Мінску. Трыццаць пяць гадоў... Начальнік партыі Насонаў Іван Яўсеевіч... Пад пяцьдзесят ужо. Маладзейшы за ўсіх Сяргей Нырко. У іх ён прафорг. Што ён

робіць у партыі як узрыўнік?.. Дзе ягоная ўзрыўчатка? Усё гэта заўтра праверыць, высветліць... Мо Куско паслаць да астатніх геолагаў на возера? Але ні Насонаў, ні Сяргей, ні Матузавец, ні Пальчук не ўспомнілі, што хтось адтуль прыязджаў. Маглі забыць...

Цішыня ў лесе, каб не гуд рухавіка, забыў бы, што на службе. Слабенькі ветрык калыша дрэвы, пахне чамусьці сенам, хоць побач не відаць сенажаці. Аднак самы час касіць. Мінулі дажджы, і зараз сена будзе сохнуць на вачах.

Нешта ў паветры далёка-далёка пачынае дрыжаць, нібы нацятая струна. Гук робіцца званчэйшы, мацнейшы, і Ярусь, а разам з ім і сяржант насцярожваюцца. Яшчэ хвіліна, і абодва разумеюць, што гэта рухавік. Кіламетраў дзесяць ад іх ці бліжэй, але гук узрастае. І сумненняў ужо няма: у бок Мышак імчыць матацыкл.

Ярусь бярэцца рукой за дзверцы, каб сесці ў машыну. Сяржант ужо за рулём. Нейкі момант Ярусь вагаецца, а затым выходзіць амаль на сярэдзіну дарогі і напружана глядзіць у той бок, скуль вось-вось з-за павароткі выскачыць матацыкліст. Відаць, што едзе ён на вялікай хуткасці, бо гул нарастае імкліва. У гэтай лясной цішыні проста цісне на вушы.

— Будзеце спыняць? — пытаецца сяржант.

— Пабачым...

Ужо чуваць, як магутна ракоча рухавік. Здаецца, чуваць шоргат колаў на гравійцы. Няйнакш ззаду камяньчыкі ляцяць фантанам. Многа пасыпалі свежага гравію, ён яшчэ не ўтрамбаваўся суцэльным настам. Раве матацыкл, раве. Нарэшце бліснуў з-за павароткі чырвоны шлем. Чамусьці адразу звярнуў увагу на шлем. Ідзе на шалёнай хуткасці. Што гэта, нават не збіраецца тармазіць! Не бачыць міліцыі...

Ярусь махнуў паласатай палкай ДАІ адзін раз, другі. Ага, убачыў, замаруджвае хуткасць. Усё бліжэй і бліжэй. На твары вялізныя чорныя акуляры. Аднак бачна, што за рулём малады хлопец. У чорнай ватоўцы, на нагах кірзавыя боты. «Няўжо?..— мільгнула ў галаве думка.— Няўжо ён?..» Матацыкл памалу ўжо коціцца і вось-вось спыніцца каля яго. Усё цішэй і цішэй гудзе рухавік.

Ён спыніўся метраў за пяць ад Яруся. Рукі на рулі, ногі ля педаляў, чакае.

— Куды едзем? — яшчэ здалёк, ідучы да яго,

сказаў капітан. Адказу не пачуў, толькі нечакана зароў рухавік, і матацыкл мо за паўметра ад Яруся, набіраючы хуткасць, паляцеў прэч ад яго.

— Стой, стой! — закрычаў ён, рука — у кішэню, а там пуста. Пісталет у райаддзеле ў сейфе. Дый, каб і быў, страляць усё роўна нельга. Яшчэ невядома — гэта злачынец ці проста напалоханы міліцыяй чалавек. Бывае менавіта ад боязі ўцякаюць. Але ж надта ўпэўнена трымаўся ён за рулём.

— Хутчэй, таварыш капітан, хутчэй,— крычаў сяржант. Хапіла яму долі хвіліны, каб ускочыць у машыну. І яны рванулі ўслед уцекачу.

Адлегласць паміж імі была метраў сорак-пяцьдзесят, і як ні цісну ў на газ вадзіцель, але яна павялічвалася. Адна надзея на паваротку, якая праз кіламетр. Там злева агромністая яма, былы кар'ер з-пад пяску, запоўнены вадой. Калі ён не зменшыць хуткасць, дык наўрад ці ўтрымае матацыкл, яго павінна сарваць з дарогі ў яму.

— Ну, націсні, націсні! — шаптаў Ярусь.— Яшчэ трошкі, яшчэ...

І тут адбылося тое, чаго яны ніяк не чакалі. У галаве не змяшчалася, што такое можна зрабіць. Неверагодна, але факт, які пасля Ярусю давялося дакладваць начальству: матацykліст раптоўна павярнуў з дарогі на прасеку. І, дадаўшы яшчэ газу, узняўшы воблакі дыму, проста, здалося, паляцеў па бярвенні, якое ляжала ўпоперак.

Ім толькі засталося выскачыць з машыны і слухаць магутны гул матацыкла. І ў паветры адчуваўся непрыемны пах дыму. Матацыкліст знік у лесе, як прывід. Вось цяпер Ярусь пашкадаваў, што ў яго не было пісталета. Ён не сумняваўся ўжо, матацыкліст — злачынец. Заўтра, канечне, чакай непрыемную размову з начальствам. Падпалкоўнік ужо не пахваліць перад гасцямі з вобласці і сталіцы. Мінімум вымову забяспечыў сабе, ах, шкада, шкада, перажываў Ярусь.

## 13

Мусіць, раніцай падпалкоўнік успомніў усе пралікі і памылкі, якія зрабіў Ярусь за час, што працаваў у райаддзеле. А ён яшчэ лічыў, што ўсё кепскае забы-

ваюць. Не, выходзіць усё добрае забылі, а кепскае пакінулі на рахунку. Карацей, вельмі яскрава дзейнічаў прынцып: я начальнік — ты дурань, ты начальнік — я дурань. Мусіць, і па сцяне размазаў бы яго начальнік райаддзела ў прысутнасці ўсіх чыноў, калі б не падтрымаў Яруся палкоўнік Казючыц.

— Тое, што Ярусь быў без зброі — гэта адно, а тое, што не страляў — гэта іншае,— сказаў ён.— Лічу дзеянні капітана правільнымі. Факт з матацыклістам сцвярджае: трэба аперацыю праводзіць і далей. Мо хіба павялічым колькасць міліцыі на дарогах. У гэту ноч крадзяжоў не было. Мусіць, злачынец адчуў, што мы яго шукаем і занерваваўся. Я ўпэўнены, хутка выйдзем на ягоны след. Вы, таварышы, едзьце да геолагаў,— звярнуўся палкоўнік да Яруся і Куско.— Яшчэ раз прасачыце, дзе быў у тую ноч кожны з іх. Як мага ўважлівей...

...Дарогай, мо кіламетраў пяць, над іхняй машынай ляцеў самалёт, невялічкі, белакрылы, з тых, што называюць кукурузнікамі. То ледзь не чапляе крыламі дрэвы, то ледзь відзён у небе.

— Што ён прычапіўся да нас? — спытаўся вадзіцель.— Мо шукае матацыкліста...

— Пажарнікі,— сказаў Куско.— Учора гарэў лес пад Матаровам, а пазаўчора на Вялікай гары. Колькі тут, як дождж спыніўся, а ўжо гарыць. Лета...

Ярусь убачыў, што самалёт нахіліўся ў правы бок да азёраў, пачаў змяншацца ў памерах. Яго стала зусім не відаць.

Ці будуць яны ўсе ў лагеры, думаў пра геолагаў Ярусь. Я ж іх толькі папрасіў, каб былі на месцы, а прымусіць не мог. Зноў туды-сюды ездзіць па лесе, траціць час. Значыць, у гэту ноч ён не выйшаў на паляванне, а мо я перашкодзіў яму, спаткаўшыся на дарозе. Магчыма, і так.

Дарога падсохла, і яны хутка дабраліся да лагера геолагаў. Яшчэ з машыны Ярусь прыкмеціў: дзверы ў вагончыку начальніка партыі замкнёныя. На ганку сядзеў і курыў Матузавец. Здалося, за гэты час, што не бачыліся, ён схуднеў, ажно завастрыўся і так доўгі нос. Пэўна, моцна перажываў, і Ярусь нават паспачуваў яму. Пачуўшы гул машыны, выйшаў з вагончыка Насонаў, трымаючы ў руках нейкую кніжку і акуляры.

Дзе ж твае людзі, начальнік, ведаў, што прыедзем,

узлаваўся Ярусь, але нічым не паказаў свайго незадавальнення. Крычы, злуй, але нічога не зменіш пакуль. Кіўнуўшы галавой у знак прывітання, ён прайшоў па лагеры, спыняючыся ля кожнага вагончыка. Убачыў замок на хлеўчуку, спытаў:

— А дзе Сяргей Нырко?

— Нейкія накладныя яму трэба было тэрмінова здаць па ўзрыўчатцы... Гэта ж узрыўчатка,— апраўдваўся Насонаў.— Я ж не мог яго затрымліваць.

— Дзе Пальчук?

— Іосіф Пальчук...— зачырванеў, як хлапчаня, Насонаў.— Іосіф Пальчук на сваім участку. Ён заявіў, што яго пальчаткі ў кішэні, таму няма патрэбы бачыцца болей з міліцыяй. Маўляў, калі спатрэбіцца, выклічаце позвай. Я ж не мог трымаць іх сілком,— развёў ён рукамі.— Вось мы і засталіся з Матузаўцом.

— Які вы ўрэшце начальнік, што не здольны загадаць ім застацца ў лагеры? — абурыўся Куско.— Мы ж не дзеля жартаў прыехалі сюды. Унь, сабралі міліцыю з чатырох раёнаў... Злачынца ўкраў зброю, людзі могуць загінуць, а вы...

— Я разумею, разумею,— бездапаможна хітаў галавой Насонаў.— Пальчуку вельмі важна скончыць сваю работу, ён збіраецца абараняць на гэтым матэрыяле доктарскую...

— Значыць, абы доктарская, а людзі — смецце, няхай гінуць,— не ўтрымаўся і Ярусь.

— Навошта вы ўжо так? — запярэчыў Матузавец.— Не трэба аб'ядноўваць розныя паняцці і не ўтрыруйце, калі ласка. Мо я і вінаваты, што зніклі мае пальчаткі, але пры чым тут адно да аднаго? Пальчук — сумленны чалавек і геолаг. Што ведае, ён вам расказаў, больш нічога дадаць не можа. Іншае са мной... Пальчатак няма, таму і сяджу тут. Калі б былі, я таксама пайшоў бы на працу... Ідзе следства, і я са сваімі пальчаткамі, мусіць, важная дэталь у ім. Правільна?

— Канечне, Анатоль Антонавіч.— Ярусь ужо шкадаваў, што распачалі гэтую спрэчку. Трэба было адразу спыніць Куско. Хоць нічога страшнага: трохі паспрачаліся, дый усё.

— Што, зноў будзем успамінаць, дзе хто сядзеў і стаяў? — спытаўся Насонаў.

— Будзем... Мяне яшчэ цікавіць вось што: дзе звычайна знаходзіцеся вечарамі, пасля работы?

— Ну як дзе, тут, у вагончыках.

— Чым займаецеся?

— Ну чым... Гуляем у шахматы, кнігі чытаем. Анатоль часта грае на гітары. Разам спяваем.

— А вось не зусім, прабачце, далікатнае пытанне. Ніхто не ходзіць у вёскі да жанчын? Прабачце, але і гэта трэба нам ведаць.

— Мне здаецца, ніхто...— недаўменна паціснуў плячыма Насонаў.

— Чаму, Іван Яўсеевіч? Сяргей Нырко амаль штовечар ходзіць да сяброўкі ў вёску,— сказаў Матузавец.

— А ў якую?

— Не ведаю. Неяк няёмка пытацца. Такая справа...

— А вы не памятаеце, ці быў ён у тую ноч у сваёй сяброўкі?

— Здаецца, быў... А мо і не... Нешта не помню. Чакайце, мы да гадзін дзесяці з ім гулялі ў шахматы. Потым з Пальчуком... А ён адышоўся ад нас. Так, так, казаў, што, магчыма, пойдзе да дзяўчыны. Але сумняваўся, казаў, што за дзень вельмі стаміўся.

— У Сяргея матацыкла няма? — спытаўся Куско.— Ці машыны?

— Не,— адказалі і Насонаў і Матузавец.

— Ён не казаў, калі вернецца ў лагер?

— Думаю, праз гадзіны дзве-тры, не раней.

— А на чым ён паехаў?

— У нас ёсць «уазік». Звычайна ездзім на ім. А сёння Сяргей пайшоў на аўтобус. Ён спыняецца за тры кіламетры адсюль. «Уазік» паехаў на Паслаўскае возера, павёз прадукты і розныя матэрыялы. Дарэчы, і пальчаткі. Думаю, не супраць?

— Не...— а калі і супраць, ужо не вернеш назад. Што рабіць, сядзець тут і чакаць тры гадзіны Сяргея Нырко альбо ехаць да Пальчука? Мусіць, трэба ехаць, падумаў Ярусь. За гэты час яны паспеюць вярнуцца ў лагер.

Ён пачуў, што запішчала рацыя. Іх выклікаў дзяжурны. Што яму спатрэбілася, мо нешта важнае? Зараз у аддзеле, пэўна, акрамя дзяжурнага і начальніка пашпартнага стала, наўрад ці быў хто. Усе на аперацыі, ездзяць па дарогах, шукаюць матацыкліста.

Вадзіцель падняў трубку, паслухаў і махнуў рукой, клічучы Яруся.

— Ідзі, пагавары,— сказаў ён Куско. Той адразу патупаў да машыны. А праз хвіліну паклікаў ужо капітана.

## 14

— Дзяжурны перадаў, Алесь Пятровіч, у квадраце нумар сем лётчык заўважыў вогнішча. Там пабылі ўжо леснікі і запатрабавалі міліцыю. Нам загад неадкладна ехаць да леснікоў. У Лысагорскае лясніцтва.

І зноў — машына. Ярусь падумаў, што апошнім часам ён толькі ездзіць і ездзіць. Каб толькі яна не сапсавалася, бо ўжо надта моцна пачаў чмыхаць рухавік.

— Што леснікі ўбачылі, дзяжурны не казаў?

— Не. Усё на месцы. Мо дарэмна пакінулі геолагаў. Мне здаецца, што нехта з іх мае дачыненне да крадзяжу. Чуе мая душа.

— Тое, што чуе душа, у якасці доказу не прыкладзеш да справы.

— Гэта канечне. Але вось адчуваю, Алесь Пятровіч. Вы не адчуваеце?

— Адчуваю таксама,— пацвердзіў Ярусь.— Нічога, праз гадзіны дзве мы вернемся ў лагер. І будзем распрацоўваць гэтую версію. Нам далі з табой такую магчымасць.

— Думаю, што ён залёг у бярлогу, убачыўшы, колькі міліцыі падняў на ногі. Дзе-небудзь спіць на баку і не думае пра нас. А мы, як кот вакол свайго хваста, скачам, скачам і не можам злавіць яго.

— Нічога, лейтэнант, зловім. Не сёння, дык заўтра...

— Не заўтра, дык паслязаўтра,— нецярпліва перапыніў Куско.— Ён гэтак можа яшчэ вельмі доўга ездзіць на сваім матацыкле.

— Не паездзіць,— сказаў як адрэзаў Ярусь, даючы зразумець, што больш гэта абмяркоўваць ён не мае намеру.

Відаць, ужо зусім усталявалася надвор'е. На небе ні хмаркі. Сонца смаліць у вочы, глядзець немагчыма. На дарозе павысыхалі лужыны. Яшчэ дзень-другі, і паляціць з-пад колаў пыл. Вось табе і два тыдні дажджу, думаў Ярусь. Умомант вільгаць праглынуў шэранькі пясочак.

Не даязджаючы да лясніцтва, на скрыжаванні да-

рог, спаткаў іх на матацыкле ляснічы. З ім былі яшчэ двое леснікоў, са стрэльбамі ў руках.

— На паляванне сабраліся? — пажартаваў Куско.

— Але ж, туды,— крывавата ўсміхнуўся ляснічы,— і хлопцаў узяў з сабой.

— Што здарылася? — павітаўшыся, спытаў Ярусь.

— Лётчык скінуў нам вымпел на двор,— узбуджана казаў ляснічы.— У ім паперка: у сёмым квартале заўважыў дым. Як ведаеце, зараз пажаранебяспечная сітуацыя. Сочым, каб пажараў не было. Зірнуў на карту, а ў гэтым месцы, дзе паказаў лётчык, у сёмым квартале балота. Наогул, ні я, ні мае леснікі там ні разу не былі. Меліярацыя не дабралася яшчэ туды. Ну, дык паслаў я на машыне хлопцаў, каб паглядзелі, ці не пажар. Ажно бачаць — не, невялікае вогнішча. Але дым з самалёта лётчык заўважыў... І, ведаеце што,— зямлянка...

— Якая зямлянка? — не зразумеў Ярусь.

— Звычайная, накшталт партызанскай, але на замку. І вогнішча. Мы тут і занепакоіліся, ведаючы, што шукаеце злачынца.

— Правільна зрабілі, едзем. І як найхутчэй.

— Тут па лесе надта не пагоніш,— сказаў ляснічы.

— Кіламетры за два ад балота спынімся,— папярэдзіў яго Ярусь.

Няўжо гэта ён, а чаму і не? Трэба ўлічваць зараз любы варыянт, якім бы неверагодным ён ні здаваўся. Зброя можа стрэліць ў любую хвіліну. І гэта будзе на тваім сумленні, на тваім сумленні, ліхаманкава думаў Ярусь. Памацаў у кішэні пісталет, на гэты раз ён быў на месцы. Хто ведае, хто ведае... Лепш, каб ён і застаўся ляжаць у кішэні.

— Зброя з сабой? — спытаўся ў Куско.

— З сабой,— сказаў той.— Учора чысціў і быў у ціры.

— Малайчына, малайчына,— пахваліў яго Ярусь і злавіў сябе на думцы, што неадчэпна глядзіць на матацыкл, які рухаецца спераду, чакае, калі ён спыніцца. Пэўна, амаль усе мускулы былі напятыя зараз. Ён быў зноў заведзены, нібы спружына. І, канечне, адчуваў, што зараз нешта адбудзецца важнае і небяспечнае. Усёй сваёй свядомасцю ён рыхтаваўся да гэтага.

Яны доўга ехалі па такіх сцежках, па якіх, мусіць, і папраўдзе даўно не хадзіла чалавечая нага. Вакол

шумеў, гойдаўся лес, і спявалі птушкі. Тут панаваў спакой. І калі заглухлі машына з матацыклам, іх з усіх бакоў ахутала цішыня. Здавалася, кожны крок быў чуцён вельмі далёка. Першым ішоў каржакаваты ляснік, які быў ужо на балоце, за ім, амаль дыхаючы ў патыліцу,— Ярусь, потым — Куско, ляснічы, ляснік і вадзіцель. Гэткім ланцужком яны рухаліся хвілін мо дзесяць.

— Чш-ш,— зашыпеў ляснік і прыпыніўся. Паслухаў і, мусіць, не пачуўшы нічога падазронага, рушыў далей. Пад нагамі захлюпала вада. Няйнакш, балота, падумаў Ярусь, ці не дайшлі ўжо. І, апярэджваючы яго пытанне, ляснік тыцнуў перад сабой.

— Глядзі, начальнік...

Ярусь угледзеўся, але спярша нічога не ўбачыў, акрамя хмызу і крываватых соснаў.

— Справа, справа!..— шыпеў у вуха ляснік.

Між кучаравай бярозай і нізкарослай сасной струменіўся кволенькі шэры дымок. Мусіць, вогнішча дагарала ўжо.

Ярусь узяў з сабой Куско і вадзіцеля-міліцыянера, загадаўшы леснікам заставацца на месцы, памалу пайшоў на гэты дым. Перад іх вачамі расхінулася палянка, узбалотак, на якім узвышалася зямлянка. На яе дзвярах вісеў чорны важкі замок. Ярусь падумаў, што недзе такі ён ужо бачыў, але зараз было не да ўспамінаў.

Перад зямлянкай дагарала вогнішча, побач нікога не відаць. Недалёка пад сасной стаялі адна на адной нейкія скрынкі.

— Будзем чакаць гаспадара,— сказаў Ярусь Куско і вадзіцелю.— Ты пад тую сасну, а ты — унь туды за бярозу. Легчы — і чакаць. Забрудзіце свае мундзіры,— агледзеў абодвух, ён сам быў у джынсах і лёгкім світэры, пад якім пісталета відаць не было.— Нічога, пачысціце.— Толькі скончыў гэтае слова, як пачуў недзе за зямлянкай трэск. Нехта ішоў сюды.— Хуценька!

Ён схаваўся за шырозным ядлоўцам. Азірнуўся, паглядзеў, ці паспелі легчы Куско з вадзіцелем. Абодва ў схованцы, як дамовіліся.

Трэск мацнеў, нават, здалося, чуваць крокі. Але сціхла раптам, хвіліна-другая. Зноў трэск, за дрэвамі мільгнуў чалавек. Вось ужо ён амаль увесь відаць, толькі твар схаваны за лапамі сасны. Прыпыніўся, слухае.

Адчувае небяспеку, баіцца. Значыць, вораг ён... Няўжо матацыкліст? Яшчэ сумненні ёсць, як гэта адразу не прыкмеціў: унь ля сасны матацыкл без колаў. «Іж», ці не з магазіна? Мо з тых, што ўкраў? Якая розніца. Бач, і сінія «Жыгулі» за ядлоўцам прыхаваў. Як гэта ён даехаў сюды па балоце, ну, спрытнюга! Ідзе, ідзе... Увага! Каб толькі Куско з вадзіцелем не выскачылі раней часу. Ага, разведку правёў, не заўважыў небяспекі. Выйшаў, азіраецца. Чакай, чакай, хто гэта? Вельмі знаёмае здалося Ярусю аблічча чалавека, які падышоў да зямлянкі. Каб не гэтая кепка, насунутая на самыя вочы і... Што такое?..

Чалавек неспадзеўкі падскочыў, нібы перапалоханы заяц, кінуўся да маладой сасоначкі і сарваў з яе вінтоўку. Божа, як гэта яны не заўважылі яе.

Грымнуў стрэл. Злачынец выстраліў па вадзіцелю. У таго тырчала з-за дрэва чырвоная шапка. Ярусь вылаяў сябе, што не загадаў Куско і вадзіцелю зняць шапкі, якія свяцілі тут бы ліхтары ўначы. Але як гэта ён адразу ўхапіў вокам небяспеку. Насцярожаны быў звер...

Як выстраліў злачынец, стрэльнулі і яны з Куско. Пасля далучыўся да іх і вадзіцель, мусіць, напалоханы. Куля сарвала шапку з яго галавы. Каб трохі ўзяў ніжэй, усё — хана, усадзіў бы кулю проста ў лоб. Гэта пасля ўжо яны гэтак ацанілі першы стрэл, а цяпер, хаваючыся за дрэвамі, спрабавалі ўзяць злачынца ў кальцо. Аднак не так проста было гэта зрабіць, стралок ён быў адметны.

Злачынец яшчэ колькі разоў стрэліў, і Ярусь пачуў, як над ягонай галавой свіснула куля, і зразумеў, што яго таксама бачаць ужо. Раптам страляніна спынілася. Ярусь больш смела і адкрыта выглянуў з-за дрэва і ўбачыў, што злачынец ліхаманкава круціць туды-сюды затвор у вінтоўцы. Няйнакш, заела яго. Злачынец быў як на далоні, і можна было лёгка падстрэліць яго. Аднак трэба ўзяць жывога, вырашыў Ярусь і больш упэўнена рушыў да свайго ворага. Рухаліся і Куско з вадзіцелем, дый нешта крычалі злева леснікі.

Злачынец нечакана скочыў да зямлянкі, пацягнуў замок, але пад кулямі не змог адчыніць, не вытрымалі нервы. Тады, хаваючыся за дрэвамі, кінуўся прэч адсюль.

— Прыкрый мяне! — крыкнуў Ярусь Куско і, не

спыняючы на хаду страляніны, шыбануў за ім. Бегчы было цяжка. Ногі правальваліся ў балоце, ажно пакуль не выбег на ўзбалотак. Там, адчуўшы пад сабой цвёрдую глебу, ірвануў колькі хапіла моцы. Даўно так не бегаў, толькі мільгалі перад вачыма дрэвы і спіна злачынца. Той азірнуўся, выскаліўшы зубы, як загнаны воўк. «Ну, зараз я цябе вазьму, вазьму!» — ліхаманкава думаў Ярусь. На тое, каб крычаць «стой», не хапала дыхання. Яшчэ і яшчэ падганяў ён сябе, ужо не чуючы, што за ім беглі Куско і вадзіцель. Яму трэба ўхапіць за гэту ненавісную спіну ў парванай кашулі, трэба! Здалося, ён скочыў як звер і закрычаў па-звярынаму. І ў гэтым скачку дагнаў уцекача, з усёй сілы стукнуў рукаяткай пісталета па плячы, і той з енкам і лаянкай паляцеў на зямлю. А на яго з размаху ўпаў Ярусь. Вокамгненна адзеў наручнікі, перавярнуў на спіну, тварам уверх. І толькі тады глянуў на твар... Пад ім ляжаў Сяргей Нырко, узрыўнік геалагічнай партыі. Ашчэраны рот, нібы застылы, анямелы позірк, у якім і страх, і здзіўленне, і нянавісць.

— Тваё сёння шчасце, лягавы,— прахрыпеў ён, ледзь варушачы языком, і ажно жылы выступілі на лбе ад напружання: ён спрабаваў яшчэ зняць наручнікі. Але дарэмныя былі ягоныя намаганні — жалеза было непадуладна яму. Знясілены, з крывой усмешкаю, здаецца, як назаўжды прыклеенай да вуснаў, зноў выдыхнуў:

— Тваё шчасце, лягавы, што не паспеў ускочыць у зямлянку...— і змоўк, адкінуўся спіной на чарнічнік.

— Ну і што, усё роўна была б табе хана,— абыякава-стомлена сказаў Ярусь, але словы Нырко ўстрывожылі яго. Дастаўшы ключы з кішэні злачынца, ён адамкнуў зямлянку і нібы трапіў у склад універсальнага магазіна, дзе, побач са скрынкамі каньяку і цукерак, ляжалі розныя запчасткі да матацыклаў, вопратка. Адразу ля дзвярэй, на невялічкім самаробным століку Ярусь раптам убачыў пакетны ўключальнік, ад якога адыходзіла ля дзесятка рознакаляровых тоненькіх правадоў. Адзін з іх выходзіў паверх парога і знікаў пад мохам. Ярусь пацягнуў яго, яшчэ надта не задумваючыся, навошта ён тут. Провад ляжаў неглыбока і паддаўся, вылез з-пад зямлі метраў на пятнаццаць. Да нечага ён быў, відаць, прымацаваны, канец знікаў у зямлі. Ярусь раскідаў рукою мох і ўбачыў прывязаную

да сасновага кораня маленькую скрыначку. Менавіта да яе быў прымацаваны провад. Раскрыўшы скрыначку, капітан жахнуўся, яму стала ніякавата, нават страшна. Ён адразу ўявіў, што магло быць, каб злачынец паспеў ускочыць у зямлянку. У скрыначцы была ўзрыўчатка, і провад злучаў яе з электрычным узрывальнікам. Вось які ўключальнік стаяў у зямлянцы на стале.

Ярусь адчуў, як пабеглі па целе дрыжыкі і забалела галава. Ён паглядзеў угору: праз галінкі дрэў ярка свяціла сонца, і блакітнае неба, здалося, ахутвала з усіх бакоў зямлю. Так пастаяў мо хвіліну, а мо і дзесяць, усё роўна як мінула вечнасць. Марудна, усё яшчэ трымаючы ў руцэ пісталет, падышоў да Нырко. Той павар'яцку ўсміхаўся:

— Эх, не даў ты мне пажыць як арыстакрату, капітан, не даў. Ненавіджу, ненавіджу! — закрычаў ён, а вакол спакойна шумеў лес, і чуваць было, як недзе зусім блізка садзіўся верталёт. Але дапамога Ярусю ўжо была не патрэбна. Усё як у банальным дэтэктыве, падумаў ён. Але ж гэта было жыццё: за два крокі з наручнікамі на руках ляжаў злачынец.

# Раман

# З ПЛОЦІ І КРЫВІ

## Частка першая

> У атамны век, у пластмасавы век,
> Век нянавісці і любві,
> Жыў сабе на зямлі чалавек —
> Не з пластмасы, а з плоці й крыві.
>
> *Уладзімір Караткевіч*

### РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

#### 1

Дзень выдаўся шэры, паветра было перанасычана вільгаццю. Аўгуст толькі выйшаў з пад'езда, як у яго адразу твар стаў мокры. Шмат людзей было з парасонамі, і ён падумаў, што, магчыма, дарэмна таксама не ўзяў парасона. Дамоў вяртацца не захацелася, не цукар, не размокне. Не надта холадна, восень пачыналася толькі. І пасля гэтай сырасці, дажджоў будуць і сонечныя дні. Колькі іх — іншае. Мінула лета, і чакай цяпер больш холаду, чым цеплыні.

Аўгуст быў у цёмна-шэрай з капюшонам курткі, якая не баялася дажджу, у чаравіках. І хутка яму нават зрабілася горача. Ён пашкадаваў, што не адзеўся лягчэй.

Аўгуст ішоў нетаропка. У яго быў адгул за суботу. У канцы месяца кепска з планам,

і ён па просьбе майстра адпрацаваў дзве змены. Сёння з раніцы вырашыў схадзіць у кіно. Да кінатэатра недалёка, і можна было дабрацца пехатой. Ён не спяшаўся, бо ўсё роўна на які сеанс ісці. На скрыжаванні вуліц доўга стаяў, чакаў, пакуль запаліцца зялёнае святло: ад цэнтра імчалі пажарныя машыны і «хуткая дапамога».

Твар стаў ужо зусім мокры, але Аўгуст не выцер яго, толькі правёў далонню па шчоках, нібыта здымаючы кроплі вады. Ягоная куртка пацямнела ад вільгаці. Чаравікі як усё роўна пацяжэлі.

Праходзячы скрыжаванне, Аўгуст паслізнуўся на мокрым асфальце і ледзь не ўпаў. Замінала яму жанчына з вялізнай сумкай. Ён не мог яе абысці, бо злева і справа ішлі таксама людзі. Нешта хацеў ужо ўзлавана сказаць і прамовіў слова «гэтыя», аднак якраз жанчына азірнулася, і Аўгуст убачыў маладую дзяўчыну з разгубленымі зялёнымі, як веснавое лісце, вачыма. Было відаць, што яна ледзьве трымае ў руках сваю сумку, і ён адразу замоўк. Колькі метраў яны ішлі побач, нарэшце ён, не гледзячы на яе, сказаў, пакашляўшы ў кулак, надта ж адчуваў сябе няёмка:

— Што ў вас там, цагліны?

Яна трохі какетліва зірнула на яго, павёўшы вачыма па высокай постаці, шырокіх плячах. Паставіла сумку на асфальт і пачала перавязваць на галаве бліскучую з балонні касынку. На лоб вылезлі светлыя пасмачкі валасоў, яна іх акуратна пахабрала, прыгладзіўшы двума пальцамі левай рукі.

— Бетон і жалеза...— вымавіла, шапялявячы неяк па-дзіцячы. Зноў паглядзела, нібы ацэньваючы, хоць ён і не заўважыў гэтага. Аўгуст стаяў у нерашучасці, не ведаючы, ці прапанаваць сваю дапамогу — а раптам адмовіцца і пасмяецца яшчэ? Дзяўчына сама падказала, выратавала яго:

— Мо паможаце?..

Яна глядзела сур'ёзна, хоць ён і чакаў усмешкі на твары.

— Ну дык што? — спыталася ўжо ўмольна.

Ён спадзяваўся, што яна будзе дарогай з ім гаварыць, але дзяўчына маўчала. Канечне ж, ён быў яшчэ благі знаўца псіхалогіі, тым больш жанчын.

Дзяўчына была і не такая ўжо маленькая, гэта яму здалося, калі яна, згорбіўшыся ад цяжару, трымала ў

руках сумку. Ростам яму па плячо. Аўгуст скоса паглядваў на яе і бачыў тонкі, востры нос, невялікі падбародак з карычневай радзімкай, акуратна крыху падфарбаваныя ружовай памадай вусны, не пульхныя і не тонкія.

— Мне на дваццаць сёмы, а вам? — сказала яна на аўтобусным прыпынку. Ён, памарудзіўшы хвілінку і вырашыўшы адмовіцца ад кіно, прагаварыў хуценька:

— Мне таксама...

— Значыць, мне пашанцавала,— усміхнулася, і Аўгуст па яе позірку адчуў: зразумела, што ён так сказаў знарок. Трэба было нешта гаварыць, але не знаходзілася слоў.

Яны з цяжкасцю ўбіліся ў перапоўнены аўтобус і апынуліся ў кутку салона. Сумку не было куды паставіць, і Аўгуст трымаў у руках, хоць было і нялёгка. Час ад часу, калі аўтобус тармазіў, дзяўчыну прыціскала да Аўгуста, і ён мармытаў: «Выбачайце». Яна зірнула на яго, ён убачыў, што ў вачах застыў смех.

— На наступным прыпынку я выходжу, а вы?

— І я выйду,— сказаў Аўгуст.

— Што б без вас я рабіла,— яна засмяялася, і здалося, што ўзрадавалася яго адказу.

Ён праштурхаўся да дзвярэй, адчуваючы яе за спіной. Неспадзявана для самога сябе, выходзячы з аўтобуса, падаў ёй руку.

— У гэтым доме я буду жыць,— яна паказала на доўгі шэра-блакітны дзевяціпавярховы дом, які стаяў далёка ад вуліцы ў полі пакуль адзінока, але побач з ім узвышаліся краны: будаваліся яшчэ дамы.

— Ці не пара нам пазнаёміцца? Галіна,— яна працягнула яму сваю тонкую руку. Аўгуст, асцярожна паціснуўшы яе, назваўся таксама.

Цяпер ён думаў, як і што сказаць, каб спаткацца зноў. Яна здалася яму вельмі прыгожай, усё было незвычайным: і голас, і твар, і фігура. Ён так упершыню падумаў пра дзяўчыну. Яму хацелася чамусьці пабыць з ёй як мага даўжэй.

Яна дазволіла Аўгусту данесці сумку да дзвярэй кватэры, якая была на другім паверсе. Моўчкі пастаялі: ён з апушчанай галавой, а яна з усмешкай на твары. Праз акно на лесвічнай пляцоўцы чуваць было, як узмацніўся дождж, зашумеў, густа забарабаніў па шкле.

— Будзем развітвацца,— сказала Галіна.— Дзякуй за дапамогу...

— Я... можна...— прамовіў Аўгуст, але на большае не хапіла духу.

— Вы хочаце сустрэцца? — вельмі проста запыталася Галіна.— Калі ласка. Адрас ведаеце. А вось мае тэлефоны.— Яна дастала з сумачкі маленькі блакноцік, напісала нумары тэлефонаў і, вырваўшы лісток, аддала Аўгусту.— Тут рабочы і хатні. Звaніце, буду рада. Дарэчы, у суботу я незанятая...

Калі за ёй зачыніліся дзверы, Аўгуст прачытаў нумары тэлефонаў, пад якімі было напісана: Сокал Галіна Іванаўна. Ніжэй прозвішча стаяла: аспірантка.

Са шчаслівай усмешкай на твары ён выйшаў з пад'езда і, пакуль ішоў да аўтобуснага прыпынку, усё азіраўся на гэты шэра-блакітны дом. Яму нават здалося, што Галіна стаяла ў акне і махала рукой. Упершыню ў жыцці яму спадабалася дзяўчына, з якой хацелася пабачыцца зноў.

Да суботы яшчэ было чатыры дні. Каб толькі хутчэй яны мінулі.

## 2

— Заўтра мы з вамі пагаворым пра раман Івана Паўлавіча Мележа «Людзі на балоце»,— Ніла Восіпаўна паглядзела на гадзіннік: праз дзве хвіліны зазвініць званок. Яна ледзь дачакалася канца ўрока. Расказвала пра мележаўскіх герояў, а сама ў думках ужо была ў дарозе. Дырэктар не хацеў яе адпускаць, але ўрэшце дазволіў паехаць на тыдзень. Хутчэй яна і не ўправілася б: туды двое сутак і столькі ж назад.

Муж быў са сваімі хлопцамі на трэніровачных зборах за горадам, і Ніла Восіпаўна на перапынках між урокамі званіла яму, званіла, а яго ўсё не маглі знайсці, ажно пакуль на тым канцы провада не злітаваліся над ёй і ўрэшце знайшлі Ісідара Карпавіча. Ён крыху здзівіўся, што яна раптам сабралася ў дарогу, бо толькі пад Новы год была дазволена сустрэча з Мірыкам. Яны былі ў яго вясной. Муж сумна ўздыхнуў і сказаў, што к вечару прыедзе дамоў.

Пасля званка Ніла Восіпаўна развіталася з класам, адчуваючы, як напяліся ў яе нервы, як захацелася паплакаць. Са школы яна адразу накіравалася ў аптэку, купіла пеніцылін.

Ёй дазволілі гэтую сустрэчу, таму што Мірык моцна захварэў і яго паклалі ў шпіталь. У сына былі слабыя лёгкія, і яна, канечне ж, ведала, што яму прывезці. Ён амаль штогод трапляў у шпіталь.

Яна ішла па вуліцы на выгляд маладзейшая для сваіх гадоў і не раз прыкмячала, як мужчыны азіраліся ёй услед. Яна ў душы смяялася з іх: пад парыком у яе былі сівыя валасы. На тое, каб схаваць маршчыны на твары, Ніла Восіпаўна штораніцы амаль дзве гадзіны сядзела перад люстэркам. Ёй ноччу балелі ногі, а яна насіла вузканосыя на высокім абцасе туфлі чырвонага колеру. Ніла Восіпаўна модна апраналася не для мужчын, хоць былі прыемны іхнія позіркі, яна спрабавала ўцячы ад сваіх гадоў. Ёй здавалася, калі будзе кепска выглядаць, дырэктар вырашыць, што яна хворая, а да пенсіі ўжо недалёка. Яна баялася пенсіі, мо яшчэ таму, што была старэйшая за мужа на дзесяць гадоў. І пенсія здавалася ёй канцом жыцця. А трэба было жыць для Мірыка, якому яна, мусіць, была кепскай маткай, дзеля Анжэлы, якая толькі канчала інстытут. Гэтага ніхто, нават муж, не ведаў, але яна пра гэта помніла штодня.

Ніла Восіпаўна ўбегла ў кватэру, на хаду скідаючы туфлі, плашч, кофту, парык. У спальні яна села перад люстэркам і заплакала. Слёзы цяклі з вачэй, змываючы са шчок касметыку, зблыталіся ў пасмы сівыя валасы, і калі яна нарэшце глянула на сябе ў люстэрка, убачыла старую жанчыну з патухлымі, стомленымі вачыма. Здавалася, нейкая незнаёмка была зараз у гэтай кватэры, прынамсі, зусім не тая настаўніца, якая бадзёра выйшла паўгадзіны назад са школы. На сцяне спакойна пастукваў гадзіннік, і стрэлкі няўмольна рухаліся па крузе. Яна не магла траціць дарэмна час, бо яго было вельмі мала. І Ніла Восіпаўна нібы гарачымі ступнямі пасля хадзьбы на высокіх абцасах зайшла па прыемна халоднай драўлянай падлозе ў ванную. Цёплай вадой змыла рэшткі касметыкі, зноў села да люстэрка, падфарбавалася і надзела парык.

Падняўшыся на табурэтку, са страхам каб не ўпасці, яна дастала з антрэсоляў дарожную сумку, якую муж купіў у Маскве, вельмі зручную, бо ў яе можна было пакласці шмат рэчаў. Хоць сыну можна ўсё роўна толькі тое-сёе перадаць.

Мірык любіў чытаць, і Ніла Восіпаўна на дно сумкі спярша паклала быкаўскую аповесць «Знак бяды», ча-

сопіс «Маладосць» з Караткевічавым раманам «Чорны замак Альшанскі» і некалькі нумароў «Немана» з дэтэктывам. «Юность» і «Иностранную литературу» яна штогод выпісвала туды, дзе сын знаходзіўся. Аднак гэтага яму было мала: у кожным лісце ён прасіў кніг. Побач з кнігамі паклала дзве пары цёплай бялізны, тоўстыя, ручной вязкі, шкарпэткі.

Яна прысела на крэсла, прыкінула, што ўзяць яшчэ. Успомніла пра сала і часнок, якія купіла ў нядзелю на Камароўцы. У пісьме Мірык скардзіўся, што баляць зубы і зрэдзь ідзе кроў з дзёснаў. Часнаку ўзяла ў цёткі, няхай есць, калі ў карты не прагуляе. Што гэта яшчэ яна вельмі хацела завезці цяпер? З-за мітусні, дый, можа, з-за склерозу, які ўжо ёсць у яе, зусім забылася пра кніжку Бартуша. Ён падпісаў: «З надзеяй і верай Міраславу Белакасцецкаму. Радзімір Бартуш». Гэта будзе яму найлепшым падарункам. Мабыць, і карысным.

Яшчэ тое-сёе яна пакідала ў сумку, з трывогай глянула на гадзіннік: Ісідара ўсё не было. Не пабачыўшы яго, не магла паехаць. Ён патрэбен быў ёй, каб супакоіцца, маральна сабрацца перад дарогай.

Ніла Восіпаўна толькі падумала пра мужа, як пачула, што адчыняюцца дзверы. Увайшоў муж, як заўсёды ў сінім спартыўным касцюме і чорнай балонневай куртцы, а з ім Максім, пануры, лысаваты, з худымі, як палкі, нагамі хлопец. Ён ужо гадоў дзесяць вазіў на аўтобусе каманду, якую трэніраваў Ісідар Карпавіч.

— Ужо сабралася? — спытаў Ісідар Карпавіч.— Не спяшайся. У нас яшчэ паўгадзінкі. Налі па кубку кавы. Есці не хочам, толькі кавы.

— Я зараз,— яна жвава, як маладая, пашыбавала на кухню і зрабіла ім кавы, а сабе наліла чаю, бо і так часта балела сэрца. Дый Ісідар Карпавіч каву піў рэдка, яе трымалі больш для гасцей.

— Мо і мне з табой паехаць...— сказаў, як заўсёды, калі збіралася да Мірыка, муж. Ён яшчэ ні разу не быў там, дый яна не хацела гэтага. Мірык толькі яе сын.

— Сама паеду,— бадзёра адказала Ніла Восіпаўна.— Нічога страшнага.

— Ты з дырэктарам школы перагаварыла?

— Ён у курсе.

— Грошай вазьмі, каб хапіла,— Ісідар Карпавіч дастаў з кішэні пінжака партманэ, зазірнуў у яго і пала-

жыў назад.— Нам з Анжэлай да зарплаты хопіць. Бяры ўсё, што ёсць дома..

— Узяла ўжо, дарагі мой,— яна, не звяртаючы ўвагі на Максіма, абняла мужа і зноў трошачкі даткнулася губамі да яго правай шчакі.— Вось што, каб не забыць. Мо будуць званіць нашыя, дык скажы: вечар перанеслі на наступны тыдзень. Званіў Радзімір Бартуш, абяцаў якраз у гэты час прыехаць. Скажы, што будзе вельмі цікава.

— Сапраўды Радзімір званіў? — муж незадаволена хмыкнуў.— Ён пра ўсё ўжо расказаў.

— Нічога, нічога... Ты ж не разумееш?..

— Канечне... Ладна, паехалі.

Максім падхапіў сумку, пачакаў, пакуль яны апрануць плашчы, і адчыніў дзверы. Ніла Восіпаўна прыдзірліва агледзела кватэру: ці будзе пасля яе парадак, яшчэ раз зірнула на сябе ў люстэрка і засталася задаволеная сабой: усё было ў норме — элегантная сярэдніх гадоў жанчына ўсміхалася ёй.

— Нілка, пара,— прагаварыў муж.— Лепш пачакаем у аэрапорце.

— Усё, гатова,— яна павесіла на плячо чорную дарагую сумачку, якой не мела ніводная настаўніца ў іхняй школе. Ісідар падарыў за прэміяльныя, калі каманда заняла першае месца ў рэспубліцы. Дырэктар завода быў аматарам футбола, і футбалістам прагрэсіўку выплачвалі нароўні са зборшчыкамі машын; якія зараблялі да пяцісот рублёў у месяц.

Ужо на парозе яе дагнаў тэлефонны званок. Ніла Восіпаўна думала не вяртацца, але ўсё-ткі зняла трубку. Яна адразу пазнала, хто звоніць, і толькі прамовіла:

— На наступным тыдні... Прабач. Я спяшаюся,— яна паклала трубку і паспешліва, хоць зноў зазваніў тэлефон, пакінула кватэру. Вялізны чырвоны «Ікарус» ля пад'езда чакаў яе.

## 3

Аўгуст жыў у сястры. У яе была трохпакаёвая кааператыўная кватэра. Пакой, які займаў Аўгуст, сястра раней здавала маладой сям'і. Аднак, калі ён вярнуўся з арміі, яна вырашыла, што брат можа не жыць у інтэрнаце, а толькі ў яе. І грошай не хацела браць ад

яго, але ён усё роўна аддаваў ёй штомесячна столькі ж, колькі плацілі кватаранты.

Калі Аўгуст ужо быў ля свайго дома, густа сыпануў дождж. Пакуль дабег да пад'езда, у чаравікі набраў вады з лужыны, якая ўзнікла проста на вачах.

Ключоў у кішэні ён не знайшоў, ці не забыўся на стале ў пакоі раніцай, збіраючыся ў горад, таму пазваніў у дзверы. Адчыніла сястра, рукі ў муцэ, з кухні пахла блінцамі.

— Зачыні сам. Згарыць усё,— кінула яна таропка і праз хвіліну ўжо крычала з кухні:— Званіў твой Аляксеевіч. Двойчы званіў.

Аўгуст пераадзеўся ў цёплы лыжны касцюм, штаны павесіў у ваннай сушыцца. Ногі памыў і надзеў сухія шкарпэткі. Пляменнікаў не было чуваць, не інакш глядзелі мультфільм па тэлевізары. З мужам сястра развялася, калі Аўгуст яшчэ служыў у арміі, і той з'ехаў некуды на Поўнач. Хто быў вінаваты, а хто не — невядома.

— Што Аляксеевіч хацеў?

— Пра гэта ён не казаў. Наогул я, Аўгуст, здзіўляюся. Ці мала хлопцаў для сяброўства, выбраў у прыяцелі дзеда,— сястра ўжо напякла гару ружовенькіх блінцоў і сама, расчырванелая ля газавай пліты і круглая, была падобная на здобную булачку.— Хоць прывёў бы калі, што гэта за дзед Барадзед.

— Добры дзед, усё жыццё змагаецца за праўду.

— І што мае з гэтага?

— Анічога. Проста змагаецца, і ўсё.

— Не веру я ў гэта,— сказала сястра.— Адна хлусня вакол, а супраць яе твой Аляксеевіч — нішто, кузюрка. І цябе, маладога і дурнога, зацягвае ў сваё глупства. Хай толькі зноў пазвоніць, скажу яму сёетое...

— А я табе забараняю гэта рабіць,— сказаў Аўгуст,— калі б усе былі, як Аляксеевіч, мабыць, хутчэй хлусню перамаглі б.

— Я твая старэйшая сястра, і ты ў мяне жывеш. Значыць, я за цябе ў адказе,— зусім расчырванелася Лёня.— Быў бы чужы, дык хоць з дзевятага паверха скачы. Мне ўсё роўна тады.

— Ай, што ты гаворыш,— узлаваўся Аўгуст.— Калі б усе былі такія, як ты, ніколі праўды не было б.

— Ага, так, так... Пабачым, як заспяваеш, маючы

сям'ю. Канечне, ты цяпер герой, як і твой Аляксеевіч. Можаш пазмагацца і за праўду. А я, дурная, розуму не хапае,— крычала сястра. Па ёй было відаць, што яшчэ трохі, і яна заплача: губы дрыжалі і рукі механічна шаравалі патэльню, якая даўно была чыстая.

— Ды не дурная ты, а напалоханая. Баішся свайго ценю, і табе праўда не патрэбна. Навошта яна табе, што рабіць з ёю,— выпаліў Аўгуст і схаваўся ў сваім пакоі. Што ні кажы, а сястра будзе стаяць на сваім, дый лепш не псаваць ёй нервы. Пакрычаць яны, палаюцца, але нішто не зменіцца, толькі ім абодвум будзе дрэнна. Мо ўрэшце перайсці ў інтэрнат, каб не перашкаджаць сястры жыць. Яна яшчэ зусім маладая, калі-небудзь кагось завядзе... Але ж яна не ведае Аляксеевіча, навошта пра яго гаварыць абы-што.

Аўгуст прылёг на ложак, прыслухаўся: дождж нібыта сціхаў, ужо рэдкія кроплі падалі на падаконнік. «Не, калі б я ажаніўся, усё было б інакш»,— раптам падумаў і адразу ўспомніў дзяўчыну з вялізнай і цяжкай, як з цэглай, сумкай.

— Галіна, Галя, Галечка,— сказаў ён, і ласкавая пяшчотная ўсмешка кранула яго вусны. Здалося, яшчэ адчувае сваёй далонню цеплыню яе маленькай рукі. Зялёнае святло з дзявочых вачэй асвятляе ўсё навокал, і ён нічога не бачыць, акрамя постаці ў цёмным ад дажджу плашчы, твару, на якім кроплі вады. Можа, пазваніць ёй. Але пра што гаварыць, калі яна аспірантка, а ён толькі просты рабочы, другі год як з арміі. Фактычна нічога ў яго яшчэ не было ў жыцці: школа, армія... А ў суботу што ён скажа ёй, куды пойдзе... У кіно? Яны дамовіліся на гэты дзень.

Здавалася б, ён толькі і думаў бы пра Галіну, пра іх будучую сустрэчу. У душы адчуваў свята, і хацелася, каб ніхто не перашкодзіў яму пабыць аднаму.

Па калідоры, нібы па двары, з тупатам прабеглі пляменнікі. Чуваць было, як на іх лаялася Лёня, пагнала на кухню вячэраць.

— Спіш? — сястра прынесла яму блінцоў у пакой, паставіла талерку на стол. Твар пакрыўджаны. Няйнакш плакала. Яму стала шкада Лёні, ён узяў яе руку, пагладзіў.

— Прабач, калі пакрыўдзіў. Добра? — Аўгуст зазірнуў сястры ў вочы.— Не крыўдуй.

— Я не крыўдую. Проста хочацца, каб у цябе было

не горш, як у людзей. А то са сваёй праўдай нічога не атрымаеш у жыцці. Ведаю, як бывае. Пакрытыкуй толькі начальства: адразу і благі работнік, і дысцыпліну парушаеш, а потым — кватэру пазней, чым іншым... Мо перазваніў бы свайму Аляксеевічу,— раптам дадала Лёня.— Пэўна, чалавек чакае, мо здарылася ў яго што, дапамога якая патрэбна.

— Вось паем тваё блінцы і пазваню,— Аўгуст падняўся з ложка і сеў да стала. Сястра забрала відэлец у яго з рук і падштурхнула ў спіну.

— Пазвані, нездарма двойчы турбаваўся.

— Цяжка зразумець вас, жанчын. Спярша адно гаворыць, а праз хвіліну — зусім іншае,— пажартаваў Аўгуст, узрадаваны тым, што сястра ўжо не крыўдавала: сэрца ў яе было адыходлівае, як у нябожчыцы маці. Накрычыць, зазлуе, а потым усё даруе, пашкадуе. Лічыла, што самага дрэннага чалавека можна выхаваць дабром, а зло — яшчэ болей псуе, робіць душу жорсткай.

Аляксеевіч падняў трубку адразу, як толькі Аўгуст пазваніў. Яны абмяняліся некалькімі звычайнымі фразамі аб надвор'і, што, мусіць, дождж аблажны,і каб не холад, дык грыбы пайшлі б у рост. І толькі пасля Аляксеевіч нібыта між іншым вымавіў, як выціснуў з сябе:

— Прапалі нашы пратаколы...

— Як прапалі? — не даўмеўся Аўгуст.

— Зніклі з майго сейфа. Сёння раніцай былі, а калі адыходзіў дамоў — ужо ні аркуша.

— Гаварыў я табе — пакладзі ў нармальны сейф. Мой надзейны, сам зрабіў,— папікнуў Аўгуст.— І што цяпер?

— І я думаю, што цяпер. Давай заўтра з раніцы з табой абмяркуем. Гэта не тэлефонная размова...

Аўгуст механічна паклаў трубку на апарат, сеў за стол есці блінцы, якія яшчэ былі гарачыя. Навіна была нечаканая і дзіўная. Ён еў, не адчуваючы смаку.

— Што-небудзь здарылася? — спытала сястра.

— Мабыць, так...

# РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

Ага, Картуш, папаўся ў мышалоўку!

*Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч*

## 1

— Як мне хочацца жыць, як мне хочацца жыць,— мармытала лабарантка, калі Галіна зайшла на кафедру.— Ах, мне хочацца жыць... Нешта ты рана сягоння? Як мне хочацца жыць!

— Ну дык і жыві. Ці табе хто перашкаджае?

— Так, як хочацца, не магу. Не хапае дробязі,— лабарантка шчоўкнула пальцамі.— На маю зарплату не надта зажывеш.

— Але па тваім выглядзе не скажаш, што ў цябе малая зарплата,— сказала Галіна.— На дацэнта цягнеш.

— Дзякуй за камплімент. Куды мне да дацэнта, гэта табе, Галачка,— іранічна заўсміхалася лабарантка, прайшлася па пакоі, дэманструючы свае новыя асеннія боты.— Як?

— Мадэрн, толькі яны табе, Алачка, не зусім...

— Як гэта не зусім? — амаль пакрыўдзілася лабарантка.

— У цябе нага кароткая, а ў ботах халявы высокія...

— Сказала б лепей, што зайздросціш.

Галіна не стала з ёй спрачацца, таму што асцерагалася лабаранткі: у яе быў надта доўгі язык. Дый першая пляткарка на кафедры. Пра ўсіх яна ведае, усім парады дае, як жыць. Яна таксама скончыла інстытут, але пісаць дысертацыю не захацела. У яе муж быў маёр, і яна марыла наогул не працаваць.

«Пайшла б ты куды»,— падумала Галіна. Лепш, каб такой сведкі, як лабарантка, не было пры іхняй размове з загадчыкам кафедры. Аднак яе ж не прагоніш з пакоя, маўляў, ідзі пагуляй. Дый хто скажа: не яна...

— Быць заўжды вам прыгожымі, быць заўжды вам прыгожымі,— вітаўся з імі загадчык кафедры прафесар Зушчыц. Вацлаў Казіміравіч быў у чорным скураным паліто, якое ён павесіў у шафу ля ўвахода, і застаўся ў цёмным касцюме ў ледзь прыкметную светлую пасачку.

Гэты касцюм ён летась купіў у Англіі, супрацоўнікі кафедры ў дэталях ведалі аб паездцы. Прафесар часта расказваў пра яе, хоць і мінула ўжо каля года. Слухала яго Галіна, і часам здавалася, што яна чытала гэта ў кнізе «Карані дуба» Аўчыннікава.

Вацлаў Казіміравіч не так даўно адзначыў пяцідзесяцігоддзе. Хоць калі прыпамінаць, дык гэта было не менш як тры гады назад. Але прафесар знешне не мяняецца, узрост, здаецца, не накладвае на яго адбітак. Гладкі смуглявы твар з моцнымі сківіцамі, раздвоены глыбокай ямкай шырокі падбародак. У каштанавых валасах сівізны не відаць. На думку Галіны, некаторыя трыццацігадовыя побач з Вацлавам Казіміравічам выглядалі састарэлымі дзядамі. У яго лёгкі спартыўны крок, падцягнутая дужая постаць. Ідзе, падскокваючы, усё роўна як у туфлях спружыны. Праўда, якога колеру вочы ў прафесара, вызначыць Галіна не змагла. Нібыта шэрыя, а мо і блакітныя. Іншы раз глянеш у іх — як халодная восеньская вада.

Прафесар пацалаваў абедзвюм жанчынам рукі, прычасаўся перад люстэркам і, відаць, застаўся задаволены сабой. Ён адчыніў фортку, потым узяў са стала газету, але не чытаў яе, перагартаў толькі.

— Вы сёння, Галачка, вельмі, вельмі...— сказаў прафесар.— І вы, Ала, таксама,— ён ласкава паглядзеў на жанчын.

— Дзякую, Вацлаў Казіміравіч. Нарэшце заўважылі,— какетнічала лабарантка.— Упершыню ад вас такі камплімент.

Аднак ён ужо не звяртаў на яе ўвагі, глядзеў толькі на Галіну, нібыта лабаранткі не было і ў пакоі. І тая зразумела гэта па-свойму: схапіла з шафы свой плашч, хуценька апранулася.

— Некуды спяшаецеся, Ала? — прагаварыў Вацлаў Казіміравіч.— Не забыліся, што паслязаўтра ў нас кафедра, паперы падрыхтавалі?

— Усё зрабіла. Я тут... Мне трэба ў навучальны аддзел.

— Калі ласка. Да дванаццаці ўправіцеся, Ала? — Зушчыц апусціў галаву, на макаўцы валасы былі радкаватыя.

— Канечне,— лабарантка, стоячы за спіной прафесара, падміргнула Галіне, пакруціла пальцам ля скроні.— Ну, я пабегла.

— Бяжыце,— прафесар гартаў падручнік па філасофіі. Як толькі за лабаранткай зачыніліся дзверы, сказаў: — У навучальны аддзел ёй трэба... Ведаю, які гэта аддзел.

— Будзьце літасцівы да жанчын, Вацлаў Казіміравіч. Колькі ў іх шчасця: работа, сям'я, дзеці, работа, сям'я. Хочацца хоць кропельку нечага светлага.

— Я не супраць светлага ў жаночым жыцці. Наадварот, як бачыце, Галечка, патураю сваім супрацоўнікам у наведванні навучальнага і іншых аддзелаў.

— Усе вам вельмі ўдзячны...

— Э не, даражэнькая Галечка,— памахаў пальцам Зушчыц.— Усім добрым не будзеш. Ніколі. Таму і не трэба нават спрабаваць. Я — навучаны жыццём.

— Вацлаў Казіміравіч, мне трэба параіцца,— рызыкнула нарэшце Галіна,— разумееце, без вас... Калі б вы паглядзелі, мо падказалі б нешта... Дысертацыю я амаль напісала. Мо паглядзелі б? Мне важна ведаць вашу думку як кіраўніка і загадчыка кафедры.

— Э, прабачце, Галечка, што перапыняю вас. Навошта прыгожым дзяўчатам аспірантура, дысертацыя — гэта ж праца, праца.

— Калі б вы паглядзелі хоць першыя дзве часткі, Вацлаў Казіміравіч? — Галіна вырашыла не адступаць, усё-ткі пачуць ад Зушчыца думку пра дысертацыю. Чакаць нейкай міласці і спадзявацца — не варта.

Ен узяў у свае рукі яе руку, гладзіў, перабіраў пальцы, нібыта забаўляўся. Яна пацягнула руку, але прафесар не адпускаў, трымаў моцна. Вочы з шэрых сталі жоўтымі. «Кот,— падумала Галіна і нечакана для сябе вырашыла: — А што, калі пагуляць з ім...» Надзвычай сімпатычны мужчына, заўсёды з грашыма і выхаваны. Прафесар, доктар навук... Інтэлігент... Перабрала ў памяці ўсіх сваіх замужніх і незамужніх сябровак і пераканалася, што ні ў кога з іх няма сярод блізкіх знаёмых доктара навук. Яна зможа пахваліцца перад імі: мой прафесар прыяцель М. сказаў, мой дарагі прафесар М. запрасіў у госці... Яна здзівілася самой сабе, што думае пра гэта, зусім не саромячыся, вельмі спакойна, як аб даўно вырашаным. Такіх думак яшчэ ўчора не было ў яе, яны ўзніклі нечакана нібыта, але ж...

— Што вы змоўклі, Галечка. У вас прыгожы твар, дзіўныя зялёныя вочы,— гаварыў Зушчыц, гладзіў яе

па руцэ, гладзіў.— Магу пачытаць дысертацыю. Хоць заўтра. Толькі... прабачце. Забыў назву дысертацыі...

Ёй было непрыемна чуць, што ён забыў, але змусіла сябе змаўчаць. Усміхнулася, сказала нешта жартаўлівае. Пакуль яму ўсё дазволена гаварыць, а яна павінна ўсё слухаць. Слухаць, хваліць яго розум, мужчынскую прыгажосць і, калі трэба, маўчаць.

— Вацлаў Казіміравіч, мая дысертацыя называецца так: «Сацыяльная актыўнасць маладога рабочага класа».

— Цікава, цікава, але неяк, знаеце, трохі неканкрэтна...

— Але ж вы самі прапанавалі, Вацлаў Казіміравіч,— усё-ткі не стрымалася яна.

— Сапраўды, прыпамінаю... Ладна, няхай будзе так. Урэшце зусім няблага, і адчуваецца важная стратэгічная думка, як патрабуе партыя. І што вы ўжо зрабілі?

— Напісала ўступ, на прыкладзе канкрэтных прадпрыемстваў паказала ролю маладога рабочага класа на сучасным заводзе, фабрыцы...

— Так, так... Вы гуляеце, Галечка, у спортлато? — Зушчыц ва ўпор глядзеў на яе, а ў вачах па-ранейшаму іронія. Ён хоча спадабацца, хоча... І ўсмешка, і кампліменты — усё разлічана на гэта. Аднак навошта яму: жонка ў яго ёсць, дарослыя дзеці. Сын — выліты прафесар Зушчыц, толькі худзенькі і маленькія вусікі на танклявым тварыку.

— Я з дзяржавай у азартныя гульні не гуляю,— сказала Галіна.— За ўсё жыццё рубель па латарэі не атрымала.

— А я, знаеце, часам гуляю. Наогул спортлато — гэта не толькі аркушык паперы з квадрацікамі і лічбамі. Гэта — напружанне розуму, праверка ведання псіхалогіі і сацыялогіі, урэшце, праверка здольнасцей як спецыяліста, дый... мужчыны.

— А жанчыны?

— І жанчыны таксама. Калі яна прыгожая і разумная... Ці ёсць у вас, Галечка, друкаваныя працы для абароны дысертацыі? — нечакана ён павярнуў тэму гаворкі.— Калі няма, паможам. Наша Алачка ўсё яшчэ ў навучальным аддзеле,— ён імкліва падняўся, прайшоў, больш чым звычайна задраўшы галаву і разгарнуўшы плечы, да дзвярэй і выглянуў у калідор.— Не відаць.

Так, сёння ў мяне лекцыі няма. Пакінем Але запіску, што мы таксама пайшлі ў навучальны аддзел. Запрашаю вас, Галечка, паабедаць.

— Мне няёмка... Мне трэба...— пачала аднекваацца Галіна, а сама была гатова зараз скакаць ад радасці. Толькі не магла ж гэта яна паказаць Зушчыцу.

Прафесар дапамог ёй апрануць плашч, між іншым пахваліўшы яе густ. Яны мінулі ўжо калідор, як Зушчыц спыніўся і, агледзеўшыся, ніякавата сказаў:

— Знаеце, прабачце, нашы людзі... Яшчэ што-кольвечы падумаюць, размовы... Я пайду першы, а потым — вы. Сустрэнемся на аўтобусным прыпынку. Там, дзе спыняецца трыццаты. Не крыўдзіцеся?

— Не, вы правільна вырашылі,— Галіна прасачыла за ім позіркам, пакуль яго высокая, прамая, як дошка, постаць была відаць у калідоры, пасля пайшла следам. Яна ўжо не магла спыніцца, вярнуцца на кафедру ці проста пайсці з Зушчыцам. Ёй нават раптам стала цікава, чым скончыцца іхні абед, пра што яны будуць гаварыць яшчэ. На ганку яна прыпынілася і здалёк убачыла прафесара, які махаў рукой і паказваў у бок моста, адкуль выварочваў жоўтае доўгае тулава аўтобус.

У туфлях на высокіх абцасах было цяжка бегчы, але Галіна ўсё-ткі паспела якраз. Зушчыц падхапіў яе пад руку і амаль штурхнуў у аўтобус. Толькі цяпер яна заўважыла, што ў прафесара тонкая, як у хлопчыка, шыя, галаву ён адкідваў назад, мо таму, каб крыху прыкрыць каўняром.

У аўтобусе Зушчыц паводзіў сябе неспакойна. Жартаваў, ціха смяяўся, але азіраўся па баках, нібыта баючыся, што акрамя аспірантні слухаюць яго таксама і іншыя пасажыры. Яго нервознасць пастунова перадавалася і Галіне. Ёй хацелася, як хутчэй прыехаць да рэстарана і выйсці з аўтобуса. Яна не вытрывала, спыталася:

— У вас раўнівая жонка?

— А што? — неспадзеўкі пачырванеў Зушчыц і таропка сказаў: — Не, не, што вы. Мы інтэлігентныя людзі,— змоўк і болей не гаварыў, а калі выходзілі з аўтобуса, павесялелы дадаў: — І сучасныя. Прынамсі, я... А ведаеце: вы мне падабаецеся.

Што адказаць яму на гэтыя словы, як іх разумець? Яна яшчэ трымалася насцярожана, быццам чакала, што ён раздумае, успомніць пра час, якога мала, а трэба

пабыць на пасяджэнні вучонага савета, рэдкалегіі, парткома, мясцкома... Недзе яшчэ яму трэба быць. Гэта не будзе хлуснёй, бо яго, пэўна, там чакаюць. Аднак Зушчыц не адмяніў свайго рашэння, і Галіна ішла з ім. Ёй захацелася, каб сяброўкі пазайздросцілі, пабачыўшы, як яна ідзе, нібы раўня, з прафесарам. І сімпатычным мужчынам...

Насустрач ім па праспекце ішоў малады ростам з два метры хлопец у чорнай куртачцы. Нечаму свайму ўсміхаўся, у руках трымаў букет гваздзікоў. Ужо ўзяўшыся рукой за дзверы, яна яшчэ раз паглядзела на гэтага шчаслівага хлопца, у якога былі кароткія светлыя валасы, шыя, паголеная, як у салдата. І ў памяці ўсплыло, як пераязджала з кватэры пазаўчора ў дождж і нечакана спаткала сарамлівага юнака, што данёс ёй цяжэрную сумку з кнігамі да новай кватэры. Дала яму тэлефон, і ён, пэўна, пазвоніць. Пазвоніць... У яго ажно загарэліся вочы, калі яна дала паперку са сваім тэлефонам.

— Калі ласка, дзверы адчынены,— голас Зушчыца вярнуў да рэальнасці, і яна паслухмяна пераступіла парог. У зале грымела музыка. Вацлаў Казіміравіч нецярпліва падштурхваў пад локаць.

## 2

Хоць і надышла ўжо восень, але жоўтага лісця на дрэвах было няшмат. Мабыць, таму што багата прайшло летам дажджоў, дый цяпер раз-пораз сыпаў грыбасей. Дні стаялі сонечныя, з мухамі, якія ачуліся ад халадоў, у паветры лётала павуцінне. Буйна цвілі асеннія кветкі. Хрызантэмы і астры выраслі як ніколі галавастыя, з шырокімі яркімі пялёсткамі. У Мінску гэтыя кветкі аддавалі амаль задарма. На якую бабульку ні глянеш, кожная прадае альбо астры, альбо хрызантэмы. Пяць капеек штука, некаторыя жанчыны прасілі дзесяць. Але ж і гэта не цана за кветку. Многа тавару нарасло на сотках у прыгарадных вёсках, на дачах.

Павел Піліпавіч хадзіў па сваёй дачы і злаваўся на жонку, якая паддалася агітацыі суседзяў і таксама паўагарода засеяла астрамі. Навошта яны, саліць іх, ці што? Вось заўсёды так жонка робіць, не параіўшыся. Дзе свая галава, свой розум — не пражывеш на сусед-

чын. Раслі б на агародзе гваздзікі... І што з імі ён зрабіў бы, не пайшоў бы гандляваць на вуліцу ля універсама. Не той ён чалавек, і гэтая работа не для яго. Хоць, канечне, мог бы аддаць кветкі за нейкую суму суседцы праз тры дачы, якая гандлюе на Камароўцы, не саромеецца; яна ж да пенсіі была інжынерам. І ўсё-ткі не начальнікам, на персанальнай «Волзе» не ездзіла, з міністрамі за руку не віталася. А ў Паўла Піліпавіча гэта ўсё было зусім нядаўна. Здаецца, пакуль у машыне на работу ездзіў, на натоўп праз шкло глядзеў, быў большы парадак і на вуліцы, і на заводах, і ў вёсцы. Стаў пенсіянерам і ўбачыў, што апошнім часам горш працаваць пачалі ўсюды. Павінна каб было лепш, але ж відаць, што ўсё горш і горш. Дзіўна, вельмі ж дзіўна... Пры ім такога не было, ягонае пакаленне працавала будзь здароў, будзь...

«Што з гэтымі кветкамі, куды іх. Хоць касой касі»,— думаў Павел Піліпавіч, раздражнёна ходзячы па дачы. Жонцы прасцей жыць, яна яшчэ пакуль пры пасадзе. Ён — персанальны пенсіянер. Год мінуў з таго дня, як парадавалі, а ён ніяк не мог супакоіцца. Вечарам пазванілі і афіцыйным тонам паведамілі, што ёсць загад аб вызваленні з пасады ў сувязі з пенсіяй. Абхітрылі яго, знянацку зрабілі, не паспеў спыніць папяровую карусель. Сябры там-сям займалі салідныя пасады, дапамаглі б, але нават яны даведаліся, што яго вызвалілі, толькі раніцай і ўжо нічым і ніяк не маглі выратаваць. Пра гэта лепш не ўспамінаць. Жыццё не скончылася, ён пры сіле, і здароўе яшчэ нішто сабе: толькі ў валасах сівізна, а сэрца, ціск — хоць рыхтуй у лётчыкі. Ці, як калісьці казалі ў ягонай вёсцы: жаніць можна. Эх, гэтыя кветкі, каб іх... Павел Піліпавіч нахіліўся і ўхапіў рукою жменю хрызантэм, вырваў іх з коранем. Панюхаў: пахла сырой гнілаватай травой, не, нават атавай. Размахнуўся і шпурнуў пук у кусты, якія акурат раслі побач з дачай.

— Ураджай знішчаеш, сусед? — пачуў Павел Піліпавіч ад вуліцы. З калонкі набіраў ваду сусед, былы прапаршчык. Звалі яго быццам Віктар ці Віталь. Яны знаёміліся аднойчы, але яшчэ ні разу не пагаварылі па-чалавечы. Усё толькі: прывітанне, добры вечар — і кожны ў сваю клетку. А чаму былы прапаршчык? Жонка яму казала, што гэты Віктар ці Віталь служыў у арміі кладаўшчыком. Няйнакш выгналі, бо на выгляд

яшчэ не стары мужчына. Мо і пяцідзесяці няма.

Сусед паставіў вёдры на камень ля калонкі і ішоў да Паўла Піліпавіча. Павіталіся, і Павел Піліпавіч адчуў, што рука ў гэтага Віктара моцная, дый яго постаць ажно дыхае сілаю.

— Да́чка ў вас неблагая, хоць пры вашай пасадзе магла б быць і лепшай,— сказаў сусед, прыжмурыўшы вока і нібы ацэньваючы дачу як пакупнік.

Гэта не вельмі спадабалася, дый пачуўся яму нейкі падтэкст у гэтых словах. Павел Піліпавіч спахмурнеў і незадаволена адказаў:

— Пасада мая пенсіянерская, хоць і персанальная...

— Ну, што вы, Павел Піліпавіч, павага і аўтарытэт усё роўна засталіся. Іх на пенсію не адправіш.

— Гэта, канечне, правільна,— згадзіўся Павел Піліпавіч.— Такі багаж не абясцэніцца, каштоўнасць грамадская.

— І я думаю гэтак, хоць некаторыя таварышы спрабуюць даказаць адваротнае. Лічу, што ўсё гэта ад непарадку. Паглядзіце толькі: кругом ашуканства, хцівасць і парушэнне норм нашага грамадства...

У гэтага Віктара кашуля расшпілена амаль да пупа, на нагах ялавыя боты, пэўна, вайсковыя. Такіх ботаў у магазінах Павел Піліпавіч не бачыў, сабе б купіў. Увосень якраз гразь мясіць па дарозе на дачу: ад электрычкі кіламетры тры хады.

«Здаровы дзядзька. Яму сена касіць і поле араць»,— думае Павел Піліпавіч пра суседа, а той гамоніць і гамоніць. Нешта ўсё пра пусто́е, дробязнае. Ну хто гэты Віктар — былы прапаршчык, а ён кіраўнік не абы-якога рангу. Павел Піліпавіч ніяк не можа паламаць у сабе дыстанцыю: Віктар для яго радавы, падначалены, якіх за жыццё было сотні. І не з кожным ён нават вітаўся за руку. Што яму была нейкая кузюрка — інжынер. Людзі — гэта аркуш чыстай паперы. Сябе Павел Піліпавіч адносіў да тых, хто можа пісаць на гэтай паперы. Было... Цяпер ён быў хоць і персанальным, але пенсіянерам. І часам нараджалася ў душы такая нянавісць да сваіх былых калег-таварышаў намеснікаў міністраў, міністраў, што хацелася крычаць. Ён быў смяртэльна пакрыўджаны, што адлучылі яго ад улады ва ўзросце, калі можна было кіраваць яшчэ. Павел Піліпавіч вельмі любіў выраз былога партыйнага дзеяча, паплечніка Брэжнева Кірыленкі: семдзесят га-

доў — сярэдні ўзрост. А яму ж толькі за шэсцьдзесят... Прапаршчык абудзіў у ім сваімі словамі гнеўякі пакуль драмаў, збіраючы сілы.

— Згодзен з вамі. І нават больш скажу,— Павел Піліпавіч убачыў, што на яблыню села цэлая плойма вераб'ёў, схапіў камень і шпурнуў.— Паразіты, дармаеды. Судзіць трэба, судзіць, і як паболей, каб іншыя баяліся. Нездарма ў народа ёсць прымаўка: бі свайго, каб чужы баяўся. Поўна рознай сваляты... Дык вось. Гэта ж колькі ў горадзе смецця. Памідорамі гандлююць і гніллё кідаюць тут жа на вуліцы. Збіраюся пісаць у газету. Ніколі не пісаў, а цяпер буду. Трэба змагацца за парадак. Вось успамінаю трыццатыя гады. Модна цяпер іх крытыкаваць — але які гэта час?! Быў я селькорам, памагаў ачышчаць грамадства ад гнілля. Во калі рэагавалі органы на выступленне прэсы. Імгненна бралі за каршэнь і — чыста ўсё. А то, бач, колькі цяпер бюракратаў, зажымшчыкаў крытыкі. Пазаядаліся, усё ў кожнага ёсць. Начальніка па знешнім выглядзе не адрозніш ад падначаленага. Гэта абсалютна ненармальна. Як вас па бацьку?

— Віктар Панкратавіч Іканнікаў. Дзіўнае прозвішча?

— Чаму, звычайнае. Я сустракаў і Задзярыхвост, і Ашуканец, і Самец, і Салтысон.

— У мяне Іканнікаў мо таму, што бацькі з чалдонаў, старавераў віцебскіх. Вёска на мяжы з Літвой. Вы нідзе не працуеце ці зноў пайшлі на пасаду? Начальнікам вашага рангу звычайна прапануюць, без партфеля не пакідаюць ледзь не да смерці,— сусед гаварыў пачціва, хоць і грубавата, усё-ткі адчувалася нявыхаванасць, сялянскае паходжанне. І Павел Піліпавіч зрабіў тое, што раней сабе ніколі не дазволіў бы: ён запрасіў Іканнікава ў хату.

— Што стаім тут, заходзьце,— сказаў і паглядзеў на дарогу, ці не відаць жонкі.— Пачастую чаем індыйскім з Індыі, а не з Адэсы.

— Можна, чаму не,— узрадаваўся Іканнікаў гэтаму запрашэнню і, пакінуўшы вёдры ля калонкі, патупаў за гаспадаром.

Сваю дачу Павел Піліпавіч будаваў гадоў дзесяць назад употай ад кіраўніцтва і падначаленых, бо меў тады службовую дачу. Ён ужо тады падумаў: а раптам здымуць, куды з дзецьмі выехаць летам альбо дзе

адпачыць у выхадны дзень. Для перасцярогі дачу аформіў на жонку, якая пасля іхняга шлюбу засталася на сваім дзявочым прозвішчы. Калі будаваліся, дык Павел Піліпавіч наязджаў разы два-тры на ўчастак і то ноччу, каб не дай бог хто не ўбачыў і не напісаў. Са страхам рабіў дачу, дрыжучы, і да самай пенсіі на ёй не быў, толькі нібыта праведваў сястру, якая кожнае лета тут жыла.

Гэта была прасторная сялянская хата на тры пакоі, з кухняй, каморай. Зробленая з тоўстай яліны, што былі прывезлі сябры с Ліпічанскай пушчы. Цяпер што хочаш думай і гавары, пенсіянеру нічога не прышыеш, дый, урэшце, не ўкраў ён дачу. Трэба ж недзе на старасці пабыць у спакоі. З месяц таму спаткаў на Камароўцы таксама аднаго былога начальніка, у якога пасада была вышэйшая, чым у яго. Скардзіўся чалавек: прывык да дачы, а яе забралі, калі выйшаў на пенсію. Пасміхнуўся тады Павел Піліпавіч: трэба было трохі варушыць мазгаўнёй. У нас жа такая сістэма, што не ведаеш назаўтра, як будзе. Што было чорным, можа стаць белым, а белае — чорным. Калі быў пры пасадзе, дык, здавалася, так і трэба.

У пакоях было сціпла: ні дываноў, ні паркету. На падлозе вясковыя ходнікі, якія сястра Паўла Піліпавіча на кроснах саткала. У зале старэнькі тэлевізар «Гарызонт», радыёла «Беларусь», стол, два ложкі. У астатніх пакоях таксама была старая мэбля. Яе, на добры лад, даўно трэба выкінуць на сметнік, але ўсё шкада, дый што новае паставіш. А навошта?

— Сціпла ў вас, сціпла,— сказаў сусед.— Значыць, жыццё пражылі, а капіталаў не набылі. Ды не гэта галоўнае.

Павел Піліпавіч змаўчаў, разліваў чай, падаў на стол аўсянае пячэнне, якое палюбіў з дзяцінства, калі аднойчы маці спякла бацманы з аўсянай мукі. Наогул ён быў з тых людзей, якіх называюць педантамі. Касцюмы шэрага колеру Павел Піліпавіч насіў апошнія трыццаць гадоў жыцця, іншага колеру не прызнаваў. Гэта была як уніформа вышэйшага чыноўніцкага апарату, дый сярэдняга. Плашч і палітон Павел Піліпавіч прызнаваў толькі рэглан. Гальштукі ўсе былі чорныя ў белую кропачку. Канечне, ён прывык і да чорнай «Волгі», якая штораніцы забірала яго ад пад'езда, але, на жаль, пазбавілі яе. Урэшце, ён нічым не вызначаўся

сярод шматмільённай савецкай арміі партыйных, дзяржаўных, камсамольскіх і прафсаюзных функцыянераў. Жыў не горш і не лепш амаль кожнага з іх, усе жылі добра. Хоць і не прызнавалі гэтага, але яны ўтварылі своеасаблівую ізаляваную касту са сваім экстраабслугоўваннем, зарплатай: у іх былі свае ўрачы, гандляры, шаўцы, аптэкары. Жыццё чыноўніка ў шэрым касцюме стала ў сто разоў даражэйшым за жыццё простага чалавека. Калі Павел Піліпавіч выйшаў на пенсію, яго пазбавілі некаторых выгод, хоць тое-сёе і пакінулі, але ўсё роўна яму было крыўдна.

— У мяне сціплая пенсія,— разліўшы чай, вымавіў Павел Піліпавіч,— і надта ўжо што-небудзь не магу сабе дазволіць. Я ўсё жыццё пражыў сціпла, а цяпер — тым больш няма за што раскашавацца... У мяне ўсё ёсць, і нічога не трэба. Галоўнае маё багацце — пасаду, прабачце, работу — забралі, астатняе — драбяза.

— Як ні кажыце, але ж крыўдна. Заслужаны чалавек і на пенсію. Ну і што — гады? Людзі, бывае, сядзяць пры ўладзе да дзевяноста гадоў,— спачуваў Іканнікаў і ўсё ацэньваў суседа, нешта прыкідваў.— Ці пайшлі б працаваць?

— Ну, знаеце. Маё становішча? — разгубіўся Павел Піліпавіч.

— Становішча пенсіянера. Ніхто вам зноў кабінет не дасць. І не спадзявайцеся, маладыя, як кажуць, зямлю рвуць з-пад ног,— грубавата сказаў Іканнікаў.

— Я і не спадзяюся,— ажно перасмыкнула Паўла Піліпавіча ад гэткай нетактоўнасці былога прапаршчыка. Хоць ён інакш і не можа. Чалавек нявыхаваны, няграматны... Прывык лічыць на складзе прасціны, коўдры, брудную салдацкую бялізну...— Мне нічога не трэба. У мяне ўжо ўсё ёсць.

— Але ж і здароўе ёсць таксама,— Іканнікаў паляпаў Паўла Піліпавіча па плячы,— аўтарытэт. У мяне прапанова. Давайце возьмем на двух кіёск «Спортлато».

— Як гэта возьмем? Не разумею...

— Не ўкрадзём, канечне. Працаваць будзем.

— Не, ну вы,— Павел Піліпавіч і чай піць перастаў, забегаў па пакоі. Прапанова прапаршчыка здалася не проста абсурднай, смешнай. Як гэта ён і — кіёск «Спортлато».

Ён пачуў, як зарыпелі веснічкі, і, выглянуўшы ў акно, убачыў жонку. Не павітаўшыся, яна стомлена апу-

сцілася на крэсла, выцягнула ногі і толькі тады хітнула галавой Іканнікаву.

— Не чую ні ног ні рук,— яна дапіла чай з мужавага кубка і дадала: — Добра табе, нікуды не трэба бегчы, спяшацца. Цішыня і спакой.— Заўважыла, што ён нечым усхваляваны, падазрона павярнула галаву да Іканнікава і спыталася: — Што здарылася?

— Нічога, калі не лічыць, што гэты чалавек прапануе мне працаваць у кіёску «Спортлато»,— выгукнуў Павел Піліпавіч, пальцам паказваючы на суседа.

— Ну і што? — абыякава сказала жонка.

— Адмовіўся.

— Чаму?..

— Я і кіёск «Спортлато» — гэта штосьці неверагоднае. Урэшце, я намеснік міністра...

— Былы, на жаль, дарагі Павел. Так...— яна наліла сабе яшчэ чаю і доўга, з апетытам прычмокваючы пры кожным глытку, піла. Нарэшце вымавіла: — Дарэмна. Як бачыш, «Волгі» больш не будзе. Нічога, пабудзь сярод простага люду. Назад дарогі няма. Так што згаджайся.

— Вось і я тое ж. Дзякую за падтрымку, Галена Сцяпанаўна,— Іканнікаў пацалаваў ёй руку і хуценька развітаўся з імі.

## 3

Аляксеевіч сядзеў на ганку вагончыка, у якім была іхняя бытоўка. З нецярпеннем чакаў Аўгуста, мусіць, бо, як толькі ўбачыў яго, ажно твар пасвятлеў. Падхапіўся на цыбатых нагах, крыху згорблены, з вялікай шапкай сівых валасоў. Як заўсёды, у чыстай спяцоўцы, на твары ніводнай шчацінкі, адэкалонам пахне.

У Аўгуста рост немалы, у арміі на правым флангу стаяў, але Аляксеевіч вышэйшы амаль на галаву. Толькі надта ўжо худы. Разам у лазні мыліся, бачыў: рэбры можна палічыць. Гэта ў Аляксеевіча вайна ўсё адгукалася: у двух месцах было прастрэлена лёгкае. І ён увесну і ўвосень моцна кашляў. Зрэдзь Аляксеевіч ездзіў у санаторый у Ялту, адтуль вяртаўся вясёлы, загарэлы і ўсім прывозіў падарункі: каляндарык, значок ці сакавіты паўднёвы яблык.

Загадкава азірнуўшыся па баках, Аляксеевіч прапусціў уперад Аўгуста і, яшчэ больш згорбіўшыся, за-

чыніў за сабой дзверы. У кутку за акном стаяла невялікая жалезная скрынка, у якой яны трымалі інструмент. Гэтай скрынцы было мо дваццаць гадоў, яе Аляксеевіч перавозіў з адной будаўнічай пляцоўкі на другую. Апошнім часам ужо разам з вагончыкам.

— Глядзі, пуста! — Аляксеевіч адчыніў скрынку. Усё было нібыта на месцы: малаткі, ключы, абцугі. На верхнюю паліцу яны пазаўчора паклалі шэранькую папку з некалькімі аркушамі паперы. Папка ляжала на дне скрынкі. Аўгуст узяў яе, разгарнуў: нічога ў ёй не было.

— Аляксеевіч, а вы замыкалі скрынку?

— Навошта? Мы ніколі яе не замыкалі. Вагончык замыкаецца.

— Мо гэта сантэхнікі? — услых падумаў Аўгуст.

— Я іх пытаў. Яны наогул учора ўвесь дзень былі на базе, адбіралі матэрыялы на дом.

— Хто мог украсці акты? — Аўгуст выглянуў у калідор. У другой палавіне вагончыка пераапраналіся сантэхнікі. Ён прабег вачыма па тварах, падазраючы цяпер кожнага з іх. Але ж ці патрэбны ім гэтыя паперкі? Навошта. Яны ж з Аляксеевічам правяралі не сантэхнікаў, а выкарыстанне будаўнічых матэрыялаў на ўчастку.

— Здароў, суседзі! — гукнуў ён.

— Здароў, здароў,— сказаў Гусак Мікалай, трохі старэйшы за яго па гадах, з вялікай залысінай хлопец. Ён нібыта служыў у ракетчыках, на запраўцы. Там і павылазілі валасы. Ён ездзіў на работу на матацыкле «Ява», які роў як трактар.

— У вас нічога не ўкралі? — угледаўся ў твары, спадзеючыся, што той, хто гэта зрабіў, выявіць сябе. Аднак нічога такога не прыкмеціў, акрамя здзіўлення.

— А што такое? — Гусак нават перастаў пераапранацца,— поўная шчырасць.

— Ды нічога,— Аўгуст развёў рукамі, уздыхнуў. Канечне, гэтыя хлопцы нічога не ведалі і не бачылі. Логіка простая: забраў акты праверкі той, хто спалохаўся нечага. Відаць, награшыў, і яны мо ўчапіліся за нітачку. А раптам пацягнуць, і клубочак пакоціцца...

— Паслухайце, у нас жа засталіся запісы ў блакноце,— Аўгуст успомніў з сінімі вокладкамі блакноцік.

— Блакноцік таксама быў у папцы,— сумна сказаў Аляксеевіч.— Давай, мо хоць успомнім, што бачылі, але

ж там розныя лічбы, наблытаем. Дый не звычныя нашы галовы да лічбаў.

— Калі ў міліцыю заявіць?

— Ім і без нашых актаў ёсць чым займацца...

Аўгуста з Аляксеевічам выбралі ў групу народнага кантролю вясной, на агульным сходзе ўчастка. Тады ж Аляксеевіча віншавалі з шасцідзесяцігоддзем. Ён не згаджаўся быць у народным кантролі, маўляў, узрост, але і адмовіцца не змог. Бачыў, што ніхто гэтай працай не хоча займацца, кожны знаходзіў тысячы прычын. Увапхнулі з жартачкамі, гвалтам старога і маладога ў гэтую групу народнага кантролю, якая была бяссільная перад начальствам і прыслужвала яму, як прафком і камітэт камсамола. Урэшце, і партбюро. Але ж адмовіцца не змог, трэба штосьці рабіць, і паспрабавалі вось. Здаецца, зусім дробязь — праверылі расход матэрыялаў. Некаму перайшлі дарогу, перашкодзілі, ці што?

— І што цяпер? — спытаўся Аўгуст.— Усё роўна некаму сказаць трэба.

— Трэба... Канечне, трэба, але ніхто актаў не знойдзе нам. Давай пасля абеду пройдзем тым жа маршрутам.

— І што мы ўбачым,— скептычна сказаў Аўгуст.— Нічога не ўбачым... Трапілі б мне ў рукі тыя зладзеі, я б іх пакараў.

Ён нават уявіў, як гэтых зладзеяў караў бы. Свалата, поскудзі... Шкада, што не нарваліся яны на яго...

Яны з Аляксеевічам хацелі як найлепш, каб было сумленна. Некаму ж гэта пашкодзіла, не спадабалася. Але ж гэта зусім па-дзіцячы, зноў можна праверыць, знайсці канцы.

Аўгуст пачуў, як затупалі ў калідорчыку сантэхнікі, выходзілі на працу. Зазірнуў Гусак, павёў па пакойчыку рыжымі вачыма.

— Падыдзі сюды,— паклікаў Аўгуста.

— Чаго? — з неахвотай падняўся, павольна падышоў.— Ну?..

— Што шукаеш? — заміргалі рыжыя вочы.— Бачыў учора начальніка ўчастка і начальніка ўпраўлення?

— Не быў тут...

— А... Яны зранку хадзілі...

— І што? — схапіў Гусака за плячо, выцягнуў усяго з дзвярэй у пакой.— Былі яны ў вагончыку?

— Былі... Больш нічога не бачыў,— Гусак вырваў плячо з яго рук, хмыкнуў.— Будзь здароў і будзь гатоў...

«Усё-такі, мусіць, нешта ведае, а мо і не?..» — думаў Аўгуст.

— Што ён табе сказаў? — Аляксеевіч ужо стаяў ля жалезнай скрынкі, браў інструмент у торбачку.

— Нічога важнага...

— Нічога важнага, нічога важнага,— паўтарыў Аляксеевіч.

«Навошта гэта ім. Не трэба казаць нічога Аляксеевічу. Лепш падумаць самому».

У паветры лётала павуцінне, чаплялася за твар. На дварэ было цёпла, толькі лісце ўжо рудое, як вочы ў Гусака, маленькімі парашуцікамі падае на зямлю. Хмары паплылі некуды за далягляд, і неба чыстае, нібы дагледжанае дзіця. Не верыцца, што ўчора ішоў дождж, бо няма лужын. За машынай, якая вязе сюды жалезабетонныя панелі, узнімаецца пыл. Аўгуст стаіць на ганку вагончыка, глядзіць на неба, дарогу, людзей, пераапранутых ужо ў камбінезоны, і ўспамінае, што забыў узяць з сабой запісную кніжку. Яна не патрэбна яму. Аднак Аўгуст вяртаецца ў пакой, бярэ кніжачку з сабой, каб потым употай ад Аляксеевіча ў якой-небудзь кватэры, дзе будзе рабіць электраправодку, пачытаць нумары тэлефонаў і прозвішча, перапісаныя з паперкі. Ён грэе рукой у кішэні каленкоравыя вокладкі і нібыта трымаецца за руку дзяўчыны, чый голас гучыць у яго галаве.

Прыплюшчыўшы вочы, спрабуе ўявіць у памяці яе аблічча і бачыць, здаецца, танклявы твар, постаць, трохі згорбленую пад цяжарам, і касыя рыскі дажджу. Ён у суботу падымаецца з пасцелі рана, зробіць фіззарадку, памыецца халоднай вадой і выйдзе на вуліцу пагуляць. Купіць газету і пойдзе міма універсама да Свіслачы па парку, каб неяк паскорыць час. Непрыгожа будзе, калі пазвоніць зарана. Мо яна яшчэ снедае ці мыецца ў ваннай. Ён уявіў, як Галіна трымае ў руках відэлец, нож... Яго настрой абрывае Аляксеевіч сваім крыкам.

— Ідзі-тка сюды на хвілінку,— гукае ён з трэцяга паверха.

Аўгуст крочыць цераз прыступку, хапаючыся за парэнчы рукой, дазваляе сабе пасвістваць нейкую ме-

лодыю, што выпадкова трапіла на язык. Аляксеевіч у трохпакаёвай кватэры, стаіць на каленях, нахіліўшыся тварам да падлогі.

— Зірні сюды,— ён паказвае на чорную пляму на паркеце,— гэта, няйнакш, як выпацкана сажай, і вось — папера, што палілі тут. Які ж вар'ят надумаў на паркеце разводзіць вогнішча? Ці гэта проста палілі паперу і кідалі на падлогу?

Аўгуст падымае абгрызены агнём аркушык. На паперы ягонае прозвішча і апошняя літара з доўгім, быццам у мышы, хвастом. Гэта яго подпіс. І цяпер ён разумее, што гэта рэшткі іхніх з Аляксеевічам актаў.

## 4

У кватэры Астапа Корзуна ва ўсіх пакоях, на кухні, у ваннай, туалеце гарэлі электрычныя лямпачкі. Было светла і прасторна, нібыта гаспадары толькі што атрымалі жытло, не загрувасцілі яго мэбляй. Пасярод гасцінай стаяла раскладушка з прарваным і зашмальцаваным брызентам, а на ёй ляжала коўдра. На падлозе проста пад акном маленькі тэлевізар з антэнай, як жук з вусамі. У спальні і ў дзіцячым пакоі гэткія ж раскладушкі з пракату. Па кватэры старыя газеты, розная папера. У калідоры з шафы тырчаў вялізны чамадан, які калісь называлі «Вялікая Германія». Жартавалі, што ў такіх чамаданах нашы афіцэры пасля вайны вывезлі палову Германіі. У шафах напакаваныя кардонныя скрынкі, сумкі, торбы і торбачкі. Нібы вартуючы гэтае дабро, у калідоры сядзеў адкормлены з гладкай поўсцю дог Генры, малады яшчэ сабака, якога Астап Корзун упадабаў летась шчанюком на кірмашы каля Камсамольскага возера. Генры зрэдзь узнімаў ад касматых лап шыракалобую галаву і неяк сумна екатаў. Гэтак, кажуць, сабака бядуе па гаспадару, які памёр.

Астап Корзун быў адзін, жонка ў абед з дзецьмі завінулася ў госці да сяброўкі Мані з Нямігі. Ён трохі паглядзеў тэлевізар, але стала штосьці самотна, выключыў яго. Дый сабака нібы здурнеў: вые і вые, слухаць ужо немагчыма.

Мо разоў дзесяць абышоў Корзун кватэру, мераючы

яе крокамі. Пад нагамі шапацела папера, быццам на якім сметніку. Ён тут як падмятайла — злавіў сябе на думцы. Да д'ябла паляцела работа бібліятэкара, якую любіў, і ўсё астатняе. Корзун, цяжка дыхаючы з-за вялікага жывата, якога ўжо не трымаў рэмень, апусціўся на калені. Было варта, канечне, зняць светлыя палатняныя штаны, але ўрэшце якая розніца. Ён поўз на каленях, збіраў у кучу газеты і паперу, пакідаючы за сабой на падлозе два шырокія няроўныя паскі. Праз якую хвіліну Корзун як папоўзаў у ручаі. Ён так даўно не пацеў, што хоць выціскай кашулю. А ля парога параней шаму выў і скавытаў сабака.

— Змоўкні! — крыкнуў Корзун, і Генры спалохана затуліў морду ў лапах. Аднак хутка зноў завыў.

— Здыхні! — кінуў жмут паперы. Каля акна, ухапіўшыся за сцяну, устаў на ногі. Ён агледзеўся вакол, павольна варочаючы галавой і трымаючы руку на шыі, нібыта балела яна. Ад пустэчы і адзіноцтва захацелася заскавытаць, як сабаку.

Корзун адчыніў насцеж акно, і свежае паветра імкліва запоўніла кватэру. Яму раптам захацелася пабегчы на вуліцу. Аднак не мог, не хапіла б сілы, дый смешна, калі б ён трухаў па вуліцы. Людзі надарвалі б жываты. Хоць чаму ўвесь час ён павінен думаць пра тое, што нехта скажа пра яго. Вось надзеў на сябе чалавек вуздэчку, добраахвотна закілзаўся, сам на сабе едзе і дубцом, дубцом сябе. Ён больш не хоча гэтак жыць.

— Я не хачу! — прашаптаў Корзун, але яму здалося, што закрычаў і гэта пачулі нават на вуліцы. Хай ляцяць яго словы далёка-далёка. Корзун расшпіліў каўнер кашулі і гукнуў, але замест магутнага крыку толькі ледзь пачуўся піск.

За шмат гадоў Астап Корзун прывык у гэткі вячаровы час прылегчы на канапе перад тэлевізарам. Ні аб чым не думаючы, драмаць пад музыку альбо гаману дыктара. У крэслах побач дзеці і жонка: хто кніжку гартае, а хто чытае. І так было штодзень, ён ніколі не мог уявіць, што ў кватэры будзе пуста, мэблю яны прададуць за паўцаны, таму што больш чакаць няма як. Божа ж мілы, а куды яны спяшаюцца і навошта? Можа б, і прыпыніўся, але ўжо цягнік не спыніць. Нагу ці руку не падставіш, адсячэ. Гэта лёс, які, мусіць, быў наканаваны яму, Корзуну. Ён спярша ўпар-

ціўся, а потым аслаб ад напружання, ад цяжару, што ціснуў на яго, і не вытрымаў. Ён слабы чалавек, дзяцей шкада, жонкі, кватэры, мэблі, сіл, якія ў гэтых сценах, падлозе, зямлі. І не пакладзеш у чамадан, хоць няхай гэта і «Вялікая Германія». Яму страшна, вельмі страшна. І не паверыць у гэта толькі той, хто не адчуў, не перажыў зняважлівых позіркаў суседзяў, калег па працы. Для іх ён вораг, нікчэмны чалавек.

Корзун ад гэтых думак зусім аслаб і, цягнучы ногі, як дзед, павалокся з гасцінай. Ён абходзіў кватэру з пакоя ў пакой, панура гледзячы на пустыя сцены, і яму раптам здалося, што ён на караблі, які вось-вось зачарпне ў сваё чэрава вады і знікне глыбока на самым дне. Як гэта можа быць, ён не ведаў, ніколі ў жыцці нават не быў на караблі і чаму гэта павінен быць карабель? Перад вачыма нават захісталася падлога, як палуба. А ён хто на гэтым караблі? Пацук?

На кухні з усяго гарнітура застаўся стол — кульгавы недалэнга, ніхто не ўзяў і задарма. Корзун прысеў ля яго і адчуў крыху палёгку нагам, жывату, усяму целу. Соннымі вачыма абводзіў кухню, успамінаў. Мо год назад у яго быў выхадны дзень. Куды ён хадзіў і што бачыў, не помніў, але дакладна тое, што ў гастраноме на Батанічнай купіў бутэльку гарэлкі. Вось цюкнула нешта, прастаяў у чарзе чатыры гадзіны, узяў, але жонцы не гаварыў. Бутэльку не паставіў у бар, а чамусьці схаваў. Толькі дзе, у якім месцы і навошта? Каб зараз хто мог сказаць... Корзун яскрава бачыў перад сабой бутэльку, проста адчуваў далонню яе, але дзе яна? На кухні і шукаць не варта, у туалеце на падлозе таксама нічога няма. Укленчыў ля ванны і засунуў пад спод яе ў далёкі цёмны куток руку, праз тканіну, у якую яна была загорнута, намацаў гладкі бок бутэлькі. Яна была ўжо ў павуцінні, як у рыбацкай сетцы, у шэрым пыле. Корзун паставіў яе сабе на калена, разгарнуў пакунак. Чамусьці ўсміхнуўшыся, вярнуўся да стала-недалэнгі. Сёння нейкае свята... Якое? — паспрабаваў ён успомніць. Ва ўсіх кватэрах святкавалі, грымела музыка, гучалі вясёлыя галасы. Ім радасна, яны шчаслівыя, а ён горшы ці дурнейшы за іх. Ён вып'е столькі, колькі захоча, каб пазайздросцілі яму і пашкадавалі, што самі не могуць быць там, дзе ён. «Ха-ха-ха!» — зарагатаў Корзун, разадраў бляшку на бутэльцы і наліў паўшклянкі гарэлкі.

Ён ніколі многа не піў, найбольш сто грамаў на вялікае свята. Панюхаў вадкасць і, зморшчыўшыся, кульнуў у рот. Як звычайна, спачатку апякло горла, а потым стала цёпла і весела. Корзун, не закусваючы, наліў сабе яшчэ паўшклянкі. «Вучыць шчэ будуць... Еду, ну, еду... Каму якая сабачая справа!!!»

— Я еду ў Канаду, у Канаду, так хачу,— выгукнуў ён на ўсю моц. Адкінуў убок табурэтку і пусціўся ў скокі. Яму здавалася, што хутка танцуе, бо ўжо сцяло дыханне, і замест ног былі асінавыя калы. Аднак ён тупаў і тупаў. Відаць, унізе ў суседа хісталася лямпа, а мо і сыпалася тынкоўка са столі. Пачалі ляпаць па трубе, але Корзун скакаў, і невядома адкуль тая сіла ў ім. «Ляпай, ляпай...» — са злосцю думаў ён і хоць ужо не падскокваў, а нагамі ўсё грукаў. Нарэшце зусім аслаб і, не дайшоўшы да стала, ля сцяны споўз на падлогу.

Успацелыя чорныя валасы зблыталіся, адкрылі ружовую на паўгалавы лысіну. Корзун трохі адпачыў, але вясёлы, упэўнены настрой змянілі злосць і нейкая нянавісць да ўсяго на свеце. Ён нават заскрыгітаў зубамі, здалося, што ў ім ёсць сіла знішчыць кожнага, хто зараз паспрабуе ў нечым перашкодзіць яму.

З бутэлькай і шклянкай Корзун перайшоў у гасцінную да расчыненага акна. Ён праз цемрадзь, якая панавала на дварэ, глядзеў на суседні дом, азіраўся на вокны свайго дома, у якім пражыў без малога восем гадоў. Неспадзеўкі ўсплыла ў галаве думка, якая ўжо неаднойчы не давала спакойна спаць, працаваць, жыць. Можа, ён начытаўся зашмат кніжак: Дастаеўскага, Талстога, Трыфанава. Гэта лічыла так нябожчыца маці. «Калі б ты менш чытаў, а больш думаў, то не сядзеў бы ў бібліятэцы, а ў якімсь міністэрстве...» Ей бог даў галаву міністра, але яна ўсё жыццё пражыла цяжка.

Корзун хіснуўся, але не разліў са шклянкі ні кроплі. Гарэлка была цёплая і непрыемная, але ён прымусіў сябе выпіць да дна. З хвіліну нічога не мог зразумець, таму што ў галаву нібыта налілі кіпню. Корзун ажно захрыпеў і абедзвюма рукамі схапіўся за горла. Бутэлька ўпала ля ног на лінолеум, а шклянка — проста на асфальт. У вачах пагойдваліся агні суседняга дома, у вушах звінела разбітае шкло. Ха-ха-ха, можа, для каго ён і бібліятэкар, чарвяк, а для сябе ён... Напалеон. На

здзіўленне ясна Корзун успомніў з рамана Дастаеўскага «Злачынства і пакаранне»: «усё ў руках чалавека, і ўсё ён міма носа праносіць адзіна ад адной баязлівасці... гэта ўжо аксіёма... Цікава, чаго людзі больш за ўсё баяцца? Новага кроку, новага ўласнага слова яны найбольш баяцца...» «І я ж баюся... Усё жыццё як моль у кніжным пыле...»

Аднак урэшце ён перамог сваю баязлівасць. Якая розніца, што думаюць суседзі, былыя калегі. Гэта ўсё мінулае, прэч яго з душы, з сэрца. Якія ў іх былі твары, калі ён сказаў, што вырашыў ехаць да сваякоў за мяжу. Як параліч разбіў. У Марыі Антонаўны ажно ніжняя губа абвісла ад здзіўлення. Як жа ж прывыклі: Астап Леанідавіч, прынясіце кніжкі, Астап Леанідавіч, застаньцеся на паўгадзінкі. Во, дурня знайшлі, закілзалі і ехалі, як на асле, за капейкі. Не давалі з голаду памерці, але і жыць...

Корзун ухапіў з падлогі за рыльца бутэльку і, асалавела гледзячы сабе пад ногі, пацягнуўся зноў на кухню. Нібы хтосьці яго падштурхнуў і шапнуў на вуха: «Ідзі...» Лепш за ўсё было б зараз легчы на раскладушку і заснуць. Звычайна так і было пасля ста грамаў: яму хацелася спаць, толькі спаць, а болей нічога. Чамусьці сон прапаў, ногі ўсё ішлі, перастаў нават адчуваць цяжар свайго цела. У калідоры Корзун спыніўся ад думкі, якая проста ўразіла яго, ён даўно яе шукаў і не знаходзіў, а зараз яна выплыла як збавенне ад сумлення, што грызла яго штодня з той гадзіны, як вырашыў канчаткова ехаць у гэтую, магчыма, нерэальную казку-краіну. Ён сам сабе гаспадар, яго дзяржава — сям'я, дзеці, жонка. Для сваёй дзяржавы ён адшукае зямлю, на якой будзе рай. Ніхто ўжо яму не перашкодзіць. Досыць дыхаць кніжным пылам, калі месца Астапу Корзуну недзе побач з міністрам. Канечне, людзі — як мухі, ім усё роўна і сала, і мёд. Ён не хоча быць мухай, ён пчала, нават чмель. Корзун стаў на адну нагу і замахаў рукамі, як крыламі, і ледзь не ўпаў, жывот перавжыў.

Жонка, калі ад'язджала да сяброўкі, папярэдзіла яго, што, мабыць, заначуе. Праз увесь горад з малымі не надта прыемна ў такі час валэндацца, шукаць гуза на галаву. Ён з гэтым быў поўнасцю, на сто працэнтаў, згодзен. Ягоная жонка вялікая разумніца, не абы-якая жанчына. Яму хоць у адным пакуль пашэнціла; добрая

жонка і, канечне ж, дзеці. Скажаш ім слова, а яны табе дваццаць, ды такіх, што ніколі не прыдумаў бы, хоць і прачытаў Талстога і Гогаля, Дастаеўскага і Трыфанава, Янку Купалу і Якуба Коласа. Мусіць, замнога было ў яго пад рукамі кніжак, дый без карысці...

Корзун сеў на чамадан і толькі пасля ўспомніў, што ў ім посуд. Ён не зварухнуўся, хоць сервізам мо ўжо была хана. Насупраць яго на сцяне з блакітнымі шпалерамі ў люстэрку панура сядзеў невядомага ўзросту мужчына. Быццам падобны на Корзуна, але ў той жа час зусім незнаёмы яму. У яго ніколі, здаецца, не было мокрых губ, твар быў ружовы і гладкі, а не азызлы, з шэраю, як падпаленая сонцам атава, шчацінаю. Ён падняў руку, потым другую, і чалавек у люстэрку зрабіў гэткі рух. Корзун прыплюшчыў вочы, і праз вузенькія шчыліны было відаць, што яму ўсміхаліся ўжо два, нават тры таўстуны з абвіслай ніжняй губою.

Ён схаваў свой твар у далонях, хвіліну альбо дзве чакаў са страхам, асцярожна глянуў ў люстэрка і, перамагаючы сябе, прыхіліўся лбом да халоднага шкла. Гэта ўсё ад кніжнага пылу, ад молі і чарвякоў, з якімі ён стаў раўня. Мама была на тры галавы разумнейшая за шмат каго, а ён, ёлупень, не слухаў, белы свет яму быў за родную мацерку. Навука, навука! — Корзун ударыў сябе кулаком у лоб, намерыўся яшчэ раз, але ўжо і так забалела галава.

Спаць не хацелася, хоць усе гэтыя дні было шмат тузаніны, нервознасці. Нібыта ў хаце пажар, і нельга адчыніць дзверы, іх заклініла, здаецца, што няма выйсця. Думалася, а раптам зноў адмовяць, прымусяць вярнуцца ў кватэру... Мо так і лепш было б. Але ніхто яго не паверне, ён дасягнуў таго, чаго хацеў, пра што турбаваўся. Хто бы ведаў, дзе добра, а дзе блага. Адзін кажа, што гэта белае, другі — чорнае. Суседзі адварочваюцца і каторыя ўжо не вітаюцца. Што, ён горшы за іх? Ёсць свая галава мо і яшчэ сякі-такі розум, хоць і не як у мамы, якая часам гаварыла, быццам Саламон. Яна, канечне, скептычна аднеслася да ўсіх пераездаў, ад'ездаў, але перад смерцю наогул не выказвала сваёй думкі пра гэта. Ці было ёй усё роўна?..

Корзун зноў патупаў па кватэры, выйшаў на балкон, трохі пастаяў, слухаючы вуліцу. Ужо зрэдзь толькі блішчэла святло ў вокнах дамоў. Недзе на суседняй вуліцы выспеўвалі, з прыпеўкамі і свістам. Ён ніколі

ў жыцці вось так з песняй, з крыкамі не хадзіў, ніхто не чуў, каб спяваў. Нейк некультурна дзерці горла. На гэта здольны які-небудзь слесар, цясляр, будаўнік... З імі нецікава яму, пра што гаварыць? Пра тое, колькі выпілі, дзе і якога вінца... Але сёння варта было б з падскокам прайсці па вуліцах горада і крычаць так, каб хто спіць — прачнуўся, а хто збіраецца ў ложак — не заснуў. Вычварыць што-небудзь, і ўсе здзівяцца. О, якія будуць твары ў суседзяў: гэта ж трэба, хто мог падумаць! «Я нічога не баюся, магу зрабіць што хачу...» — думаў Корзун.

Генры падняў ад падлогі галаву і застагнаў, нібы штось яму балела. Ніколі ў іхняй кватэры не было сабак. Генры першы ў яго жыцці і, мусіць, апошні. Проста жонцы па сакрэце шапнула Маня з Нямігі, што быццам там, куды яны сабраліся ехаць, сабакі ў цане. Можна будзе Генры прадаць за добрую торбу грошай: долараў ці якіх там фунтаў стэрлінгаў. Напачатку хопіць для падтрымкі штаноў. «Эх ты, друг чалавека!» — Корзун нахіліўся над догам, пачухрыў рукою ў яго за вухам. Сабака напружыўся,быццам для скачка, і поўсць узнялася, як іголкі ў вожыка.

— Ну, ну, ну! — Корзун пагразіў Генры пальцам.— Не бунтуй, а то... зубы выб'ю.

Сабака, нібыта зразумеўшы гэтыя словы, гыркнуў і вышчарыў пашчу.

— Эх ты! — уздыхнуў Корзун. Генры не прызнаваў гаспадара. Хто ж тады паслухае яго, калі нават сабачка... Пра што можна думаць і гаварыць беднаму чалавеку, які неспадзеўкі сышоў з рэек. Корзун дапіў гарэлку, прысеў недалёка ад сабакі, крыху паплакаў дурнымі п'янымі слязьмі. Потым халоднай вадой памыў замурзаны твар, узяў са стала нож і палажыў яго ў кішэню штаноў і спыніўся, не ведаючы, што рабіць далей.

Раптам Корзун успомніў словы песні, чутай недзе вельмі даўно, а дзе — і не ўспомніць. Дый навошта памятаць розную драбязу. Аднак песня душыць, муляе горла, і яно не вытрымлівае націску: «Эх, сяджу на нарах, як кароль на імянінах...»

Корзун мо разы тры прасіпеў куплет і, стомлены нязвычнай для сябе работай, змоўк. Цяпер з галавы зніклі ўсялякія думкі і толькі незразумелы цяжар ціснуў на патыліцу і, здавалася, былі прыкутымі ногі да

падлогі. Невядома якая патрэбна была сіла, каб адарваць. Корзун варухнуўся туды-сюды і здзівіўся, што ўсё-такі цела падуладнае яму. Сабака ўважліва, са смуткам глядзіць на гаспадара, потым лапаю дзярэ па падлозе, нібыта хоча памагчы. Як самотна на душы, хоць ты завый, як Генры. І хто яго гоніць у шыю некуды ехаць. Няхай там рай з боскімі яблыкамі і малочнымі рэкамі, але ці будзе гэтак жа, як дома. Васіль Сямёнавіч гаварыў, што намнога лепш, а чамусьці сам не едзе. У галаве нібы дзірка, праз якую скразняк выдзьмуў увесь розум, і ў нагах — дзіркі, і ў сэрцы — дзірка... Кніжны чарвяк здурнеў ад свежага паветра, не хапае пылу, без якога нецікавае жыццё. Аднак праверым, ці ёсць у нагах дзіркі... Корзун стаў спярша на карачкі, а потым як сагнутае дрэва, выпрастаўся ля сцяны на ўвесь рост. Трохі пагойдваліся дзверы, сабака, падлога ўваччу і спакваля заціхлі, бы прыбітыя цвікамі да роўнага месца.

5

Як моцна ўколаты іголкай, Корзун кружыў па кватэры. Вярнуўся ў калідор і, як прачнуўшыся, спыніўся перад дзвярыма, бы зачараваны чорным замком. Рукі самі пацягнуліся да яго. Рэзка павярнуў блішчасты гузік, замок амаль бязгучна адчыніўся. За парогам была цемра і нейкая дзіўная цішыня, якой не было ў кватэры. Ён стаў ля адчыненых дзвярэй, паслухаў гэтую цішыню. Яго замаруджанасць зварухнуў лёгенькі стук, нібыта хтось пашараваў жалезам аб жалеза. Аднак Корзун якую хвіліну баяўся сысці з месца. Яму стала знобка, і ён захінуў кашулю на грудзях, зашпіліў гузікі. Няўтульна стаяць у цемры. Якісь вар'ят разбіў на пляцоўцы лямпачку, ён сам укруціў быў яе на тым тыдні. Каму было дрэнна ад таго, што светла вакол? Што стала з вамі, людзі, як знішчыла вашы душы таталітарная сістэма?.. Усё пустэча, ашуканства... «Не хачу жыць чарвяком, хачу — чалавекам...»

Забалела галава, і Корзун застагнаў, праклінаючы сябе. Навошта ён піў гэтую гадасць, якую ніколі не любіў. Раней не верыў, што ад гарэлкі моцна баліць галава, дый надта яна не паслухмяная, нібыта чужая. Каб была дома жонка, гвалт узняла б на ўсю ваколіцу. Канечне ж, пры ёй не шукаў бы гэтую бутэльку і не

піў гадасць, ад якой нібыта здурнеў. Усё, дамоў на раскладушку і — спаць, спаць, мо тады будзе лягчэй целу.

Ён памалу развярнуў сваё непаслухмянае цела тварам да дзвярэй і аслабелай рукой націснуў у тым месцы, дзе адчуў халоднае жалеза замка. Чамусьці ляпнуўся аб сцяну, хоць ведаў, што стаіць перад дзвярыма, якіх не зачыняў. Тады паспрабаваў адкрыць іх дзвюма рукамі. Нібы хтось ускочыў у кватэру і магутным плячом трымаў дзверы. Корзун узлаваўся і наваліўся на перашкоду ўсім целам. Цяпер ён спалохаўся, скрозь тлум у галаве ўсё-ткі змікіціў; дзверы зачыненыя, а ключы засталіся ў кватэры.

На лесвіцы было цёмна, як у кнігасховішчы, калі выключана электрычнае святло. Там Корзун часам параўноўваў яго з турмой, хоць у турме ніколі не сядзеў, але здавалася, што менавіта ў камеры такі пах і паветра. Корзун панюхаў: усё тое ж. «Як я пражыў столькі ў гэтым доме,— падумаў ён,— нешта пахне, нібы ў хляве...» Хоць за сваё жыццё ён ніколі не быў у хляве, з горада ездзіў толькі на адпачынак і то на поўдзень, да Чорнага мора — там жылі сваякі па жонцы. Сёння ўсе яго пачуцці і свядомасць, яго арганізм пратэставалі супраць абмалёваных сцен самадзейнымі мастакамі, паху са смеццеправода, цемры ў калідоры. Калі раней ён гэта не заўважаў, яму было ўсё роўна, дык цяпер усё было кепска: ад зямлі да неба ў гэтым месцы, у гэтым горадзе, у гэтай краіне. Развагі і сумненні раптам зніклі, як пыл, што здзьмуў вецер. У гэты момант Корзун ужо не думаў, што мо не варта кудысь ехаць, нечага шукаць у невядомым, якое адны моцна хвалілі, а іншыя моцна ганілі. Ён адкінуў ад сябе свае сумненні. У шматлікіх кнігах ён знаходзіў гэтую думку: найважней за ўсё чалавеку воля. Ці быў вольны дагэтуль, ці мог сказаць, што думаў? Паўшэптам і з упэўненасцю, што ніхто не данясе ў райком ці сакратару партарганізацыі. Але лепш зусім нічога не казаць і нікому, а заставацца сам-насам са сваімі меркаваннямі. Канечне, ён гэтак выхаваны маткай, якая так напалохалася пры Сталіне, што да смерці не магла развітацца са страхам. І гэты страх увесь час жыў і ў ім, душыў яго, прымушаў галаву ўгінаць у плечы і лічыць сябе божым канём, калі гэтак лічыў начальнік. І ўсё-ткі Астап Корзун — чалавек, рабом ён не хоча болей быць,

для яго найважней за ўсё воля і ён нарэшце атрымае яе. Хай што хочуць думаюць пра яго ў гэтай краіне...

Недзе на трэцім альбо чацвёртым паверсе Корзун ледзьве не грымнуў усім целам на бетонную падлогу, паспеў учапіцца за ручку ў акне, аднак усё роўна выцяўся сцягном.

З болем крыху праяснілa ў галаве, а пасля як пад ціскам нахлынуў туман, зрабілася яшчэ горш. Корзун ужо цішэй, трымаючыся рукамі за сцяну, нагамі намацваў прыступкі і поўз уніз.

Такога, канечне, не было ў яго жыцці. Ніводзін чалавек не бачыў Корзуна на падпітку, а тым болей каб лыка не вязаў. Усё гэта ад таго... Ад чаго? Ён не знайшоў адказу сабе, думкі рваліся, быццам ператрухлелыя вяроўкі пад цяжарам уцекача з турмы. Чаму турма? Усё-ткі дарма ён выйшаў на вуліцу, трэба было легчы на раскладушку альбо на падлогу, балазе жонкі няма ў хаце і ніхто б не дудзеў у вуха, не прымушаў распранацца, бо на гэта ў яго ўжо сілы не хапіла б.

Ля пад'езда ён сядзеў на лавачцы, якая была цёплая, быццам на ёй толькі што людзі пасядзелі і пайшлі па кватэрах. Дый там-сям святло было ў вокнах, нехта яшчэ не спаў. Мусіць, балявалі ў кватэры Паўла Пілінавіча, які вельмі прыстойны на выгляд чалавек, былы ж намміністра. «Чыноўнік, свалата,— раптам падумаў Корзун,— гэта з-за яго я ад'язджаю з краіны... Ніяк не наядуцца...» Думкі выцякалі з галавы, як вада з разбітага кубка, вочы заплюшчваліся. Ужо засынаючы, праз туман ён пачуў, што захроп. Гэта, напэўна, яго разбудзіла, і Корзун падняўся з небяспечнай лаўкі і, хістаючыся, павалокся ўздоўж дома. Вось калі б міліцыя натрапіла альбо гэтыя з чырвонымі павязкамі. Быў бы ім для плана... Дулю б яму паказалі, а не замяжу. Ён прашаптаў дрыготкімі губамі: «Божа мой, якое глупства, якое глупства!..» Што было глупства, Корзун пакуль не ведаў. Нарэшце зразумеў: жыў няправільна — гэта і ёсць глупства.

Яму надакучыла ісці, дому не было канца. Да сённяшняга дня не мог уцяміць, як атрымаў кватэру тут. Гэты дом быў для мінскай эліты, і звычайна яна не дапускала да сябе такіх, як Корзун. Яму пашэнціла, бо дырэктар бібліятэкі захацеў пасяліцца ў «бабровым запаведніку», як называлі мікрараён вуліцы Пуліхава,

і зрабіў шырокі жэст: ахвяраваў старую кватэру свайму супрацоўніку. О; няўдзячнасць чалавека, які ад'язджае за мяжу, напляваўшы на ўсіх калег, не думаючы, што ім давядзецца адказваць за яго, што нехта атрымае вымову. Корзун нікога не ведаў у гэтым доме, акрамя прафесара Зушчыца Вацлава Казіміравіча, яны часта сустракаліся ў бібліятэцы, калі Зушчыц пісаў доктарскую, вялі размовы пра літаратуру. Ну і яшчэ — бачыў, як Павел Піліпавіч да пенсіі штодзень ездзіў на чорнай «Волзе», а яшчэ больш за яго — жонка. Цьфу, цьфу... Толькі цяпер Корзун заўважыў, што імжыць дождж, халодны ці цёплы — усё роўна. Амаль цвяроза падумаў, што змые з яго цяжар ад гарэлкі, якую не хацеў піць і нават у галаве такога не было. Проста благі настрой дый смутак, што дзярэ душу, як экскаватар зямлю.

Калі яму было кепска, ён чытаў для сябе вершы. Найбольш любіў Купалу, Коласа і рускіх паэтаў пачатку стагоддзя. Заплюшчваў вочы і чытаў вершы, глытаў іх, як пілюлі ад хваробы, не слухаючы, што пра яго гавораць на сходзе альбо крычыць начальства. Ён паспрабаваў зрабіць гэтак жа і цяпер. Але акрамя радкоў Ганны Ахматавай: «В узких каналах уже не струится — стынет вода. Здесь никогда ничего не случится.— О, никогда!» — нічога не мог прыпомніць. Паўтарыў іх некалькі разоў і заблытаўся, праз хвіліну і яны зніклі з памяці. Ён супакоіўся, што гэта дробязь, паспіць, галава адпачне, і ён зноў прачытае сотні вершаў, якія жывуць у ім, проста часова заснулі, зачынілі за сабой брамку, але ён адамкне яе.

У кватэры Паўла Піліпавіча па-ранейшаму гарэла святло, спявалі. «Не спіць... Святкуе?..» Корзун не спыніўся ля свайго пад'езда, прайшоў да бойлернай, пастаяў, гледзячы на другі паверх дома. Пасля, нават не разумеючы, навошта ідзе, рушыў наўпрост праз клумбу да тэлефонных будак. Увайшоў у першую ж і зняў з рычага трубку. Ён паслухаў крыху яе гуд, крутнуў дыск раз-другі-трэці, здзівіўся, што тэлефон зусім маўчыць. Там, дзе выгрушчылі шыбу, дзьмуў гуллівы вецер. Корзун павярнуўся да яго спіной, пераклаў тэлефонную трубку з правай рукі ў левую. Было відаць, што нехта ў кватэры Паўла Піліпавіча падышоў да акна, высокі і, мабыць, малады... «Балююць усё...» — зайздросная думка мільганула ў Корзуна. Весела ім,

утульна, а ён, бы сабака, туляецца па двары, і яму так дрэнна, як, пэўна, яшчэ ніколі не было. У іх ніякіх праблем, жывуць лепш за Радзівілаў. Савецкія паны... Сапсавалі ім настрой, сапсавалі, каб сэрца затукала да болю, каб было крыху страшна, каб падумалі, што зноў вернуцца туды, адкуль прыйшлі. «Выйшлі мы ўсе з народа, як бы вярнуцца назад...» Чорта яны самі вернуцца. Хай крыху пахвалююцца. Чорт іх не возьме.

Корзун пазваніў у даведку па 09, назваў прозвішча і адрас Паўла Піліпавіча. Калі пачуў нумар, успомніў, што некалі яго ведаў. Але скуль?.. Корзун зірнуў на гадзіннік — было позна, і іншым разам ён ніколі не патурбаваў бы чалавека. Сёння — мора па калена.

Нават у маладосці ён ніколі ў такі позні час не затрымліваўся на вуліцы. Мама не любіла, каб недзе гуляў з сябрамі, а тым больш з жанчынамі. Ёй усё жыццё здавалася, што калі Астап будзе ісці ўначы адзін па вуліцы, яго абрабуюць і могуць забіць. Яна не магла забыць, як у дваццатым на Нямізе зарэзалі іхняга суседа яўрэя ювеліра Шульмана з сям'ёй: адчыніла дзверы, каб папрасіць у багатага грамадзяніна Ідзі сто рублёў да канца месяца і ўбачыла кроў, раку крыві. А найбольш маці не хацела, каб з'явілася ў кватэры чужая жанчына. Яна не магла ўявіць, што Астап будзе слухацца і падпарадкоўвацца не ёй. Дала згоду на яго вяселле, калі яму ўжо было за трыццаць, а нявесту пасватала сяброўка цётка Адэля з Нямігі.

Ён ніколі не быў хуліганам, ні разу ў жыцці ні з кім не біўся, але адчуваў, што у ім сядзіць насцярожаны звер — жаданне нешта вычварыць, пайсці насуперак маці, начальству, жонцы, самому сабе, але ён стрымліваў гэтага звера, таму што ім валодаў страх. Страх кіраваў яго дзеяннем і — усіх астатніх людзей. Калі б не страх, не было б ні міру, ні спакою, ні шчасця. Яго ў гэтым пераканала маці і амаль штодня, як пацеры, паўтарала, баючыся, што сын не слухае. Ён, канечне, ужо не хацеў чуць, але не мог нічога зрабіць, нават закрычаць на яе, выйсці за дзверы, сядзеў паўсонны і абыякавы, нібы прыгавораны да смерці. Аднак павінен быць урэшце ў кожнага чалавека нейкі момант, калі ён абудзіцца ад сну і зробіць штосьці такое, аб чым ніхто на свеце не дадумаўся. У гэткія імгненні людзі здольныя на подзвіг, на вялікае здзяйсненне...

«Яшчэ не спяць»,— зноў зірнуў Корзун на асветле-

ныя вокны і, прыпамінаючы нумар, пачаў круціць дыск тэлефона. Па даху забарабаніў рэдкі дождж, у будцы было цёпла, як у хаце.

— Ало, ало! — здаецца, зусім побач пачуў голас Паўла Піліпавіча і разгублена павесіў трубку. Надта ж падзейнічалі начальніцкія ноткі, ніколі яшчэ не даводзілася размаўляць з намеснікам міністра, хоць і былым. Праз хвіліну набраў зноў нумар. Ён падлічыў: Павел Піліпавіч пяць разоў сказаў «ало», і тады Корзун прамовіў: «Ало...»

— Ало! — радасна закрычаў Павел Піліпавіч.

Страх пачынаў заціскаць у абцугі волю, ужо шкадаваў, навошта пазваніў, але ўзяў верх насцярожаны звер, які столькі часу хаваўся ў душы. Корзун, не пазнаючы свайго голасу, прахрыпеў:

— Ало!.. У вас...— галава ўжо варыла, хоць і не тое, што трэба,— гарачая вада ёсць?

— Ёсць...— адказаў Павел Піліпавіч.

— У бюракратаў усё ёсць. Наліце ў ванну, я прыйду мыцца, купацца. Дастаньце з халадзільніка сваю міністэрскую шынку і крабы, буду есці.— Пасля гэтых слоў у трубцы доўга маўчалі. Потым Корзун пачуў кашаль. «Яму ўсё жыццё было добра, панаваў, а мне было кепска. Хай і ён крыху патурбуецца, панервуецца»,— зласліва падумаў і, перачакаўшы кашаль, тонкім, як здавалася, жаночым голасам сказаў:

— Рыхтуйце чарку і скварку, чыстую пасцель, як дзеду Міхеду.

— Пайшоў ты...— прагучала ў трубцы некалькі адборных мацюкоў, і Павел Піліпавіч паклаў трубку.

Званіць зноў Корзун пабаяўся, а раптам выйдзе былы намміністра са сваімі гасцямі дый надае па карку. Мала гэтага: заўтра ўвесь дом будзе ведаць, што Астап Корзун вырабляў. «Во, інтэлігент смаркаты!» — скажа цётка Клаўдзя, гэтая пралетарка, якая гаворыць, нібы гарох сыпле. Гэта яшчэ не ўсё: паведамяць у міліцыю, іншыя органы і будзе, будзе...

Першай думкай цяпер было як хутчэй знікнуць адсюль. Ужо адчыніў дзверы, ступіў нагой на вуліцу і нечакана ўзнікла помслівая, злая думка, якая перамагла перасцярогу, усе астатнія пачуцці. Хто пойдзе ў гэткі час шнарыць па будках? Канечне, ніхто. Стары пень Павел Піліпавіч, напалоханы званкамі? Дый хто ведае, што яму званілі з гэтай тэлефоннай будкі, а не з горада.

Корзун вярнуўся ў будку, азірнуўся па баках, было вакол цёмна, толькі перад домам светлыя плямы ліхтароў. Ён выцягнуў з кішэні нож і шаркнуў па провадзе, што быў між трубкаю і апаратам. Адразу не перарэзаў. Яшчэ тры разы ўзмахваў нажом, а сэрца адчайна скакала і ногі аслаблі. Навошта гэта робіць, навошта гэта ўсё? Аднак не мог спыніцца. Калі б хто ішоў і загаварыў да яго, ён бы, мусіць, ад страху ўпаў бы на калені.

Але нікога не было, і Корзун адарваў нарэшце трубку ад апарата і, не ведаючы, што з ёй рабіць, шпурнуў прэч ад сябе. Ён на хвіліну нават перастаў дыхаць, прыслухаўся. Здалося, што хтосьці сюды ідзе, пачуў, як гамоняць. Корзун выскачыў з тэлефоннай будкі з неверагоднай для сваёй вагі хуткасцю і шыбануў у цемру.

6

Ніле Восіпаўне пашанцавала, яна ў Сыктыўкары якраз паспела на самалёт да Вожа. І недзе апоўдні была ўжо ў гэтым невялічкім паўночным гарадку з драўлянымі тратуарамі, дзесяткамі сабак на вуліцы. Цяпер трэба было шукаць спадарожны транспарт, каб дабрацца да Мірыка.

З паўгадзіны паблукаўшы па гарадку, Ніла Восіпаўна нарэшце выбралася на дарогу, якая вяла ў тайгу. На шчасце, у той бок рухалася шмат аўтобусаў, грузавікоў. Ехалі ўсё нафтавікі, гаманлівыя людзі, аброслыя барадамі. Яны і падвезлі Нілу Восіпаўну да шэрачырвонай камяніцы з драўлянымі прыбудовамі і прыбудовачкамі. Ужо было ўсё знаёмае: і вялізныя жоўтыя вароты, і калючы дрот, нацягнуты шматлікімі радамі, і постаць вартавога на вышцы. Ніла Восіпаўна ледзь не бегма падышла да гэтых жоўтых варот, не адчуваючы, што ў руках цяжкая сумка. Моцна калацілася сэрца, і было ажно млосна. Кожны раз, як прыязджала сюды, ёй рабілася страшна і ўсё не верылася, што за жоўтымі варотамі яе Мірык. Здавалася, што вартавыя з аўтаматамі, калючы дрот — гэта проста недарэчнасць, сон. Але яна магла рукой дакрануцца да халоднага жалеза варотаў, пастукаць у іх і ў аконцы ўбачыць вусаты твар ужо знаёмага прапаршчыка, якога яна баялася і ненавідзела. У яго было складанае для вы-

маўлення прозвішча — Перабурмыт. Ён доўга разглядваў праз аконца Нілу Восіпаўну, кашляў і ўрэшце сказаў:

— А...— і некаму нябачнаму за варотамі, мусіць, салдату загадаў: — Адчыняй!

Нешта ледзь чутна шчоўкнула, і ў варотах адчыніліся маленькія веснічкі. Перабурмыт падхапіў з яе рук сумку і павёў па вузкім, сціснутым з бакоў цаглянымі сценамі двары.

Неба змрочнае, у хмарах, і таму адчуванне, што вось-вось пачнецца пануры, бясконцы восеньскі дождж. І зусім шэрым стане двор, гэтая дарога яе пакут.

У Перабурмыта рыпелі бліскучыя боты, новая партупея на вышараваным ад доўгай службы шынялі. Яшчэ ў самалёце яна марыла, каб толькі не сустрэць гэтага вусатага прапаршчыка, і нібы наўмысна ён быў першы, хто спаткаў на парозе турмы. Зноў прыйдзецца, як і мінулыя разы, апусціць вочы, забыць аб сваёй годнасці і з вінаватай усмешкай аддаць яму падарунак. Інакш замест трох сутак яна з Мірыкам пабудзе адзін дзень. Гэтак у яе было спачатку, пакуль не падказалі добрыя людзі, чые сваякі таксама сядзелі ў гэтай калоніі. І, баючыся, каб Перабурмыт не перадумаў, усёткі чалавек, Ніла Восіпаўна абагнала яго і, зазіраючы ў вочы, зашаптала-загаварыла:

— Сувенір вам са сталіцы прывезла...

Яго твар не адрэагаваў, вочы застылі глядзелі ўперад.

— Калі б вам, Епіфан Арсенавіч, уручыць? — спяшалася яна выгаварыцца, вызваліць душу ад непрыемнага абавязку, каб супакоілася сумленне.

Ён скасіў вочы і грубым голасам асадзіў:

— Не мітусіся, будзе час... Не лезь, сказаў...

І Нілу Восіпаўну нібыта ўдарылі проста ў сэрца, бо так бесцырымонна з ёй яшчэ ніколі не гаварылі.

Цяпер жа яе, як кацянё, піхнулі носам, паказалі на месца, якое яна заслужыла. Так, так, заслужыла, раз яна — маці Мірыка. І гордасць згарнулася ў камяк, прыціхла, бо, мабыць, такая павага і павінна быць да маці злачынца. Яе віна ёсць у тым, што Мірык зараз у гэтых бараках... Але, зрэшты, у чым яна? Хоць яна любіла свайго сына гэтак жа, як і кожная іншая маці, і не хацела нічога яму благога. Але зноў мо ў мільённы раз спраўдзілася вялікая народная мудрасць: «не

засцерагайся ні ад сумы, ні ад турмы», пра якую пачала думаць пасля ўжо суда, калі пабыла ў гэтым глухім далёкім краі. Ніколі, мусіць, не знікнуць з памяці словы, яна будзе іх помніць да скону: «За хуліганскія дзеянні і калектыўнае рабаўніцтва ў нецвярозым стане прыгаварыць да васьмі гадоў пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму...»

У канцылярыі іх сустрэў немалады капітан у надзетай паверх кіцеля футравай безрукаўцы. Ён усё паціраў рукі, прытупваў нагамі. Хоць дзіўнага ў гэтым нічога не было, радыятары грэлі вельмі слаба, а мураваныя сцены, белыя, як у бальніцы, здавалася, патыхалі холадам.

Марудна ішоў час, і здалося, нібы яна ўжо цалюткі дзень сядзіць у гэтым пакоі. Прыслухоўвалася да кожнага гуку, спадзеючыся, што нарэшце ідзе Мірык.

Яго прывялі, калі Ніла Восіпаўна ўжо стамілася чакаць і ад нервовага перанапружання зусім замерзла, убачу ўзнік туман. Яе хітнула, бы ў самалёце, і яна пачула, што нумар 1253 з'явіўся. Знікла няўпэўненасць, вочы ачысціліся ад туману, скрозь які вырас Мірык. Яна ўскочыла з табурэткі і, забыўшыся пра сумачку, выпусціла яе з рук на падлогу... Некалькі крокаў — і яны абняліся. Ад Мірыка пахла дымам, смалой і казармай. Яна пачула, як гучна стукае яго сэрца, а рука, якая ляжала на яе плячы, дрыжала. Адхіліўшыся ад сына, яна зірнула ва ўпартыя чорныя вочы, шукаючы ў іх радасці ці хвалявання, але яны маўчалі, былі абыякавыя.

Ніла Восіпаўна адступіла трошкі ў бок ад сына. Капітан стаяў спіной да іх, гартаў кніжку на падаконніку. Яна далікатна кашлянула, і ён адразу павярнуўся. Зябка павёў плячыма, сказаў:

— Вам дазволена сустрэча на трое сутак. Згодна рэжыму...— нудна стаў чытаць пункты правілаў для наведнікаў папраўча-працоўных устаноў. Ніла Восіпаўна іх ужо ведала на памяць і сама магла расказаць, што можна перадаваць сыну з рэчаў, прадуктаў, а што забаронена.

—Спадзяюся, што разумееце ўсю адказнасць? — капітан звяртаўся да яе.

— Канечне, разумею,— неспадзявана для сябе неяк какетліва адказала Ніла Восіпаўна.

— А вы, Белакасцецкі?

— І я таксама, грамадзянін начальнік,— бадзёра выгукнуў Мірык.

Іх за вароты правёў прапаршчык Перабурмыт. Доўга адчыняў веснічкі, бурчаў штосьці сабе пад нос, незадаволена паглядваў на Нілу Восіпаўну. Яны ўжо адышлі ад турмы метраў дваццаць, як Перабурмыт загукаў, спыніў. Яна спалохалася, што мо перадумалі, вернуць назад Мірыка. Дый у сына былі разгубленыя вочы.

Перабурмыт падышоў да іх, паклаў руку на плячо Ніле Восіпаўне і, нахіліўшыся над ёй, ледзь чутна вымавіў:

— Буду ў дваццаць тры нуль-нуль,— і ўжо голасна дадаў Мірыку: — Глядзі, не пазніся на паверку.

— Не спазнюся,— не сказаў, а выціснуў з сябе сын і таропка пакрочыў, а яна подбегам рушыла за ім. Яны ішлі вельмі шпарка, здалося, уцякалі ад жоўтых варот турмы, ля якіх застаўся Перабурмыт.

Ніла Восіпаўна адважылася азірнуцца толькі ад пасёлка: ззаду былі цёмныя пабудовы, тайга і дарога, што стомлена паўзла ўдалячынь, пакідаючы іх з сынам на гэтай кроплі зямлі, з якой адысці немагчыма. Ад далёкіх блакітна-шэрых гор дзьмуў наравісты сівер. Да дому тысячы кіламетраў, і нават цяжка ўявіць, ацаніць гэтую адлегласць, дый не хацелася, таму што побач сын, дзеля якога яна была здольная на ўсё, каб толькі палегчыць неяк жыццё, напоўніць сэнсам.

Яны нанялі пакой у той самай пажылой цёткі, у якой спыняліся ўжо некалькі разоў. Дагэтуль, здавалася, спакойны і вытрыманы Мірык замітусіўся, вочы заблішчэлі, як у п'янага. Ён не слухаў маці, а сам не проста гаварыў, а крычаў. Яна з валідолам пад языком слухала яго і чакала, калі сын нарэшце супакоіцца. Гэта было як прыступ хваробы, што абуджалася пры кожным спатканні. Істэрыка скончылася раптоўна, як і пачалася, і Мірык, знясілены, бледны, амаль упаў на канапу. Ніла Восіпаўна палажыла галаву сына на калені і гладзіла яго, нешта праз слёзы шаптала, у некага прасіла яму сілы, здароўя і трываласці, каб вытрымаць апошнія месяцы і вярнуцца ў родны дом, падарыць ёй унукаў і спакой на старасці.

Яна паставіла на стале ўсю ежу, што прывезла сюды. Сама ні да чаго не дакранулася, хоць за дзень не было ў роце і глытка вады. Яна прысела зноў на канапу і,

дрыжучы ўсім целам ад холаду, які апанаваў яе, глядзела на сына. Ён еў памалу, нават без апетыту, утаропіўшыся вачыма ў стол.

— Кроплю прывезла? — спытаўся і паклаў відэлец. Яна чакала гэтага пытання, як увайшлі ў пакой, нават па дарозе сюды.

— Не...— сказала Ніла Восіпаўна і, апраўдваючыся, дадала: — У продажы рэдка бывае...

Яго спіна яшчэ болей згорбілася, ён павярнуў скрыўлены твар і ляпнуў кулаком па стале.

— Захацела б, знайшла,— выкрыкнуў і заматляў галавой.— Ух, фраеры, ух, паскуды!..— прыціх на імгненне і падняўся з-за стала: — А чаю хоць прывезла?

— Так, прывезла...— яна пацягнулася да сумкі, каб паказаць чай, але Мірык падскочыў, вырваў з рук і пачаў хаваць пачкі за пазуху, некуды ў штаны. Ён адразу неяк ажыў, павесялела, здалося, яго згорбленая спіна, разгарнулася, як у вельмі стомленага чалавека пасля добрага адпачынку. Нельга было зразумець, ці ўзрадаваўся сын яе прыезду. Канечне, было відаць, што чакаў яе... Аднак мо лепш, каб ён не выходзіў з жоўтых варот да канца тэрміну, не раздражняў сваю душу некалькімі гадзінамі. Гэта, мабыць, тое ж самае, што паказаць сляпому святло і зноў забраць яго. Ніла Восіпаўна з сумам пазірала на сына, як ён прагна глытаў да чарнаты завараны чай і думала, чаму яна такая нешчаслівая, гаротная. Каб не даглядала сына, не любіла яго, а то ж — жыццё бачыла толькі ў ім. Ён быў для яе найпрыгажэйшым і найразумнейшым. Канечне, як для кожнай маці сваё дзіця. Чаму ж яе сын за жоўтымі варотамі і глядзіць на неба праз закратаванае акно? Чаму ён злачынца, ізаляваны ад грамадства як шкодны элемент? Непрыемнае слова — элемент, вельмі нежывым ад яго патыхае.

Нічога, акрамя суму, не дала ёй гэтая сустрэча з сынам. Радасці не было, Ніла Восіпаўна ледзь стрымлівала слёзы, якія перапоўнілі ўжо яе вочы, але яна не магла плакаць у прысутнасці сына. Хапіла волі, каб сабраць нервы ў кулак і з гаротнай усмешкай слухаць і гаварыць. Яна канчаткова зразумела: характар у Мірыка сапсаваўся яшчэ больш, стаў горшы, чым да турмы, якая, на жаль, не выхоўвала яго. Ніла Восіпаўна нават пабаялася ўявіць, якім вернецца сын дамоў. Ні-

бы ратуючыся, яна ўспомніла пра Радзіміра Бартуша.

— Вазьмі кнігі і часопісы,— сказала яна, перадаючы пакет сыну.— Паглядзі на кніжку ў сіняй вокладцы...

— Ну і што?..

— Яна падпісана табе...

— Радзімір Бартуш... Гэта той...

— Той самы, пра якога я пісала,— таропка гаварыла Ніла Восіпаўна.

— Дзякуй, пачытаю,— вочы ў Мірыка памякчэлі, ён падышоў да маці, абняў яе.— Эх, мамулечка! Трэ ўжо ісці, а то больш не выпусцяць.

Ен запхнуў за пазуху і кнігі, на хаду яшчэ ўхапіў скрылік кілбасы. Прыпыніўся ля акна і глядзеў, глядзеў на дарогу, якая ўжо амаль была не відаць, тайга хавала пад сваім цёмным крылом.

Ніла Восіпаўна пайшла б за сынам аж да жоўтых варот, але ён насварыўся і паныла патупаў сам. Яна сачыла за ім датуль, пакуль ягоная постаць зусім не знікла ў гушчыні дрэў. Вось цяпер, застаўшыся адна, яна паплакала б, дала б палёгку сэрцу, але ўспомніла пра Перабурмыта. «Дома будзеш плакаць, каб ніхто не ўбачыў»,— падумала Ніла Восіпаўна.

## 7

— Вам падабаецца гэта жанчына? — спытала Галіна ў яго, але ён адразу не пачуў, бо якраз падышла з экскурсаводам вялікая група школьнікаў.— Гэта партрэт Сапегі Грызельды, прыёмнай дачкі вялікага маршалка літоўскага Кшыштафа Весялоўскага, а перш дачка ваяводы падлескага Яна Вадынскага і Сафіі Сабескай... Паглядзіце, якая прыгожая жанчына. Яе маляваў, мабыць, нехта з гродзенскіх мастакоў. Мо гэта быў Францішак Лякшыцкі альбо Гіляры Хаецкі. Традыцыйная манера пісьма семнаццатага стагоддзя...

— Але, мне здаецца, яна вельмі хітрая, гэтая Грызельда,— сказаў Аўгуст.— Камандавала, мусіць, сваім мужам.

— Вы толькі гэта ўбачылі? — Галіна іранічна ўсміхнулася.— Якія разумныя ў яе вочы, мудры лоб. Нездарма правая рука ляжыць на кніжцы, вельмі дарагой па тым часе рэчы. І калі нават не ўсе мужчыны

ўмелі чытаць, Сапега Грызельда была адукаваная жанчына. А галоўнае — прыгожая, і яе любілі. Мо нават шляхціцы страляліся на дуэлі з-за яе. Грызельда стала ўрэшце жонкай маршалка вялікага літоўскага Яна Станіслава Сапегі. Аднак пражыла пасля гэтага нядоўга: у наступным годзе памерла. Яшчэ маладой і прыгожай жанчынай. Якая прычына смерці, невядома, але, уявіўшы той час, можна падумаць, што не вытрымала родаў альбо памерла ад чумы ці сухот. Відаць, Ян Станіслаў моцна кахаў сваю жонку, твар у яе ўпэўнены і шчаслівы.

— Вельмі цікава, але ж я гэтага не бачыў на партрэце,— паціснуў плячыма Аўгуст.— Скуль вы гэта ўсё ведаеце?

— У студэнцкія гады я тут працавала на паўстаўкі экскурсаводам. Грошай маміных і стыпендыі было малавата, а хацелася жыць, як усе людзі,— Галіна не сказала, што і цяпер яна ў выхадныя вяла экскурсіі па музеі. Грошай пакуль, як і ў студэнцкія гады, не хапала.

Аўгуст не ведаў, куды яе запрасіць, і Галіна прапанавала спаткацца ў мастацкім музеі, дзе ён, канечне ж, ні разу не быў. Але ці прызнаешся ў гэтым дзяўчыне, ды яшчэ якая скончыла інстытут і амаль будучы прафесар.

З усіх сіл Аўгуст спрабаваў быць культурным і выхаваным, асцярожна хадзіў па музеі і слухаў яе, якая, мабыць, яшчэ ніколі не мела такога ўдзячнага слухача. Большасць з таго, што яна апавядала, было незнаёмае для яго, ён чуў упершыню. Непрыязнасць да гэтага музея, якую Аўгуст адчуваў, уваходзячы ў дзверы, бо свет мастацтва пакуль быў яму чужы, непрыветны, памалу знікала.

І усё-такі для першага разу было зашмат інфармацыі, таму што пад канец іхняй экскурсіі па музеі ён стаміўся, і словы Галіны амаль не ўспрымаліся ім.

— Вы так шмат ведаеце,— сказаў ён, нават не падазраючы, як камплімантам натхніў Галіну, і яна падумала, што так і ёсць, яна вельмі разумны чалавек. Хай бы ацаніў гэта Вацлаў Казіміравіч Зушчыц, убачыў бы яе побач з маладым сімпатычным і здаровым, кроў з малаком, хлопцам. Мо зараўнаваў бы, захацеў бы часцей бачыць яе...

— Адукацыя — яшчэ не значыць культура,— пра-

мовіла Галіна.— Колькі мне сустракалася ў жыцці людзей з дзвюма, нават з трыма вышэйшымі адукацыямі, але яны былі хамы і ім проста не хапала элементарнай павагі адзін да аднаго. Зайздрасці, нянавісці у іх мо столькі ж, колькі крыві, якая таксама атручана дэбільствам,— яна гаварыла натхнёна і гучна, быццам яны ўжо стаялі на вуліцы, дзе было шмат людзей і шумелі машыны, з-за якіх нічога не чуваць. Толькі ён чуе яе... І яны, пабыўшы гадзіны тры ў музеі, апынуліся на вуліцы. Ужо бралася на вечар. Восеньская смуга насоўвалася борздка, выфарбоўвала ў цёмны колер дамы, дрэвы, машыны. Запаліліся ліхтары, і ад іх жоўтага святла ўсё навокал зрабілася пярэстым.

Яны перачакалі на скрыжаванні, пакуль не праехала кавалькада машын з міліцыяй наперадзе і ззаду, і павольна пайшлі да праспекта. Аўгуст ужо адчуваў сябе не так скавана, як у музеі, але ўсё роўна гаварыў мала, а больш слухаў. Кожнае слова Галіны яму здавалася ісцінай, якую трэба заўсёды памятаць. Хоць зрэдзь тое-сёе нібыта ён чуў раней ці то па радыё, ці чытаў у газеце. Аднак усё роўна-зараз Галіна была для яго прафесарам, калі не богам... Вочы бачылі яе, і толькі яе. Усё-ткі нездарма яна ў аспірантуры, нездарма марыць стаць выкладчыкам у інстытуце. Ёсць у яе талент вучыць людзей, ёсць...

— Тэма сацыяльнай актыўнасці моладзі вельмі актуальная, надзённая,— гаварыла Галіна, радуючыся, што ёсць такі зацікаўлены слухач.— Колькі ў нас яшчэ ёсць маладых, якія толькі і мараць, каб добра ўладкавацца ў жыцці, ні за што не адказваць, але мець шмат грошай. І такі настрой у маладых узнікае, таму што ў іх недастатковая сацыяльная актыўнасць. Гэта значыць удзел у грамадскім жыцці. Маладыя мала чытаюць, не цікавяцца газетамі... Ці не так? Вашу думку я спытаю пасля, мне цікава, як у вас на будоўлі. Ва ўмовах навукова-тэхнічнага прагрэсу роля сацыяльнай актыўнасці асабліва вялікая. Ці не так?

Яна хацела ўспомніць нешта са сваёй дысертацыі, але на языку былі агульныя фармулёўкі. Ёй не хапала жывога матэрыялу з заводаў, калгасаў ці будоўлі. Яна не хацела туды ісці, займацца даследаваннем. Быццам адкрые нейкую ісціну, усё даўно вядома. А калі гэтая праца будзе марная? Зушчыц паабяцаў ёй дзве-тры распрацоўкі аднаго няўдалага аспіранта, які з'ехаў

некуды ў Сібір, а матэрыял падарыў Вацлаву Казіміравічу. Адну з гэтых прац яна знайшла некалькі месяцаў назад, калі перакладала паперы ў кніжнай шафе, дзе захоўваліся дыпломныя работы выпускнікоў іхняга факультэта.

— Армія вучыць сацыяльнай актыўнасці,— сказаў Аўгуст,— на сабе адчуў. Ніколі ўжо не буду абыякавым да ашуканства, да хлусні. Не магу спакойна глядзець на некаторых паразітаў. Нядаўна мы з Аляксеевічам зрабілі рэйд на будоўлі дома. Дык нехта ўкраў нашыя акты. Мне асабіста ясна, хто гэта зрабіў. Пэўна, той, хто ўкраў, злодзей.

— Як гэта — укралі акты? — здзівілася Галіна.

— Яны ляжалі ў жалезнай скрынцы, незамкнёныя, і хтосьці ўзяў іх і спаліў. Мы знайшлі рэшткі актаў у адной з кватэр.

— Чакайце, а дзе ж вы будуеце? — Галіна бачыла, што Аўгусту прыемна яе цікавасць да ягоных спраў.— Ці не на Адоеўскага? Хоць не, там, мусіць, ужо дом засялілі... Дык дзе будуеце?

— На Кастуся Каліноўскага. Нібыта... Начальнік участка казаў...

— Дык гэта наш дом,— ускінула рукамі Галіна.— Гэта наш інстытут сабе будуе,— і не ўтрымалася, каб не пахваліцца.— Мне паабяцалі ў ім кватэру. Я ж жыву на прыватнай... А што вы знайшлі са сваім Аляксеевічам?

— На складзе не хапала з дзесятак скрынак каляровай кафлі.

— А цяпер?

— Як ні дзіўна, але хапае. Мы з Аляксеевічам не ведалі, што і рабіць.

— А навошта рабіць, калі ўсё ёсць?

— Мы думаем, ці не махлярства тут?..

— Як вы дакажаце, нават актаў праверкі ў вас няма?

— Нічога, дом яшчэ доўга будаваць. Новыя праверкі зробім і напішам акты. Зловім злодзея. Навошта тады наша група народнага кантролю, калі не зловім. Правільна?

— Мо і так,— згадзілася Галіна. Ён не заўважыў, калі яна ўзяла яго пад руку, і Аўгусту захацелася, каб гэтак было як мага даўжэй. Здаецца, нават праз куртку, світэр і кашулю адчуваў яе локаць, цеплыню

і ласкавасць, што асвятляла вочы і твар дзяўчыны.

— Вам не холадна? — Аўгуст зірнуў ёй проста ў вочы. Яна глядзела на яго спакойна і ласкава. Ён раптам адчуў, што яму горача.— Мо зайдзем у кафэ? — нясмела прапанаваў ён.

— Можна, чаму не. Толькі зараз ужо няма месц.

— Тады мо ў кіно,— сказаў ён.

— Не трэба. Мы з вамі проста пагуляем. Заўсёды спяшаешся, некуды бяжыш, а вось каб так, спакойна, прайсціся па вуліцы — няма часу. У вас, Аўгуст, мабыць, часу больш, а ў мяне яго заўсёды вельмі мала.

Ён падумаў, што яна знарок так сказала, каб больш з ім не сустракацца. Ёй, пэўна, не цікава. Што ён можа расказаць, калі сам яшчэ нічога не ведае.

Яны мінулі цэнтральную плошчу і пайшлі міма дома, у якім жыў Зушчыц. У яго кватэры ў вокнах было святло. Няйнакш Вацлаў Казіміравіч вячэрае альбо сядзіць у сваім кабінеце. Ці ўспамінае ён аспірантку Галіну, якая цяпер злучана з ім нябачнай для ўсяго астатняга свету ніткай, вельмі трывалай. Што б сказаў ёй Аўгуст, гэты маладзенькі хлопец, каб даведаўся аб яе сяброўстве з прафесарам Зушчыцам. Не, доктарам навук, прафесарам Зушчыцам, загадчыкам кафедры. Для яго, мусіць, усе гэтыя званні пусты гук, абы-што. І ён шчаслівы, што не ведае ўсяго гэтага. Падумаць толькі, ён — народны кантралёр, некага хоча злавіць і змагаецца за праўду. Божа мой, ці не смешна гэта. Канечне, усё-такі смешна...

— Нешта халаднавата,— знобка павяла яна плячыма і зморшчыла нос.— Надвор'е зусім не вераснёўскае...

— Так, так,— ухапіўся ён за гэтую тэму,— звычайна ў верасні бывае цёпла.

Праспект на плошчы можна было перайсці толькі праз падземны пераход, і яны пачалі спускацца па коўзкіх ад вільгаці прыступках уніз. Аўгуст падтрымліваў яе за руку і быў напагатове, каб, калі паслізнецца на высокіх і тонкіх абцасах, не даць упасці. Яна ішла, нахіліўшыся да яго, і ён бачыў смуглявую шыю, парослую светлым дзіцячым пушком, адчуваў пах валасоў.

У падземным пераходзе яшчэ былі адчынены газетны кіёск і кіёск кветак. Ля яго стаялі мужчына і жанчына. Аўгуст убачыў, як яны купілі букет гваз-

дзікоў, і жанчына пайшла радасная, адразу папрыгажэлая.

— Пачакайце хвілінку,— сказаў ён і па тым, як успыхнулі ў Галіны вочы, зразумеў, што яна здагадалася, навошта яны спыніліся. Аўгуст падбег да кіёска і ўзяў з рук кіяскёршы вялікі букет гваздзікоў і гэтак жа бегма вярнуўся да Галіны.

— Навошта ж такі букет,— толькі і вымавіла яна, збянтэжаная і разгубленая.

Ля выхаду з падземнага перахода сіваваты ў зялёным капелюшы мужчына прадаваў латарэі «Спортлато». Ніхто не купляў у яго, і відаць, што яму ўжо надакучыла сядзець тут на холадзе. Убачыўшы Аўгуста з Галінай, ён прыкметна ажывіўся і, энергічна махаючы рукою, паклікаў іх да сябе.

— Купіце на шчасце,— выцягнуў перад імі руку з заціснутымі ў ёй жоўтымі паперкамі.— Хто не гуляе ў спортлато, той не ездзіць на аўто.

— Якое такое аўто? — зацікавілася Галіна.

— Канечне ж, машына. Усё наша жыццё, маладыя людзі, гэта я зразумеў на старасці,— спортлато. Угадаеш свае лічбы, значыць, паедзеш на аўто. Не пашанцуе, пешкі будзеш хадзіць, гразь мясіць.

Мужчына гэты быў пенсійнага ўжо ўзросту, але вельмі рухавы, жвавы, рукі дагледжаныя, тонкія. Наўрад ці займаўся ён калі фізічнай працай. Мабыць, адстаўны бюракрат, начальнік... Раптам стала Аўгусту непрыемна слухаць, як гэты дзядок агітуе іх купіць латарэю. Ён аддаў грошы і ўзяў тры паперкі.

— Кажуць, я шчаслівая,— прамовіла Галіна,— падары іх мне. Тады нам пашанцуе абаім...

— З радасцю...

Яны памалу падымаліся па прыступках, і нечакана Галіна моцна прыціснулася да Аўгуста і, прыўзняўшыся на дыбачках, пацалавала яго. Ён разгубіўся, толькі адчуў, як усяго яго агарнула цеплыня, уваччу нібы пацямнела. Абняўшы Галіну, паспрабаваў сам пацалаваць яе, але яна, засмяяўшыся, выслізнула з-пад яго рукі. Адбегла на некалькі метраў уперад і памахала пальцам:

— Ну-ну. Гэта толькі падзяка за кветкі.

— А мне можна таксама падзякаваць,— знайшоўся Аўгуст, узяў асцярожна яе руку, прылажыў да сваёй шчакі. Пра што казаць, дый навошта. Яму хацелася

толькі глядзець ёй у вочы, трымаць у руцэ яе мяккую, зусім маленькую руку, адчуваць цеплыню.

Ён маўчаў ажно да аўтобуснага прыпынку, што быў на плошчы Якуба Коласа, прыціхла і яна, з радасцю ідучы побач з ім. Усё-ткі трэба было нешта сказаць, і Аўгуст праз сілу вымавіў:

— Вы... Мне... Тады... Вельмі...

Яна прыйшла яму на дапамогу, весела выгукнула, падабраўшы яго інтанацыю:

— Спа-даба-лася...

Ён сарамліва апусціў галаву і пацвердзіў ледзь чутна:

— Так, вельмі спадабалася.

Яна падумала, што гэты хлопец зусім яшчэ дзіця, хоць і адслужыў у арміі, і мо дарэмна яны спаткаліся і больш не трэба бачыцца. На сённяшнім паставім кропку і забудзем яго. У яе аспірантура, неблагія адносіны з Зушчыцам. Хай ідзе сваёй дарогай, а яна — сваёй. У кожнага, урэшце, адна дарога, дык ужо лепш адразу пайсці па ёй, чым доўга блукаць па сцежках і толькі на зыходзе жыцця ўзбіцца на яе.

Яна адгаворвала Аўгуста не праводзіць яе, бо позна ўжо і ехаць далёка, але ён не паслухаўся, увайшоў таксама ў аўтобус. І гэтая ягоная настойлівасць спадабалася, ён зрабіў так, як павінен быў зрабіць мужчына, а не хлапчук.

Яны знайшлі сабе месца ў кутку ззаду, паглядвалі адно на аднаго, сочачы за кожным сваім рухам. Аўгуст адгарадзіў яе шырокімі плячыма ад націску пасажыраў, якіх у аўтобусе не змяншалася, і трымаўся абедзвюма рукамі за парэнчы.

— Дык кажаш, укралі вашы акты і спалілі? — незаўважна і проста перайшла Галіна на «ты».

— Так, і спалілі,— механічна, не задумваючыся, адказаў Аўгуст. Для яго нібы ўвесь свет перастаў існаваць, акрамя гэтага вясёлага дзявочага твару. Які, здавалася, быў незвычайнай прыгажосці. Аўгуст марыў, каб даўжэй ехаў аўтобус і Галіна была перад вачыма, каб не развітвацца сёння. Ён падумаў, што мо яна, як гэта бывае ў кніжках, запросіць да сябе на чай. Яны паслухаюць музыку, потым сустрэнуць на вуліцы золак. Ён не ведаў, але пра гэта ж думала і Галіна, вагаючыся, як развітацца з ім. Яе фізічна вабіў гэты дужы і наіўны, нібы дзіця, хлопец, і было

відаць па вачах, што ён амаль закахаўся ў яе, і ўсё-ткі яна вырашыла трымаць яго пакуль на дыстанцыі. Няхай выспее каханне, няхай ён адчуе, што не можа без яе жыць. Вельмі хацелася, каб Аўгуст загаварыў пра каханне. Яна дачакаецца гэтага прызнання, хоць аднойчы ў жыцці пачуе словы, якія прымушаюць хвалявацца сэрца жанчыны. Каханне, сэрца... Навошта нараджаецца чалавек? Для жыцця і кахання. Яшчэ два гады назад яна скептычна ставілася да слоў «каханне, кахаю», усё, здавалася, вельмі проста і так. Мо таму ніхто ёй ніколі не казаў: «Я цябе кахаю...» Ёй таксама патрэбны гэтыя словы.

## 8

Ледзь хапіла сіл, каб распрануцца, распакаваць сумкі, якія, здавалася, абарвалі рукі, скласці прадукты ў халадзільнік. І было жаданне памыць ногі халоднай вадой і хоць на паўгадзінкі легчы на канапу, ачуняць ад стомы, што назбіралася за дзень мітусні і пасяджэнняў. Але, відаць, ёй не наканавана гэтага. Тэлефон званіў, не пакідаючы нават надзеі на тое, што хутка адключыцца.

— Алё, алё, Яніна! Алё, ці чуеш мяне?! — вылятала з трубкі.

— Чую, чую, Галіна Іванаўна,— нарэшце адгукнулася гаспадыня кватэры,— нешта з тэлефонам, мабыць...

Яніна сказала няпраўду, проста ёй не хацелася сёння гаварыць са сваёй сяброўкай, якая званіла часам па некалькі разоў на дзень. Аднак няёмка было маўчаць, добра, што хоць Галіна сыпала словамі, як гарошынамі. Ёй было галоўнае, каб яе слухалі, і яна магла гаманіць па тэлефоне гадзіны паўтары. Скончылася размова тым, што Галіна напрасілася ў госці, і Яніна не змагла адмовіць ёй, хоць на вечар былі планы ўпарадкаваць у кватэры, памыць бялізну, дый у цішы, пакуль муж з дзецьмі на дачы, пачытаць крыху. За паўсядзённым клопатам забыла, калі нават кніжку брала ў рукі. А тут якраз на рабоце далі пачытаць часопіс «Иностранная литература», у якім друкаваўся раман «Сіцылійскі спецыяліст». Яніна з сумам уздыхнула, з дакорам падумала, што дарэмна не адмовіла сяброўцы.

Хуценька памыўшы падлогу ў кватэры, яна апранула свежы халацік з кароткім рукавом, прычасалася, акуратна перабіраючы свае каштанавыя валасы тонкімі пальцамі, на пазногцях якіх заставаліся рэшткі манікюра. На патыліцы валасы завязала чырвоным шнурочкам. Потым намачыла ватку ў ацэтоне і працерла пазногці. Паглядзелася на сябе ў люстэрка і засталася задаволеная сабой: твар быў свежы, румяны, ні следу стомы. Яна ў нерашучасці ўзяла памаду, але вусны сакавіта па-маладому блішчэлі, і вырашыла не фарбаваць іх.

У кватэры было чыста і ўтульна, і гэта яе парадавала. Вось-вось павінна пад'ехаць Галіна, але можа здарыцца, што і праз гадзіну. Не ў звычаі Яніны было сядзець проста так, і яна ўзяла томік вершаў Максіма Багдановіча, якога любіла чытаць, калі хацела адпачыць ад тняга тлуму. Ёй здалося, што на тэлевізары пыл, і, адклаўшы кнігу, выцерла яго.

Наогул у яе сёння быў неблагі настрой. Ад'язджаючы на дачу, муж з сынам прынеслі ёй вялізны букет, а як кожная жанчына, яна вельмі любіла кветкі. І на рабоце дзень быў прыемны, бо намеснік начальніка ўпраўлення Станкевіч, быццам хмурны і сярдзіты чалавек, раптам пахваліў яе на лятучцы перад усімі супрацоўнікамі. Што было вельмі рэдка, і ўсе прывыклі чуць ад гэтага чалавека толькі крытыку і ніводнага добрага слова. Яніну пасля лятучкі віншавалі і, канечне, цікавіліся, як яна патрапіла Станкевічу. Яна адказвала жартам, смяялася, бо адчувала сябе здольнай і ўпэўненай; нібыта крылы выраслі за плячыма.

Часам работа не падабалася, і ёй хацелася звольніцца і перайсці куды-небудзь у іншае месца. Аднак мінаў дзень-другі, і яна старанна пісала даведкі, лічыла на калькулятары. З дзяцінства прывыкла рабіць усё грунтоўна, інакш проста не магла.

Вершы Яніна не чытала, толькі пагартала кніжку, спыняючыся вокам на знаёмых радках. Яна ўсё яшчэ злавала на сябе за тое, што згадзілася прыняць Галіну, якая і характарам і складам свайго жыцця не падабалася ёй. Аднак сумленне не дазваляла ёй, у душы, здавалася, супраць волі нараджалася спачуванне да гэтай жанчыны, хоць яна была ні бедная, ні хворая. Мо ёй не хапала крышачку шчасця, думала Яніна. Калі-нікалі хацелася парваць усялякія адносіны з Га-

лінай, было непрыемна з ёй гаварыць нават па тэлефоне. Што ж, так было неаднойчы, але яны сустракаліся, як блізкія сяброўкі, не маглі доўга развітацца, дарылі адна адной падарункі на святы.

З балкона праз адчыненыя дзверы пацягнула скразняком, і Яніне стала холадна. Яна падабрала ногі пад халацік, але дрыжыкі пабеглі па аголеных руках, шыі. Павагаўшыся, яна надзела світэр, нацягнула мужавы спартыўныя штаны, ёй здавалася заўсёды, што ў яго вопратцы намнога цяплей. Галіна затрымлівалася.

Яніна падышла да акна: горад запаліўся мноствам агнёў, пацішэла на вуліцы, толькі зрэдзь пралятаді з шумам хлопцы на матацыклах. Пакрапваў рэдзенькі, дробны дождж.

Яніна зноў паглядзела на сябе ў люстэрка, правяла рукой па пругкай хвалі валасоў. У кватэры паветра згусцела, і можна было запальваць святло. Толькі не хацелася парушаць гэты спакой і нейкую казачнасць, якія ўсталяваліся ў кватэры з надыходам прыцемку. Мо таму і надта рэзка прагучаў званок, яна ажно здрыганулася і хуценька пайшла адчыняць дзверы. Заўсміхалася, нібыта вельмі рада Галіне, проста шчасце бачыць яе. Неяк між іншым атрымалася: звычка — другая натура чалавека. А калі звычак шмат, тады што — шматаблічны? — «Гэтак разважаючы, можна сказаць: блізкі да хамелеона»,— падумала Яніна, але навошта, каб Галіна прыкмеціла што-небудзь на твары, бо настрой на ім адразу быў добра відаць заўсёды.

У калідорчыку Галіна скінула з ног басаножкі, на вешалку прычапіла сумачку, якая была, мусіць, у яе новая. У гэтай сукні, цёмна-шэрага колеру з чатырма чырвонымі трохкутнікамі, раней не бачыла яе Яніна. Выгляд у яе быў такі, нібыта сабралася ў тэатр. І толькі праз хвіліну цюкнула: гэта ж яна з'явілася, каб пахваліцца сваім новым абуткам, новай сукняй, каб ёй стала зайздросна. І ўсе рэчы імпартныя, у магазіне ў чарзе проста не купіш. Канечне ж, ёй дапамагала прыдбаць цётка, таваразнаўца у вялікім прадмагу ў Гродне. За кілбасу і мяса што хочаш здабудзе. «Калі ўжо такая сяброўка, дык і мне што-небудзь папрасіла б у цётачкі»,— думала Яніна і хваліла абноўкі, нават рукой правяла па спіне: маўляў, насі на здароўе, і вымавіла так:

— Табе да твару... Насі на здароўе. Вельмі прыгожа...

— А я ведаю...— павяла плячыма Галіна.— Тавар не абы-які, чыстай вады імпарт, і ўсё заходнееўрапейскае, з капкраін.

— Ну, не кажы, югаслаўскія боты...

— І што яшчэ? Усё?! Навучыліся сябры ў нас...

— Чаму ж... Румынскі абутак неблагі.

— Нібыта сама не ведаеш.

— Ведаю.

Яны былі знаёмыя даўно, аднак не маглі з цвёрдай упэўненасцю сказаць, што добра ведаюць адна адну. І сапраўды, найскладанейшая і найразумнейшая істота на свеце — гэта чалавек. Немагчыма ніколі і нікому здагадацца, што чалавек неспадзеўкі можа зрабіць. Што ён толькі можа зрабіць... Жывёлу спыняе страх перад расплатай, чалавек навучыўся пераадольваць яго і ісці далей, прымушаючы сябе не баяцца расплаты, хоць і ведаючы пра яе немінучасць.

Галіна курыла, таму яны перайшлі на кухню і адчынілі фортку. Яніна наліла ў чайнік вады, паставіла на агонь, дастала з шафы бляшанку з бразільскай кавай, цукар, пячэнне. Потым нарэзала на сподак кілбасы і сала.

— Я хацела б з табой параіцца,— сказала Галіна,— можа, такога больш не будзе... Я проста не ведаю, што мне рабіць. Пазнаёмілася з хлопцам, адчуваю, неблагі, малады...

— Віншую і рада за цябе. Хто ён? Гэта ж вельмі і вельмі цікава.

— Ён з тых, каго нашы газеты называюць просты рабочы.

— Ну, гэта не страшна, мо, наадварот, добра. Захочаш, вывучыш.

— Але ж яму толькі дваццаць. У нас розніца пяць гадоў.

— Галачка, і гэта — дробязь. Бывае, людзі кахаюць адно аднаго, калі між імі дваццаць гадоў. Ён табе падабаецца? Ой, я табе зайздрошчу,— гаварыла Яніна і нібыта сама перажывала гэтае знаёмства з хлопцам.— Ён яшчэ не прызнаўся табе ў каханні?

— Пакуль не. Мы ж толькі два разы бачыліся, не было калі. Ну і што?

— Есць, кажуць, каханне з першага позірку. Дый я

сама ведаю жанчыну, якая выйшла замуж за чалавека на трэці дзень іхняга знаёмства...

— Мне ён падабаецца як мужчына...— сказала Галіна, прытушыла цыгарэту ў попельніцы і нібыта выдыхнула: — У яго дужыя рукі, шырокія плечы. Ён як абняў мяне, аж перахапіла дыханне...

— Дык ты радуйся, што да цябе прыйшло каханне. Мо ён якраз той чалавек, якога табе не хапала ў жыцці,— ажно захвалявалася за сяброўку Яніна, тэмпераментна размахваючы рукамі.

— Я пакуль нічога не ведаю... Узнікла адна акалічнасць, якая трохі... Разумееш, я адчула, што да мяне неабыякавы наш загадчык кафедры прафесар Зушчыц.

— Што? Ну, Галіна, ну, Галіна,— не ўседзела за сталом Яніна, пабегла да пліты глядзець чайнік, хоць і так было відаць, што вада яшчэ не закіпела.— Я зусім заблыталася. У цябе, дарагая, столькі навін, што ў мяне проста галава ідзе кругам.

— Вось і ў мяне тое ж. Мне, канечне, калі казаць шчыра, як сяброўцы, прыемная ўвага Зушчыца.

— Але ж яму не менш, мусіць, чым пяцьдзесят гадоў?

— Ты ж сама гаварыла, што ўзрост у каханні нічога не значыць,— пасміхнулася куточкамі рота Галіна.— Зушчыц проста вачэй не зводзіць з мяне, і я адчуваю, што мяне цягне да яго, мне прыемна гэта... Прафесар, доктар навук і мужчына яшчэ не стары. І галоўнае,— яна сумелася пад няўцямным позіркам Яніны.— Мне ж абараняць дысертацыю... Я зусім разгубілася. Не ведаю, як жыць далей. Мне вельмі хочацца бачыць Аўгуста, і я не магу адмовіць Зушчыцу.

— У вас што-небудзь ужо было з ім? — запінаючыся, баючыся здацца нетактоўнай, спыталася Яніна.

— Не, мы толькі раз пасядзелі вечарам у рэстаране. Я ж табе званіла тады. Ён правёў мяне да кватэры, пацалаваў руку, і толькі. Але сягоння на кафедры пачаў размову, каб, маўляў, спаткацца. Яму не дала даказаць лабарантка — гэтая мегера. Пра яе табе расказвала... І ён абарваў на паўслове. Потым мімаходзь сказаў, што мне пазвоніць... Я чакаю гэтага званка і баюся яго. Таму і ў госці да цябе напрасілася, каб некуды збегчы. Я ў разгубленасці...

Яніна неяк адхінула галаву ўбок, у яе здзіўлена пашырыліся вочы і пагляд быў такі, нібы яна ўпершы-

ню бачыла гэтую дзяўчыну, што сядзела насупраць у яе кватэры. Нарэшце яна як выціснула з сябе, аднак схаваўшы ад Галіны твар у далонях, якімі быццам хацела адгарадзіцца ад пачутага, каб сяброўка не заўважыла гідлівасці, што напоўніла, здавалася, усю істоту.

— Цяжка раіць,— сказала Яніна зусім не тое, што думала.— Надта ж складаная сітуацыя...— адчуваючы, як камяк гідлівасці адыходзіць ад горла, адняла далоні ад твару і гучна, узбуджана загаварыла: — Гэта ж чалавечыя адносіны, а яны заўсёды няпростыя. Перад табой паўстаў момант выбару, ад якога, канечне, будзе залежаць тваё жыццё. І, мабыць, не толькі сёння, заўтра, і да скону. Усё-ткі, мне здаецца, каханне бывае адзін раз. Але, на жаль, не заўсёды жывём мы з каханымі, а часам проста з неблагімі людзьмі, якія нас любяць, шануюць, паважаюць, і мы павінны, звязаўшы з імі свае лёсы, паводзіць сябе гэтак жа.

— Гэта мне і самой зразумела, што да іншых людзей. Вось што рабіць мне? — Галіна зноў закурыла, прагна глытаючы дым і пасля выпускаючы яго ў адчыненую фортку. Вецер закручваў дым і вяртаў назад у пакой. «Няхай ужо дакурыць гэтую цыгарэту і папрашу, каб больш не пачынала»,— падумала Яніна і сказала:

— Ты не спяшайся. Не спяшайся... Самой высветліць, каго ўсё-ткі кахаеш. Вядома, з улікам усіх акалічнасцей. Асабліва сямейнае становішча Зушчыца...

— Усё ўмоўна. Чалавек мае права жыць, як яму хочацца... Нешта ёсць у гэтым: прафесар М. мой блізкі сябар... Як лічыш, га? Не зайздросціш? — раптам з вясёлай злосцю і з запалам у вачах спыталася Галіна. Яна проста ганарылася сваім рашэннем, якое да канца не адкрыла Яніне. Ей вельмі і вельмі пацешыла б душу, калі б на твары ў сяброўкі ўзнікла зайздрасць, тады можна было б прызнаць сябе больш шчаслівай, таленавітай і прыгожай, але Яніна засталася на выгляд абыякавай. Быў бы хто-небудзь яшчэ ў Галіны блізкі чалавек, яна пасварылася б цяпер і, грымнуўшы дзвярыма, паехала б. Аднак такога чалавека не было ў яе, і яна прытрымала свой гонар. Ей не хацелася ехаць у свой пусты пакой з чорным тэлевізарам на покуці і чуць праз дзверы балбатню гаспадыні па тэлефоне, якая ўсё-ткі марыла знайсці нестарога ўдаўца з нішта-

ватай пенсіяй. Але чым горшая яна за іншых, за Яніну, чаму не можа быць шчаслівай? Яна таксама хоча мець сваю сям'ю, кватэру. Чаму яна павінна змагацца за гэта? Ужо сем гадоў амаль яна на чарзе на кааператыўную кватэру, і невядома, колькі шчэ чакаць яе, бы манну нябесную. Вось якое шчасце, бы сабака беспрытульны, з клункамі штогод па горадзе шукае сабе куток... Яна толькі падумала так, але нічога Яніне не сказала, толькі ўсміхнулася і курыла цыгарэту за цыгарэтай.

# РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ

## 1

— Рудаміна, Рудаміна! — нечакана пачуў Аўгуст з густога шматфарбнага натоўпу, што віраваў, здавалася, па ўсім праспекце. Столькі людзей на вуліцы яшчэ, мусіць, не бачыў. Быў сонечны восеньскі дзень, выхадны. Аўгуст, азіраючыся па баках, разглядаючы вітрыны магазінаў і каляровыя аб'явы на рэкламных шчытах, паціху ішоў ад вакзала, дзе купляў білет для сястры, якая ад'язджала заўтра ў камандзіроўку... Ён заставаўся за няньку з дзецьмі.

Голас, што гукаў яго, здаўся вельмі знаёмым, нібыта раніцай чуў, сустракаўся з чалавекам. Аўгуст павёў вачыма па натоўпе, спрабуючы вызначыць з мноства людзей свайго знаёмца, але ніводзін твар не затрымаў увагі яго.

— Рудаміна! — пачулася ўжо, здаецца, ля вуха, і дужая рука ляпнула па плячы, аж нахіліўшы яго назад. Мо хтось іншы і не ўтрымаўся б на нагах ад гэткага штуршка, але Аўгуст адразу ўвесь напяўся, яшчэ не забылася вайсковая падрыхтоўка. Ён крутнуўся, і яго-ныя вочы сутыкнуліся з вясёлымі, крыху нахабнаватымі вачыма пад рыжымі, як восеньскае кляновае лісце, брывамі. У чалавека былі густыя і, відаць, шорсткія, нібы дрот, такія ж рыжыя валасы. Твар быў усё роўна як размаляваны рэдкім, але яркім рабацідзем. Нос трохі скрыўлены ўлева і задраны ўгору. Чалавек быў адзеты ў светла-карычневы касцюм з расхрыстанай на грудзях жоўтай кашуляй, з-пад якой усім быў відаць блакітна-белы цельнік дэсантніка.

— Віталік?! — здзівіўся Аўгуст і ажно засмяяўся ад радасці, бо перад ім стаяў ягоны сябра па арміі Віталь Абламей. Яны не бачыліся ўжо амаль год, як у Баранавічах развіталіся на пероне і раз'ехаліся на цягніках: Абламей — да Лунінца, Аўгуст да бацькоў — у Сялец.

Якую хвіліну яны ляпалі адзін аднаго па спінах, абодва высокія, постацямі падобныя на спартсменаў. Заўважыўшы, што замінаюць людзям, адышлі ўбок пад ліпу. Узіраліся ў твары, але ніякіх змен у іхнія абліччы гэты год не прынёс. Неяк было дзіўна бачыць сябра ў цывільнай вопратцы, бо ў памяці ён заставаўся паранейшаму вайскоўцам, у «афганцы», з аўтаматам, з усёй амуніцыяй, без якой не ўяўлялася жыццё.

— Што робіш тут? — пытаўся Аўгуст.

— А ты? — усё ціснуў руку Віталь.

— Жыву ў Мінску...

— І я таксама.

— Ну, выдатна!

Яшчэ з паўгадзіны яны стаялі пад ліпай насупраць ГУМа, узбуджана размаўлялі, нікога не заўважаючы вакол сябе. Аўгуст урэшце зразумеў, што Абламей у Мінску ўжо месяц, жыў пакуль у цёткі, а працаваў слесарам у механічным цэху на заводзе вылічальных машын.

— Куды ішоў?

— А нікуды. Думаў мо схадзіць у кіно.

— Нешта горача стала зусім, як летам. Пайшлі, тут недалёка кафэ, марожанага паядзім, якога соку вып'ем. Чарку бярэш? — спытаў Аўгуст.

— Ні-ні, навошта. Трэба ў форме быць. Зашмат падлюкаў вакол, каб чарку браць,— сekануў паветра рукой Абламей.— Мне віна не трэба, і так як заведзены. А ты?

— Мы ж, здаецца, сябры. А сябры за год не мяняюцца,— прамовіў Аўгуст і ляпнуў далонню па далоні Віталя.— Цяпер мне будзе весялей, а то амаль нікога не ведаю. Работа, кватэра, кватэра, работа... Праўда, на рабоце ніштаваты дзядок, мой напарнік, Аляксеевіч. Во, каб былі ўсе такія людзі, даўно б жылі пры камунізме. Вайну прайшоў ад званка да званка, паранены і толькі медаль «За адвагу». Я, кажа, змагаўся за волю і незалежнасць, а не за ўзнагароды. А што ты рабіў дагэтуль?

— Патоўкся трошкі дома, а пасля ўладкаваўся слесарам у калгасную майстэрню. Работы шмат, я адзін працую, а астатнія як мінуў абед, ужо шукаюць, дзе б заправіцца. П'юць усялякую хімічную гадасць, тармазную вадкасць, ласьёны. Адэкалон у іх,— што каньяк. У магазіне ж нічога няма: ні віна, ні гарэлкі. Ну, яны і дурнеюць. Шкада, хлопцы маладыя. Я з імі паспрабаваў пагаварыць, куды там — біцца лезуць. Я хуценька супакоіў іх. Пайшоў да сакратара камсамольскай арганізацыі, ён на словах гатоў змагацца супраць п'яніц-наркаманаў, але, як што, у цянёк, каб і відаць не было. Аднойчы пасварыліся з ім, я — у морду яму. Бачу, няма толку. Дый маці з бацькам кажуць, едзь, сынок, лепш у Мінск, бо цябе тут шчэ пасадзяць за бойку, як хулігана. Я б не паехаў, мяне, кавалера ордэна Чырвонай Зоркі, параненага пасадзіць! Але ж плача маці, шкада яе, плюнуў на ўсё і з'ехаў. Столькі злосці было, спярша думаў: пайду паганяю ўсіх гэтых бюракратаў, паскуд, пачашу ім патыліцы. Неяк змусіў сябе, цішком сеў у аўтобус і паехаў. Хаджу па Мінску, а душа ўсё роўна не на месцы. Думаю пра вёску, перажываю і не магу спакойна глядзець на гэтых у скураных штоніках, з бранзалеткамі, ланцужкамі на ботах... Удвух хоць весялей будзе. Хоць пасядзім ды ўспомнім сяброў і дарогі, па якіх мы тупалі, штохвіліну чакаючы кулю ў спіну альбо ў галаву. Эх, і часіны былі, як толькі з табой, дружа, ацалелі...

За ГУМам па вуліцы Леніна, па якой яны пайшлі да кафэ, людзей было менш, чым на праспекце. Тут ад гасцініцы «Юбілейнай» рухаліся замежныя турысты, сярод іх вызначаліся старыя, адзетыя гэтак жа, як і маладыя: у джынсах, спартыўных куртачках, у красоўках. Здаецца, не вельмі прыгожа глядзеліся бабулькі з сівымі валасамі, прыгорбленыя, у маладзёжнай апратцы. Аднак гэта была іхняя манера, мода, і, мабыць, яны не адчувалі сябе старымі. І ў гэтым было іх, пэўна, шчасце. Аўгуст з Віталем абагналі такую пару: ён — у белых модных штанах лімоннага колеру і скуранцы, дзядок гадоў пад восемдзесят, і яна — у гэткім жа касцюме, па ўзросце не маладзейшая за свайго спадарожніка. У жанчыны быў маршчыністы з нездаровай шэрай скурай твар, размаляваны яркімі фарбамі, і таму яна здалася падобнай на старую бабульку.

Перад кафэ на пляцоўцы стаялі столікі, іх пазайма-

ла ўжо дзятва, якая шумела, пішчэла, як вераб'і на вішні. Пастаяўшы ў чарзе хвілін сорак і дарэшты стаміўшыся ад нудоты, Аўгуст з Абламеем усё-такі дайшлі да прылаўка, узялі марожанага, соку і па булачцы. Час быў і абедаць, жывот падціскала, і аслаб рэмень у штанах.

Яны знайшлі сабе месца амаль што ля тратуара, за крайнім столікам, які вызвалілі ім, мусіць, бацька з маці і двое іхніх дзетак гадоў па шэсць-сем, няйнакш, блізнятак, белагаловых, у аднолькавых блакітных штоніках і малінавых кашульках. Сонца якраз было ў зеніце, шчодра грэла ў спіну.

— Калі мы былі там,— сказаў Абламей,— я зрэдзь марыў, каб вось так пасядзець, паесці марожанага, папіць ліманаду. Гэта мне ўяўлялася найвялікшым святам. Вакол ходзяць людзі, сонца, я ў прыгожым касцюме, ем марожанае...

Аўгуст нічога не сказаў, бо нешта такое было і ў яго дый, мусіць, у кожнага, хто служыў з імі ў бліпчастых удзень ад гарачага паўднёвага сонца гарах, пакрытых снегам нават у чэрвені і змрочных, страшных сваёй неспадзяванасцю, невядомасцю ўначы. Калі на пачатку службы нават камень маглі ўявіць чалавекам, ворагам. Ён пасміхнуўся ў душы з таго, як зусім па-дзіцячы Віталь асцярожна браў маленькай лыжачкай марожанае, смакаваў яго, ад асалоды заплюшчваючы вочы. Мо і ён збоку выглядаў такім жа хлапчуком, які нарэшце атрымаў доўгачаканы ласунак і цяпер у яго свята, якое надоўга застанецца ў ягонай памяці.

— Ты помніш тыя ночы на дарозе? — прамовіў раптам Аўгуст, і нібыта не стала побач гэтых столікаў, утульнай пляцоўкі з вясёлымі, шчаслівымі дзецьмі, толькі ён і Абламей сядзелі адзін перад адным. Ад яго пытання Віталь ажно ўздрыгнуў, акуратна аблізаў лыжачку, паклаў яе на сподак. Вейкі апусціліся, і ён, уздыхнуўшы, вымавіў:

— Да канца жыцця не забуду...— у яго задрыжала рука, калі ён узяў шклянку з сокам. Нічога больш не дадаў, і Аўгуст маўчаў, бо пра тое, што ўспаміналася, проста так не мог гаварыць. Яны маўчалі, але ў кожнага ў памяці ажыла, выпрасталася пад спудам часу вузкая, прабітая мо трыста гадоў назад дарога ў гарах, якую яны прыкрывалі ад душманаў двое сутак. Было часу падумаць і аб усіх і аб усім. Удзень раўлі «МАЗы»,

«КРАЗы», везлі да Кабула хлеб, паліва, медыкаменты, і было трошкі спакайней, хоць душманы маглі з'явіцца ў любы момант, але тое, што бачыш сваіх, надавала сілы і ўпэўненасці. Уначы дарога сціхала, затойвалася, хоць зрэдзь і праходзіла якая адна аўтакалона і быццам знікала сярод навіслых над ёю чорных гор, рабілася вузенькай і ледзь прыкметнай для не ўзброенага прыборам начнога бачання вока.

Душманы ведалі, што на гэтай паваротцы-крывульцы, злева ад якой дыхала, здавалася, бяздонная цясніна, пост, узброены акрамя аўтаматаў станкавым кулямётам, бо не раз паспыталі ўжо яго, і ўсё-ткі зноў і зноў імкнуліся выйсці на дарогу. Цясніна была вельмі зручнай для дыверсіі на дарозе. Узарваўшы яе, можна было надоўга спыніць рух на Кабул у гэтай правінцыі.

Да Аўгуста і Віталя на пасту дзяжурылі літовец Глебас і азербайджанец Мамедаў. Першыя суткі былі спакойныя, затое потым дзень і ноч атакі душманаў, якія, мабыць, уведалі пра калону бензавозаў. Так ці не, але бой ішоў жорсткі, без перапынку, і абодвух моцна параніла. На шчасце, падаспелі верталёты з дэсантам, усмалілі ракетамі па душманах. Аўгуст з Абламеем дапамагалі пагрузіць Глебаса і Мамедава ў верталёт і пасля інструктажу, які марудна, падкрэсліваючы кожнае слова, зрабіў нампаліт капітан Марута, іхні зямляк з Гомельшчыны, засталіся на гэтай паваротцы ўдвух...

Ён прывык ужо да таго, што сонца знікала раптоўна, нібыта падала ў цясніну альбо яго сцягвалі з неба вяроўкамі душманы, і паветра тады гусцела, напаўнялася фіялетавай фарбай, якая спакваля змянялася на сінюю, а потым і на чорную, як дзёгаць. Адценні змяняліся незаўважна і вельмі хутка. І з прыцемкамі адыходзіла і саракаградусная спёка, уступаючы свае ўладанні прахалодзе, што падавала аб сабе знак спачатку лёгкім ветрыкам, які, здавалася, штохвілінна вастрэў, дзічэў і гэтак жа мяняў колеры, быццам паветра. Калі цемрадзь схавала ад вачэй горы, дарогу, каменне на ёй, ужо дзьмуў злосны, па-паўднёваму надта ядраны сівер. Ніводзін сіноптык не мог гарантаваць, што тут, на вышыні каля трох з паловай тысяч метраў над узроўнем мора, у чэрвені ці ліпені не выпадзе снег, які, канечне ж, назаўтра да абеду сыдзе парай, і зноў гэтыя векавечныя камянюкі заблішчаць сухімі і адпалі-

раванымі самім часам бакамі. Гэта на дарозе, а на іхняй вышыні нічога таксама не змяніцца. Кулямёт будзе стаяць на сваім месцы руляй на усход, адкуль найчасцей чуваць гартанныя крыкі душманаў. Побач, у ямцы, пад рукамі, каб было зручней браць, ляжаць гранаты. Пазіцыя з усіх бакоў добрая, і яны спакойныя, чамусьці вельмі ўпэўненыя, цішком перамаўляюцца, ні на хвіліну не перастаючыназіраць за сваімі сектарамі абстрэлу. Вакол цішыня, якая бывае толькі, здаецца, на поўдні, нібы ўсё сапраўды спіць, не варушыцца, не кранецца з месца, дзе напаткала цемрадзь. Гэтая цішыня і спакой, як мяккая пасцель для здарожанага цела, проста гіпнатызуе, прымушае заплюшчыць вочы, выцягнуць ямчэй ногі між каменнем. Абламей бубніць і бубніць, апавядае, як яны з бацькам хадзілі па першым снезе на паляванне, біць зайцоў на Пінскіх балотах, асушаных і знявечаных, дадае ён, і Аўгуст згаджаецца з ім, механічна ківае галавой у такт гэтай балбатні. Абламей змаўкае, а з-пад яго знікае мяккая пасцель і галава робіцца яснай і свежай, ажно чуваць, як у скронях пульсуе кроў; яны насцярожваюцца, бо нібы шоргат ці шыпенне дзесятка змей парушае цішыню злева ад іхняй пазіцыі. Не паспелі перакінуцца слоўцам, абмазгаваць, што гэта такое,— за некалькі крокаў ад іх грукае, і адразу ўспышка, выбух. Над галовамі завішчалі асколкі, сцебанулі па каменні, выбілі з яго пыл, які хоць не бачна, але адчуваецца, што пахне пылам.

Аўгуст прыціскаецца, здаецца, усім целам да кулямёта і дае кароткую чаргу ў той бок, адкуль кінулі гранату. Ён чуе, як нешта злосна крычыць Абламей і таксама страляе і страляе ў цемру. Нахіляецца да самага вуха, і Аўгуст нарэшце разумее яго словы: «Трэба паведаміць у роту, што атакуюць нас!..»

Чарната быццам згарае ў полымі выбухаў і запальных куль, раней часу ў гарах золак, створаны людзьмі, без сонца і ранішніх пахаў кветак, травы, млявы, з крывымі ценямі і жоўтымі гарамі. Яны гэтых змен не заўважаюць, таму што самі абудзілі ўсё наваколле, і народжаны імі ранак можа стаць апошнім для іх, дзевятнаццацігадовых, якія нічога яшчэ не пабачылі ў сваім жыцці. Канечне, яны пра гэта не думаюць. Калі перад табой вораг, уся свядомасць накіравана на тое, каб не прапусціць яго, знішчыць, бязлітаснага і страш-

нага, які паважае і прызнае толькі сілу кулямёта і гранат, што раз-пораз шпурляюць з Абламеем з гары. На якую хвіліну ён перастае страляць, і хтосьці нібы калом перацягвае па правым плячы. Ад гэтага ўдару Аўгуст выпускае з рук кулямёт і ў вачах чырвоныя, жоўтыя, блакітныя цені, кругі, яны звужаюцца, звужаюцца, ён пачынае слізгаць уніз і падае тварам на востры камень. Боль выпроствае яго, і ён дрыготкімі рукамі, якія кепска слухаюцца яго, зноў падладжваецца да кулямёта і рэзка цісне на спускавы курок. Паслухмяная і адданая яму машына ажно раве. Аўгуст, здаецца, бачыць, як ляцяць кулі, спыняючы душманаў, не даючы ім выйсці да дарогі, да іхняй пазіцыі...

— Маладыя людзі, вы з'елі марожанае? Можна прыбіраць посуд? — абрывае ягоны гэты зацяглы ўспамін прыбіральшчыца, пажылая цётка з падносам у руках. Яна рашуча, не чакаючы адказу, выцірае ануччай стол, забірае шклянкі з недапітым сокам, сподачкі. Аўгуст з Абламеем яшчэ трохі сядзяць, пазіраючы на чаргу, якая выцягнулася да прылаўка з марожаным, але, калі падыходзяць да іхняга стала дзяўчаткі са шклянкамі соку, вызваляюць ім месца. Сабралася поўна дзяцей, яны шчабечуць, як птушаняткі, сноўдаюць туды-сюды пад восеньскім сціплым сонцам.

Іх абганяюць на пераходзе цераз вуліцу дзве дзяўчыны, высокія, з доўгімі загарэлымі нагамі, у светлых кароткіх па новай модзе сукенках. У адной валасы чорныя, нібы намазаныя маслам, ажно зіхацелі, у другой —саламяныя, падстрыжаныя па-хлапечы. Яны азірнуліся на Аўгуста і Віталя, нечаму свайму перасміхнуліся і пабеглі шпарчэй, бо зялёны агеньчык святлафора замігаў, папярэджваючы пешаходаў.

— Сімпатычныя... Мусіць, студэнткі,— сказаў Абламей.— Мо дагонім?

— І пра што будзем гаварыць з імі? — спытаў Аўгуст і адразу ўспомніў Галіну.

— Прыдумаем...— відаць, рашучасць у Віталя прапала ўжо.— Ты маеш дзяўчыну?.. Мая з вёскі не дачакалася мяне, выскачыла замуж за агранома. Цяпер плача, з сінякамі ходзіць. П'янчуга, недзе з Бранскай вобласці, лупцуе яе, з хаты выганяе. Сустрэў неяк, размінуліся, як незнаёмыя. Толькі што «здароў і да пабачэння»... Што казаць... Ну, дык ці маеш дзяўчыну?

Хлусіць Аўгуст не ўмеў і не хацеў, але ці варта расказваць Абламею пра Галіну. Можна яе назваць сваёй дзяўчынай, калі бачыліся толькі некалькі разоў, альбо не? Віталь чакаў ад яго адказу, вочы былі вельмі цікаўныя, нецярплівыя.

— Эге, бачу, ты ўзляцеў да нябёсаў,— лёгенька штурхануў Віталь.— Раскажы, не саромся. Сябру можна. Тым больш такому, як я. Сам ведаеш.

Аўгуст усё яшчэ быў ва ўладзе мроі і, толькі мінуўшы амаль квартал, зноў загаварыў нарэшце. Ён амаль са шкадаваннем развітваўся са сваёй таямніцай. Ва ўяўленні Аўгуста Галіна была надзвычай добрай і пяшчотнай, прыгожай, і наогул такіх дзяўчат ён яшчэ не бачыў, не сустракаў у сваім жыцці. Голас у гэтай дзяўчыны — нібы пошум маладых дрэўцаў у маі, калі гук напоўнены веснавым пахам.

Ён змоўк і глянуў на Абламея, баючыся на яго твары заўважыць іронію альбо горш — здзеклівую ўсмешку, але той уважліва слухаў і быццам таксама перажываў за свайго сябра.

— Ну і няблага... Мо і я з якой прыгажуняй пазнаёмлюся ў сталіцы. Разам будзем гуляць,— сказаў Абламей.

— Канечне, канечне!.. У цябе ж вопыт большы за мой.

— Які там вопыт. Нічога ў нас з табой няма, акрамя арміі за плячыма. І той дарогі...

— Нажывём. Хоць і гэтага не так ужо і мала,— вымавіў Аўгуст і зноў нібыта ўбачыў сябе і Абламея на асветленай аўтаматнымі і кулямётнымі чэргамі і выбухамі гранат базальтавай гары. Калі б запазнілася дапамога, яны з Віталем біліся б да канца. Надзея была б толькі на апошнюю гранату...

## 2

Цёмна-шэрыя, як порах, тэлефонныя будкі з жоўтымі абадкамі прыладзілі акурат напроці пад'езда. Жыхары надта ўзрадаваліся гэтаму. Тэлефоны былі толькі ў дзвюх-трох кватэрах. Ці мала што здараецца часам у жыцці: нават тую ж «хуткую дапамогу» выклікаць. Да суседа вельмі не набегаешся. Цяпер жа стала зручна. Не трэба ні ў кога ласкі прасіць, абы дзве капейкі.

Тэлефоны яшчэ былі спраўныя. Праўда, колькі дзён назад нейкая басота ў трох будках абрэзала трубкі. У пад'ездзе заўважылі, канечне. Пенсіянеркі Антаніна Пятроўна і цётка Клаўдзя, седзячы штодзень на лавачцы ля пад'езда, бачылі, што рабілася ў двары.

Калі Антаніна Пятроўна і цётка Клаўдзя сабраліся на вячэру, у тэлефонную будку ад вуліцы ўвайшла маладая дзяўчына ў штанах, з распушчанымі чорнымі валасамі па плячах. Жанчыны спынілі сваю гаворку і пачалі назіраць за ёй. Дзяўчына, было відаць, пазваніла адзін раз, але трубку не павесіла на месца і з будкі не выйшла. Гэта насцярожыла жанчын.

— Мне ўчора братавая Матруна казала, што дзве гэткіх маладых «двухстволкі» перанялі апоўначы ў пад'ездзе яе суседку і абрабавалі,— сказала Антаніна Пятроўна.

— А божачкі, глянь ты! — здзівілася цётка Клаўдзя.— І што?

— А тое, што знялі з кабеты залатыя пярсцёнкі, ланцужок, гадзіннік. Дый шчэ сінякоў на мордзе пасадзілі. Такія тэлефонную трубку адрэжуць, і не паспееш падумаць, не тое што перашкодзіць... Бач, стаіць...

Спакойна сядзець на лаўцы і глядзець, як гэтая дзеўка нешта вычварае, ужо не было сіл. Жанчыны дружна ўсхапіліся і спярша нетаропка, а потым усё хутчэй падаліся да тэлефонных будак. За некалькі крокаў ад іх прыцішылі хаду і, мінаючы, зазірнулі ўсярэдзіну. І Антаніна Пятроўна, і цётка Клаўдзя адразу прыкмецілі, што дзеўка зусім маладая і прыгожая. Трубку яна пакуль яшчэ не адрэзала, трымала яе ў руцэ, гледзячы на суседні дом. Што яна там убачыла, было невядома. Магчыма, званіла туды.

Прашпацыравалі жанчыны ўзад-уперад, але дзеўка нават на іх не глянула, і вярнуліся на лаўку.

— Ат, курва! Штосьці хімічыць,— вымавіла цётка Клаўдзя. Яна толькі тры месяцы як на пенсіі, дагэтуль працавала прыбіральшчыцай у праектным інстытуце.

Антаніна Пятроўна змоўчала, падумала, што мо і дарма яны нервуюцца. Ці мала вакол ходзіць людзей, і кожнаму некуды трэба званіць. Чорт разбярэ іх, хто хоча адрэзаць трубку, а хто не.

— Нехарашо. Сядзем, Клава,— сказала Антаніна Пятроўна.— Трохі пачакаем і пойдзем вячэраць.

— Як хочаш,— незадаволена вымавіла цётка Клаўдзя.— Мне што, мне абы-што.

— Няўжо...— Антаніна Пятроўна раптам нечакана для самой сябе моцна пазяхнула і спалохалася, засланіла твар аберуч.

Грукнулі дзверы, і міма жанчын прайшоў Раман з трэцяга паверха. Быў ён у зялёным вельветавым касцюме, у белай кашулі, з вузенькім чорным гальштукам. Яго жонкі Яніны нешта з тыдзень не відаць ужо.

Каля тэлефонных будак Раман замарудзіў крок, азірнуўся і зайшоў усярэдзіну. Гэта здзівіла жанчын, таму што ў яго кватэры быў тэлефон. Хоць ён мог, канечне, сапсавацца. Званіў Раман куды ці не, цяжка было заўважыць, таму што ён высокі і закрыў сваім целам будку, схавалася за ім і дзеўка.

Доўга ён каля тэлефона не быў, і жанчыны падумалі, што ён пойдзе некуды далей. Аднак Раман павярнуў да пад'езда.

— Са святам, дарагія жанчыны! — на твары ў яго радасная ўсмешка, ажно схіліўся перад Антанінай Пятроўнай і цёткай Клаўдзяй, пацалаваў ім рукі. Жанчыны нібы здурнелі ад такой увагі, забылі, што пільнавалі, чаму не ішлі вячэраць.

— А з якім святам?!..— ускліюнулі жанчыны.

— З нядзеляю,— на хвілінку задумаўшыся, адказаў Раман.— Бачыце, мы дажылі ўжо, што нядзелю і святам не лічым.

— І то праўда. І цябе віншуем, Рамане, каб быў шчаслівы і здаровы,— загаманіла цётка Клаўдзя, не даючы Антаніне Пятроўне ўставіць якое слоўца. Прыгожы ўсё-ткі мужчына гэты Раман: валасы чорныя і густыя, што конская грыва, смуглявы твар, а на падбародку ямінка.

Цётка Клаўдзя хацела нешта сказаць, але раптам забылася. Ад тэлефонных будак проста ў іхні пад'езд шпарка ішла тая дзеўка.

Ёй больш не было як гадоў дзевятнаццаць-дваццаць. Вочы вялізныя, на паўтвару, і вусны ажно блішчаць ад памады. Штаны на ёй былі кароткія, пад каленам падвязаныя бліскучым шнурком. У бёдрах яна была крыху паўнаватая, але гэтым, мусіць, яшчэ болей прывабная для мужчынскага вока. Чырвоная блузка ля шыі расшпілена, і быў відаць тоненькі залаты ланцужок. Усё гэта цётка Клаўдзя паспела за нейкую хвілю

ўгледзець, пакуль за дзеўкай не ляпнулі моцна дзверы.

— Дык чаму не святкуеце? — ужо ад жанчын Раман і не слухаў, што яны кажуць. Нават на твары напісана, што заспяшаўся ён.

— Па-бег...— сказала цётка Клаўдзя, па-змоўніцкі падміргнула Антаніне Пятроўне і зусім па-маладому рушыла ў пад'езд. Дзверы за сабой прычыніла пацíху і стаілася, прыслухалася каля лесвіцы. Быў чуцен пошчак абцасаў, потым ён заціх. Забухаў мужчынскі голас, на трэцім паверсе адчынілі кватэру, ударыў аб бетон абцасік жаночага туфля. Больш ніякіх гукаў хвілін пятнаццаць цётка Клаўдзя не чула.

Калі выйшла з пад'езда, яе было проста не пазнаць, твар нібы памаладзеў на гадоў дзесяць. Падсела да Антаніны Пятроўны і зашаптала ў вуха:

— Павёў...

— Хто і што павёў?

— Павёў,— паўтарыла цётка Клаўдзя,— да сябе ў кватэру.

— Хто? — не разумела Антаніна Пятроўна.

— Раман павёў гэную дзеўку.

— Да ну... Ты што — бачыла?

— Не верыць, во баба дурная!

— Не дурней за цябе,— пакрыўдзілася Антаніна Пятроўна, але цікавасць перамагла.— Гэну дзеўку? А дзе ж яго жонка?

— Скуль я ведаю. Вось так... А я думала, што ета яна тут, верціхвостка, круціцца. Вона што, га?..

— Мо яна зараз будзе ісці назад? — нерашуча выказала думу Антаніна Пятроўна.

— Чакай. Спецыяльна для цябе выйдзе...— цётка Клаўдзя адчула, што ёй стала горача, яна зняла з сябе цёплую кофту, але злякалася, што прастыне і адзелася зноў.

— Цьфу! — раптам плюнула Антаніна Пятроўна.

— Чаго ты?

— Бля-а-дун! — рэзка і безапеляцыйна абвясціла Антаніна Пятроўна.

— Ну, не кажы,— запярэчыла цётка Клаўдзя, задумалася і ўсміхнулася, нешта, відаць, успомніўшы.— А можа, жонкі яму мала. Дый яе штосьці не відно. Ен жа, бач, які огер. Яму толькі бабу давай.

— Цьфу! Кажаш абы-што. Саромелася б хоць, жан-

чына ва ўзросце, на пенсіі ўжо, а плявузгуеш, вушы чырванеюць,— Антаніна Пятроўна і пачырванела, з абурэннем паглядзела на сяброўку.

— Разумніца! Пажыла б без мужа дваццаць гадоў, яшчэ б не тое заспявала б,— цётка Клаўдзя нешта замырматала і, пакінуўшы Антаніну Пятроўну ў разгубленасці, з высока ўзнятай галавой пакіравала дамоў.

## 3

Раман, спрабуючы зрабіць гэта як мага цішэй, зашчоўкнуў за сабой дзверы ў кватэру, пасля ўставіў ключ у ніжні замок і павярнуў два разы. Дзяўчына як ўвайшла, так і стаяла ў калідоры, прысланіўшыся да сцяны, і з усмешкай назірала, тым часам асцярожна здымаючы памаду з губ.

— У цябе такі напалоханы выгляд,— сказала яна,— што, можа, не варта было прыходзіць мне?

— Што ты, каханенькая! — Раман абхапіў яе за плечы.

— Пачакай,— ледзь чутна зашаптала яна і знясілена прысела на тумбачку для абутку, якую хвіліну сядзела моўчкі з заплюшчанымі вачыма з летуценнай усмешкай на пульхных вуснах. У яе былі роўныя і белыя,як фарфоравыя,зубы. Раман ужо ледзьве валодаў сабой. Яна здалася яму прыгожай лялькай, якую хацелася гладзіць, песціць і нават гуляць з ёй. Ён так падумаў і засмяяўся. Балазе яна не магла зразумець прычыну гэтаму.

— Анжэлка, ты цуд! — Раман зноў пацягнуўся да яе, каб абняць, але яна адхілілася і лёгенька адштурхнула яго.

— Здымі з мяне туфлі! — Анжэла капрызна надзьмула губы і тупнула нагой.— Ну!

— Слухаю, ваша міласць! — ён жартаўліва ўпаў перад ёй на калені і, перш чым разуць яе, пацалаваў ногі.

— Ты нечым устрывожаны? — яна пацягнула яго за галаву, уважліва паглядзела ў вочы.— Так?

— Пенсіянеркі сапсавалі настрой. Відаць, яны заўважылі, што ты пайшла да мяне. Вечна сядзяць і вывіжоўваюць, усё нюхаюць...

— А дзе твая жонка?

— У суседнім пакоі,— сказаў ён і нервова рагатнуў, бо ў самога ад гэтага жарту пахаладзела ўнутры.

— Ты што? — яна спалохалася і, нібыта абараняючыся, засланіла твар рукамі, пасунулася ў куток.

— Я пажартаваў,— Раман пасміхнуўся, хацеў дадаць, што жонка спіць, аднак не паспеў: Анжэла, усхліпнуўшы, ляпнула яго па шчацэ. Ніколі не падумаў бы, што ў яе такая цяжкая рука: ажно зазвінела ў вуху.

— Вінаваты,— ён схіліў перад ёй галаву, і Анжэла ласкава пагладзіла шчаку, якую толькі што ўдарыла.

— Больш не называй мяне зязюлькай!

— Чаму?

— Калі будзе ад цябе дзіця, дык я сама выгадую, нікому не падкіну.

Раман правёў Анжэлу ў гасцёўню, уключыў магнітафон і, пакуль яна аглядалася, шчыльна зацягнуў на вокнах гардзіны. Пашнарыўшы на кніжных паліцах, аднекуль дастаў тоўстую чырвоную свечку, прыладзіў яе ў шклянцы і запаліў. Крохкае святло затанцавала, хітнулася і заблішчэла зыркім язычком.

— Ты есці хочаш? — спытаў ён у Анжэлы.

— Не...— яна назірала за Раманам, як ён мітусіцца, завіхаецца, і ёй было радасна. У яго былі дужыя, прыемныя рукі, за якія хацелася патрымацца, каб хоць трохі адчуць і сябе моцнай. Анжэла ўжо прыходзіла сюды некалькі разоў, і заўсёды ёй было вельмі страшна. Міналі дні, яна забывала пра страх і, калі Раман званіў, зноў згаджалася прыйсці да яго. Зараз яна падумала, што, пэўна, любіць гэтага мужчыну, які не абяцае ёй ні жаніцца, ні быць з ёй усё жыццё. Хоць гэта навошта?.. Навошта яна і сёння прыйшла сюды? Спярша была непрыемнай ёй Раманава канспірацыя (каб толькі ніхто не ўбачыў), прывыкла, і нібыта гэтак было заўсёды.

Раман усё-ткі зварыў кавы і паставіў на табурэтцы перад канапай два белыя з блакітнымі пасачкамі кубачкі. На сурвэтцы ён прынёс жменю цукерак. Анжэла ўзяла адну і палажыла назад: такія не любіла. Чамусьці раздражнёна падумала, што мог ужо ўведаць, якія цукеркі яна есць, аднак не сказала гэта.

Раман шукаў, што б яшчэ пакласці на стол і пачаставаць Анжэлу. Толькі ніякіх прысмакаў больш у кватэры не было. Жонка, едучы ў вёску да бацькоў, амаль усё выбрала з халадзільніка.

— Я вельмі рады, што ты прыйшла,— прысеў на

канапу побач з Анжэлай, прыціснуў яе да сябе, але яна ўперлася рукамі яму ў грудзі і адвярнула галаву ўбок.

— Не спяшайся... Давай пагаворым...

— Што нам гаварыць,— ён зноў абхапіў яе і з сілаю пацягнуў, каб палажыць яе галаву сабе на калені.

— Прымітыўны ты чалавек, Раман. Трэба ж ласкава... Жанчыны любяць вушамі... Кажы, што я твая любімая, адзіная, мілая і гэтак далей.

— Мілая, адзіная, сонечная! — ён зарагатаў і скрозь смех дадаў: — Галубка, ластаўка, сінічка...

— Сарока, варона,— пачала смяяцца і Анжэла.— Даўно хачу цябе запытаць?..

— Ну?..

— Ты любіш сваю жонку?

— Навошта гэта табе, ці не ўсё роўна?..

— Проста мне стала чамусьці няёмка. У мяне такое адчуванне, нібыта штосьці краду... Не ведаю...

Ён узяў яе тонкую руку далоняй уверх, прыклаў да сваёй шчакі і на нейкі момант заплюшчыў вочы. Яму здалося, што трымае кветку, балазе яна пахла, як букет.

— А мяне ты любіш? — Анжэла пасунулася бліжэй да яго, і ён, падуладны агню, які запалаў ва ўсім целе, пачаў, як вар'ят, цалаваць яе. Галава затуманілася і нават забалела ў патыліцы.

— Любіш, любіш? — яна шаптала, дапытвалася ў яго, і ён гэтак жа ледзь чутна адказваў, што любіць. І калі Анжэла абняла і моцна прыціснулася, у Рамана зноў узнікла адчуванне, што ахутаў водар кветак, і яны ўсюды вакол: на канапе, на падлозе, на стале. Яму здалося, што ён паплыў разам з Анжэлай некуды далёка-далёка... Ён у майскім садзе, цвіце вішня, гудуць пчолы... Ён перапоўнены шчасцем. Потым загуло, занепакоілася мора, закрычалі чайкі... Шторм спакваля заціх, пахла ўсё роўна не морам, а кветкамі.

Здалося, што надта гучна трашчыць свечка, і можна было яе зусім патушыць, а ён забыў пра гэта. І вось цяпер яна надакучліва свеціць, і ад яе разбегліся нейкія чорныя плямы. Ён падняўся і сеў, раптам яму захацелася, каб гэтая прыгожая і жаданая заўсёды дзяўчына хутчэй пайшла з кватэры, штосьці яго турбавала, грызла душу. Такое ў яго было ўжо неаднойчы, але ён неяк перамагаў сябе, а пасля супакойваўся і толькі меў радасць ад Анжэлы.

— Ідзі, ідзі...— яна клікала яго, абхапіла за шыю ласкавымі рукамі. Аднак ён вызваліўся з абдымкаў і басанож падышоў да акна, адгарнуў гардзіну і выглянуў на двор. На двары нікога не было. Ён падумаў, што найлепш сказаць Анжэле, каб паціху збіралася дахаты. Хоць, канечне, яна моцна пакрыўдзіцца і можа больш не прыйсці. Яму не хацелася страціць яе. Усё-ткі з Анжэлай было вельмі добра, яна нічога не патрабавала, яна была проста шчаслівая з ім, гэтыя сустрэчы для яе свята. Зрэшты, ёй у душу не заглянеш, якія думкі ў Анжэлы, іх яна не вельмі выказвае.

— Ой, Рамане, Раманеку,
Хадзі да мяне, дамянеку,
Ой, Рамане, Раманеку...—

раптам заспявала Анжэла, і ён ажно ўздрыгнуў ад яе голасу, хацеў сказаць, каб змоўкла, але ачомаўся і вярнуўся на канапу.

— Ты ўсё маўчыш,— пакрыўджана загаварыла Анжэла,— быццам нямы...

— У свой час,— Раман пасунуўся бліжэй да Анжэлы, і канапа зарыпела, нібы век на ёй спалі, а не паўгода, як купілі ў Доме мэблі. І гэтае рыпенне непрыемна сцебанула па нервах.

— Што з табой, даражэнькі?

— Сам не веда...

— Супакойся, сонейка маё, любімы мой,— Анжэла лашчылася да яго, а ён не мог з сабой саўладаць, кожны гук гаспадарыў над ім. Аднекуль выплыла ўжо злосць на Анжэлу, таму што сёння ён не чакаў яе, хоць спярша і ўзрадаваўся, убачыўшы ў тэлефоннай будцы.

— Каву будзеш піць? — сказаў першае, што прыйшло ў галаву.

— А ты?

— Не ведаю...

— Я таксама...

Відаць, яна вырашыла застацца ў яго на ўсю ноч, і гэта было нікуды не варта. Хоць сілком ён не мог выгнаць Анжэлу з кватэры, не хапала смеласці і пасварыцца з ёй. Звычайна пасля сваркі яна адразу ляпала дзвярыма, і потым ён два альбо тры тыдні прасіў яе, каб зноў прыйшла, гаварыў, што лепшай за яе няма на свеце.

Усё-ткі ён падняўся з канапы, паставіў на агонь чайнік. Вада хутка закіпела.

— У цябе прыгожы сын,— Анжэла рассунула на акне гардзіны і разглядвала фотаздымкі ў альбоме.

— Колькі ўжо яму?

— Шэсць,— буркнуў ён,— тут нічога цікавага.

Раман не хацеў, каб яна бачыла фотакарткі, на якіх яны з Янінай, і пацягнуў з рук альбом. Анжэла, жартуючы, не аддавала, і тады ён з усяе сілы рвануў і, мабыць, зрабіў ёй балюча. Твар у Анжэлы пакрыўджана скрывіўся, яна павярнулася да сцяны і з галавой накрылася прасцірадлам.

Ён пабадзяўся па кватэры з кутка ў куток, не ведаючы, што рабіць. Потым падняў раскіданую па дыване апратку і адзеўся. Трошкі стала спакайней на душы.

— Хочаш, каб я пайшла? — глухім голасам спыталася Анжэла, і па яе ўздыхах ён зразумеў, што яна плача.

— Не...— Схлусіў Раман і пашкадаваў, бо ненатуральна прагучала гэтае «не».

— Навошта ж ты адзеўся? — спыталася яна. Сказаць ёй, што захацеў падыхаць свежым паветрам альбо забраць газеты з паштовай скрынкі,— не паверыць, дый гэта проста глупства.

— Ты мяне не любіш і ніколі не любіў... Я, як вар'ятка, імчала да цябе, пачуўшы, што хочаш пабачыцца. Вось дурніца дык дурніца,— вельмі спакойна казала яна, а ён маўчаў, бо гэта была праўда, і яму не хацелася зноў хлусіць. Цяпер найлепш было толькі слухаць, хай гаворыць, ёй стане лягчэй і яму прасцей.

А на вуліцы ўсё яшчэ было светла, хоць і сонца даўно схавалася за небакраем. Вецер гнаў па асфальце пыл. Расліннасць была нейкая шэрая. Анжэла прыціхла, магчыма, заснула, а ён стаяў да яе спіною і глядзеў у акно, адчуваў сябе брудным, як гэтыя дрэвы. Ён уявіў Яніну, сына, якіх, канечне ж, ніколі не пакіне, бо сапраўды любіць іх. З Анжэлай усё гэта,— мусіць, разбэшчанасць, ніяк не адвыкне ад свайго халасцяцкага жыцця. «Што за характар»,— вылаяў сябе.

Ён падняўся з канапы і выйшаў на кухню. Заўтра вечарам (успомніў, убачыўшы на халадзільніку спіс прадуктаў, які склала жонка) паедзе ў вёску па Яніну і сына. Трэба забыць Анжэлу, яе абдымкі і пацалункі, пераключыць сябе, як электрычны прыбор. Пасля такіх сустрэч, як сёння, у яго заўсёды сваркі з Янінай, яму

здаецца, што жонка нясмачна гатуе, у кватэры не прыбрала і наогул благая гаспадыня.

Хоць гэта жончына заслуга, што ў кватэры ўтульна, з густам падабраны ў пакоях і ў калідоры шпалеры. Дый, відаць, амаль ніколі ён не быў галодны. У Таліне Яніна купіла вясёлага лупатага чорта. Ён павесіў гэтую цацку на цвіку над дзвярыма.

Раман хітнуў чорта, і ён закруціўся, бліснуў бельмамі, нібыта пасміхаючыся з усяго, што робіцца ў кватэры. Як толькі цацка спынілася, дзынкнуў званок. Спачатку вельмі коратка і асцярожна, а другі раз працягла і настырна. Зараз Раман пашкадаваў, што не ўставіў у дзверы вочка, як гэта зрабіў сусед. Мяшчанства мяшчанствам, але калі б стаяла, дык убачыў бы, хто гэта хоча да яго ў кватэру. Жонка не магла быць, сам пасадзіў яе з сынам раніцай на аўтобус, які ідзе да цешчынай вёскі шэсць гадзін. Значыцца, некага чорт нясе.

Ён на дыбачках падышоў да гасцёўні, шчыльна зачыніў дзверы, для ўпэўненасці замкнуў іх на ключ. Калідор быў засланы кароткім і вузкім дыванам, і Раман зачапіўся за яго нагою. Ад нечаканасці ледзьве не ўпаў. Мімаходзь ён убачыў у люстэрку свой напружаны і зацяты твар, іншым разам пасмяяўся б з сябе. Было не да смеху, за дзвярыма нехта настойліва ціснуў на кнопку званка. Ён падумаў, што варта адарваць провад ад чорнай скрыначкі пад столлю, і зноў будзе ціха. І павярнуўся ўжо ад дзвярэй, каб ісці па табурэтку, але не пайшоў. Ці не гаспадар ён у сваёй кватэры, чаго і каго яму палохацца?

Ён рашуча адчыніў дзверы і выйшаў на пляцоўку. Лямпачка над уваходам у ліфт перагарэла, і кволае святло з двара было толькі ля акна. Аднак яго дастаткова Раману, каб убачыць чалавека, які так недарэчна званіў у кватэру.

— Што такое? — амаль ускрыкнуў ён і, збянтэжаны, спытаў: — Хто вы?

Канечне, ён сказаў не тое, што трэба было б. З гэтай хударлявай і ціхай, як мыш, жанчынай, Раман вітаўся дзве гадзіны назад. Яе кватэра была над ягонай. І звалі жанчыну Антаніна Пятроўна, некалі знаёміліся, памагаў насіць мэблю. Калі вочы прывыклі да цемнаты, ён убачыў, што суседка нечым усхвалявана. Яна нервова ўскідвала галаву, і ад гэтага шэрая цёплая хустка спаўзала на плечы.

— Мне... Можна зайсці? — нейкім дрыготкім голасам нарэшце вымавіла. Яе ўзбуджанасць быццам перадалася Раману, ён замітусіўся і шырэй адчыніў дзверы, прапускаючы суседку. Антаніна Пятроўна адразу з парога нахілілася, штосьці падхапіла з падлогі і павярнулася да Рамана. Пры яркім электрычным святле яе твар быў чырвоны, як пацёрты цаглінай, старэчыя рукі ў пухірах і дробным рабаціннi ажно калаціліся.

— Гэта вашай жонкі? — Антаніна Пятроўна здзекліва прыжмурыла вочы. У яе руках былі басаножкі Анжэлы.

— Маёй,— ні на хвіліну не задумваючыся, адказаў ён,— а што?

— У вашай я не бачыла,— яшчэ больш прыплюшчвала вочы суседка,— гэта дэфіцыт!

— А што? — Раман крыху разгубіўся. Здаецца, нічога асаблівага ў гэтых басаножках: бліщчастыя спражкі, тонкі і востры, як швайка, абцас. Ногі паламаеш у гэткім абутку. Для жанчын усё дэфіцыт.

— У вас жанчына! — гучна сказала Антаніна Пятроўна.— Як не сорамна! Няма! Чаму тут замкнулі дзверы? — яна шырокім крокам падышла да гасцёўні, націснула на дзверы і стала перад імі, тыцнуўшы пальцам:

— Яна там!

Раман як зачараваны сачыў за Антанінай Пятроўнай і так быў здзіўлены яе паводзінамі, што толькі разгублена лыпаў вачамі. Нарэшце аслупяненне прайшло, і ён забраў басаножкі, акуратна паставіў іх на месца. І, больш не слухаючы, што гаворыць Антаніна Пятроўна, моцна ўзяў яе за руку, з нейкім задавальненнем убачыў страх у яе вачах, павёў з кватэры. Яна ішла за ім, паслухмяная і з шэрым, як хустка, тварам. Раман спалохаўся, каб не здарылася што благое з ёй. Ён вывеў яе на пляцоўку і борздка, не азіраючыся, ускочыў у кватэру і, не раздумваючы, адрэзаў нажом провад ад званка. «Так яно пакуль будзе лепей...» Ён прысеў у калідоры на тумбачку і задумаўся. Гэтая старая баба можа і нагаварыць жонцы, а тая раптам паверыць... Во, міліцыянер у спадніцы, каб цябе. «Не трэба было пускаць у кватэру. Такая напіша і на работу, і ў міліцыю, маўляў, бардак у маёй кватэры...»

З вуліцы пачулася песня, недзе спявалі ў двары іхняга дома. Немаладыя галасы басавіта цягнулі «Зям-

лянку». Праз акно на кухні Раман убачыў на лавачцы ля пад'езда Івана Кірылавіча з першага паверха і з ім яшчэ трох незнаёмых пажылых мужчын. Ва ўсіх іх на пінжаках былі медалі. Іван Кірылавіч узмахваў перад сабой кульбакай, дырыжыраваў. Сівая чупрына была ўскудлачана, а вусы па-заліхвацку падкручаны ўгору. Трошкі збоку на тратуары стаяла яго жонка, таксама ўжо немаладая жанчына, у светлым плашчы і з бамбукавай палкай у руцэ. У яе была хворая правая нага, а Іван Кірылавіч страціў на вайне левую. Нехта з пад'езда даў ім мянушку Рубель дваццаць. Раману падабаліся гэтыя людзі, яму заўсёды было прыемна сустрэць Івана Кірылавіча, пагаварыць якую гадзіну з ім. Адчувалася, што і гэты сусед з прыязнасцю адносіцца да яго. Калі б не Анжэла, ён выйшаў бы на двор.

Недзе побач хтосьці паціху стукаў, з асцярогаю, нібыта баючыся. Раман адразу падумаў, што гэта, мабыць, Анжэла. І, калі ён адамкнуў гасцёўню, яна была ўжо адзетая, трымала ў руках сумачку.

— Куды ты?

Яна змаўчала, адвяла вочы і паспрабавала абысці Рамана.

— Ну што...— дрыготкім голасам прагаварыў Раман і прымусіў сябе дадаць: — Я люблю цябе...

Анжэла зашморгала носам, і ён адчуў, што кашуля на плячы стала мокрая ад слёз. Тады ён сваёй насоўкай выцер ёй вочы, твар.

Яна абышла Рамана, як слуп, перад люстэркам падфарбавала вочы, губы. І, нібыта яго не было тут, моўчкі абула басаножкі, якія ўгледзела Антаніна Пятроўна. Раман не паспеў ачомацца, як яна ляпнула за сабой дзвярыма. Ён толькі ўздыхнуў.

Раман прыбраў з канапы пасцель, адчыніў вокны ў гасцёўні, спальні і на кухні. Відаць, Іван Кірылавіч ужо дома, таму што не было чутно з вуліцы яго голасу. Невядома колькі часу, бо будзільнік спыніўся. Раман уключыў радыёпрыёмнік, якраз дыктар перадаваў апошнія навіны. Было не позна.

## 4

Перад Аляксеевічам сядзелі два сярэдніх гадоў дзядзькі і бубнілі, бубнілі, як жанчыны, хоць і тыя зранку адмоўчваюцца. Гэта найзласнейшая баба на зол-

ку пачынае псаваць ужо людзям нервы. Надаедлівыя трапілі суседзі, перашкаджаюць думаць, толькі ж едучы на работу і можна ўзважыць і асэнсаваць усё, што сабралася ў галаве за дзень альбо тыдзень.

Зусім незнарок Аляксеевіч прыслухаўся, ды гэтую балбатню чула паўаўтобуса. Адзін быў, мусіць, глухаваты, усё перапытваў і здзіўляўся на поўны голас:

— Няўжо ж спецыяльна той сакратар у Кіргізіі рабіў?

— А як ты думаў. Браў хабар, акружыў сябе сваякамі, рознымі падхалімамі. У газэце напісана, сусед расказваў, абяцаў даць пачытаць. Няйнакш мільён назбіраў. А мяне за тое, што ўзяў бутэльку фарбы, на тварыскі суд зацягнулі і аштрафавалі на пяцьдзесят рублёў. Кажуць, нясун. Дык я бутэльку адзін раз узяў і не данёс, а то, бач, мільён, і калі яго пакаралі? Ого, не так проста ўзяць гэтага мільянера за жабры. Калі меў столькі грошай, дык, пэўна ж, і падкупіў усіх, каго трэба. За рубель дваццаць яго не возьмеш.

— Так, так. Крычаць па радыё, у газетах аб справядлівасці, а я ўчора кажу майстру, ён у цэху старшыня цэхкома, што гэта ў нас нямашака душавой, прасіў пуцёўку сыну — не далі. Ведаю: па гэтай пуцёўцы паехаў сынок галоўнага інжынера. У заводскім прафкоме ў мяне дзеўка знаёмая, зямлячка, расказала. Гэта ўсё ў майстра, а ён мне адразу: табе не падабаецца Савецкая ўлада? Бач, ён ужо — Савецкая ўлада. Ах, думаю, смаркач ты пузаты. Хацеў пляснуць яму па вуху, але потым бяды не абярэшся. Хуліганства прыпішуць, прэміі паздымаюць. Вось і перабудова. Як вылезеш з крытыкай начальства, лічы, заціснуць і не піснеш.

— І я пра тое. Навошта той Узбекістан і Кіргізія, калі мы ў сябе бачым...

Што яны ў сябе бачаць, Аляксеевіч не даслухаў, бо трэба было выходзіць з аўтобуса. Ён падумаў, як лёгка можна пакрыўдзіць чалавека, і той будзе гэта доўга помніць і праз сваю крыўду глядзець на ўвесь свет.

Будаўнічая пляцоўка была недалёка ад аўтобуснага прыпынку, яе адгароджваў ад вуліцы зялёны, з добрай габляванай дошкі плот, які зрабілі па загаду былога начальніка ўчастка Ярыгі. Ён цяпер рэдка прыязджаў на пляцоўку, таму што стаў начальнікам упраўлення, і такіх аб'ектаў у яго падначаленні было шмат.

Да пачатку работы яшчэ амаль паўгадзіны, Аляксеевіч заўсёды прыходзіў трошкі раней за астатніх. Гэта была прывычка, выпрацаваная гадамі: зайсці на пляцоўку, калі там нікога пакуль няма, у цішыні і спакоі пасядзець ля вагончыка, канечне ж, не ў замець альбо дождж, а пры роўным, лагодным надвор'і, і падумаць пра жыццё-быццё. Дома людна, дачка з мужам і малой у адным пакойчыку, сын з жонкай і двума дзецьмі ў другім, а яны з жонкай — нібыта ў трэцім, але гэта ўсё адносна, бо жывуць усё-ткі разам і, здаецца, без крыку, гвалту, а гэта значыць, што Аляксеевіч увесь час і з дзецьмі, і з ўнукамі. Толькі ўначы і сціхае іхняе жытло. Калі малыя не хворыя, а так і ноччу плач то справа ў пакоі, то злева. Сям'я, канечне, без клопату і шуму не выходзіць, не бывае. І вось, седзячы на лавачцы ля вагончыка на будаўнічай пляцоўцы, ён застаецца адзін. За гэтыя трыццаць хвілін перадумае аб усім, разважыць, як і што рабіць надалей, каб правільна, па сумленні жыць. Чалавеку хоць зрэдку, хоць на маленькі прамежак часу хочацца пабыць аднаму, дый, мабыць, трэба.

Аляксеевіч, прыціскаючыся да плота, на вузкіх дошках абмінуў лужыну ля варот і, усё-ткі чарпнуўшы паўбацінкам халоднай бруднай вады, выйшаў да вагончыкаў, якія былі пастаўлены ўпрытык адзін да аднаго і нагадвалі цыганскі табар. Толькі што тут на сценах віселі плакаты з заклікамі працаваць з высокай прадукцыйнасцю, якасна, эканоміць матэрыялы і электраэнергію, актыўна ўдзельнічаць у сацыялістычным спаборніцтве. Вока даўно прывыкла ўжо да гэтых папер, і словы, надрукаваныя на іх буйнымі літарамі чырвонага колеру, не хвалявалі, сталі гідкімі, як лаянка майстра і рабочых. Пра гэта некалі Аляксеевіч гаварыў на партыйным сходзе, але яго тады яшчэ пакрытыкавалі за антыпалітычны погляд, несумяшчальны са званнем камуніста. Не-не і ўспомніцца дурное абвінавачванне і як пекане па нервах, па сэрцы. Во, дурасць людская, няшчасны фанатызм. Аляксеевіч другі дзесятак гадоў выпісваў часопіс «Коммунист» і начытаўся яго, мог пры жаданні пафіласофстваваць, карыстаючыся навуковымі тэрмінамі, але гэтага не рабіў, бо паважаў сябе і людзей, не хацеў паказвацца надта разумным. Які ён чалавек, што ў яго за душой, хто з ім даўно працуе — ведаюць.

Перад прарабскім вагончыкам стаяла шэрая, вядомая амаль усім рабочым старая «Волга» начальніка ўпраўлення. Вагончык быў яшчэ зачынены, а ў машыне сядзеў, апусціўшы галаву на руль, нібыта спаў, вадзіцель. Яго Аляксеевіч ведаў, бо той вазіў начальніка ўжо з дзесятак гадоў і не раз быў на будоўлях.

Як толькі Аляксеевіч ступіў на ганак свайго вагончыка, вадзіцель падняў галаву і, адчыніўшы дзверцы, гукнуў: «Гэй!» Потым памахаў рукою, запрашаючы да сябе ў машыну.

— Што? — павітаўшыся, спытаў Аляксеевіч.

— Сядай. Ты Антон Аляксеевіч Кемчык?

— Ну, я. І што?

— А нічога. Шэф загадаў даставіць цябе ў кантору,— ужо заводзіў рухавік жвавы вадзіцель з нахабнаватым тварам, як у большасці шафёраў, якія возяць начальства.

— Навошта?

— Мне ён не дакладваў,— адрэзаў вадзіцель, з цяжкасцю вырульваючы між лужынай і плотам.

Амаль ля варот Аляксеевіч прыкмеціў Аўгуста і махнуў рукой, але той, мусіць, не ўбачыў яго ў машыне.

Да ўпраўлення было недалёка, але зранку вуліцы перапоўнены транспартам, і яны ехалі марудна. Аляксеевіч, перабіраючы ў галаве розныя варыянты, усё спрабаваў здагадацца, навошта спатрэбіўся Ярыгу, і не мог зразумець.

Упраўленне знаходзілася ў старой трохпавярховай будыніне архітэктуры канца пяцідзесятых гадоў. Наколькі Аляксеевіч помніў, раней яно было недагледжанае, з абдзёртымі і парудзелымі ад часу сценамі, на якіх яшчэ заставаліся чырвоныя плямы былой фарбоўкі. Цяпер упраўленне было не пазнаць: адрамантаванае, відаць, не так даўно, з новай шыльдай. Няйнакш навялі парадак з прыходам Ярыгі. І гэта парадавала Аляксеевіча, раней непрыемна было заходзіць сюды, усялякі настрой псавалі і аблезлыя сцены, і паламаныя дзверы, і падлога, якая ажно пішчала пад нагамі. Быццам хлеў, а не сур'ёзная ўстанова.

У прыёмнай начальніка Аляксеевіча сустрэла маладая прыгажунька з прычоскай, якую, думаў, толькі ўбачыш на фотакартках у цырульні, аж не — і ў жыцці, аказваецца, такая ёсць.

— Ілью Ільіча выклікалі ў райком партыі, але ён

хутка будзе. Прасіў яго дачакацца,— сказала яна, вельмі сур'ёзна паставіўшы свае нафарбаваныя вочкі.

— Добра, пасядзім...— не зусім упэўнена прамовіў Аляксеевіч, бо яму трэба было б па-добраму не тут прахалоджвацца, а заканчваць з Аўгустам электраправодку на чацвёртым паверсе. Зацягнулася надта гэтая работа з-за матэрыялаў: то не прывезлі праваду, то выключальнікаў, якія запраектаваны ў кватэрах, то не хапіла электрычных шчыткоў. А тут якраз усё сабралася, і можна скончыць нарэшце з гэтым паверхам. Ён прысеў у крайняе ад дзвярэй кабінета начальніка крэсла, і на твары прыгажунькі ўзнікла недаўменне ці нават пратэст. Ён адразу не паспеў асэнсаваць гэта, проста яна скрывіла вусны, нібы з'ела кіслае.

— Прабачце...— неяк нервова выдыхнула яна, вочы не апусціла ўніз, глядзела з халоднай рашучасцю.— Тут нельга чакаць.

— Як? — недаўмеўся Аляксеевіч.— Гэта ж прыёмная. Дзе ж чакаць? — адчуў, як закіпае кроў, што не стрымаецца і нагрубіць гэтай маладой прыгажуні; ёй сапсуе дзень і сам будзе потым доўга пакутаваць — лічыць, што задарма пакрыўдзіў чалавека.

— У калідоры,— яна адвярнулася да акна, ужо не чула Аляксеевіча, і ён падхапіўся, амаль калоцячыся ад абразы гэтай смаркачкі. І зноў нічога не прамовіў, бо не мог сварыцца і ніколі гэтага не рабіў, згорбіўшыся, выйшаў у калідор. Затупаў па новай бела-сіняй лінолеумнай падлозе. Неяк непрыемна цадзілася з белых трубак святло. У адной лямпе сапсаваўся стартэр, таму што трубка шчоўкала, гудзела, то цямнеючы, то зноў наліваючыся,быццам малаком. Шчоўканне раздражняла.

Зрэдзь адчыняліся з кабінетаў дзверы, з іх выбягалі кабеты і мужчыны з паперамі ў руках, вельмі заклапочаныя і сур'ёзныя. Яны мільгалі міма Аляксеевіча туды-сюды, і кожны паглядваў на яго, відаць, думаючы, чаму сярод рабочага дня ён швэндаецца тут, але ніхто не пытаўся нічога. Ранейшых супрацоўнікаў упраўлення Аляксеевіч ведаў, і яны яго таксама, але многія пайшлі на пенсію, той-сёй звольніўся, і, лічы, акрамя начальніка аддзела кадраў адстаўніка Цярэшчанкі і Ярыгі — усе былі незнаёмыя.

Мінула гадзіна-другая, час ужо набліжаўся да абеду, а ён усё тупаў па калідоры: пастаяў ля аднаго акна,

ля другога, паўзіраўся на вуліцу, спадзеючыся ўбачыць нарэшце Ярыгу, прачытаў аб'явы на стэндзе народнага кантролю, дзе ў спісе групы знайшоў і сваё прозвішча, папіў вады з бачка і — нічога. Урэшце набраўся смеласці, адчыніў дзверы ў прыёмную і асцярожна спытаў у сакратаркі, якая няўмела двума пальцамі ляпала па машынцы, друкуючы штосьці:

— Не званіў Ілья Ільіч?

— Не, чакайце...

Але навошта спатрэбіўся ён начальніку ўпраўлення, чаму раптам успомніў старога рабочага Кемчыка, нездарма ж, відаць. З нечым гэта звязана. І машыну нават прыслаў, скуль такі гонар яму? Ну, у райком паехаў, выклікалі, можна ж было пазваніць гэтай дзеўцы і сказаць: так і так, маўляў, затрымаўся, невядома калі буду, няхай чалавек ідзе на работу. А гэта што ж, чортведама якая дурнота. Добра, хоць не ў рабочай спяцоўцы сюды прыехаў, а то зусім як пудзіла быў бы тут.

Ён яшчэ раз зазірнуў у прыёмную і пачуў тое ж самае: чакайце. Аднак колькі чакаць — падумаў зайсці да сакратара парткома ўпраўлення, мо той у курсе — навошта спатрэбіўся Ярыгу. Ужо дайшоў да кабінета сакратара парткома, узяўся за дзверы і адступіў. Вырашыў пачакаць пяць хвілін і вяртацца на будоўлю. Больш не заходзіў да сакратаркі, пастаяў ля насценнай газеты «Будаўнік», дзе старшыня групы народнага кантролю хваліў яго за актыўную работу. Хоць гэта трохі падняло настрой, і ён некалькі разоў прабег вачыма па радках, у якіх значылася і яго прозвішча. Пасля яшчэ прайшоў па калідоры ад акна да акна, стараючыся як цішэй ставіць ногі на падлогу, каб не шумець сваёй хадой і не перашкаджаць працаваць людзям у кабінетах, у якіх дзверы хліпкія, тонкія, нібыта сіта, прапускаюць кожны гук. Вось-вось павінен быў пачацца ва ўпраўленні абед, і Аляксеевіч не захацеў больш мазоліць вочы. Ён пакінуў гэты дом у недаўменні, здзіўлены дарэшты.

## 5

Дарожная сумка ўжо была зусім лёгкая. Ніла Восіпаўна агледзела пакой, каб не забыцца што,— усе яе рэчы былі спакаваныя. Заставалася толькі пераадзецца і пакласці ў сумку халат і тапкі.

У яе яшчэ было трохі часу. Яна прысела на табурэце і падумала, што вельмі хутка надышла апошняя гадзіна іх сустрэчы з сынам. І калі зноў убачацца, ніхто не можа пакуль ведаць. Хоць і засталося ўжо нямнога яму... Мірык стаў нейкі злосны, калючы, як вожык, зусім сапсаваўся характар. Канечне, калонія — гэта не родны дом, нават не інтэрнат, але ж сам такую долю сабе зрабіў, сам, і ніхто іншы... Здавалася б, мог бы ўжо і зразумець гэта, хоць перажываў бы, а то ж па ім не відаць, каб надта пакутаваў. І куды падзеліся ягоныя ласкавасць, сціпласць, як і не было іх. Затое як прыклеіў да твару нахабную ўсмешку, у вачах — пустэча, і, адчуваецца, ніякага толку з таго, што ён чытае кнігі, часопісы, якія яна стараецца прысылаць, выпісвае яму.

А мо так здаецца, мо ўсё-ткі сын проста бравіруе сваёй упэўненасцю, спакоем. Маўляў, які ён смелы нават у калоніі і нічога-нічагусенькі не баіцца.

Ніла Восіпаўна паправіла парык, каб не вылазілі з-пад яго валасы, падфарбавала бровы, вейкі, губы, памазала крэмам шчокі, схаваўшы маршчыны, якія няўмольна секлі твар. Трэба ўжо рыхтавацца дадому, вярнуцца да мужа нястомленай, бадзёрай, каб не было відаць розніцы ў гадах паміж імі. Яна мужу патрэбна здаровая, вясёлая і сімпатычная. Нездарма ж заўважыла, што ён апошнім часам пачаў пазіраць на маладых жанчын. Заўважыла, і стала сумна, горка, хоць плач, але ж усё правільна, так яно і павінна было быць.

Здалося, у сенях вецер адчыніў дзверы і грукнуў імі спярша, нібыта забаўляючыся, слаба, а потым — не адчуваючы сваёй сілы, што ажно дзынкнулі адна аб адну шклянкі на стале. Аднак гэта быў не вецер, а нехта ішоў: цяжкі, марудлівы — падлога рыпела пад ім, адгукаючыся на кожны крок. Яна насцярожылася, схавала свае жаночыя прычындалы ў сумачку, яшчэ раз зірнула ў люстэрка, нібыта правяраючы сваю работу, і напружана сцялася ў чаканні. Але ж не здзівілася, калі ў пакой ступіў прапаршчык Перабурмыт. Яна чакала яго яшчэ два дні назад, адразу пасля прыезду, ён казаў, бо разумела, што ён проста не мог не прыйсці; ён прыходзіў усе разы, калі ў іх былі сустрэчы з сынам. Перабурмыт быў у шынялі, зімовай шапцы, шырокі, з цёмным, як з задымленым, тварам. Вачэй не відаць, голас ціхі, мяккі:

— Што, ужо ў дарогу? Мала пагулялі ў нас... Але ж тут нічога такога няма, каб і паглядзець...

— Мне нічога і не трэба,— сказала Ніла Восіпаўна і міжволі глянула на гадзіннік: пакуль у яе яшчэ час быў. Добра, што пераадзелася перад прыходам гэтага госця.— Сядайце, калі ласка. Прабачце, задумалася, сама сяджу, а вас не запрашаю.

— Нічога, нічога... Мы і пастаяць можам. Маслы здаровыя, сіла яшчэ трошкі ёсць. Але ж магу і сесці,— Перабурмыт зрабіў два крокі ад парога, падышоў да табурэткі, але не сеў на яе, адсунуў нагою ўбок і апусціўся на ложак, які жалобна застагнаў пад яго цяжарам, і на якім тры гадзіны назад адпачывала перад дарогай Ніла Восіпаўна.

— Я вас чакала раней,— сказала Ніла Восіпаўна. Яна ўжо спадзявалася, што Перабурмыт не прыйдзе, на гэты раз ёй мо не трэба будзе пакорліва згінаць голаў перад ім. Аднак ён усё-ткі з'явіўся, выбраў момант, калі яна нічога не можа змяніць. У яе цяпер было адно жаданне: як найхутчэй развітацца з Перабурмытам, выбегчы з гэтай хаты і сесці ў аўтобус, які давязе да аэрапорта, каб ёй не бачыць шырокі, распанелы твар, халодныя жорсткія вочы і не чуць голас, які яна, здаецца, чуе нават у сне.— Дзякую вам за дапамогу,— яна вымавіла гэта, заплюшчыўшы вочы, бо адчула, як гідлівы камяк папоўз да горла. Неяк усё ж авалодала сабой, нават, мусіць, усміхнулася прыветліва.—Мне хацелася б вам падарыць сувенір...

Ён маўчаў, толькі пагойдваў нагой, абутай у бліскучы хромавы бот, на Нілу Восіпаўну не глядзеў. Заставалася часу толькі апрануцца і выбегчы з хаты, праз дзесяць хвілін павінен быць на прыпынку аўтобус. Калі яна спозніцца, дык не паспее і на самалёт.

— Вазьміце, калі ласка,— яна таропка палажыла на ложак шатландскі махеравы світэр у цэлафанавым пакеце, бляшанку чорнай ікры, дзве бутэлькі каньяку, запакаваныя ў белую тоўстую паперу. Перабурмыт і пальцам не варухнуў, сядзеў нерухома, не пагойдваў і нагой.

Яна ў нерашучасці ўзялася за сумку, яшчэ не думаючы, ці правільна робіць і ці трэба гэта, але яе падганяў час і проста звар'яцець можна было ад выгляду панурай нерухомай постаці, якую пасля яна параўнала з Будай. Ніла Восіпаўна дастала з партманэ сто пяць-

дзесят рублёў і паклала на шатландскі світэр. І, больш не гледзячы на Перабурмыта, хай праваліцца скрозь зямлю, таропка надзела паліто, схапіла сумку і ўжо была ў дзвярах.

— Чакайце...

— Я спазняюся на самалёт,— Ніла Восіпаўна ледзь не крычала, у яе дрыжалі рукі. Яна не магла тут больш заставацца і хвіліны.

— Нічога... Яшчэ ёсць тры мінуты,— Перабурмыт пазасоўваў яе падарункі ў кішэні, пералічыў грошы.— Я выйду першы, а пасля — вы. Так будзе лепш. Да сустрэчы,— ён працягнуў ёй сваю руку, і Ніле Восіпаўне нічога не заставалася рабіць, як паціснуць яе.— Эх, жанчыны!..— іранічна сказаў Перабурмыт, усё яшчэ стоячы на парозе і засланяючы сваёй шырокай цёмнай постаццю дарогу.— Хоць бы парык добра надзела, а то сівыя валасы, як у лінялай сучкі, вылазяць на лоб. Я ўжо думаў цябе паласкаць, на шчасце, разгледзеў, што ты ўжо нікуды не вартая.

— Як вы!.. Хто вам даў права? — У Ніны Восіпаўны ў вачах загойдаліся сцены, і яна, мабыць, астатняй сваёй сілай, астатнім нервам утрымала сябе, не ўпала на падлогу. Толькі сумка, раптам страшэнна пацяжэлая, нібыта нагружаная цэглай, шмякнулася перад ёй з аслабелых рук.

— Будзь, мамачка,— рагатнуў ужо ў сенцах Перабурмыт, і нарэшце яго не стала, і нават крокі сціхлі, калі ён саскочыў з ганка.

Ёй бы легчы ці хоць сесці, каб пасвятлела ўваччу і перасталі калаціцца рукі і ногі, але ж там ля суседскага двара праз дзве-тры хвіліны спыніцца аўтобус, і калі яна вось зараз не дабяжыць да прыпынку — тады ўсё, не перажыве, проста памрэ ў гэтым ненавісным гарадку. Як падхапіла сумку, як выйшла з хаты, Ніла Восіпаўна амаль не адчувала, ёю кіравала адна думка, што трэба ляцець. Яна не помніла, як дабегла да прыпынку і села ў аўтобус, у вачах усё яшчэ хісталася, і нейкі цяжар ціснуў на плечы, на галаву, і выратаваннем ад яго было б упасці і ляжаць, нічога не адчуваючы і не бачачы. Аднак ці то халодны ветрык з расчыненага акна, ці то ўтульнае мяккае сядзенне паўплывалі, толькі перасталі дрыжаць рукі і ногі, як знялі цяжар з цела. Ніла Восіпаўна ўжо знайшла ў сабе сілу адчыніць сумачку і, узяўшы люстэрка, паглядзець на свой

твар. Здалося, мала памады было на губах, і яна падфарбавалася. Твар ад касметыкі быў ненатуральна маладым, гладкі, без маршчын. У сваіх вачах яна ўбачыла страх, які ўсё яшчэ жыў у кожным яе нерве. Яна паспрабавала ўсміхнуцца, але атрымалася панурая грымаса.

Калі ў акне нарэшце ўбачыла агні аэрапорта, Ніла Восіпаўна ажно ўздыхнула. І астатнія рэшткі трывогі, страху адышлі некуды назад, хацелася пакінуць іх у гэтым ненавісным ёй пасёлку.

Чаму так не пашанцавала з сынам, якога яна вельмі любіла? Магчыма, як кожная маці сваё дзіця. І што атрымалася з гэтай любові? Чаму менавіта яе сын у турме, а не чый іншы, хоць, канечне ж, ёй ад гэткай думкі і ад таго, што сядзеў бы за кратамі нейчы сын,— лягчэй бы не стала. У кожнага свой лёс, свая доля, свой крыж, які трэба несці ўсё жыццё. Што будзе з Мірыкам, калі ён усё-ткі выйдзе з турмы, як будзе жыць? Ніхто не скажа, ніхто не ведае і ён сам таксама. Хоць па-разумнаму, па-добраму — ніхто за яго гэта не вырашыць. Толькі б не з'явіліся былыя сябрукі, каб не спаткаліся ягоныя аднакамернікі. Колькі разоў за гэты час, як Мірык у турме, да яе заходзілі то Славікі, то Сані, то Вовікі з запіскай: «Аддай мой доўг...» Доўг мог быць сто, дзвесце, трыста альбо нават пяцьсот рублёў. Які доўг у турме, адкуль такія выдаткі за кратамі, дзе ні рэстаранаў, ні бараў, ні універмагаў. Аднойчы яна спасцігла гэты сакрэт. Ен быў надзвычай просты: банальны. Мірык у турме з вялікім азартам гуляў у карты. Яна ж за яго разлічылася, бо ён яе сын, яе кроў. Яе пакуты, слёзы. У яе валасы пасівелі, калі Мірыка пасадзілі ў турму. Была толькі пасмачка ў чорных валасах. Цяпер уся галава белая, а сын яшчэ ў турме. І ці будзе радасць калі ён урэшце выйдзе на волю. Вельмі шмат пагарды і нянавісці да людзей сабралася ў ягонай душы. Значыць, душа ў яго хворая. Ці здолее яна вылечыць свайго сына, ці зможа ўліць кропля за кропляй любові, спачування, літасці ў жорсткае, неміласэрнае сэрца?

Аўтобус пакінуў яе на бетонцы, і Ніла Восіпаўна стаяла адна ў цемры і не магла нават варухнуць нагой. Аднак трэба было ісці ў аэрапорт, самалёт адлятаў у восем гадзін. Недзе ўперадзе гаманілі людзі, весела

смяялася жанчына. Потым магутна, нібыта выпростваючы перад палётам крылы, зароў самалёт. «Калі ж паляціць адсюль Мірык, калі?..»

6

Усё-ткі ёй вельмі хацелася, каб Аўгуст пазваніў, запрасіў спаткацца. Гэты хлапчук, як у думках называла яго, спадабаўся Галіне. Яна чакала званка з самай раніцы, нервавалася, і толькі калі сабралася ў інстытут, успомніла, што ён недзе на сваёй будаўнічай пляцоўцы, а там, канечне ж, наўрад ці ёсць тэлефон. Хоць калі б захацеў пазваніць, знайшоў бы. «Аўгуст... Чаму такое дзіўнае імя ў яго».

Яна пагартала кніжкі, якія купіла ў кіёску, і спакваля ўспаміны пра Аўгуста неяк адсунуліся назад. Нямнога часу заставалася да канца года, і трэба было б нарэшце дамовіцца з Зушчыцам, каб абмеркаваць на кафедры яе дысертацыю. Дысертацыя амаль гатова, і было б добра як мага хутчэй наблізіць яе да абароны. Калі па чарзе, якая была на абарону дысертацыі ва універсітэце, дык Галіне яшчэ рана, але хто можа вызначыць, што такое рана, а што такое позна. Трохі няёмка перад астатнімі аспірантамі, але гэтая няёмкасць будзе да таго часу, пакуль яна не абароніцца. Пасля — кандыдацкая ступень, званне. Пагавораць, пагавораць і забудуць. Кожны дбае толькі пра сябе, і, улічваючы іх сяброўскія адносіны з Зушчыцам, ніхто нават не асмеліцца хоць што-небудзь сказаць ёй, абвінаваціць у несумленнасці.

Ёй можна было сёння і не ісці на кафедру, але зусім выпадкова ад лабаранткі даведалася, што Зушчыц збіраецца на месяц у камандзіроўку. Пакуль ён не з'ехаў, трэба з ім перагаварыць, мо трохі больш паўсміхацца, няхай прафесару здасца, што яна закахалася ў яго.

Яна яшчэ з тралейбуса ўбачыла яго прамую, абцягнутую чорным скураным паліто постаць. Ён якраз выйшаў з машыны і накіраваўся да галоўнага корпуса. Ішоў памалу, размахваючы жоўтым, старэнькім партфелем, які купіў, пэўна, у аспіранцкія гады. Хвіліна-другая, і Зушчыц будзе на прыступках доўгага, выцягнутага метраў на дваццаць пяць, ганка. Гэты ганак Галіна любіла крытыкаваць як архітэктурную без-

густоўшчыну, цяпер жа яна ў думках падзякавала таму архітэктару, што будаваў навучальны корпус. Выскачыўшы з тралейбуса, яна панеслася наўздагон Зушчыцу. Ён не спяшаўся, здавалася, нібыта лічыў прыступкі і даваў магчымасць дагнаць яго.

Яна бегла, як мо ніколі так не бегала, і толькі за метр-два ад Зушчыца прыпынілася. Відаць, цяжка дыхала, таму Зушчыц раптам азірнуўся і на той прыступцы, на якую ступіў. Нібыта сонныя вочы ажывіліся, і Галіна здзівілася, бо ўбачыла ў іх радасць. Ён усё роўна як чакаў яе, як думаў пра яе. Мо і так, таму што Зушчыц сказаў:

— Я думаў пра вас...— узяў яе за руку.

І зноў, як некалі, Галіна падумала, што прыемна і няблага было мець сябрам прафесара. Гэта ж не абыякая падтрымка. Ёй раптам стала горача, адчувала, калі б глянула на сябе ў люстэрка — убачыла б чырвоны твар. Яна нават не заўважала, што Зушчыц пажылы мужчына, здавалася, знікла між імі розніца гадоў. Пасміхаўся, жартаваў з Галінай не прафесар з сіваватымі валасамі і густымі стрэхамі калматых броваў, а яе равеснік, найбольш даўні сябра, які хоць трохі і старэйшы, але яны аднаго пакалення, недзе раслі разам, гулялі ў хованкі ці ў лапту.

Зушчыц гладзіў руку, пасміхаўся і, відаць, сапраўды быў вельмі рады, што сустрэў яе. Надвор'е было мяккае, самотна-панылае, і можна спакойна стаяць на дварэ, не баючыся дажджу, які цяпер непрыветлівы, халодны. Аднак дождж недзе яшчэ збіраўся толькі. На небе плылі рэдкія, разарваныя на латкі рудаватыя хмары.

Яны адышлі з ганка да драўлянай з высокай спінкай лавачкі, не селі на яе, стаялі, павярнуўшыся спінамі да ўвахода ў галоўны корпус. Зушчыц нейк нават згорбіўся, і Галіна зразумела, што ён, мусіць, не хацеў быць ва ўсіх навідавоку разам. Хоць нічога дзіўнага не магло быць у тым, што спаткаліся і размаўляюць прафесар са сваёй аспіранткай. Іншае, калі ён частачаста гэтак жа ажыўлена-зацікаўлена гутарыць з рознымі жанчынамі. Тады хутчэй у яго самога, чым у знаёмых, узнікае боязь, што пачнуць гаварыць, як пра чалавека занадта ахвочага да жанчын. Бывае, канечне, што той-сёй баіцца і свайго ценю і ў яго з'яўляецца назойлівы клопат аб адным: як адгарадзіць сябе ад якойнебудзь благой людской думкі, плёткі.

— Няёмка, што мы тут стаім,—сказала Галіна, адчуўшы ніякаватасць у паводзінах Зушчыца.

— Нічога, нічога,— азіраўся па баках, касіў вачыма Зушчыц і гаманіў, гаманіў: — Даражэнькая Галіна Іванаўна, ды я ж не супраць таго, каб абмеркаваць вашу дысертацыю. Калі ягадка паспела, дык можна і трэба яе з'есці... На кафедры ў адкрытую не пагаворыш, ва ўсіх вушы натапыраны, а тут таксама няўтульна. Дзе ж гэта нам пасядзець і пагаварыць, не азіраючыся і не баючыся, каб задужа маральна ўстойлівыя універсітэцкія прафесары і дацэнты не западозрылі ў парушэнні норм маралі. А потым і на кафедры абмяркуем вашу працу.

— Мне хацелася б, Вацлаў Казіміравіч, пра абмеркаванне,— слухала яго Галіна, але не забывала, дзеля чаго спяшалася ва універсітэт. На кафедры на дошцы загадаў, якія аддаваліся на факультэце альбо універсітэце і вешаліся сюды, быў шэранькі ад часу аркушык паперы, надрукаваны лабаранткай. Гэта спіс прэтэндэнтаў на званне кандыдата навук, якія збіраліся абараняцца. Галіна была ажно ў сярэдзіне спіса. У яе не было цёткі альбо дзядзькі, якія б займалі адказныя пасады і штурхалі наперад, забяспечвалі яе будучыню. Раз няма, дык, значыць, трэба думаць і думаць, варушыць мазгамі самой.

— Што абмеркаванне!.. Драбяза, зробім. І што ты, Галіна Іванаўна, усё аб рабоце ды аб рабоце. Я рады і вельмі нават рады бачыць цябе. Лічы, што закахаўся на старасці гадоў,— нечакана сказаў Зушчыц, і яна разгубілася ад гэтых слоў, але знайшлася ўсё-ткі.

— Ну, вы яшчэ не такі стары, не прыбядняйцеся,— сказала Галіна і здзівілася, як у Зушчыца ажно паружавеў твар, запытальна варухнуліся вочы, на нейкае імгненне хаваючыся ў гушчары доўгіх вылінялых веек.

— Не такі, а ўсё ж стары...

— Не, ну што вы,— засаромелася Галіна, бо надта пільна ўжо ўзіраўся ў яе Зушчыц. Не па ўзросце ярка блішчэлі яговыя вочы.

— Мо пойдзем на кафедру... Няёмка тут стаяць, дый нешта холадна ўжо...

— Ладна, Галіна Іванаўна, пойдзем...

Яна зайшла на кафедру трохі пазней за Зушчыца, так зрабіць прапанавала сама, бо ўжо ведала, якія

доўгія языкі ў некаторых выкладчыкаў, дый яе сяброўка — лабарантка Лена, пляткарка яшчэ тая, няхай толькі што даведаецца, адразу раззвоніць па ўсім універсітэце. І раней пра Зушчыца яна чула, што ён быццам любіць увіхацца за жанчынамі, асабліва за сваімі аспіранткамі. Яна неаднойчы чытала яшчэ студэнткай пра такога, як Зушчыц, прафесара ў кніжках, аднак пасля знаходзіла рэцэнзіі, артыкулы ў часопісах, газетах, у якіх крытыкаваліся аўтары за спробу вывесці амаральнага тыпа сярод вучоных. Дурні! Спыталі б яе...

Пра Зушчыца яна ўжо ведала амаль усё. Прынамсі, ёй гэтак здавалася. Зушчыц быў жанаты другі раз. З першай жонкай развёўся даўно, бо дачцэ ад новай жонкі недзе гадоў пятнаццаць. У яго быў сын, якога Галіна ведала. Ён часта заходзіў на кафедру да бацькі. Сын зайшоў і сёння. Ён голасна павітаўся і спытаўся, дзе Зушчыц. Лабарантка адказала, што хутка прыйдзе, адлучыўся на некалькі хвілін у партком. Малады Зушчыц збіраўся ехаць працаваць у Афганістан, выкладаць рускую мову і літаратуру ў Кабульскім політэхнічным інстытуце.

На кафедры акрамя лабаранткі і Зушчыца быў трохі старэйшы за Галіну выкладчык Рэм Ільіч Ярыга, лысаваты, з маленькім жыватом і худым выцягнутым тварам мужчына. Ён абараніў дысертацыю два гады назад і прэтэндаваў на пасаду дацэнта, якая павінна неўзабаве быць. Заставалася толькі, каб дацэнт Шрубовіч нарэшце пайшла на пенсію, якую яна надта доўга, недзе амаль два гады, афармляла. Цяпер Рэм Ільіч увесь час вёў нейкія перамовы з Зушчыцам, калі размаўляў з ім, дык, здавалася, ажно заглядваў яму ў рот, лавіў кожнае слова. На кафедры гэта нібыта не заўважалі, але, як толькі зачыняліся дзверы за Зушчыцам і Ярыгам, пачыналі іх абгаворваць. Той-сёй лічыў, што Рэм Ільіч прафесійна не дарос да дацэнта: і лекцыі яго нецікавыя, і ніякай навуковай работы не вядзе. Галіна гэтыя размовы слухала, але сваіх пяць капеек не ўстаўляла пакуль, ёй трэба было займацца сваёй дысертацыяй, сваім лёсам. Што ёй да таго, што Ярыга мае мала навуковых прац, гэта ягоны клопат. Урэшце, па тым, як актыўна завязвае ён сяброўства з Зушчыцам, невядома, ці ёсць у яго дасягненні ў навуцы альбо няма. Вельмі ўсё можа проста вырашыцца, таму што ўчора лабарантка, як заўсёды, нібыта толькі ёй,

употай паведаміла, што Рэм Ільіч памагае Зушчыцу рамантаваць дачу. Гэта не абы-што, калі ўлічыць дэфіцыт з цэглаю, лесам, дый трэба ўмець будаваць, а прафесар наўрад ці мае гэткую здольнасць. Неяк ён казаў, што, каб павесіць люстру ў гасцінай, выклікаў электрыкаў з домакіраўніцтва, маўляў, яго справа жыцця — навука, і няма часу займацца бытам.

— Цалую ручкі,— да Галіны падбег Ярыга, схіліўся перад ёй і сапраўды пацалаваў руку. Што ні кажы, але ёй гэта было прыемна, нават падумала: шчаслівы дзень — спярша цалаваў руку прафесар, а цяпер — Рэм Ільіч. Яна адчула сябе вельмі прыгожай, маладой, амаль дзяўчынкай, першакурсніцай, калі заўважаеш першыя знакі ўвагі ад хлопцаў. Усё было б добра, калі б не раўнівы і трохі зласнаваты позірк лабаранткі: зайздросна, яна ж таксама яшчэ не адцвіла, год толькі як замужам, дзяцей няма. Галіне не хацелася мець ворага. Яна сказала: — Сягоння наша Лена вельмі прыгожая...— і, не даючы лабарантцы ачомацца, зразумець яе тактычны ход, дадала: — Дзе ты шыла сабе такую сукенку, такое хараство.

Спярша ў вачах лабаранткі мільгнуў недавер, але ж кожнай жанчыне прыемна чуць кампліменты, хто б іх ні казаў, і ў яе ажно расцвіў твар. Яна жартаўліва крутнулася на адной назе, дэманструючы свой убор. Мужчыны, а з імі і Галіна запляскалі ў далоні.

У пакоі было светла ад сонца, якое сёння гаспадарыла, шчодра, зусім не па-асенняму, грэла зямлю. Можа, гэта надышло бабіна лета, але ж чамусьці не лётала ў паветры павуцінне.

— Думаю, што хутка можна абмеркаваць вашу дысертацыю, Галіна Іванаўна,— нечакана сказаў Зушчыц.— Як, вы гатовы, не супраць? — ён глядзеў на яе праз тры сталы, прыжмурыўшыся і падняўшы на лоб акуляры, якімі карыстаўся толькі чытаючы.

— Г-гатова, не с-супраць,— заікаючыся, ледзь вымавіла яна. Адкуль ён здагадаўся, што менавіта гэта яна хацела прасіць яго. Ад радасці, якая перапоўніла яе, Галіна, нават не заўважаючы сама, засмяялася. Усё-ткі ён зразумеў яе, зрушыў з месца гэтую надзвычай важную для яе справу. Гэта, канечне, яшчэ не абарона, але ж галоўнае пачаць работу...

— Ой, я на хвілінку, Вацлаў Казіміравіч,— лабарантка ўжо была ў дзвярах у плашчы, з сумачкай у

руках.— Мне пазванілі, каб зайшла, тут недалёка... Я мігам, раз-два,— не дачакаўшыся адказу ад Зушчыца, яна выскачыла з пакоя: было чуваць, як звонка зацокала абцасікамі па калідоры.

— Не ведаю, што і рабіць з гэтай Ленай,— сказаў Зушчыц,— толькі і бегае па магазінах. Усё нешта дастае, купляе. Мне гэта пачынае ўжо не падабацца. Думаю, ці не пашукаць якую-небудзь іншую лабарантку.

Ярыга маўчаў, толькі, нібыта згаджаючыся з шэфам, махаў галавой.

— Навошта, Вацлаў Казіміравіч,— Галіна вырашыла падтрымаць лабарантку, але каб пасля яна пра гэта ведала.— Лена неблагі работнік, добра друкуе на машынцы. Дый наогул паглядзіце, на кафедры парадак... І характар у яе не тое што ў некаторых... Рэм Ільіч, думаю, мяне падтрымае.

— Мо і так...— Зушчыц пагладжваў высокі з залысінамі лоб, паглядваў то на Галіну, то на Ярыгу. Нешта, відаць, меркаваў.

— Рэм Ільіч?

— Слухаю, Вацлаў Казіміравіч?

— Ты казаў, нібыта жонку адправіў у санаторый, а дзеці з ёй?

— Не, яны ў бабулі. Узяла да сябе на месяц, далі мне магчымасць творча папрацаваць, падумаць над артыкулам. Я вам гаварыў: аб павышэнні вытворчасці працы на аўтамабільным заводзе...

— Чаму ж, я помню. Але ж, мусіць, ты забыў, што хацеў запрасіць сёння нас з Галінай Іванаўнай на дзень нараджэння?

— На дзень нараджэння? — твар у Ярыгі ажно скрывіўся, не мог, відаць, зразумець, пра што гаворыць Зушчыц, але гэтае здзіўленне ў яго было долі хвіліны, бо ён амаль радасна аб'явіў: — Так, так... запрашаю вас, Галіна Іванаўна, і вас, Вацлаў Казіміравіч, да сябе на дзень нараджэння.

— Як, Галіна Іванаўна, прымаем прапанову? — Зушчыц не глядзеў на яе, нешта пісаў.

— Не ведаю, у мяне былі на сёння іншыя планы,— яна крыху разгубілася, таму што думала пайсці на балет «Стварэнне свету» ў тэатр оперы і балета, білет ёй дасталі па знаёмстве. Аднак было б вельмі несур'ёзна і няёмка адмовіць Зушчыцу. Да абароны дысерта-

цыі яшчэ шмат часу, і яшчэ невядома, як і што можа павярнуцца ў жыцці.

— Свае планы трэба ўзгадняць з планамі роднай кафедры,— сказаў Зушчыц.

Яна не паспела адказаць: зазваніў тэлефон. Трубку падняў Ярыга, паслухаў і заўсміхаўся:

— Галіна Іванаўна, мужчына! І, відаць, малады. Голас як раніцай у пеўніка.

— Дзякую.

Можна было сказаць, што ягоныя каментарыі ёй непатрэбныя, але змаўчала. Хуценька выхапіла трубку. Гэта быў Аўгуст. Ён запрашаў яе спаткацца, купіў білеты ў кіно і хоча пазнаёміць са сваім сябрам па арміі, які проста незвычайны хлопец. Яна азірнулася на Зушчыца, той з хмурна-зласнаватым выглядам гартаў кніжкі.

— Не магу сёння,— гучна прамовіла яна і дадала, што моцна занятая. Ёй лёс сёння дарыў такі шанц, аб якім нават не магла марыць. І гэты шанц яна выкарыстае. А Аўгуст?.. «Нічога, пачакае»,— упэўнена вырашыла Галіна.

## 7

А восьмай гадзіне яны селі за стол вячэраць. Меню было ў іх аднастайнае ўжо некалькі гадоў: шклянка кефіру, чай без цукру са скібкай чорнага хлеба. Ніла Восіпаўна толькі што скончыла расказваць пра сваю паездку, і за сталом была нейкая напружаная паўза: кожны думаў пра Мірыка.

«Мо не варта было ўсё гэта пры Анжэле...» — Ніла Восіпаўна скоса пазірала на мужа, які дапіў чай, і, узяўшы газету, усё то разгладжваў яе, то складваў у столкі.

— Нехта стукае,— сказала Анжэла.

— Табе здаецца. Гэта сусед наверсе нешта робіць,— адазвалася Ніла Восіпаўна.

— Не, стукаюць у дзверы...

— Навошта стукаць, калі ёсць званок,— сказаў Ісідар Карпавіч.

— Пайду пагляджу. Усё-ткі стукаюць,— упарта заявіла Анжэла. Яна, падзякаваўшы за вячэру, павольна шоргаючы тапкамі, якія абувала не на ўсю нагу і за што сварылася на яе маці, але гэта не дапамагала,—

пайшла да дзвярэй. Нават ззаду было прыемна глянуць на дачку: стройная постаць, праўда, трохі паўнаватая ў сцёгнах, ладныя ногі з белай скурай, на якой зрэдку маленькімі кропелькамі чарнелі радзімкі. У яе валасы былі доўгія, вельмі густыя, з-за чаго штодзень даводзілася па гадзіне сядзець перад люстэркам. Можна было, канечне, падрэзаць валасы, але ж шкада такога багацця. У Нілы Восіпаўны ў маладосці таксама былі багатыя валасы. Твар дачкі, відаць, нельга назваць прыгожым: таўставатыя губы, кірпаты нос.

Ні бацька, ні маці не ведалі, што ў яе быў сябар Раман. Анжэла ўявіла, што рабілі б яны, калі б даведаліся пра гэта.

І ёй чамусьці стала смешна.

— Праходзьце, калі ласка... Распранайцеся...— пачула Ніла Восіпаўна, як дачка запрашае некага ў кватэру. Ёй, канечне, цяпер нікога не хацелася бачыць, залезці б у цёплую пасцель, уключыць таршэр і пачытаць кніжку. Яна нават з нецярпеннем чакала, як нарэшце возьме ў рукі раман «Унесенные ветром», які далі ёй на тыдзень. Але нехта прыйшоў у кватэру, скасаваў яе планы. Яна не зазлавала, проста падумала, што зноў давядзецца чытаць толькі ноччу, калі ўсе ў хаце паснуць.

З калідора гудзеў незнаёмы мужчынскі голас. Як добрай гаспадыні трэба было б выйсці насустрач і прывітаць госця. Але ж яна сёння нават з кухні не выйдзе, не падымецца з гэтай табурэткі. І хто б ні быў, няхай хоць сам, як кажуць, Езус Хрыстус, але яна будзе займацца толькі сабой. Пазаймаешся, калі ўжо Ісідар глядзіць недаўменна, маўляў, чаму не варушышся, не бегаеш, як прывык бачыць, калі да іх прыходзілі госці. Дарэмна яна спадзявалася, што адпачне. «На тым свеце ўжо адпачну...»

Пакуль яна ўсё-ткі вырашала, ці выходзіць з кухні, вярнулася, пакінуўшы госця ў гасцёўні,з узбуджанымі, няйнакш ад здзіўлення альбо ад моцнага ўражання, і трохі разгубленымі вачыма Анжэла.

— Бартуш...— прашаптала яна.

— Які Бартуш? — адразу не даўмелася Ніла Восіпаўна, і нават Ісідар Карпавіч палажыў газету на стол.

— Які, які! Той самы, якога вы запрашалі ў госці.

— Радзімір Бартуш?... Госпадзі,— Ніла Восіпаўна

адразу забыла пра стому, наогул пра сваю паездку.

— Ідзі, а я зараз выйду. Адзену хоць кашулю,— сказаў Ісідар Карпавіч.

— Іду, іду, як жа ж,— заспяшалася Ніла Восіпаўна.— Чаму ж ён тэлеграму не даў, не папярэдзіў? Пайшлі, Анжэла, да чалавека...

Як яны ўвайшлі ў гасцёўню, Бартуш падняўся з канапы. Яны ні разу ў жыцці яшчэ не бачыліся, былі знаёмыя толькі па перапісцы. Праўда, Ніла Восіпаўна даўно запрашала Бартуша прыехаць у Мінск, пагасціць у іх.

Яна працягнула яму сваю невялікую, ужо сухаватую ад узросту руку, і ён узяў яе ў далоні, мякка пацісНуў. У яго рукі былі шырокія, з цвёрдай шурпатай скурай, нават мазолістыя. І гэта было трохі дзіўна для інтэлігента. Аднак рукі былі нейкія ласкавыя, добрыя, такія рукі, здаецца, Ніла Восіпаўна запомніла ў бацькі.

Яны сказалі пакуль толькі па два-тры словы, далікатна прыглядаліся адно да аднаго. Ніла Восіпаўна даўно чакала гэтага чалавека і ў думках чаплялася за яго, як за сваю апошнюю надзею.

У Бартуша была буйная шыракалобая галава, з цёмнымі, спераду радкаватымі валасамі, праз якія ўжо добра ружавела скура. Ен пазіраў на гаспадароў скрозь павіслыя, густыя, як мяцёлкі, бровы, таксама чорныя. Шчокі хоць былі і паголены, але проста нібы выпацканы сажай. На правай руцэ, у якой ён трымаў часопіс «Огонек», вытатуіраваны фіялетавы крыж з драконам.

Бартуш быў адзеты ў светла-шэрыя штаны і ў тоўсты пуховы світэр, амаль такі, што Ніла Восіпаўна аддала Перабурмыту. Туфлі ён зняў у калідоры і абуў тапкі Ісідара Карпавіча, якія былі, пэўна, вялікаватыя яму, і адчуваў сябе не надта ўтульна, але маўчаў, а можа, проста не звяртаў на гэтую драбязу ўвагі.

— Як заходжу ў кватэру, перш-наперш гляджу кнігі. Па тым, якія кнігі ў шафе, я вызначаю характар гаспадароў,— ціха сказаў Бартуш, але голас у яго быў валявы, нават безапеляцыйны. Такі голас бывае ў людзей, якія раптам упэўніліся, што ім ніякіх перашкод не можа быць, што ўсе жыццёвыя праблемы — гэта драбяза, усё асноўнае — у іх саміх, яны — цэнтр, пуп свайго існавання.

— Ну і які характар у нас вызначылі вы, Радзімір Севасцьянавіч? — паспрабавала трымацца незалежна,

упэўнена Ніла Восіпаўна, бо ёй ніякавата рабілася ад позірку цёмных халодных вачэй і гэтага голасу, які, адчувалася, не прызнаваў ніякіх пярэчанняў.

— У вас... Упарты і настойлівы... Толькі гэта пакуль магу сказаць. Завіце мяне проста Радзімір. Хачу яшчэ адчуваць сябе маладым.

— Неблагое жаданне, Радзімір. Мы з вамі саюзнікі. Прабачце, я вас на хвілінку пакіну з Анжэлай... А вось і Ісідар Карпавіч,— яна пазнаёміла госця з мужам, які пераадзеўся ў новы спартыўны касцюм, у ім амаль быў непрыкметны жывоцік, што няўмольна рос, нягледзячы на ўсе спробы Ісідара Карпавіча есці мала. У яго была ад бацькоў схільнасць да паўнаты і перадалася Анжэле.

Ніле Восіпаўне было неяк страшнавата, хоць сама ж хацела, каб Бартуш прыехаў. Размаўляючы з ім, яна непрыкметна, але прагна шукала ў яго абліччы, на твары, у паводзінах адмеціны, якія магла пакінуць на ім турма, жыццё, звязанае з людзьмі жорсткімі, бязлітаснымі і варожымі грамадству. Здавалася, такі ж чалавек, як усе, што яна бачыць на вуліцы, у школе, у тэатры. Нібыта ўсё ведала пра Бартуша, канечне, не ўсё, якраз тое, што і змусіла яе звярнуцца да яго з лістом, з мальбой, каб падказаў, навучыў, як памагчы Мірыку.

Нілу Восіпаўну крыху ўразіла, што злодзей з пятнаццаццю гадамі зняволення напісаў дзве кнігі і стаў пісьменнікам. Яна прачытала гэтыя кнігі, і не адзін раз, і чамусьці паверыла, што Бартуш дапаможа Мірыку і Мірык вернецца дамоў такім, якім хацелася бачыць яго: якая маці пажадае благога свайму сыну.

Занятак на кухні паспрыяў ёй, яна змагла памалу пераадолець разгубленасць і няўпэўненасць перад Бартушам і зноў адчуць сябе спакойнай, здольнай разважаць. Яна сабрала на стол усё лепшае, што было ў хаце. Праз два дні ў Ісідара Карпавіча дзень нараджэння, і яны назапасілі прадуктаў поўны халадзільнік і маразільнік, у які можна было пакласці цалюткага парсючка-гадаванца. Тонкімі скрылікамі Ніла Восіпаўна нарэзала вяндліны, сыравэнджанай кілбасы, вясковага сала з тонкімі праслойкамі мяса, смачнейшага за крамны бекон. Салёныя агуркі, зялёны гарошак, вараная кілбаса, цыбуля, бульба і морква былі пад рукой, і яна хутка згатавала мясную салату, лю-

біму́ю сямейную страву. Такой салаты немагчыма было паесці нават у лепшым рэстаране «Планета», таму што кухары, вядома ж, тое-сёе з прадуктаў забіралі ў сумках дамоў. Дый наогул Ніла Восіпаўна пераканалася, пабыўшы на некалькіх днях нараджэнняў сваіх калег у розных рэстаранах і кафэ, што смачныя стравы зніклі. Некалі ў любой сталоўцы можна было ўзяць нават мачанку. Са сваіх запасаў, якія зберагала для паездак у калонію, Ніла Восіпаўна дастала стограмовую бляшаначку чорнай ікры, зберагала яе да вяртання Мірыка з турмы. Аднак калі тое будзе, дый ці патрэбна яна тады. Трохі павагаўшыся, бо ўсё-ткі было шкада, дзе возьме яшчэ, Ніла Восіпаўна адкрыла бляшанку і зрабіла бутэрброды з ікрой, ашчадна палажыўшы яе на скібкі батона, намазаныя маслам. Кожную страву ўпрыгожыла зялёнымі гарошынамі, кавалачкамі морквы і лімонам. Лімон таксама нарэзала асобна на сподачак, пасыпала цукрам. Заставалася паставіць стол, дый самой не пашкодзіць змяніць вопратку. Яна вельмі хацела спадабацца Бартушу і, перабраўшы ў думках свой гардэроб, выбрала ярка-жоўтую сукенку з аксаміту, аблямаваную на рукавах і каўняры паскамі шырынёй з далонь цёмна-карычневай норкі. Ісідар Карпавіч любіў, калі яна надзявала гэтую сукенку, а забываць пра яго Ніла Восіпаўна не магла.

Яна ўжо думала паклікаць дачку на дапамогу, як Анжэла, нібы адчуўшы, прыйшла сама. Ёй пераадзявацца не трэба было: амерыканскія джынсы і блакітная кофтачка на ёй зранку, збіралася да сяброўкі.

— Мамуля, з цябе можна пісаць карціну! А твар які, твар! На ім натхненне і агонь. Ну, мамачка, ну, мамулечка, Нілачка! Ну, Нілка,— дачка тады-сяды, калі між імі ўзнікала пачуццё поўнага даверу і таварыскасці, называла Нілу Восіпаўну па імені. І гэта ўжо была іхняя невялікая сямейная традыцыя, якую падтрымліваў і бацька. Ніле Восіпаўне здавалася, што яна шчаслівая...

— Стол паставілі. Бяры талеркі і нясі.

— А напіткі якія ставіць?

— Спытай у мужчын. Ты ж ведаеш, бацька не п'е, а як Бартуш...— Ніла Восіпаўна развяла рукамі.— Трэба што-небудзь паставіць. Мы нікога не прымушаем. Нясі...

Яна яшчэ хвілінку патаўклася на кухні, усё ж нейкі

неспакой быў на душы. У залу ўвайшла з хлебам, якраз купілі свежага перад прыходам Бартуша, і яго пах адразу, здалося, густой хваляй паплыў па пакоі. І Бартуш спачатку сказаў:

— Які пахуткі, мусіць, смачны хлеб,— узяў скібку, пакаштаваў.— Смачны, вельмі нават,— і толькі тады дадаў, неяк бесцырымонна агледзеўшы Нілу Восіпаўну з ног да галавы.— А вы прыгожая жанчына, Ніла Восіпаўна. Ісідару Карпавічу няйнакш даводзіцца часта раўнаваць.

Яна засаромелася, але ж какетліва (вось дык жаночая прырода) павяла плечукамі і прайшлася, паводзячы бёдрамі, па зале, хоць патрэбы такой не было, быццам дэманструючы Бартушу, што яна сапраўды прыгожая. Забыла пра свае сівыя валасы пад парыкам, пра хваробы — адчула сябе маладой і ад гэтага камплімента гатовая весяліцца і танцаваць хоць усю ноч, абы знайшоўся кавалер...

— Вы не бачылі мяне, Радзімір, дваццаць гадоў назад,— перавёўшы дух, уздыхнула яна.— Тады Ісідар, канечне, мяне раўнаваў. Праўда, Ісідар?..

— Праўда, праўда,— трохі, здалося, абыякава адказаў муж, які быў заняты сервіроўкай стала і не надта прыслухоўваўся пакуль да размовы.

— Наша мамулька і цяпер у форме,— сказала Анжэла.

— Ты мяне, дачушка, не перахвальвай...

— Нічога, нічога, добрае слова нікому не шкодзіла,— Бартуш сеў на канапу, паклаўшы нагу на нагу.— Я ў сваім жыцці больш чуў благога, накшталт: паразіт, зладзюга, зэк, свалата. Спіс гэтых слоў вельмі доўгі, і, мабыць, не варта яго працягваць. Злосць і нянавісць параджаюць злосць і нянавісць, а дабро параджае дабро. Канечне, гэта можна ўбачыць і адчуць не адразу, але ўрэшце так яно і будзе.

— У Мінску вы, Радзімір, па службовых справах ці проста так? — асцярожна, баючыся здацца недалікатным, спытаў Ісідар Карпавіч.

— Гледзячы як лічыць. Мне хацелася проста так, спакойна і незалежна паехаць у родны горад, я ж тут нарадзіўся, пахадзіць па ім, падумаць. Але міністэрства ўнутраных спраў зафрахтавала мяне, каб навучыў зэкаў розуму, і выпісала камандзіровачнае пасведчанне. На, Анжэла, пачытай сваімі несапсаванымі вачыма, што там напісана.

— Пасведчанне дадзена літаратару Бартушу Радзіміру ў тым, што ён накіроўваецца для правядзення агітацыйна-выхаваўчай работы. Тэрмін камандзіроўкі пятнаццаць дзён,— звонка прачытала Анжэла і сказала: — Дык вы цяпер палітрук...

— Правільна, палітрук для зэкаў,— Бартуш забраў ад яе паперку, схаваў у партманэ.— Мне гэта самому ўсё смешна, але ж, але ж... Чалавек народжаны для дабра, для любові. Бачыце, якім маралістам я стаў, а кім быў. Раскажаш якому, цяпер асабліва нікому і не расказваю, каб не палохаць,— дык адразу ўцякае ад мяне. І сам здзіўляюся: шаснаццаць гадоў турмы, калоніі і раптам — пісьменнік. У нейкім сэнсе я сябе лічу унікальным чалавекам. Што, Ніла Восіпаўна, маўчыце, не запрашаеце за стол. Люблю пасядзець за добрым сталом, ніяк не наталю свой голад з тых цёмных сваіх часін...

— Калі ласка, Радзімір, прашу,— замітусілася Ніла Восіпаўна.— Я вельмі рада, што вы прыехалі, адгукнуліся на мае лісты. І чамусьці я веру, што з вашай дапамогай і наш Мірык...— Яна не вытрымала, усхліпнула, але без слёз, каб не сапсаваць свой знешні выгляд: фарба магла пацячы з веек дый пудра, а хацелася быць маладой і прыгожай. Такой, як Бартуш убачыў яе.

— Безумоўна, памагчы чалавеку — ніколі не адмаўляюся,— Бартуш расчырванеўся, знікла з яго вачэй насцярожанасць, якая адчувалася ў паводзінах, размове. Ён зразумеў, што трапіў у сям'ю, якая сапраўды вельмі рада яму. Ён ужо неяк іранічна агледзеў пакой, паравёў позірк на гаспадароў. Раптам сказаў: — Што людзі, а што мураўі — адзін чорт.

— Чаму так? — Ніла Восіпаўна, баючыся запэцкаць сваю суkенку, накрыла калені доўгім палатняным ручніком з пеўнямі. Села так, каб было зручна падняцца, калі спатрэбіцца што-кольвек узяць з кухні. Проста гэта быў падарунак лёсу: яна — з самалёта, а тут — Бартуш, пра якога яна думала ўсю дарогу, і чамусьці верылася, што нешта падкажа, параіць такое, што верне ёй Мірыка. Яна слухала Бартуша, ловячы кожны яго рух, позірк, успрымаючы ягоныя словы як мудрыя, найважнейшыя.— Чаму так? — паўтарыла яна.

— Бо людзі, як мураўі, усё цягнуць у свой дом: і добрае, і благое. Знаеце, пазаўчора я выгнаў са сваёй кватэры карэспандэнта газеты і даў яму яшчэ

выспятка. Навошта займаецца падтасоўкай і выдае свае думкі за мае? Я ж, здаецца, у сілах і пры розуме, каб напісаць тры-чатыры старонкі. Ух, не люблю паганцаў, спекулянтаў на маёй крыві,— Бартуш сапраўдыззлаваў, і яго вочы ярка заблішчэлі, шырокі рот скрывіўся, і на твары ўзнікла здзеклівая, нахабная ўсмешка. Ніла Восіпаўна ад гэтай усмешкі ажно ўздрыгнула. Гэтак жа ўсміхаўся Мірык. І яна падумала, што надта шмат гадоў прабыў у турме Бартуш і наўрад ці пазбавіўся ён ужо таго выхавання.

— А што здарылася ў вас, Радзімір? — спыталася Анжэла, гледзячы на яго наіўнымі, круглымі вачыма, у якіх былі і захапленне, і страх, і здзіўленне. Няйнакш, ёй падабаўся гэты не падобны на іншых яе знаёмых чалавек, у паводзінах якога межавалі, здавалася, абсалютная нявыхаванасць і інтэлігентнасць, пачцівасць і нахабства. Відаць, ён пастаянна трымаў сябе ў руках, сілай волі прымушаў гаварыць і рабіць так, каб не выклікаць абурэння. Ён адчуваў сябе ўжо як дома. І яны ўспрынялі яго такім, якім ён быў.

— Што здарылася? — здалося, Бартуш абурыўся, бас яго гучаў на ўсю кватэру.— Зэк прыслаў у рэдакцыю ліст, у якім прасіў дапамагчы вызваліцца з калоніі. Калі гэтак зробяць, дык ён, маўляў, стане сапраўдным савецкім чалавекам. Гэты ліст прынеслі мне і папрасілі даць адказ, а рэдакцыя надрукуе яго ў газеце. Я падумаў і вырашыў, чаму б не напісаць тры-чатыры старонкі гэтаму чмуру, які лічыць усіх астатніх дурнямі, а сябе вельмі разумным. Я напісаў, што кожны павінен несці свой крыж да канца. Адседзіш тэрмін, які прызначыў суд, выйдзеш на волю і, калі ласка, будзь нармальным чалавекам, не крадзі, не рабуй. Ніхто табе не перашкодзіць, калі ты хочаш стаць чалавекам. Хочаш раней вызваліцца, працуй дзень і ноч, можа, суд улічыць гэта і перагледзіць прыгавор. Знаю я гэтую пароду пісараў. Піша, просіць, абяцае, хоць і не збіраецца нічога ў сваім жыцці мяняць. Хлусня і ашуканства...

— Аднак, мусіць, ёсць і такія, што хочуць стаць нармальнымі людзьмі, мець сям'ю, працаваць?..— спытала Ніла Восіпаўна. У яе задрыжаў голас, і яна хуценька глынула вады.

— Ёсць, чаму ж не. Усялякія ёсць. Там, дарагая Ніла Восіпаўна, поўны спектр сучаснага грамадства. Хоць трапляе і эліта, якой вельмі і вельмі складана

існаваць за турэмнымі сценамі. Анікому не раіў бы туды трапляць. Гэта тое ж самае, калі ў зграю ваўкоў кінуць авечку. У звяроў вырашаецца ўсё проста: яны абедаюць авечкай, знішчаюць яе. У зэка горш, яны знішчаюць у сваёй авечцы душу. І трэба быць ваўком, каб выжыць у гэтай зграі.

— І вы былі ваўком? — ціхенька спытала Анжэла, у якой ужо страх быў на бледным твары. Яна пасунулася з крэслам бліжэй да маці і ўзяла рукамі за яе левую руку.

— Быў,— вельмі сур'ёзна сказаў Бартуш, памаўчаў і паўтарыў, на імгненне прыкрыўшы пушыстымі вейкамі вочы: — Быў. Інакш наўрад ці я сядзеў бы тут з вамі за гэтым шыкоўным сталом. Аднак на сёння хопіць, мабыць, успамінаў з майго турэмнага жыцця. Гэта ўсё мінулае, хоць, канечне, і не так далёкае. Мне ўсё здаецца, што я малады... А вунь ужо колькі ззаду... Амаль зусім не помню вайны, быў яшчэ зусім малы: толькі пажар... Гэта калі гарэла наша вёска... Вось і ўвесь успамін пра маленства, а потым — турма, турма... Але ж усё-ткі хопіць пра тое. Мне, канечне, пашанцавала. Таму я стаў нармальным чалавекам і нават літаратарам. На маім шляху тады сустрэўся вельмі цікавы чалавек. Зусім выпадкова мае дзённікі трапілі яму, ён прачытаў і дапамог мне надрукаваць іх, выдаць кніжку. Ён змог убачыць ува мне пісьменніка і, пэўна, цікавага. Так я думаю, Ніла Восіпаўна?

— Канечне, канечне, Радзімір...— ледзь вымавіла яна і выйшла на кухню нібыта паглядзець, ці закіпеў чайнік. На кухні паплакала, пастаяла трохі ля акна, слухаючы, як гудзе ў гасцінай Бартушаў голас, і зноў з прыветнай усмешкай вярнулася за стол. Бартуш вельмі ўважліва паглядзеў на яе і раптам заспяваў, нават замармытаў нейкую песню пра цыгана і маладую прыгажуню, што чакае і ніяк не дачакаецца свайго хлопца. Цыган вельмі кахае дзяўчыну і вагаецца, што рабіць: ехаць з табарам у свет ці застацца ў вёсцы з прыгажуняй і заваяваць яе сэрца.

Ніла Восіпаўна слухала Бартуша, і душа яе поўнілася трывогай. Сэрца стукала часта-часта, нібы спяшалася, даганяла час. Хоць бы дачакацца, калі вернецца Мірык, пачне працаваць, мо ажэніцца. Калі гэта будзе, калі?..

Прыціснуўшыся лбом да халоднага шкла, Аўгуст стаяў ля акна і глядзеў на вуліцу, па якой, спяшаючыся і нетаропка, ішлі пажылыя і маладыя людзі, хлопцы з дзяўчатамі. І яму было крыху зайздросна, бо чаму не мог ён гэтак жа ісці з дзяўчынай. Канечне, мог бы, але чаму Галіна ніяк не можа знайсці часу, каб сустрэцца з ім? Ну чаму, няўжо такая занятая, столькі ў яе работы? Усе ж працуюць, аднак ходзяць і на спатканні. Ці ж можна адмовіцца ад радасці бачыць адно аднаго, чуць голас, які здаецца любімай песняй? Мо ён штось не разумее са сваімі дзесяццю класамі? Яна ж без пяці хвілін вучоная, кандыдат навук. Ні ў кога з яго знаёмых няма такой адукаванай дзяўчыны, і ён нікому пакуль не будзе пра Галіну гаварыць. Навошта, гэта яго асабістае, яно існуе толькі для яго, яно ў ягонай душы. Толькі чаму Галіна ўсё — звані пазней, звані пазней... І ў яе голасе з'явілася нейкая занадта строгая нота, быццам хоча паставіць між сабой і ім сценку. Во, во і халадок адчуваецца ў размове, надта ж афіцыйна яна гаворыць. Ясна, што на рабоце слухаюць тыя, хто сядзіць з ёй у кабінеце, і гэта, мусіць, непрыемна, але калі табе пазваніў блізкі, нават родны чалавек, дык ці будзеш звяртаць увагу на некага, хто занадта цікаўны да чужога жыцця. Пра гэта нават не падумаеш. Яна ж, відаць, думае і саромеецца яго.

Аўгуст паспрабаваў уявіць Галіну, але не змог: твар чамусьці яму ўспомніўся зусім нейкі невыразны, бы на кепскай фотакартцы. «Гэта ўсё ад таго, што даўно не бачыліся»,— сумна падумаў ён. Пры сустрэчы ён абавязкова папросіць у яе здымак. У арміі ў многіх хлопцаў былі фоткі дзяўчат, толькі ў яго не было. І цяпер яму таксама захацелася мець у левай кішэні пінжака партрэт дзяўчыны і цішком пазіраць на яе. Тады яна будзе ўвесь час разам з ім, і ён зможа ўявіць кожную рыску яе твару, прыпомніць, як яна размаўляе...

Чаму Галіна так марудзіць са спатканнем, няўжо ёй не хочацца пабачыць яго? Ці ён ужо зусім нікуды не варты? Здаецца, і не малы ростам, і дужы. Мог бы падняць яе на руках і панесці далёка-далёка, ажно за небасхіл. Ён здолеў бы, і сіла ў ім была б... Мо ён непрыгожы, і Галіне сорамна ісці з ім па вуліцы? Аўгуст ужо хацеў выйсці ў калідор і зірнуць на сябе ў вялізнае,

на паўсцяны, люстэрка, але пачуў, як ляпнулі дзверы: няйнакш, вярнулася з магазіна сястра. Яна, чуваць было, прайшла на кухню і там будзе займацца сваімі рознымі хатнімі справамі доўга. Абы толькі ні пра што не дапытвалася ў яго, не лезла ў душу з пытаннямі накшталт: чаму сядзіш у хаце, нейкі сумны ў цябе твар, мо што баліць? Потым пачне спачуваць і вохкаць, што яму не хапае самастойнасці, хоць нібыта і ў арміі адслужыў, і нават медаль «За адвагу» мае. Які гэта дурань даваў. Маладая яшчэ жанчына, а будзе бурчаць, як старая цётка, некім і нечым пакрыўджаная.

Яму прапаноўваў Віталь Абламей пайсці хоць бы ў клуб імя Дзяржынскага альбо ў «карчы» на трактарны завод, маўляў, там танцы да ўпаду. Навошта гэтыя танцы, як будзеш танцаваць з нейкімі дзяўчатамі, чужымі і мо нават непрыемнымі, калі ў галаве стаіць Галіна, яна ўся, толькі прыплюшчыць вочы... А што, калі сабрацца і паехаць да яе на кватэру, не будзе дома, пачакаць ля пад'езда. Канечне, варта было б зайсці, і прыдумаў бы, што сказаць, як растлумачыць сваё нечаканае з'яўленне... Але ж там шмат дамоў, падобных адзін на аднаго, ці зможа ён знайсці яе дом, і яе пад'езд, і яе кватэру?.. А чаму не знойдзе, успомніць...

«Мо яна цяпер на рабоце?» — раптам падумаў ён і рашуча пайшоў да тэлефона і пазваніў па нумары, які Галіна яму дала яшчэ пры знаёмстве, дакладней, пры першай сустрэчы.

Мужчына, на тым далёкім канцы провада, адказаў, што Галіна Іванаўна толькі што пайшла з інстытута і ці вернецца — невядома. Не, больш званіць не варта, таму што праз гадзіну кабінет замыкаюць.

Пануры і чамусьці вельмі стомлены Аўгуст зноў абыякава, бессэнсоўна глядзеў уніз на двор з вышыні сёмага паверха. Ніколі дагэтуль нават не мог уявіць, што яму сёння так захочацца пабачыць дзяўчыну. Ён успамінае той салодкі і, здавалася, бясконцы пацалунак, які пазбавіў яго на нейкі момант сілы, розуму і волі. Нібыта зноў яна прыхілілася да яго, прыціснулася сваім гнуткім целам...

Адчуваючы, што душа проста як бы перапоўнена Галінай, Аўгусту і хацелася з кім-небудзь хоць трошкі падзяліцца сваёй радасцю, расказаць і адначасова нешта яго стрымлівала, змушала маўчаць; пэўна, яшчэ нават не разумеючы гэтага, ён саромеўся свайго пачуц-

ця, яно было вельмі далікатным і нечаканым, і баяўся, каб не страціць яго. Усё неяк пакуль было незразумелым, складаным, ці мо гэта яму так здавалася.

«Ну і што стаіш каля акна, як дурань...— папракнуў сябе Аўгуст.— Вырашай што-небудзь. Не стаяць жа panyла ўвесь дзень, нешта трэба зрабіць...» Аднак ён не сышоў з месца. Шкло ўжо страціла свой холад і пацяплела ад ілба. Думкі ў галаве не варушыліся, здалося, ён наогул перастаў думаць ад сумоты, якая апанавала яго. «Як добра жылося, пакуль не спаткаў Галіну, а цяпер... Цяпер горш?» — не змог ён адказаць сабе на гэтае пытанне. Нецікавыя сталі раптам усе клопаты Аляксеевіча, які думаў знайсці недзе праўду і справядлівасць і змагацца з ашуканствам. Успомніў, як пра нешта недарэчнае: Аляксеевіч прасіў пад'ехаць да яго, маўляў, штосьці ён зразумеў. Ну і што з гэтага? Нібыта нешта зменіцца... Як жа ж знайсці цяпер Галіну?

Аўгуст яшчэ вагаўся трохі, апошнімі намаганнямі волі стрымліваў сябе і ўсё-ткі паддаўся таму жаданню, якое, здавалася, проста знясіліла яго, згвалціла ўсю душу. Ён ледзь не стрымгалоў выскачыў у калідор, схапіў куртку і шапку і, ужо не чуючы, што пытаецца сястра, вылецеў з кватэры. Адчуваў, што, калі запыніцца хоць на хвіліну, пачне зноў узважваць, тады ўжо не зрушыць з месца. Калі вырашыў ехаць, дык трэба спяшацца, ісці да канца: што ўжо будзе.

Ён аўтобусам даехаў да вуліцы Горкага, бо помніў, што яны з Галінай першы раз ехалі гэтым маршрутам. На плошчы Горкага перасеў на тралейбус, хоць быў прамы аўтобус, які давёз бы яго амаль што ад дома да дома. Але Аўгуст не паехаў гэтым маршрутам, бо нібыта знарок хацеў адцягнуць сустрэчу з Галінай, ці то з боязі, ці то з сарамлівасці, ад якой яму здавалася, што ў аўтобусе ўсе людзі глядзяць толькі на яго і ведаюць, аб чым ён думае, марыць цяпер.

Прыпынак быў той самы, на якім яны выходзілі з Галінай, тыя ж дамы, шырокае поле, што засталося ад былой вёскі. Ён пашыбаваў па сцежцы, часам азіраючыся на прыпынак, каб не страціць арыенціры, як дакладней выйсці да таго дома, дзе жыла Галіна. На полі вецер шапацеў сухой сурэпкай, што расла абапал сцежкі. Там-сям жаўцелі грыўкі паўзасохлай травы. Аўгуст мінуў адзін дом, другі і, здалося, урэшце апынуўся там, дзе яму трэба было быць. Ля першага пад'езда ён

спыніўся, агледзеўся і вырашыў, што кватэра Галіны тут — насупраць дзіцячая пляцоўка з паламанымі арэлямі: стромкім замкам з тонкага сасновага бярвення, пафарбаванага ў чырвонае. Наверсе замка круціўся ад ветру чырвоны з чорным жыватом бляшаны певень. Ён нечым дробна званіў, як сыпаў проса, і Аўгуст якую хвіліну паслухаў, адначасова азіраючыся па баках і спрабуючы ўбачыць у жанчынах, якія праходзілі міма, Галіну. Аднак яе не было, і самае важнае — ён не ведаў, якая яе кватэра. Заставалася толькі чакаць і спадзявацца. Але на што спадзявацца і колькі чакаць? Мо яна спакойна сядзіць у пакоі і выйдзе з кватэры толькі раніцай, дык ён жа не можа чакаць тут бясконца. І ўсё-ткі пакуль толькі заставалася чакаць з надзеяй убачыць урэшце, пачуць яе голас. Гэта было як навала, насланнё, якому ён раптам падпарадкаваўся поўнасцю.

## 9

— Пакуль чалавек здзіўляецца, ён жыве. Значыць, штодзень ён нешта знаходзіць новае ў свеце, які яго акружае,— казаў Бартуш, не даючы гаспадарам нават слова ўставіць.— Напрыклад, я ўвайшоў у вашу кватэру і здзівіўся. Адкуль столькі дабра? Каб я быў па-ранейшаму злодзеем, дык, канечне ж, абрабаваў бы гэтую кватэру. Аднак у мяне ўсё роўна засталося б пытанне: відаць, шмат зарабляюць гаспадары, калі столькі багацця,— ён шырока развёў рукамі.

Ніла Восіпаўна памкнулася запярэчыць, нават запратэставаць, бо здавалася, што ў іх дабра не больш, чым у знаёмых, і не менш. Прынамсі, так заўсёды хацелася, дзеля гэтага часам нават, думалася, яны і жылі. Толькі Бартуш не заўважаў пратэсту на яе твары, тарабаніў, зусім не клапоцячыся пра тое, што мо ягоныя словы не спадабаюцца гаспадарам, сваю думку ён развіваў далей. І непрыемна было, але нічога не заставалася, як маўчаць і слухаць.

— Вось ты, Ісідар, трэнер. Звычайны, без тытулаў і званняў. Колькі ў месяц маеш? Можаш не казаць, я вашу сістэму вывучыў няблага: мецэнат завод корміць і цябе і тваіх слесараў-футбалістаў, аматараў, якіх ніколі не бачылі на заводзе. Потым талоны, прэміі. Так? Выходзіць у суме рублёў чатырыста. Правільна я палічыў?

— Амаль што...— трохі незадаволена сказаў Ісідар Карпавіч.— Пяцьсот. І ўсё мае...— і з выклікам дадаў: — Бывае і шэсцьсот. Але я працую ледзь не круглыя суткі, мала жыву дома, пастаянна раз'езды на зборы, матчы. Хто і чым кампенсуе маё.здароўе, нервы, якія проста гараць з гэтымі, як кажам, слесарамі-футбалістамі. І наогул, ёсць у беларусаў, калі не забыў, добрая прымаўка: лепш біць свае вошы, чым лічыць чужыя грошы.

— Ха-ха-ха,— засмяяўся Бартуш.— Праўда гэта. Аднак цяпер усе лічаць, а раптам дзе непрацоўныя даходы выскачаць. Я ўжо таксама запраграмаваўся і лічу і бачу па вашых тварах, што паводжу сябе не як госць, а як гаспадар. Знаеце, я даўно заўважаю, што часта за прыгожымі знешнімі аблiччамі людзей схаваны такія цёмныя і брудныя душы, што нават зэк з лагера анёл у параўнанні з імі. Не кажучы пра якую птушку альбо мураўя, ваўка. У гэтых звяроў душа, пэўна, прыгажэйшая, чымсь у асобных людзей, ці ўжо толькі ў асобных. У людзей душу лечыць гора, бяда... Не думаю, што вы надта клапаціліся, перажывалі, пакуль сынок не трапіў за краты і пакуль страх за яго і сумота не закранулі вашы сэрцы...

Ей і так было кепска на душы, ніяк не магла ачомацца ад паездкі да Мірыка, а тут яшчэ дома дзяўбе мазгі гэты чалавек, ад якога чакала дапамогі, парады, зрэшты, добрага слова. Усё-ткі ёсць вопыт гэтага невядомага і страшнага жыцця. Яна не вытрымала, ускрыкнула, забыўшы пра клопат аб сваёй знешнасці, прыгажосці.

— Дарагі Радзімір, мы чакалі вас як самага-самага найдаражэйшага чалавека,— сказала Ніла Восіпаўна,— як доктара, які дапаможа нам вылечыць хваробу... Зразумейце мяне, я хачу, каб Мірык вярнуўся дамоў паўнацэнным чалавекам, каб яго больш не зацягнула гэтае страшнае балота, каб ён больш не трапіў за краты...

Бартуш слухаў яе, прыплюснуўшы вочы і адвярнуўшы галаву да акна, за якім ужо было цёмна, сыра і, мусіць, холадна, бо, калі ён ішоў сюды, пачынаў сыпаць дождж. Узбуджаныя словы Нілы Восіпаўны яго не кранаді, хоць яму па-чалавечы было шкада жанчыну, але чамусьці душа заставалася абыякавай да яе бяды. Здавалася, нікому не пажадаў бы: сын у турме.

Усе надзеі, якія былі з ім звязаны, планы зламаліся, як трухлявая скрынка пад цяжарам нават толькі аднаго чалавека, што незнарок ступіў на яе. Розумам ён нібыта спачуваў Ніле Восіпаўне, але сэрца было абыякавым да лёсу вядомага толькі па пісьмах дваццацігадовага Мірыка. Ён у турме пабачыў розных людзей і, пэўна ж, змагаўся, каб выжыць і застацца асобай. Яму ніхто не дапамагаў, ён быў адзін, здавалася, ва ўсім белым свеце. І ён выжыў, таму што прайшоў праз пакуты і неймаверны фізічны і маральны цяжар і не страціў сваёй чалавечай годнасці. Хацелася адказаць гэтай жанчыне проста і жорстка: што зарабіў сын, тое няхай і мае. Аднак па той настойлівасці, з якой Ніла Восіпаўна дамагалася іхняй сустрэчы, запрашала ў госці, ён разумеў, што гэтым толькі пакрыўдзіць яе.

— Прабачце, я перашкодзіла вам, не дала гаварыць,— на твары ў Нілы Восіпаўны разгубленасць і ніякаватасць, яна ажно нервова ламае пальцы.

— Не, гэта ў мяне нешта сёння моцна язык...

У калідоры дзынкнуў званок, нехта яшчэ ішоў у госці, хоць, здаецца, нікога і не клікалі. Ніла Восіпаўна паднялася ўжо з канапы, каб пайсці да дзвярэй, але апярэдзіла Анжэла, выбегла з пакоя, какетліва варухнуўшы бёдрамі, шчыльна абцягнутымі джынсамі. Бартуш правёў яе позіркам і падумаў, што яна сімпатычная. Мусіць, ужо ў натуры ў жанчын пакрасавацца перад мужчынам. Дзеўцы замуж хоць заўтра, не сядзіцца з маці ды бацькам.

— Наша Анжэла — вельмі сціплая і нікуды не ходзіць. Усё дома, дома,— чамусьці прамовіла Ніла Восіпаўна, пачырванеўшы. І Бартуш зразумеў, што яна заўважыла, як ён паглядзеў на Анжэлу. Быў бы на вуліцы, ён мацюкнуўся б, таму што не любіў, калі на яго глядзелі.

З калідора пачуўся смех Анжэлы, потым — нейчы як бы прыглушаны голас. Праз хвіліну ў пакой увайшоў высокі з худым маршчыністым тварам сярэдніх гадоў мужчына. У яго былі лупатыя жоўтыя вочы, кароткія, з сівізной, чорныя і, мусіць, шорсткія, як дратва, валасы. Па тым, як імкліва, з радаснымі ўсмешкамі падняліся насустрач мужчыну гаспадары, было відаць, што гэта дарагі госць у доме. Ён пацалаваў руку Ніле Восіпаўне, пакланіўся ёй. Ён трымаў сваю галаву высока ўзняўшы, плечы былі шырока разгорнутыя. Выгляд, як кажуць,

нібы ў арла. Бартушу раптам здалося, што ён нават сам сабой любуецца і, амаль як жанчына, красуецца перад людзьмі. І хоць Бартуш зусім не ведаў яго, але адразу ўзнікла непрыязнасць і гідлівасць да гэтага чалавека.

— Мне хацелася б, каб вы пазнаёміліся і пасябравалі,— паспешліва загаварыла Ніла Восіпаўна.— Гэта Ілья Ільіч Ярыга, надзвычай цікавы чалавек і эрудыт, хоць і будаўнік...

— Ну, Ніла Восіпаўна, мушу з вамі паспрачацца,— сказаў Ярыга,— будаўнікі вельмі і вельмі разумныя людзі...— ён, мабыць, чакаў, што выкажа Бартуш, але той маўчаў.

— Наш госць Радзімір Бартуш з Масквы, ён пісьменнік,— падкрэсліла гаспадыня, маўляў, вось якія людзі бываюць у нас.

— Рады, рады,— ціснуў руку Ярыга, глядзеў не ў вочы, а паверх галавы. Рука ў яго была цвёрдая і халодная, па поціску адчувалася, што дужая.— З пісьменнікамі яшчэ не быў дагэтуль знаёмы. І, па шчырасці, даўно не чытаў кніжак, хоць і маю неблагую бібліятэку, выпісваю і «Литературную газету», і «Иностранную литературу», і «Юность». За работаю дык няма калі нават пагартаць іх. Нам не да літаратуры, калі трэба будаваць кватэры. Наш лозунг: кожнай сям'і — асобную кватэру.

— Лозунг вельмі добры,— сказала Ніла Восіпаўна.— Сядайце, Ілья Ільіч. Невядома толькі, як яго ажыццявіць.

— Сеў. Я на сваё месца,— Ярыга прымасціўся ў кутку на мяккім крэсле і нібыта ўтануў у ім, толькі тырчэлі худыя доўгія ногі з вострымі каленямі.— Вы знаеце, калі па шчырасці,— ён азірнуўся на Бартуша.

— Гаварыце, гаварыце. Радзімір свой чалавек,— з ласкавай усмешкай супакоіла яго Ніла Восіпаўна.

Бартуш хмыкнуў, нешта думаў сказаць, але сустрэў вачыма ласкава-трывожны позірк Анжэлы, зноў здзівіўся ёй і прамаўчаў. Пакуль вырашыў паслухаць, спяшацца не было куды, ўсё роўна ж ён прыехаў у гэты дом, гаспадары якога чакалі яго, даўно запрашалі да сябе. «Ярыга Ілья Ільіч...»

Ен цішком уважліва агледзеў Ярыгу. «Чалавек, які на ўздыме. У яго пакуль мала што ёсць, але ён імкнецца ўзяць як мага больш...»

— Налі мне кавы,— грубавата сказаў ён Анжэле.— І ў вялікі кубак...

Яна прынесла з кухні паўлітровы кубак, паставіла перад ім.

— Такі?

Ён махнуў рукой: налівай. Супакоіў сябе думкай, што будзе піць гэтую каву ўвесь вечар.

— Мне здаецца, мы гуляем у дэмакратыю, хістаемся то ўлева, то ўправа,— разважаў Ярыга.— Ад гэтых хістанняў і наша грамадства трасецца, нібы ў малярыі. Вот мой бацька расказваў пра трыццатыя гады. Родам ён з Чэрвеня. Дык казаў, як ноч падыходзіць, усе ўжо трасуцца. Чыя чарга, да каго прыедзе «чорны воран» і хлопцы ў капелюшах і скураных паліто. Раніцай даведваліся: Алеся ўзялі ці Яся як ворагаў народа. А які той Ясь быў вораг, бядак з бедакоў. Сям'я з васьмі душ. Нехта прасігналізаваў на Яся. Пайшоў на тры гады, і больш яго не бачылі. Нібыта пасля дваццатага з'езда быў рэабілітаваны... Ніла Восіпаўна, прабачце, вы былі ў Мірыка? — раптам спытаўся Ярыга.

— Была... Была,— яна падумала, што пакуль надта вяла ідзе размова. І чамусьці маўчыць пісьменнік, глытае каву і іранічна-здзекліва пасміхаецца. І наогул, здаецца, чалавек ён не вельмі выхаваны. Але ж што можна чакаць ад яго, калі столькі гадоў адбыў у турме, дый вадзіў сяброўства са зладзеямі, бандытамі. Сама захацела, запрасіла яго. Ёй хацелася скінуць сваю прыгожую сукенку, якая цесная і пад пахамі, і на спіне, легчы ў ложак. Укрыўшыся цёплай коўдрай, ні аб чым не думаць. Але гэта проста немагчыма і нерэальна. Ярыгу яна не запрашала, ён прыйшоў сам, як даўні сябра іхняга дому. Даўні сябра. Калі судзілі Мірыка і ягонага Ігара, дык ён свайго Ігара неяк уратаваў ад пакарання і суд апраўдаў Ігара. Хоць яны былі разам з Мірыкам у той бойцы, і так нікому невядома, хто пакалечыў таго дзядзьку. Пасля таго Ігар ні разу не зайшоў да іх, ухіляецца ад сустрэч. Нават пакінуў Анжэлу, з якой гуляў амаль два гады. Мабыць, усё не так, як яна думае, але ж яна — маці, і ў яе баліць сэрца за сваё дзіця, як у кожнай маці. Мо яна благая маці? Відаць, благая, калі сын у турме.

— Мне трэба, і гэта лічу правільна, каб рабочы займаўся сваёй справай, а начальнік участка ці майстар —

сваёй. Калі рабочы пачне рабіць не тое, што яму загадана, такога рабочага трэба звальняць.

Бартуш піў каву, трымаючы кубак абедзвюма рукамі. Галава ў яго была схілена ўніз да стала. Пры апошніх словах Ярыгі Бартуш таргануў плячыма і гучна ляпнуў кубкам па стале.

— Чым вы, грамадзянін Ярыга, адрозніваецеся ад тых дзялкоў у скураных паліто, пра якіх з абурэннем расказвалі? — прамовіў Бартуш.— Я розніцы не бачу.

Збянтэжанасць адразу пабегла па тварах людзей. Ярыга прыўзняўся з крэсла, выпраставў сагнутыя ногі і закрактаў, закашляў.

— Вы ж не ведаеце Ілью Ільіча,— сказала Ніла Восіпаўна, умольна склаўшы рукі і вачыма просячы, каб ён маўчаў.— Ен жа, ён жа...— і захліпнулася словамі, як вадой.

Нібыта зноў хтось пацягнуў яго за язык, і Бартуш нечакана вымавіў:

— Я з такімі хлапчукамі шустрымі сядзеў у турме.

— Дзе? — ажно ўскочыў Ярыга.

— У турме! — выразна і гучна паўтарыў Бартуш.— У нашай роднай савецкай турме!

# РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЁРТЫ

Кружыць лісце вецер...

*З народнага*

## 1

Аляксеевічу пачаў сніцца бацька. Такі, якім ён запомніў яго ў апошні раз: высокі, крыху прыгорблены, з доўгімі сіваватымі вусамі. У вачах былі сум і любоў да яго, свайго сына. Але найбольш у іх было суму. Пасля Аляксеевіч чытаў у адной кніжцы, што з такімі вачыма людзі ідуць на шыбеніцу.

Бацька тады ўжо быў у Грамадзе і разам з сябрамі адстойваў незалежнасць беларусаў на «ўсходніх крэсах». Помніць Аляксеевіч, як аднойчы сабраліся ў іхняй клуні чалавек пятнаццаць, а ён у гэты момант сядзеў на вышках і ўсё слухаў, чуў, пра што гаманілі бацька з

мужчынамі. А пасля заспявалі: «Ад веку мы спалі, і нас разбудзілі...»

Па вёсцы шнарылі паліцэйскія, вынюхвалі, у каго незалежны дух. Хто супраць Польшчы? Іх было ў вёсцы шэсць членаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, а бацька — сакратар партыйнай арганізацыі. Пра гэта Аляксеевіч даведаўся ўжо ў канцы пяцідзесятых гадоў, пасля XX з'езда.

Бацька з сябрамі ўчынілі дыверсію — спалілі ў Гута-Міхаліне тартак. І пачалося. Многа людзей ухапілі, каго забілі цішком, а каго — у лагер Бярозу Картузскую. Грамадоўцаў пахапалі, а камуністы вырашылі ўцякаць цераз граніцу ля Баранавіч у Савецкі Саюз.

Бацька ўначы прыйшоў дахаты, развітаўся з сям'ёй. Вось тое развітанне і сніцца цяпер Аляксеевічу. Жывы бацька з'яўляецца па начах, пра нешта расказвае, жартуе. А ён, Аляксеевіч, па-ранейшаму падлетак, дзіця...

Праз дваццаць гадоў вярнуўся быў у іхнюю вёску адзін толькі стары Тодар, без правай нагі і хворы. Аляксеевіч якраз адпачываў з сям'ёй. Вестку прынесла маці, прыбегла ў хату, ледзь на нагах стаяла. Палажылі яе на ложак, як маглі супакоілі, і пайшоў Аляксеевіч да Тодара на сустрэчу. У ягонай памяці гэты чалавек застаўся маладым, вялізным матросам, які насіў на галаве бесказырку з надпісам: «Грамабой». Аляксеевіч знайшоў Тодара не дома, бо таго жонка не прыняла — даўно жыла з дзядзькам Маркам з Ласасіны,— а ва ўдавы Тафілі, беднай няшчаснай бабы з чатырма галымі і галоднымі дзецьмі.

— Дзе дзядзька? — спытаў Аляксеевіч у Тафілі, якая на двары замешвала ў цэбры свінні.

— На ложку, дзе ж яму быць,— адказала, насцярожана паглядзеўшы на яго.

Ён як увайшоў у хату, так і спыніўся ля парога, нічога не разумеючы і не верачы сваім вачам: ля печы стаяў, абапёршыся рукой на мыліцу, аднаногі дзядок з рэдзенькім сівым пушком на галаве. Гэты чалавек зусім быў непадобны на Тодара, якога помніў Аляксеевіч. Яны ўглядаліся адзін у аднаго: Тодар недаверліва, з асцярогай, а Аляксеевіч — са спадзяваннем, надзеяй. Грукнула дзвярыма Тафіля, зірнула на абодвух, усміхнулася і сказала:

— Запрашай чалавека сесці і сам сядзь, а то шчэ грымнеш на падлогу.

— Нічога, нічога, далёка не ўпаду,— здалося, вельмі бадзёра сказаў Тодар.— Нешта не пазнаю чалавека...

— Ды гэта Кемчыка Аляксея сын,— буркнула Тафіля і выйшла з хаты. Праз акно было відаць, што панесла вядро да хлява.

— Кемчыкаў...— неяк задуменна-разгублена паўтарыў Тодар і сеў-такі на ўслон ля стала. Дастаў з кішэні папяросу, закурыў і надоўга закашляўся, хрыпла, з усхліпамі. Нарэшце аддыхаўся, ад твару адхлынула нездаровая плямістая чырвань.

— Я хацеў бы пачуць пра бацьку,— не вытрымаў больш Аляксеевіч, словы вырваліся неяк міжволі, таму што яны даўно жылі ў ім, часта не давалі спакойна спаць.

І Тодар, перарываючы свой аповяд кашлем, пачаў яму расказваць пра тое, што было з імі, членамі КПЗБ, трыццаць гадоў назад. Скажа слова і замоўкне, думае і паглядвае вельмі ўважлівымі вачыма.

У Баранавічах іх сустрэў надзейны чалавек, звалі яго «таварыш Стась», і ён правёў да граніцы, а там перадаў другому, маладому хлопцу. І той удала пераправіў іх за мяжу...

— Пасля два гады мы не бачыліся,— Тодар адвярнуўся ў акно, варушыў старэчымі пальцамі, нібыта штосьці лічыў.— Зноў сустрэліся ўсе разам у лагеры... Як былыя польскія шпіёны. Змардаваныя, змучаныя... Я трохі папрацаваў на заводзе ў Смаленску, думаў ужо, як бы сям'ю забраць да сябе. Тым больш што пагалоска пайшла ўжо пра сёе-тое... Нарэшце ўбачыліся ўсе. Уся наша партячэйка ў лагеры, як шпіёны... Ад дэфензівы ўцяклі, свае падабралі. Усім там у лагеры і канцы. Адзін я застаўся. На шчасце, гангрэна да нагі ўчапілася, яе адпілавалі. Які з мяне працаўнік ужо... Прыладзілі мяне да кухні, потым на кані вазіў, што збіралася з парашы... Тады-сяды кусман хлеба перападаў звыш нормы. Вось так і выжыў. А твайго бацьку Аляксея сам хаваў... Змагаліся за незалежнасць, за волю, за вольную Беларусь. Хаваў яго і плакаў. Думаў, няўжо цяпер усё, нават сабе месца прыгледзеў, дзе мяне закапаць. Хацеў аднаму сябру сказаць, але не гаварыў... І аказалася правільна. Той раней за мяне памёр... Што стаіш, сядай,— Тодар даланёй скінуў са стала шалупінне на падлогу. Сядзеў, схіліўшы галаву, а Аляксеевіч чакаў, што яшчэ скажа гэты стомлены і раней часу

састарэлы чалавек. Аднак той больш нічога яму не сказаў, нібыта знясіліўся пасля доўгай і вельмі цяжкай працы. І тады Аляксеевіч паставіў на стол бутэльку гарэлкі, хоць амаль ніколі не піў, нават на фронце сто грамаў наркомаўскіх аддаваў, бо разумеў, што ў разведцы трэба мець цвярозую галаву. Колькі хлопцаў, смелых, таленавітых, па дурасці, глынуўшы гэтай вадкасці з градусамі, паклалі галовы. Ён не піў, а на гэты раз сам адкаркаваў бутэльку і разліў па шклянках. Пачуўшы бульканне, Тодар падняў галаву, абыякава паглядзеў на тое, што робіць Аляксеевіч, але ж дастаў з шафкі хлеб, цыбулю і сподачак з некалькімі скрылёчкамі сала.

— Аляксей быў спярша ў Воршы. Пра яго пісалі ў газетах, вось у «Звяздзе». Маўляў, перараджэнец, перашкаджае паскарэнню развіцця сацыялістычнага грамадства ў краіне. Там было напісана, што ён польскі шпіён і, акрамя таго, працуе яшчэ на англічан. Пасля гэтага артыкульчыка яго і ўзялі. Як мне сказаў ужо там, у лагеры, ішло ачышчэнне грамадства ад гною, гэта значыць ад нас. Быў завёўся ў мяне знаёмец, адзін лейтэнант. Папрасіў яго паглядзець маю справу. Лепш бы не прасіў. Паглядзеў ён мае паперы, а там: контррэвалюцыйная дзейнасць. З таго часу ніякіх са мной кантактаў. Вораг ёсць вораг... Цяперка вось рэабілітавалі... Дзякуй хоць за гэта таварышу Хрушчову. Сказалі, што ні ў чым нявінен. Не разабраліся, памыліліся. Добрая памылка — з шасці чалавек адзін застаўся і то без нагі. А я ж матрос з «Грамабоя», у грамадзянскую белых біў,— раптам закрычаў Тодар.— А тут у адным лагеры давялося з бацькам тваім сядзець. І нават з былым ротмістрам, які спрабаваў на Доне паўстанне ўздымаць, на суседніх нарах спалі.— Ён глынуў трохі і выліў гарэлку на падлогу.— Мы некалі ў падполлі давалі клятву не ўжываць гэтае паскудства, не магу прывыкнуць.

— Дый не трэба прывыкаць,— прымусіў сябе вымавіць Аляксеевіч і зразумеў, што больш нічога ён не пачуе ад Тодара, бо той зноў ці то знясілена, ці то ў задуменні схіліў галаву. На дварэ нешта сама сабе гаварыла цётка, ляпала веснічкамі ў агародзе, потым увайшла ў сенцы, затупала, нечым бразгаючы. Нібыта спрабуючы запомніць гэтую згорбленую постаць, каравыя з тоўстымі сінімі жыламі рукі, Аляксеевіч разглядваў Тодара,

думаючы, што калі б дажыў бацька, дык ён таксама быў бы такі на выгляд. Пачакаўшы яшчэ крышку, вырашыў ісці дамоў. Ля парога спыніўся з надзеяй, што, можа, яшчэ пачуе пра бацьку. Аднак Тодар, здавалася, спаў. І Аляксеевіч моўчкі пайшоў з хаты, нібыта асеплены і глухі, усё ягонае цела быццам працінаў наскрозь боль за бацьку, ён амаль фізічна адчуваў, як баляць рукі, ногі, галава, спіна. Ён ішоў з невідушчымі вачыма, нікога перад сабой не бачачы і не чуючы. У ягонай душы не было нянавісці ні да кога, быў толькі боль. Здавалася, нават так не балела на фронце параненая нага. Пасля, праз некаторы час, ён зразумеў, што тады раптам усплыў той даўні, трыццацігадовы боль з маленства, калі забралі бацьку, і боль, які жыў у ім усё ягонае жыццё. Ён нібыта стрэліў проста ў сэрца, і Аляксеевіч, як вытрымаў, як дайшоў дахаты, потым не помніў, не мог успомніць. І ўсё-ткі на наступны дзень знайшоў сілы, каб сесці за стол і напісаць пісьмо ў Маскву. Ён хацеў ведаць усё пра бацьку, у чым яго абвінавачвалі і, галоўнае — прачытаць, што бацька рэабілітаваны. А найлепш хай надрукуюць гэта ў той газеце, якая называла яго перараджэнцам.

Гэтае пісьмо Аляксеевіч пісаў амаль дзень, і, баючыся, што, калі ўкінуць у вёсцы ў скрынку, яго па дарозе могуць забраць і не дойдзе ў Маскву, ён перадаў пісьмо з суседам-шафёрам, якраз той збіраўся ў рэйс ажно да сталіцы. Адказ ён атрымаў праз паўгода, у Мінску. Яго выклікалі ў райваенкамат і там пад распіску аддалі вялізны блакітны канверт, у якім была маленькая паперка з двума радкамі слоў. Яму паведамлялі, што бацька ў сувязі з тым і тым і паводле такога і такога артыкула рэабілітаваны. Але ніводнага слова пра тое, што ён быў невінаваты ні ў чым. Праседзеўшы над гэтай паперкай мо гадзіны тры, Аляксеевіч зразумеў: нічога больш ён не даведаецца. Дый ці ўрэшце зменіцца што, бацьку не вернеш. Шмат аб чым ён тады перадумаў і канчаткова нарэшце зразумеў: несправядлівасць і ашуканства былі і ёсць. Яны хаваюцца за прыгожымі словамі, за заклікамі, намаляванымі на шырозных плакатах і развешаных паўсюль. «З ашуканствам трэба змагацца, каб пасля ягонаму сыну ці чыйму іншаму не давялося чытаць паперку аб рэабілітацыі»,— думаў Аляксеевіч. Але як змагацца?..

Тодар пасля вяртання ў родную вёску пажыў мо

гады два і памёр. Хавала яго амаль уся вёска, успомнілі на могілках, што быў ён героем грамадзянскай вайны, матросам рэвалюцыі. Пра гэта казаў на пахаванні настаўнік Каляда, сябра Аляксеевіча, з якім яны ў дзяцінстве разам пасвілі кароў і свіней. Нешта было ў гэтай прамове сказана і пра няўдзячны лёс Тодара, што людзі не ацанілі яго. Аляксеевіч прыехаў у вёску недзе праз месяц, як пахавалі Тодара, і, канечне, сустрэўся з Калядой. І той, разгаварыўшыся, з недаўменнем і здзіўленнем выказаў яму, што выклікалі ў райком да загадчыка аддзела прапаганды і адвучвалі ад палітычнай блізарукасці і што наогул не трэба было ўспамінаць пра лагер. «А чаму нельга?» — недаўменна пытаўся Каляда. Людзей знішчаць можна было, а гаварыць крый божа. Праўда з крывым і гнілым бокам наўрад ці патрэбна. Праўда чалавеку, як здароўе,— не шкодзіць, а, наадварот, жыць дае радасна і шчасліва. Гэта казаў настаўнік Каляда, які меў за плячыма інстытут і больш разумеў тое-сёе ў жыцці, чым Аляксеевіч, які, канечне ж, менш адукаваны, бо, акрамя сямігодкі і школы ФЗН, нічога не канчаў. Канечне, шмат што ён уведаў, займаючыся самаадукацыяй, і ў цяперашнім узросце ў электрыцы, дый у іншых пытаннях разумеў лепш за некаторых малайцоў, якія прыходзілі ў іхняе ўпраўленне з інстытута. Аднак тое, што адбывалася ў грамадстве, не мог зразумець, чаму гаварылася адно, а рабілася іншае.

Чым далей адыходзіў той час, калі забралі бацьку, тым усё часцей ён успамінаўся. Мо таму, што Аляксеевіч дажыў да такога ўзросту, што ўжо яго не толькі цішком, але і ў вочы пачалі зваць дзедам. А ў старасці найбольш успамінаецца дзяцінства. І вайна, якая таксама адгукаецца ў памяці. І хто ведае, колькі яшчэ адведзена гадоў яму на зямлі, дык хацелася б пражыць іх так, каб не было на схіле дзён сорамна перад сабой. Ён ніколі не крывіў душой, помнячы бацьку, а цяпер ніхто, ніводзін чалавек не зможа пахітаць ягоныя прынцыпы.

Быў Сталін, як бог, а пасля ўвесь народ даведаўся, што Сталін знішчыў многіх людзей. І помнікі Сталіну скінулі з п'едэсталаў. Аляксеевіч разам з усімі даведаўся з газет пра страшэнныя рэчы, што вырабляліся пад сцягам вернасці партыі. Пад сцягам вернасці Сталіну і г. д. Здавалася, ужо цяпер будзе справядлі-

васць і праўда, і таму, што гавораць з высокіх трыбун, можна верыць. Аднак зноў ашуквалі людзей...

Ён не мог прывыкнуць да таго, што пра кіраўнікоў краіны і партыі пайшлі раптам анекдоты. Нават пасля партыйнага сходу іхні сакратар расказваў пра лысага дзядзьку, які хоча сеяць кукурузу на Месяцы. Пра Хрушчова наогул шмат чаго расказвалі, і Аляксеевіч не вёрыў, не хацеў верыць, што такое магло быць. Але ж гэта ўсё-ткі было...

Толькі чаму?!. Урэшце, Алексеевіч пераканаў сябе, што памылкі былі часовыя. Толькі вельмі хутка ён зразумеў, што памыліўся зноў. Яму зрабілася страшна, калі ўбачыў, што пачынаецца балбатня, і ўсе смяюцца, не вераць новаму кіраўніку, але ніхто не скажа, што іх ашукваюць. Колькі разоў яму гаварылі: унь твае сябры-камуністы пад судом за крадзеж, дзе ж твая праўда? Ён спрачаўся, нешта даказваў — чаму і сам ужо не верыў... І ўсё-ткі яму вельмі хацелася дачакацца праўды і справядлівасці, той праўды, дзеля якой ён ваяваў і дзеля якой ягоны бацька лёг касцьмі... Аднак цяпер у душы Аляксеевіч не верыў ні тым, хто выступаў у іх на партсходах, ні тым, хто красаваўся на экране тэлевізара. Яго цярпенне канчалася: ён не спаў начамі і думаў, ці не здаць у партбюро свой партыйны білет. Гэтае рашэнне прыйшло да яго неспадзявана, і Аляксеевіч пакутаваў, жыў з ім ужо не адзін тыдзень.

## 2

Сваю старую дачу Зушчыц перапісаў на сястру, якую забраў з вёскі. Гэта было зрабіць нялёгка, але дапамаглі сябры. Ён ніколі ў жыцці не займаўся б такой справай, калі б не ўведаў, што ў Зялёным бары, дзе таксама былі універсітэцкія дачы, удава прафесара Кержуха прадае сваю дачу. Неблагі двухпавярховы будынак, хоць і недагледжаны, але калі трошкі папрацаваць над ім, дык атрымаецца проста лялька. І Вацлаў Казіміравіч купіў ва ўдавы гэтую дачу. Ён адзін раз толькі сустрэўся з жанчынай, пажылой, з дрыжачай галавой кабетай, якой, мусіць, вельмі не хацелася прадаваць дачу, але настойвалі дзеці. Яны жылі ў Маскве, яны адарваліся ад Беларусі, і ў іх не было жадання сюды ездзіць, тым больш што мелі свае дачы, як зразумеў

Вацлаў Казіміравіч, пад Кубінкай. Па яго просьбе ўсімі фармальнасцямі, звязанымі з афармленнем дакументаў, займаўся Ярыга. Недзе за месяц ён усё аформіў і перадаў ключы ад дачы Вацлаву Казіміравічу.

Ключы ад дачы былі ў кішэні, і Вацлаў Казіміравіч вырашыў з'ездзіць у Зялёны бор. Гэтая думка яму прыйшла пасля абеду, калі ён, вярнуўшыся на кафедру, убачыў Галіну, якая апошнім часам рэдка прыходзіла ва універсітэт, таму што працавала над дысертацыяй, да абароны ўжо было і не так далёка. Яму раптам захацелася паехаць з Галінай. Ягоная «Волга» стаяла ля галоўнага корпуса з поўным бакам бензіну.

Ім пакуль ніхто не мог перашкодзіць: жонка была ў Чэхаславакіі яшчэ.

На выездзе з горада Зушчыц спыніўся каля універсама і купіў кілбасы, хлеба, мінеральнай вады і бутэльку шампанскага. Пакупкі нёс да машыны ў торбачцы: навошта людзям мазоліць вочы, а раптам некага са знаёмых спаткаеш. У гэтым раёне і сапраўды быў універсітэцкі дом, летась яго здалі і побач з ім будавалі яшчэ адзін. Такія-сякія планы наконт гэтага дома былі і ў Вацлава Казіміравіча, але ён нікому пра іх не казаў...

Зушчыц толькі паспеў расказаць Галіне адзін анекдот, як амерыканскі прэзідэнт і наш дзяржаўны дзеяч ляцелі ў самалёце. Мо якая хвіліна па завулачках пасёлка і — спыніліся ля дачы. Зушчыц зноў, які ўжо раз, падумаў, што не прагадаў.

Была дача недалёка ад электрычкі і ад аўтобуснага прыпынку. Дом складзены з яловага смалянiстага бярвення, цяпер такі зруб цяжка зрабіць: і дарага, і лесу не проста знайсці. Трэба мець знаёмствы ў лясніцтве. А проста так не возьмеш: нечым плаціць. Дапамагай нейчаму сыну ці пляменніку паступіць ва універсітэт.

Дый ён і ўладкаваў не аднаго: пяць пляменнікаў і пляменніц. А колькі розныя знаёмыя прасілі. Канечне, прасіў яго не абы-хто.

Сад на дачы быў недагледжаны, дрэвы, мусіць, даўно ніхто не абразаў, маліннік, як анархіст, пайшоў па ўсім агародзе. Агрэсту было зашмат кустоў і амаль здзічэлых. Рукі гаспадара, канечне, не адчуваліся. Ці будзе яна адчувацца тут цяпер. «Наўрад, калі і якім чынам»,— падумаў Зушчыц, вылазячы з машыны. Ён адчыніў дзверцы і дапамог Галіне, падтрымаў яе пад локаць.

Уся пярэдняя сцяна дачы была ў дзікім вінаградніку, які сплёў пад уваходам зялёна-жоўтую страху з лісця і гронкаў дробных чорненькіх ягад. Каля ганка стаяла шырокая на ўкапаных у зямлю слупах лава, а на ёй ляжала нейкая разгорнутая кніга. Няйнакш, забыла ўдава прафесара. Зушчыц узяў у рукі кнігу, пагартаў пажаўцелыя старонкі і раўнадушна паклаў назад на лаву, нават не прачытаўшы назвы. І ўсё-такі Галіна ўбачыла, што гэта вершы і паэмы Янкі Купалы. Кніга была выдання трыццатых гадоў.

— Вось у нас і суседзі з'явіліся,— пачулі яны абое з правага боку, дзе асабліва густа шчацініўся сваімі калючкамі агрэст. Зушчыц ад гэтых слоў неяк нервова таргануўся, бо ніякіх суседзяў менавіта сёння яму бачыць не хацелася. І ён, падштурхнуўшы Галіну пад вінаградную страху, сам выйшаў туды, адкуль з імі загаварылі. За кучаравым кустом агрэсту, які шырока разросся, Зушчыцу прыязна ўсміхаліся пажылы мужчына ў вылінялым капелюшы і сіняй балонневай курткі і жанчына ў чорным рабочым халаце, накшталт тых, што на грузчыках у магазінах. Мужчына таксама наблізіўся да Зушчыца і першым працягнуў руку:

— Павел Піліпавіч! — сказаў ён, упэўнена і цвёрда, па-начальніцку гледзячы ў вочы Зушчыцу.— Я — чалавек вольны, трыццаць дзён у месяц і дваццаць чатыры гадзіны ў суткі.— І засмяяўся, відаць, задаволены сваім, як ён лічыў, удалым жартам. Ён даволі-такі бесцырымонна разглядваў Зушчыца, быццам хацеў адразу дазнацца пра ўсё ягонае жыццё. Неяк ніштавата стала пад гэтым уважлівым позіркам, хоць Вацлаў Казіміравіч сам мог часам так глянуць, што людзі ніякавелі. У позірку былі нахабства, самаўпэўненасць і, канечне ж, бесцырымоннасць. Вацлаў Казіміравіч падумаў, што гэты Павел Піліпавіч, безумоўна, заўважыў Галіну. Наогул над тым, якія ствараюцца адносіны між ім і Галінай, Вацлаў Казіміравіч не вельмі задумваўся. І не рабіў з гэтага праблемы: не яна — першая і ён — не першы. Ужо колькі ў кніжках панапісана пра любоў між пажылым прафесарам і маладой аспіранткай альбо нават студэнткай. Урэшце, да яе ў яго былі палюбоўніцы, можна так сказаць сабе, і пасля будуць, бо з маладымі ён адчувае, што і сам маладзее.

Трэба быць лагічным і дыялектычным — час аскетаў мінуў. Чаму ён, Зушчыц, не можа ўзяць з сабой Га-

ліну і спакойна пабыць з ёй на дачы ці дзе ў іншым месцы? Не, трэба ўсё рабіць цішком, баючыся, каб хто не прасігналіў у партком ці ў райком... «Вось што цяпер трэба гэтым пенсіянерам?» — думаў Зушчыц, усміхаючыся, хітаючы галавой, нібыта слухаючы гэтага, мусіць, былога начальніка. На ганку чакала Галіна, якая, пэўна ўжо нервавалася, хоць бы адчыніў дзверы.

— Запрашаем вас на чай,— сказала суседка.

— Дзякую, дзякую,— паволі, баком адыходзіў ад іх Зушчыц.

— Што там дзякуй. Такога ўзроўню людзям, як мы, трэба сябраваць,— сказаў Павел Піліпавіч.— Тым больш суседзям. А гэта што, мо гаспадыня з вамі? — раптам спытаў ён.

«Ах, свалата, усё-ткі прыкмеціў. Яны, мабыць, бачылі, як я пад'ехаў і як Галіна вылазіла з машыны... Ну і чорт з вамі, каб вы згарэлі разам з вашай цікаўнасцю»,— нядобра падумаў Зушчыц і нічога не адказаў на пытанне Паўла Піліпавіча. Нібыта развітваючыся, кіўнуў галавой і пайшоў, чапляючыся вопраткай за іголкі агрэсту.

— Што яны хацелі? — трохі раздражнёна сустрэла яго Галіна.— Прывезлі і кінулі адну, Вацлаў Казіміравіч, безабаронную...

Ён працягнуў рукі, каб абняць яе, але Галіна адхілілася, зрабіўшы выгляд, што не заўважыла гэтага. Як толькі Зушчыц адамкнуў дзверы, яна штуршком расчыніла іх і ўвайшла ў цёмны пакой.

Наступныя дзверы былі незамкнёныя і лёгенька пагойдваліся ад скразняку.

— Недзе я нядаўна чытала аб прафесару і аспірантцы, якія спаткаліся на дачы,— сказала Галіна.— Здаецца, у рамане «Летнія мелодыі».

— Што ж, усё паўтараецца,— Зушчыц вельмі ўважліва глядзеў на Галіну і зноў наблізіўся да яе, але яна раптам насцярожылася і падняла руку ўгору, заклікаючы яго прыслухацца. У двары, недзе ля машыны, сапраўды чуліся галасы. Няйнакш людзі ішлі ў дом. Канечне ж, Зушчыц не хацеў, каб Галіну бачылі тут, не дай бог, калі хто з універсітэта альбо даўно знаёмыя. Ён адчуў сябе амаль што злодзеем, якога знаходзіць у сваёй кватэры гаспадар. Аднак нельга было страчваць упэўненасці перад Галінай. Унь што робіць маладая жанчына з мужчынам: загадай цяпер Галіна скочыць

яму з даху, а гэта значыць з вышыні сямі-васьмі метраў,— мусіць, палез бы наверх. І ўсё-ткі каб гэта было без сведкаў, каб не бачылі людзі, якія яго ведаюць. Ён не паспеў нават папрасіць сваю госцю перайсці ў суседні пакой, як нехта далікатна пастукаў у дзверы. І Зушчыц праз шкло ўбачыў суседа, з якім толькі што развітаўся. Яму не хацелася ні бачыць гэтага чалавека, ні гаварыць з ім. Як кажуць, не пускаюць яго ў дзверы, лезе ў акно. Дый не патрэбна яму гэтае знаёмства. Навошта пенсіянер яму, якая выгада, толькі паваструць язык? Для гэтага ён лепш возьме Галіну...

— Зноў да нас сусед, Галечка,— сказаў Зушчыц.

— А вы яго не пускайце...

— Я не ведаю...

— Глядзіце самі.

— Даражэнькі Вацлаў Казіміравіч, мая жонка перадае вам прэзент; кошык апенькаў. Назбіралі ўчора унь там, за агародам, два мяхі... Дык чаму не пачаставаць і добрага чалавека...— неяк радасна і шумна гаманіў сусед, не спыняючыся ў сенцах, ішоў міма Зушчыца, і ён не змог схапіць за рукаў няпрошанага госця і выпхнуць сілком з дома. Дый ужо не паспеў гэтак зрабіць, калі і вырашыў бы. Дзверы нібыта самі расхінуліся перад Паўлам Піліпавічам, і ён, голасна вітаючы Галіну, паставіў кошык з грыбамі на старую аблезлую табурэтку, якую не забралі былыя гаспадары.

— Частуйцеся. Сёлета столькі апенькаў, што хоць касой касі. Зімой яны вельмі смачныя, асабліва калі...— ён па-гаспадарску ўпэўнена, быццам не ён быў у гасцях, а Зушчыц, засмяяўся і зусім не па-старэчы зірнуў на Галіну. Відаць, яна спадабалася гэтаму старому, і ёй зрабілася смешна. Падумала, што прывёз сюды, на дачу, амаль дзед, а цяпер — кавалер старэйшы. Яна вырашыла гэтаму дзядку глянуць проста ў вочы, каб ён разгубіўся, каб не ведаў, як сябе паводзіць і хутчэй пайшоў адсюль. Аднак ён ужо стаяў да Галіны спіной і размаўляў з Зушчыцам аб надвор'і, якое з кожным днём усё больш псуецца, і, пэўна, не сёння-заўтра надыдзе зіма. Зушчыц быў вышэйшы за Паўла Піліпавіча на галаву, і таму яго вачэй было не відаць, і ён усё міргаў Галіне, варушыў разгублена плячыма. І зусім збянтэжыўся, калі сусед дастаў з кішэні чорных, забруджаных сырой зямлёй штаноў пляскатую з бела-чырвонай этыкеткай пляшку. Гэты жэст быў

вельмі красамоўны, і не трэба было больш нічога гаварыць, і так ужо стала ясна, што прыйдзецца ім пакуль быць у кампаніі Паўла Піліпавіча, які, пэўна, ужо здагадаўся, кім даводзіцца Галіна Зушчыцу. І нічога не заставалася Вацлаву Казіміравічу, як запрасіць яго ў гасцёўню, дзе былі стол і канапа, а Галіну — быць гаспадыняй. І толькі яны паселі за стол, як пачулі ў сенцах голас жонкі Паўла Піліпавіча. Яна прасіла прабачэння за тое, што — няпрошаная госця. Яна прынесла мяса проста на патэльні. Ад гэтых суседзяў было не проста адчапіцца, іх жа не выганіш з хаты. І Зушчыц урэшце прыміры́ўся з іх прысутнасцю, ужо спакойна слухаў размову Паўла Піліпавіча і Галіны, якая, здаецца, нават была задаволена гэтай кампаніяй, усміхалася. Аднак мінула якая гадзіна ў пустой, нікчэмнай гаворцы, і Зушчыц падумаў пра тое, што рана ці позна, але прыедзе сюды і жонка і абавязкова спаткаецца з суседзямі. І калі-небудзь усплыве мо нават мімаходзь, так між іншым, іхні прыезд сюды з Галінай. А жонка ў яго экспансіўная, нервовая, як большасць жанчын дваццатага стагоддзя, ледзь што — успыхвае, як порах, і гэта значыць будзе вялікі гвалт, страшэнны шум, водгулле якога можа даляцець ажно да кафедры. Але навошта яму гэта, што ён не можа жыць спакойна? Мо не трэба было сюды везці Галіну, гэту маладую ласіху, якая вельмі ведае, што хоча. Яму здаецца, што яна і паехала з ім, каб неяк паспрыяць сваёй дысертацыі, каб ён застрахаваў сваім аўтарытэтам яе абарону. Вохці, гэтыя маладыя, прагматычныя жанкі, здольныя на ўсё дзеля свайго поспеху. Часам няможна з імі гаварыць, слухаць іх, а цераз нейкае імгненне, калі міне гэты агрэсіўны настрой, жаданне высмеяць, думаеш, што няблага было бы паехаць вось з такой ласіхай на пясочак да цёплага мора альбо хоць на дачу, калі жонкі няма дома. І колькі разоў ужо ездзіў і ўсё было, дзякуй богу, ціха, заставалася між імі. Аспіранткі паспяхова абараняліся. Яму гэта было проста зрабіць, як старшыні савета па абароне. Ёсць жа сотні кандыдатаў і доктароў навук, ад якіх дзяржава анічога не мае, дык калі да іх далучацца яшчэ некалькі, горш не стане, тым больш што яны ягоныя вучаніцы. Павінна ж быць у кожнага саліднага вучонага свая школа. Павінна быць...

— У мяне была пасада на ўзроўні амаль першага

намесніка міністра. І яшчэ б рабіў, каб не гэтая перабудова... Вырашыў: ладна, пагляджу, як вы перабудуецеся. Трэба было жыць, як жылі, і ўсё! — выказваў свае думкі Павел Піліпавіч.

— У краіне была вельмі складаная сітуацыя,— сказала Галіна,— дый бюракратызм...

— Што вы разумееце, дарагая, у бюракратызме,— перапыніў яе Павел Піліпавіч.— Калі б не было бюракратаў, да іх можаце далучыць і мяне, даўно б развалілі краіну. Там, дзе бюракрат,— там парадак. Паверце майму вопыту: трыццаць гадоў на кіруючай рабоце. Эх, не так усё проста...

— А я з вамі абсалютна нязгодная. Вы, мусіць, забылі, што казаў Ленін пра бюракратаў.

— Помню, што гаварыў Ленін, але да кожнай тэорыі трэба падыходзіць дыялектычна... Я вось што скажу. Цяпер ужо можна... У пяцідзесятым годзе я скончыў юрыдычны інстытут, не пачаў яшчэ працаваць, калі неяк позна вечарам выклікаюць мяне ў адпаведныя органы і тэрмінова накіроўваюць у Маскву. Еду, але куды, нічога не ведаю, усё роўна як з завязанымі вачыма. У Маскве на вакзале ўжо чакала машына. Ехалі доўга, і пасля бачу, што ўжо недзе за горадам. І прыехалі мы, як я зразумеў, на ўрадавую дачу. Не паспеў аддыхацца, толькі плашч зняў з сябе, павялі ў пакой, дзе ўжо мяне чакаў чалавек, якога я адразу пазнаў, бо бачыў не раз у газетах на здымках. Як здалося, прыемная ўсмешка, прафесарскія акуляры. Вельмі ветліва са мной загаварыў... Значыць, аказалася, што мяне выбралі сярод мноства іншых людзей на пасаду начальніка каравула ў ахове гэтай дачы. Ён спытаў, ці згодзен я. Дзіўнае было пытанне... Назаўтра я быў ужо ў форме старшага лейтэнанта.

— А хто той чалавек быў? — спыталася Галіна.

— Берыя. Лаўрэнцій Паўлавіч...

— Той самы?..

— Той самы.

— І я служыў да таго часу ў ахове, пакуль не арыштавалі яго. Дык я навошта ўсё гэта расказваю: тады я пераканаўся, як важна, калі ёсць у краіне парадак...

— Які парадак? — амаль выкрыкнула Галіна.— Парадак, наведзены Берыем? А вы ведаеце, што мой дзед быў рэпрэсіраваны і ні за што расстраляны? Тымі, хто завёў той парадак. А мо і вы, і вы...— яна не

дагаварыла, рэзка ўзнялася з-за стала, ледзь не перавярнуўшы яго, і, ляснуўшы дзвярыма, пайшла на двор. Адразу стала вельмі ціха, Зушчыц адчуваў сябе няёмка і нават трывожна, бо падумаў, што цяпер, калі сюды прыедзе жонка, суседзі ўжо абавязкова скажуць пра Галіну. І навошта была гэтая яе дэманстрацыя, знайшла з кім спрачацца, з пенсіянерамі, якія нічога ўжо ў жыцці не вырашаюць. Толькі і робяць, што ўспамінаюць. Вот дурніца!.. Аднак як ні дзіўна, але не было відаць, што Павел Піліпавіч пакрыўдзіўся, ён неяк паблажліва ўсміхаўся, іранічна прыжмурыўшы вочы.

— Неразумнае дзяўчо,— сказаў праз доўгую зацяглую паўзу, калі ўжо і Зушчыц збіраўся нешта прамовіць, бо вельмі ж было ніякавата маўчаць. Павел Піліпавіч падчапіў на відэлец мяса з патэльні, агледзеў яго з усіх бакоў і з'еў. І нібыта пахваліў Зушчыца: — Неразумнае дзяўчо, але сімпатычнае... Пайшлі, мая палавіна, дахаты, пакуль нас не папрасіў сусед.

— Ну што вы, што вы,— уголас быццам і запярэчыў Зушчыц, а сам грубавата думаў: — «Ідзі, чорт стары, ідзі!» Яму хацелася хутчэй вярнуць у дом Галіну. Яна і так, мабыць, злуе, што ён не пабег за ёй! Аднак гэта было б ужо занадта, ён не закаханы хлапчук дваццаці гадоў, а сталы мужчына, які добра ведае, што яму патрэбна. Да чорта ўсе Берыі і Паўлы Піліпавічы, усё да чорта! Галоўнае тое, што датычыць яго, што трэба яму, што хоча ён, а астатняе... Усе ружовыя ілюзіі, пакуты душы даўно мінулі, ён ясна і цвёрда ведае, як яму жыць на гэтай зямлі, тым больш што зусім невядома, колькі засталося яшчэ. Прынамсі, намнога менш, чым пражыў, дык няхай гэтая ягоная восень будзе яму святам. І толькі няхай хто надумае перашкодзіць, забраць гэтае свята...

Правёўшы гасцей да веснічак, ён порстка абышоў вакол дома і, нідзе не ўбачыўшы Галіну, устрывожыўся і адначасова зазлаваў на яе. І калі, ад злосці стукнуўшы кулаком па дрэве і ажно скрывіўшыся ад болю, раптам пачуў аднекуль з малінніку ціхі смех, страшэнна ўзрадаваўся. Усё-ткі яна была тут. І ён не пашкадаваў, што, адкінуўшы ўбок усе справы, паехаў на дачу. Ён адчуў сябе маладым і дужым, якому жыць і жыць. Здалося, забыў аб усім на свеце.

Была позняя восень, і трэба было запаліць грубку, каб хоць трохі пасвяжэла ў пакоі. А за якіх дваццаць —

дваццаць пяць кіламетраў шумеў горад, у рэстаранах, тэатрах і кафэ весяліліся людзі, грымела музыка. І недзе ў кватэры, на лавачцы, у парку ці пад шатамі дрэў каля дома абдымаліся мужчыны з жанчынамі. Пошум той, гарадской весялосці адчуваўся і на гэтай старой, пабудаванай адразу пасля вайны, дачы.

## 3

Кажу вам, што кожнаму, хто мае, дадзена будзе, а ў таго, хто не мае, забяруць і тое, што мае.

*Евангелле ад Лукі, гл. 19 с. 26*

Некалі ў 1863 годзе таксама Аўгуст-Рыгор Шатыка, прапрапрадзед Аўгуста Рудаміны, са сваім атрадам, адступаючы ад царскага войска, прыпыніўся на адпачынак ля рэчкі Гайні на ўскрайку бярозавага гайка, самасею, непадалёк ад Гута-Міхаліна. Ва ўсіх было адно жаданне: легчы на мяккую і цёплую траву і хоць трохі адпачыць пасля доўгага зацятага бою і адступлення. Добра, што наперад выслалі на астатніх конях пяцёх таварышаў, якія заскочылі да заможнага даволі шляхціца Гуркоўскага, і той, не шкадуючы, даў сала і хлеба. І цяпер было чым падсілкавацца. І была ўпэўненасць, што ніхто не зможа нечакана да іх падысці, бо з аднаго боку — калыхалася і смуродзіла газам дрыгва, а з другога — цякла Гайна, у тым месцы глыбокая і хуткаплынная. Войска магло напасці толькі ад лесу, але ён вось — як на далоні, і ў лоб наўрад салдаты пойдуць, таму што з атрадам Аўгуста Шатыкі мелі ўжо не раз моцную бойку, якая заканчвалася немалымі стратамі з абодвух бакоў.

Пад'еўшы хлеба з салам, амаль увесь атрад хутка заснуў, знайшоўшы нарэшце спакой у гэтым ціхім зялёным куточку Дзедаўскай пушчы. Мо пашэнціць ім, думалася Аўгусту-Рыгору Шатыку, і яны адарвуцца ад войска і, можа, застануцца жывымі. Ён глядзеў на стомленыя, аброслыя шчэццю твары сваіх таварышаў і вельмі шкадаваў іх, бо цяпер, мабыць, ужо зразумеў, што паўстанне скончылася зусім не так, як хацелася, што яно разгромлена. І тых, хто і пасля ўсіх баёў не загіне, чакае страшная кара. А ў іх, і ў яго таксама ў вёсках сем'і, старыя бацькі і малыя дзеці. Ці не

ўпершыню за час паўстання, калі ён стаў інсургентам, так сумна было на душы. Аўгуст, хоць вочы самі, здаецца, заплюшчваліся ад стомы, усё-ткі, перакусіўшы і праверыўшы варту і з жахам убачыўшы, што і яна вось-вось засне, раздзеўся пад шырокім сівым кустом вербалозу і скокнуў у халаднаватую, перакаламучаную ваду. Плынь адразу падхапіла яго і панесла, панесла па рэчцы ўніз, і ён спярша аддаўся яе сіле, націску і плыў, адчуваючы, як нібыта проста ачышчаецца цела ад бруду і пылу шматдзённага паходнага жыцця. Не пашкодзіць, каб усе хлопцы памыліся, а то шчэ вошы завядуцца, а там і да хвароб недалёка. Ён вырашыў вярнуцца назад, але плынь заварочвала яго, штурхала, забіраючы астатнія сілы. І Аўгуст, урэшце злаўчыўшыся, ухапіўся правай рукой за доўгую і пругкую вербалозіну, якая ляжала ў вадзе. Потым зачапіўся і другой рукой, аддыхаўся і памалу пачаў выбірацца на бераг. Ад лагера, дзе спалі хлопцы, Аўгуста аднесла рака не менш чым на кіламетр. І цяпер трэба было голаму, абразаючы ногі асакой, брысці берагам назад. Ён крыху пастаяў, слухаючы абвострана-насцярожана цішыню, бо раптам здалося, што хтосьці недалёка загаварыў. Нібыта нічога небяспечнага не было чуваць, і гэта супакоіла. Ён нетаропка, дапамагаючы сабе чорнай ад вады ламачынай, якую падхапіў па дарозе, патупаў да лагера. Спярша, канечне, трэба было адзецца, і Аўгуст, знайшоўшы вопратку, прысеў на высокую шырокую купу з высахлай жоўтай травой. Ён нацягнуў на мокрыя ногі зрудзелыя штаны з вялікай латкай на левым калене, потым — кашулю, якую варта было б памыць, бо каўнер ужо закарэў ад поту і гразі, аднак гэта ўсё была ўжо дробязь, на якую не варта звяртаць увагі. Не да гэтага. Пасталы ў яго былі амаль новыя, і анучы мала насіў, спрэзентаваў шляхціц Гуркоўскі, які яшчэ прапаноўваў яму і свае бліскучыя боты, але навошта яны, не для балота ж. У пасталах зручней, трывалей сябе адчуваеш. Да чаго чалавек прывыклы, тое і добра. Няхай паны ў бліскучых ботах ходзяць.

Ён пачаў закручваць на нагах анучы, нацягваючы тужэй, з задавальненнем думаючы, што іх хопіць, мусіць, надоўга. У абутку нага атрымалася акуратная, нават файная, не горш чымсьці ў ботах. У целе пасля купання ўзнікла сіла, упэўненасць, якіх ужо яму не хапала. Ён вельмі баяўся расчаравання ў сваёй мэце,

якая была ў ім ад народжанай недзе ў душы самасвядомасці. Гонар за беларускі народ змусіў яго ўзяць у рукі касу і пайсці разам з паўстанцамі змагацца за волю. Шляхце было прасцей, бо ў яе гонар быў заўсёды, вось яму, селяніну з валокай зямлі, трэба было нарадзіцца нанава, дужа ўжо дарослым чалавекам, каб нарэшце асэнсаваць, што такое пачуццё гонару за родную Бацькаўшчыну. Вось чаму ён стаў паўстанцам, ці, як назвалі ў вёсцы, мяцежнікам, гэта ўжо на рускі капыл, як казалі царскія služкі.

Эх, якое было неба, прыгожае і чыстае, нібыта вымыта добрай працавітай кабетай. Нішто не паказвала на непагадзь, захацелася спакойна памарыць пра будучыню сваіх дзяцей, чым скончыцца гэтае паўстанне. Каб знаць, ведаць усё, дык... Аўгусту зноў падалася нейкая гаворка, і на рускай мове. Як не можа быць, што ён загаворыць па-рускі, так і немагчыма, каб войска падышло з лесу ці праз раку. Гэты роздум яго неяк супакоіў, і Аўгуст канчаткова расслабіўся, заплюшчыў вочы. Ён упаў спіной на мяккую пахуткую траву, раскінуў ушыркі рукі і імгненна заснуў. Прысніўся Аўгусту сон, ружовы і страшны, бо яго таварышы стаялі на каленях і плакалі, нібыта жанчыны, а слёзы, буйныя і празрыстыя, ператвараліся ў каштоўнасці, за якія чамусьці нельга купіць зброі столькі, колькі патрэбна было ягонаму атраду. Бо вывеў людзей з косамі і сахарамі супраць стрэльбаў і гармат.

Не ведаў Аўгуст-Рыгор, колькі часу ён спаў, але наўрад ці доўга, бо не прывык, а бадзянне па лесе і балоце, пастаянная засцярога ўжо выпрацавалі ў ім неабходнасць падымацца тады, калі гэта было трэба, хоць праз дваццаць хвілін сну. Пасталы амаль датыкаліся да вады, рэчка вуркатала, цякла міма. Ён расплюшчыў вочы, дацягнуўся рукой да вады, зачарпнуў у далонь, пырснуў сабе на твар. Адразу адчуў, што няблага адпачыў і зможа зноў ісці, ісці. Ці не пара ўжо была падымаць атрад, сонца пачало хіліцца да заходу.

Аўгуст-Рыгор ускочыў з зямлі, падхапіў світку і ўжо сабраўся ісці да хлопцаў. Нечакана з-за старога куста вербалозу, галіны якога, здавалася, накрылі паўракі, выплыла нешта доўгае і чорнае. Мо гэта бервяно, пачарнелае ад вільгаці, мільганула ў галаве, але праз імгненне не было сумненняў, што — чалавек. Ён плыў, гойдаючыся на хвалях, са страшным выскалам на твары.

Няйнакш быў просты селянін, у адных зрэбных штанах. Яшчэ, мабыць, малады хлопец.

Аўгуст-Рыгор толькі глянуў на нябожчыка і шпарка пайшоў ад рэчкі. Ён шыбаваў, а перад вачыма гойдаліся хвалі і чалавек на іх. Ужо колькі часу быў інсургентам, не раз бачыў кроў, а ўсё роўна не мог прывыкнуць, дый, пэўна, немагчыма, да забітых, да смерці. «Колькі мне шчэ адведзена на гэтай зямлі,— думаў Аўгуст-Рыгор,— ці хоць памру ў роднай хаце, сярод сваіх дзетак?.. Пашкадуй ты мяне, божа, і даруй такую ласку...» Зрэшты, за што ён змагаецца, ці будзе мець тое, аб чым марыў. Ужо відаць — усё, але ж, пачуўшы пах волі, незалежнасці, хоць і вельмі слабы, дый далёкі пакуль ад гэтых лясоў,— ён не можа спыніцца, павярнуць убок, бо тады гэта — здрада.

Яму здавалася, што ішоў да паляны, атрымлівалася ж не так, амаль не зрушыў з месца. Сунуўся, як стары дзед, забыў аб усім на свеце, помніў толькі пра сябе, пра сваіх дзяцей. Нібыта ў таварышаў не было сем'яў, не засталіся за лесам гаспадаркі, не плакалі жонкі, калі салдаты вялі палонных, якіх недзе чакала шыбеніца. Ён ішоў, лаючы сябе за тое, што адышоў надта далека ад атрада, і турбуючыся пра вартавых, іх трэба было змяніць ужо.

Аўгуст-Рыгор выбег на палянку, трохі задыхаўшыся, але рашучы, без ранейшых сумненняў, настроены, каб ісці далей. Лес шапатліва гаманіў, дыхаў, падстаўляючы свае лапы-дрэвы гулліваму ветру. Зрэдзь спявалі птахі, дзёўб дзесьці за тры крокі сасну дзяцел.

— Э-эй, хлопцы! — гукнуў Аўгуст-Рыгор, дзівячыся з таго, што нешта заспалі яго таварышы, не відаць іх. Куды падзеліся, дзе ж яны. І зноў крыкнуў ён, але вярнулася толькі рэха аднекуль здаля, дзе не магло нікога быць з ягоных хлопцаў. Запомніў, што пад галінастым дубам, усё роўна як пасыпаным зялёнымі яшчэ бочачкамі жалудоў, улёгся Стынь Залева, сябра маленства, сусед праз хату. Толькі прымятая трава паказвала, што ляжаў тут гэты хлопец. Наводдаль пад раскаракай-сасной адпачывалі Воўк і Заяц, на адной світцы ляжалі. І на гэтым месцы — адна прымятая трава. І тады ў Аўгуста-Рыгора ўзнікла ў душы трывога, ён прабег палянку і не знайшоў ніводнага свайго байца. І калі ў роспачы збіраўся зноў крычаць, пад дзвюма трапяткімі бярозкамі ўбачыў мёртвых Стыня Залеву і

яшчэ чатырох хлопцаў з варты. Атрада не было. І жудасная здагадка ўскалыхнула усю душу Аўгусту-Рыгору. Ён падумаў аб здрадніцтве, што, мабыць, нехта з атрада забіў яго вернага Стыня і варту, у якой таксама былі надзейныя і адданыя людзі, і павёў астатніх у пашчу царскаму войску. Ад гэтай думкі закрычаў так, як крычыць паранены звер, птушкі пазляталі з дрэў і шухнулі ад паляны.

Аўгуст-Рыгор упаў на зямлю, і нібыта зашкуматала яго падучая. Ён катаўся, што вар'ят, па паляне, грыз у злосці траву, лупцаваў рукамі па каравай шурпатай сасне, каб адчуць боль і мо нават самому памерці. І усёткі нешта прымусіла яго падхапіцца з зямлі, чуйна ўслухацца ў лясную варожую цішыню, якая падманула яго і ён страціў пільнасць. Цяпер сапраўды быў падобны на звера, абадраны, у крыві з надзвычайнай сілай у руках, якія не пашкадуюць ворага.

Ён улавіў з правага боку, там, дзе быў Гута-Міхалін, нейкі рух у лесе, іншым разам наўрад ці пачуў бы. І адразу, больш не раздумваючы, толькі прытрымліваючы рукой пістолю за пазухай, ён проста паляцеў, не зважаючы ні на дрэвы, ні на кусты, ні на ямы, і, як ні дзіўна, нават не зачапіўся ні за што. Нібыта лес, спагадваючы яму, адкрываў дарогу.

Аўгуст-Рыгор выбег да поля,і тое, што ўбачыў, пазбавіла яго сіл. Ужо адышоўшы мо з вярсту ад лесу, паныла і асуджана брылі па гасцінцы яго таварышы. Іх цесна акружылі салдаты, падштурхоўваючы прыкладамі стрэльбаў у плечы. Амаль увесь атрад ішоў перад ім у ганьбе і знявазе, а ён, Аўгуст-Рыгор Шатыка, якому хлопцы верылі і ішлі з ім у самае пекла, нічым не мог дапамагчы. Нічым... Хоць ён ведаў, што амаль усіх іх чакае смерць, таму што былі захоплены са зброяй, дый чуткі разнесліся паўсюдна пра ягоны атрад. Вось і праспалі яны сваю смерць, а яна была за гэтай здрадніцкай цішынёй. Ідзе атрад на шыбеніцу, а камандзір, схаваўшыся ў гушчары, цікуе... Што хлопцы думаюць пра яго, мо што загінуў ад штыха ці кулі салдацкай, а мо што здрадзіў, прадаў іх за трыццаць сярэбранікаў, як Юда. Ён стаяў і не мог зварухнуцца з месца, бачыў, як спакваля знікаюць удалечыні белыя і шэрыя постаці людзей. Мо кінуцца з пісталетам і нажом на ахоўнікаў, ахвяраваць сабой, каб людзі, выкарыстаўшы разгубленасць салдат, маглі уцячы. Да лесу яшчэ

дабягуць. Няхай загіне яшчэ той-сёй, але ж атрад выратуецца ад шыбеніцы. Гэтая надзея штурханула Аўгуста-Рыгора, адарвала ад лесу, да якога ён быў нібыта прыкуты і жалем, і роспаччу, і страхам. Таму што ён чалавек, а не звер, хоць і звер мае ўнутры страх.

Ён пабег напрасткі па полі, штомоцы сціскаючы ў руцэ гарачую ручку пісталета. Мо яшчэ не зусім гэта разумеў, але яму вельмі патрэбна было, каб хлопцы ўбачылі яго, пачулі голас свайго камандзіра, каб не думалі, што ён прадаў іх, як Юда за трыццаць сярэбранікаў. «Божа, памажы мне, дай мне сілу, дай»,— крычала яго душа, і слёзы цяклі па твары. З гасцінца Аўгуст-Рыгор спусціўся да лужка, парослага рэдкай і кволай альшынай, хоць тут і балацявіна, а там-сям і дрыгва, але гэткай дарогай ён раней за калону выскачыць да скрыжавання, на якім стаіць старадаўні чорны крыж. Так яно і атрымалася: ён намнога апярэдзіў сваіх хлопцаў, іх панылы спеў быў чуцен яшчэ на старым Міхалінскім шляху, а гэта не менш як з паўвярсты. Аднак, калі Аўгуст-Рыгор выбіўся з зараснікаў і балота да скрыжавання дарог, яго ахапіў такі адчай, што пацямнела уваччу, і ён падумаў, што зараз звар'яцее. Ля чорнага крыжа гарцавала на мышастых конях недзе з паўэскадрона драгун, яны, пэўна, бачылі палонных з канвоем і чакалі іх. Што цяпер ён з пісталетам і нажом? — толькі застрэліць сябе ці перарэзаць горла. «О, божа! — застагнаў Аўгуст-Рыгор.— Навошта ты даў мне сон? Навошта? Каб загінулі мае сябры на шыбеніцы? О, пракляцце!» І, знясілены, у бяспамяцтве ўпаў ён на зямлю, а хутка міма яго ішлі інсургенты сваёй апошняй дарогай, у канцы якой рыпелі пад ветрам змайстраваныя для атрада Шатыкі шыбеніцы.

4

Людзям было весела, яны спявалі, гулялі на вуліцах свайго прыгожага горада, танцавалі. Радаваліся жыццю, і, здавалася, яно бясконцае і заўсёды будзе незвычайным і шчаслівым. Калі чалавек хоць раз у год шчаслівы, тады ён забывае пра сумоту, няшчасці, гора.

Дні стаялі цёплыя, сонечныя і прыгожыя, нібы толькі што нарадзіліся. Чыста-зялёнае лісце дрэў, незамутнёнае неба. Гэтак хораша, мусіць, бывае аднойчы, кож-

ны год адметны нечым сваім, і таму падобных гадоў не можа быць. Пройдуць стагоддзі і нават тысячагоддзі, але нічога кропля ў кроплю не будзе. Хоць так не было...

Аднак раніцай людзі, здавалася, занадта прыцішаныя, насцярожаныя і напалоханыя. Ужо гэтак пасля падумае Аляксеевіч і пачне цаглінка да цаглінкі дабудоўваць у сваёй свядомасці асобныя дэталі, дробязі, каб стварыць карціну падзей, якія сталі яму вядомыя.

Ён прыехаў на работу амаль на паўгадзіны раней, не пераапранаючыся ў спяцоўку, прысеў на ганак вагончыка. Адсюль відаць праз адчыненыя вароты прыпынак аўтобуса. Вось спыніўся адзін, з яго выйшла багата людзей. Сярод натоўпу ўбачыў Аўгуста, які тупаў няспешна. На правым плячы ён трымаў сінюю спартыўную сумку. Яна была з ім амаль штодня, няйнакш прывык да яе.

Здаля прыкмеціў Аўгуст Аляксеевіча таксама і паскорыў хаду, лёгка пераскочыў лужыну ў варотах і праз якую хвіліну прысеў побач. Твар у хлопца быў узбуджаны, вочы глядзелі трывожна. Відаць было, што яму дужа хацелася выказацца, і ён маўчаў нядоўга.

— Ці чулі, Аляксеевіч? — спытаў ён.— Кажуць, нават у праграме «Час» вечарам перадавалі...

— Не глядзеў вечарам тэлевізар. А што такое?

— Дый я не глядзеў. У аўтобусе пачуў, як мужчыны гаварылі... Нібыта здарылася нейкая аварыя на атамнай станцыі і дзесь амаль на Беларусі ці на мяжы з Украінай. Чарнобыль называлі...

— Я нічога не чуў,— нервовая ўзбуджанасць Аўгуста пачала перадавацца і Аляксеевічу. Ён адчуў нейкі цяжар у душы, і адразу з вачэй нібы зніклі фарбы гэтай сонечнай і прыгожай раніцы. Што такое атамныя станцыі — яму не трэба расказваць, бо не раз быў на іх, ездзіў ён у камандзіроўку летась і ў Чарнобыль. Помніў горад сучасны і зялёны, станцыю, бо нават заходзіў у памяшканне другога рэактара. Тады яго пераконвалі тамтэйшыя электрыкі ў стопрацэнтнай надзейнасці станцыі, а ён хоць і сумняваўся заўсёды ў праўдзівасці гэткіх заяў, бо бачыў на сваім вяку ўжо шмат чаго, аднак урэшце паверыў, што атамная станцыя надзейная. І тое, што сказаў Аўгуст, ускалыхнула ў памяці сумненні, якія былі тады ў ягонай душы. Канешне, аварыя магла быць, але ж, магчыма, яна дробязная. І Аляксеевіч вымавіў з дакорам:

— Аварыя, аварыя... Мо якая драбяза. У нашай справе электрычнай усё бывае, але гэта, як звычайна, нічога страшнага. Ты, мусіць, ноччу нешта сасніў, што ажно на работу напужаны прыбег...

— Чаму я напужаны,— зазлаваў Аўгуст.— Кажу тое, што чуў сваімі вушамі.

— Э, знаем у аўтобусе багата пра што гавораць. Калі паслухаеш, дык так страшна робіцца, што хоць адразу пятлю на галаву. Бо ўсё роўна кранты.

— Ладна,— не згаджаўся з Аляксеевічам Аўгуст.— Унь Ілья Ільіч Ярыга, начальнік упраўлення. Яго і спытаем.

Сапраўды, на двор заехала «Волга», і з яе вылез начальнік будаўнічага ўпраўлення, з якім Аляксеевіч так і не спаткаўся за мінулы тыдзень.

Калі Ярыга падышоў да іх, узняліся з ганка, усё-ткі начальства трэба паважаць. Ен пацісную абодвум рукі, але нічога не гаварыў. Моўчкі закурыў, накіраваўся да дома, зазірнуў унутр праз акно, у якім была разбітая шыбіна.

— Ну што, будзем канчаць,— ці то спытаў, ці то катэгарычна прамовіў Ярыга. Ен вярнуўся да вагончыка.— Як настрой, салдат?— звярнуўся да Аўгуста, і той ажно вырачыў ад здзіўлення вочы: адкуль даведаўся, што ён нядаўна з арміі. Калі афармляўся на работу, з ім Ярыга не размаўляў, і ніколі яны дагэтуль не бачыліся.

— Нічога, план выконваем,— сказаў Аўгуст, а ў сярэдзіны засвярбела: як бы спытацца, хоць і няёмка. Аднак усё-такі рашыўся і проста выпаліў: — А як там у Чарнобылі?..

У Ярыгі падняліся ўгору бровы, твар адразу стаў афіцыйна-чыноўніцкі, як у вайсковага старшыны перад строем маладых салдат. Ен, здалося, вывучаў Аўгуста, потым перавёў позірк на Аляксеевіча і гідліва-здзекліва перасмыкнуў плячыма, разводзячы рукамі.

— Ну што ты скажаш... Вы б, Аляксеевіч, хоць бы на маладых уплывалі, выхоўвалі. Пачулі, што недзе адна баба сказала, і ўжо аварыя, аварыя... Не трэба, дарагі таварыш, разносіць плётак. Прыслужваць імперыялістам... Яны і без вас нас ачарняць...

— Ды я што, ды я...— разгубіўся ад такога павароту Аўгуст.— Ды... ужо, кажуць, што па праграме «Час» перадавалі. Пры чым тут імперыялісты?

— Па праграме «Час», па праграме «Час». Ну і што. Але было сказана, што гэта дробязь. Вы зразумелі? Як ваша прозвішча?

— Рудаміна.

— Таварыш Рудаміна. Між іншым, я яшчэ пакуль называю цябе таварыш... Так што май на ўвазе.

Памалу збіраліся рабочыя ля вагончыка, убачыўшы начальніка ўпраўлення, запыняліся, слухалі. І Ярыга, відаць, вырашыў скончыць размову, запрасіў Аляксеевіча сесці да яго ў «Волгу». Але іх ужо акружыў натоўп рабочых. Нехта, Аўгусту здалося, што з сантэхнікаў, гучна запытаўся:

— Усё-такі, Ілья Ільіч, што з Чарнобылем? Была ж заява па тэлебачанні? Мо што яшчэ ведаеце, якая-небудзь ёсць адтуль інфармацыя.

— Мне не дакладвалі,— буркнуў Ярыга.— Ведаю тое, што і вы. Нейкая дробязная аварыя.

— Але ж, не надта, перадалі б па тэлевізары, калі была дробязная. Нашы тады ўжо кажуць, калі болей не схаваеш. Усё роўна тыя з-за бугра перакажуць. От, сабакі, усё ведаюць жа аднекуль.

— Гэта не вашага розуму справа,— рэзка перапыніў рабочага Ярыга.— Такія размовы толькі на руку ворагу.

— Ага, ага, толькі ворагу і патрэбны нашы размовы,— зарагаталі ў натоўпе.— Нешта вы, Ілья Ільіч, не дагаворваеце. Пэўна ж, знаеце, не хочаце сказаць. Мы ж людзі цяпер граматныя, ведаем, што ета атамная станцыя і з чым яе ядуць. Ужо людзі кажуць, што яна ўзарвалася.

— Людзі кажуць, людзі кажуць,— рэзка загаварыў Ярыга.— Вы чулі ў заяве, што нічога сур'ёзнага.

— Чулі, чулі, усяго мы ўжо чулі...

— Сядайце, Кемчык, у машыну і паехалі. Не хвалюйцеся, таварышы. Нам галоўнае — здаць дом па плане, астатняе не датычыць нас.

Калі запрашае начальнік упраўлення, дык трэба слухацца. Аляксеевіч аддаў ключы ад бакоўкі Аўгусту і сеў у машыну на задняе сядзенне. Ярыга прымасціўся побач і ўсё хмыкаў, хмыкаў абурана.

— Ну і людзі, ну і людзі! Зусім ужо дайшлі да ручкі,—нібыта шукаючы падтрымкі ў Аляксеевіча, гаварыў ён і раззлавана ляпаў далонёй сябе па калене. Аляксеевіч не адгукаўся, хоць і дужа свярбела

выказаць сваю думку. Вырашыў пакуль змоўчаць, невядома, навошта спатрэбіўся начальніку ўпраўлення. Ён, канечне, шмат пра што мог выказацца Ярыгу і гэтак зрабіць некалі, толькі ці зменіцца што на будоўлі? Не раз ужо гаварыў і на партсходах, і проста так у вочы. І ўсе згаджаліся з ім, ніхто не быў супраць, толькі ўсё як было, так і засталося. Аляксеевіч яшчэ чакаў, ці папросіць прабачэння Ярыга за тое марнае яго бадзянне па ўпраўленні.

— Антон Аляксеевіч, у мяне канфідэнцыяльная размова да вас,— сказаў Ярыга.— Хацелася б, каб яна засталася між намі. Што там у вас за такое здарэнне было, крадзеж нейкіх дакументаў?

«Няўжо не знае, якіх дакументаў?» — падумаў Аляксеевіч.

— Укралі акты праверак народным кантролем будаўніцтва дома.

— І гэта ўсё,— пасміхнуўся Ярыга.— Тады нічога, новыя зробіце.

— Не ўсё. Там былі важныя матэрыялы, мы знайшлі злоўжыванні... Я сабраўся ісці ў міліцыю, хоць і начальнік участка адгаворвае.

— І правільна робіць,— нібыта ўзрадаваўся Ярыга, пагладзіў Аляксеевіча па плячы рукой.— Я хачу таксама папрасіць, каб нікуды не заяўлялі. Ну навошта гэта нам. Самім трэба разабрацца ва ўсім. Давайце вартаўніка пакараем, які недагледзеў, як лезлі зладзеі ў вагончык. З міліцыяй лепш не звязвацца. Я згодзен, што нехта зацікаўлены, каб вашы акты былі не абнародаваны, і мо ён і ўкраў. Але што з гэтага. Вам трэба яшчэ раз праверыць, дый не апошнім днём жывём. Антон Аляксеевіч, не трэба выносіць смецце... У нас здаровы калектыў, баявая партарганізацыя. Што мы самі без міліцыі не разбяромся ва ўсім гэтым? Дый справа дробязная...

— Як тут сказаць,— зніякавеў ад такога націску Аляксеевіч.— Але ж...

— Ну вось, я бачу, што згодны з маімі аргументамі.

— А навошта нам баяцца міліцыі, калі мы ні ў чым не вінаватыя?

— Вы ж разумны чалавек і столькі гадоў на будоўлі. Што-небудзь можна заўсёды тут знайсці. І адступленні ад праекта, і перарасход матэрыялаў, і нехта з рабочых

возьме з сабой паўлітэрку фарбы альбо дошку. Гэта ўсё незаконна, але ж я не магу ўсачыць за кожным маляром, як ён налівае фарбу ў бутэльку, хавае яе ў кішэню. Правільна, рабіце, таварышы народныя кантралёры, рэйды, рабіце. Я заўсёды падтрымаю вас, каб не было гэтых несуноў, якія па цвічку, па дошчачцы расцягваюць матэрыялы.

— Добра, калі вы супраць таго, каб я заявіў у міліцыю пра крадзеж дакументаў групы народнага кантролю, тады трэба сказаць у райкоме партыі і раённым камітэце народнага кантролю,— Аляксеевіч спакойна глядзеў на Ярыгу і думаў, чаму ён гэтак устрывожыўся. Каб смецце не выносіць са сваёй хаты — гэта зразумела, але, можа, тут штось іншае...

Яны ездзілі на машыне па горадзе, нідзе не спыняючыся. Няйнакш начальнік упраўлення хацеў весці гэту размову з вока на вока, без сведкаў. Аднак ні да чаго не дамовіўшыся, праехалі па кальцавой, потым завярнулі да будаўнічай пляцоўкі. Метраў за сто ад яе Ярыга высадзіў з машыны Аляксеевіча.

— Усё-такі спадзяюся, што зразумееце мяне,— паўтарыў ён яшчэ раз. Аляксеевіч нічога не адказаў, таму што цяпер канчаткова ўпэўніўся — трэба было ўжо заявіць аб крадзяжы калі не ў міліцыю, дык у раённы камітэт народнага кантролю.

— Будзе вельмі шкада, калі вы не паслухаеце мяне,— пачуў Аляксеевіч апошнія словы Ярыгі.

Машына пыхнула сівым смярдзючым дымам і ад'ехала, пакінуўшы яго аднаго са сваімі думкамі, якіх пасля гэтай сустрэчы была паўнюткая галава. «А прабачэння так і не папрасіў за той дзень...» — крыўдліва падумаў пра Ярыгу Аляксеевіч.

Пераапрануўшыся ў вагончыку, дзе ўжо нікога не было, ён набраў выключальнікаў і разетак у скрынку, накшталт тых, што ў цесляроў, некалі зрабіў яе сам, з ручкай, даволі пляскатую, каб не замінала пры хадзе. Аўгуста знайшоў на трэцім паверсе ў кампаніі сантэхнікаў, якія перакурвалі і зноў гаманілі пра Чарнобыль. Мусіць, яшчэ і не браліся за работу.

— Усё курыце,— спыніўся ля іх Аляксеевіч,— сонца ўжо дзе... Пайшлі, Аўгуст, а то і з цябе гэтыя туалетныя работнікі выхаваюць абібока. Пайшлі...

— Навошта крыўдзіш, ай, кепска кажаш,— сказаў Васіль Рыжутка, адных гадоў з Аляксеевічам сантэх-

нік, але дужа сівы, з маршчыністым тварам і таму па выглядзе намнога старэйшы, падхапіўся з падлогі, на якой сядзеў, падаслаўшы пад сябе газету, і камандаваў, хоць і не быў брыгадзірам: — Айда, хлопцы, на работу. Чарнобыль Чарнобылем, а на хлеб зарабляць трэба.

Аляксеевіч з Аўгустам узняліся на дзевяты паверх, вырашылі адтуль пачынаць сёння сваю работу. У Аўгуста таксама ў руках была скрынка з выключальнікамі і інструментам. Хвілін дзесяць працавалі моўчкі. Аўгусту трапіў выключальнік, якога ніяк не мог замацаваць, штосьці не трымаўся ў гняздзе, ужо хацеў зняць яго зусім і выкінуць, як брак. Падышоў Аляксеевіч, паглядзеў, паглядзеў, як нервуецца Аўгуст, лёгенька адштурхнуў убок, туды-сюды пацягнуў выключальнік, крыху разагнуў ягоныя лапкі, адвёрткай пакруціў вінцікі і — гатова. Моцна трымаецца выключальнік у гняздзе, не вырвеш.

— Вось так, спакойна...— Аляксеевіч падхапіў з падлогі сваю скрынку, патупаў у суседні пакой, у дзвярах як між іншым: — Ты не надта глядзі на гэтых сантэхнікаў. У кожнага свая дарога...

— Я не гляджу. Проста гаварылі ўсё пра гэты Чарнобыль. Нібыта быў там узрыў. Усе вакол аж да Мінска радыёлакацыйныя станцыі вывела са строю. І што радыяцыя ў Мінску ёсць.

— Кінь гэта глупства. Чаму ж не адчуваем?

— Мо і глупства, але як падумаю, што ад маёй вёскі, дзе бацькі і сястра з дзецьмі, недалёка ён, дык і рознае ў галаву лезе, слухаеш, што кажуць.

— А гэта ад таго, што слухаеш. Чуў, што гаманіў Ярыга. І правільна: навошта плёткі разносіць, калі яшчэ нічога невядома. От, халтура...— Аляксеевіч разабраў выключальнік, зноў сабраў, але той усё роўна не шчоўкаў.— Халтура. Калі ўжо навучацца добрыя рэчы рабіць. Мо навучыць іх цяперка дзяржпрыёмка. Якое тут чысло. Месяц назад зроблены ўжо, мусіць, і дзяржпрыёмка была.

— Чаго прыязджаў Ярыга? — па Аўгусту відаць, што хацеў пра гэта спытацца адразу, як Аляксеевіч вярнуўся, але чакаў зручнага моманту, выхаваны хлопец.— Ці не па той справе?

— Па той..— адказаў Аляксеевіч.— Па той, браце... Не хоча, каб мы заяўлялі пра крадзеж у міліцыю.

— А мо ён сам і ўкраў? — выпаліў з бліскучымі ад здагадкі вачыма Аўгуст.— Цяпер баіцца. Ці не можа гэтак быць?

— Навошта гэта яму. Не, наўрад...— запярэчыў Аляксеевіч, хоць, канечне ж, такая думка была і ў яго.— Не думаю.

— А што гэта ён затурбаваўся. Няйнакш напалохаўся?!

— Знаеш, не магу так сказаць, не магу. Ты вінцік не цісні, а лёгка закручвай. Тут трэба не сілай, а розумам. Адпусці лапкі ў выключальніка, каб яны свабодна ўваходзілі ў гняздо, тады круці.

Перайшоўшы ў суседнюю кватэру, яны ўбачылі маляроў, якія гэтак жа, як і сантэхнікі, абмяркоўвалі паведамленне аб аварыі на атамнай станцыі. Толькі па-жаночы больш эмацыянальна і гучна, са слязьмі і смехам. На электрыкаў амаль ніхто і не глянуў спераша, ва ўсіх адабрала ўвагу аварыя. Хацеў Аляксеевіч перапыніць іх гаворку, супакоіць жанчын, але, трохі паслухаўшы, палічыў за лепшае не ўмешвацца. Пацягнуў за сабой Аўгуста, маўляў, пайшлі далей.

К абеду яны пачулі ўжо, што радыяцыя ёсць у Мінску і трэба як хутчэй піць ёд і даваць дзецям. Што дзяцей нельга выпускаць на вуліцу. Страх памалу ўцягваў у сваю сетку ўсё больш людзей, і Аляксеевіч таксама адчуў сябе не надта ўпэўнена. Насцярожвала, што ніхто з кіраўніцтва нічога не гаварыў, і з радыёпрыёмніка, які вісеў на першым паверсе дома, ляцелі вясёлыя песні, грымелі маршы.

У абед, а хто і раней, амаль усе жанчыны пабеглі ў аптэкі, дзеля цікавасці падаліся і некаторыя мужчыны. Галоўнае — нічога не было ні відаць, ні чуваць. Радыяцыя — гэта не гарматы і самалёты, як у вайну, гэты вораг нябачны. І Аляксеевіч трохі разгубіўся, нават падумаў, ці не пазваніць у райком партыі. Няхай нешта скажуць, трэба ж ведаць праўду.

З горада людзі вярталіся з поўнымі сумкамі і кішэнямі ёду, ад іх стала вядома, што ў аптэках велізарныя чэргі і ўжо прадаюць толькі па адной бутэлечцы ёду. Нібыта самі аптэкары раяць на шклянку вады пяць-шэсць кропляў. Работа амаль спынілася. Людзі, сабраўшыся групамі, устрывожана зноў і зноў гаварылі пра радыяцыю. І тады Аляксеевіч пазваніў у райком партыі па тэлефоне, які запісаў, калі быў сакратаром

цэхавай партарганізацыі. Здаецца, гэта нумар арганізацыйнага аддзела. Назваўшыся, Алексеевіч папрасіў, каб яму растлумачылі, што ў сапраўднасці адбываецца ў горадзе. У трубцы спярша маўчалі, пасля загадалі пачакаць. Чакаў даўгавата ці мо гэтак здалося, потым той жа голас, прывыклы загадваць, спытаў:

— Што вам трэба?

— Я хачу даведацца, бо...

— Бо, бо!.. Не распаўсюджвайце плёткі, бо прыцягнем да партыйнай адказнасці. І так, думаю, неабходна вас пакараць.

— Вельмі нават ясна,— толькі і сказаў Аляксеевіч.

## 5

Назаўтра Анжэла, наўздзіў бацькам, таму што вельмі не любіла без дай прычыны некуды ісці, сама прапанавала Бартушу паказаць горад. Найлепш было б паляжаць яшчэ ў ложку, той нешта кепска сябе адчуваў, мо толькі пад раніцу заснуў. Аднак гаспадары спяшаліся на работу, і яму нічога не заставалася, як паснедаць і пайсці з маладой і сімпатычнай дзяўчынай знаёміцца з Мінскам, з якога амаль дваццаць гадоў назад уцякаў ад міліцыі. Ён абакраў маленькі задрыпаны магазінчык на ўскрайку горада, у ім, надзіва, была не здадзена каса. Узяў яе і ўцякаў, але далёка не ўцёк. Яго ўзялі ў цягніку пад Оршай, калі ён засынаў у мяккім купэ. Успамінаць пра гэта, як і пра ўсё мінулае жыццё, было цяжка і непрыемна. Здавалася, быў нехта іншы чалавек, толькі ў яго было такое ж прозвішча.

Бартуш, як кажуць, адным вухам слухаў Анжэлу, якая рабіла ўсё, каб госцю не было сумна. «Навошта гэта, навошта»,— думаў ён, сустракаючы вачыма яе, здавалася, нейкі сабачы, ліслівы позірк. Анжэла штосьці расказвала пра гісторыю Мінска, і ён бесцырымонна перапыніў яе сваім пытаннем:

— Калі ж быў заснаваны горад? У якім годзе?

Ён спытаўся проста так, абы сказаць і каб спыніць Анжэлу, не прывык ён да такога непрыкрытага падхалімажу і ўгодлівасці. «Давай, вось так, без лішніх слоў пройдземся. У мяне ў самаго ёсць вочы, дый пра Мінск я больш за цябе ведаю...»

— Дык у якім годзе? — другі раз пытацца не варта было, таму што Анжэла пачырванела і ішла, апусціўшы галаву. Аднак гэтая дзяўчына няблага валодала сабой. Ніякавата адчувала сябе нядоўга, шчыра прызналася:

— Не ведаю... Але ж ці гэта важна?.. Наша гістарычная адукацыя дужа слабая. На жаль...

— І я так думаю, што на жаль. Некаму гэта, мусіць, выгадна. Толькі вось каму, не магу зразумець.

— А чаму, Радзімір, у вас так мала напісана пра каханне. Толькі некалькі старонак у дзвюх кнігах.

— Лічу, што пра каханне і без мяне шмат напісалі. Не хачу.

— Але ж усе людзі любяць чытаць тыя кнігі, у якіх пра каханне. Асабліва — жанчыны. Свет нейкі жорсткі, неміласэрны і ўсім, мусіць, не хапае пяшчоты, ласкі і кахання.

— Вы разважаеце, як старая, прабачце, як жанчына, якая ведае толк у жыцці. Самавыхаванне?

— Я ж не ў ізаляцыі. Дый мне ўжо за дваццаць. Трэці курс універсітэта.

— Ну, канечне, канечне, вы ўжо шмат ведаеце і маеце сваю ўласную думку на жыццё.

— Маю, а як жа ж. Кожнаму чалавеку, нават сямігадоваму дзіцяці, варта мець уласную думку. Тады ён вырасце чалавекам, здольным браць на сябе адказнасць, не палохацца цяжкасцей.

— Вы, Анжэла, загаварылі мовай нашых газет.

— Нічога дзіўнага, я іх чытаю... А вось гэта былы касцёл, а цяпер рэспубліканскі Дом кіно. Туды можна трапіць па блату. А гэта Дом урада...

— Дарагая Анжэла, у Мінску я жыў амаль пяць гадоў і ведаю горад мо не горш за вас. Прабачце, што не сказаў адразу.

— Ну што ж, тым лепш. Толькі што мне паказваць і расказваць паважанаму таварышу пісьменніку?

— Нічога не трэба.

— Мне трэба выконваць загад мамы.

Ад Дома ўрада яны павярнулі на плошчу Мяснікова і адтуль паціху пацягнуліся да Нямігі. Бартуш раптам падумаў, як пагаварыць з Анжэлай, каб толькі не пакрыўдзілася, што няхай яна ідзе куды ёй трэба, а ён ужо сам паблукае па горадзе. Навошта яму спадарожнікі, калі ён хоча пабыць адзін. Хоча, але ўвесь час з ім нехта ёсць і не хапае нахабства адмовіць людзям

у жаданні быць яму карысным. Ну навошта? І блытаніна ў галаве, думкі заблыталіся і ад гэтага нейкая злосць нарастае ў душы. Абрыдла ўжо расказваць, што некалі быў злодзеем і глядзяць на яго, як на дзівака, і ўсё — ах, вох. Лепш бы ахалі і вохалі, калі паважаны нібыта чалавек робіцца злодзеем. Дый ён не робіцца, ён увесь час у душы злодзей, проста баіцца, што схопяць за руку. Ахаюць і вохаюць, але самі дазволілі яму ўкрасці. Самі...

— Знаеце што... Я прыдумала,— б'е ў ладкі Анжэла, і ў яе на твары такая радасць, проста шчасце. Нібыта выходзіць замуж, зласнавата думаў пра яе Бартуш.— Я пазнаёмлю вас, Радзімір, з чалавекам, які будзе вам вельмі і вельмі цікавы. Як пісьменніку. Тут недалёка. Можам пад'ехаць два прыпынкі на аўтобусе альбо пехам прайсці, калі не стаміліся.

— Не стаміўся. Яшчэ крыху сілы ёсцека,— кажа Бартуш.

Анжэла бярэ яго пад ручку, і, паскорыўшы крок, шыбуюць па задымленай і шумнай ад плоймы машын Нямізе. Сіноптыкі зноў памыліліся, і ў плашчы горача, ён замінае хадзе. Бартуш думае, што дарэмна траціць дарагі час, і злуе, што цяпер не за сталом, дзве-тры старонкі да абеду напісаў бы, а праз паўгода трэба здаць у выдавецтва кнігу, інакш яе выкінуць з плана. Раздражнёнасць расце ў душы, ён ледзь стрымліваецца, каб не сказаць што-небудзь непрыемнае гэтай дзяўчыне. Хоць і разумее, што несправядлівы да яе, няўдзячны за дабрыню. Калі па шчырасці, дык не так ужо ён і абласканы ўвагай як пісьменнік. Трошкі пагаварылі пасля першай кніжкі, сенсацыйнай тым, што аўтар былы злодзей, адамкнуў абывацелю цёмную старонку, пра якую шмат кажуць, але не паказваюць. А ён узяў і паказаў. Каб трохі пазней здаў кніжку, наўрад ці надрукавалі б. Яму пашанцавала, што гэта былі гады пачатковага развянчання культу асобы Сталіна. Тады друкаваліся творы, ад якіх потым яшчэ доўга не маглі супакоіцца. Пра ягоную кніжку таксама шумелі ў друку, быў пастаўлены фільм. Здаецца, зусім нядаўна гэта паштальён яму штодня насіў дзесяткі пісьмаў. На некаторыя ён адказваў, іншыя толькі чытаў, дзівячыся з чалавечай прымітыўнасці — думаюць, варта апісаць, як сядзелі ў турме, і пісьменнікі ўжо; памалу гэтая навала пісьмаў прайшла, і цяпер зрэдзь мо раз-

другі ў год чакаў у паштовай скрынцы канверт з невядомым адрасам. Ліст ад Нілы Восіпаўны быў адзіны за ўвесь год, мо таму Бартуш хутка адказаў і падтрымліваў перапіску, не думаючы аб значэнні яе.

Анжэла не ўтрымалася, усё-ткі скінула плашч і несла яго на руцэ. Варта было прызнаць, канечне, што яна сімпатычная дзяўчына, мо нават прыгожая. Хоць у гэткім узросце амаль усе маладыя дзяўчаты здаюцца прыгажунямі. Пакуль не пачнуць злоўжываць касметыкай і яшчэ чым-небудзь іншым... Хоць бы курэннем, віном дый гулямі. Гулі, гулі...

«І куды я іду, і навошта. Адчуваю, закіпае ў жылах дурная кроў, нібыта зноў іду красці. Чорт, што гэта за настрой. Мо ад таго, што побач маладая...»

У гэтым месцы, куды яны накіраваліся, Бартуш ніколі не быў, не паспеў. Пэўна, на сваё шчасце. Ён ужо хацеў спытацца, ці доўга яшчэ тупаць. Сонца неміласэрна смаліла, вымушаючы стомленае цела адпачыць, пратэставала супраць дарогі, якая невядома калі скончыцца. «Што вы ад мяне хочаце?..» — неяк умольна ў думках спытаўся ён у Анжэлы, Нілы Восіпаўны. Ён не можа выцягнуць іхняга Мірыка з калоніі і не параіць, як не быць злодзеем, бо гэта проста немагчыма зрабіць. Усё ў руках у чалавека, у ягонай душы, у сэрцы, якое найважнейшы дарадца і кансультант. Што ён сказаў бы гэтаму зэку, спаткаўшыся з ім, ну што? Канечне ж, тое самае, што некалі ўжо гаварыў, як быў яшчэ ў зеніце сваёй недаўгавечнай славы ці вядомасці. Тады з газеты яму пераслалі ліст ад зэка аднекуль з Пермскай вобласці з просьбай даць адказ. Ён чытаў і пляваўся: у кожным радку слёзы і крык, каб дапамаглі выбрацца з турмы. Барташ напісаў злоснае пісьмо, маўляў, не трэба хлімкаць, ліць кракадзілавы слёзы, а сваёй работай дамагчыся свабоды. Ніводзін пісьменнік не пойдзе прасіць пракурора, каб вызвалілі з турмы злодзея, і не скажа, што гарантуе яго надзейнасць для грамадства. Лухта, смешна! Праз месяц газета надрукавала гэты адказ, але ў ім Бартуш не знайшоў ніводнага свайго радка, былі чужыя пустыя барабанныя словы, ад якіх патыхала такой казёншчынай, што ён у адчаі схапіўся за галаву. Зганьбілі яго імя, зрабілі марыянеткай, ды ён ніколі ў жыцці не сказаў бы так. Ён адразу пазваніў у рэдакцыю, з некім лаяўся, шукаў таго, хто стаў яго сааўтарам, аднак нічога не вы-

светліў. Яго супакойвалі, раілі не браць блізка да сэрца, а ўрэшце паставілі кропку — ён сам напісаў палітычна няграматна. Бартуш больш ужо не слухаў, кінуў трубку. А калі да яго зайшоў (набраўся нахабства) карэспандэнт, каб растлумачыць пазіцыю газеты, выгнаў з кватэры.

Яму непатрэбны чужыя думкі і словы, заўсёды хапала сваіх. І жыў заўсёды сваім розумам. І ніхто сваёй волі яму не навяжа.

— Дык што, дзе мы нарэшце прыпынімся? — і так дастаткова слухаўся гэтую птушачку, час паказаць ужо характар. Бартуш вылічыў, што, калі не спыняцца насупраць дзевяціпавярховага дома з магазінам унізе, тады ён паверне назад.

— Яшчэ дзесяць метраў і — на ліфце на пяты паверх,— ад нейкай незразумелай радасці ажно цвіла Анжэла, і голас у яе стаў больш ласкавы, мякчэйшы.

— Спадзяюся, мы ненадоўга? — спытаўся ён, хоць і разумеў, што гэта не дужа тактоўна.

— Як вам спадабаецца,— Анжэла глядзела яму проста ў вочы.

Увайшоўшы ў цёмны пад'езд даўжэзнага дома, яны на ліфце пад'ехалі трохі ўгору і апынуліся ў прасторным жаўтлявым ад кволай лямпачкі калідоры. Анжэла, не звонячы, адразу адчыніла дзверы ў кватэру, якая была побач з лесвічнай пляцоўкай. Гэта заўважыў Бартуш, але не здзівіўся, бо прывык у жыцці да самага неверагоднага, хоць цяпер нічога асаблівага не было.

Іх, мусіць, пачулі, бо ў пакоі за шклянымі дзвярыма нехта закашляўся, нечым стукнуў.

— Хто там? — спытаўся малады звонкі голас.

— Гэта я! — гучна азвалася Анжэла.— Прывяла да цябе госця, каб не было сумна.

— Запрашаю, калі ласка. Заходзьце...

Відаць, Анжэла была тут не раз, таму што, скінуўшы туфлі, дастала з шафкі пантофлі сабе і Бартушу. Перад невялічкім люстэркам паправіла валасы, падфарбавала вусны, хоць ёй не варта было гэтага рабіць: вусны ў яе былі яшчэ яркія, пунсовыя. Здаецца, пратэставалі супраць памады.

Бартуш трохі затрымаўся, пакуль марудна здымаў плашч, туфлі. І зайшоў у пакой, калі Анжэла ўжо была там. Яна цалавала ў шчаку чарнявага бледнаватага хлопца, які сядзеў на ложку ў чырвонай кашулі, пры-

крыўшы ногі прасцінаю. У яго быў высокі з залысінамі гладкі лоб, вочы зялёныя, здаецца, ажно свяціліся.

— Міша, гэта пісьменнік Радзімір Бартуш,— сказала Анжэла,— пазнаёмся, калі ласка.

Хлопец падаў руку, бледную, вялую, і Бартуш пацiснуў яе, слабую і бездапаможную. Здзівіў позірк гэтага Мішы, нейкі прагны і ўмольны, бы хлопец нешта хацеў папрасіць і баяўся, што яму адмовяць. Па нездаровай бледнасці твару праступілі чырвоныя плямы, усё роўна як іх нехта намаляваў. У думках, ажно сам унутрана здрыгануўшыся, Бартуш параўнаў з маскай акцёраў тэатра пантамімы. Нядобра падумаў пра няшчаснага, абязножанага чалавека, але гэта адбылося ў яго міжволі, і хлопец выклікаў толькі спачуванне і жаль. Толькі не мог Бартуш даўмецца, навошта Анжэла прывяла сюды яго, каб нечым здзівіць, дык ён у жыцці бачыў розных людзей: і страшэнна хворых, і асілкаў. Каб паспачуваў хлопцу і падняў яму дух? — дык тое, што скажа некалькі слоў, агульных і няшчырых... Толькі чаму ён адзін у гэтай кватэры, нехта ж, мабыць, жыве з ім?

Пакой быў прасторны, тут, акрамя ложка, стала і двух крэслаў, больш нічога не было. На сценах вісела некалькі карцін, без рамак, здалося, напісаных неахайна, груба. Бартуш прыгледзеўся да адной, што была ля акна. Гэтая карціна была невялікая, мо трохі большая за паштоўку. На ёй намалявана дзяўчынка, якая танцуе ў кветках, нібыта лётае над імі. Дзве кветкі ў яе валасах. Твар у дзяўчынкі вельмі шчаслівы, і нібыта губы варушацца, спяваючы песню, мелодыя якой адчуваецца ў бляску вачэй, імклівасці руху, у самім наваколлі, створаным пэндзлем мастака. «На каго ж яна падобная?» — натужліва думаў Бартуш і, перавёўшы пагляд на Анжэлу, зразумеў, што гэта яна танцуе сярод кветак. Ён стаў пытацца, хто мастак, хто аўтар карціны, бо раптам здагадка, і чамусьці раўнівая, узнікла ў яго. Няўжо гэта Міша? Але ж у яго слабыя рукі, якія наўрад ці ўтрымаюць нават пэндзаль.

Сарамлівая ўсмешка на вуснах была нібы намалявана і не знікала ўвесь час, пакуль Бартуш быў у кватэры. Міша амаль не размаўляў, ён, здалося, прагна слухаў. Асабліва калі гаварыла Анжэла.

— Міша мастак, ён вельмі таленавіты мастак. Гляньце, Радзімір, якія ў яго карціны. Колькі ў іх апты-

мізму, мужнасці, які цудоўны аптымістычны настрой. Гляньце, калі ласка, вось на гэтую карціну,— яна ўхапіла Бартуша за рукаў і пацягнула да напісанага сакавітымі зялёнымі і блакітнымі фарбамі пейзажа, які сапраўды, быў зроблены таленавіта, хоць за тымі ж элементамі неахайнасці, што і на іншых карцінах.— Ён штодзень працуе, хоць гэта і нялёгка. Сябры зрабілі яму спецыяльнае прыстасаванне, з дапамогай якога трымае пэндзаль, аловак,— яна сакатала, сакатала, а на твары хлопца цьмяная ўсмешка.

— Ну што ты, Анжэла, усё пра мяне,— зноў нечакана звонка прагучаў голас.— Лепш раскажыце пра сябе, што робіцца на вуліцы, у свеце.

Аднак Анжэла ўсё роўна гаварыла пра карціны, іх было шмат. Яна прымусіла Бартуша пайсці ў суседні пакой, у якім, бы ў мастацкім музеі, на ўсіх сценах віселі карціны, таксама не ў рамках. Тут былі і пейзажы, і партрэты, і нацюрморты, некаторыя прымітыўныя па сюжэце і кампазіцыі, нават няўдалыя, але былі і таленавітыя работы, дый, урэшце, на ўсіх малюнках адчувалася рука неардынарнага мастака. Не хапала ў гэтым карцінах прафесійнага. Яны ўразілі Бартуша, і, мо нават не карціны, а дух, паўнакроўнасць жыцця, створанага мастаком. Як ён знайшоў у сабе столькі сілы, каб выявіць у партрэтах і нават нацюрмортах такую жыццёвасць? Як!

Бартуш раз абышоў пакой, потым другі. Ён узіраўся ў твары людзей і, здаецца, бачыў самога мастака. Пазнаваў яго ў жанчынах і дзецях, у дрэвах і кветках, у траве. Што гэта за стыль работы, выяўленне сябе ў сваіх работах? Чаму ён здзіўляецца, так было спакон веку і ў пісьменнікаў, не толькі ў мастакоў. Ці ж не тое самае ў яго ўласных кнігах?..

Анжэлу мастак намаляваў на дзесяці карцінах, але ўжо ўсюды яна была з рознымі людзьмі: у кампаніі з хлопцамі, з дзяўчатамі, з бабулькай, а на адной — з аўтарам, які сядзеў чамусьці на дрэве, іграў яблыкі і кідаў дзяўчыне, а яна смяялася. Воблакі чапляліся за яблыню, і твар у мастака быў гэткі ж бледны, як і ў жыцці.

Анжэла кранула Бартуша за локаць і моўчкі хітнула галавой, запрашаючы за сабой. Ён выйшаў з пакоя з жаданнем, якое нарадзілася ў апошні момант, калі стаяў перад пейзажам: голыя без лісця чорныя дрэвы і

шэрая вясковая хата, на ганку якой бабулька з кульбакай, глядзіць некуды ў сусвет,— захацелася, каб яму падарылі гэтую карціну, на крайні выпадак, прадалі. Ён яшчэ не тлумачыў сабе, навошта гэтая карціна, проста душы яна была патрэбна. Мо банальна, калі ён скажа, што неспадзеўкі падумаў пра сваю вёску, пра маці, якой даўно ўжо няма на гэтым свеце. Але гэта праўда, што ён успомніў сваю вёску і старэнькую хату, злепленую ў пяцідзесятым годзе з аполкаў, кавалкаў бярвення, з усяго таго, што людзям іншым, дзе быў мужчына і сіла,— нягожа. Цяпер, дажыўшы да паўвекавой мяжы, ён ці то баяўся, ці то саромеўся ехаць у тую сваю палескую вёсачку, дзе яго помнілі і ведалі як злодзея і бандыта, які адседзеў шмат гадоў. Наўрад ці хто ўяўляў, што пісьменнік — гэта той самы іхні аднавясковец Радзімір Бартуш.

— Ну, як маё мазюканне? — нібыта абыякавым тонам спытаў мастак, але ў вачах відаць трывога, нервова скрыўлены вусны, нібыта чакае прысуд. Як сказаць, каб не пакрыўдзіць, каб словы былі шчырыя, праўдзівыя... Усё-ткі ён таленавіты чалавек і мужны.

— Мне падабаецца,— сказаў Бартуш,— і я нават сёе-тое купіў бы, калі б вы, Міша, прадалі?

— Што вы хацелі б?

— Чорныя дрэвы і вясковую хату. Пейзаж.

— Дзіўна, дзіўна...— прамовіў Міша.— Мне таксама самому падабаецца гэтая карціна. Знаеце, як я называю яе: «Пераадоленне смутку». Не буду гаварыць, чаму так, думаю, здагадваецеся. Знаеце што, я хачу падарыць гэтую карціну вам, Радзімір. Мне здаецца, яна будзе нагадваць вам аб роднай зямлі, якую ніколі нельга забываць, якую трэба любіць яшчэ больш, чым жанчыну. Згодны са мной?

Бартуш махнуў галавой і сумна падумаў, што надта позна ён гэта зразумеў. Лепшыя гады жыцця страчаны, ён страціў і сваю родную вёсачку, хоць яна апошнім часам усё часцей пачала сніцца. Ён ужо думаў, што гэта нібыта перад смерцю.

Мінулі гадзіна за гадзінай, а яны з Анжэлай усё сядзелі ў мастака, які шмат гаварыў і смяяўся. Паказваў, як малюе, надзяваў на руку металічны бранзалет з пярсцёнкам на вялікі палец, у які заціскаўся аловак альбо пэндзаль. Міша зрабіў два графічныя накіды партрэта Бартуша і падарыў іх яму. Недзе пад вечар,

калі сабраліся развітвацца, вярнулася з работы Мішава маці і, узрадаваная гасцям, хуценька сабрала на стол, і як ні адмаўляліся Бартуш з Анжэлай, а давялося сесці. Бяседа была ўжо нядоўгай, але калі яны развіталіся і выйшлі на вуліцу, дамы ахутвала начная шэрань.

— Ён вас кахае, Анжэла,— чамусьці сказаў Бартуш.

— Чаму вы так падумалі? — яна адступіла на крок ад яго і вельмі сур'ёзна глянула.— Чаму?

— Гэта відаць па ягоных работах. Ці ж гэта кепска?

— Вы не жартуеце, Радзімір?

— Якія жарты, я сказаў толькі тое, што адчуў і ўбачыў.

— Зразумела...— уздыхнула Анжэла, зноў наблізілася да Бартуша.— Можна, я вазьму вас пад руку?

— Калі ласка, трымайцеся,— нібыта жартаўліва сказаў Бартуш, і яна адразу ўхапілася рукой за яго правую руку. Цяпер яны ішлі трохі нават прыціснуўшыся адно да аднаго. Анжэла моцна трымалася за локаць, крок у яе быў меншы, чым у Бартуша, і яна ўвесь час нібыта даганяла яго. Ну што ж, ён не шкадуе, што пабыў у гэтага мастака, дзень не страчаны дарэмна. Канечне, Мішу іхні прыход быў святам, але і ён адчуваў, што і яго душа неяк узбагацілася сустрэчай.

— Пойдзем да нас? — спыталася Анжэла.

— Не, сёння я пайду ў гасцініцу. Буду ў вас заўтра.

— Можна, я правяду да гасцініцы?

— Нам усё роўна па дарозе,— сказаў Бартуш, не надаўшы значэння гэтай просьбе, і ўжо хутчэй адказваючы проста аўтаматычна, чым падумаўшы: — Як кавалеру мне трэба правесці даму. Ці ўжо ў маладых не так?

— Чаму, так. Зрэшты, кожны робіць так, як хоча. Дый вы не такі ўжо і стары...

— Дзякую за камплімент, але, Анжэла, усё-ткі і не юнак. Хоць і на жаль! — Бартуш выпраставу спіну, горда ўскінуў галаву.— Інакш бы мы зусім не так гулялі па вуліцы.

— А як?

— Ну... Напрыклад, цалаваліся, абдымаліся.

— Цікава... Ужо і ваша гасцініца.

— Але ж, будзем развітвацца.

— А мо, Радзімір, пакажаце, дзе вы жывяце,— сказала Анжэла, і яму здалося, што яна пачырванела

і тарганулася яе рука.— Мне цікава, вельмі...— жаласліва дадала яна.— Я ніколі не была ні ў якіх гасцініцах.

— Што ж, калі ласка, толькі ці прапусціць швейцар-цэрбер на ўваходзе.

Швейцар, якога Бартуш назваў цэрберам, сярэдніх гадоў мужчына ў сіняй з лампасамі форме, нават не глянуў на іх, калі зайшлі ў гасцініцу. Нумар быў на трэцім паверсе, і яны, не чакаючы ліфта, падняліся наверх пешкі.

— Тут можна жыць,— Анжэла зазірнула ў адзін пакой, у другі, у ванную, села на мяккае прасторнае крэсла ля тэлевізара.— І вельмі нават няблага. Мусіць, грошай шмат каштуе. Але вы, пісьменнікі, людзі багатыя.

— Усе мільянеры, і рахункі маем у Швейцарскім банку, і цяпер у мяне машына маркі «мерседэс», пяціпакаёвая кватэра, дача на тры паверхі і па каханцы ў кожным горадзе роднага Саюза.

— А калі сур'ёзна?

— Сур'ёзна... Толькі аднапакаёўка ў Цёплым Стане. І жыццё ў доўг. Ад ганарару да ганарару. Чым вас, Анжэла, пачаставаць, проста не ведаю. Акрамя бутэлькі мінеральнай вады мінская-4, нічога не маю.

— І не трэба, навошта,— Анжэла лёгка, нават імкліва падхапілася з крэсла, падышла да Бартуша, узяла яго за рукі.— Знаеце што, Радзімір, лепш пацалуйце мяне...

— Што? — не адразу ўцяміў ён.

— Пацалуйце мяне. Ці я вам не падабаюся?

— Дужа стары, дарагая, я вам. З маладымі цалуйцеся.

— Яны не цікавыя, сталі горш за жанчын, усё стогнуць, плачуць, бегаюць па анучы... Я не бачу ў іх мужчын. Усё нейкая драбяза. Дый наогул мне не шанцуе: як ні пазнаёмлюся з мужчынам — абы-што.

— Ну, ужо і так...

— Так, так... Быў у мяне адзін знаёмы... Здавалася, ён мужчына сапраўдны, але перакаланалася: такі, як амаль усе.

— І не бываюць выключэнні?..

— Бываюць. Думаю, адзін з іх вы...

— Я, значыць, не драбяза?..

— Канечне, не. І, наогул мне падабаюцца мужчыны ў вашым узросце, з імі надзейна і проста. Ну, паца-

луйце ж,— патрабавальна прамовіла яна і ашчаперыла яму шыю, шчыльна прыціснуўшыся.

Ён холадна, бы дзіця, пацалаваў яе і хацеў вызваліцца з абдымкаў, але яна не адпускала. У пакоі было цёмна. Вечар толькі пачынаўся, за акном пакоя гудзеў вясёлы і шчаслівы горад, у якім усё-ткі спакваля нараджалася трывога, пераходзячы з дома ў дом, з сям'і ў сям'ю...

## 6

Ён жыў усе гэтыя гадзіны і нават суткі, быццам у сне, хадзіў, нешта рабіў, еў, бо так трэба было, ён адчуваў сябе робатам, але нічога змяніць не мог. Колы круціліся, машына запрацавала, набіраючы хуткасць, і ўжо не ў яго, мусіць, сіле было спыніць рух. Паддаючыся яму, плыў, як пазбаўлены волі, нібыта ахвяра, над якой занеслі меч, і ратунку ад яго няма. Зусім не хацелася ўжо, каб прыйшла машына з вялізнымі карычневымі, здаецца яму, падобнымі на троны, скрынкамі, куды складуць іх рэчы, замкнуць дзверы, і ўсё — назад не вернешся.

Мітусіліся жонка, цешча,і ён мітусіўся разам з імі. Тое шчасце, якое яны сабраліся шукаць, было недзе вельмі далёка, як усё роўна на небе, калі па ім плывуць цяжкія шэрыя хмары, і вось-вось быццам ухопіш іх рукой, а яны — унь дзе яны!.. Паспрабуй дагані і вазьмі. Але думалася інакш: мо раптам і пашанцуе, дый абавязкова будзе ўсё добра, проста цудоўна. Нездарма ж адтуль пішуць, што жывуць ледзь не ў раі, так ужо ўсё ў іх ёсць, і маюць, што хочуць, абы грошы. А грошы зарабіць не праблема, толькі б галава была на плячах. І плечы каб былі дужыя, гэта не пашкодзіць. Але можна і без усяго гэтага — шчасце кожнага чакае там, дзе яму патрэбна.

О, божа міласэрны! Как гэта было ўсё проста, але ж нібыта жылкі адрываеш ад сэрца і душа па кавалачках разбураецца на нейкае смецце. Дзьмухне вецер — і больш не відаць нічога.

Але ж чалавек з'яўляецца на свет дзеля радасці, дык павінна ж яна некалі і быць. Мо некаму і будзе, толькі ён, Корзун, яшчэ ўсё сумняваецца, бо надта далёка гэтая радасць і шчасце. І ці трэба па яго ехаць, шукаць гуза на галаву. Ці трэба... Аднак настаў час развітвацца,

і ён здзіўляецца, што павыходзілі людзі са сваіх кватэр, з нейкай спагадай на тварах гутараць з ім, і такое адчуванне, што ў двары пахаванне і ў гэтых жалезных карычневых скрынках не шмаццё і мэбля, а ён сам, Корзун. І людзі праводзяць яго ў апошнюю дарогу.

Эх, як журботна і горка на душы, якая разбураецца на гнілыя кавалачкі, і робіцца пуста-пуста. Лес, рэчка, дамы знікаюць з вачэй, калі таксі выбіраецца з вулічнага тлуму на кальцавую дарогу і імчыць некуды, дзе пакуль толькі невядомае, перад якім страшна.

Яму хочацца ўжо адступіць назад, каб раптам адмянілі дазвол на выезд. Пагаравалі б трохі жонка з цешчай і супакоіліся б, і ўсё зноў пайшло б прывычным шляхам, ажно да самай магілы. Чамусьці пачаў тады-сяды і думаць пра смерць, хоць нібыта па гадах яшчэ рана і паміраць. У некага з класікаў ён чытаў, што чалавек, нарадзіўшыся на свет, робіць свой першы крок да магілы.

Прыціхлі дзеці, прыціснуліся да жонкі і маўчаць, звычайна вясёлыя і гаманкія, ім зараз заляпіла вусны і ў вачах таксама сум. Адкуль з'явіўся ён у гэтых кволенькіх, маленькіх чалавечках, якія яшчэ нават не зразумелі, што такое дрэва, сонца, неба, у іх няма каранёў, мо па слабенькіх, дробненькіх карэньчыках і прайшоў ад зямлі сум у іхнія душы. Ці будуць яны шчаслівы там, далёка. У яго, дарослага, губляюцца ў нялёгкім роздуме неспакойныя думкі, а пра дзяцей і казаць не трэба. Надта ўжо ў іх пануры выгляд, дый страціла сваю ранейшую весялосць жонка, таксама ў яе позірк нібыта ў параненай ласіхі. Тады ў яго, мусіць, вочы,— як у параненага лася, які занепакоены лёсам сваіх малых.

Каб даўжэй ехала машына па горадзе, хочацца міжволі запомніць, захаваць у памяці гэтыя вуліцы, па якіх не раз ён хадзіў, гуляў некалі з жонкай, пакуль не былі жанатымі. Даўкі камяк сядзіць ў горле, то ўзнімаецца, то апускаецца да грудзей, і застаецца толькі сядзець сцяўшы зубы, бо, калі ён хоць трошачкі пакажа нейкую слабасць, пачнецца плач і енк.

Яшчэ мо тыдзень, нават два-тры дні назад, ён амаль з нянавісцю думаў пра гэты горад і дом, у якім жыў, а цяпер у душы адна горыч, нуда, што абрынулася на яго. У ім і напамінку аб нянавісці не засталося. Калі б успомніў тое, што думаў, яму б зрабілася сорамна.

Прывыклае і, здаецца, роднае неба памалу адплывала назад. Нават яшчэ не мог уявіць, што ён не будзе цяпер тут жыць, дыхаць гэтым паветрам, якога ўпершыню глынуў, нарадзіўшыся на свет.

Ні аб чым не здагадваецца таксіст, пэўна, і думаць не думае, што вязе на вакзал будучых эмігрантаў. На лбе ж у іх не напісана пра гэта. Знешне нібы людзі як людзі, звычайныя пасажыры, пра якіх ён забудзе на вакзале, высадзіўшы з машыны. Хоць бы загаварыў ён, але ж маўчыць, а ў самога язык не паварочваецца аб нечым гаманіць. Усе словы цяпер на дне апусцелай і спалоханай душы.

Мо ўпершыню, разлічваючыся з таксістам, Корзун адмовіўся ад рэшты. Як не заўважыў яе. Гэты жэст зрабіў наўмысна, спадзеючыся, што хоць так прымусіць гэтага пажылога ўжо чалавека больш уважліва зірнуць на сваіх пасажыраў і падумаць, мабыць, някепска, лагодна, як аб суседзях, якія ад'язджаюць у адпачынак на поўдзень.

Нібы цыганы, агледзеўшы сваю сям'ю, нагружаную пакункамі і чамаданамі, падумаў Корзун. Заспяшаўся з перона, чамусьці спалохаўся, што неспадзеўкі спаткае каго-небудзь з работы альбо, яшчэ горш, знаёмага, якому прыйдзецца тлумачыць, куды ён выправіўся, а пасля бачыць надта цікаўны і здзіўлены твар. Поўнасцю занялі купэ і зачыніліся ў ім, толькі фіранкі на акне не былі зацягнуты. Дзеці адразу прыліплі да акна, нібыта прыклеіліся, а Корзун сеў ля дзвярэй, хоць яму таксама дужа хацелася глядзець і глядзець праз шыбіну на людзей, што сноўдалі па платформе, слухаць, як яны гавораць, смяюцца, як плача дзіця на руках у маткі і як сварыцца жонка на мужа, што надта марудна ідзе за ёй. Аб гэтым ён здагадваецца па словах, якія ўсё-ткі далятаюць да яго, і ён іх ловіць, быццам любімую музыку.

Вочы нечакана спатыкаюцца з жончынымі вачамі, і яна адводзіць іх убок, твар крывіцца, крывіцца, і вось-вось пальюцца слёзы, але ён не можа гэтага дазволіць ёй, бо тады не стрымаецца і ён.

Зазірнула ў купэ правадніца, нешта казала, брала сабе іхнія білеты. Цягнік рушыў, пакідаючы ззаду натоўп людзей, вакзал, дамы, горад.

7

Відаць, у чалавеку сядзіць, жыве робат і варвар, здольны разбураць, знішчаць, не думаючы аб выніках гэтай дзейнасці. Робат быў у чалавеку яшчэ да таго, як вынайшлі гэтую механічна-электронную машыну. Аднак яго спынялі страх, вера ў кару, клопат пра дзяцей, пра будучыя пакаленні. Цяпер гэтых тармазоў амаль няма, яны ўжо не перашкаджаюць чалавечаму робату быць урэшце сапраўднай машынай, бяздушнай і агрэсіўнай. Таму што няма ў яго ў сэрцы любові, апусцелая душа. Дый якая можа быць душа ў робата. Яе ў яго няма, толькі схема. Божа мой, што гэта вярзецца мне сёння, якая дурнота лезе ў галаву. Ад таго, што ў мяне благі настрой, што мне не звоніць Галіна, а калі я званю — мне кажуць, нібыта яна ў ад'ездзе. Можа, і ў ад'ездзе, ці ж не бывае так. Але настрой у мяне нікуды не варты, толькі злосць кіпіць у грудзях да ўсяго свету. Аўгуст ляжаў на ложку ў сваім пакоі, уткнуўшыся галавой у падушку. Ён шчыльна прычыніў дзверы, і было ціха, ніпто не турбавала яго, а ў душы, здаецца, усё гарэла полымем, агонь ахапіў усю ягоную істоту. «Яна зусім мяне не кахае, ні трошачкі, я ёй непрыемны,— думаў ён,— не хоча бачыць мяне і чуць. Інакш бы адгукнулася, пазваніла б. У яе ж ёсць мой тэлефон. Ёсць, яшчэ пры знаёмстве яго даў ёй. Няйнакш з нейкім дацэнтам зараз гаворыць, смяецца. Канечне ж, я не раўня ей, просты электрык. Падумаеш, кандыдат навук...»

Ён перавярнуўся з жывата на спіну, праз паўрасплюшчаныя вочы ўбачыў, як адчыніліся дзверы і зазірнула ў пакой сястра, паглядзела на яго ад парога, уздыхнула і зачыніла назад дзверы. Дзе гэта бачна: сярод дня, хоць і выхадны, ляжыць на ложку здаровы малады хлопец гадзіну-дзве, як той Абломаў, і нікуды нават не збіраецца ісці, лежань. Як сястра зачыніла дзверы, ён мацней заплюшчыў вочы, спадзеючыся заснуць, хоць спаць яму не хацелася, але мо сон трохі на якую гадзіну палегчыў бы жыццё.

Аднак колькі ні сціскаў павекі, яны ўсё роўна разыходзіліся, адкрываючы вачам святло, што панура цякло праз шыбіны, прыкрытыя ў пакоі фіранкамі. Крыжнакрыж, крыж-накрыж, бы ў турме, раптам узнікла думка, голая і выпадковая, за якую ён чапляецца, бы тапелец за саломінку. Толькі б знікла з галавы

Галіна, толькі б забыць хоць на імгненне пра яе існаванне. Пра турму ён нічога не можа прыдумаць, згадаць, бо нічога не ведае, і думка вагаецца, слабенькая, што павуцінка, і пад націскам новай плыні рвецца, яе пачынае адносіць бурлівым патокам, і ён спрабуе звязаць, і нічога з гэтага не атрымліваецца. Надта тоненькая нітачка, цяжка ўтрымаць, калі яна і не вельмі патрэбная.

Ніколі не думаў, што каханне — такая дурнота, проста хвароба, якую пакуль не ведаеш, як вылечыць. Хоць адным вокам цяпер убачыць Галіну, пачуць яе голас. Навошта яму тыя пратаколы народнага кантролю, увесь клопат Аляксеевіча, усё гэта непатрэбна, яго хвалюе і непакоіць толькі адно... і нешта даўно не звоніць Абламей, мо б ён па-сяброўску што падказаў, параіў. Але з іншага боку, ці варта каму яшчэ расказваць пра гэтую сваю хваробу. Не, не трэба. Абламей хоць і сябар, але лепш нікому нічога не казаць.

Яму захацелася памарыць, і ён уявіў сябе з Галінай на беразе рэчкі. Не, не той, што ў горадзе, а на беразе Ясельды, якой ужо няма ля ягонай вёскі, якую ператварылі людзі-робаты ў панылы канал. Аднак у мроях ён усё роўна бачыў гэтую рэчку, якая назаўсёды засталася ў яго памяці з дзяцінства. Яны былі з Галінай удваіх, і больш нікога, толькі побач спакойна дыхала чыстая і халодная вада і вербалоз пагойдваўся, нешта шаптаў разам з ветрыкам. На небе сонца, маленькія белыя воблачкі, нібыта пушынкі, няспешна плывуць некуды і, мабыць, пазіраюць зверху на іх, маладых. Пад нагамі зялёная-зялёная трава і мяккая, ласкавая, як рука маці. Ён і яна стаяць на гэтай траве босымі нагамі, адчуваючы цеплыню зямлі. Яму так ніколі не было добра, ён найшчаслівейшы чалавек ва ўсім гэтым наваколлі, якое нібы пакалыхваецца ў моцна нагрэтым паветры.

Яны нічога не кажуць, маўчаць, але словы тут і непатрэбны. Перамаўляюцца між сабой вочы, у якіх радасць, захапленне і ўвесь свет. Ляжыць на траве карычневая посцілка, тканая некалі ягонай маткай, на ёй маленькая белая сумачка і шэрая торба з салам, хлебам і агуркамі. Гэта іхні абед, а мо нават і вячэра. Гэта ён так думае, і яму хочацца, каб ніхто сюды не прыйшоў, каб навокал была гэтая вечнасць, якую ўчулі прадзеды і дзяды, бацька і ў якую ён цяпер амаль паглыбіўся сваёй свядомасцю, існаваннем і розумам.

Яны раздзяваюцца і кладуцца на посцілку, даверліва падставіўшы сваё цела сонцу і небу. Шаргацяць галінамі вербалоз і маладая пругкая альшына, а ў траве бурліць жыццё, туды-сюды сноўдаюць кузюркі і мурашы. Убачыўшы нешта вялізнае і бела-бліскучае, палахліва спыняюцца, а потым смела караскаюцца ўгору, не разумеючы, што пагражае небяспека. Але Аўгуст толькі асцярожна скідвае з сябе і Галіны шырокай лапай папаратніку гэтых жучкоў. Яна смяецца, жартаўліва скочваецца з посцілкі, адмахваецца сваёй хустачкай. Ягонае сэрца перапоўнена шчасцем. Ён перахоплівае яе руку, прыціскае да сябе і, ледзь-ледзь даткнуўшыся вуснамі, цалуе ад пальцаў да локця. Галіна адразу сціхае і трошкі насцярожана замірае. У яе заплюшчаны вочы, яны схаваліся пад доўгімі чорнымі вейкамі...

Ягоныя мроі перапыняюцца, ён больш не можа ляжаць і ўскоквае з ложка і падбягае да акна, за якім густы і дробны дождж ахутаў сваёй шэранню ўсё наваколле. У галаве пустэча і ў душы... Здаецца, ён ні на што не здатны, нічога не варты і ў жыцці ніякай перспектывы. Дый ці будзе там далей нейкае жыццё. Ну і што, што пражыў толькі дваццаць з маленькім хвосцікам. Нічога, нічога. Малады, яшчэ многае наперадзе.

Яго вока спынілася на стосіку кніжак, якія ляжалі на стале. Іх даўно не чапала нічыя рука, нават пыл быў відаць на вокладках. Яны ляжалі на гэтым месцы яшчэ тады, як Аўгуст прыехаў да сястры,як даўно ён не чытаў кніжак, хоць у школе вельмі любіў. У арміі не было на іх часу і жадання, чамусьці толькі хацелася адпачыць, заплюшчыць вочы і спаць, каб не чуць стрэлаў, не бачыць камення, не адчуваць пад нагамі яго вострыя і бязлітасныя бакі. Ён далонню выцер пыл з тоўстай у цёмна-карычневай вокладцы кніжкі, прачытаў назву: «Браты Карамазавы», Фёдар Дастаеўскі. Летась Аўгуст быў у вёсцы Дастоева недалечка ад Брэста, і там яму з гонарам казалі, што гэта радзіма вялікага пісьменніка Фёдара Дастаеўскага. Ён чамусьці не паверыў, але потым падумаў, што, магчыма, і так. І прозвішча больш падобнае на беларускае, чым на рускае. Аднак ён на той час нічога, на свой сорам, не чытаў з твораў гэтага геніяльнага, як усе сцвярджаюць, пісьменніка. Цяпер ён трымаў у руках кнігу з вельмі простай і зусім нягучнай назвай — «Браты

Карамазавы». Прачытаў на першай старонцы: «Истинно, истинно говорю вам: если пшеничное зерно, падши в землю, не умрет, то останется одно; а если умрет, то принесет много плода» (Евангелие от Иоанна, гл. XII, ст. 24). «Чаму гэта пісьменнік цытуе Евангелле, няўжо ён лічыць, што няма нічога больш разумнага, колькі было вучоных і іншых вялікіх пісьменнікаў. Мы ў школе, калі пісалі сачыненне, дык пісалі спярша эпіграф з якога-небудзь Маякоўскага, альбо Фадзеева, ці яшчэ з каго, а тут Евангелле?..» Газеты ж раней пісалі, што рэлігія — опіум народа і супраць яе трэба змагацца, а ў пісьменнікаў цытуецца Біблія ці Евангелле, і ў царкву шмат людзей ходзіць. Унь нават сястра раптам пачала наведваць царкву, а не клуб, хоць яшчэ маладая жанчына. Хто яе туды цягнуў? Ніхто. Сама пайшла, ён абураўся, а яна адно: у мяне хворая душа, у клубе не стане лягчэй, а яшчэ горш. У нас кажуць — усё для чалавека, усё ў імя чалавека, а як цябе канкрэтна будзе датычыць, дык убачыш, што гэта толькі словы, смецце... У царкве я хоць душу ачышчу... Вось што яна кажа, маладая жанчына свайму брату, камсамольцу, і сама ж таксама яшчэ нядаўна была камсамолкай. Ён пагартаў кніжку, пакуль не адчуваючы да яе цікавасці. У самым канцы кніжкі міжволі вочы пабеглі па радках: «Галубчыкі мае,— дайце я вас так назаву — галубчыкамі, таму што вы ўсе вельмі падобныя на іх, на гэтых прыгожых сізых птушачак, цяпер, у гэтую хвіліну, як я гляджу на вашыя добрыя, мілыя твары,— мілыя мае дзеткі, магчыма, вы не зразумееце, што я вам скажу, таму што я кажу часта вельмі незразумела, але вы ўсёткі запомніце і потым калі-небудзь згодзіцеся з маімі словамі. Ведайце ж, што нічога няма вышэй, і мацней, і здаравей, і карысней, надалей для жыцця, як добры які-небудзь успамін, і асабліва захаваны з дзяцінства, з бацькоўскай хаты...» Усё правільна, гэта ён адчувае па сабе, але ж яму хочацца, каб нешта было наперадзе. Адным успамінам жыць не будзеш.

Ён не чуў, як зноў увайшла ў пакой сястра, са спагадай гледзячы на яго, сказала:

— Табе нехта звоніць...

Спярша Аўгуст хацеў нават не ісці да тэлефона, папрасіць, каб пагаварыла сама, маўляў, няма дома, аднак сястра ўзяла яго як малога за руку і пацягнула ў калідор.

— Ідзі...

Ён узяў трубку і пачуў вясёлы, нават радасны голас Абламея, ледзь прымусіў сябе агукнуцца. Абмяняліся прывітаннем, сказалі некалькі агульных слоў пра настрой і надвор'е, а потым Абламей, чамусьці смеючыся, папрасіў яго прыехаць да плошчы Перамогі. Іх двух запрасілі ў госці да дзяўчат, будзе, пэўна, вельмі цікавы вечар. Аўгуст адразу заўпарціўся, даводзячы, што няма аніякага жадання вылазіць на дождж з кватэры, і ўсёткі не вытрымаў націску сябра. Мільганула ў свядомасці: з'езджу на гадзінку і ўцяку, бо ўжо і ў кватэры абрыдла сядзець і ляжаць. Галава — як пустое вядро.

Сястра ўзрадавалася, убачыўшы, што ён апранаецца, і нават хацела пакласці ў кішэню пяцёрку, але ён вярнуў назад. Хапала і сваіх грошай, не піў, не курыў і не раскашаваў па рэстаранах. Аўгуст аддаваў усю зарплату сястры, але яна не захацела, толькі часам брала ў яго дзесятку-другую, калі ў канцы месяца ў яе канчаліся грошы. Канечне, ён пяцьдзесят рублёў штомесяц даваў ёй і на прадукты. Хоць яна таксама гэтага не хацела.

Ён хутка даехаў да плошчы Перамогі, дзе яго, ужо нервуючыся, чакаў Абламей. Быў ён у моднай імпартнай куртачцы і новых джынсах, але без шапкі, і валасы намоклі, і яму было, відаць, халаднавата, бо стаяў згорбіўшыся, увабраўшы шыю ў плечы.

— Пайшлі хутчэй,— адразу, як убачыў Аўгуста, ён ледзь не пабег па праспекце.

— Куды мы ідзём? — Аўгуст дагнаў яго і паспрабаваў прытрымаць: — Куды ляціш? Паспеем...

— Паспеем, ага! Ужо спазнямся, а я не люблю спазняцца, ты гэта ведаеш.

— Тады, давай трохі падбяжым...

— Давай, толькі каб не абпырскацца.

Яны пабеглі трушком, але даволі порстка, таму што абодва былі высокія ростам і крок у іх быў немалы. Спераду бег Абламей, а трохі ззаду Аўгуст. Дыхалася лёгка, і ногі нібыта самі, непадуладна розуму, абміналі лужыны, дзе трэба скакалі. Ён раптам адчуў сябе гэтак жа амаль, як у арміі, калі за плячыма рэчмяшок, аўтамат на грудзях, на рэмені біклага і ў кішэнях патроны, гранаты, аднак гэтыя рэчы чамусьці не цяжкія, яны быццам частка ягонага цела.

Спыніліся ля дома старой пабудовы, з тых, што, кажуць, з высокімі столямі, дзе вельмі шмат паветра і прасторы. Некалі ён быў у такой кватэры і падумаў, што раней, мусіць, былі больш разумныя людзі і, калі рабілі такія дамы, глядзелі далёка ў будучыню.

— Значыць, так, трымайся свабодна і ўпэўнена, каб не падумалі, што мы з табой звычайныя рабацягі, у якіх у думках толькі чарніла.

— Ты тут ужо калі-небудзь быў?

— Не, таксама, як і ты, упершыню. Якая розніца. Мы з табой байцы. Толькі ўперад і ні кроку назад. Будзем штурмаваць гэтую крэпасць. Тым больш што там ёсць прыгожыя дзяўчаты.

Яны імкліва падаліся наверх і, як паспеў заўважыць Аўгуст, апынуліся на чацвёртым паверсе. Ім адчыніла дзверы чарнявая, здалося, вельмі прыгожая дзяўчына, якую неяк па-панібрацку цмокнуў у шчаку Абламей.

— Ужо думала, што не прыйдзеце,— яна ўважліва глянула на Аўгуста, і ён засаромеўся, адчуў, што чырванее. Мармытнуў нешта пад нос і, хаваючы вочы, пачаў распранацца, вешаць куртку ў шафе, куды яму моўчкі паказала дзяўчына.

— Гэта ўсё Аўгуст, Аўгуст,— весяліўся Абламей, ляпаючы яго па плячы рукой.— Ён затармазіў крыху, але ж, мусіць, нічога. Нармальна?

— Нармальна... Які вы вялізны!—вачыма, поўнымі захаплення, яна глядзела на Аўгуста. Ён не прывык да гэткай увагі да яго асобы, да бесцырымоннасці жаночай і зусім разгубіўся, не ведаў, куды схаваць свае чырвоныя мазалістыя рукі. І ўсё-ткі дзяўчына, мабыць, зразумела ягоны стан ці проста скончылася яе гэтым гасціннасць гаспадыні, аднак яна, падхапіўшы пад локаць Абламея, павяла ў пакой, адкуль чуліся галасы, даволі ўзбуджаныя. Выдзяляўся рэзкі, грубаваты голас мужчыны. Аўгуст, як увайшоў у пакой, адразу вызначыў яго, гэтага мужчыну. Сіваватага, з шырокай квадратнай барадой, у белай кашулі з кароткім рукавом. Рукі ў яго былі мускулістыя, карычневыя ад загару, парослыя цёмнымі валасамі. Збоку ад гэтага мужчыны сядзеў чалавек з вельмі знаёмым тварам. Праз хвіліну Аўгуст успомніў, хто гэта, і здзівіўся сваёй сустрэчы, бо гэта быў начальнік іхняга будаўнічага ўпраўлення Ярыга Ілья Ільіч. Пажылая жанчына,

моцна нафарбаваная і падобная на дзяўчыну, што іх сустрэла, мітусілася ля стала.

На Аўгуста з Абламеем амаль ніякай увагі не звярнулі, толькі ўважліва і трохі здзіўлена паглядзела гаспадыня. Іх тут, канечне, не чакалі. Аўгуст зазлаваў на Абламея, што завёў да незнаёмых людзей, якія і яго бачылі мо ўпершыню. Толькі дзе ж ён пазнаёміўся з дзяўчынай, што гэтак хутка трапіў да яе ў госці?

— А хто гэтыя хлопцы? Пазнаём нас, Анжэла, калі ласачка,— перапыніў сваю прамову барадаты і насцярожана паглядзеў на хлопцаў. Адчувалася, што ён на падпітку.

— Пачакайце, Радзімір, яшчэ пазнаёміцеся,— адмахнулася Анжэла і пабегла за маці на кухню. І пакуль не вярнулася назад, барадаты маўчаў, углядваўся ў хлопцаў. Нейкая раздражнёнасць, злосць была ў яго скептычных позірках, здавалася, адно слова насуперак выкліча скандал з яго боку. Аўгуст ужо бачыў у жыцці такіх людзей, якія, нібыта салома, успыхвалі ад дробязнай заўвагі, крытыкі ці проста нязгоды з іхняй пазіцыяй. Мусіць, такі быў і гэты чалавек, на якога чамусьці гаспадыня глядзела як на бога. Калі побач з ім сядзеў Ярыга, значыць — не абы-хто.

Анжэла пазнаёміла іх з усімі і пасля дадала, што яны абодва служылі ў Афганістане. Гэта было пададзена, як гарчыца да мяса, і дужа не спадабалася Аўгусту, аднак ён нічога не сказаў, толькі цішком штурхнуў Абламея кулаком у бок. Раптам барадаты, які аказаўся пісьменнікам Радзімірам Бартушам з Масквы, усхапіўся са свайго крэсла-гушкалкі, ступіў да Аўгуста, паціснуў яму руку, а потым і Абламею. Ён цісну рукі доўга, нібыта выпрабоўваючы сілу ў хлопцаў. Аўгуста нават штурхнуў плячом у грудзі. Падаў вялую тонкую руку Ярыга. З цікавасцю агледзеў Аўгуста, і ў вачах нібыта мільгнула здагадка. А мо здалося. Ці мала рабочых у будаўнічым упраўленні? «Наўрад помніць кожнага ў твар»,— падумаў Аўгуст. Яны сутыкаліся адзін з адным найбольш разы два-тры, і Аўгуст быў з сантэхнікамі.

— Гвардзейцы, байцы! — выгукнуў Радзімір Бартуш і тэатральна махнуў перад сабой рукою.

— А як жа ж, гвардзейцы,— з выклікам сказаў Абламей,— і байцы!

— Ну-ну...

Але на гэтым увага да іх скончылася і размова пайшла далей між субяседнікамі.

Нібыта аддалі даніну ветлівасці ці адзначылі ў спісе гасцей. І Аўгуст, скарыстаўшы гэта, ціхенька запытаўся ў Абламея:

— Калі ты пазнаёміўся з Анжэлай?

— Учора ў тралейбусе. Прыгожая, праўда?

— Праўда,— ён хацеў дадаць, што надта хутка Абламей напрасіўся ў госці, але да іх падсела гаспадыня, маці Анжэлы. Аўгусту здалося, што ў яе нейкі пакутлівы выраз твару, быццам ён увесь час нешта моцна баліць і яна трывае з апошніх сіл, каб не закрычаць і не напалохаць прысутных. Аднак, заўважыўшы, што ён пільна ўзіраецца ў яе, жанчына ўсміхнулася і гэта ўпрыгожыла твар, які адразу памаладзеў. Яна падцягнула маленькі столік і прапанавала хлопцам бутэрброды. Аўгуст хацеў адмовіцца, але гаспадыня настаяла ўзяць па бутэрбродзе з кілбасой і з рыбай. І зноў на яе твары ўзнік пакутлівы выраз, але яна апусціла вочы і адвярнулася ад хлопцаў, нібыта слухаючы, што гаворыць пісьменнік.

— Ну як, смачна? — раптам спытала яна ў Аўгуста. Ён толькі хітнуў галавой, але яна глядзела на яго, і ён сказаў:

— Вельмі смачна.

— Нічога асаблівага, звычайная магазінная кілбаса. Вам было страшна там, у Афганістане? — у яе на шыі часта-часта пульсавала сіняя жылка, ён адвёў вочы ўбок.

— Усяляк было,— яму не хацелася зараз успамінаць пра Афганістан, быў зусім не той момант. Дый наогул ён не любіў шмат гаварыць пра гэта.

Проста перад яго вачыма вісеў на сцяне вялікі партрэт хлопца, вельмі падобнага на гаспадыню, і Аўгуст, каб змяніць тэму гаворкі, спытаў, кіўнуўшы галавой:

— Ваш сын?

— Мой...

Невядома калі рабілі гэты партрэт, але, мусіць, хлопец быў недзе аднаго ўзросту з ім. Мо на год-два старэйшы ці маладзейшы.

— Дзе ён? — сказаў Аўгуст ужо механічна, каб не спынілася размова.

— Далёка... У турме...

— Як у турме? — не зразумеў ён.

— Проста... У турме,— яна ўздыхнула, узяла са століка бутэрброд, але не стала есці, патрымала трохі ў руцэ і паклала назад.— Пасадзілі за хуліганства. Недзе вашага ўзросту... Прыслаў пісьмо, што, можа, сёлета адпусцяць. Я малю ўжо бога, каб дачакацца гэтага. Вы не можаце ўявіць, як гэта цяжка, калі твой сын у турме. І нічым не дапаможаш.

— Я вам спачуваю,— ён сапраўды спачуваў гэтай, відаць, неблагой жанчыне з пакутлівым выразам твару, але апошнія словы выклікалі ў ім пратэст, і, не стрымаўшыся, ён сказаў:

— А ці трэба дапамагаць? Калі усё па законе, адседзіць і прыйдзе дамоў. Мая мама заўсёды казала: не засцеражэшся ні ад сумы, ні ад турмы. У жыцці ўсё можа здарыцца з чалавекам.

— Лёгка так гаварыць, а ў сапраўднасці ўсё намнога складаней. Вы, мусіць, вельмі дужы чалавек...

— Не ведаю,— пацісնуў плячыма Аўгуст,— звычайны, як усе людзі. А хто гэта? — ён кіўнуў галавой у бок Ярыгі і адвёў вочы, баючыся, што гаспадыня заўважыць няшчырасць.

— Гэта... Гэта Ярыга Ілья Ілыч, вельмі разумны чалавек, начальнік нейкага будаўнічага, здаецца, упраўлення. Вельмі энергічны і разумны. Хочаце, пазнаёмлю вас з ім?

— Не, дзякую, дзякую. Іншым разам, калі можна.

Абламей аб нечым шаптаўся з Анжэлай і зрэдку хіхікаў, як нейкі шалапут, зусім непадобна было на яго, каб ужо так увіхаўся ля дзяўчыны. На іх раз-пораз спадылба паглядваў пісьменнік, тон ягонай гаворкі быў незадаволены, буркатлівы, яму ўсё нешта не падабалася. Ён крытыкаваў і пісьменнікаў, і журналістаў, называючы іх прастытуткамі, што, маўляў, не маюць сваёй думкі, выконваюць тое, што ім навязваюць зверху. Аўгуст такое чуў упершыню і таму здзіўляўся, пачаў уважліва прыслухоўвацца да гэтых слоў. Раптам Бартуш ажно закрычаў: «Ух, паскудзяры, прадажныя шкуры!» Ад гэтага крыку ўсе проста ўздрыгнулі, а гаспадыня незадаволена паглядзела на госця, але нічога не сказала, толькі ласкава спыталася:

— Мо што падаць вам, Радзімір?

— Нічога, дарагая, цалую ручкі. Дай мне, калі ласачка, Ісідарык, гітару. Нешта публіка засумавала, павесяліць хочу.

— Мо не трэба?..— разгублена сказаў лысаваты мужчына, мабыць, гаспадар.

— Трэба, што ты мне рот перакрываеш, Ісідарык,— твар у Радзіміра зачырванеўся, ён склаў на грудзях магутныя, у перапляценнях мускулаў, рукі.

— Калі ласка, я ж не супраць,— гаспадар амаль бегма аднекуль з другога пакоя прынёс гітару з вялікім чырвоным бантам. Гэты бант Бартуш адвязаў і адкінуў ад сябе. З хвіліну нібыта лашчыў струны тоўстымі смуглявымі пальцамі, а пасля ўдарыў рэзка, так, што здалося, ірваў струны. І зноў Аўгуст здзівіўся, як зачаравана глядзела на яго Анжэла, адсунуўшыся ад Абламея, яна нахілілася разам з крэслам уперад, бы збіралася бегчы да гэтага кудлатага, дзіўнага чалавека, які заспяваў хрыпла, але моцным голасам, старанна падкрэсліваючы кожнае слова:

А неяк раз на станцыі...
Трымаюся я за карман,
І вось да мяне падыходзіць
Незнаёмы мне граждан.
І гаворыць: «Марсель, якія кабакі,
Якія там дзяўчынкі, а якія бардакі!!!
Там дзяўчыначкі танцуюць голымі,
А дамы ў сабалях...

«Што гэта за чалавек, што гэта за людзі тут»,— думаў Аўгуст, азіраючыся па баках. Ён пакуль яшчэ шмат чаго не разумеў. А голас Радзіміра хрыпеў:

Мы здалі таго фраера войскам НКВД,
З таго часу я не сустракаў яго нідзе...

## РАЗДЗЕЛ ПЯТЫ

Што за месяц, што за ясны —
Ўночы свеціць, а ўдзень не.
Што за міленькі дружочак —
Калі прыйдзе, калі не.

*Беларуская народная песня*

### 1

Яна загаравала, што фактычнага матэрыялу малавата. Размова ішла без сведкаў, вока на вока; якраз лабарантка пабегла ў буфет па сасіскі, і Зушчыц пера-

пыніў гэтую яе крыўду доўгім пацалункам і бесцырымонным абдымкам, ад якога ёй стала ажно ніякавата. Потым Зушчыц адчыніў вялікі, як шафа, шэры сейф і адтуль выцягнуў дзве тоўстыя папкі, кінуў на стол.

— Карыстайся, тут ёсць шмат матэрыялу.

— А чые гэта? — яна развязала папкі і ўбачыла на першай старонцы: Ярыга.— Дык гэта Ярыгава?

— Першы варыянт, які я зарэзаў,— спакойна сказаў Зушчыц,— яму яшчэ трэба папрацаваць. Пасля тваёй абароны яму гэты матэрыял не спатрэбіцца.— Паўтарыў: — Няхай папрацуе. Ён яшчэ сабе знойдзе. Мо спаткаемся сёння? — ён дадаў ужо ледзь чутна, бо якраз увайшла лабарантка, здалося, па яе выгляду, па тым, як ускочыла ў кабінет, што, мусіць, шмат дала б за тое, каб пачуць, аб чым гэта так з усмешачкай размаўляе з аспіранткай загадчык кафедры. Хоць на яго вуснах гэтую ўсмешачку бачыла ўжо не раз, калі ён гаварыў з Галінай. Дый, мабыць, яшчэ з год таму назад Зушчыц радасна ўсміхаўся і ёй, лабарантцы. І калі ягоная жонка была на курсах павышэння кваліфікацыі ў Маскве, яны нават некалькі разоў сустракаліся ў прафесарскай кватэры. Каб яе муж даведаўся пра гэта... Дык што ён зрабіў бы? Анічога, пакрычала б на яго — і супакоіўся б. Канечне, гэта не зусім сумленна ў адносінах да мужа, але ж ён нейкі бязвольны, якануча, зарплата сто пятнаццаць рублёў, а чалавеку — сорак пяць гадоў. Яна спадзявалася, што Зушчыц дапаможа ёй абараніцца ці хоць перайсці на пасаду выкладчыка, і ён абяцаў гэта. Толькі — абяцанкі-цацанкі, а яшчэ калі чалавек — цынік ды ў якога нічога святога няма ў душы.

Лабарантка сядзела за сталом, пазірала на Зушчыца і Галіну, і лютая нянавісць нараджалася ў душы. Жанчына спалохалася, што гэтую нянавісць раптам убачыць у яе вачах прафесар, таму пачала старанна друкаваць на машынцы план работы кафедры, схіліўшы галаву над сталом. Аднак яе позірк Зушчыц заўважыў і насцярожыўся, перапыніў сваю размову, успомніўшы, як стрымгалоў убегла ў пакой лабарантка, як яна раўніва глядзела на іх з Галінай. Дый Галіна ўбачыла расчырванелы твар і нянавісць у вачах, і яна зразумела, што можа ў яе з'явіцца небяспечны вораг. Пакуль лабарантка была ёй сяброўкай, але колькі ў жыцці было выпадкаў, калі сябры рабіліся ворагамі.

Яна ўявіла, як і чым можа нашкодзіць ёй лабарантка, улічваючы, што трэба яшчэ абараняць дысертацыю, і вырашыла, надзіва спакойна і ўпэўнена, што прыкладзе ўсе намаганні, каб паміж імі засталіся калі не дружба і сяброўства, дык хоць добрыя адносіны. Нездарма, відаць, чула яшчэ летась пра тое, што ў лабаранткі і Зушчыца нешта было... Каб не дысертацыя, каб не трэба было думаць пра работу і не хацелася б застацца тут на кафедры... І жыць як жывуць астатнія дацэнты і прафесары інстытута: мець кватэру, бо ўжо абрыдла прыватная, дачу, а мо і машыну. Ёй хочацца, каб было многа грошай, не лічыць кожную капейку, эканоміць на сукенках, каб купіць боты, цана на якія расце вельмі хутка. На тым тыдні Зушчыц раптам сказаў такое, што яна ніяк не чакала ад яго: «Хачу табе зрабіць падарунак...» Яна спыталася: навошта? Ён у адказ, маўляў, каб увесь час была ў цябе памяць пра мяне. Дастаў з кішэні пяцьдзесят рублёў: на, купі што-небудзь сабе. Спачатку думала абурыцца, але нічога не сказала, узяла грошы і яшчэ падзякавала. Праз гадзіну яна ненавідзела сябе і Зушчыца з-за гэтых грошай, каб была, здаецца, тысяча, дык кінула б яму ў твар. А ўвечары, па дарозе дамоў, забегла ў ЦУМ і купіла туфлі, у якіх і сёння на рабоце. І Зушчыц заўважыў іх, пасміхнуўся хітра і ласкава. Яна зразумела, што ён вырашыў, што купіў яе, бедную аспірантку, яна хоча не толькі абараніць дысертацыю, але і прыгожа, модна апранацца, абувацца. Цешылася думкай, што толькі абароніцца — і адразу яму ад варот паварот, рэзка і холадна будзе з ім гаварыць і нават зневажаць, каб надта шмат не думаў пра сябе. «Стары пень і дурань...» — пранеслася ў галаве, а сама прыхільна і шчасліва пазірала на яго. Яшчэ паўгода назад не паверыла б ніколі, што здолее быць такой хітрай, вылузвацца з адной скуры і ўлазіць у другую. А недзе сумуе па ёй, можа, помніць пакуль, прыгожы і малады, хлопчык-асілак, які, пэўна, у яе моцна закаханы.

Лабарантка таксама жанчына хітрая і, канечне ж, даўмелася, што ў іх з Зушчыцам сяброўства. І цяпер ад яе можна чакаць што хочаш, няхай толькі зашуміць у галаве зайздрасць, дый раптам надумае адпомсціць Зушчыцу за тое, што падмануў, не зрабіў, што абяцаў ёй. А ён абяцаў, у гэтым не трэба і сумнявацца.

чым жа ён зацягвае ў свой палон, як не абяцаннямі, больш у яго нічога няма.

Ёй хацелася зараз як найхутчэй уцячы з кафедры, каб не глядзець у вочы лабарантцы, каб не размаўляць больш і не бачыць, як запанікаваў Зушчыц. Ён азіраўся спалохана па баках, спрабаваў чытаць нейкі часопіс і, відаць, проста марыў, каб нехта паклікаў яго адсюль ці хоць бы зазваніў тэлефон. Але было ціха, ніхто не турбаваў, і яны сядзелі моўчкі, насцярожана, прыслухоўваючыся да кожнага гуку, які быў чуваць з-за цяжкіх тоўстых дзвярэй і з акна, шчыльна зачыненага. Галіне здалося, што яна чуе, як стукае яе сэрца. Ці можна ў гэткіх умовах працаваць? Яна ж не робат, а чалавек, жанчына. Ёй заплакаць, застацца адной, пашкадаваць сябе... Абараняюць іншыя жанчыны дысертацыі і без сяброўства са сваімі кіраўнікамі. І пасля лягчэй жыць, таму што не залежаць ні ад каго, самі ідуць па навуковай дарозе, нічым не абавязаны. Але дзе тыя жанчыны, хоць бы адну паказалі ёй, яна б папрасіла, каб хоць вопытам падзялілася, як абараніць дысертацыю. Унь аспіранткі Рагоза і Лапец збіраюцца абараняцца. Наўрад ці яны ездзяць на дом да сваіх кіраўнікоў, але ж з іншага боку калі глянуць. У Зоські Рагозы бацька другі сакратар абкома партыі, а ў Марыі Лапец — міністр. Неяк Зушчыц казаў, што загадчык кафедры сам напісаў дысертацыю Марыі. Вось так, і пасля сканчэння інстытута яны адразу былі размеркаваны ў аспірантуру, хоць нічым не вызначаліся: ні здольнасцямі да навукі, ні вялікім розумам наогул. Праз якіх пяць гадоў яны будуць вучыць студэнтаў, будуць гаварыць ім пра сумленне, шчырасць, гонар... Яна, Галіна, збыткуе на прыватнай кватэры і за свае грошы чакае ўжо дай бог які год каапinduced, а гэтыя дзеўкі-каралёўкі даўно жывуць ва ўласных і — у дамах, узведзеных для чыноўнікаў з вышэйшых устаноў рэспублікі. Яна марыць атрымаць кватэру ў доме, які цяпер будуюць для інстытута якраз у «андатравым» раёне. Чым яна горшая за Рагозу альбо Лапец? Відаць, горшая, таму што іхніх бацькоў возяць машыны, а яе бацька ездзіць на ровары. Дык калі гэта можна зразумець: іхнія бацькі шмат вучыліся, шмат працавалі (хоць гэта таксама вельмі ўмоўна), яе ж бацька ўсё жыццё пражыў у вёсцы і ўся ягоная адукацыя — пяць класаў. І ўсё-ткі бацькі Рагозы і Лапец зарабілі сабе

прывілеі, а якое дачыненне да іх маюць дочкі.

Яе бацька ўвесь час пытаецца ў адукаванай дачкі, што збіраецца стаць вучонай: дзе праўда, дзе справядлівасць, пра якую трашчаць радыё і тэлевізар? Ёсць, канечне, ёсць, але іх трымаюць у хляве пад замком, і не кожнаму чалавеку надараецца адамкнуць яго, падабраць ключ. А мы ж усе нібы нарадзіліся роўныя перад сонцам і небам, дык куды пасля знікае гэтая роўнасць, а з'яўляецца ў характары, ва ўсім ладзе жыцця хцівасць і подласць, сквапнасць? Чаму, чалавек жа нараджаецца нібыта роўны адзін перад адным? Нібыта так. Але ж у кожнага дзіцяці ёсць бацькі. І ў аднаго яны ездзяць на чорнай «Волзе», а ў другога — ледзь караскаюцца сярод камення, гор і пагоркаў, якія ўзвышаюцца па крывулістай дарозе.

Вельмі хочацца, каб гэтая дарога была лягчэйшая і менш было на ёй камення, і дзеля гэтага яна гандлюе сваім сумленнем, нібыта з радасцю глядзіць у самаздаволены твар Зушчыца. Яна караскаецца па жыцці, як альпініст па гарах. Бываюць хвіліны, калі яна здольна нават плюнуць у яго азызлую, прапахлую тытунём і адэкалонам морду, але гэтае жаданне ўзнікае як імпульс, успыхне ў свядомасці і прапала. На шляху імпульсу стаіць велічэзная сцяна — эгаізм, якому цяпер падначалена ўсё, абсалютна ўсё ў яе жыцці. І яна не можа пераадолець эгаізм, і галоўнае — нават не спрабуе гэтага зрабіць. Таму што спачатку яна — жанчына, якая хоча прыгожа апранацца, мець кватэру, дачу, аўтамабіль. Яна не можа ўсё жыццё збіраць капейкі, жыць на сто рублёў. Навошта вучылася ў інстытуце, навошта канчае аспірантуру, навошта наогул дзесяць класаў? Каб, урэшце, стаць мулярам ці швачкай — хопіць і васьмі класаў, дый нават тады зарабляла б намнога больш. Хто гэта прыдумаў (паглядзець бы на ідыёта ці вялікага інквізітара), што ў горадзе нармальны, дарослы чалавек, які не мае падтрымкі ад бацькоў з вёскі, можа жыць? Хто? Яго б самога на гэтую зарплату пасадзіць на некалькі гадоў і паглядзець, што з гэтага атрымаецца...

Яна часта прыгадвае анекдот. У Грузіі частавалі Брэжнева. Прамоўца сказаў тост: мы п'ём, дарагі Леанід Ільіч, за цябе не таму, што ты Генеральны сакратар. Ты за гэта атрымліваеш грошы. Мы п'ём не таму, што ты Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета. Ты і за

гэта атрымліваеш грошы. Мы п'ём не за тое, што ты Маршал, бо і за гэта атрымліваеш грошы... Мы п'ём за тое, што ты на сваім вопыце даказаў: у нашай краіне нельга пражыць на адну зарплату. Вось таму яна і чапляецца з усёй сілы за Зушчыца, хоць ён, канечне ж, чалавек паганы. Думала так Галіна і амаль радавалася, бачачы, як Вацлаў Казіміравіч ледзь не дрыжыць пад зласнаватым і здзеклівым позіркам лабаранткі. «Я ёй заўтра куплю цукерак,— раптам Галіна ўспомніла, што ў лабаранткі дзень нараджэння.— Мне з ёй псаваць адносіны не варта. Дый навошта... Зушчыц заўсёды знойдзе сабе паратунак, а мне... Мне не дадуць абараніцца. І тады ўсё: бывай зарплата, кватэра...»

Галіна ўзнялася з-за стала і неяк, вельмі проста гэта ў яе атрымалася, заўсміхалася радасна, шчасліва і амаль падбегла да лабаранткі. Абхапіла яе за плечы, прытулілася шчакой да галавы. Узбуджана загаварыла:

— Ах, прабач, зусім вылецела з галавы. У цябе ж заўтра дзень нараджэння. Віншую, віншую. У мяне падарунак ёсць... Каб была і надалей такая прыгожая, здаровая і разумная,—цмокнула яе ў вусны і адразу ўбачыла, што дамаглася свайго. Лабарантка нібыта расцвіла ад гэтых слоў.

2

Праз КПП машына прайшла, лічы, нармальна, вартавы толькі зверху, збольшага агледзеў кузаў, кабіну, зазірнуў спадыспаду і махнуў рукой, прапускаючы. Прапаршчык з другога паверха канцылярыі бачыў, як вадзіцель Басуматраў, па мянушцы Кракадзіл, назвалі гэтак, відаць, з-за доўгага, пляскатага, страшэнна непрыгожага твару,— радасна ашчэрыўся жоўтымі доўгімі зубамі і ўскочыў у кабіну. Заставалася яшчэ адна прахадная, але на ёй стаяў малады, чатыры месяцы як служыў, Паніётаў з Данбаса. Гэты лапавухі, наогул ніколі нічога не заўважаў, хоць ты яму ў кішэню пакладзі, а пасля забяры. І пры ім быў дзяжурным ён, Перабурмыт. Проста на хвілінку заскочыў у канцылярыю, каб спытаць, ці падпісалі нарэшце ягоны рапарт на адпачынак. Мог і пазней зайсці ў канцылярыю, але не вытрымаў напружання, захацелася збоку

паглядзець, як Басуматраў будзе мінаць КПП. Дый падумалася, што без яго Паніётаў зусім нічога не заўважыць. У машыне за паліўным бакам была прымацавана скрыначка, а ў ёй быў скарб для Перабурмыта: чай, анаша і гарэлка. Усё гэта ён збудзе сёння ж, пакупнікі даўно чакаюць тавар. Пасля некалькіх хвілін страху і мандражу, калі здавалася, што канец, труба,— усё роўна яму нічога не пагражае, пакладзе ў кішэню столькі грошай, колькі хопіць нават на два адпачынкі на пляжах Крыма і Каўказа. Дзяўчаты будуць ля яго ног. Ніводзін зэк не выдасць свайго дабрадзея, прапаршчыка Перабурмыта, калі нават зараз... Але ён спыніў сваю недарэчную думку, ад якой усё-ткі ажно пахаладзелі ногі і рукі.

Машына памалу рухалася, нібыта яе штурхалі людзі, а не цягнуў магутны рухавік. «Баязлівец, баязлівец...» — прапаршчык мацюкнуў уголас Басуматрава, і старшына-пісарчук падняў вочы ад папер, пахітаў галавой. Вось машына спынілася ля Паніётава, і гэты салабон бярэ з рук шафёра паперы, доўга чытае, лезе ў кузаў, нешта там робіць. Няйнакш лічыць. «Ну лічы, лічы...» Азіраецца па баках, на твары разгубленасць і здзіўленне. Пэўна, перажывае: аднаму праверку рабіць. Чаго час цягнеш, чаго валэндаешся? Ах, каб цябе халера пабрала... Прапаршчык убачыў, што Паніётаў раптам нахіліўся і палез пад кузаў. Вось будзе, калі яшчэ знойдзе. Ён толькі паспеў так падумаць, як Паніётаў нібы вынырнуў з-пад машыны; твар узбуджаны, нават адсюль відаць, як вочкі гараць. І праз хвіліну ўжо прыціснуў аўтаматам Басуматрава да кола і той, напалоханы, падымаў рукі ўгору.

Што з дурня возьмеш — яшчэ пальне ад радасці, маўляў, знайшоў скарб пад машынай. Ой, чаму ж я такі няўдалы... Каб жа згарэў, салабон няшчасны.

Перабурмыт выскачыў з канцылярыі і бегма да прахадной. Як жа ж, здарэнне, а дзяжурны не на месцы. А раптам следства зробяць і пацягнуць за нітачку... Дык трэба як хутчэй перарваць, каб не шукалі там, дзе не патрэбна. Ён падбег і пачуў, што Паніётаў крычыць:

— Кантрабандыст, спаймаў, кантрабандыст, спаймаў!..

— Што такое, Паніётаў?

— Кантрабандыст, спаймаў, кантрабандыст, спай-

маў! — усё роўна крычыць той, нібыта звар'яцелы.

— Смірна! — гаркнуў Перабурмыт.— Дакладвайце, што здарылася.

— Затрыман кантрабандыст,— прапішчаў Паніётаў і адвёў нарэшце аўтамат ад спіны вадзіцеля, і той адразу вырашыў уратавацца ад вартавога ў кабіне. Але ж не тут-та было, аўтамат зноў пагрозліва павярнуўся назад. І як ужо не супакойваў прапаршчык Паніётава, нічога не атрымалася: давялося лезці пад машыну і нават цяпер яшчэ можна было б штосьці прыдумаць, але позна, позна...

Ух, і закруціліся, заварушыліся, прыціснулі Басуматрава, і ён праз некалькі сутак, напалоханы, што могуць прыпаяць тэрмін, прызнаўся амаль ва ўсім. І ў першую чаргу, што гэта быў заказ прапаршчыка Перабурмыта, што ён меў толькі маленькую долю ва ўсім багатым падпольным прадпрыемстве. Ажно плакаў Басурматаў і прасіў пашкадаваць яго бедную маці і дваіх дзяцей з жонкай, якія на ягоным утрыманні. На допыце найбольш націскалі на тое, адкуль анаша і каму з зэкаў яе везлі. Аднак Перабурмыт даўно ведаў, чым менш скажа, тым больш у яго шанцаў выблытацца з пасткі, у якую неспадзеўкі трапіў. Ніколі не чакаў, думаў, усё было надзейна. Раней, калі хто з аховы і трапляў з чаем альбо гарэлкай, толькі аб'яўлялі вымову. Цяпер прыціснулі так, што Перабурмыт спалохаўся: а раптам пасадзяць. А з турмы ўжо можаш і не выйсці. У гэтых праклятых зэкаў нібыта тэлеграф працуе між турмамі, адразу даведваюцца, калі сядзе хто з надзіральнікаў ці з міліцыі. І тады чакай самасуду: усадзяць ноччу між рэбраў нож, альбо на будоўлі цэментовая панель на галаву ўпадзе. Варыянтаў шмат... Хоць страляйся, але ўжо няма чым, бо забралі пісталет яшчэ на прахадной.

Каго ім назваць з зэкаў, усіх бы назваў, але ж рукі ў іх доўгія і помста будзе страшная, нават калі і не пасадзяць. Перабурмыт перабраў у памяці амаль усіх са свайго атрада і, трохі павагаўшыся, спыніўся на Мірыку, яму заставалася сядзець чатыры месяцы, быў ён хворы і, што было праўдай, пакурваў анашу. Дый мала хто з іх адмаўляўся, калі трапляла ў рукі. І ён яго назваў, дадаўшы, што той ужо гандляваў у калоніі.

Умомант Мірыка прыцягнулі. Ён лаяўся, крычаў, што нічога не ведае і ведаць не жадае. Допыт здымаў

сівагаловы маёр з абласнога ўпраўлення, і, адчувалася, сімпатыі ў яго былі на баку прапаршчыка, ён ненавідзеў зэка.

— А, фраеры, адна кантора! — крычаў у роспачы Мірык, але сядзеў як прыкуты, ніводным рухам не паказваў пратэсту. Турэмныя правілы даўно вывучыў. Толькі істэрычна гукаць: «фраеры» — мо і хапіла яго. Хоць і за гэты крык мог быць карцэр.

Выходзячы з кабінета, Мірык на імгненне прыпыніўся, кальнуў Перабурмыта чорнымі вачыма і спакойна, неяк абыякава прамовіў:

— Дзякуй, прапар, дзякуй. Паямо яшчэ разам кашку-малашку... Падагнем табе ласты.

— Ідзі, ідзі,— павысіў голас маёр.

Эх, вялікія спадзяванні былі ў Перабурмыта на Мірыка, было ў яго тое-сёе запланавана. Можна было б грошай набраць зусім спакойна, толькі выхад патрэбен быў на горад, і не які там райцэнтр, а на горад маштабны, як, напрыклад, Мінск, дзе жылі родзічы гэтага наркота. Усе разлікі паляцелі да чорта, тут абы самому выбавіцца з пасткі, а астатнія хай сабе хоць згінуць. Абы не асудзілі, каб толькі гэты маёр з ласкавасцю бульдога надта не выведаў...

Усё скончылася вельмі і вельмі добра́, прынамсі, для Перабурмыта. Яго толькі выгналі з органаў. Чыстымі і сухімі выйшлі з гэтай гісторыі усе, акрамя толькі Басуматрава, якога ўсё-ткі засадзілі на паўтара года, хоць ён і выконваў толькі волю прапаршчыка, праз ванага зэкамі Кашалотам.

Сабраў Перабурмыт свае рэчы, пасядзеў, падумаў і вырашыў паехаць у Мінск, быў у яго адрас Нілы Восіпаўны. І, пакуль Мірык у калоніі, можна было хоць трошкі ўзяць яшчэ ад жыцця. Шмат сабраў адрасоў за гэты час ад розных зэкаў. Спярша збіраў дзеля смеху, а потым як для калекцыі, каб таўсцейшы быў блакнот. І вось праглядзеў яго, прайшоўся вокам па назвах гарадоў, але прыпыніўся на Мінску. Хоць і страшнавата было, таму што мог, канечне, Мірык паведаміць маці аб прычыне свайго далейшага зняволення. Толькі наўрад ці гэта зрабіў, бо кожны зэк, які трошкі паважаў сябе, быў скрытным і асцярожным у пісьмах. Іншае, калі выйдзе з-за кратаў, тады больш верх бралі эмоцыі, пачуцці. Здавалася, Ніла Восіпаўна якраз той чалавек, які проста павінен дапамагчы былому прапар-

шчыку Перабурмыту пачаць новае, шчаслівае жыццё. Ён нарадзіўся, сам нават не ўспамінаў, дзе гэта ён нарадзіўся, у Бранскай вобласці, але як пайшоў у армію восем гадоў назад, дык там і ні разу не быў. Нават пісьмаў не пісаў бацькам, навошта была тая яму вёска, дачуўся, што ў Беларусі людзі жывуць добра, і ўжо канчаткова вырашыў ехаць у Мінск. Родная зямля, родны край, родныя карані — цьфу, пустыя словы: ён рускі, рускі, рускі. Увесь Савецкі Саюз — яго родны край, а найлепш той, дзе можна добра ўладкавацца, каб ужо ўсё было гатовае, каб можна было смачна есці, мала працаваць, рэгулярна браць чарку. Ну і жанчыны, чуў,— прыгожыя на Беларусі.

Ён супакоіўся, калі даведаўся, што Мірык усё-ткі хутка выйдзе, тэрмін яму не павялічылі. Значыць, баяцца нікога не трэба, можна спакойна рушыць у дарогу. Атрымлівалася, што нікога ён не выдаў, не прадаў. Сумленне чыстае перад усім светам, а найбольш перад Нілай Восіпаўнай. Урэшце, галоўнае ўчапіцца. Учапіцца і трымацца, трымацца наверсе! Ух, ён учэпісты — Перабурмыт. Калі ўжо зэкі ад яго пішчалі, дык як-небудзь астатніх возьме за рэбры. Перш-наперш, што ён зробіць — гэта скажа, што Мірык-нырык павінен яму тысячы тры грошай, не, пяць тысяч. Хай толькі не дасць гэтай сумы, але ж не, дасць. Няйнакш прывыкла, што сябрукі сына пастаянна заходзілі па грошы. Вывучыла ўжо турэмны закон. А ён не які-небудзь зэк нумар 1153, а прапаршчык аховы, чалавек важны і адказны, ад яго шмат што залежыць. Гэта, пэўна, яна зразумела, баба адукаваная і разумная, сто разоў гаварыць не давядзецца ёй.

У яго цяпер час вельмі дарагі, хвіліна ідзе на тысячу, няма калі ўжо сядзець тут і думаць. Ён падхапіў чамадан, закінуў за плечы рэчмяшок і, нібыта ўцякаючы, ні з кім не развітваючыся, подбегам рушыў ад дома, у якім пражыў пяць доўгіх вельмі гадоў. У чамадане, у двайным дне, склаў пачкі грошай і з дзесятак залатых лацужкоў і пярсцёнкаў, што яму падаравалі сваякі зэкаў. Узяў з сабой і форму, няхай будзе, а раптам спатрэбіцца, розныя бываюць моманты ў жыцці. Усё, канечне, не прадугледзіш, але ж хочацца, каб ва ўсім шэнціла яму.

Па дарозе зайшоў у рэстаран, папрасіў паклікаць знаёмую афіцыянтку Кацьку. Выбегла хутка і, убачыў-

шы яго з чамаданам, ажно загарэлася ўся ад радасці, няйнакш, дурніца, удумала, што ён да яе прыйшоў, перабіраецца жыць. Даў грошы і загадаў вынесці дзве бутэлькі каньяку. Сказаў, што едзе ў адпачынак на радзіму. Хоць і баялася, бо цяпер з гэтым надта строга, але ж усё роўна вынесла і нават не дзве, а тры бутэлькі. Адну ад сябе дадала, падарунак у дарогу. Ну, дзякуй, ён ад падарункаў ніколі не адмаўляўся. Ці вернецца хутка? «Ага, чакай, чакай»,— падумаў здзекліва і ажно зарагатаў, бо весела стала ад панылага твару афіцыянткі. Яшчэ пачуюць пра мяне. Даведаюцца, хто такі Перабурмыт.

Страх ад допытаў даўно мінуў, нічога ўжо не пагражала, і ўпэўненасць зноў вярнулася ў ягоную душу, дала яму сілу, з якой ён быў здольны перавярнуць дагары ўвесь свет. Незразумелай была логіка тых, хто судзіў, хоць, канечне, яны думалі аб чысціні свайго мундзіра, трэба было пасадзіць Перабурмыта на гады тры, каб ён сам адчуў знявагу і крыўду, каб пабыў безгалосым і бяскрылым, каб ведаў, што ён гэткі ж, як і іншыя зэкі, проста воляю лёсу патрапіла яму ў рукі ўлада над людзьмі, пазбаўленымі ўсялякіх правоў. Праўда, некалькі разоў узнікала ў яго галаве гэткая думка, што магло здарыцца і ён апынецца за кратамі, але ён адразу адганяў яе прэч, каб не назаляла, каб не палохала сваёй неверагоднасцю.

У яго кішэні ляжаў білет на самалёт ад Ухты праз Маскву да Мінска. Ён уявіў, як пазвоніць у дзверы Ніле Восіпаўне і які будзе ў яе здзіўлены твар. Пасля яна нібыта ўзрадуецца, пачне дзячыць за тое, што зайшоў да іх у госці.

Настрой у Перабурмыта быў выключны, ён адчуў сябе вольным чалавекам, вольным ад розных абавязкаў. Было смешна нават думаць пра тое, што ён стаяў на ахове інтарэсаў дзяржавы. Пры чым тут дзяржава, калі ён сам сабе гаспадар. Дзяржава ў ім самім. Няма больш у ім дурня, які слухаў нудныя разважанні начальніка і нампаліта пра мараль, доўг, вернасць. Гаварыць гаварылі, а рабілі праз некаторы час, а то і адразу пасля палітгадзіны, зусім іншае. Неаднойчы бачыў і абслугоўваў гэтыя вясёлыя кампаніі. Яшчэ ж нядаўна было: калі прыязджаў начальнік упраўлення лагераў Галімджанаў. Ну і што, што тыдзень назад яго знялі, але ж пенсію ўсё роўна далі, і не абы-якую, а палкоўніцкую.

Улічылі, што быў да органаў першым сакратаром райкома партыі. Таксама прыгожа гаварыў на сустрэчы з асабовым саставам калоніі: і пра партыю, і пра чысціню радоў. Але ж як скончылася афіцыйная частка, начальнік калоніі аддаў загад Перабурмыту і яшчэ некалькім прапарам ісці з нампалітам. Ну і пайшлі. На бераг ракі, дзе гудзеў усімі сваімі конскімі сіламі магутны катэр. А на ім ужо былі пяць начальніц атрадаў з суседняй, жаночай калоніі. І пачаліся гульбішчы, сумесныя купанні па-царску, палілося віно. Двое сутак яны гэтак гулялі, прапарам тое-сёе перападала з начальніцкага стала. І тады Перабурмыт вырашыў, што чым большы начальнік, тым яму больш дазволена. Яму павінны прыслужваць, дагаджаць. Яму можна, можна... Перабурмыт зайздросціў палкоўніку, якога даглядалі, сачылі за кожным яго позіркам, і любая з чатырох лейтэнантак толькі радавалася, калі ён спыняў свой выбар на ёй. У маленстве Перабурмыт чытаў, што гэтак паводзілі сябе некалі да рэвалюцыі паны, балюючы дзень і ноч, ва ўцехах з жанчынамі, і нібыта была заведзена гэткая традыцыя ва ўсходніх ханаў, якія мелі гарэмы. Аднак начальнік упраўлення лагераў не хан і не пан, ён мацнейшы і магутнейшы за іх, бо нікога не прыціскае, не прыгнятае, а ўсе самі, добраахвотна дагаджаюць яму. Усё роўна як гіпноз нейкі?.. Ці псіхоз?.. Але гэта добра, бо, калі начальства дурэе, тады падначаленым лягчэй жыць.

Бралася на вечар, чорнай густой паласой выцягнулася за пасёлкам тайга, у якой недзе пад Пячорай раўлі машыны. На дарозе, яшчэ як і ўлетку, гультаявата-сонна ляжалі лайкі, прыплюшчыўшы вочы, драмалі, а мо апошні раз глядзелі на Перабурмыта. Ён з глухім і ажно салодкім задавальненнем ударыў аднаго сабаку нагой, і той, заныўшы, адляцеў убок. І адразу ўся сабачая зграя заекатала, успаролася з драўлянага тратуара, гырканнем праводзячы прапаршчыка. Ён ішоў, ішоў, а потым спыніўся, азірнуўся да пасёлка, у якім адбыў цалюткіх пяць гадоў, памахаў рукой і падумаў, што шкада, раней не дадумаўся. Трэба было падпаліць якую халабуду напаследак, каб яркае і злоснае вогнішча асвятляла яму дарогу ў будучыню.

Аўтобус давёз яго да Ухты вельмі хутка, гэта быў экспрэс нафтавікоў. І праз гадзіну Перабурмыт ужо драмаў у салоне самалёта, які імчаў да Масквы.

## 3

Да вады ў густой высокай траве падпоўз чалавек, прагна прыпаў ротам, цягнуў і цягнуў у сябе ваду, потым стомлена прадыхнуў і перавярнуўся на спіну. Ляжаў, заплюшчыўшы вочы, і грудзі высока ўзнімаліся і апускаліся. Рукі былі раскінуты ўшыркі. Чалавек нібы збіраўся абняць Сусвет. Ён ляжаў нерухома, расслаблены, але твар быў насцярожаны, здавалася, ніводзін гук не абмінаў яго ўвагі. Праз якую гадзіну чалавек падхапіўся з зямлі, азірнуўся па баках, але нічога не ўбачыў і не пачуў такога, што б яго спалохала, бо менавіта гэтага ён чакаў. І вельмі баяўся.

Гэта быў яшчэ малады хлопец, толькі не па гадах зашмат злосці было ў яго вачах. Правую руку ён трымаў на ручцы нажа, схаванага пад крысом старой парудзелай ватоўкі. Яму было горача, буйныя кроплі поту падалі з ілба на шчокі, на бараду, парослую густым чорным шчаціннем, і ён раз-пораз змахваў іх даланёй левай рукі.

Ён пастаяў яшчэ трохі і зразумеў, што яго не шукалі. Уцекачоў было пяць, і салдаты іх дагналі ля ракі і пачалі шалёную страляніну з аўтаматаў. І тады яны кінуліся ў тую раку, што засталася адсюль далёка ззаду, раку бурлівую і халодную, як смерць. Ён выпаўз з ракі мо за якіх тры кіламетры ніжэй ад таго месца, дзе ўскочыў у ваду, ратуючыся ад пагоні, І, дрыжучы так, што, здавалася, не вытрымаюць жылы, затаіўся ў гушчары і чуў, як зусім недалёка ад яго галёкалі салдаты і гаварылі, што ўсім хана і пайшлі да рыб на корм. Аднак ён застаўся жывы і нават не паранены і гэта зразумеў, калі адбег на такую адлегласць, што нават вопратка на ім высахла.

Канечне, ніколі б ён не пабег, засталося ўсяго тры месяцы, а там — воля, але яго змусілі амаль. Вырашыў уцякаць Шчур, «бацька» ўсіх зладзеяў у законе ў іхнім лагеры, страшны чалавек, нелюдзь з трыма сваімі целаахоўнікамі, а яго захапілі ў якасці скацінкі. Яму стала яснай ягоная роля на другі дзень уцёкаў, калі прылеглі адпачыць. Пачуў, засынаючы, як пра гэта гаманілі целаахоўнікі Шчура — Карась і Вінт. Мо ўскочыць і пырнуць нажом Шчура, але ж яму не далі б нават падбегчы, і ад гэтай безвыходнасці было хоць вый ваўком, грызі зямлю. І ўсё-ткі ён знайшоў

у сабе сілы сціснуцца, нічым не выдаць сябе. Пакуль ён быў бездапаможны, як чарвяк.

Тры месяцы было да волі, тры месяцы заставалася да жыцця, калі можна есці, піць што хочаш, кахаць жанчын, якія цяпер пачалі яму сніцца амаль штоноч.

Ён стаяў сярод глухой, маўклівай тайгі адзін, адзін на многа кіламетраў. І што рабіць у турэмнай вопратцы, без ежы, без дакументаў? Нічога. Ці то ад холаду, ці то ад жаласці да сябе сутаргавата ўздрыгнула ніжняя сківаца, новая хваля дрыжыкаў навалай пайшла па целе. Ён затросся, і з вачэй уперамешку з потам паліліся слёзы. Упаў на зямлю і скурчыўся, падабраўшы пад горла калені, плакаў, плакаў, ажно пакуль не пачуў далёкі, але ўсё бліжэй і бліжэй грукат з неба. Чалавек адразу бы нырнуў, хутчэй перакаціўся клубком пад шырозную калматую старадрэвіну. Ён увесь сцяўся і перастаў калаціцца ад дрыжыкаў, напружана ўглядаўся ў неба. Чый гэта грукат, ужо здагадаўся, і яму хацелася з галавой закапацца ў зямлю, каб ніводнага следу не было відаць тут.

Зашумелі дрэвы, здалося, зараз сядзе перад ім, так нізка над тайгой ляцеў верталёт. Гул пачаў аддаляцца, скіраваўся да той вялікай ракі, потым зноў загрукатала амаль над галавой і памалу пайшло назад, адкуль чалавек бег. З'явілася адчуванне, бы з усяго наваколля выкачалі паветра і стварылі вакуум, такая цішыня абрынулася на галаву і стомленае, знерваванае цела. Ён ажно закрыў рукамі вушы, у якіх запішчаў камар.

І ўсё-ткі яму трэба было ісці, калі ўжо так здарылася, што сарваўся, як паўдурак. За тры месяцы да волі. Назад дарогі няма, яна закрыта, толькі рушыць уперад. Далей ад сонца, у той бок, дзе яно апускаецца на ноч. Пакуль у чалавека не было ніякіх планаў, ён нават не ўяўляў добра, што зробіць заўтра ці пасляаўтра, калі яго не схопяць салдаты ці міліцыя. Абсалютная бяздумнасць. У калоніі прывык, што ўсе рашэнні і планы прымаліся іншымі людзьмі, а ён толькі бездакорна падначальваўся ім. Часам і зрываўся з тармазоў, пратэставаў як мог, бо ён не жывёліна, а чалавек, хоць і асуджаны на зняволенне. Ён чалавек і будзе жыць, а не скацінка, якою меркаваў зрабіць яго Шчур са сваімі пацукамі. Усе захлынуліся ў халоднай сібірскай вадзе, пайшлі на дно, змыла іх з жыцця, нібы здыхляціну. А ён, Мірык, упершыню за гэтыя

страшныя гадзіны назваў сябе па імю, быццам баяўся, што падслухае нехта, спыніць адразу і тады... Уцякаючы ад салдат, ён менш іх баяўся, чым Шчура, і каб не Шчур, мо і спыніўся б, упаў бы на зямлю, каб не чуць ля вуха свісту куль, а потым падняцца з упэўненасцю, што жывы і ніякая сваната не павядзе з сабой, як жывёліну. Ён жывы, нечакана з усёй паўнатой і яснасцю зразумеў Мірык і быццам крыкнуў: жывы, але слабы шэпт толькі сарваўся з яго разбітых, сасмяглых вуснаў. Страх па-ранейшаму кантраляваў яго душу, пачуцці і дзеянні, якія былі вельмі абачлівымі і асцярожнымі.

І ўсё-ткі трэба рухацца — канчаткова сабраўся з духам Мірык, і, як уявіў, колькі кіламетраў ад гэтай тайгі да Мінска — кругам пайшла галава. Уперадзе салдаты, міліцыя, а трэба ж садзіцца на цягнік, самалёт, а ў кішэнях пуста, ні дакументаў, ні вопраткі. Ля першай жа вёскі яго затрымаюць і здадуць у міліцыю, пасля суд і прыпаяюць на ўсю катушку. «Каб ты здох, падла!..» — падумаў ён пра Шчура, але зараз жа ўспомніў, што таго ўжо няма на гэтым свеце і трэба нешта вырашаць, зыходзячы з сітуацыі, якая склалася. Вагацца няма чаго, у рукі ўладзе здавацца ён не будзе. Мабыць, ужо залічаны ў нябожчыкі разам са Шчурам. А верталёт, супакойваў ён сябе, лётаў дзеля парадку, каб ахове ўпэўнена аб'явіць, што пяцёра ўцекачоў патанулі ў рацэ, а целы дзе ты знойдзеш, калі рака бурлівая, на дне бярвенне — тапляк, пазачапляліся за яго — ніякага следу. Можа, праз колькі гадоў недзе выплывуць, але ў такой тайзе, дзе рэдка спаткаеш чалавека, ніхто і не заўважыць гэтага.

Прайшоўшы кавалак дарогі праз гушчар, Мірык адчуў, што калі не перадыхне і калі не з'есць хоць скібку хлеба,— дык памрэ. Толькі дзе мог ён узяць хлеба. Вочы прагна шукалі, што ўхапіць з зямлі, з дрэваў, каб хоць трохі суняць спазмы голаду, які пачаў, здавалася, ірваць страўнік. За крокаў пятнаццаць — дваццаць заўважыў на галінастым, з тоўстым кароткім камлём дрэве чырвоныя ягады. Нібыта ў плечы хто штурхнуў. Ажно паляцеў колькі было сіл да гэтых агністых, падобных на рабіну ягад, пачаў ірваць з лісцем, абедзвюма рукамі запіхаць іх у рот. Спярша не адчуваючы смаку, а потым, калі гарката перапоўніла горла, усё роўна еў і еў, не зважаючы ні на што і не думаючы, ці наогул іх можна есці. Трохі падмацаваў-

шыся, хоць холад патрабаваў ежы і страўнік балеў не менш, ён яшчэ выламаў на дарогу некалькі галін з гронкамі ярка-чырвоных ягад. Раней чуў, што ў гэтай тайзе ёсць кедры, і падумаў, што было б зусім няблага патрапіць на арэхі, тады зажыў бы весялей.

Сонца было перад ім, значыць, ішоў правільна, на захад. Хутка ён даўмеўся, што напрасткі па тайзе надта далёка не зойдзеш. Кругом быў гушчар і гушчар. Як ні хацелася, але нічога іншага не заставалася, як вярнуцца назад да ракі і рухацца ўздоўж яе. Аднак было нават страшна падумаць, каб павярнуць, столькі кіламетраў пакінуў ужо за плячамі. Канечне, не так мо і шмат, сем-восем, толькі кожны кіламетр яму быў дарагі, кошт ацэньваўся сілай, якая спакваля пакідала яго. Было адно жаданне — упасці на зямлю і заснуць, каб забыць пра ўсё і, галоўнае, пазбыцца думак пра будучыню, якая чакала яго за дрэвам, за небасхілам, дзе ўжо знікала сонца.

Адолеўшы яшчэ мо кіламетр па гушчары, Мірык з радасцю і насцярожанасцю ўбачыў спераду прагал. Пасвятлела, раскрылі свае шаты дрэвы. Ён апынуўся на палянцы, з краю якой прыляпілася ля дзвюх высозных елак хатка. Сонца якраз зазірала ў акенцы, і яны бліішчэлі пражэктарамі. Здавалася, высвечвалі, вышуквалі Мірыка. Ён спуджана схаваўся за дрэва, доўга стаяў, угледаўся, чакаючы, калі адчыняцца дзверы. Нарэшце, набраўшыся адвагі, подбегам, наколькі хапала сілы, рушыў па краі паляны, каб апынуцца ззаду хаткі, не адчуваць пільнага вока акенцаў. Ля сцяны перавёў дух, паслухаў трохі, але нічога небяспечнага для сябе не пачуў. Моцна тахкала ягонае сэрца, і ён дыхаў занадта гучна, як стомлены конь.

Дзверы не былі замкнёны, і Мірык адчыніў іх, ступіў у цёмнае памяшканне. Руку па-ранейшаму трымаў на нажы, гатовы ў любую хвіліну ўдарыць ім. Нервы былі напяты і ажно звінелі ад напружання. Ніякага руху, нічога страшнага не чуваць. Тады ён пайшоў далей у хату. Вочы амаль звыкліся з цемраі, і ён разгледзеў стол, нары, на якіх ляжаў кажух, пасярэдзіне пакоя металічную печку. На стале была напалову пагрызеная луста чорнага хлеба, ён нават спярша падумаў, што гэта якая трэска, аднак не, гэта быў хлеб. Яшчэ не ўзяўшы яго ў руку, не пакаштаваўшы, Мірык ад парога, здавалася, адчуў, як ён пахне і які ён смач-

ны. Дрыготкімі рукамі схапіў лусту і кусну, пачаў жаваць, з асалодай адчуваючы, што страўнік прыціх і боль знікае, слабее, даючы яму магчымасць перадыхнуць.

Калі з'еў хлеб, агледзеўся як мае быць. Адразу забраў кажух. За нарамі знайшоў два рэчмяшкі. Вельмі спакойна, нібыта дома, развязаў абодва і высыпаў з іх рэчы. Адклаў сабе цёмна-сіні тоўсты світэр, штаны, чаравікі (навошта ў тайзе гаспадару?). Аднак чаравікі не падышлі, і ён назад абуў свае, з моцнымі яшчэ падэшвамі. Знайшоў Мірык ваенны білет у кішэні рэчмяшка. Разгарнуў яго: на фотакартцы быў малады хлопец, старэйшы за яго на два гады. Тройчы прачытаў: Сімак Аляксандр Аляксандравіч. Нарадзіўся ў Омскай вобласці, у вёсцы Кісцень, ваеннаабавязаны. Прымаў прысягу... Старшы сяржант... Мірык, не вагаючыся, засунуў ваенны білет сабе ў кішэню. У парттабаку ляжалі грошы, ён іх пасля пералічыў: было трыста пяцьдзесят сем рублёў. Мільгнула ў галаве: навошта ў тайзе грошы?

У трох прасторных, аб'ёмістых скрынках убачыў прадукты: кансервы, крупы, масла. Спярша набраў іх за пазуху, але перадумаў. Акуратна склаў рэчы ў адзін мяшок, а ў другі паклаў прадуктаў. Недзе ў свядомасці ўсплыло, як бег, хаваўся, пачуўшы грукат верталёта. І хутчэй высыпаў прадукты з рэчмяшка і, патупаўшы па хаце, знайшоў звычайны палатняны мяшок. Туды і паклаў сабе запас на дарогу, прыладзіўшы да мяшка лямкі з вяроўкі. Узяў яшчэ некалькі карабкоў запалак і палову цыгарэт, якія былі ў хаце. Усё не стаў забіраць. Гэтым толькі раззлуе гаспадара і пашкодзіць сабе. Розуму хапіла прыбраць за сабой, усе рэчы паставіць на ранейшае месца. Падумаўшы, напісаў алоўкам, што ляжаў на стале, на агрызку паперы: «Чакаў, не дачакаўся. Прабач, што трохі ўзяў таго-сяго. У бліжэйшы месяц вярну. З глыбокай павагай начальнік геалагічнай партыі Іван Андрэевіч Іваноў». Паклаў запіску на сярэдзіну стала, задаволены сабой, агледзеўся і, пераканаўшыся, што ніякіх небяспечных для яго слядоў не пакінуў, пасунуўся з хаты, хоць вельмі хацелася ўлегчыся на нарах і паспаць. Але хто ведае, дзе гаспадар і калі вернецца, лепш не рызыкаваць і не сустракацца з ім. Ужо адышоўшы даволі далёка, ён падумаў, што дарма напісаў запіску. Той, вярнуўшыся,

убачыць, што няма ваеннага білета. А навошта ваенны білет Сімака Аляксандра Аляксандравіча начальніку геалагічнай партыі Івану Андрэевічу Іванову? Саліднаму чалавеку, кіраўніку. Навошта? Несалідна... Ажно спыніўся ад гэтай думкі Мірык, пахаладзела ўсярэдзіне. Хоць бяжы назад і забірай тую паперку. Паразважыўшы, усё-ткі вырашыў не вяртацца, далей, як мага далей на захад. Бліжэй да Мінска, да роднай зямлі, на якую цяпер вельмі хочацца ступіць нагой, адчуць урэшце, што ты вольны. Дый ён быў бы вольны праз тры месяцы, каб не Шчур са сваімі пацукамі. Яму расказвалі гэткія гісторыі яшчэ калі толькі апынуўся ў калоніі. Спярша не верыў, але ад жудасці замірала сэрца, і ён пачынаў праклінаць той дзень, у які з сябрукамі пайшоў у горад. І вось дачакаўся сам да такога лёсу, і фактычна выратавалі Мірыка салдаты, бо яны загналі Шчура ў раку. А ён з паўгода назад усё гадаў, чаму гэта наблізіў яго да сябе страшыдла Шчур, якога баяліся амаль усе зэкі ў калоніі. Бо Шчур стварыў сваю мафію і мог разлічыцца з любым, вырабляў, што хацеў, і ніхто не перашкаджаў яму. У яго былі нават сувязі з аховай. Аднойчы Мірык сам бачыў, як прапаршчык Перабурмыт перадаваў Шчуру чай і анашу, цыгарэты. З імі курыў і Мірык пасля таго, як Шчур наблізіў да сябе. Значыць, ужо тады Шчур рыхтаваўся да ўцёкаў, а яго падкармлівалі рознымі ласункамі. Шчур забіраў у таго-сяго мяса і аддаваў Мірыку. Некалькі разоў казаў: малайчына, вагу набіраеш, дужэйшым будзеш. І яшчэ гэтая поскудзь — прапар. Вырашыў за ягоны кошт выйсці сухім з вады, калі злавілі шафяругу з чаем і анашой.

— І-эх! — заскрыгітаў зубамі Мірык. Усё жыццё пайшло пылам, адзін страх вакол. Што наперадзе? Што? Ён углядаўся ў тайгу насцярожанымі вачыма, здольны біцца, рэзаць нажом, ірваць зубамі любога, хто цяпер пяройдзе яму дарогу. Вострае, амаль фізічнае жаданне дайсці да дому, прабіцца праз гэты чорны лясны гушчар, праз міліцэйскія засады ў гэты момантператварыла яго ў звера. Ён мог зрабіць такое, што ніколі не зрабіў бы ні у калоніі, ні выйшаўшы адтуль. Ён быў як паранены звер, небяспечны для кожнага, хто стане на яго шляху.

Ужо было халаднавата, але Мірыка ратаваў кажух. Дый не хацелася больш ісці. Але маладое цела хутка

прывыкла да нялёгкай хады, з'явілася сіла, якая дагэтуль спала, неабуджаная нават у калоніі. З кожным днём ён усё лягчэй і лягчэй дыхаў, порстка крочыў, рухаўся па тайзе амаль нячутна. Аднак запас прадуктаў памалу змяншаўся, і Мірык ужо на прывалах толькі варыў у бляшанцы з-пад кансерваў рэдзенькі крупнік.

Калі ў мяшку нічога не засталося, а ён зноў па дарозе пачаў шукаць ягады, Мірык выйшаў да чыгункі. Дзве чорныя каляі, як шнуркі, былі расцягнуты на поўдзень і на захад.

Было пуста і спакойна. Ён прылёг галавой да рэйкі і пачуў, як яна звініць. «Ідзе!» — узрадаваўся, нават не чакаў, што не давядзецца чакаць цягніка. І зноў пашанцавала яму. Праз якую гадзіну з-за павароткі, нібы з тунеля, выскачыў з тайгі цягнік. Гэта быў таварняк, на палове платформаў ляжала бярвенне. У канцы прычэплены вагоны...

4

Павел Піліпавіч сядзіць у сваёй будцы «Спортлато», аддае латарэі, забірае грошы. Палічыўшы іх, складвае ў цэлафанавы пакецік. Наўрад ці хто з міністэрства пазнае цяпер Паўла Піліпавіча. Ён у цёмных без аправы вялікіх акулярах, на галаве кепка, насунутая на лоб. Месяц назад адпусціў вусы. Рыжыя, тырчаць, як голкі ў вожыка. Пасівелыя валасы пафарбаваў хной, гэта параіў яму зрабіць Іканнікаў, і хоць жонка была супраць, паслухаўся яго.

Тры гадзіны ўжо сядзіць Павел Піліпавіч, а латарэй нешта купілі мала. Канечне, большасць пакупнікоў з'яўляецца пад вечар, калі ідуць з работы. Цяпер шмат людзей на вуліцы, толькі ён жа ў тунелі. Наверсе жвавей ішоў бы гандаль.

Хоць амаль змяніў сваю знешнасць Павел Піліпавіч, але не-не дый здрыганецца сэрца, калі ўбачыць былога саслужыўца, калегу па міністэрстве. Міжволі апускаў вочы ўніз да стала і рабіў выгляд, што лічыць грошы альбо нешта піша. На шчасце, за тры месяцы, што ён адседзеў у кіёску, ніякі знаёмец да яго не падышоў. Можа, таму, што міністэрства было ў процілеглым баку горада, а можа, ён сапраўды быў непазнавальны ў сваёй аклеенай квяцістымі афішамі будцы.

Гэты тыдзень ён павінен быў адпачываць, але ўпрасіў Іканнікаў падмяніць, нешта ў яго гарыць ці выгарае. Паабяцаў не пакрыўдзіць, а ў ягоных вуснах гэта значыць, што заплоціць, як ужо было аднойчы. Даў ажно дзевяноста рублёў, хоць Павел Піліпавіч іх з хвіліну не хацеў браць, гэта ж, лічы, месячны аклад. Аднак узяў і цяпер згадзіўся сядзець тыдзень у будцы толькі з-за дзевяноста рублёў... «Калі Іканнікаву яны гэтак лёгка дастаюцца, дык хай плаціць за паслугу»,— падумаў Павел Піліпавіч.

Ніяк не можа ён, усё-ткі змяніць сваю псіхалогію, характар думак, не можа пакуль забыць, што яшчэ ўчора быў кіруючым работнікам міністэрства. Эх, жыццё...

Учора ўвечары жонка казала, што бачыла Дубеля, як Павел Піліпавіч яго раней называў Дубля, стаяў за два крокі і нават не падышоў, не павітаўся з ёй. Вось таму і не хочацца бачыць былых саслужыўцаў. Унь той жа Дубель як скакаў ля яго, калі ён быў намеснікам міністра. Адзін момант, Павел Піліпавіч, адзін момант, Павел Піліпавіч...

Канечне, што ні кажы, але слабая, падатлівая душа у чалавека, любіць, калі нехта хваліць, называе разумным, таленавітым кіраўніком, знаўцам дзяржаўнага маштабу. Дубель быў простым інспектарам на ста сарака рублях. Ён тройчы жаніўся і пакутаваў язвай страўніка. Аднойчы яны зусім выпадкова паехалі разам у камандзіроўку. Нават не разам, а проста Павел Піліпавіч зрабіў такі прыгожы жэст — намеснік міністра ўзяў у сваю машыну радавога супрацоўніка, згуляў у дэмакратыю. Чатыры дні яны былі ў камандзіроўцы, і Павел Піліпавіч убачыў, як Дубель умеў дагадзіць начальству: проста класічна, непрыкметна і — арганізатар ён сапраўды таленавіты. Дзе б яны ні спыняліся, усё іх ужо чакала — ці то юшка на беразе возера, ці то шашлыкі, ці то, калі захацелася ўзяць з сабой ліпавага мёду — у багажніку «Волгі» ўжо стаялі два трохлітровыя слоікі.

Па дарозе дахаты Павел Піліпавіч неяк зусім выпадкова загаварыў, што вось-вось атрымае новую кватэру, а яе ж трэба было ўзяць і ў кафлю і ў дрэва, усё каб было, як у людзей. Больш нічога не казаў, але потым Дубель праз дзень дакладваў яму, што кафля ёсць найлепшая, унітазы, мэбля... Калі яны з жонкай пера-

ехалі ў новую кватэру, старую пакінуўшы сыну, яна проста зіхацела, усё было так, як толькі марылася... Увесь час, пакуль кватэра даводзілася да ладу, ключы былі ў Дубеля, а Павел Піліпавіч зрэдзь заязджаў і бачыў, што работа была наладжана, як на добрым прадпрыемстве. Вось калі ацаніў ён Дубеля, нечым трэба было аддзячыць чалавека, які паслужыў яму з добрай душой, пастараўся, каб жонка не хвалявалася, не перажывала, што іхнія сцены не горшыя, чым у іншых намеснікаў міністраў. Адна ж перад адной любяць выхваляцца больш за вясковых баб. Ну чым аддзячыць? Проста сказаць, што век буду помніць клопаты паважанага таварыша Дубеля — дык гэта ж глупства. Фарбы, шпалеры, кафлю Дубель купляў за свае грошы. Страты панёс, каб услужыць Паўлу Піліпавічу. І, на шчасце, як і думалася тады, пайшоў на пенсію начальнік аддзела эканамічнага аналізу, акрамя ўсяго, і член калегіі міністэрства. Кандыдатур, як заўсёды, было шмат на гэтую пасаду і з боку па рэкамендацыях партыйных органаў, і свае ж былі супрацоўнікі, пэўна, даўно чакалі моманту, калі нешта вызваліцца на верхніх прыступках іерархічнай лесвіцы міністэрства. Павел Піліпавіч, як першы намеснік міністра, адказваў за гэты аддзел, ён таксама курыраваў і кадравыя пытанні, безумоўна, таму вырашэнне падбору чалавека на пасаду шмат залежала ад яго. Пасля доўгага роздуму ён ужо і спыніўся быў на адным вельмі кемлівым і разумным хлопцу, кандыдаце навук, але зноў спатрэбілася паехаць у камандзіроўку. І на гэты раз з ім быў Дубель. Цяпер Павел Піліпавіч успамінае тую паездку з агідаю, дый ён спрабуе не ўспамінаць. Але, убачыўшы з акенца свайго кіёска Дубеля, ён чамусьці адразу падумаў, як яны ездзілі, пра вечар, ноч... Ён нібыта баіцца, што жонка разгадае ягоныя думкі, толькі іх не загоніш пад прэс...

К вечару яны, стомленыя, брудныя, у пыле, запыніліся ў маляўнічай хатцы, ля якой было яшчэ некалькі хатак, абгароджаных высокімі балясками. Павел Піліпавіч ля калодзежа памыўся халоднай вадой, паліваў яму Дубель, папіў, і стала лепш. Вакол стаялі людзі, якія з павагай, цярпліва чакалі, калі ён скончыць мыцца, падалі прыгожы белы ручнік, каб выцерся. У іхніх вачах Павел Піліпавіч бачыў адданасць і мо нават радасць ад таго, што да іх завітаў намеснік міністра.

Увайшоўшы ў хату, ён зразумеў, што яна не такая ўжо маленькая, як здавалася з вуліцы. Не менш як чатыры прасторныя пакоі былі ў ёй. Адразу за ўваходам праз маленькія сенцы ў пакоі ўжо стаялі засланыя абрусамі сталы, а на іх падавалі чатыры маладыя прыгожыя дзяўчыны, светлавалосыя, у нацыянальных беларускіх касцюмах і стройныя. А потым пачалася пагулянка. Ганаровае месца за сталом Паўлу Піліпавічу, усе амаль што глядзелі яму ў рот, слухалі кожнае слова. Дубель заліваўся салаўём, расхвальваючы і ўслаўляючы дабрадзейнасць намесніка міністра. Спявалі песні, але больш пяцідзесятых гадоў, паспрабавалі пачаць хоць якую беларускую, аказалася, што ніхто не ведаў ніводнай. Урэшце, дзяўчаты завялі «Касіў Ясь канюшыну...». К гадзіне адзінаццатай... Танцы, шманцы... Гэта яшчэ помніў Павел Піліпавіч, а потым — туман у галаве. Прачнуўся раніцай, а пад бокам дзеўка, танцаваў з ёй быццам; ён і яна — у касцюмах, як пішуць, Адама і Евы... Затрымаліся яшчэ на паўдня. Выехалі на Мінск толькі пад вечар, галава гудзела, што барабан, настрой быў вельмі паганы, хоць Павел Піліпавіч усміхаўся, смяяўся і нават расказваў анекдоты. Пра палітычнага дзеяча, якому пашыралі грудзі, бо не было ўжо куды вешаць ардэны і медалі.

Калі да Мінска заставалася ўжо нямнога, але яшчэ на добрую гадзіну язды, Дубель прапанаваў спыніцца і трохі падыхаць свежым лясным паветрам. Павел Піліпавіч з радасцю згадзіўся, бо яму было душна, а шкло ў дзверцах не апускалі: баяўся прастуды.

Яны адышлі ў лес, які ў гэты летні час быў вельмі прыгожы, ціхі, пастаялі трохі. І ўжо душа Паўла Піліпавіча пачала супакойвацца, забываць пра паляўнічую хатку і дзяўчыну Люду, у якой ён тэлефон усё-ткі ўзяў, проста так, а раптам некалі зноў закіне лёс у гэты раён і чаму тады не пасядзець разам з кубкам кавы ці чаю.

Ён сам загаварыў пра міністэрскія справы, што варта ўжо прызначыць чалавека на пасаду начальніка аддзела эканамічнага аналізу, яму патрэбна вырашыць гэтае пытанне. Назваў хлопца Дубелю, неяк проста, па-хатняму, як сыну ці брату, найлепшага кандыдата, на ягоную думку. І быў страшэнна ўражаны, калі пачуў:

— Вы не таго кандыдата назвалі.

— Чаму, я не памыліўся. Ведаю ж яго...

— Усё-такі не таго вы назвалі чалавека,— паўтарыў Дубель.

— Цікава, а каго ж я магу назваць? — шчыра здзівіўся Павел Піліпавіч.

— Мяне... І толькі мяне,— рашуча вымавіў Дубель.— Я маю поўную падставу прэтэндаваць на гэтую пасаду. Я, і толькі я, Павел Піліпавіч.

— У вас жа не тая кваліфікацыя, дый вы нават не намеснік начальніка аддзела. Вопыту такой работы не маеце...

— Вопыт набуду... Мне здаецца, я заслужыў права заняць гэтае месца. Вы што, так не лічыце?!. Ці ў мяне няма арганізатарскіх здольнасцей?

— Чаму ж...— разгублена сказаў Павел Піліпавіч.— Чаму... Але ж, гэта неяк нечакана. Вы і раптам — начальнік аддзела эканамічнага аналізу.

— Нічога. Гэта залежыць ад вас.

— Не толькі ад мяне.

— Безумоўна, але думаю, вы зробіце ўсё магчымае, каб я заняў гэтае месца. Вы пераканаліся ў камандзіроўках, што я вельмі здольны... Я шмат магу, і памылкай не будзе, калі зробіце, як кажу. Будзем лічыць, што мы вырашылі пытанне... Думаю, у вашых інтарэсах, Павел Піліпавіч, прыняць для гэтага, як кажуць, неабходныя меры. Не мне вас вучыць.

— Так, так...

І ён змог пераканаць міністра, што найлепшы кандыдат на пасаду начальніка аддзела эканамічнага аналізу Дубель і што гэта якраз у духу часу, калі простага супрацоўніка прызначаюць кіраўніком. Расхвальваў, двойчы ўспомніў у дакладзе на калегіі. Раніцой, спаткаўшыся з ласкавым, адданым позіркам Дубеля, у думках лаяўся і як хутчэй абмінаў яго, праклінаючы той дзень, калі яны разам паехалі ў камандзіроўку. Лёгка і проста яго купілі, зацiснулі ў такія абцугі, з якіх не вырвацца ніколі. Дубеля, канечне, прызначылі, а праз паўгода зрабілі і членам калегіі. І на апошняй калегіі, на якой разглядалі ягоную справаздачу, першы, хто распачаў па ім крытыку, быў Дубель. Ён ледзь не біў сябе ў грудзі, гаворачы аб сваёй прынцыповасці і беспрынцыпнасці Паўла Піліпавіча, які надта ж далёка адстаў ад прагрэсу, ад машыны паскарэння. Адстаў, мог бы пабегчы, але ўжо не... Калі машына па кузаў у гразі і гноі, дык надта ж цяжка

ехаць, трэба рота салдат, каб выштурхнуць яе, альбо мацнейшая машына, якой дагэтуль яшчэ няма. Штохвілінна роту салдат не прыгоніш на кожную дарогу, а машыны няма... І, седзячы ў кіёску «Спортлато», ён мог нават радасна пасмяяцца, гледзячы, як усё гавораць, абмяркоўваюць, за што ўчапіцца, каб штурхнуць і каб не выпацкаць рукі.

Сяды-тады ўзнікае ў Паўла Піліпавіча думка, хоць ён і стрымлівае яе, але, калі прачытаў сёння ў газеце «Звязда», што ў Цэнтральным Камітэце адбылася нарада, на якой таксама выступаў Дубель, яна неадступна стаіць у галаве. Нават калі заняты ўспамінамі альбо разлічваецца з пакупнікамі. Канечне, было б вельмі няблага напісаць ананімку, што-небудзь дый знойдуць. Не могуць у Дубеля не знайсці. І ў канцы пісьма намякнуць, што ён прыслужнік міністра, бярэ хабар мёдам, мясам... Не можа быць, каб не браў. Адказны супрацоўнік міністэрства, пакуль што і як — і ўзнікне нешта. Нічога, што нібы не разглядаюць ананімкі, нічога. Гэта на паперы. У нашай краіне яшчэ міне шмат часу, калі адмовяцца ад ананімкі. Яна будзе датуль, пакуль жывы страх. А раптам — новы Берыя, Шчолакаў, Брэжнеў... Чыноўнікі, бракаробы — лае ў думках сваіх былых калег Павел Піліпавіч. Гэта яны вінаватыя, што ў магазінах гандлююць халтурай і яшчэ па высокай цане, што не хапае пятага, дзесятага. Нябожчык Машэраў на пленумах абураўся, што ў магазінах не было жаночых калготак. Што б ён казаў цяпер, калі невядома, што ёсць. Давялі краіну дзялкі дарэшты. Сядзяць, аклады добрыя маюць, а рабіць не хочуць нічога. «У, гультаі!» — мармыча сабе пад нос Павел Піліпавіч. Зусім інакш было, калі ён працаваў, інакш...

Давялі краіну да анархіі, да краху, дакіраваліся гэткія ні на што не здатныя Дубелі.

І ўсё-ткі трэба напісаць, толькі абавязкова левай рукой, бо почырк ведаюць у міністэрстве, хоць наўрад ці падумаюць на яго. Няхай сабе думаюць, абы праўда. Ён мае, нарэшце, сказаць сваё слова, супакойвае сябе Павел Піліпавіч. Ён навучыць іх розуму, дасць клопату, каб трохі варушыліся, думалі аб народзе, а не толькі аб уласным пузе. Трэба скінуць Дубеля, гэтага ўнутранага дыверсанта. Покуль шчэ не позна, інакш дакіруе ўжо ён... Чыноўнікі, бюракраты. Унь зноў план павя-

лічылі на продаж латарэй, гэта іхняе паскудства. Усё мала ім прэмій, грошай.

Паўпусты падземны пераход, толькі зрэдзь пройдзе чалавек. Яшчэ гадзіну-дзве будзе сумота, а потым змена на заводзе скончыцца, і рабацягі заварушацца, хлынуць ракой. Хоць бы план выцягнуць, без прэміі не застацца... Вочы Паўла Піліпавіча зачапілі высокую, хударлявую постаць у чорным скураным паліто. Няйнакш сусед па дачы, Зушчыц Вацлаў Казіміравіч. Ідзе ганарыста, памахвае дыпламатам і вачыма зырк-зырк на сустрэчных жанчын. На маладую, з доўгімі светлымі, як салома, валасамі, нават азірнуўся. Усмешка на твары, задаволенасць жыццём, самаўпэўненасць. Вось яшчэ б на каго напісаць, на гэтага прафесара. Дзяўчат маладых на дачу возіць і, напэўна, хабар бярэ, не можа не браць. З такімі вачыма і постаццю абавязкова ў нечым замешаны, акрамя жанчын. Дача, дача якая!.. Што ў яго, былога першага намесніка міністра, ёсць? Цьфу, пыл!..

## 5

Думкі, думкі весялушкі!  
Скуль вы ўзяліся,  
Што ў мыслях, нібы птушкі,  
Песняй азваліся?  
Ці павеяў вецер вольны,  
Што па горах скачэ,  
Што у плоце, як бяздольны,  
Па сіротках плачэ?

*Беларуская народная песня*

Гэта добра, што лес амаль падыходзіў да самага Сэльца дый балота з грыўкамі маладой альшыны — там якраз і можна было прапаўзці, падабрацца незаўважна да вёскі. А куды яму выбірацца, рухацца, яшчэ раней чуў, што карныя атрады рускіх перакрываюць дарогі, усе выхады з лясоў і пушчаў. Навокал чужы свет, насцярожанасць, страх, хто падтрымае, дапаможа? Хто дасць скарынку хлеба, глыток вады, калі на слупах і дрэвах вісяць такія, як ён. Спалох пануе, святкуе перамогу. Калі наканавана памерці, дык трэба хоць хвіліначку паглядзець на дзяцей, жонку, родную хату, а пасля, ну што ж... Значыць, такая ў яго

доля. І зноў ён усё думае толькі пра сябе, пра сваіх дзяцей і жонку, а хто цяпер падумае пра родных і блізкіх таварышаў, якія склалі галовы ў Дзедаўскай пушчы. Ён, іхні камандзір, яны аддалі свае жыцці ў ягоныя рукі... Як гляне ў вочы іхніх жонак і дзяцей. Чаму ты вярнуўся, жывы і здаровы, змагар за волю, за шчасце свайго беларускага народа, а астатніх пабілі? Камандзір павінен памерці з байцамі, але ён не можа ўвагнаць сабе нож у жывот, яму ўсё-ткі вельмі хочацца пабачыць дзяцей і перадаць ім усю праўду, каб запомнілі яе і зберaглі, перадалі наступным пакаленням, каб таксама змагаліся за волю, за родную Беларусь. Калі надарыцца так, што спаткае салдат,— ён гатовы памерці, хай застрэляць яго ці павесяць. Пасля смерці таварышаў нічога не страшна, але ж усё-ткі, каб зазірнуць у вочкі дзетак, ён так даўно не бачыў іх. Лічы, ад самых грамніц. З таго часу, як уначы пастукаў у дзверы чалавек са Слоніма і перадаў загад з Гародні — узбройвацца і змагацца. Узбройвацца і змагацца... Ён падняў і павёў сваіх знаёмых з маленства людзей, старэйшых і маладзейшых за яго, якія паверылі ў шчаслівую долю.

Што чакае яго наперадзе: шыбеніца альбо расстрэл на месцы. Не, відаць на Алендрах. Яму ўсё роўна, толькі не трэба, каб бачылі ягоную смерць дзеці. Дзеці не павінны глядзець, як вешаюць ці расстрэльваюць іхніх бацькоў.

Аўгуст-Рыгор выпаўз з зарасніку маладой альшыны, якая, быццам падкова, апаясвала выжар і амаль датыкалася да каталіцкіх могілак. З капліцы чуўся глухі, панылы звон. Няйнакш некага хаваюць, таму што імшу правілі ў касцёле на Месце. «Нехта памёр ці забілі»,— падумаў ён.

Дзень быў пахмурны, і хоць яшчэ сярэдзіна яго, але быццам ужо вечар агарнуў сваёй шэрасцю вёску, і пастаўнік, і выжар, па якім неяк трэба незаўважна прабрацца да агародаў, а там бульбай, па разоры — і ў клуню, дзе можна будзе прыхавацца, пакуль зусім не змеркне, і мо жонка выйдзе на двор. З могілак у гэты бок ніхто не ішоў, толькі на полі Угліка Яся варушылася баба, ці не матка яго. Не дай бог убачыць, адразу спытае пра Яся, што адкажа ёй? Заўтра паўвёскі даведаецца пра яго, Аўгуста, вяртанне, і ўжо не схаваешся нідзе...

На шчасце, баба не затрымалася доўга ў агародзе, з поўным кашом зелля пацягнулася да двара, ледзь павалакла старая сваю ношку. Уся ў шэрым нефарбаваным зрэб'і, падышла да хлява і як растала, зусім не відаць. Падумаў Аўгуст, што і яго не надта ўбачыш, бо і ён у даматканай, самаробнай вопратцы, толькі кашуля і нагавіцы пачарнелі ад поту і гразі, парваліся на каленях, дый ззаду ўжо, мусіць, свіціцца. У руках пустая торба і за плячыма торба, нібы жабрак. Твар зарос сівой барадой, ніякай зброі, акрамя нажа, няма. Пісталет выкінуў.

Па густым высокім аеры, як па альшыне амаль, прапоўз да свайго плота, паднырнуў пад ніжнюю баляску і — вужом у разору. Толькі над галавой вецер варушыць бульбоўнік, шаргаціць ім. Ніколі не думаў, што дахаты будзе вяртацца на пузе, хаваючыся ад людскога вока. Уся ж вёска ведае: Аўгуст — касіянер, нават камандзір касіянераў.

Ён дапоўз да клуні, стаіўся, прыслухоўваючыся, але, здавалася, нічога падазронага не чуваць. Ужо намерыўся падняцца з разоры і мо пайсці проста ў хату, а не дык залезці на гару і там трохі перачакаць. Стукнулі дзверы, і чужы чалавек выйшаў на двор. З ягонай хаты выйшаў салдат, а праз якую хвіліну яшчэ адзін. Яны закурылі, перакінуліся некалькімі словамі і, павесіўшы стрэльбы на плечы, падаліся на вуліцу. Адзін з іх усё калупаўся ў роце, пляваўся і бурчэў.

Аўгуст прыціснуўся да зямлі і дыхаць перастаў, нагой і рукой не варухнуў, пакуль зусім не сціхлі крокі рускіх. «Што ім трэба было тут, чаго былі ў хаце?» — заскакала думка ў галаве. Няўжо да сям'і прычапіліся, мо ў хаце няма ні дзяцей, ні жонкі? Мо дзе павезлі іх у Сібір? Не, трэба ўсё-ткі дачакацца ночы, столькі вытрымаў і яшчэ трохі паляжыць на гэтай сырой зямліцы, але затое роднай. Хоць і холад пачынае працінаць цела і хочацца есці. Мо гэта апошняя яго дарога ў жыцці, і стаіць ён ля парога, за якім канец. Толькі б дзяцей пабачыць і жонку. Да іх засталося з дзесятак крокаў, а ён не можа пераадолець, знямогся, і страх, перасцярога прыціскаюць да зямлі, прымушаюць чарвяком паўзці па разоры, якую ўвесну сам зрабіў, клапоцячыся аб сям'і, каб не галадала. Калі бульба ёсць на стале, значыць, голад не страшны.

Зноў зарыпелі, непрыемна завішчэлі на нязмазанай завесе дзверы; няйнакш і перакасіліся без гаспадара. Усё-ткі ёсць шчасце: выйшла жонка Гандзя, раней часу састарэлая, худая ад бясконцых клопатаў, перажыванняў. Прыпынілася, выглянула на вуліцу і амаль бегма да клуні. Вочы напалоханыя, твар белы, і дрыжыць уся. Маўчала, углядалася ў бульбоўнік, на выжар пазірала, а потым ціхенька: «Аўгуст... Аўгуст...»

— Я тут,— ледзь чутна сказаў ён. Але сілы зусім пакінулі Гандзю, і яна проста ўпала грудзямі на вароты. Аўгуст ускочыў з зямлі, падбег да жонкі і падхапіў за плечы. Адцягнуў яе пад паветку, якая была ззаду клуні.

— Я адчула, што ты недзе побач,— прашаптала Гандзя,— баялася, каб не зайшоў, пакуль былі салдаты ў хаце.

— Чаго яны былі?

— Гэта ў пакаранне. У кожную хату паставілі салдат. Цалюткі полк у вёсцы. Каб кармілі іх і паілі.

— Свалата...— ён ажно скрыгануў зубамі. Самім есці няма чаго, хлеб напалову з карой. Спытаўся: — Мяне не шукалі?

— Ціха пакуль. Да касцёла павезлі шмат параненых, і касцёл разбураюць. Нібыта царкву збіраюцца будаваць.

— А дзе параненыя? — падумаў, што мо нехта са знаёмых там альбо хто з атрада.

— Ля касцёла на плошчы. На зямлю кладуць.

— Дзеці спяць?

— Да бабы пабеглі...

Баба Агата, маці Аўгуста, жыла на другім канцы вёскі. Мо гэта і добра, што іх няма дома, хоць і хочацца пабачыць.

— Паесці што ёсць?

— Бульбы трохі засталося ад салдатні. Пайшлі паясі.

Ён нібыта праглынуў бульбіны, нават не адчуўшы смаку. Гандзя пашукала на паліцы і знайшла праснака, аддала яму. Таксама імгненна з'еў. І тады наліла яшчэ міску капусты, хоць і нішчымнай, але гарачай і смачнай. Вось цяпер ён збольшага пад'еў, і адразу моцна пачало хіліць у сон. Таму падняўся з услона, стаяў, пагойдваючыся, як ап'янелы, і хмурыўся.

— Паспі,— пацягнула Гандзя яго за рукаў з хаты

ў камору, дзе ляжала некалькі аўчын, прыгатаваў яшчэ ўзімку на кажух, але не было калі шыць яго. Ён прылёг і мо заснуў, таму што нібы нырнуў у яму і амаль адразу, так здалося, ачуўся, асалавелымі вачыма агледзеўся. Убачыў, што ў сваёй каморы, толькі не мог спярша зразумець, як трапіў сюды. Свядомасць вярталася марудна, але, яскрава выяўляючы мінулыя дні, часіны, яна прымусіла падняцца з аўчын, сесці і з трывогай прыслухацца. Усё было спакойна, быццам недзе зусім недалёка не стралялі, не вешалі людзей. І, мабыць, сярод іх былі ягоныя таварышы, і нехта трапіў у рукі салдат параненым, бездапаможным. Ён жа ляжыць у цяпле, сыты, а за сцяной жонка. Ці ж гэта справядліва, ці ж гэта правільна, калі хлопцы даверылі яму свае жыцці? Ён нікуды не варты камандзір, таму што, мусіць, больш думаў пра сям'ю, чым пра атрад.

Аўгуст усхапіўся з аўчын і, нячутна ступаючы пасталамі па глінянай падлозе, падышоў да дзвярэй у хату. На хвіліну прыслухаўся і рашуча ступіў з сенцаў на ганак.

На вуліцы брахалі сабакі, чуліся гучныя грубыя галасы. Гаварылі па-руску і смяяліся. Аднак ён не спалохаўся гэтых чужых людзей, толькі выцягнуў з анучы нож і схаваў яго ў прызбе. Рашуча пакрочыў насустрач салдатам. Толькі пачуў ззаду ціхі ўскрык і зразумеў, што гэта жонка, але не азірнуўся нават.

Спаткаўся з салдатамі праз тры хаты. Іх ішло чацвёра, у нянавіснай для яго вопратцы, са стрэльбамі, яшчэ зусім маладыя. Ён спадылба глядзеў, пільна сачыў за іх паводзінамі і нічога небяспечнага не прыкмячаў.

Аўгуст вырашыў ісці толькі па сцежцы і не зыходзіць убок. І амаль расчаравана, хоць і супакойваючыся, уздыхнуў, калі яны параўналіся і прапусцілі яго, нават не глянуўшы, што за чалавек трапіўся насустрач. Як ішлі гамонячы, весела пасміхаючыся, так і пакрочылі, нібыта абмінулі дрэва ці студню, а не былога камандзіра атрада інсургентаў. «Ведалі б яны, каго спаткалі,— падумаў Аўгуст, зараз жа штыкі наставілі б у спіну».

Ля могілак ён убачыў суседку Бочыліху, якая ажно вочы вылупіла ад здзіўлення. І ўсё-ткі нічога не спыталася, толькі вітаючыся хітнула галавой. Потым ад-

некуль з-за Дамінікавага агарода выскачыла Рагнеда Варажбіцкая. Ласкава, прыязна мовіла: «Дзень добры, дзядзьку!» — і пакланілася яму. І ён схіліў трохі сваю стомленую, здарожаную постаць. Размаўляць не хацелася, хоць і імкнулася кабета перамовіцца з ім слоўкам. У атрадзе быў яе дзядзька, Міхал Варажбіцкі. Тыдзень назад пад Морматавам пахавалі яго, не дагнала яго куля руская, памёр ад нейкай хваробы. «Пасля раскажу пра кожнага, толькі пасля...» — думаў Аўгуст і адразу спытаў сябе, а ці будзе гэтае «пасля». І ўсё роўна нічога не паведаміў ён Рагнедзе, а пайшоў шпарчэй да Места, дзе, было чуваць, сабралася шмат людзей і ляскала жалеза аб жалеза, грукала нешта цяжкое аб зямлю.

Яшчэ некалькі чалавек спаткаў ужо на сцежцы і чым бліжэй быў да плошчы, тым усё больш траплялiся на вочы салдаты, якія ішлі і з афіцэрамі і самі па сабе. Кожны меў у руках стрэльбу, было такое ўражанне, што вёску ператварылі ў ваенны лагер.

Шмат людзей пабачыла ўжо Аўгуста, і нехта мог, канечне, выдаць яго рускім, зарабіць на ім капейчыну. Пакуль, аднак, ніхто з чужых не спыніў, не запытаў, хто такі і навошта ходзіць тут. Надта ж у яго была звычайная мужыцкая знешнасць, і блізка нішто не напамінала ў ім паўстанца.

Ён апынуўся на плошчы, якую спаконвеку называлі Места. Яна цяпер была як мурашнік. Адны людзі адыходзілі з яе, другія заязджалі з вазамі, трэція разбуралі чырвонагаловы касцёл. Гоман стаяў як на кірмашы, калі ладзілі яго пасля яблычнага спаса. Зараз не было відаць ні яблык, ні гусей, ні кур. На вазах не было гаршкоў, не крычалі гаршкалепы, запрашаючы купіць іхні тавар. Толькі, як лаянка, гучалі над Местам каманды афіцэраў, і салдаты дружна тупалі ботамі, размахвалі стрэльбамі.

І ў першае імгненне, збянтэжаны незвычайным малюнкам, які разгарнуўся перад ім на плошчы, мноствам людзей ён нават крыху разгубіўся і забыў пра тое, дзеля чаго ішоў сюды. Але гэтая збянтэжанасць ягоная была нядоўгай, ён увесь унутрана напяўся, ператварыўся зноў у асцярожнага і пільнага паляўнічага альбо хутчэй у звера, што пастаянна помніць пра небяспеку. Канечне, сівая барада, выраслая за час блукання па пушчы, змяніла яго з твару, намнога састарыла і нават

добра знаёмы мог не пазнаць. Але Аўгуст не думаў ужо аб гэтым, у вёсцы і так ведалі, што ён тут.

Яго насцярожаныя вочы агледзелі плошчу, але пакуль таго, што патрэбна, не прыкмецілі. Шмат стаяла вазоў, але больш усё з ваенным рыштункам, і гэта былі фуры, каля іх паходжвалі фурмацкія салдаты. Унь расклалі вогнішча і вараць сабе, мусіць, кашу. Некалькі салдат паляглі на траву, а адзін, стоячы, штосьці апавядае, і ўсе рагочуць.

Аўгуст падхапіў з зямлі кіёк і, згорбіўшыся, паваloкся да рамізні. Зноў з нізка апушчанай галавой, але вочы пільна ўзіраліся, аглядвалі кожнага, хто сустракаўся на шляху. Ён усё прыкмячаў, складваў у памяці. І, бачачы афіцэраў, шкадаваў, што без зброі, хоць некалькі застрэліў бы іх. Ну і яго, вядома, таксама не адпусцілі б жывым.

Чорт з ім, калі ўвесь атрад загінуў...

За дзесятак крокаў ад рамізні ён спыніўся і адчуў, як халадзеюць ногі і рукі: убачыў тое, чаго баяўся, ідучы сюды. Вакол, дзе на траве, а дзе і на голай зямлі, упокат ляжалі параненыя і бездапаможныя інсургенты. Іх амаль не ахоўвалі, калі не лічыць двух вартавых, якія паходжвалі ля крамы Еселя. Але вось аднекуль з кустоў вынырнуў афіцэр, нешта закрычаў на іх, урэзаў аднаму па мордзе, пасля другому, і яны разышліся па баках, закрочылі ўзад-уперад. Аўгуст не спыніўся, памалу набліжаўся да рамізні, яму трэба было быць з таварышамі.

Вартавыя яго не запынілі, мо нават не звярнулі ўвагі, бо знешне ён быў як жабрак, дзядок, знясілены голадам і бясконцай дарогай. І ён пайшоў між параненых, узіраючыся ў твары і нікога не пазнаючы, усё былі незнаёмыя сяляне, якія па волі лёсу трапілі ў палон. Яму хацелася падтрымаць іх дух, сказаць нейкае важкае слова, але не знаходзіў яго, толькі вусны раптам прашапталі: «Трымайцеся, трымайцеся...» І з гэтым шэптам рухаўся, марудна пераастаўляючы ногі, як пазбаўлены сілы. Павярнуўшы галаву, ён убачыў, што да яго набліжаецца той самы афіцэр, які лупцаваў вартавых, але не заспяшаўся, бо страху ўжо не было.

— Эй! — пачуў ён ззаду крык. Аднак Аўгуст ніяк не зрэагаваў, нібыта яго гэта і не датычылася. Перад ім ляжалі таварышы па змаганні, пакрыўджаныя, у чаканні свайго канца. Што ў іх наперадзе смерць,

ён не сумняваўся. І зноў ззаду ўжо злоснае і рашучае:

— Эй, мужык!

Ён угнуў яшчэ больш галаву, цягнуўся, падымаючы пасталамі сівы пыл. Яго спыніў моцны штуршок у спіну. Афіцэр быў у чыне штабс-капітана, з даўжэзнымі вусамі, здавалася, ажно закручанымі за вушы.Ягоныя вочы пачырванелі ад злосці, вылупіліся як два галубіныя яйкі. У руках трымаў нагайку з пасярэбранай ручкай, вельмі ж прыгожую і балючую — адчуў на сваіх плячах Аўгуст. Афіцэр перацягнуў яго раз, пасля яшчэ. Іншым разам ён ухапіў бы за гэтыя вусы, даў бы ў лыч так, што ляцеў бы, задраўшы ногі. Іншым разам, а цяпер толькі схіліць галаву і сціснуць кулакі. Больш нічога не застаецца.

— Іваноў, Сакалоў! — ужо крычаў афіцэр, і вартавыя, бухаючы ботамі, падбеглі да іх.— Дзе вашы вочы? — і па мордзе ім, і па мордзе. Яны выцягнуліся, церпяць. «Цярпіце, цярпіце»,— падумаў Аўгуст, і раптам як асвятленне найшло на яго. Набраў у рот пабольш паветра і зацягнуў:

Зялёны дубочак,
Шырокі лісточак.
Куды вецер вее,
Туды голлі гнуцца.

— Молчать! — гаркнуў афіцэр.— Марш отсюда, чтоб духа не было-с!

Куды вецер вее,
Туды голлі гнуцца.
Па ветры да мілай
Ўсе весці нясуцца.

Ён ішоў між параненых і голасна выспеўваў, старанна выводзячы кожны радок. Калі ёсць тут яго таварышы, дык пачуюць. Гэтую песню яны не раз зацягвалі ў час пярэдыху. Зацягваў Усяслаў Радзімірка, потым падхоплівалі ўсе. Яны любілі гэтую песню.

Ён абышоў усё Места і нікога з таварышыў не знайшоў. Толькі пад канец здалося, нібыта з перабінтаванай галавой і звязанымі рукамі дзядзька быў Усяслаў Радзімірка. Але калі гэта быў ён, дык чаму не засяваў?

Канечне, вёска ведала, што ён камандаваў атрадам касіянераў і што ён вярнуўся дамоў, але яна маўчала. І з ім віталіся гэтак жа, нібыта бачыліся толькі ўчора, спакойна і нават ціха, як з любым іншым аднавяскоўцам.

## 6

Цягнік татахкаў коламі на стыках рэйкаў, гойдаўся вагон, а за акном уцякаў назад ад вачэй Корзуна лес. Здаецца, ніколі ў гэты бок не ездзіў яшчэ. Часцей за ўсё выязджаў пад Барысаў альбо на Гомельскім напрамку, ля Асіповіч жыла іхняя далёкая сваячка, гасцінная цётка Наста. У яе быў свой агарод, дзе ўжо ў жніўні падрастала ўдосталь агуркоў, памідораў і на чатырох яблынях паспявалі яблыкі. Усё гэта цяпер у мінулым...

Жонка, прыхіліўшыся да сценкі, відаць, драмала, дзеці, прыціхлыя, сумныя па-даросламу, з журбой у вачах, сядзелі моўчкі і таксама глядзелі ў акно. Было шкада іх, адно супакойвала, што з імі ён, бацька і маці. І малым перамена месц дый жыхарства праходзіць лёгка, без трагедыі, надта ж слабыя яшчэ карані ці нават карэньчыкі. Вось яму абрываць свой корань, які глыбока ў зямлі, вельмі балюча і, галоўнае, хоць быццам ужо абарваў, але страшна. Страшна, ці прыжывецца на новым месцы, ці будзе... А жонка дрэмле. Якая спакойная ў яе душа, быццам едзе ў адпачынак па пуцёўцы на Чорнае мора.

Калі не адпускалі, тады хацелася ехаць, а зараз, на здзіўленне самому, і жадання таго няма. Хоць і сядзіць з усёй сям'ёй у гэтым вагоне.

Апошнім часам наогул шмат дзіўнага пачалося. Адны вяртаюцца адтуль, а другія едуць туды. І ў кожнага свая праўда. Кожны думае, каб было яму лепш. Усплыло ў памяці з Плутарха: «На шляху ў Вавілон да Аляксандра зноў далучыўся Неарх, караблі якога ўвайшлі ў Еўфрат з Вялікага мора. Неарх паведаміў Аляксандру, што яму сустрэліся халдзеі, якія прасілі паведаміць цару, каб ён не ўступаў у Вавілон. Але Аляксандр не звярнуў на гэта ўвагі і працягваў свой шлях...» Усміхнуўся: які ён Аляксандр, хоць ужо і сустракаў халдзеяў. Калі ідзе лавіна з гор, яе немагчыма спыніць і нават не толькі лавіну, але і адзіны каменьчык набірае хуткасць ядра, якое ляціць з гарматы. Трэба забыць, мабыць, і Плутарха, і Талстога, і Булгакава, ці патрэбны цяпер яны? Аднак без іх ён наогул нічога сабой не ўяўляе. На што ён здольны, акрамя як перастаўляць кнігі, чытаць, думаць аб прозе і паэзіі, хоць сам ніколі не напісаў ніводнага

радка, але ўсё жыццё карміўся за кошт іх і карміў сям'ю.

Ён проста кніжны чарвяк, толькі здольны напаўняць сябе зместам кніг. Чарвяк, які вырашыў паездзіць па свеце, які ўявіў, што за жалезнай заслонай стане лебедзем.

З кожным днём ён адчуваў усё больш: яго напаўняе скептыцызм і нешта яшчэ — толькі не мог пакуль зразумець што.

Жонка нават патроху пахрапвала, дзеці, прыціснуўшыся адно да аднаго, глядзелі ў акно. Корзун, асцярожна прычыніўшы за сабой дзверы, выйшаў у калідор. Некалькі мужчын тут стаялі і курылі, а ён думаў, адкуль гэтак пахне цыгарэтным дымам. Хай бы курылі сабе ў тамбуры, падумаў ён, але ніякай заўвагі курцам не зрабіў, смеласці на гэта не хапіла, дый не прывык ён рабіць заўвагі.

Корзун прачытаў у паперцы насупраць купэ праваднікa, што ў Брэст яны прыедуць у 19... Яшчэ ехаць было каля трох гадзін. Ён павярнуўся і ўбачыў правадніцу, маладжавую жанчыну, якая піла чай і чытала тоўстую кніжку ў чырвонай вокладцы. Што яна чытае, раман ці зборнік апавяданняў і аповесцяў? Урэшце, ці не ўсё роўна, мо дэтэктыў? Ён не любіў чытаць дэтэктываў і не мог паважаць чалавека, які захапляецца імі. Толькі аднойчы, пачуўшы пра «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча, узяў і прачытаў. Пасля доўга здзіўляўся, што яму твор спадабаўся. Дый мо гэта ўрэшце быў комплекс у яго наконт дэтэктываў. Мільёны людзей знаходзяць проста асалоду, чытаючы іх. Якім попытам карыстаецца гэтая літаратура, ён ведаў выдатна, працуючы ў бібліятэцы.

Якая ж гэта кніга? Проста цягнула яго да праваднiцы. Толькі хацелася пабачыць назву, і ўсё. Але яму не хапала смеласці пераступіць парог купэ і спытацца. І жанчына заўважыла яго ваганні, яе голас прагучаў проста і будзённа:

— Вы нешта хацелі?

— Прабачце, якую вы чытаеце кнігу? — сказаў Корзун.— Мне здаецца гэта... «Трыумфальная арка» Рэмарка?.. Ці не ўгадаў я?

— Ах, мужчыны, мужчыны, — заўсміхалася праваднiца,— што толькі не прыдумаеце, каб пазнаёміцца.

— Не... Вы разумееце...— зусім сумеўся Корзун.— Справа ў тым, што...

— Ну, канечне, як мяне завуць? Вы гэта хацелі спытацца,— бліснула чорнымі вачыма праваднiца.— А калі жонка ўбачыць, што са мной гаворыце?

— І што,— з нязвыклай для сябе рашучасцю сказаў Корзун.— Мне цікава, якую чытаеце кнігу. Справа ў тым, што я спецыяліст па кнігах.

— Пісьменнік? — на твары ў праваднiцы здзіўленне.

— Не, толькі бібліёграф... Можна, я сяду?

— Сядайце, калі ласка,— яна адсунулася да акна, паклала кнігу на столік, і Корзун узяў яе ў рукі. Гэта быў першы том рамана «Граф Монтэ-Крыста». Зазірнуў у старонку, якую чытала ў гэты момант праваднiца: «Першага верасня Марэль вярнуўся. Усё сямейства з вялікай трывогай чакала яго; ад гэтага падарожжа ў Парыж залежала апошняя магчымасць выратавання...»

— Вам падабаецца? — спытаў, бо цяпер трэба было нешта казаць.

— Канечне. Такія кніжкі я люблю. Сяброўка дала пачытаць. Сабе хацела купіць, але на вачах апошнюю забралі. Гэта ж «Граф Монтэ-Крыста»! А вы што, не любіце?

— Чаму... Чытаў.— Корзун чытаў гэтую кнігу гадоў дваццаць назад, яшчэ ў школе.— Мусіць, вы шмат кніжак чытаеце ў дарозе.

— Скуль. Няма часу. Мітусня, мітусня. Гэта вольная хвіліна выдалася, дык прысела. Думаю, што ж далей з бедным Эдманам Дантэсам. Такі прыгожы хлопец... А тут унь як лёс з ім абышоўся. Бачу, з сям'ёй некуды едзеце, далёка сабраліся?

— Далёка,— ён незаўважна для сябе ўздыхнуў, але наўрад ці звярнула на гэта ўвагу праваднiца. Відаць, яна любіла пагаварыць і ўзрадавалася, што знайшоўся чалавек паслухаць яе.

— Ой, людзі едуць, едуць. Возіш іх, возіш і канца краю няма.

— Відаць, вам падабаецца гэтая работа?

Падабаецца не падабаецца — прывыкла, недзе ж трэба рабіць. Прывыкла да людзей... Ездзіш, каго толькі не пабачыш... Зараз трохі менш стала, а помню адзін год столькі ехала ў Брэст, гэтых, што ад'язджа-

юць з Саюза. Многа ехала. Цікава, чаго яны ехалі, не разумею дагэтуль,— правадніца акуратна пазяхнула, затуліўшы рот даланёй.— Хоць, з аднаго боку, мо і сапраўды некага крыўдзілі, здзекаваліся: чаго толькі не бывае. Унь заўчора вычытала ў газеце, мо і вы чыталі. Чалавек ні ў чым не вінаваты адседзеў у турме чатырнаццаць гадоў і восем месяцаў. Абвінавацілі, што забіў сваю жонку. Дык маці не вытрымала такой ганьбы, здзекаў у міліцыі, калі дапытвалі, і павесілася. Бацька памёр, брата малодшага таксама катавалі. А забойца ў гэты час гайсаў па свеце, ажно унь калі затрымалі. Дык, канечне, пасля такіх здзекаў можаш і паехаць куды вочы глядзяць, хоць на край свету. Але ж няўжо ўсе пакрыўджаныя. Яўрэі едуць, немцы, армяне дый рускія, адны нашы беларусы ні з месца... Чаю наліць вам ці не?..

— Наліць,— ён адчуваў, як чырвань аблівае твар, шыю, і, здаецца, стала горача ўсяму целу. Калі ўзяў шклянку з чаем, убачыў, што трохі дрыжаць рукі. Яму хацелася, каб яна загаварыла пра штосьці іншае. Хоць бы пра «Графа Монтэ-Крыста». Падняцца і пайсці таксама не мог, бо думаў, што гэта мо апошнія хвіліны, калі ён проста, зусім звычайна размаўляе з людзьмі, з якімі разам жыў на адной зямлі, сярод гэтых лясоў, палёў, падобных, як блізняты, дамоў.

— Усё ж не магу зразумець тых, хто ад'язджае, ну, не магу,— разахвоцілася да размовы правадніца. Канечне ж, Корзун гэткага не чакаў.— Што б я рабіла ў той Амерыцы ці Германіі?

— Усюды людзі жывуць,— выціснуў Корзун, маленькімі глыткамі піў чай, як заўсёды, чамусьці вельмі смачны ў цягніках.— Жывуць...

— Гэтак, канечне, жывуць і хлеб ядуць, мо не горшы, чым наш. Унь з суседняй ля маёй вёскі цётка Агата жыве ў Канадзе. Бачыла яе гадоў дзесяць назад, прыязджала да брата. Нічога такая цётка, за Польшчай шчэ выехала з бацькам, было ёй тады пятнаццаць ці шаснаццаць. Казала, што і прыбіральшчыцай была, і пакаёўкай, а пасля купіла сабе лазню і памалу разжылася. Цяпер, кажа, жыву няблага. Паказвала фотакарткі: дом, як палац, дзве машыны ля яго. Хто ведае, мо і не яе дом, і не яе машыны. Мо ўсё прапаганда, як нашыя газеты пішуць, варожая. Прабачце, гляжу я на вас, нешта вы надта сумны, няёмка пытацца...—

правадніца змоўкла. Корзун падумаў, што яна здагадалася, куды ён едзе і хоча пра гэта сказаць.

— Гэта здаецца, што я сумны, я вельмі вясёлы, проста ў мяне такі твар. Але вы, калі ласка, на гэта не зважайце.

— Што мне... Вас, мусіць, ужо зачакаліся? Хутка шукаць пачне жонка.

— Чаго мяне шукаць, я ж не іголка,— сказаў Корзун, і ўсё-ткі трэба было ўжо ісці ў купэ, бо жонка магла і кінуцца на пошукі, яна на гэта здольная. Пасля ўбачыць з правадніцай і калі-небудзь абавязкова ўспомніць. Усё можа быць, усё... Але гэта, канечне, драбяза і глупства, зусім іншае тое, што, ён глянуў на гадзіннік, праз дзве з паловай гадзіны ён апынецца ў Брэсце, у якім за ўсё жыццё ні разу не быў дагэтуль. Хоць збіраўся з'ездзіць з дзецьмі неаднойчы, дый недалёка ж, колькі той язды. А дзе ён быў наогул, што бачыў, акрамя бібліятэкі і дома; часам хадзіў з жонкай у кіно, тэатр, аднак з дня ў дзень прывязаны да кніжак, дзе ён адчуваў сябе чалавекам, дзе ён чуў галасы найвялікшых людзей і дыхаў адным з імі паветрам. Кнігі для яго былі што людзі, вакол яго ішлі войны, нараджаліся і паміралі героі, квітнелі і знікалі дзяржавы, буяла вечнаю кветкаю каханне, якое было асноваю ўсяго. З-за кахання пачыналіся войны і спыняліся, яно было ўсюды, амаль у кожным тонкім ці тоўстым томе. Гэта было жыццё, якое ён моцна любіў і раптам сваёй рукой абарваў карані, што сілкавалі ягоную душу, сэрца. Навошта ўсё гэта, навошта?

У правадніцы быў просты, шырокі твар з прывялымі вуснамі, вочы мяккія і добрыя, як у яго маці, але ёй было ўсё роўна, хто такі Корзун і што турбуе яго. Колькі пасажыраў, мусіць, сядзела ў гэтым купэ, і яна з імі размаўляла аб жыцці, перадавала свае назіранні і піла з імі чай. Потым яны развітваліся і больш ніколі не бачыліся, напэўна, ніколі, бо ў кожнага адна дарога. Бываюць выпадковасці, аднак гэта адзін працэнт мо з тысячы...

— А ведаеце, куды я еду? — вымавіў ён, глытнуў ужо астылага чаю, усё роўна смачнага, і дадаў як аб нечым звычайным, нават крыху абыякава: — Я еду за мяжу... назаўсім...

Правадніца дзіўнавата заплюскала вачыма, даланёй правяла па століку, выціраючы кроплі чаю, хоць

збоку ляжала анучка, вельмі ўважліва зірнула на Корзуна.

— Я адразу пра гэта падумала,— сказала яна ціха,— адразу. Толькі не хацелася ў вас пытацца. У кожнага свая доля... Што тут казаць. У мяне дачка зблыталася з неграм, нібыта з Камеруна. Кахаю, кажа, жыць без яго не магу. Адна ж у мяне яна, без бацькі гадавала. Вырасла, дый яшчэ ёй толькі дзевятнаццаць мінула... Перад Новым годам паехала з ім. Добра, што хоць угаварыла не мяняць падданства. Што з ёй, як яна там? Піша, што добра, а маё сэрца адчувае нешта благое. Колькі унь газеты пішуць пра нашых дзяўчат, якія захацелі лёгка і прыгожа пажыць. Адна ідзе ў прастытуткі, іншая блытаецца па свеце, ажно пакуль дзе-небудзь не сканае. Так пішуць, і, мусіць, праўда.

— Мабыць, праўда,— Корзун паспеў прачытаць назву станцыі, якую мінулі, не спыняючыся,— гэта ўжо былі Івацэвічы.— Усё можа быць, усё...

— Навошта ж вы едзеце? Што ў вас там — сваякі? — амаль спачуваючы яму, пыталася праведніца.

— Сваякі, дый...— ён не даказаў, хто там у яго ёсць, падняўся, падзякаваў за чай, але ўспомніў, што трэба аддаць грошы, паклаў на столік дзесяць капеек.

— Прабачце...— ён пайшоў чамусьці праз увесь вагон, у тамбуры, прапахлым сырасцю і цыгарэтным дымам, стаяў і неадрыўна глядзеў, як назад імкліва ляцела зямля, якая чамусьці не стала яму роднай. Калі б была роднай, ён не ад'язджаў бы адсюль, не пакідаў бы яе. Нібыта ж яго не саджалі ні ў турму, ні ў псіхіятрычную бальніцу. Мала было грошай, эканомілі кожную капейку... Яму не было чаго красці: ён не працаваў ні на мясакамбінаце, ні ў рэстаране, дзе можна было б узяць у сумку кавалак мяса ці кілбасы. Кнігі ён не змог бы красці. Здаецца, паміраў бы з голаду, але не ўкраў бы ніводнай. Гэта проста немагчыма ўявіць. Ні да каго няма ў яго злосці, нянавісці. Значыць, абсалютная абыякавасць... Яму проста вельмі кепска, вельмі. І як уцякае ад усяго, што перашкаджае жыць так, як хоча душа. А як, як яна хоча? Усё заблыталася, усё цёмна, і пакуль толькі святло за мяжою, дзе канчаецца зямля, на якой ён вырас і дажыў да сівых валасоў. Урэшце, няхай будзе так. Ен не можа спыніцца, выйсці з гэтага вагона і вярнуцца назад. Бязлітасна перарэзаў старыя карані; дрэву патрэбна

новае месца, каб было менш ценю і холаду, каб галіны вольна маглі расці ўгору і ўшыркі. Яго ў гэтым надзея... Корзун пацягнуў за дзверы, яны былі незамкнёныя і адчыніліся. Ен ступіў на край пляцоўкі і выглянуў з дзвярэй. Твар апаліў вецер, рэзнуў халодным струменем па вачах. Унізе мільгала зямля, стракацілася разнаколер'ем і цягнула, цягнула да сябе. Ажно захацелася адпусціць руку і скочыць. І яму стала страшна, кроплі поту на імгненне заслалі вочы. Нейкая дужая, нахабная рука пацягнула за каўнер і так рэзка, што Корзун, паслізнуўшыся на абцасах, упаў назад. Балюча выцяўся левым плячом. Над ім схілілася правадніца, пальцам круціла ля скроні, глядзела вырачанымі вачыма.

— Во, звар'яцеў! Я не хачу з-за цябе, вар'ята, у турму... Прэч адсюль, паршывы...— памаўчала і дадала стомлена: — Інтэлігент. Ідзі,— падштурхнула яго ў плечы, калі ён падняўся з падлогі.— Граф Монтэ-Крыста...

І Корзун паплёўся па калідоры, паныла гледзячы перад сабой і нічога не бачачы. Сэрца, як гэты хуткі цягнік, спяшалася. А ўваччу стракацілася зямля, неслася назад...

7

Зноў прысніліся Аўгусту афганскія горы, зноў ён адстрэльваўся, біў і біў у начную цемру з кулямёта і выразна чуў, як крычыць Віталь Абламей, хоць гэта было проста немагчыма пры такім грукаце, што, здавалася, шухне на іх з вяршыні лавіна камянёў. Недзе далёка ў падсвядомасці ён помніў, як яго адпусцілі дахаты і быццам ужо — зусім не ваенны чалавек. Аднак не мог зразумець, чаму зноў страляе з кулямёта і побач стогне паранены Абламей.

З цяжкай галавой, з болем у скронях Аўгуст выйшаў з дому. Быў сыры цёмны ранак з блякла-жоўтымі кроплямі ліхтароў. Гультаявата-павольна сыпаў дождждж. Восень ужо канчалася, трохі нават цяплейшая за лета, якое было сырое, халоднае, з рэдкім сонцам. Але ж зіма яшчэ не бралася, хоць магла аб'явіцца ў любы дзень, яна стаяла на парозе. Усё-ткі хацелася, каб узяўся мароз, падсушыў зямлю, прагнаў надакучлівую слоту.

Да будаўнічай пляцоўкі Аўгуст дабраўся нейк вельмі хутка, ажно за гадзіну да пачатку работы. Выйшаў з дому і якраз спыніўся на прыпынку экспрэс, а ён намнога апярэджвае звычайны рэйсавы аўтобус.

Калі заставалася да вагончыка мо метраў трыццаць, заўважыў, што нехта яшчэ больш ранняя птаха, чым ён. Іхняя палова вагончыка была асветлена. Значыць, Аляксеевіч ужо тут, механічна падумаў Аўгуст. Ён стаў насупраць акна і зазірнуў унутр: няйнакш стары чытае кніжку. Ніякага старога не ўбачыў, толькі нейчая шырокая постаць упіналася ля скрынкі з інструментам: яны на тым тыдні атрымалі на базе ўпраўлення дзве электрадрэлі, новыя пасаціжы, вялікі набор яшчэ розных інструментаў і бутэльку спірту для падчысткі кантактаў. Сантэхнікі прасілі па-брацку падзяліцца, маўляў, навошта каштоўны тавар скарыстоўваць на глупства, але Аляксеевіча ўгаварыць было немагчыма.

Постаць і блізка не была падобная на старога, і Аўгуст спярша ад здзіўлення нібы аслупянеў, разгублена глядзеў, як невядомы завіхаецца ля іхняга сейфа з ломам. Праз колькі хвілін, ужо не раздумваючы, адным скачком узляцеў на ганак і гэтак жа імкліва ўскочыў у вагончык. Адразу з парога гаркнуў:

— Што робіш, свалата? — і добра, што затармазіў, не пабег да злодзея, які ўзмахнуў, пэўна, са страху ломам.— Пакладзі лом, не махай,— сказаў Аўгуст,— бо зараз рукі выкручу, ты што думаеш, я дарэмна ў Афганістане быў. Пакладзі лом... Не бойся, не дрыжы.

— Я і не баюся,— усё-ткі дрыготкім голасам сказаў злодзей, і Аўгуст пазнаў у ім Мікалая Гусака, сантэхніка.— Не чапай мяне...— прасіўся ўжо ён, але лом не апускаў.

Аўгуст вельмі спакойна падышоў да яго, вырваў з рук лом і, штурхнуўшы плячом, пасадзіў на лаўку.

— Што ж ты, зладзюга, у сваіх крадзеш? — усё-ткі хацелася даць аплявуху гэтаму ёлупню, і ён не стрымаўся, урэзаў справа-налева, моцна ці не, але Гусак заенчыў, кінуўся да парога. Аўгуст паспеў, схапіў яго за куртку і прыцягнуў назад да лаўкі.— Ад мяне не ўцячэш. А зараз я цябе буду доўга і моцна біць...

— Не трэба біць! — ля ўвахода стаяў Аляксеевіч і здзіўлена пераводзіў позірк з аднаго хлопца на другога.— Што тут такое?

— Гляньце самі,— Аўгуст адышоў у бок ад Гусака. Той паспеў ужо сарваць замок з сейфа і дастаў дрэлі, брызентавы чамадан з інструментам. Прыборы патрушчыў ломам. Пляшка са спіртам знікла.

— Дзе спірт?

Гусак, апусціўшы галаву ўніз, маўчаў.

— Дзе спірт? — паўтарыў Аляксеевіч.

Усё роўна маўчыць.

— У яго за пазухай,— сказаў Аўгуст,— унь з левага боку... Даставай, бо зараз...

Гусак дастаў пляшку, паставіў на падлогу ля ног. Аляксеевіч прысеў ля яго, паклаў руку на плячо.

— Навошта гэта ты? Што маўчыш...

— Проста так,— пацісНуўшы плячыма, сказаў Гусак.— Каб вам было горш...

— А табе стане лепш, калі нам будзе горш?

Аўгуст не зразумеў, навошта важдаецца Аляксеевіч з гэтым злодзеем: трэба даць яму добрага прачуханца і ўручыць міліцыі. Хай сабе высвятляе, разбіраецца ў яго, навошта і чаму. Здаецца, усё было вельмі проста: краў, каб прапіць. Тым больш у сейфе спірт. Іншай мэты Гусак проста не мог мець, на іншае ў яго мазгі не здольныя. Раптам успомнілася, замільгала ў галаве думка, якую ён адразу і выказаў.

— Гэта ці не ты і акты праверкі ўкраў...

— Якія акты, якія акты... Нічога я не браў,— закрычаў Гусак,— чапляеш ужо ўсё на мяне,— неяк ён нервова замітусіўся, ірвануў з лаўкі, меркаваў уцячы ад сваіх следчых, але ў Аляксеевіча яшчэ дужая была рука.

— Пачакай, пачакай, а мо і праўда?..— сказаў Аляксеевіч, падміргнуў Аўгусту.— Канечне, мы, пэўна, робім не па законе. Але ж... Браце, зараз будзем моцна цябе біць, а потым здадзім у міліцыю. Скажам, што затрымалі на месцы злачынства. Ты супраціўляўся... Ведаеш, што ў міліцыю лепш не трапляць... Дык ты ўкраў у нас паперы?

Да работы заставалася зусім мала часу, вось-вось пачнуць прыходзіць людзі. Як тады гаманіць з Гусаком? Канечне, можна адразу запрасіць сюды ўсіх і аб'явіць, што ён злодзей, але што потым. «Мо трэба так, а мо і не»,— завагаўся ў думках Аляксеевіч. Адказ Гусака спыніў усе яго сумненні.

— Нічога мне не зробіце, калі скажу, што я ўкраў і

паперы. Ну, украў. Але я выконваў загад начальства...

— А хто табе загадаў? — спытаў Аляксеевіч. На двары ўжо чуліся галасы будаўнікоў. Не, сёння яны нікому нічога казаць не будуць. Спяшацца ж варта.— Вось што... Ідзі. Пасля яшчэ пагаворым. Калі трэба, зноў раскажаш тое, што казаў. Зразумеў усё?

— Усё...

— Ідзі і маўчы... Гэта ў тваіх пакуль інтарэсах.

— Што — і ў міліцыю не будзем заяўляць? — здзівіўся Аўгуст.

— Не, не будзем.

— Дык трэба было, хоць морду яму пачысціць. У нас у арміі калі хто краў, дык ведаеце, як яго вучылі. Цёмную рабілі. Каб у сваіх і красці — гэта зусім ужо чортведама што.

— Амаль ва ўсім з табой згодны, але хто нам даў права біць яго? Не маем такога права. Наогул аб крадзяжы пакуль нікому не кажы... Пачакаем...

— Дарэмна, што не дапыталі яго да канца. Чый ён выконваў загад! Ярыгі?

— Не ведаю, не ведаю,— сказаў Аляксеевіч,— хоць не выключаю і гэтага...

Дзень яны адпрацавалі на чацвёртым паверсе, устанаўлівалі ў кватэрах электраплІты, выключальнікі, разеткі. Гусака ў абед сярод сантэхнікаў не было, нібыта адпрасіўся ў паліклініку. У Аўгуста ледзь не сарвалася з языка: на злодзеі і шапка гарыць, толькі ўспомніў папярэджанне Аляксеевіча і стрымаўся. Усё маглі б, урэшце, ператварыць і ў жарт, ведаючы, што ў сейфе электрыкаў была бутэлька спірту.

За якіх паўгадзіны да канца рабочага дня Аляксеевіча і Аўгуста паклікалі ўніз. Ці мала дзеля чаго збіраюць, падумалася, мо начальства які сход хоча правесці. Яны сабралі інструменты, матэрыялы, што не выкарысталі за дзень, і памалу падаліся да свайго вагончыка. Аляксеевіч, відаць, аб нечым настойліва думаў, хоць аб чым ён думаў, можна было здагадацца.

Яны нетаропка ішлі паўз выцягнутага і доўгага дома: працавалі ў дванаццатым пад'ездзе, а вагончык стаяў перад домам з боку першага пад'езда. Аўгусту не цярпелася пагаварыць пра Гусака, але Аляксеевіч маўчаў. Моўчкі дайшлі яны да вагончыка. Сантэхнікі ўжо былі ў сваёй палавіне, праз адчыненыя дзверы чуваць было, што сёння яны, як і ўчора, гаманілі пра

Чарнобыль. Пыхкае рэактар ці прыціх, колькі мілірэнтгенаў па раёнах.

Перш чым ісці на сход, трэба было пакласці інструмент на месца, і Аўгуст з Аляксеевічам, як звычайна, адразу павярнулі да сябе ў бакоўку. Не паспелі за імі зачыніцца дзверы, як ад парога пачулася:

— Дык гэта вы хуліганы?

Ля дзвярэй разам з начальнікам упраўлення Ярыгам стаяў малады бялявы лейтэнант міліцыі. Аўгуст недаўменна паглядзеў на іх, потым на Аляесеевіча. Здзіўленне было і на твары Аляксеевіча.

— Дык гэта вы хуліганы? — зноў паўтарыў лейтэнант міліцыі. Ён прыязна ўсміхаўся, у правай руцэ ля бока трымаў карычневую тонкую папку. Праз адчыненыя дзверы ў пакой зазіралі сантэхнікі.

— Ідзіце, таварышы, мы пакуль самі разбярэмся,— сказаў Ярыга. Ён быў у чорным даўгаватым паліто з белым шалікам і ў чорным капелюшы. Адзеты быў па-святочнаму, не для таго, каб хадзіць па будаўнічай пляцоўцы. Шчыльна прычыніўшы дзверы, нетаропка прайшоўся па пакоі, спыніўся насупраць Алексеевіча. Вельмі ўважліва паглядзеў на яго, нібыта спрабуючы зазірнуць у вочы і нешта толькі вядомае яму ўбачыць там.

— Не чакаў ад вас, не чакаў. Ад каго хочаце, але не ад вас...— прайшоўся да парога, вярнуўся назад.— Шчыра, не чакаў.

— Што не чакалі?— Аляксеевіч сеў на лаўку, дзе раніцай сядзеў Гусак.

— Не чакаў, што вы са сваім маладым памочнікам мардабіццем займецеся. Хоць разумееце, што робіце?

— Не, не разумею,— сказаў Аляксеевіч.— А ты, Аўгуст, што разумееш? Якім мардабіццем мы займаліся?

Аўгуст хмыкнуў: што ён мог адказаць. Канечне, калі б не Аляксеевіч, дык набіў бы Гусака, але ж не набіў. «А мо і дарэмна»,— сказаў ён сабе. Што слова, калі найважкі аргумент таму ж Гусаку — кулак, і чым мацнейшы, тым больш да яго павагі. І ўсё-ткі нічога пакуль не было ясна: якая патрэба прывяла да іх раптам Ярыгу, а з ім яшчэ і лейтэнанта міліцыі.

— Ад грамадзяніна Гусака, рабочага будаўнічамантажнага ўпраўлення, паступіла заява, што вы, Кемчык і Рудаміна, пабілі яго. У нас ёсць пацвярджэнне

ўрача,— неяк урачыста, азіраючыся на Ярыгу, сказаў лейтэнант.

— Якоесь глупства,— сказаў Аляксеевіч,— глупства. Ён жа злодзей, ён ломам унь узламаў замок на сейфе. Паглядзіце! — паказаў рукой у куток вагона. Лейтэнант агледзеў сейф і развёў рукамі.

— Тут нічога такога не відаць. Дый як вы дакажаце? А калі быў факт, чаму не заявілі ў міліцыю альбо начальніку ўпраўлення, таварышам, нарэшце. Мы апыталі рабочых, ніхто нічога не бачыў. А дакумент, што вы пабілі Гусака, ёсць.

— З вамі абсалютна згодзен, таварыш лейтэнант,— падаў голас Ярыга, загаварыў гнеўна, здалося, ажно кіпеў ад абурэння,— гэта хуліганства. Хто даў права вам, Кемчык, нават калі быў факт, хоць не веру, учыняць бойку, рабіць суд. Ніхто вам не даваў такога права,— памахаў пальцам і павысіў голас.— А вы яшчэ камуніст, франтавік. Добры ж прыклад паказваеце маладым. Чаму гэты малады рабочы навучыцца ў такога настаўніка, пакуль цяжка сказаць. Адно ясна: клопату міліцыі задасць. Гэта проста недапусціма, што на рабочым месцы ўстрайваеце бойку, удвух на аднаго. Разбірайцеся, таварыш лейтэнант.

— Аляксеевіч,— ціха, амаль на вуха, сказаў Аўгуст.— Давайце я іх выраблю. Не магу больш цярпець гэты здзек.

— Спакойна, спакойна,— гэтак жа ціха ў адказ Аляксеевіч,— маўчы.

«Нездарма мне сёння прысніўся Афганістан,— падумаў Аўгуст,— ды і галава балела...» За акном ужо стала цёмна, падвываў вецер. За дзвярыма нібыта нікога не было, быццам сантэхнікі пайшлі дамоў, але ён адчуваў, што ніхто не скрануўся з месца. Чакаюць, чым скончыцца гэтая сустрэча. Гусака не любілі, але ж калі даведаюцца, што несправядліва яго пакрыўдзілі, дык асудзяць іх. У рабочых, Аўгуст даўно заўважыў, было якоесь абвостранае пачуццё справядлівасці.

— Мне тут яшчэ справы ёсць, паеду. А вы, лейтэнант, разбірайцеся. Аб'ектыўна... як загадаў вам начальнік.— Ярыга падаў руку міліцыянеру і зняважліва, скрывіўшы вусны, глянуў на рабочых.— Усё строга па законе. Да камуністаў патрабаванне павінна быць асабліва строгім і нават жорсткім.

— Канечне, толькі па законе,— захітаў галавой

лейтэнант.— Мігам пераапранайцеся і марш за мной!

— Куды гэта? — амаль адначасова прамовілі Аляксеевіч з Аўгустам.

— У міліцыю. Куды яшчэ. Не ў рэстаран. Мы яшчэ вас, галубкоў, праверым на алкаголь. Мо вы п'яныя.

— Вось правільна,— былі апошнія словы Ярыгі.— Цвярозыя не зрабілі б.

— Ага, п'яны, ушчэнт п'яны,— выгукнуў яму наўздагон Аўгуст.

— Паводзьце сябе сціпла і прыстойна, грамадзянін Рудаміна,— абарваў яго лейтэнант.

«Вось ты і дачакаўся, Кемчык, дажыўся, што як забойцу ці хулігана павязуць за кратамі,— думаў Аляксеевіч.— Дажыўся. Але ж ці ўсё можна прадугледзець, прадбачыць... Хто зразумее, ці ёсць такі наогул прадбачлівы чалавек. І злавацц на лейтэнанта не варта, не трэба, ён просты выканаўца, якому загадала начальства. А загадаў начальнік... Значыць, Ярыга перагаварыў з начальнікам міліцыі. А дзе ж Гусак? Што ён робіць, ці спакойнае ў яго сумленне?..»

— А дзе Гусак? — спытаўся ён занадта гучна, што нават сам адчуў трошкі істэрыю.

— Яго адпусцілі дамоў,— абыякава раптам сказаў лейтэнант.— Сабраліся? За мной, і хутчэй. Няма і так часу, а тут...— ён не дагаварыў, што тут, але па тым, як незадаволена махнуў уніз рукой, стала зразумела: клопату і без іх у яго, мабыць, вышэй галавы.

— Яго адпусцілі, а мы што? — абурыўся Аўгуст.

— Давай, давай!..

У двары іх чакала міліцэйская машына з кратамі па бакавых і задніх вочках. Калі садзіліся ў будку, убачылі, што ля вагончыка сабралася даволі шмат рабочых. Натоўп насцярожана глядзеў на не зусім звычайную карціну. Нехта выгукнуў:

— Нічога, хлопцы, трымайцеся. Мы з вамі!

— Ну, ну, давай,— падштурхнуўшы Аляксеевіча ў плечы, лейтэнант замкнуў за імі дзверцы.

І яны паехалі, так, як ніколі дагэтуль не ездзілі ў жыцці. Кожны з іх падумаў: добра, што вечар, цёмна і ніхто са знаёмых не можа пазнаць. Так ужо атрымліваецца, што амаль ва ўсіх людзей склаўся стэрэатып: калі ўзяла міліцыя, значыць, вораг грамадства. А яны, Аўгуст і Аляксеевіч, хто? Хто яны — ворагі грамадства? Такога сораму ў жыцці Аляксеевіч не меў, такой

крыўды і знявагі. Але ён быў бездапаможны і толькі хаваў свой твар у каўнер паліто.

Аўгуст быў таксама разгублены, толькі ў ім усё больш і больш узнікала злосці, нянавісці, і, калі б яны хутка не даехалі да міліцыі, хто ведае, чым ўсё скончылася б. Магло б, што, выкарыстаўшы сваю немалую сілу, спрыт, набыты ў арміі, і вопыт, ён спыніў бы машыну, разламаў бы гэтыя краты... Яшчэ б трошкі.

Але яны ўжо былі ў міліцыі, як у сне, падпісаліся пад пратаколамі на штраф у дваццаць рублёў, і той самы лейтэнант вывеў іх назад на вуліцу. Паглядзеў на аднаго, на другога, паляпаў абодвух рукою па плячах, ці то хмыкнуў, ці то засмяяўся.

— Ідзіце... Ідзіце...— уздыхнуў і знік у сваім будынку, дзе ля дзвярэй за шкляной перагародкай сядзеў яшчэ міліцыянер з чырвонай павязкай дзяжурнага. Аўгуст шырока, на поўныя грудзі ўздыхнуў і пачуў, як гэтак жа ўздыхнуў і Аляксеевіч. Яны, ледзьве перастаўляючы ногі, патупалі, як страшэнна стомленыя людзі.

## РАЗДЗЕЛ ШОСТЫ

Прыляцеў саколік у двор,
Сеў жа ён,
Сеў жа ён,
Спусціўшы галовачку...

*Беларуская народная песня*

### 1

Калі Мірык сеў у першы цягнік, яшчэ баяўся, стомлены, знерваваны, засынаў і амаль адразу прахопліваўся, асалавелымі вачыма спрабаваў убачыць сваіх ворагаў. Урэшце дайшоў быў да такога стану, што ледзь не марыў, каб яго забралі. Але чым далей ад'язджаў ад тайгі, тым усё больш хацелася апынуцца ў родным горадзе. Канчаткова паверыў, што пагоня палічыла яго нябожчыкам, як і Шчура з памочнікамі. Толькі непакоіўся, ці не пакінуў слядоў у хатцы паляўнічага. Хоць, канечне, пакінуў палову прадуктаў, дакумент забраў толькі. А мо гаспадар не адразу кінецца, навошта яму

ў тайзе той дакумент. Яшчэ зіма толькі пачынаецца, а яна на Поўначы доўгая, гэты паляўнічы людзей убачыць не хутка. За той час ці мала хто пройдзе ля яго хаткі, ці мала хто можа пакваліцца на дакумент. На Поўначы шмат рознага люду блукае...

Мабыць, так яно і было, таму што Мірык спакойна даехаў да Мінска, яго ні разу ніхто не спыніў. З барадой, у сваёй вопратцы, ён быў падобны на якогась геолага ці гараджаніна, які вяртаецца пасля шабашкі дамоў. Праўда, адзін раз на Беларускім вакзале ў Маскве ён моцна быў злякаўся. У чаканні цягніка прыдрамаў на лаўцы, і раптам нібы хтось штурхнуў яго ў бок, адразу ачнуўся. Побач сядзеў міліцыянер, як здалося, уважна пазіраў на яго. І не проста міліцыянер, а, пэўна, дзяжурны паставы, бо на каленях ляжала маленькая рацыя. Міжволі Мірык усміхнуўся, і той адгукнуўся прыязнай усмешкай.

— Чакаем поезд?

— Чакаем...— Мірык зірнуў на гадзіннік .— Хутка будзе.

Першае ж у яго жаданне было схапіць рэчмяшок і ўцякаць. І ўсё-ткі стрымаў сябе, яшчэ здолеў высядзець пад уважлівым позіркам хвіліны тры-чатыры і падхапіўся з лаўкі, за мяшок — і пашыбаваў прэч ад небяспечнага месца.. Унутры, здавалася, усё калаціласяя, і было жаданне пабегчы, схавацца ў натоўпе, які віраваў тут. Адышоўшы па пероне амаль у самы канец пуцей, ён нарэшце азірнуўся і супакоена перадыхнуў. Людзі ззаду хадзілі, але міліцыянера не было. Усё-ткі ён шчаслівы, шанцуе яму. Колькі праехаў ужо ад тайгі да Масквы, і ніводны сабака не ўнюхаў. Няўжо і сапраўды яны вырашылі, што ён утапіўся. А чаму і не, чаму? Шчур са шчуранятамі пайшоў на дно, дык мог і ён. Вельмі і вельмі нават... Але ж не пайшоў. Білет у кішэні, унь цягнік выпаўзае да платформы. Яшчэ трошачкі — і сядзе ў вагон. Не — адразу спаць, спаць, каб выйсці ў Мінску дужым, спакойным, каб ніякая халера нават не падумала, што ён уцёк з калоніі. Мінск — родны горад, схавае дзе-небудзь пад сваім крылом. Але ж як жыць далей, чым займацца. Сябры, канечне, знойдуцца ўмомант, але ж яны не ўратуюць ад міліцыі. Толькі самому, самому трэба нешта думаць.

Ён спакойна праспаў ноч і выйшаў з цягніка ў Мінску, адпачыўшы, з настроем, што ў яго наперадзе

ўсё складзецца як мае быць. Праўда, убачыўшы міліцыянера, насцярожваўся і хутчэй абмінаў яго. На яго ніхто не звяртаў увагі. «Родны горад прыняў, не адштурхнуў, хоць шчэ пабачым»,— пульсавала ў галаве думка. Калі і возьмуць, дык трэба пажыць, пагуляць, каб было што ўспомніць. Пазваніць дамоў і перамовіцца з маткай альбо з Анжэлай. З бацькам пакуль не варта гаварыць, ён надта гарачы, толькі пашкодзіць. Дахаты адразу нельга ісці, недзе перачакаць, перабыць, рана ажываць, калі ён ужо нябожчык. Але ж куды пайсці, дзе прыхіліцца? Дзе?.. Адвык ён ад горада, ад таго, што амаль праз сто метраў спаткаеш міліцыянера. У Маскве іх і то, здаецца, менш. Куды ні глянь, усюды чырванеюць, як спелыя памідоры. Хоць ён ужо не баяўся, ішоў проста на іх і нават разглядваў. Убачыўшы двух тоўстых, пузатых старшын, абазваў напаўголасу раскормленымі парсюкамі. У думках здзекаваўся з іх, не ведаючы, што амаль сам у рукі ідзе ім медаль альбо ордэн. Канечне, менш за ўцекача не дадуць і яшчэ павысяць па службе.

Ён пад'еў у сталоўцы ля Юбілейнай плошчы, разамлелы ад цеплыні і сытага абеду, ледзь устаў з крэсла. І ўсё ж куды?..

Вочы пачыналі прывыкаць да горада, але ў памяці надта яшчэ свежая была дарога па тайзе, грукат верталёта ў небе, чыгунка з халоднымі вагонамі. Хацелася памыцца ў цёплай ванне, а найлепш у лазні, легчы ў чыстыя прасціны і заснуць, ужо не чуючы раніцай каманды, крыкаў, лаянкі. Ён зусім малады, і чаму нельга яму пажыць удосталь, пагуляць з прыгожымі дзяўчатамі. Унь колькі іх ідзе, нібы кветак. І зараз ніводная нават не глядзіць на яго, зараслага, у ватоўцы і ботах, бруднага. Ім давай фраера ў скураным паліто альбо ў дублёнцы, з машынай і дачай. «Эх, вы!» — ён гучна вылаяўся, але побач нікога не было і ніхто не пачуў. Раптам ён успомніў пра Зінку Каляга, якая некалі вучылася з ім у адным класе, была прыгожай даволі дзеўкай, калі б не скрыўлены трохі ўлева нос. Перад калоніяй ён разы два бачыўся з ёй мімаходзь. Маці летась казала яму, што Зінка ў піўной на Партызанскім. Маўляў, бачыліся яны неяк, а Зінка пыталася пра яго, Мірыка, і надта шкадавала. Амаль слова ў слова прыгадалася тая размова з маці, і ён, больш не раздумваючы, ускочыў у тралейбус, які ішоў у бок Партызанскага праспекта.

Вагаючыся на прыпынку, куды ехаць, ён ледзь не пазваніў дамоў. Падышоў да тэлефоннай будкі, пастаяў, пастаяў і ўсё-ткі стрымаў сябе, вялікім намаганнем сілы волі прымусіў пакласці назад у кішэню дзве капейкі. Уявіў, які перапалох уздымецца дома, калі пачуюць яго голас. Пэўна ж, ужо міліцыя пабыла ў іх, папярэдзіла бацькоў, што, магчыма, ён загінуў, уцякаючы з калоніі, але магла і папрасіць паведаміць ёй, калі аб'явіцца раптам.

А мо тэлефон іхні цяпер праслухоўваюць? У калоніі ўсякіх баек наслухаўся, у тым ліку — і што падслухоўваюць кватэрныя і службовыя тэлефоны. Калі гэта правільна, дык яму не трэба званіць. Лепш, каб яны лічылі, што яго ўжо няма на свеце. Але як толькі Зінка ўбачыць, адразу ўзнікне пагроза, што нехта яшчэ даведаецца: Мірык у Мінску. Але ж як ён апынуўся тут?.. Вызваліўся з турмы ці ўцёк... Канечне, уцёк, пра гэта таксама хутка будзе вядома. Калі ўжо не стала. І ўсё-ткі няма да кога, апрача Зінкі, і ехаць, прыгарнуцца. Да былых сяброў?.. Не, яны — былыя і навошта яму.

У піўной была вялікая чарга, проста немагчыма падысці да прылаўка. Мірык нават адразу не пазнаў Зінку. На галаве высокая прычоска з чорных валасоў, да якіх прычэплена бялюткая хустачка ці салфетка, цяжка нават вызначыць, што гэта такое. Вусны ярка пафарбаваныя, і голас у яе рэзкі, гучны. Нібы крыклівая баба на кірмашы. Дык, урэшце, яна і ёсць баба, чаму ён здзіўляецца. А якая павінна быць Зінка? Толькі такой, мо з прычоскай больш маладзёжнай, а то нібы ў кабеты гадоў сарака пяці.

Ён прабіўся праз натоўп мужчын, якія гудзелі, быццам пчаліны вулей, папрасіў хлопца недзе ягоных гадоў узяць два кухлі піва. Аднак з бакоў зашумелі, каб не адпускалі без чаргі. І тады недзе з самай глыбіні душы ўзнялася хваля чорнай нянавісці да гэтых сытых, задаволеных людзей, якія потым пойдуць у цёплыя ўтульныя кватэры да сваіх ласкавых жонак. У яго ні першага, ні другога няма, ззаду тысячы кіламетраў страху і наперадзе столькі ж. Ён бліснуў па баках вачыма, нібы галодны воўк, ашчэрыў зубы і не сказаў, а прашыпеў:

— Ша, фраеры! Ша!..

І натоўп, адчуўшы нейкую незразумелую яму сілу і нянавісць, сціх. Мірык адхіліў хлопца, які ўсё яшчэ

вагаўся, браць піва ці не гэтаму барадатаму, і паклаў рубель перад Зінкай.

— Два піва і два яйкі, ласкавая!

— Чаго лезеш без чаргі! — выгукнула яна, але, мусіць, хутчэй аўтаматычна, чым свядома, бо ёй было ўсё роўна, каму наліваць. Паставіла перад ім кухлі, напалавіну напоўненыя пенай, якая рвалася з шыпеннем угору, паклала яйкі. Не гледзячы на яго, адлічыла рэшту і адразу пачала наліваць новыя кухлі. Была ўся ў рабоце, малаціла, пакуль можна было, грошы. «Колькі яна на пене мае?» — падумаў Мірык, але далей думкі наконт Зінчынага заробку не пайшлі, бо ў бар увайшоў міліцыянер, малады хлопец, з ружовым тварам, з бляхай патрульнага на шынялі. Пазыркаў вачыма, пастаяў трохі ля парога і выйшаў. Усюды гэтая міліцыя, усюды. Нават у калоніі Мірык чуў, што нідзе, ні ў якім горадзе няма столькі міліцыі, колькі ў Мінску. Мо там яны пахаваліся ў цывільную вопратку, а тут на кожным кроку ўбачыш іх. «Каб вочы іх не бачылі»,— злуючыся, са страхам, разважаў Мірык. І раптам пачуў, як Зінка гукнула:

— Чаргі не займайце і не стойце. Піва канчаецца. Усё.

Натоўп глуха зашумеў, занепакоіўся, але не зменшыўся. Відаць, кожны чакаў, што яму хопіць піва.

На вуліцы ўжо было цёмна і вельмі паныла, бо няма куды ісці. Трэба чакаць Зінку, без яе ён адсюль не скранецца. Няўжо не пазнала яго, а мо зрабіла выгляд, бо ведае, што ён уцёк з калоніі? Бабы заўсёды былі хітрыя, хітрэйшыя за мужчын. І Зінка хітрая, нездарма гандлюе півам. Хутчэй зачыняла б гэты свой бар, а яна не спяшаецца і за ўвесь час нават не зірнула на Мірыка. Ён ад піва асалавеў і ўжо ледзь трымаўся на нагах, так і хацелася легчы. Апошнімі рэшткамі свядомасці прымусіў сябе стаяць за столікам. Стаяць і чакаць, хоць таксама небяспечна, а калі зноў зойдзе «памідор» і спытае, хто ён такі. Здрыганулася ўсярэдзіне: ён амаль механічна намацаў рукою ў кішэні свой дакумент. На месцы, значыць, няма чаго баяцца. Ён чалавек з дакументам, толькі б у ванную залезці. Што ж ты, Зінка, гуму цягнеш, усю пену ўсё роўна ж не забярэш. Ах, сцерва, ах, сцерва,— сварыўся Мірык, але пайсці не было куды. Нарэшце дачакаўся: Зінка гучна абвясціла:

— Усё, піва нямашака.

Было чуваць, што з крана яшчэ трохі пашыпела і зусім сціхла. Незадаволеныя мужчыны, лаючыся пацію, выходзілі з бара. Ля стойкі валюхалася прыбіральшчыца, а Зінка на нейкую хвіліну знікла ў дзвярах, што вялі няйнакш у склад ці ў якую бакоўку. Даволі хутка ў бары амаль нікога не засталося, і Мірыку без натоўпу стала ніякавата. Ён адчуў сябе як у пастцы, калі прышчамілі нагу ці руку і паляўнічы ўжо зусім побач. Як ратавацца, дзе выйсце, хоць па-воўчы адгрызай гэтую руку.

Акно цёмнае, у ім блішчыць ліхтар. Відаць, што туды-сюды ідуць людзі, спакойныя, бесклапотныя, якія нічога не баяцца. Смяюцца хлопец з дзяўчынай, ягоная рука ляжыць на яе шыі. Прыгожая, выпешчаная... Вось каб цябе ў лагер альбо ў лес пад Варкуту... Там пасмяялася б...

— Піва нямашака, чуеце? — кажа прыбіральшчыца,моршчыць свой азызлы твар, і на ім ўзнікае ўсмешка, як усё роўна выціснутая са зморшчын. Віляючы худым азадкам у брудна-белым халаце, падыходзіць да століка і анучкай трэ, трэ, дробненька хіхікае. «Старая чавэла...» — ён абыякавым позіркам глядзіць на яе і маўчыць. Трэба дачакацца Зінку, але яе ўсё не відаць са склада. Мірык ужо не вытрымлівае, просіць прыбіральшчыцу, каб паклікала Зінку. Ён кажа ціха, амаль шэпча:

— Клікні Зінку...

— А навошта табе Зінка? — а непрыемным какецтвам пытаецца гэтая карга. Няйнакш, убачыла ў яго асобе сябра. Фу, поскудзь... Ён азіраецца, бо адчувае, што нехта зайшоў у бар. Так і ёсць, той самы патрульны міліцыянер, сяржант з ружовай мордай. Пазірае, але маўчыць. Вельмі пільна аглядвае яго. Каб яшчэ не ўздумаў прычапіцца, маўляў, пакажы дакумент. Любы дурань, калі гляне, зразумее, што не Мірыкаў. Як удаў прыцягвае сваім позіркам, ажно падгінаюцца калені. Лепш не глядзець у той бок, нешта трэба зрабіць. І Мірык падыходзіць да стойкі і голасна гаворыць:

— Калі ўжо гандляваць будзеце. Мо дасцё мне соку і булачку,— звяртаецца да прыбіральшчыцы. Але тая не адказвае, нешта мармыча. Складвае талеркі на падносе. Ох, як марудна ідзе час, як марудна... І дзе тая Зінка, ліха яе пабрала. Мірык аглядваецца і адразу супакойваецца: міліцыянера ўжо няма. Чортава Зінка,

доўга яе чакаць? Нарэшце ўзнікае, быццам вынырвае, са складоў. Ужо без халата, з элегантнай прычоскай, як яму здаецца, і рэзкім голасам, усё роўна як у начальніка атрада, камандуе:

— Зачыняем, прашу пакінуць памяшканне...

Ён бачыць, што прыбіральшчыца шэпча Зінцы на вуха і паказвае рукой на яго. Вось цяпер Зінка пачынае ўжо прыглядацца, спярша здалёк, а потым выходзіць з-за стойкі, рашуча набліжаецца да яго. Упэўненая, ганарыстая, ведае сабе кошт. «Падняла яго сабе ў бары»,— з іроніяй думае Мірык і скептычна, нахабна аглядае яе з галавы да ног, і яна заўважае гэты позірк і моцна чырванее. Але не спыняецца, падыходзіць амаль ушчыльную.

— Што трэба? — у голасе насцярожанасць.

— Не пазнаеш, Зінка?

— Мала вас тут ходзіць...— уваччу запальваецца цікавасць, потым здагадка.

— Ну, ну,— ён усміхаецца,— Зінка-Зінуля... Радасць мая.

— Мірык? — на яе твары спалох. Куды падзелася ганарыстасць. Рукі дрыжаць, і нейкая крывая ўсмешка чапляецца на прыгожых поўных вуснах, ярка нафарбаваных.— Мірык...— ужо цішэй паўтарае яна і прыкладае палец да вуснаў. Хапае Мірыка за рукаў і цягне, цягне за сабой, туды, за стойку, у маленькі пакойчык, дзе на цвіку вісіць яе паліто, стаяць столік і два крэслы. Штурхае яго ў крэсла, шэпча: «Пачакай...» — І выбягае. Цішыня ахоплівае з усіх бакоў, і паўзе сон, ад якога слабеюць рукі і ногі і галава пачынае бездапаможна схіляцца да грудзей. Але ён змагаецца з гэтай раптоўнай слабасцю, прыслухоўваецца, сціскаючы ў кішэні нож. Ён чамусьці цяпер успомніў пра гэты нож. Па-добраму, варта яго выкінуць, але гэта звыш ягоных сіл, бо, здаецца, стане зусім безабаронным і нясмелым. Смеласць надае кавалак жалеза, ад якога, канечне, трэба пазбавіцца: ніяк не дапаможа, толькі нашкодзіць яму. Гэта падказвае розум, але страх змушае да болю сціскаць у руцэ нож.

Зінка адсутнічае мо якіх пяць хвілін, імкліва ўскаквае ў пакойчык. Тварык у чырвоных плямах, вочы перапалоханыя. Амаль зрывае з цвіка паліто, апранаецца і нічога не кажа. Яны выходзяць праз заднія дзверы, і іх ахоплівае цемра, наперадзе трохі размытая

ліхтарамі. Мірыку здаецца, што яны свецяць гэтак жа, як і ліхтары на турэмным плацы.

— Давай, давай,— падганяе Зінка, дужая, здаровая, а ў яго ўжо і ногі не йдуць. Стаміўся ён, палову Саюза прабегчы — гэта табе не півам гандляваць. Злосць узнімаецца на Зінку, і Мірык хоча мацюкнуцца, але ўсё-ткі прыкусвае язык. Не ён вядзе яе да сябе на кватэру, а яна. Ён прыйшоў да Зінкі па дапамогу, а не яна да яго...

Калі яны селі за стол, Зінка нарэшце не вытрымала, спытала, сумна гледзячы на Мірыка:

— Ты ўцёк? Уцёк ці вызваліўся?

Ён нічога не адказаў, ніжэй схіліў галаву і ўсё еў, еў, ніяк не мог супакоіць апетыт. Добра жыла Зінка: на стале вэнджаныя сухія кілбасы, чорная ікра, мяса, віно, каньяк... Нездарма мые рукі півам.

— Я ўчора бачыла тваю маці,— кажа Зінка,— трохі пастаялі...

— Мяне ўспаміналі? — адрываецца ад курынай нагі Мірык і асалавелымі вачамі выбірае, што б яшчэ з'есці.

— Не, яна яшчэ, мусіць нічога не ведае...

— І не ўведае...

— Чаму? — палохаецца Зінка, узнімаецца ад стала і ідзе на кухню. Раздабрэла дзеўка, клубы выпінаюць з сукні, шыя белая-белая. Мірыку ўжо есці не хочацца, у душы нарастае пачуццё, якое, здаецца, даўно пакінула яго. Ён міжволі аблізвае вусны і нецярпліва чакае, калі Зінка вернецца назад. Але яна нешта яшчэ нарэзвае, грукае талеркамі і зноў нясе паўнюткі паднос рознай ежы, пра якую ён даўно забыў.

— Дык чаму? — пытаецца яна.

— Што чаму? — у яго рука проста сама лезе да талеркі, што прынесла Зінка, бярэ кавалак мяса і цягне да рота. Ён есць, хоць апетыт ужо супакоены, і, адчувае, пуза палезла на рэмень.

— Чаму маці не ўведае? — у Зінкі круглыя пухлявыя калені, хочацца пагладзіць іх. Аднак ён не можа скрануцца з месца, з гэтага глыбокага крэсла, у якім, здаецца, можна было б пражыць усё астатняе жыццё.

— Таму што не трэба.

— Як гэта не трэба?..— нічога не разумее Зінка.

— А гэта цябе не датычыцца,— ужо злуецца Мірык, нахіляецца і пачынае гладзіць ёй калені. Ён марыў аб

такой спакойнай і лагоднай хвіліне мо ўвесь час, калі бег па тайзе. Яму вельмі добра, проста незвычайна.

Гасне святло ў кватэры, і толькі ў акне жоўтыя плямы ад ліхтароў. Ах, як спакойна, здаецца, нічога не існуе за межамі гэтай кватэры. Ён цяпер у дзяржаве, дзе царыцай Зінка. Яму нішто не страшна, што будзе заўтра — яго не цікавіць ужо. Будзе вечна гэтая цішыня, побач беласкурая Зінка, ад якой моцна пахне малаком. Ён зноў жыве, жыве так, што пазайздросціць любы зэк, няхай хоць пахан... Шчура няма, а ён жывы і дапяў да цяпла, хлеба, мяса і гэтай кватэры. Ён проста шчаслівы і нібыта толькі нарадзіўся. Нікога не баіцца, і мора яму па калена...

2

Галава балела цалюткі дзень, не дапамаглі і пілюлі, невыноснай была і ноч, нібы абцугамі сціскалі скроні. Хоць і спрабавала трымацца Ніла Восіпаўна, але на гэта не заўсёды хапала моцы. І знаходзіліся адразу тыя, хто спачуваў ёй. Толькі ад спачування лепш не рабілася. Вучні, канечне, нічога не заўважалі, таму што настаўніца, як звычайна, не крычала, роўным голасам вяла ўрок. Калі яны былі б больш назіральныя, дык убачылі б, што ў яе твар быў падобны ў гэтыя гадзіны на белую маску. Часам боль быццам знікаў, а потым зноў наплываў хвалямі. Ёй хацелася закрычаць, заплакаць, а яна нічога гэтага не магла сабе дазволіць. Бо глядзелі дзеці, і навошта іх палохаць.

І нейкі неспакой надта заварушыўся ў грудзях, здаецца, пазбавіў апошняй раўнавагі. Ніла Восіпаўна жыла на нервах, часта балела галава. Па-добраму, трэба было б пакінуць работу, аформіць пенсію і адпачыць хоць трохі. Паехаць самой у горы ці ў лес і ні аб чым не думаць, проста купацца ў рэчцы альбо ў моры, збіраць грыбы і чытаць кніжкі. Яна вельмі стамілася за сваё жыццё, ёй трэба перадыхнуць, глынуць свежага паветра.

Учора здзівіў візіт участковага, а найбольш — ягоныя пытанні. Ці даўно было пісьмо ад Мірыка, ці не пісаў, калі прыйдзе, а мо ўжо прыйшоў. Калі б вярнуўся, дык стаў бы ў іх на ўлік.

Збіраўся муж ехаць на спаборніцтвы, везці каман-

ду, але нешта там сарвалася, і ён амаль увесь дзень быў дома. Бурчэў незадаволена, ляпаў дзвярыма, але маўчала, нічым не выказвала свайго абурэння. Сцялася ўся, думала. Але аб чым? Хто б спытаў, дык акрэслена не сказала б. Галава нібы запоўнена туманам ці дымам, які цячэ, распаўзаецца і не злавіць, не затрымаць яго.

А мо ўжо і супакоіцца, пакінуць школу і трохі пажыць для сябе? Вось-вось прыйдзе Мірык і мо ажэніцца. Народзяцца ўнукі, і яна будзе іх глядзець. Кажуць, што ўнукі лепш нават, чым дзеці. І ты адчуваеш з імі сябе зноў маладой.

А ў галаве гудзе нейкая машына, ці гэта гул школы. На апошнім уроку яна ледзь стаяла, калі б яшчэ хвілін дваццаць не было званка, магла б упасці. Было б вельмі непрыгожа: настаўніца падае перад вучнямі.

Дзе Анжэла, куды яна пайшла? Відаць, яшчэ не скончыліся заняткі ва універсітэце. Навошта ён стукае, так не можа зайсці...

Уваходзіць у спальню Ісідар Карпавіч. Глядзіць на жонку, яна спрабуе зразумець, што напісана на ягоным твары. «Чым ужо ты незадаволены»,— думае і выціскае на вуснах усмешку. У люстэрку бачыць, як крывіць усмешка твар, такі бледны, непрыгожы і зараз зусім стары.

— Ты ці не захварэла? — даволі мякка кажа Ісідар.

Канечне, яна адказвае, што здаровая. Мужу, які на дзесяць гадоў маладзейшы за яе, не скажа пра хваробу. Яму патрэбная яна заўсёды толькі здаровая.

— Не, не захварэла. Проста неяк не па сабе... Нейкія дурныя думкі лезуць у галаву.

— Няйнакш Мірыка ўспомніла? — Ісідар прысеў побач з ёй, пагладзіў па плячы, нібыта супакойваў. І ад гэтага стала лепш на душы: усё-ткі родны чалавек, як бы ні было. Мо сказаць яму, што ёй ужо абрыдла працаваць і трэба мусіць сесці нарэшце на пенсію. Быць дома, варыць абед і чакаць дачку і мужа. А потым Анжэлу возьмуць замуж, будзе гадаваць унукаў. Было б добра, каб яны ўсе жылі разам.

— Не званіў Радзімір Бартуш? — спытаў Ісідар, і па ягоным тоне можна зразумець, якія пачуцці выклікае гэтае імя. Загасцяваў у Мінску Бартуш, ужо хацелася б развітацца з ім. Хоць, з іншага боку, мы гэта прывыклі, каб як хутчэй адправіць гасцей, няма часу

важдацца з імі. Але ж яна сама запрасіла Бартуша: званіла, пісала. Усё здаецца, рабіла, каб ён толькі прыехаў. А цяпер што: агітаваць яго ехаць з Мінска. Дзякуючы Бартушу яна змагла зразумець лагерную ці турэмную псіхалогію сына. А мо гэта яна знарок унушае сабе, улагоджвае сваё самалюбства? Ці варта тая ахвяра, якую паклала яна, спрабуючы вярнуць Мірыка да нармальнага жыцця. Але якога нармальнага жыцця — таго, што за акном? Дзе ашуканства, хабарніцтва і бюракратызм, маленькай дэталькаю якога стала і яна, інакш бы ён, нібы прэс, расплюшчыў бы і не засталося б нават следу.

Яна маўчыць і не адказвае мужу. Чакае пачуць пра Бартуша, і нешта ён падазравае пра яго і Анжэлу. У сваім спартыўным асяроддзі нагледзеўся, наслухаўся, і ўжо дома яму бачыцца, як пажылыя дзядзькі спакушаюць маладзенькіх дзяўчатак. Калі б штось было, дык, пэўна ж, Анжэла ёй сказала б. Між імі давер, зрэшты, здаецца, нібыта няма таямніц... Хоць гэта ўжо ёй здаецца. Усё больш і больш аддаляецца дачка. У яе свой свет, свае сябры, інтарэсы. Яна часта недагаворвае... Што ж, відаць, так павінна быць: у маладосці — сваё, а ў старасці — сваё, як гэта ні сумна. Але вельмі шкада, вельмі...

Маўчаў Ісідар, сядзеў угнуўшы спіну. Нялёгка і яму, нялёгка. Але нічым яна не дапаможа, хопіць і таго цяжару, што ляжыць на яе плячах.

— Пазванілі, ці гэта мне здаецца? — сказала Ніла Восіпаўна. Яна сапраўды пачула, як дзынкнуў званок, толькі не зразумела: гэта ад тэлефона альбо ад дзвярэй. Ісідар прыслухаўся.

— Нехта прыйшоў,— сказаў так, нібы ў некага яшчэ акрамя Анжэлы мог быць ключ. З калідора ўжо гудзелі галасы, басавітыя мужчынскія і звонкія жаночыя. У спальню ўскочыла Анжэла, вочы ажно гараць, шчокі зачырванелыя з вуліцы.

— Татка, мамка! — усклікнула, вуснамі ледзь дакранулася да мацерынай шчакі, абняла бацьку і, як віхор, выбегла. Голас яе зазвінеў па ўсёй кватэры, радасны і бадзёры. Прыемна было слухаць яго, ажно настрой, здаецца, палепшаў. У душу дыхнула прыемным, ласкавым.

— Мо што памагчы ёй,— сказала Ніла Восіпаўна. Ля люстэрка папраўіла прычоску, агледзела сябе. Ха-

лат на ёй быў багаты і прыгожы, муж прывёз летась з Вільнюса.

Госці якраз ішлі ў гасцёўню, і яна адразу разгледзела добра іх. Двух хлопцаў бачыла раней і нават успомніла, як іх зваць: Аўгуст і Віталь. Дзяўчыну з доўгай русявай касой не ведала. Анжэла іх пазнаёміла, і тая працягнула неяк манерна вузкую халодную руку, назвалася Галінай. Яна была, канечне, старэйшая за дачку і трымалася з гонарам, нібы зрабіла вялікую ласку, наведаўшы гэтую кватэру. У Нілы Восіпаўны было дастаткова жыццёвага дый педагагічнага вопыту, каб гэта заўважыць.

— Ты выпадкова Бартуша не бачыла? — асцярожна спытала яна ў Анжэлы, якая ўжо размясціла гасцей і бегла на кухню.

— А што? — чамусьці з выклікам сказала дачка і яшчэ больш пачырванела, чым была з вуліцы.

— Ужо два дні не звоніць. Мо з'ехаў. Але ж чаму не развітаўся? — Ніла Восіпаўна ўздыхнула, але больш нічога не дадала. Яна моўчкі памагала дачцэ сервіраваць стол, заварвала чай. Потым дачка пайшла да сяброў, а яна засталася на кухні.

Галава стала трохі менш балець, але сум не знікаў. Адчула сябе вельмі адзінокай. Ісідар, мусіць, заснуў, прылёгшы на ложку. Не перажывае, не думае аб Мірыку, не родны сын, як бы ні казаў, што гэта таксама ягонае дзіця. У душу, канечне, не заглянеш, але і так відавочна: Анжэлу ён любіць, а Мірыка ўспрымае, як недарэчнасць, з якой трэба звыкнуцца і цярпець. Яна гэта ўсё разумее і нічога змяніць не можа, да скону будзе несці свой крыж. Колькі яшчэ гэтай дарогі засталося. Яна проста адчувае яго, з яе, нібыта з прабітага вядра, кропля па кроплі выліваецца здароўе. Найбольш яго адняў Мірык... Але што ўжо пра гэта думаць... Нічога не зменіць.

Яна прысела на кухні ля акна, праз паўадчыненыя дзверы чула музыку, галасы. Ісці ў гасцёўню ёй не хацелася. Мо ўпершыню яна зразумела, што для гэтых маладых людзей ужо бабулька і іх інтарэсы вельмі далёкія ад яе інтарэсаў. Дарэмна яна выклікала і Бартуша. Што ён зробіць для яе, чым дапаможа, каб хутчэй вярнуўся дамоў Мірык. Усё глупства, глупства.

— О, дзень добры, шаноўная Ніла Восіпаўна! — на кухню зайшоў Бартуш, калі ён з'явіўся ў кватэры яна

і не заўважыла. Значыць, ён не паехаў у Маскву, усё яшчэ тут. Што ён дапаможа? Анічога. Але ж трэба ўсміхнуцца, працягнуць яму руку.

Бартуш пацалаваў ёй руку і, трохі пахіснуўшыся, прысеў ля Нілы Восіпаўны. Твар у яго быў нездаровы, шэры, з цёмнымі дугамі ценяў пад вачыма.

— Стаміўся, усё абрыдла... Усё...— ён не дакончыў, што яму абрыдла. Нізка нахіліў сіваватую галаву, нібы выпацканую ў срэбры. Густая чупрына захіліла вочы.

— Чаму ўжо так і ўсё? — паспрабавала яна пагаварыць з ім у ранейшым іранічна-сяброўскім тоне. Але не было жадання ўсміхацца, радавацца нечаму ілюзорнаму. Можна было сказаць, што ён надакучыў і час ехаць у Маскву. Толькі нельга такое дазволіць сабе. Ён не заслужыў такую крыўду. Сама паклікала, папікнула сябе, сама знаёмілася, перапісвалася і, урэшце, моцна агітавала, каб прыехаў у Мінск.

— Дык што такое ўсё? — спытала яна мякчэй, зноў надаючы свайму голасу адценне павагі і шчырай радасці, што бачыць Бартуша.

— Морды абрыдлі, пустыя размовы і ўся шушара, якая мігціць уваччу... Мігціць, мігціць. Вы адна, Ніла Восіпаўна, у горадзе жанчына, якая зразумее маю душу...

— У вас стомлены выгляд. Мо адпачылі б?

— А не, гэта зусім нармальны выгляд. Я шмат працаваў гэтыя дні. Мне было так хораша, што нават падумаў, ці не застацца ў горадзе. Дапісаць кніжку, сабраць матэрыял на новую. Вось якія ў мяне напалеонаўскія планы.— Ён угледзеўся ў яе вочы: — Хочаце, я зараз адпраўлю ўсіх гэтых гасцей, каб вы нармальна адпачылі. Не перажывайце, яшчэ трошачкі — і Мірыка выпусцяць. Супакоіцца ваша душа... І будуць у вас унукі і праўнукі. Ад Мірыка пісьма няма?

— Не, няма... Ідзіце, Радзімір, у гасцёўню. Адпачніце крыху з маладымі.

— Так-так... Ладна, мо і праўда,— ён выйшаў, прыкрыўшы за сабой дзверы, і адразу Ніла Восіпаўна пачула голас Анжэлы, нібы яна толькі што падышла сюды, а мо і так было. З дачкой, можна лічыць, усё было нармальна, сын балюча трывожыў сэрца.

«І навошта прыходзіў участковы? Яшчэ Мірыка няма, ён не прыехаў... Мо што здарылася там, у калоніі?» — ліхаманкава запульсавалі думкі, ад якіх ажно

пераняло дух. Яна больш не магла ўжо сядзець вось так проста і нічога не рабіць. «Ён у турме, але ж ён мой сын, маё дзіця. Маё дзіця... А што, калі паспрабаваць і папрасіць дазволу пабачыць зараз сына. Але ж яму засталося ўсяго некалькі тыдняў. Гэта ж няблізкі край. Што ж мне рабіць, што? Госпадзі! І няма каму расказаць усё, што мяне турбуе. Няма...»

Мо пазваніць каму з сябровак, пагаварыць з імі? Але што яны параяць, што падкажуць... Нічога, у кожнага сваіх праблем зашмат. Зашмат... І ўсё-ткі яна ўзяла з калідора тэлефон, прынесла яго на кухню і, зачыніўшыся, вырашыла пазваніць якой-небудзь сяброўцы. Каму раскрыць сваю душу, яна яшчэ не ведала, але тое, што гэта трэба зрабіць, адчувала. Спадзявалася, хоць цяжар зменшыцца, калі нехта падзеліць з ёй тугу і смутак. Яна спадзявалася.

Дзынкнуў тэлефон, якраз збіралася круціць дыск апарата. Імкліва і нават прагна схапіла трубку, нібыта яна магла выратаваць яе ад самоты і няшчасця. Трубка маўчала, толькі дыхала, асцярожна і, здалося, палахліва.

— Алё, алё, гаварыце!..

Ніхто не адгукаўся, толькі спалохана дыхаў. Навошта званіў? Яна патрымала яшчэ крыху трубку і паклала. Зноў званок, працяглы, настырны. Нехта забаўку найшоў сабе. А мо звоніць з аўтамата, а яны ж часта глуханямыя.

— Алё, алё,— сказала ледзь чутна, і, дзіўна, яе адразу пачулі. Нейчы тонкі голас прабіўся праз павуціну іншых галасоў, якія сабраліся ў трубцы. «Калі ўжо гэтая сувязь будзе працаваць нармальна»,— з раздражненнем падумала Ніла Восіпаўна. Яшчэ хвіліна, і гул знік, застаўся толькі чысты жаночы голас.

— Алё, Ніла Восіпаўна? Ніла Восіпаўна, гэта вы?

— Я, а хто гэта?

— Гэта Зіна Каляга, помніце мяне!

— Як жа ж, добра помню, Зіначка. Мы з вамі на тым тыдні бачыліся,— засмяялася Ніла Восіпаўна ад радасці. Вось з кім яна пагаворыць, з Зінкай, простай дзяўчынай, з якой можна аб усім, аб усім. Яна простая, як неба, як трава, як дрэва. З ёй усё ясна, і Зіна зразумее яе, маці, што пакутуе. Можа, яна нічога не параіць, проста паслухае, паспачувае — і гэтага досыць.— Я чую цябе, Зіначка, чую,— ажно захліпнулася сло-

вамі,— добра чую. Скуль ты звоніш, з аўтамата?!. Ну, зразумела. А я думаю, хто гэта не адгукаецца. Усё роўна як правярае нашу кватэру. Ты ведаеш, Зіначка, у мяне было жаданне табе пазваніць. Але ж у цябе няма тэлефона. І я думаю, каб сустрэць зноў Зіначку, пагаманіць.

— Ніла Восіпаўна, паслухайце,— перапыніла Зіна, перапыніла на паўслове, нецярпліва,— даўно вы ад Мірыка атрымлівалі пісьмы. Не піша, калі вернецца дамоў?

— У яго, Зіначка, тэрмін канчаецца праз два тыдні. Недзе ў тым месяцы павінен быць ужо дома. Дзякуй табе, што ўспомніла Мірыка. Ён, павер мне, не такі і благі. Знаеш, нездарма кажуць: не адмаўляйся ні ад сумы, ні ад турмы... Я нават хацела паехаць туды; сустрэць яго і разам вяртацца дамоў. Ты разумееш, як гэта складана ўваходзіць пасля такога жыцця ў нармальнае. Мне б вельмі хацелася, Зіначка, каб і ты, калі ён звернецца да цябе, не адмовіла яму ў чалавечым разуменні, спагадзе.

— Канечне, канечне,— неяк разгублена казала Зіна, хоць гэтак здалося па тэлефоне,— як жа ж, як жа ж...— Яна змоўкла і зноў задыхала часта-часта, нібыта толькі што спынілася пасля цяжкога бегу. І тады Ніла Восіпаўна падумала: няўжо толькі з-за Мірыка яна званіла, мо што ёй трэба. А мо яна што ведае пра яго, чаму раптам спыталася, калі вернецца. Дагэтуль не цікавілася, а цяпер звоніць...

— Я ўжо кожную гадзіну лічу,— сказала Ніла Восіпаўна,— калі нарэшце скончыцца гэта. Я так стамілася, у мяне проста няма сіл жыць. Нікому яшчэ так не казала, а табе гавару. Я вельмі стамілася, і мая душа прагне адпачынку. Думаю, ты мяне зразумееш...

— Добра, добра, Ніла Восіпаўна,— Зіна развіталася, і ўсё, абарвалася сувязь. Не даслухала, урэшце, каму якая справа да пакут яе...

За акном запаліліся ліхтары, ад іх святла лужыны сталі нібы шкляныя. Праехала машына і разбіла гэтае шкло. Але яно зноў зраслося, роўнае і бліскучае. Яна ўсё гэта бачыць праз сваё вузкае і самотнае акно. А ў калідоры чуваць бас Бартуша і звонкі галасок дачкі. Што гэта яны ўвесь час разам, што ў іх можа быць. Між імі? Што?

Дзеля чаго яна фарбавалася, упрыгожвалася, каб

не кінуў муж, маладзейшы за яе на дзесяць гадоў.

Пасля таго, як сеў у турму сын,— гэта ўжо не страшна. Жыццё засталося ззаду, наперадзе нічога, акрамя пенсіі і хвароб, якія толькі чакаюць, каб абрынуцца на яе.

## 3

Ніколі нават не ўяўляў былы прапаршчык Перабурмыт, што апынецца ў Беларусі, якая надта ж далёкая ад Поўначы. Але ён пра гэта не думаў. Ведаў, навошта едзе сюды, што яму трэба. Тайга і турма былі далёка ззаду. Заставалася толькі купіць цывільны касцюм-тройку (яму вельмі хацелася тройку), каб набыць выгляд саліднага чалавека. Ваенную форму можна было б ужо выкінуць, каб не назаляла, не напамінала аб мінулым. У яго быў у чамаданчыку касцюм, але ніякага шыку ў ім не было. Так, шэранькі, абышто.

Як далей жыць, у яго плана не было, нічога яшчэ канкрэтнага не паспела ў галаве. Ён быў упэўнены, што Ніла Восіпаўна ўсё яму зробіць. Нават на хвілінку не ўзнікалі ў яго сумненні, што можа не быць так. Яна сустрэне ласкава, дапаможа, і ён у Мінску зажыве як чалавек. «Як белы чалавек...» — з такой вясёлай думкай Перабурмыт апынуўся на вакзале, паблытаўся сюд-туд, агледзеўся. Настрой трохі яму папсаваў патруль, які прычапіўся да яго знешняга выгляду: маўляў, ґузікі не форменныя, шынель памяты. Але Перабурмыт, пасля таго як усё добра скончылася са следчым, нікога не баяўся. Ён нахабна заявіў, што ўжо не служыць і наогул не жадае з імі размаўляць. Павярнуўся і пайшоў. Начальнік патруля, маладзенькі старшы лейтэнант, пашлёпаў губамі, пашлёпаў і застаўся на месцы. Няйнакш засаромеўся пры вялізным натоўпе бегчы за ім, а Перабурмыт, вельмі задаволены і смеючыся рушыў да таксі. Ужо як назваў адрас, падумаў, што мо варта было б купіць кветак, але вырашыў, што і так яго прымуць. І так яго прыезд павінен быць радасцю Ніле Восіпаўне. У гэтым ён зусім не сумняваўся. Заехаць у гастраном і ўзяць бутэльку каньяку не пашкодзіла б. Але дзе той гастраном, дзе яго можна ўзяць. З таго часу, як распачалі барацьбу з алкаголікамі, купіць што-небудзь стала праблема. І гэта пацвердзіў ва-

дзіцель таксі: ужо нічога не купіш. «Ну што, хай падарункам ёй буду я...»

Ён не стаміўся з дарогі, выспаўся ў двухмесным купэ. З ім ехаў дзядок, які таксама ўвесь час спаў і што было вельмі важна: не чапляўся са сваімі размовамі. Цяпер хацелася неяк весела пажыць, каб пазайздросцілі яму. Ён, як кажуць, выйшаў сухім з вады. Мо калі і схамянуцца і знойдуць якія канцы, але толькі не яго, Перабурмыта. Прывітанне, ластаўкі, прывітанне. Вы не ведаеце яшчэ Перабурмыта. Але ўведаеце...

— Нешта марудна едзеш, начальнік,— ён адкінуўся на заднім сядзенні, закурыў, адчуваючы сябе ўсемагутным. Ён возьме яшчэ свой лёс за рогі і пакруціць іх ва ўсе бакі.

— Хутчэй не магу...— здалося, што непрыязна адказаў таксіст.— Яшчэ дзве-тры мінуты, і будзем на месцы. Куды ты, прапаршчык, спяшаешся на злом галавы?

— Не прывык марудзіць. Знаеш, як мы ў арміі ездзім... Ого! — яму захацелася пахваліцца, нешта расказаць, каб і ў гэтага шафяругі склалася ўражанне, што ён не абы-хто.

— У якой арміі,— здзекліва перапытаў таксіст,— мо ў турме альбо ў лагеры? У цябе ж форма не армейская...

— Шмат ты разумееш... Твая справа руль круціць, ясна! — не любіў Перабурмыт, калі гаварылі яму насуперак.

— Што я табе сказаў, прапар ты вашывы! — таксама павысіў голас таксіст. Чым бы гэтая сварка скончылася — невядома, на шчасце, яны нарэшце прыехалі. І Перабурмыт, кінуўшы траяк на пярэдняе сядзенне, выскачыў з машыны, з усяе сілы ляпнуўшы дзверцамі.

— У, вашывы прапар! — данеслася ад вадзіцеля, і яшчэ б трохі — Перабурмыт мог бы ляпнуць яго па твары, які тырчэў над апушчаным шклом. Але машына рванула і, мільгнуўшы агнямі, знікла з двара.

Адрас, дзе жыла Ніла Восіпаўна, ён помніў і таму адразу накіраваўся да пад'езда. Ніякіх ваганняў у яго не было, ён быў надзіва спакойны і рашучы. Нішто цяпер не магло спыніць. Мірыку яшчэ сядзець амаль месяц, і за гэты час ён, Перабурмыт, вырашыць усё, што яму трэба. Ну і што, што ён падставіў гэтага мазурыка, усё роўна некага трэба было, дык чаму не Мірыка. Вось чым ён лепш за астатніх зэкаў. Абсалютна нічым. Усё

роўна сядзець, дык на год больш ці менш, якая ім розніца. Аніякай. Не яму ж садзіцца. Не, прабачце, грамадзяне, мяне не возьмеш. Не возьмеш...

Ен выйшаў з ліфта, на пляцоўцы было чатыры кватэры, агледзеўся і націснуў чырвоную кнопачку ля дзвярэй. Яны расчыніліся амаль адразу, мо каго чакалі, а мо проста была ў калідоры гэтая сімпатычная дзяўчына, якая нават не здзівіўшыся яму, запрасіла:

— Заходзьце, калі ласка!

Перабурмыт на імгненне трохі разгубіўся ад такой гасціннасці. Ен паставіў на падлогу свой чамаданчык і спытаў, ці можна пабачыць Нілу Восіпаўну.

— Мама, цябе пытаюць! — крыкнула дзяўчына, адышла па калідоры і пачала бесцырымонна разглядваць прапаршчыка.— Вы, відаць, здалёк? — спытала яна.

— Здалёк...— ужо ўпэўнена адчуў сябе Перабурмыт.— Здалёк.

— Вы да мяне? Добры вечар! — выйшла з бакавога калідора пажылая жанчына, і ён не паверыў, што гэта тая Ніла Восіпаўна, падумаў, што памыліўся. І толькі па голасе, хрыплаватым і быццам рэзкім, пазнаў.

— Да вас, канечне, да вас,— шырока заўсміхаўся Перабурмыт.— Вядома да вас, Ніла Восіпаўна. Я проста рады, што нарэшце бачу вас, а гэта, мусіць,— дачка? Ці хто? Бачу, дачка, падобная. Гэткая ж прыгожая, як маці. Знаеце, ехаў, ехаў і, думаю, давай заеду ў Мінск, пабачу вас. Тым больш што адрас у мяне ёсць. Самі ж давалі, помніце...

Цень прамільгнуў па твары Нілы Восіпаўны. Пэўна, яна яшчэ не даўмелася, што гэта за госць завітаў да іх. «Добра, што ў форме застаўся,— падумаў Перабурмыт,— а то яшчэ вытурылі б з кватэры».

— А... Як жа ж...— нечакана ажно заблішчэлі вочы ў гаспадыні, проста засвяціліся.— Распранайцеся, калі ласка. Анжэла, Ісідар! Ідзіце сюды,— гукнула яна, і выйшлі ў калідор зноў тая маладая прыгажуня і лысы дзядзька, няйнакш гаспадар.— Пазнаёмцеся, гэта прапаршчык, прабачце, Пера...

— Перабурмыт.

— Перабурмыт. Ен служыць там, дзе наш Мірык... Ен... Ен мне дапамагаў, калі трэба было,— ужо без радасці прамовіла Ніла Восіпаўна.

У галаве Перабурмыта даўно ўжо было ўсё праду-

мана, што расказваць Ніле Восіпаўне, а тое, што яна пачне распытваць — ніякіх сумненняў. Не магла ж яна атрымаць пісьмо за гэты час. Наўрад. За тое, у чым цяпер вінен Мірык па законе, ніякай перапіскі не дазволяць. Дзе-небудзь сядзіць у шызо — штрафным ізалятары. Хай пасядзіць там, а ён пагасцюе ў яго дома. Калі гэта ўсё высветліцца, палова жыцця можа прайсці, а тады — прывітанне, шукай, як кажуць, ветру ў полі. Не трэба яму і паўжыцця, тыдня мо хопіць. Галоўнае, здабыць яшчэ грошай. Значыць, пакуль нельга ім гаварыць, што ён ужо не служыць у калоніі, што звольнены. Усё застаецца так, як і было. Наперад, Перабурмыт!

Калі ён мыў рукі ў ваннай, Ніла Восіпаўна, падаючы ручнік, умольна прашаптала:

— Толькі два словы, як там Мірык?

І хоць Перабурмыт чакаў гэтага пытання, але ўсё роўна яно было раптоўным і нежаданым, лепш было б на яго не адказваць. Ён стаяў спіной да жанчыны, і яна ў гэты момант не бачыла ягонага выразу твару.

— Адбывае свае два тыдні і пасля павінен прыехаць.

— Значыць... Ён у канцы месяца будзе ў Мінску?

— Напэўна,— ён поўнасцю ўжо валодаў сабой. Павярнуўся, аддаў ручнік.

— Праходзьце. Вы, мусіць, з дарогі, есці хочаце. Мы пасля з вамі трошкі пагаворым. Добра? — таропка казала Ніла Восіпаўна і вяла яго за сабой па калідоры ў пакой, дзе было поўна людзей, якія гучна гаманілі, курылі і ніяк не адрэагавалі на з'яўленне Перабурмыта. Толькі адзін з гасцей, даволі сталага веку мужчына з сівізною ў чорных валасах, прамовіў:

— А, наша армія — нас беражэ...— і адвярнуўся да хлопца, які нечаму смяяўся, ажно папіскваў.

Ніла Восіпаўна пасадзіла за стол Перабурмыта і паставіла перад ім талерку з салатай, мясам. Пасунула да яго чарку, але ён адразу вырашыў, што браць нават на зуб спіртнога не будзе. Яму трэба было зрабіць на гаспадыню найлепшае ўражанне, каб яна паверыла, што ён сапраўды дапамагаў Мірыку, а не толькі браў падарункі. Ён еў, паглядваў на людзей, што сядзелі побач з ім, і чым больш прыслухоўваўся, тым больш здаваўся небяспечным для яго сіваваты. Гэты чалавек паводзіў сябе тут вельмі незалежна, і нават Ніла Восіпаўна, адчувалася, была ў яго ўладзе, была гатова

падпарадкавацца яму. У ім Перабурмыт адчуў сілу, якую не меў сам, але якую мелі ў калоніі паханы, і ён баяўся іх. Як толькі сіваваты паварочваў галаву ў бок Перабурмыта, той апускаў вочы, не мог вытрымліваць цяжару і іроніі, якімі быў ажно перапоўнены пагляд.

Перабурмыта ні з кім не пазнаёмілі, і ён палічыў, што Ніла Восіпаўна зрабіла гэта наўмысна. Напэўна, не хоча, каб тут успаміналі сына, гаварылі пра турму. Мо хто з гасцей не ведае, што яе сын сядзіць. А пазнаёміўшыся, рана ці позна ўзнікне пытанне да Перабурмыта: адкуль прыехаў, што робіць. А калі даведаюцца, што ў калоніі служыў... служыць, тады пытанняў будзе мора. У людзей звычайна ўзнікае цікавасць да маламядомых старонак жыцця. А тут такіх пікантных — з жыцця калоніі. Можна было б пасмяшыць публіку, але ж ён прыехаў сюды не дзеля смеху, дый ці будзе гэта прыемна Ніле Восіпаўне, чый сынок сядзіць ужо каторы год. Аднак ён, Перабурмыт, ёй не спачувае. Бач, як жыве, якая мэбля ў кватэры, якія дываны. Багацце ажно прэ з усіх куткоў, усё маюць. А ў яго нічога, акрамя некалькіх тысяч, што сабраў з зарплаты і падарункаў. Канечне, каб паслужыў хоць дзесяць гадоў, дык можна было б тады паглядзець, што меў бы Перабурмыт. Няхай сабе і прапаршчык.

— Вам, можа, яшчэ што пакласці? — пасунулася да яго бліжэй дачка Нілы Восіпаўны.— Не саромцеся. Вы ж, мусіць, згаладаліся з дарогі...

— Ды не, дзякуй... Вы лепш мне скажыце, хто ў кампаніі,— сказаў Перабурмыт так, каб пачула толькі яна.— Бо я сяджу, нікога не знаю. І трошкі няёмка сябе адчуваю.

Ен і сам не мог зразумець, навошта спытаў пра гэтых людзей. Можа, падумаў, што некалі спатрэбяцца ў яго жыцці, калі застанецца тут. Хоць гэта было б трохі і небяспечна, бо вернецца дамоў Мірык і адразу ж яму паведамяць пра яго, былога прапаршчыка Перабурмыта. А ён вывучыў гэтых поскудзяў, ведае іх звычкі. Помсціць будзе за тое, што прадаў, каб вызваліцца самому. Найгорш, што нявіннага. Не мог жа Перабурмыт назваць Шчура з яго хеўрай. Тады б хана была б у турме. Нешта прыдумалі б поскудзі, падлавілі б і ўсадзілі б між рэбраў нож. Хто і што — потым шукай. А калі і знайшлі б, дык Перабурмыту было б ужо ўсё роўна. Нічога, калі які год яшчэ пасядзіць Мірык. Яму турма,

што дом родны. І з вамі нічога не зробіцца, цынічна думаў пра Нілу Восіпаўну, якая за гэты час, пакуль ён еў, пераапранулася ў святочную сукню, блішчастую і доўгую. Яна села на канапе насупраць Перабурмыта і, здавалася, зазірала яму ў рот, не зводзіла вачэй з яго. Такая пільная ўвага раздражняла Перабурмыта. Іншае, калі б не было гэтых гасцей, невядомых яму, хоць Анжэла і пералічыла іх, але ўсё роўна яны былі пакуль небяспечныя Перабурмыту. Яны маглі высветліць, што ён ашуквае гаспадыню, што ён ужо не служыць. Так ці інакш яму трэба будзе пра гэта сказаць, але пасля, пасля...

Падсілкаваўшыся, Перабурмыт пачаў аглядваць кампанію, у якую трапіў па волі лёсу. Ён бачыў, што Ніле Восіпаўне вельмі хочацца пагаварыць з ім, парапытваць пра сына. Мусіць, проста ажно свярбіць язык. Перабурмыт ужо вырашыў для сябе, што сёння ёй нічога не раскажа. Размовы свае яны пачнуць з раніцы, тады парадуе жанчыне душу: які добры стаў сынок, што ён хутка, вось-вось апынецца дома. Такая думка мільгнула і знікла, ён прыглядваўся цішком да двух хлопцаў, якія сядзелі побач з сівым пісьменнікам. Хлопцы як хлопцы, адзін — чарнявы, другі — бялявы, адзін маўчаў, другі спрабаваў спрачацца з пісьменнікам. Аб чым, пра што яны гаварылі, Перабурмыт пакуль не разумеў, дый навошта гэта ўсё яму. Балбатня. Жыць не ўмеюць, толькі ўсё ля-ля, ля-ля. Пустое. Вось ён — іншае. Нават трапіўшы на кручок, змог вырвацца і — на волі. Усё чыста, роўна. Што яны дыскутуюць, спрачаюцца, калі нічога не вырашаюць, абы мянташыць языком. Таму і бардак у краіне, што ўсе мянташаць языком. «А мо ў міліцыю наняцца? — раптам падумалася.— Будзе не горш, чым у калоніі. Улада... А чаму і не ў міліцыю?.. Чаму? Толькі быць асцярожным, каб не схапілі за руку».

Для Перабурмыта было нечаканым пытанне сівавалосага пісьменніка, і ён інстынктыўна насцярожыўся.

— Дык армія гатова абараніць свой народ, які поіць і корміць яе? Як лічыце, таварыш прапаршчык? — спытаў і ўсміхнуўся сіваваты.

— Вы яшчэ можаце сумнявацца, Радзімір! — усклікнула Анжэла.— Паглядзіце на нашых сяброў,— яна рукою павяла ў бок хлопцаў,— дый сам прапаршчык.

— Вы мяне, Анжэла, не пераканалі,— пісьменнік чамусьці зарагатаў.— Але вам памылку можна дараваць. Прапаршчык — гэта не армія. Ён — унутраныя войскі, няйнакш мае гонар служыць у турме.

— Як гэта вы, Радзімір, вызначылі? — паціснула плячыма Анжэла і пільна, проста ў вочы зірнула на Перабурмыта.

— Па мундзіры. Усё вельмі проста. Такія хлопцы некалі і мяне ахоўвалі. Толькі шчэ прапаршчыкаў не было. Дык ці правільна я сказаў, прапаршчык?

— Што вы ўсё прапаршчык, прапаршчык. У яго ж імя ёсць,— падала голас Ніла Восіпаўна.

— Чаму ж не, правільна,— Перабурмыт расшпіліў мундзір, каб адчуваць сябе зручней, разам з крэслам пасунуўся трохі ўперад.— Правільна. Я служыў у калоніі....— і адразу паправіў сябе, бо зноў перад ім былі здзіўленыя вочы Анжэлы.— Я служу ў калоніі, але не лічу гэта нечым ганебным, непрыстойным. Некаму трэба і ахоўваць. Калі вас ахоўвалі, значыць, была прычына, каб вас ахоўваць. Значыць, вы былі небяспечным для грамадства чалавекам. Каб вас тады не ахоўвалі, дык, можа, цяпер не сядзелі б тут за сталом і не сталі б пісьменнікам...

Твар у сіваватага чырванеў, вочы наліліся крывёю, здаецца, зараз вылезуць з арбіт. Зазлаваў, слінаю запырскаецца. Перабурмыт рады: укалоў, уеў нахабніка. «Пісьменнік, разумнік, не трапіў ты да мяне ў атрад, я цябе навучыў бы, як сабак стрыгуць...» Пісьменнік не дае яму дагаварыць.

— Ну дзякуй, таварыш надзіральнік, дзякуй! Вы зрабілі мяне чалавекам, навучылі жыць. Ды каб я сам не ўзяўся за розум, і цяпер выносіў бы парашу з камеры. Пасля вашай навукі — хто не краў, становіцца злодзеем. Хто быў злодзей — рэцыдывістам. Ваша навука — дзярмо!

Пісьменнік крычаў, а Перабурмыт усміхаўся. Ён ненавідзеў усіх, хто быў зараз у гэтым пакоі, ненавідзеў усіх у краіне. «Аўтамат бы, аўтамат...»

## 4

Аўгуст зноў апынуўся ў гасцях Нілы Восіпаўны выпадкова. Гэтак жа выпадкова спаткаўся і з Галінай, пра якую апошнім часам думаў усё менш. І гэта зра-

зумела: калі чалавека не бачыш доўгі час, ад яго пачынаеш проста адвыкаць. Усё менш і менш застаецца для яго месца ў тваёй душы. І цяпер Аўгуст наўрад ці ўбачыў бы Галіну, калі б не Віталь Абламей, якому надта хацелася пабыць у Анжэлы дома.

Быў шэры восеньскі дзень з мокрымі і голымі дрэвамі, людзі спяшаліся, на вуліцы не затрымліваліся. І, як звычайна, транспарт хадзіў кепска, быў перапоўнены.

Абламей ужо ведаў пра Галіну, гэта ён звёў іх з Аўгустам. Як знайшоў і выцягнуў на гэтую сустрэчу, не сказаў. Толькі пакуль ішлі да Анжэлы, падміргваў і анекдоты плёў. Аўгуста здзівіла, што Галіна была моцна нафарбавана: і вусны, і вочы. Дый уся яна была зусім не такая, якая запомнілася яму. Здалося, што і ў сваіх паводзінах вельмі змянілася. Нібы той самы чалавек, але і не той. Ганарліва падціскае ніжнюю губу. Больш маўчыць, чым гаворыць. І паглядвае на ўсіх іранічна. Апранута яна была ў скуранае паліто з каўняром з блакітнага пясца. На галаве гэткая ж шапка. Яна была ў ботах на высокіх абцасах і выглядала вельмі стройнай і высокай. Анжэла ёй па плячо і як падлетак ля сталай дамы.

Ніякавата сябе адчуваў Аўгуст, яму здавалася, што Абламей жартуе не так, як трэба, гаворыць пошласць. Гэта можа абразіць Галіну, і ён ішоў, сцяўшыся, увесь напружаны і азіраючы сябе з усіх бакоў. Мо ён блага апрануты, у куртцы караткаватыя рукавы, дый джынсы на ім старыя. А хацелася б, каб ураджанне склалася ў яе добрае, каб адчула, што ён не абы-які там. Канечне, не аспірант і не інжынер. Але нічога, у яго ўсё наперадзе. Усяму яшчэ навучыцца. Чаму яна нават слоўца яму не скажа, а размаўляе толькі з Анжэлай і Абламеем. Яго як не заўважае. Нешта трэба было б і яму сказаць, але мову як адняло. І мазгі не варушыліся, не хацелі думаць...

Ён не можа зразумець, што з Галінай, чаму яна такая абыякавая.

А Абламей смяецца з Анжэлай, яны вясёлыя і шчаслівыя. Куды яны ідуць і навошта? Што ён там згубіў? Урэшце і Галіна здзівілася сабе, што дужа не ўсхвалявалася. Няйнакш, усё астыла, дый ці палаў агонь... Не да гэтага хлопца ёй, ён яшчэ сваё знойдзе, спаткае. Ёй трэба клапаціцца пра сваю будучыню. Усё яшчэ няпэў-

на і з дысертацыяй, і кватэрай. Дом будаваўся для універсітэта, але гэта не значыць, што абавязкова будзе ёй кватэра. Усё настолькі хістка, яна не можа рызыкаваць дзеля нейкага выпадковага імкнення... Хоць ёй вельмі прыемна, як глядзіць на яе Аўгуст. І сімпатычны ён хлопец, але ж — дысертацыя і кватэра. Яна цяпер прагматык: перш — кватэра, а потым — каханне. Канечне, гэта непрыгожа з пункту гледжання тых, хто прыдумаў гэтую мараль. Яны жывуць у выдатных кватэрах і ў прэстыжных раёнах.

Яе запрасіла да сябе Анжэла, у якой яна вяла практычныя заняткі па сацыялогіі. Паабяцала, што будзе цікавы пісьменнік, і назвала яго кнігі. Галіна іх чытала, праўда, мала помніла што ў дэталях, але імёны некаторых герояў адразу прыгадаліся ёй. Адна кніжка была пра турму, пра нешта вельмі страшнае... Як галоўны герой кнігі ўцякаў з турмы. Ці будзе калі яшчэ такая сустрэча? Было вельмі цікава пабачыць таго чалавека, які напісаў гэтую страшную кніжку. І яна ніяк не чакала, што зноў убачыць Аўгуста. Відаць, у яе было проста часовае жаданне сустракацца з гэтым хлопцам, ад якога даўно яна пазбавілася ўжо. Што такое каханне, калі няма кватэры. А Зушчыц можа дапамагчы...

Тыдзень назад Зушчыц быў у рэктара універсітэта. Клапаціўся пра яе. Клапаціўся, толькі што з гэтага будзе? Мо трэба было самой адразу выходзіць на рэктара? Зушчыц нібыта і спрабуе нешта зрабіць, але, мусіць, гэта не па зубах яму. А хочацца нарэшце атрымаць свой куток. «Вось тады можна было б спаткацца і з табой...» — думае Галіна, акідваючы позіркам панылага Аўгуста. І сама жахаецца: настолькі цынічная гэта думка.

Усё-ткі ёй прыемная ўвага Анжэлы, Аўгуста і Абламея. Яна адчувае сябе значным чалавекам ля іх. І гэтае пачуццё грэе сэрца, хвалюе ажно.

Адразу не падабаецца пісьменнік, які быццам магнітам цягне да сябе і гаворыць, гаворыць. Яна — убаку. Пісьменнік як не заўважае яе, толькі звяртаецца да Анжэлы.

Потым прыходзіць нейкі прапаршчык з хітра-нахабным тварам, перад якім ледзь не на дыбачках Анжэліна маці. Што гэта за чалавек, навошта ён тут?

Размова ідзе вельмі прымітыўная, як усё роўна вясковыя бабы і дзяды сабраліся на прызбе. Ніхто не

можа ацаніць яе здольнасці і тое, што яна вось-вось кандыдат навук.

— Вам сумна, Галіна? — звяртаецца да яе Анжэліна маці. «Нібыта не бачыць сама».

— Не, наадварот, надта прыемна ў гэтай кампаніі.

— Галя, ў цябе непрыемнасці? — кранае за руку Аўгуст. І гэты дотык яе раздражняе яшчэ больш.

— Не, ты што! — яна рагоча, знарок шырока раскрываючы рот. У яе прыгожыя роўныя зубы. Чаму не паказаць іх? Няхай паглядзяць і пазайздросцяць ёй.

— Табе тут нецікава і мне таксама,— шэпча Аўгуст і зазірае ёй у вочы.— Пайшлі адсюль. Трохі пагуляем...

Ей шчыра шкада гэтага хлопца, можа, сказаць, каб не тлуміў сабе галаву, што ў яе ёсць чалавек... дарагі...

І ўсё-ткі нешта ў гэтым Аўгусце прываблівае, цягне. Яна была ўжо зусім абыякавая да яго, а цяпер зноў цікавасць да гэтага хлопца. І хоць супрацівіцца, але ўсё роўна спее жаданне прыгарнуцца да магутнага пляча... Але ж гэта немагчыма, ён не патрэбен ёй...

— Наша грамадства прагніло наскрозь,— усё выступае пісьменнік. Калматыя сівыя пасмы, буйны чырвоны твар з чорнымі брывамі і ненатуральна-бліскучымі вачыма нагадваюць ёй Мефістофеля, якога яна бачыла ў тэатры оперы і балета. Толькі той Мефістофель быў, можа, трохі вышэйшы і голас грымеў, наганяючы страх. А тут ёй не страшна, а смешна.

— І мы прагнілі. Крычалі — самае дэмакратычнае, самае чалавечнае, а ўрэшце — кароль голы. Дзе наша дэмакратыя?

— Сярод нас,— не вытрымала Галіна і падала рэпліку, чым выклікала яшчэ большы запал.

— Гэта мы чулі дзесяцігоддзямі. Толькі чулі вушамі, а не бачылі вачыма.

Настойліва, ва ўпор разглядвае яе прапаршчык. Непрыемны тып. Мусіць, лічыць, што ягоныя мужчынскія якасці настолькі відавочна магутныя, што ніводная жанчына ад іх не адмовіцца. Усё абрыдла, усё. Хутчэй бы дачакацца таго часу, калі яна нарэшце абароніць дысертацыю і атрымае кватэру. Тады ўсё, усё, поўная самастойнасць. Непатрэбны будзе і Зушчыц. Яны тады назаўсёды застануцца проста сябрамі. Не забудзе дабра, якое ён зробіць, але досыць, досыць...

Пісьменнік узмахнуў сваёй кашчавай рукой па валасах, збіў іх назад і адкрыў з вялізнымі залысінамі

чырвоны, як распараны, лоб, які перасякаў рудавата-фіялетавы шрам. Твар набыў яшчэ больш разбойніцкі выраз. «І ўсё-ткі, відаць, ён сапраўдны мужчына,— падумала Галіна.— Аўгуст яшчэ хлопчык... Калі я сама неўпарадкавана — і брацъ на шыю маладога...»

Месяц яшчэ назад яна так не думала б, а цяпер адчувала сябе на гадоў дзесяць старэйшай. Верх над пачуццямі ўсё часцей браў розум. Ей здавалася, што яна разлічвае кожны крок. Зрэдзь яе ахопліваў сорам і пачынала ціснуць на душу сумленне. Але гэта працягвалася нядоўга, і яна з новай апантанасцю рушыла да сваёй мэты. Калі сама не дойдзе, ніхто не дапаможа. У яе няма ні бацькі — сакратара абкома ці хоць райкома, ні дзядзькі. Прыемныя закаханыя позіркі Аўгуста: хай яны будуць, хай упрыгожаць жыццё ёй.

— Вы сумуеце ў нас? — неяк па-панібрацку абняла яе за плечы Анжэла, замуркала, як кошачка. У вушах завушніцы з дыяментамі, на левай руцэ пярсцёнак таксама з дыяментам. Вось і звычайная студэнтка, а яна, можна сказаць, выкладчыца універсітэта, не мае простага таннага пярсцёначка. На сто рублёў на шмат не размахнешся. Добра, што бацькі зрэдзь перакінуць сотню-другую, каб якую сукню купіць ці боты, а то не ведала б, як жыць. А Зушчыц... Стары скнара і прайдзісвет. «Але ж я нічога не магу зрабіць без яго...»

## 5

Зушчыц быў не супраць таго, каб Галіна абаранілася, але і прыспешваць абарону дысертацыі ён не хацеў. Навошта? Цяпер яму ўсё роўна хто яна: аспірантка ці кандыдат навук. І нават лепш, калі проста аспірантка, больш залежная. Урэшце, ці мала было ў яго гэтых аспірантак. У грамадскіх навуках усе яны каралевы... Тут ніхто нічога не ведае. Хто пры большай пасадзе, той і найлепшы знаўца законаў грамадства. Па вялікім рахунку — кошт усім гэтым дысертацыям нуль капеек. Але якая розніца яму...

На абмеркаванне дысертацыі Галіны з Масквы прылятаў доктар навук Кастроў Фёдар Анатольевіч. І Зушчыц сустракаў яго ў аэрапорце. Яны былі трохі знаёмыя, але гэтае знаёмства было толькі ў тым, што яны ведалі адзін аднаго ў твар. Нават дакладней, ведаў

Зушчыц Кастрова. Той займаў цяпер пасаду намесніка дырэктара навукова-даследчага інстытута. Яго лічылі знаўцам і аўтарытэтам у грамадскіх навуках. Магчыма, гэткая думка была б і пра Зушчыца, калі б ён жыў у Маскве. Аднак яму хапала і Мінска. Іншае, што знаёмства з Кастровым...

Ён пазнаў здалёк хударлявую постаць маскоўскага прафесара і, трохі памарудзіўшы, рушыў яму насустрач. Зушчыц падумаў, што Кастроў выглядае даволі маладым, хоць яму ўжо і за пяцьдзесят. У валасах сівізны не відаць, твар гладкі і дагледжаны, як усё роўна ў артысткі, пастаянна заклапочанай сваім знешнім выглядам. Кастроў быў у куртачцы і джынсах. У руках трымаў шырокую чырвона-блакітную сумку.

Ён таксама адразу пазнаў Зушчыца, хоць яны і бачыліся толькі аднойчы, вячэралі разам у адной маскоўскай кампаніі. Размаўлялі некалькі разоў па тэлефоне. І кожны з іх адчуў адзін у адным блізкага па духу чалавека. Спаткаўшыся, узрадавана пацiснулі рукі. Толькі Зушчыц нахіліў яшчэ галаву, доўгія валасы ўпалі на вочы, і ён, выгнуўшы правую руку, закінуў іх назад. Але зрабіў гэта элегантна і прыгожа.

Кастроў прыехаў толькі на два дні, з Мінска яму яшчэ трэба было ехаць у Рыгу. Таксама на савет па абароне дысертацый. І ён пра гэта адразу сказаў Зушчыцу.

Яны ехалі ў машыне, абменьваліся агульнымі словамі пра надвор'е, пра знаёмых, якія былі бліжэй да Кастрова, чым да Зушчыца, таму што працавалі ў Маскве. Зушчыцу ўсё было цікава, і ён запытаўся і пра Галінастага, зяця аднаго з былых партыйных кіраўнікоў. Даўно хадзілі і па Мінску чуткі, што Галінасты арыштаваны і ідзе па ім следства. Канечне, Кастроў ведаў пра гэта і расказваў весела, смеючыся, нібыта анекдот. У Галінастага быццам пры арышце ўзялі багацця на тры мільёны рублёў. Яшчэ адна маскоўская плётка была такая: за мяжой у Брэжнева знайшліся сваякі, якія запатрабавалі сваю долю наследства ў суме семдзесят мільёнаў рублёў. Дзе тыя сваякі, Кастроў не ведаў. Мо ў Ізраілі, мо ў Амерыцы — якая ўрэшце розніца.

Зушчыц толькі вохкаў. Прыслухоўваўся да іх размовы і вадзіцель і нават дарогай зрэдзь устаўляў сваіх пяць капеек. Атрымлівалася, што ён не менш за Кастро-

ва быў у курсе таго, што рабілася ў вялікай сталіцы. Ехалі яны з новага аэрапорта з-пад Смалявіч, а гэта недзе амаль пяцьдзесят кіламетраў, дый яшчэ па Мінску кавалак дарогі — пагаманіць часу хапіла. Былі, праўда, моманты, якія хацеў закрануць Зушчыц, але перашкодзіў гаманкі вадзіцель. Вырашыў адкласці на пасля, каб не было сведкаў. Ён уладкаваў Кастрова ў гасцініцу, дзе яшчэ зранку перад тым сам аплаціў нумар. Канечне, мог прымусіць гэта зрабіць Галіну, ёй найперш патрэбен масквіч, але няхай будзе прыгожы жэст. У іх адносінах ён застанецца джэнтльменам да канца. Пра такога апанента, як Кастроў, любы дысертант можа толькі марыць. Наўрад ці ён будзе надта ўжо крытыкаваць Галіну. Прынамсі, калі б быў на яго месцы Зушчыц...

Мо праз дзве гадзіны яны былі ўжо на кафедры, дзе іх чакала Галіна. Па тым, як бліснулі вочы ў Кастрова, як ён адразу пацалаваў руку ёй, Зушчыц зразумеў, што ўсё атрымаецца найлепшым чынам. У пакоі, акрамя іх траіх, нікога не было, і Кастроў быў вельмі вясёлы, зноў расказаў анекдоты. Потым успомніў пра тое, як быў у Італіі і нават у Монтэ-Карла. Пакуль размова пра дысертацыю не ішла, нібыта заўтра зранку не пачыналася абарона. Галіна амаль на кожны жарт, на кожнае слова Кастрова хіхікала, на Зушчыца ўвагі не звяртала зусім. І ў ім пачала ўзнімацца непрыязнасць, амаль нянавісць да гэтай дзяўчыны, якая з-за таго, каб спадабацца масквічу, ужо забылася пра яго. Нібыта ён, Зушчыц, і не вывеў яе да фінішу, да гэтай абароны. А ўрэшце не трэба быць вялікім вучоным, каб зразумець, што дысертацыя дробненькая, скампіляваная з розных кніжак таварыства «Веды». «Усё забыла ўжо...» — думаў Зушчыц. І каб самому не патрэбен быў Кастроў, дык ён мог бы зараз груба ўзяць Галіну за рукаў і вывесці з кабінета. Альбо зрабіць гэта больш інтэлігентна — папрасіць схадзіць на кафедру філасофіі да загадчыка і што-небудзь высветліць там. Ён усё мог бы, але ніколі не зробіць гэтага. Таму што яму Кастроў даражэйшы, чым Галіна. «Пачакай, яшчэ трохі — і я цябе выштурхну адсюль...» — думаў ён і, каб не заўважылі ў яго вачах рэўнасці, бо гэта была менавіта яна, хоць ён яшчэ пакуль не асэнсаваў гэтага, паглыбіўся ў паперы, якіх было поўна на стале. Ён чытаў, не ўнікаючы ў іх сэнс, перагортваў, складваў у папкі

і чуў усё, што гаварылі Кастроў з Галінай. Што гэта з ім, з-за нейкай дробязі расхваляваўся, здольны выскачыць у калідор, каб не чуць і не бачыць, як яны размаўляюць. Хоць нічога асаблівага не адбываецца: прафесар з аспіранткай абмяркоўваюць дысертацыю. Зайшоў у кабінет Ярыга, нешта казаў, і Зушчыц слухаў, але не чуў яго.

На абароне, хто б ні выступаў, дысертацыю хвалілі, нібыта яна была — ажно адкрыццём у навуцы. Зушчыцу пачало здавацца, што, магчыма, так яно і ёсць. І калі яму далі слова, дык таксама пахваліў, а на заканчэнне прамовы дадаў, каб Галіна не спынялася на кандыдацкай, а расла далей. Пад канец абароны ўжо сама Галіна верыла таму, што казалі гэтыя сівыя людзі, якія, праўда, увесь час звярталіся да яе апанента, прафесара Кастрова, нібыта ён збіраўся стаць кандыдатам навук ці, прынамсі, доктарам. А ўсё так добра склалася, бо Кастроў выступіў першы.

— Ну, што, справа зроблена, віншую, віншую,— ласкава ўсміхаўся, ціснуў ёй руку Кастроў.— Умываю рукі і лячу ў Рыгу. Чуеце, Вацлаў Казіміравіч,— павярнуўся да Зушчыца: — Умываю рукі і лячу ў Рыгу...

— Не можа быць, не можа быць,— міргаў Галіне Зушчыц. А яна і сама ведала, што ёй трэба рабіць.

Афіцыйна банкеты былі забаронены. Але цішком усё роўна іх наладжвалі. Так, каб, барані божа, які чужы не дазнаўся і не паведаміў у райком, абком. Ва ўсіх яшчэ быў на памяці выпадак. На банкеце пасля абароны доктарскай дысертацыі пабыў намеснік міністра, і нехта з ягоных добразычліўцаў прасігналіў у гарком. Праз месяц намеснік міністра ўжо адпачываў на пенсіі. Таму справа з банкетам была вельмі далікатная. Галіна вырашыла, што банкет будзе ў яе на кватэры, якраз гаспадыня на тыдзень паехала ў Гомель у госці да дачкі, і запросіць Зушчыца, Кастрова і... Трэба ж яшчэ кагосьці з жанчын, каб было пароўну... Усё культурна, ціха і спакойна, і тады ніводная сабака не ўведае і нікому не напіша. Пра банкет яна думала яшчэ калі пісала дысертацыю і не раз раілася з Зушчыцам. Ён нават прапаноўваў пасядзець у яго на дачы, але пры ўмове, што жонка з'едзе куды-небудзь у камандзіроўку. Жонка Зушчыца нікуды не з'ехала, пільна сачыла за мужам. І Галіна запрасіла Кастрова і Зушчыца на чай, падкрэсліўшы, што не на просты чай, а беларус-

кі, з зёлак, сакрэт якога перадала ёй бабуля. Выказана гэта было ўжо без сведкаў і ў кабінеце Зушчыца. Абодва прафесары адразу згадзіліся, бо ясна, што яны толькі і чакалі запрашэння.

За дзень да абароны яна купіла ў кулінарыі дзве курыцы, у кафэ «Брыганціна» тры порцыі чырвонай рыбы, з якой зрабіла дзесяць бутэрбродаў, прыгатавала рознай салаты, акрамя таго, у халадзільніку была свініна, бекон і кааператыўная вэнджаная кілбаса «Паляўнічая».

Галіна, канечне, і сама накрыла б стол, усё прыгатавала б, але лабарантку Лену запрасіць падказаў Зушчыц. І яна з ім згадзілася, дый, зрэшты, трэба была яшчэ адна жанчына. Хоць, з другога боку, лепш, каб яна была не з кафедры. Але ж Зушчыц быў упэўнены ў Лене. І тая, калі Галіна сказала пра банкет, згадзілася адразу.

Яны накрылі стол абрусам, з старадаўняй беларускай вышыванкай,— маці некалі падаравала Галіне на дваццацігоддзе, паставілі закусь, пітво. Атрымалася няблага, прынамсі, лепш, чым у рэстаране, дзе замест мяса ці кілбасы на закусь могуць пакласці зельц і ліверку. Тут усё было зроблена па найвышэйшым узоры — адбылася, як ні кажы, але важнецкая падзея ў яе жыцці. Яна цішком прамовіла: «Кандыдат навук, кандыдат навук», а потым уголас паўтарыла і засмяялася вельмі задаволеная.

— Шчаслівая? — спытала Лена, яна яшчэ ўсё парадкавала на стале, хацела паставіць жбанок з журавінавым напіткам. На хвіліну азірнулася, і Галіна як ні была занята сабой, сваёй радасцю, але паспела заўважыць у вачах лабаранткі зайздрасць. І ад гэтага ёй чамусьці стала яшчэ больш прыемна. Цяпер яна была на дзве галавы вышэй за Лену. Мо праз некалькі гадоў будзе дацэнтам, а Лена ўжо нічога не атрымае больш таго, што мае.

Зушчыц з Кастровым прыйшлі з кветкамі і тортам, а таксама прынеслі бутэльку шампанскага. Спярша віншавалі Галіну, а пасля яе апанента. Які ён разумны, колькі ён дапамог! І наогул, каб яго не было, дык наўрад ці Галіна напісала б сваю дысертацыю. Пасля таго, як ужо добра пасядзелі, яна сама так казала і шчыра гэтаму верыла. У галаве была нейкая мітусня, думкі былі

абарваныя, нікчэмныя. У пакоі, здавалася, грымела: кандыдат навук, кандыдат навук!.. Не помніла, як яны засталіся ўдваіх з Кастровым. Ён нешта шаптаў на вуха, цалаваў яе. Яна смяялася, нічога не разумела, і ёй было вельмі добра. Потым сама абдымала Кастрова, і ў свядомасці выплыла нецвярозая думка: які чалавек, прафесар з Масквы пакахаў яе. Розум не кантраляваў дзеянняў, верх над ім узялі пачуцці, эмоцыі, якімі была перапоўнена душа...

Раніцай яны пілі чай у ложку, а потым яшчэ ляжалі амаль да дванаццаці гадзін, ажно пакуль Галіну не падняў тэлефонны званок. Ёй стала трохі ніякавата, калі пачула голас Аўгуста. Ён запрашаў яе на спектакль, у Мінску на гастролях быў маскоўскі тэатр, не самы вядучы, але ўсё-ткі сталічны. Яна, безумоўна, на гэты раз пайшла б у тэатр, калі б не было Кастрова. Яна папрасіла Аўгуста ўзяць білет у тэатр на пазней, бо вельмі занятая. Яна бегае зранку да ночы па розных кабінетах, збірае гэтыя паперы. Кастроў слухаў, што яна казала па тэлефоне, і смяяўся...

Не паспела Галіна дайсці да спальні, як зноў пазванілі. На гэты раз быў Зушчыц.

— Ну як? — сказаў ён замест прывітання і дадаў: — Можаш сёння на работу не выходзіць. Глядзі...— зарагатаў і паклаў трубку.

«Ну, ладна...— здзекліва-нянавісна падумала Галіна,— пабачым, як ты пасля заспяваеш». Відаць, у яе на твары нешта адбілася, бо Кастроў занепакоена спытаўся:

— Мо што здарылася? Так?.. Не...

Яна адмоўна пахітала галавой, усміхнулася, хоць ад абурэння здольна была закрычаць.

— Так, знаёмая запрашала на выстаўку мод.

— Гэта няблага, няблага,— Кастроў паклаў ёй руку на плячо, прыцягнуў да сябе.

Быў ужо новы дзень, які здаўся Галіне незвычайным. Нібыта новае жыццё пачыналася для яе, з нечаканым каханнем, яна адчула, што Кастрова вельмі кахае, што быццам ведае яго шмат гадоў. Ёй хацелася быць з ім заўсёды. Але зноў загудзеў тэлефон. Яна нервова перасмыкнула плячыма і не пайшла здымаць трубку.

6

Двойчы набіраў Мірык нумар свайго хатняга тэлефона, але, пачуўшы голас маці, амаль спуджана клаў трубку. Здавалася, што, як толькі ён вымавіць хоць слова, адразу ўся міліцыя Мінска будзе ведаць ягоны адрас. Схопяць, арыштуюць і зноў на шмат гадоў пасадзяць ў закратаваны дом, нават назву якога лепш не ўспамінаць — калонія. Гэткі настрой у яго быў раніцай, бо вечарам, узяўшы чарку-другую, збіраўся на вуліцу горада з п'янай адвагай і хаваючы ў кішэні нож. Зінка ледзь не на калені станавілася, упрошваючы яго адумацца, а ён рагатаў і адштурхваў яе. Праз якую гадзіну цверазеў і прасіў прабачэння. Супакойваўся, шаптаў Зінцы ласкавыя словы, і яна проста размякала ад пяшчоты, забывала грубасць.

Мінула з тыдзень, і Мірык рабіўся ўсё болей нервовым, ён ужо не знаходзіў сабе месца ў кватэры, адчуваў сябе, як звер у клетцы. Вельмі хацелася ўбачыць родных, але яго спыняў страх. Урэшце ён супакоіў сябе думкай, што ў міліцыі яго ўжо выкраслілі з жывых і маці паведамілі пра гэта.

Зінка яшчэ была ў сваёй піўной, і яна магла прыйсці не раней чым праз гадзіны дзве. Ужо механічна, не заўважаючы сам, Мірык хадзіў ад акна да акна і глядзеў на двор, на дрэвы, машыны, людзей, якія амаль штохвілінна рухаліся па тратуары. Яму раптам захацелася адчыніць акно і закрычаць, каб гэтыя людзі спыніліся альбо хоць азірнуліся і паглядзелі на яго. Жаданне было настолькі моцнае, што ён адскочыў да шафы і, каб прыглушыць яго, спыніць сябе, наліў шклянку гарэлкі і выпіў. Адразу неяк абыякавымі сталі яму гэтыя людзі. Ён уключыў магнітафон і пачаў слухаць Высоцкага. Смутак палез у душу і нібыта кіпцямі пачаў чапляць яе, прыціскаць. «Усё,— вырашыў Мірык,— апранаюся і іду на вуліцу. Пагуляю, падыхаю свежым паветрам. Столькі прыгожага жыцця там, а я сяджу ў душнай кануры. Не дзеля гэтага рваў скуру ў тайзе, як воўк, прабіраўся праз усю краіну. Колькі можна сядзець?!» — ён ажно ўдарыў нагой па падлозе. Да д'ябла Зінка, нікуды яна не падзенецца. Пайду — канчаткова вырашыў ён. Амаль адразу, як апынуўся тут, Зінка купіла яму паліто, туфлі і касцюм. Тады ён сказаў, што верне грошы ёй. А Зінка толькі махнула рукой,

не дуры галавы. Хоць так, дурыць ён ёй галаву. Дурыць, ой як дурыць...

На вуліцы ўжо было цёмна. Толькі там-сям блішчэлі ліхтары, а яму б лепш, каб яны ўсе пагаслі і ніхто не пазнаў са знаёмых. Мо нічога і так: адраслі вусы і барада, чорныя і, ён здзівіўся, з павуцінкамі сівізны. Па вызначэнні Зінкі — барада маладога дацэнта, які марыць аб прафесарскім званні.

Мірык адзеўся, паклаў у кішэню штаноў нож, усёткі будзе спакайней, калі хоць нешта ў руках, і апынуўся на вуліцы. Яна адразу здалася яму варожай. Куды ісці і што рабіць? У каліце было толькі дзесяць рублёў. Ён успомніў пра гэтыя грошы, таму што Зінка падаравала імпартную каліту ўчора і ён яшчэ смяяўся з мяшчанскай звычкі насіць грошы ў каліце. Намацаўшы ў кішэні гэтую рэч, Мірык адчуў сябе ўжо больш упэўнена, яскрава ўзнікла мэта, куды варта было б пайсці. Сесці ў кафэ за столік, пасядзець і паслухаць, што гавораць людзі, чым яны жывуць. Хоць калі б у Мірыка спыталі пра гэта цяпер ці нават хвіліну назад, ён адказаў бы, што гамоняць пра розныя транты і жывуць дзеля свайго пуза. Нічога іншае іх не цікавіць. Кожны заняты, як найлепш пажыць і за кошт чужы. Кожны марыць украсці, украсці!.. І чым яны арозніваюцца ад зэкаў, а нічым, толькі адны сядзяць у кафэ, а другія — за кратамі; неба для іх у пасачку.

Ён якую хвіліну пастаяў, вагаючыся, у якім кірунку рухацца, і неяк міжволі падаўся ўправа да вуліцы, на якой званілі трамваі. На момант забыў пра небяспеку, страціў пільнасць і, дыхнуўшы на поўныя грудзі свежага колкага паветра, зашыбаваў весела, нават пасвістваючы. Яму насустрач трапіла група дружыннікаў, якія, здалося, падазрона паглядзелі на яго. І тады Мірык схамянуўся і спалохаўся, што могуць затрымаць і адвядуць у міліцыю. Калі ж возьмуць за штаны, дык усё, хана. Ён зноў вельмі асцярожна, хаваючыся ад святла ліхтароў і падняўшы каўнер, пайшоў памалу. Ускочыўшы ў трамвай, ён ужо ведаў, куды едзе. Праз пяць прыпынкаў быў дом, у двары якога прайшло яго маленства, там на чацвёртым паверсе яго родныя, ад якіх ён хаваецца і не можа нават ім паказаць свой твар. Прастаяў ля дзвярэй, пільна ўглядаючыся ў акно трамвая і прагна азіраючы знаёмыя вулачкі і завулкі, якія разбягаліся ручайкамі ад вуліцы. Лічыў прыпынкі і

ледзь не праехаў свой. Паспеў выскачыць, калі ўжо зачыняліся дзверы і кранаўся з месца трамвай.

Недзе павінна была вярнуцца з працы Зіна, няйнакш хвалюецца. Дарэмна не пакінуў ёй запіску, бо яшчэ ўзніме гвалт: не дай бог пазвоніць у міліцыю. Па дарозе была тэлефонная будка, але Мірык не стаў званіць Зінцы. Ён вырашыў, што некалькі хвілін, ну мо гадзіну, пабудзе ля дома і — назад. Колькі той язды. Нічога, урэшце, Зінка не такая дурная, зразумее, што яму абрыдла сядзець у клетцы. І ён выйшаў дыхнуць, адчуць сябе чалавекам, а не зверам. Не дзеля таго каб у клетцы быць, ён адолеў тысячы кіламетраў па краіне, у якой на кожным кроку спаткаеш міліцыянера. Небяспека на кожным кроку.

Ад трамвайнага прыпынку да іхняга двара ісці дзве хвіліны. Гэтымі завулкамі ён бегаў, як толькі ўстаў на ногі. І цяпер, здаецца, гэта было вельмі і вельмі даўно, проста неверагодна даўно.

У альтанцы ён узлез на лаўку нагамі, каб лепш бачыць вокны кватэры, дзе зараз маці, бацька і Анжэла. Вокны былі моцна асветленыя, і адно акно ў гасцёўні было адчынена, і з яго гучала музыка, спяваў Чэлентана, чый голас Мірык чуў і ў цягніку, і на вакзале, і нават у калоніі. Гэты італьянец падабаўся, відаць, усім. І родныя Мірыка былі не выключэнне.

«Гуляюць, весела ім...» — падумаў ён з сумам і трохі раздражнёна. Але ж не плакаць ім усё жыццё, што іхні Мірык за кратамі і есць турэмную баланду. Дык ім што, адмовіцца ад кілбасы, каньяку? Навошта. Думаў — расхвалюецца, прыхіліцца грудзьмі да сцяны роднага дома, не. На душы чамусьці спакойна, толькі вушы, як у зайца, наставіліся і ловяць кожны гук з вокнаў.

У светлым прамавугольніку акрэслілася цёмная і, мусіць, высокая постаць чалавека, які нахіліўся над падаконнікам, развёў рукамі і шумна пазяхнуў. Чалавек быў незнаёмы Мірыку і паводзіў сябе надта вольна, быццам жыў у гэтай кватэры. І Мірык раптам засумняваўся, а калі раптам гэта — не яго дом... Няўжо ён пераблытаў, а мо бацькі атрымалі новую кватэру? Але ж наўрад ці дадуць ім новую, бо і старая прасторная... Хоць бацька ўсё можа, нават такое. Аднак не можа быць...

Ці то ад холаду, ці то ад страху па целе пабеглі дрыжыкі, і Мірык засунуў рукі ў кішэні, моцна сціснуўшы

нож. Каб меў сілу, здаецца, скочыў бы проста ў акно, разагнаў бы ўсю кампанію, бо яна была яму ненавісная. З-за гэтай кампаніі ён не мог ўвайсці ў свой дом і пабачыць маці, Анжэлу. Ужо здольны быў гэта зрабіць. Нельга ж бясконца хадзіць вакол, як ваўку, і хавацца ад святла ў цемру. Сваіх пабачыць, а потым зноў залегчы ў бярлогу да Зінкі. Але колькі там можна ляжаць... Якое смачнае паветра, якая прыгажосць на волі. І зноў яму не бачыць усяго гэтага, зноў есці баланду і нюхаць парашу. А гэтыя сытыя, задаволеныя рагочуць, абдымаюць яго сястру.

Ён убачыў Анжэлу, якая выйшла на балкон з двума хлопцамі, высознымі і, пэўна, нахабнымі, бо адзін з іх адразу бесцырымонна паклаў ёй руку на плячо і прыхіліў да сябе. Яна гучна смяялася, нешта казала, а Мірык ажно кіпеў, набіў бы ім лычы. Усе лічаць яго мерцвяком, нябожчыкам, а ён жывы і яшчэ доўга пажыве на гэтым свеце. Падабраўшыся да самага дома, паспрабаваў пачуць, аб чым гамоняць на балконе, але толькі рэдкія словы даляталі да яго. Музыка з кватэры грымела, здавалася, глушыла вакол усе гукі.

У пад'ездзе ляпнулі дзверы, выйшаў чалавек і спыніўся недалёка ад Мірыка.

— Што вы тут робіце? — спытаўся.

— А ідзі ты! — адмахнуўся Мірык. Што ён мог рабіць, проста стаяў, прытуліўшыся да сцяны. Аднак праз хвіліну ў ім як бы спрацаваў сігнал небяспекі. Ён напружыўся і ўгледзеўся ў цемру: крокаў за пяцьшэсць ад яго быў чалавек у форме. Хто ён — міліцыянер альбо ваенны,— відаць не было, у галаве ж Мірыка запульсавала адна думка: міліцыянер. І Мірык задам, задам пачаў адыходзіць да вуліцы. Яшчэ хвіліна — і ён, рэзка павярнуўшыся, шыбануў з усіх ног. Ужо заскакваючы за рог дома, пачуў кароткае і страшнае:

— Стой! Стой!

Уваччу пацямнела, страх ударыў у кроў, і Мірык шалёна памчаў прэч ад свайго роднага дома. Ззаду крычалі «стой», а ён, не зважаючы на машыны і трамвай, здалося, адным скачком пераадолеў вуліцу і нырнуў у цёмны парк. Нібыта зноў уваскрэслі ў памяці тыя часіны, дні, калі ўцякаў са Шчуром з лагера. Пах гэткай жа небяспекі і страху пагналі яго па парку. Мірык закружыў, замітусіўся, баючыся пакінуць сляды, за якія маглі зачапіцца яго ворагі. Недзе ў глухім кутку

ён прысеў на лаўцы перадыхнуць. Затуліўшыся далонам, закурыў, прагна глытаючы цыгарэтны дым. Адыхаўся і толькі цяпер падумаў, што мо дарэмна ўцякаў. Гэта ж мог быць у круглай шапцы і чыгуначнік, і лётчык грамадзянскай авіяцыі. Які-небудзь і ляснік. А яму ўсё бачацца толькі міліцыянеры. «Ух, паскуда!» — непрыгожа вылаяўся, і палягчэла на душы. Трэба вяртацца ў логава. Зінка няйнакш ужо дома. «Ух, паскуды, ух, фраеры!» — вымавіў з палёгкай. Быццам недалёка трэснула голле, потым — зноў. Нехта ішоў, ці то ўжо здавалася яму. Няхай сабе ідзе, у кожнага — свая дарога. Толькі рука міжволі намацала ў кішэні халодную ручку нажа. Калі што якое... Губляць няма чаго... Не, ён не зможа гэтага зрабіць. Навошта. Ён жа не Шчур са сваёй зграяй. Мо не трэба было ехаць у Мінск? Гэта ж прыехаў, лічы, у пашчу зверу. Калі і будуць шукаць, то тут. Ён гэта разумеў і ўсё роўна ехаў. А куды ж яму ехаць, куды?..

Уперадзе раўнула машына, мазнула фарамі па кустах, дзе хаваўся Мірык, павярнула на алею і пакаціла па парку. Цяпер ён не сумняваўся, што гэта міліцыя. Як найхутчэй да Зінкі ў кватэру, як найхутчэй. Там цяпер у яго ратунак.

## 7

Калі Корзун выйшаў з вагона ў Брэсце, ужо змяркалася, і таму ў чорных ценях вакзал здаўся нелюдзімым і нават варожым. Людзі тут спяшаліся, беглі і крычалі, ляскалі буферамі вагоны, назойліва мігаў чырвоным вокам трактарык з прычэпам, нагружаным поштай. Дзеці і жонка палахліва азіраліся, прыціскаліся да Корзуна.

Малады яшчэ насільшчык пагрузіў іхнія рэчы на сваю каляску і жвава пацягнуў некуды ў сярэдзіну вакзала. Дзіўна, што ён нават не спытаў, куды ім, на які цягнік. Корзун паспеў прачытаць на шыльдзе, што гэта — зала для тых, хто выязджае за мяжу. Дагэтуль здавалася; ён яшчэ зможа павярнуць назад, але, калі ляпнулі за імі дзверы, ён зразумеў: адступаць няма куды. Ззаду ў яго на дарозе шлагбаум, які ніхто не падыме цяпер для яго. Наперадзе была заманлівая чужая краіна, што павінна яму стаць роднай, а ззаду заставалася родная краіна, якая рабілася чужой. Усё... Ён

цяжка, хаваючыся ад сям'і, уздыхнуў і зусім нечакана ўспомніў, як хацеў паехаць па турысцкай пуцёўцы ў Венгрыю і яго не пускалі, тлумачылі, што мала пуцёвак. Спярша аддаюць пуцёўкі перадавікам вытворчасці, як тлумачыў пухлявы з дзіцячай ружовасцю на шчоках чыноўнік. Ён амаль не глядзеў на нейкага чарвяка Корзуна, вочы былі апушчаны на стол, на якім ляжала некалькі паперак. Корзун тады моцна пакрыўдзіўся і доўга пры сустрэчах з сябрамі, дый на рабоце, разважаў аб несправядлівасці, ашуканстве. Усе згаджаліся, але ніхто ні чым не мог дапамагчы яму, бо кожны быў гэткі ж, як ён, маленькі чалавек. І іх пастаянна ашуквалі таксама. Ашуканства ён назваў і адно з прычын, з-за якой едзе за краіны. Маўляў, абрыдла быць маленькім чалавекам, хочацца быць проста чалавекам, вольным і нікому нічым не абавязаным. І хоць разумеў, што гэта ілюзія, аднак усё роўна хоча вось пашукаць тое месца ў свеце, дзе ёсць воля. У краіне, дзе ўлада ў руках таталітарнай дыктатуры, няма ні волі, ні незалежнасці. Абрыдла, усё абрыдла, але цяжка пераступіць мяжу і развітацца з тым светам, які спарадзіў цябе і сфарміраваў тваю душу.

Усё, цяпер ззаду былі бясконцыя чаканні ў прыёмных кабінетаў, здзеклівыя позіркі суседзяў і калег. Гэта было ўжо нібы сон. Назад ён не вернецца. Без волі ён памрэ, і ягоным дзецям трэба воля. У іхняй душы ўжо не будзе раба. Яны пакінуць яго з гэтага боку мяжы, хай ён застанецца тым, хто любіць дыктатуру... Так ліхаманкава думаў Корзун, ідучы ўслед за насільшчыкам. Ён агледзеўся і ўбачыў у зале гэткіх жа людзей, як і яго сям'я. Старыя і малыя з клункамі і чамаданамі — яны імкнуліся таксама на волю. «У кампаніі весялей, надзейней»,— разважаў Корзун і ўжо зусім бадзерым голасам загадаў везці рэчы ў левы кут залы, дзе, здалося, былі яшчэ вольныя месцы.

Амаль насупраць іх, на вышыні метраў двух ад падлогі, зіхацеў экранам тэлевізар ці мо відэамагнітафон, бо тое, што цяпер паказвалася, Корзун бачыў у мінулую нядзелю. І наўрад ці гэта быў паўтор перадачы, хутчэй усё-ткі па відэамагнітафоне паказвалі старую яўрэйку рээмігрантку, якая плакала і казала, што вельмі блага жыць у капіталістычных краінах. Яна плакала, а на суседняй лаўцы з левага ад Корзуна боку маладая жанчына з чорнымі доўгімі валасамі рагатала, нібы вар'ятка,

паказваючы пальцам на тэлевізар. І раптам Корзун адчуў, што смех падбіраецца і да яго, нягледзячы на панылы настрой, вельмі хочацца смяяцца. І ён не вытрымаў, паддаўся, спакусе, таксама зарагатаў, спярша праз сціснутыя зубы, а потым на поўную моц. Услед за ім заўсміхалася жонка, дзеці хіхікнулі недаўменна, пазіраючы на бацькоў.

Праз якую хвіліну Корзун, знясілены смехам, сутаргавата разяўляючы рот, думаў, што ён, мусіць, вар'ят. Раней ён лічыў сябе інтэлектуальным чалавекам, які вышэй за настоўп, кнігі давалі яму сілу. Апошнія гады ўсё менш і менш сустракаў людзей, якія б чыталі ўсе творы Дастаеўскага, Талстога ці Горкага. Ягоныя субяседнікі пералічвалі назвы раманаў і нават успаміналі іх герояў, але не маглі не толькі па-філасофску, удумліва паразважаць аб творах, і наогул прыблізна ведалі фабулу найбольш вядомых кніг, напрыклад, як «Вайна і мір». Корзун мог гадзінамі гаманіць пра П'ера Безухава ці князя Балконскага і знаходзіць у іх вобразах тое, пра што, можа, не думаў Талстой. Але гэта думаў Корзун, які прачытаў не адну, мусіць, тысячу кніг. Цяпер раптам настойліва заварушыліся ў галаве радкі Янкі Купалы, вершы якога ён вельмі любіў і лічыў яго найвялікшым паэтам ў свеце. У скронях пульсавала:

Песні мае, песні!
Смуткаў маіх дзеці.
Калі ж час вам прыйдзе
Весела запеці?
Ой! Сваю і з вашай
Роўну долю бачу,
Плачаце вы, песні,
І я з вамі плачу.
Хацеў бы вас, песні,
Зрачыся, пакінуць,
Сілачкі ж мне мала,
Буду ўжо так гінуць.
Выплакаў вас сэрцам.
Высніў вас душою,
Вальчучы з нядоляй,
Вальчучы з бядою...
І так мне здаецца,
Сколькі ні тужыці,
Са мной вы, я з вамі.
Вечна будзем жыці.
Толькі, мае песні,
Смуткаў маіх дзеці,
Калі ж час вам прыйдзе
Весела запеці?!

«Калі нам запеці...»

— Ну, усё, хопіць, хопіць,— прамовіла жонка,— хопіць. Не пакутуй. Назад дарога адрэзана. Трэба было думаць раней. У нас дзеці... Цяпер думай пра іх.

У Аўстрыі іх павінен быў спаткаць дзядзька Корзуна, які наўмысна прыляцеў ужо з Канады. Як яны будуць там жыць, што ён будзе рабіць? «Дапамажы нам, божа!» — нечакана для самога сябе звярнуўся да бога Корзун, хоць ніколі ў жыцці не верыў у яго і ні разу рават не быў у царкве. Хіба толькі як у музеі. «Дапамажы нам, божа!» — паўтарыў ён уголас і спалохана азірнуўся, баючыся што пачуў яго нехта чужы. Але ўсім тут, на вакзале, было ўсё роўна. Здавалася, на Корзуна ніхто і не глядзеў, вакол стаяў гармідар. Не такая ён быў важная цаца, каб за ім яшчэ нехта сачыў. Ён быў адзін з сотняў людзей, якія штодня ад'язджалі за мяжу. Ён не плакаў ад суму, што пакідае зямлю маленства, і не смяяўся ад радасці, што нарэшце апынецца ў вольным свеце — ён панура глядзеў вакол сябе і нечага чакаў. Яму здавалася, што ўсё-ткі нехта працягнуў да яго нябачныя ніці, па якіх спрабуе дыктаваць сваю волю. Корзун ужо больш не мог сядзець на гэтым вакзале, вельмі хацелася выскачыць адсюль і пабегчы, усё роўна куды, абы толькі не сядзець тут. Нервы былі напятыя да апошняга, а яшчэ наперадзе мытня і пагранічнікі, і невядома, чым скончыцца сустрэча з імі. Але дарогі назад у яго ўжо не было...

## РАЗДЗЕЛ СЁМЫ

Эй, кончана казка! Ну, як вам здаецца?
Ці праўды ў ей многа, ці лжэ, ці смяецца?
Мне ж верце, што гэта йосць праўдай звычайнай...

*Янка Купала*

### 1

Павячэраўшы сырам і чаем, каб не таўсцець, Павел Піліпавіч пайшоў з кухні да тэлевізара. У гэты час якраз перадавалі навіны рэспублікі. Яму было цікава іх глядзець, бо зрэдзь у кадрах мільгалі твары знаёмых. Некалі і яго не раз упаміналі ў гэтай перадачы. Але гэта ўжо ў мінулым, застаецца толькі слухаць, як іншыя

кіруюць, дзе бываюць і што абмяркоўваюць на розных важных сустрэчах.

Бліснуў мяккім малочным святлом, запаліўся экран тэлевізара, і Павел Піліпавіч пачуў, што ягонае былое міністэрства праводзіць на Брэстчыне семінар. Гэта абвясціла сімпатычная маладая дыктарка, ласкава ўсміхаючыся гледачам. Пасля паказалі рэпартаж з семінара: купка людзей стаяла ля падобнага на кароўнік будынка і слухала, што ім апавядаў высокі худы чалавек. Павел Піліпавіч пазнаў яго адразу. Дзіўна было б не пазнаць Яўгена Крумцеля, якога яшчэ сам прызначаў галоўным інжынерам абласнога ўпраўлення. Хлопец ён быў талковы, хвацкі, паважаў Паўла Піліпавіча. Але хто гэта? Побач з Крумцелем стаялі сакратар ЦК і Дубель. Відаць было, што яны перамаўляліся між сабой.

Хвілін пяць паказвалі яшчэ на экране семінар, і ўвесь час Дубель з сакратаром ЦК былі побач. Што гэта значыць? І выгляд у Дубеля ўжо, як у міністра. Нездарма так уважліва слухаў яго сакратар ЦК... Нездарма.

Павел Піліпавіч больш не мог глядзець тэлевізар. Ён забыў, што на пенсіі і яму павінна быць усё роўна, хто з кім недзе там стаіць ці размаўляе. Аднак жа невыпадкова Дубель стаяў ля сакратара ЦК. І хто, Дубель? Той, хто спрытны ў камандзіроўках з начальствам. А як спецыяліст што ён сабой уяўляе? Нічога. Пустое месца, але ж усё роўна не Павел Піліпавіч, а Дубель стаяў ля сакратара ЦК на семінары... Яму і гонар, і пашана.

Ён разнерваваўся і не заўважаў нават, што амаль бегаў па пакоі, сціскаючы кулакі, бы хацеў вось зараз, тут, з некім біцца. Не бачыў сябе збоку: валасы тарчма, кашуля расшпілена, і белы твар, на якім нянавісць, боль і жаданне змагацца, але з кім — ён пакуль і сам не ведаў. Адна думка выспела ў ім цвёрда: чаму быў мяккацелы, маючы ўладу, чаму не знішчыў Дубеля. Адразу, як той паказаў сябе, калі выпусціў кіпцюры. І Дубелю хана б да скону. Але ж спалохаўся ён, Павел Піліпавіч, пад каленьмі затрымцела, ах, як шкада! Дзе ж твая, браце, загартоўка ў ахове Лаўрэнція Паўлавіча, дзе вопыт столькіх гадоў апаратнай работы? Ці ж не ведаў, як гэткіх спрытнюг спыняць, вяртаць да мятлы і рыдлёўкі? Ведаў, але страх, страх...

— Што з табой, дарагі мой? — Не прыкмеціў, як у пакой увайшла жонка.— Мо «хуткую» выклікаць?

— Нічога не трэба. Мне добра,— рэзка сказаў Павел Піліпавіч.— Проста думаю...

— Табе заўтра ў «Спортлато»?

— Заўтра, заўтра, каб яно скісла! Прабач, дай мне яшчэ трохі падумаць...

— Калі ласка. Думай,— мусіць, пакрыўдзілася жонка, але няхай, перажыве. Гэта не крыўда ў параўнанні з ягонай. «Дубель, Дубель!.. Няўжо сакратар ЦК не бачыць, што ён пустое месца, толькі агульныя фразы, размаўляе, нібы чытае перадавы артыкул з газеты, як кажуць, застойных часоў. А чым ад тых адрозніваюцца перадавыя артыкулы сёння? А нічым,— са злосцю думае Павел Піліпавіч.— Мы да застою давялі, а паглядзім, да чаго вы давядзяце, таварышы Дубелі? Ананімкі цяпер не прызнаюць, пісаць пад сваім прозвішчам? Кепска таксама. Аднак трэба пісаць. Мо памагчы расплюшчыць вочы сакратару ЦК на Дубеля? Але як?»

Павел Піліпавіч адчуў, што ад гэтых думак у яго ўзняўся ціск, уваччу заскакалі дробненькія мошкі. Аднак ён не спыніўся, не сцішыў хаду па пакоі, не мог забыць пра Дубеля.

І не было з кім параіцца: скажаш жонцы, а яна ў адказ — сам выгадаваў гэтага дабрадзея. Канечне, сам, але ж не мог ён усё расказаць ёй. Калі б ведала, чаго гэта каштавала яму... Колькі патрачана нерваў, здароўя.

Зноў увайшла жонка і, не даючы яму выказаць незадаволенасць, махнула толькі рукою на тэлефон, маўляў, звоняць табе. Ён узяў трубку і ледзь не падскочыў ад радасці. Усё-ткі ёсць на свеце бог ці як гэта яшчэ назваць. Нібы адчуў Адам Казіміравіч Мацюлевіч, што трэба пазваніць свайму было́му шэфу. Ай, малайчына, ай, малайчына! Нездарма, нездарма... Што нездарма, калі гады чатыры назад Павел Піліпавіч прапаноўваў Адама Казіміравіча вызваліць з пасады начальніка аддзела. Здаваўся нерашучым, слабаватым. Ніхто з былых падначаленых дагэтуль не ўспомніў Паўла Піліпавіча, забылі ўжо, а Мацюлевіч пазваніў. «Каб ты ведаў, як я рады табе!..» — ледзь не крычаў Павел Піліпавіч, але паводзіў, канечне, стрымана, хоць і падзячыў за памяць.

Мацюлевіч доўга апавядаў яму, што адбылося ў міністэрстве, хто і дзе што казаў, Павел Піліпавіч уважна слухаў, але нецярпліва чакаў, каб спытацца пра Дубеля. Усё астатняе яму было не так важна. Нарэшце дачакаўся, калі Мацюлевіч змоўк.

— Што Дубель, бачыў яго сёння па тэлевізары? — трохі апалым голасам спытаўся ён.— Каля сакратара ЦК хадзіў...

— Ну, Дубель...— сказаў Мацюлевіч, і цяжка было зразумець, ці ён захапляецца, ці абураецца.— Ён жа вас вучань, Павел Піліпавіч...

— Чаму мой вучань?

— Усе так кажуць... Не сёння-заўтра ён будзе ў вялікім доме.

— Няўжо? — Павел Піліпавіч адчуў, што ў яго слабеюць ногі.

— Так, так. Намеснікам і нібыта першым — загадчыка аддзела. Міністр вылучае як найбольш ініцыятыўнага, дый ён спадабаўся там. Сучасным, дзелавым падыходам да праблем... Так што ваш вучань, Павел Піліпавіч, віншую! Нешта вы не заходзіце ўжо да нас. Хоць разумею вас, разумею...

Калі Павел Піліпавіч паклаў трубку, ён ужо не мог стаяць і, амаль чапляючыся рукамі за сцяну, пасунуўся да канапы і проста ўпаў на яе. Здавалася яшчэ трошкі і — спыніцца сэрца. Хацеў паклікаць жонку, але стаў нейкім цвёрдым язык і не варушыўся ўжо. Апошнімі намаганнямі Павел Піліпавіч дацягнуўся рукою да шафкі і дастаў таблетку нітрагліцэрыну. Крыху адляжаўшыся, падумаў — які ён дурань: не трэба перажываць, нервавацца і пісаць нікуды не трэба. Тыя, хто бяруць Дубеля, хай на сваёй скуры адчуюць ягоныя здольнасці. Значыць, і ў іх розуму не надта каб... Толькі языком мянташыць майстры, а вялікіх спецыялістаў сярод іх няма. Толькі функцыянеры... І такіх сабе падбіраюць на змену. «Хай кіруюць — з пагардай і здзекліва думаў Павел Піліпавіч.— Ужо амаль дакіраваліся; а што будзе далей... Аказваецца, жывём ні пры сацыялізме, ні пры капіталізме... Няма на іх Іосіфа Вісарыёнавіча з Лаўрэнціем Паўлавічам, яны б хутка навялі парадак».

— Хто званіў? Ці не Мацюлевіч? — спыталася жонка, узяла яго за руку і пачала лічыць пульс.— Ты кепска сябе адчуваеш? Пульс у цябе неважнецкі.

Татахкае, як электрычка. Мо кінуць табе ўжо сваё спортлато? Дык што Мацюлевіч?

— Дубеля бяруць у вялікі дом,— спрабуючы казаць абыякава, з цяжкасцю вымавіў Павел Піліпавіч.

— Ого, з тваёй лёгкай рукі. Твой вучань!..

— Што твой вучань, твой вучань! — ускіпеў ён і, каб была сіла, здаецца, ускочыў бы з канапы. І гэтая яшчэ — твой вучань! — Ты ж ведаеш, як я думаю пра гэтага Дубеля!

— Ну і што? Але заўтра вазьмі і пазвані яму. Павіншуй, карона з цябе не спадзе.

— Навошта гэта ўжо мне. Якая розніца: у вялікім ён доме ці ў малым. Мне ўжо ўсё роўна.

— Ну, не кажы, не кажы,— гладзіла яго жонка па галаве, супакойвала, масажыравала скроні, і нібы боль слабеў, ажно дыхаць стала лягчэй. Мо і нітрагліцэрын дзейнічаў ужо.— Не забывай, што твой сын пакуль толькі інжынер на заводзе.

— Не просты інжынер, а намеснік начальніка цэха... Зрэшты, ён толькі летась скончыў інстытут.

— Дык вось падумай і пазвані свайму Дубелю. Павіншуй. Ты ж разумны чалавек.

«Канечне, ён разумны чалавек, інакш не быў бы намеснікам міністра. Хоць і Дубелі могуць быць міністрамі... Так, я заўтра павіншую яго. Жонка кажа праўду... Цяпер хто я? Ніхто. Сыну свайму ворагам не буду!.. А дурнем я, здаецца, ніколі не быў... Мо за мемуары сесці дый успомніць, як працаваў разам з Дубелем? А што, чаму б і не!..» — думаў Павел Піліпавіч.

## 2

Аўгуст ішоў па вуліцы, нічога не бачачы перад сабой. Насустрач дзьмуў сівер, але ўсё роўна было горача. Аўгуст ірвануў на грудзях куртку і парваў яе. Яго раз'юшаны пагляд, ні на чым не спыняючыся, пераскокваў з аднаго прадмета на другі, перад ім быў як усё роўна туман, пустэча. Ён быў як адзін у натоўпе, на вуліцы, паўнюткай машын, як ізаляваўся ад усяго. Шыбуючы стрымгалоў, Аўгуст нібы ўцякаў, як ратаваўся ад сваіх нядобразычліўцаў, ад якіх не мог адбіцца. Ён бег, і ўся яго душа ажно крычала, галасіла на ўвесь свет: чаму вас не было там, пад кулямі, дзе

ноч ператварылася ў дзень, а дзень — у ноч. Іх там не было, туды яны паслалі яго ды Абламея, яшчэ і яшчэ хлопцаў, якія больш ніколі не ступяць на зямлю бацькоў. Яму крычалі пра доўг, які ён абавязаны аддаць там, у гарах. І ён аддаў, але гэтага ўсё роўна мала. Калі ім ужо нарэшце хопіць!

Ён адчуў, як заныла параненае плячо, нібы толькі што выцяла яго куля. Ажно забалела патыліца, і Аўгуст раптам спатыкнуўся, зачапіўшыся чаравікам за прыступку лесвіцы, па якой спускаўся ў тунель. Як ён апынуўся тут? Азірнуўшыся затуманенымі вачыма, убачыў, што стаіць на плошчы Перамогі. Над ім ужо блішчэлі ліхтары. Значыць, быў вечар. Але якая розніца? Ці мог ён хоць калі ўявіць, што з ім магчыма такое?.. Здаецца, з ім пажартавалі, гэта не ён быў у судзе, а нехта іншы. Яму ж гэта ўсё прыснілася. Так, гэта проста дзіўны сон. Бо такое немагчыма ўявіць нават. Ён ляпнуў рукою сябе па лбе, і яму забалела. Усё-такі гэта ява, а не сон. Вось калі зараз кагось спыніць на гэтай вуліцы і расказаць аб усім, што было з ім,— ці паверыць чалавек? Калі б яго спыталіся, ён ніколі не паверыў бы, палічыў бы таго, хто такое казаў,— вар'ятам. А мо ён, Аўгуст, вар'ят?

Ён зараз ішоў па вуліцы, па-вечароваму сцішанай і паўсоннай ужо, і ўсё яшчэ ў шаленстве лаяўся. Ніколі так не было адзінока і пустэльна ў душы, быццам пражыў сваё жыццё. Нічога яму не патрэбна, нічога не хочацца, хай забяруць сабе ўсё. «Разам з медалём...» — падумаў у роспачы, хоць, канечне, медаль ніколі не аддаў бы, бо на ім ягоная, Аўгуста, кроў. А сваёй крывёй ён не гандлюе. Лепш выкінуў бы медаль у раку...

Каб ён ведаў, што гэтак скончыцца сённяшні дзень, лепш паехаў бы да бацькі ў вёску. Там адчуў бы ён радасць жыцця, спакой, які страціў, аддаючы свой доўг.

Раніцай сястра перадала яму позву з суда, і ён, канечне, здзівіўся — што яны маюць да яго? Здаецца, ні з кім не біўся, нічога не ўкраў. Праўда, мільгнула думка: ці не выклікаюць з-за таго выпадку, калі іх з Аляксеевічам забралі ў міліцыю. Не ўгадаў, дый колькі б жыў, мусіць, не здагадаўся б. І калі сакратар суда, у строгім чорным касцюме жанчына, зачытала паперу,— ён не паверыў сваім вушам. Стаяў некаторы час, як спруцянелы, ніяк не мог даўмецца, што ад яго хочуць, і папрасіў прачытаць яшчэ раз. Здалося, металіч-

ным голасам жанчына зноў прабубніла: на падставе даведкі нумар 351 ад 21 жніўня 1985 года ўтрымаць з грамадзяніна Рудаміны Аўгуста Восіпавіча 258 рублёў 77 капеек. Даведка падпісана камандзірам часці Іванавым і начфінам Сеніным. Што яна складзена па законе, яе зацвердзіў загадчык консульскага аддзела пасольства СССР у Афганістане таварыш... Які гэта быў таварыш, Аўгуст ужо не чуў. Значыць, гэта яму пакаранне за той выпадак, калі быў паранены вадзіцель «МАЗа» сяржант Юсік і ён, Аўгуст, сеў за руль.

— Дык пры чым тут я?! — ускрыкнуў Аўгуст, і, здалося, суддзя, спачуваючы яму, бо надта жаласны быў у яго пагляд, апусціў сівую голаў. Доўга маўчаў, і ў зале таксама прыціхлі.

— Закон ёсць закон,— сказаў нібы абыякава і доўга выціраў насоўкай свае вялікія ў залатой аправе акуляры, а Аўгуст чакаў, што ён скажа яму яшчэ, але той не вымавіў больш ні слова.

— Дык навошта такі закон, калі ён нялюдскі! — закрычаў Аўгуст і выбег з залы, не мог дыхаць ужо гэтым цвілым паветрам, якое душыла яго.

...Яны ехалі тады з Юсікам у калоне «МАЗаў» чацвёртымі, і было вакол нібы спакойна і ціха. Над імі баражыравалі верталёты, ахоўвалі калону. Здавалася, ніякі душман і носа не высуне з камення.

— Дык ты адразу дамоў? — пытаўся Аўгуста рыжаваценькі, увесь у рабаціннi Юсік; яны павінны былі разам звальняцца з арміі.

— Толькі дахаты, а ты хіба не? — здзівіўся Аўгуст, гледзячы з жахам управа, дзе метраў трыццаць унізе ад дарогі дагарала машына. Яна была не з іхняй калоны, але ўсё роўна шкада.

— Шкада...— прамовіў ён і пачаў, як дзынкнула шкло і застагнаў Юсік.— Ты ш-што?

У Юсіка быў белы твар, і руль ён трымаў толькі правай рукой.

— Паранілі, сволачы!.. Бяры руль, хутчэй, хутчэй! — ужо хрыпеў Юсік. Аўгуст учапіўшыся адной рукой за руль, другой — пацягнуў Юсіка на сваё месца, а сам перасеў на ягонае. Ён не мог пакуль перавязаць параненага, бо не мог спыніцца тут. Вакол ужо грукатала страляніна, а ён, сціснуўшы да болю скіўіцы, спрабаваў утрымаць машыну на дарозе, не сарвацца ў бездань. Нервы здалі, калі пасля шалёнай язды калона

пачала спыняцца. Ён трохі не разлічыў і амаль з размаху ўпяўся ў пярэднюю машыну. Зрэшты, ён быў не шафёр. Проста тады-сяды садзіўся за баранку, але гэта была толькі гульня. Здалося, што ён там пашкодзіў ужо, у параўнанні са стратамі ад налёту душманаў: з іхняй калоны згарэла тры машыны. І Юсік застаўся жывы, і «МАЗ» дайшоў да канца. Камандзір роты ўвечары хваліў Аўгуста, абвясціў нават быў падзяку. «А цяпер атрымліваецца, я шчэ павінен 258 рублёў і 77 капеек... За тое, што давёў машыну...» — падумаў Аўгуст. Значыць, яму ўсё хлусілі, ашуквалі: і камандзір роты, і камандзір часці, які праводзіў іх дамоў і дзячыў за службу, за тое, што выканалі інтэрнацыянальны доўг. «Не, ўвесь, значыць, доўг...»

Ён спыніўся ля рэстарана, які, мусіць, толькі адчыніўся, бо яшчэ заходзілі людзі. Былі ў ім месцы. І Аўгуст, трохі павагаўшыся, павярнуў туды таксама. Ён ужо не верыў нікому.

# Апавяданні

## ФАВАРЫТ КАРЛ

Нахіліўшыся над загараддзю, Сцяпан Мінавіч прутком паказытаў свіней, якія лянiва, быццам начальнікі, валюхаліся перад ім у гразі. Свінні ўсе гладкія, з ружовенькімі лычамі, адно ў адно, што блізняты.

Сцяпан Мінавіч стаяў і думаў, што вось і споўнілася тры гады ягонага новага жыцця. Хоць якое яно новае, калі тры гады? Здавалася, тут ужо векаваў. За тры гады ён амаль усё ўспомніў з інстытуцкай навукі і па заатэхніі і па ветэрынарыі. Успомніш... Лепш свіннямі загадваць, чым лес пілаваць альбо мокнуць у снег і дождж на будоўлі. Лепш... Дзякуй тым, хто дапамог яму, знайшоў гэтае месцейка загадчыка турэмнай свінафермы. Лепш быць з свіннямі, чым з людзьмі...

Прычухаў да плота парсючок Карл. Рохкае, трэцца бокам аб нагу Сцяпана Мінавіча. Потым абслюніў лычом увесь чаравік, узняў свае маленькія свіныя вочкі і глядзіць не міргаючы. Ёсць, мусіць, і ў яго галаве нейкая думка. Сцяпан Мінавіч прыгінаецца і гладзіць, гладзіць па спіне парсючка, а самому раптам хочацца плакаць. Па шчацэ спаўзае сляза. Рукавом выцірае яе і бачыць, што і ў парсючковым воку бліскучая кропля... «Ах ты дурненькі»,— шэпча ён, чухрыць парсючка па гладкім дагледжаным карку і за-

бывае, што гэта жывёла, а не чалавек. Усё, што вакол яго, знікае, нібыта ён не ў турме. І на душы адразу лягчэе. Застаецца толькі ён, гэты парсючок Карл, і статак свіней, якія рохкаюць ціха, бесклапотна.

Калі б гадоў дзесяць назад хто сказаў, што яму для шчасця будзе дастаткова пасядзець аднаму каля свіней і пачухрыць ім спіны, ён бы таго вылаяў і ніколі больш не размаўляў з ім. Але гэта ў мінулым жыцці...

Карл прыціх, лёг каля слупа, мяккім бокам прыціснуўшы нагу загадчыка фермы. Мусіць, бедалагу таксама не хапае ласкі. Не ведае, не разумее лапавухі, што ўвосень прыйдзе прапаршчык Зухвец, загадае закалоць яго да свята.

Будзе вельмі шкада Карла. Толькі што зробіш, калі такі парсюковы лёс — ісці на спажыву людзям. Раней, яшчэ ў тым жыцці, Сцяпан Мінавіч ніколі пра гэта не думаў. Палічыў бы проста глупствам. А цяпер гэта глупства мо для яго найважнейшае. Усё змянілася, перавярнулася, стала, як кажуць, з ног на галаву.

Учора ў канцылярыі, куды выклікаў яго прапаршчык Зухвец, Сцяпан Мінавіч крадком зірнуў на сябе ў люстэрка, што вісела на сцяне каля дзвярэй. Жахнуўся: твар у зморшчынах, валасы ссівелі, нелюдзімы позірк. Словам, дайшоў, даехаў...

Не ўзнімаючы галавы, ён раптам убачыў, не, проста адчуў, што недалёка ад яго прыпыніўся чалавек. Навошта ён тут? Адразу ахапіў страх: хто гэта? Нехта з аховы, альбо гэтакі ж зэк, як і ён? Яму нікога не трэба зараз, досыць кампаніі Карла! І ўсё-ткі краем вока Сцяпан Мінавіч спрабуе разгледзець таго, хто парушыў яго спакой. На другім баку загарадзі, гэтак жа апіраючыся грудзьмі на жэрдку, стаіць Карнук. Ён у турме з таго тыдня. Яны ўжо бачыліся, пагаманілі трохі. Хоць і ў чорнай ватоўцы Карнук, простых картовых штанах і галава паголеная, аднак яшчэ адчуваецца былая пастава. Здаецца, вось-вось пачуеш вымову альбо папярэджанне. І ў прысутнасці Карнука ў Сцяпана Мінавіча нешта сціскаецца ўнутры, хочацца бадзёра павітацца з ім. Усёй істотай пратэстуе Сцяпан Мінавіч супраць свайго трымцення перад былым сакратаром райкома, але нічога не можа з сабой зрабіць. Міжволі на вуснах зляпліваецца прыязная ўсмешка.

За тыдзень Сцяпан Мінавіч прывык ужо да думкі, што Карнук таксама тут, у турме. Значыць, нешта-такі

адбываецца ў краіне, калі ён за кратамі. І ўжо тое, што стаіць побач, не бянтэжыць і не здзіўляе. Відаць, прыслалі ў памочнікі да яго. Сцяпан Мінавіч палахліва думае: а калі ён, Карнук, ужо загадчык свінафермы? Ягоныя ж сувязі мацнейшыя...

Сцяпан Мінавіч хітае галавой, Карнук гэтак жа адказвае. На яго твары таксама ўсмешка. Пастава ў ім засталася, але ўсмешка сумная і нават, здаецца, баязлівая. Яшчэ ўчора Сцяпан Мінавіч яму спачуваў, а сёння — наўрад. У душы варушыцца ціхая радасць: і на яго знайшлася сіла. Думаў да смерці выседзець каля карыта. «Бач, адабралі крэсла! Карытнік... — думае Сцяпан Мінавіч.— Я павінен быць удзячны яму: уратаваў ад сібірскай тайгі, уладкаваў да свіней. Спакойнае, ціхае жыццё. Але ж я ледзь не спяваю ад таго, што ён разам са мною...»

У Карнука пад ватоўкай пададзеты світэр, хоць на вуліцы і не холадна. Твар у яго бледны, шчокі адвіслі, як у старой свінні. Але ж Сцяпан Мінавіч забыў, што свінні не дажываюць да старасці.

Карнук падыходзіць зусім блізка, дастае цыгарэты з кішэні, частуе. Які гонар, думае Сцяпан Мінавіч. Раней такога не дачакаўся б ад Карнука. Раней...

Сцяпан Мінавіч рэдка калі курыць, але бярэ цыгарэту і кладзе за вуха. Маўчыць, хоць бачыць, што Карнук нервуецца. Дурань, што ўжо нервавацца, нервы трэба пакінуць за варотамі турмы. Інакш — надоўга не хопіць здароўя. Бо нават свіней без здароўя не дагледзіш.

Позірк выпадкова апускаецца на руку Карнука, у якой цыгарэта. Дробненька дрыжаць пальцы, і скура жоўтая, з рудаватымі плямкамі, бы ў дзеда.

— Парасяты, як лялькі, негоршыя, чым калісь у тваім калгасе,— робіць камплімент Сцяпану Мінавічу Карнук.

Што адказаць яму? Мо падзякаваць і радасна заўсміхацца? «Памыляешся, Вікенцій Пятровіч, у калгасе парасяты былі горшыя. Кармоў заўжды не хапала».

Не, усё-ткі не мог уявіць Сцяпан Мінавіч, што мінуць тры гады і да яго далучыцца сам Вікенцій Пятровіч. Адразу, як яны спаткаліся ў турме, моцна карцела нагадаць, як павучаў усіх, крычаў на бюро. А ўнутры была парахня...

— Мо ты, Мінавіч, не хочаш са мной рабіць? —

пытаецца Карнук, і ў яго вачах, напалоханых, з чырвонымі, як распухлымі, вейкамі, жах, які крывіць сутаргавата твар.

— Чаму, Вікенцій Пятровіч? Мы з вамі выгадуем найлепшых парасят за ўсю гісторыю гэтай фермы.

Яны паціснулі адзін аднаму рукі і закурылі. Парсючок Карл варушыцца каля іхніх ног, але не ўстае. Сцяпан Мінавіч чухрыць яму спіну, і ён сціхае.

Сонца кволае, нейкае паўсоннае, але ўсё роўна здаецца, што цёпла. Да абеду яшчэ ёсць час. Сцяпан Мінавіч успамінае, што ў свінарніку сабралася шмат гною. Прапаршчык Зухвец можа ўзлавацца і напісаць рапарт.

Сцяпан Мінавіч пералазіць загарадку і ідзе, каб узяць сахор. Ззаду чуваць хрыплае дыханне Карнука, дыханне старога курца і немаладога чалавека. Да абеду яны выкінуць гной, падсцелюць саломы. Потым... Усёткі шкада Карнука. Спярша, калі трапіў сюды, думае Сцяпан Мінавіч, і сам не ведаў да каго прыхіліцца, было страшна. Яму пашэнціла, удвух лягчэй. Але ж, бач, і Вікенцій Пятровіч не адкупіўся ад турмы. І хто! — той, у каго сувязі і ў вобласці, і ў рэспубліцы, і далей. Нібыта чакала яго ўжо высокая пасада ў Мінску...

Сцяпан Мінавіч лічыць, што па дурасці ў турме. Хоць ад вялікага розуму тут мала хто. Усе лічаць, што па дурасці. Мусіць, да скону ён будзе помніць тую салаўінную вясну, надзіва раннюю. Перад маем яны ўжо былі адсеяліся. І даў ён сабе крышачку палёгку: паехаў аднойчы на вячэру да суседзяў у калгас «Чырвоны партызан». Быў без шафёра — навошта сведкі. За рулём добры дзесятак гадоў, ездзіў і на падпітку не раз. Не меркаваў доўга сядзець, а выйшла наадварот. Кампанія была вясёлая. З раёна быў інструктар і чыноўнік з аграпрома. Мужчына салідны, паабяцаў Сцяпану Мінавічу запчастак для аўтамашыны. І ўрэзаў Сцяпан Мінавіч на радасцях так, як даўно не піў: аж уваччу задваілася. Развітваючыся, цалаваліся, абдымаліся, як жанчыны. Цьфу ты... Гаспадыня ўгаворвала не ехаць, але Сцяпан Мінавіч тады быў вельмі ўпарты дый прывык начаваць у сваёй хаце. Язды той пятнаццаць хвілін.

Сеў ён за руль, упёрся рукамі і нагамі, здаецца, уваччу пасвятлела трохі. Дрэвы перасталі хістацца, усё набыло трываласць і надзейнасць. Помніў, як зрушыў з месца, выехаў на гасцінец. Лёгенька пакручваў руль, машына рвалася, як звер, уперад. Ён спяваў, і ўсё яго-

ная душа спявала. Як добра, калі шмат сяброў, з якімі можна пасядзець, адпачыць. Перад Навасёлкамі павярнуў па крузе ўлева. Да роднай хаты заставалася раўнюсенька пяць кіламетраў. Дарога чысцюткая, ніводнай машыны, і трэба ж, аднекуль з поля, з-пад кустоў выскачыў матацыкліст. Спярша Сцяпану Мінавічу здалося, што той быў адзін, а пасля ўбачыў: ззаду сядзела дзяўчына. Іх зачапіла перадам машыны, пацягнула за сабой. Калі Сцяпан Мінавіч нарэшце спыніўся, яны абодва ляжалі ў крыві на асфальце, а колы матацыкла ўсё яшчэ круціліся з шалёнай хуткасцю...

Ён успамінае часта да гэтага моманту, бо далей проста было, як па праграме. Дзесьці ў тым жыцці засталіся жонка з сынам. Карнук паклапаціўся пра яго, уладкаваў у гэту турму, пастухом да свіней. Канечне, гэта не тое што на лесапавале...

Нібыта ўпершыню бачачы, Сцяпан Мінавіч уважна, з цікавасцю разглядае Карнука, які спрабуе ўхапіць сахаром гной. Ён хрыпіць, кашляе, лоб мокры ад поту. Вядома, гной ірваць у свінарніку, не тое што сядзець у кабінеце. Учора ён плёў кашалі і плакаў: яго абылгалі, зайздроснікі з'елі. З'есці не з'елі, а выплюнулі. Усё адно хеўра. Карнук можна верыць найбольш на трыццаць працэнтаў, астатняе — казка. Кожны хоча, каб пра яго думалі лепш, чым ён ёсць.

— Перакурым, Пятровіч,— кажа Сцяпан Мінавіч.

Карнук хоць нічога не зрабіў, але намучыўся, хай адпачне. Ён з крэктам усаджваецца на камень ля сцяны, адкідваецца да яе спіной. Курыць з заплюшчанымі вачамі.— Нічога, Мінавіч, мы яшчэ вернемся,— гаворыць Карнук. Яго застылыя вочы ажываюць, у іх ужо нянавісць.— Сядай.— У голасе ўладныя ноткі, быццам ён зноў на кані.— Перакусім. Хлопцы ўчора ўвечары перадалі.— Карнук расшпільвае ватоўку і з-за пояса штаноў дастае чорны скрутак. Заінтрыгаваны Сцяпан Мінавіч са здзіўленнем пазірае, як ён дастае пляскаты штоф «Белавежскай», паўпалкі сервелату і цукеркі «Мішка на Поўначы». Такога багацця не бачыў даўно. На языку варушыцца, хоча сарвацца пытанне — скуль гэта ўсё, але Сцяпан Мінавіч стрымлівае сябе. І так ясна сказана: перадалі хлопцы.

Шклянкі няма, і Карнук п'е з рыльца. Глынуўшы, перадае Сцяпану Мінавічу. Ён робіць тое ж самае. У гэты момант яго нешта штурхае ў ногі, ён ледзь не падае.

Д'ябал, парсючок Карл прытупаў ужо сюды. Няйнакш адчуў пах кілбасы. Карнук з размаху б'е яго нагой у жывот, і парсючок з віскатам адскоквае ўбок. Узбуджана пачынаюць рохкаць усе свінні, падымаюць галовы з лужын нават тыя, што драмалі, грэючыся на сонцы. Карл пакрыўджаны, і Сцяпану Мінавічу не спадабалася, што Карнук ударыў яго. Але вельмі смачная кілбаса і ў бутэльцы шмат яшчэ «Белавежскай».

— Мы вернемся, Мінавіч,— паўтарае Карнук, грызе кілбасу, і Сцяпан Мінавіч, як клоун, міжволі хітае галавою і таксама мармыча: — Абавязкова вернемся. Толькі куды? — У галаве нейкае зацьменне, блытаніна. Некуды вернуцца, але куды? Канечне, вернемся, супакойвае сябе Сцяпан Мінавіч і зноў глядзіць на Карнука не як на зэка, а як на першага сакратара, найразумнейшага ў раёне чалавека. Час ужо і падзякаваць за тое, што дапамог уладкавацца загадчыкам гэтай фермы. Думаў не гаварыць, але, мусіць, пара. Глытае «Белавежскай» і абдымае Карнука:

— Вікенцій Пятровіч, мой дарагі, да скону не забуду, што загадчыкам фермы зрабіў мяне. Хочаш, на калені стану?..

— Ну-ну,— махае рукою і смяецца Карнук, смяецца. Сцяпан Мінавіч таксама хіхікае, а праз хвіліну ўжо рагоча. Раптам ім абодвум забівае дых, у двух кроках ад свінарніка прапаршчык Зухвец. Сцяпан Мінавіч ускоквае з зямлі і выцягвае рукі па швах. Карнук нават не варухнуўся, сядзіць і трымае ў руках бутэльку. У галаве ў Сцяпана Мінавіча ўмомант святлее, і ён уяўляе найгоршае, што з імі можа быць. Шэпча Карнуку, каб схаваў бутэльку, але слоў сваіх не чуе, быццам адняло мову. Ох, як не хочацца ехаць на лесапавал вось з-за гэтай дурноты. Пра яго добра думаюць у турме, і начальнік паабяцаў пахадайнічаць, каб скасавалі тэрмін. Цяпер усё, і месца ўдзячнасці да Карнука займае нянавісць. Як загіпнатызаваны стаіць Сцяпан Мінавіч: толькі фіксуе вачамі, што прапаршчык Зухвец падыходзіць да Карнука, нагінаецца і нешта шэпча яму на вуха. Бярэ цукерку і хавае яе ў кішэню. Потым ляпае Сцяпана Мінавіча па плячы і жартуе, што ў яго выдатная выпраўка. Шырокая зялёная спіна прапаршчыка з кароткімі тоўстымі нагамі хутка знікае ў вузкіх варотах. Нібыта і не было Зухвеца, яны толькі адны і парсючок Карл, які,

рохкаючы, лезе зноў у ногі, не верыць, што яго могуць пакрыўдзіць. Але Сцяпан Мінавіч ужо сам адганяе яго і толькі кідае ласунак — скібкі хлеба. Карл амаль на ляту ловіць і чаўкае, ад задавальнення пускаючы сліну.

— Сядзь ты нарэшце,— незадаволена бурчыць Карнук.— Еш кілбасу... Да вечара далёка.

Зусім нядаўна гэтага немаладога чалавека з азызлым тварам баяўся цалюткі раён. Сцяпану Мінавічу неяк пашчасціла быць з ім у кампаніі. Тады якраз наведаў раён дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, якога летась па хваробе адправілі на пенсію. І быў у лясгасе на базе адпачынку ў Дзямідаўскім бары, як кажуць, бэнц. Сцяпана Мінавіча і Саўку Касяровіча, старшыню калгаса «Чырвоны партызан», таксама запрасілі. Але яны з Саўкам былі як у ліхога сына на вяселлі: сядзелі не разам з шаноўным госцем, а ў маленькім пакойчыку на кухні з вадзіцелямі. Сцяпан Мінавіч і Саўка адказвалі за фінансавую частку прыёму. Яны ўсё роўна ганарыліся гэтым, бо абыякому старшыні Карнук не давяраў. Чалавек ён пільны, вопытны, стольківгадоў адбыў сакратаром райкома. Усё добра, калі б не адна ягоная слабасць. Многія на гэтым гараць: жанчыны і гарэлка. Яны і да турмы даводзяць... Не, шмат ён не піў. Сцяпан Мінавіч ніколі не бачыў яго на падпітку. Браў не больш, чым усе ў той самы застойны час. Дый лічылася нармальным канчаць сход ці канферэнцыю чаркай. Гэтыя бяседы ўздымалі настрой, думае Сцяпан Мінавіч, мацавалі сяброўства... Карнук прыгледзеў сабе кабетку. Яна некалі сядзела ў райспажыўсаюзе. Мо колькі разоў і бачыў яе Сцяпан Мінавіч. Нічога асаблівага: чарнявая, вялізныя залатыя завушніцы. Валасы чорныя, шорсткія, як конская грыва. Потым прыязджала ў калгас ужо як інструктар райкома партыі. Вучыла, як жаць жыта. Чарнявенькая закілзала Карнука так, што ні туды і ні сюды. Грошай давай як паболей, і пачаў ён дзерці іх са старшынь калгасаў. Самы росквіт Карнуковага кахання быў, калі апынуўся Сцяпан Мінавіч на гэтай свінаферме. Карнуку проста не пашэнціла: гадоў пяць назад выйшаў бы сухім з вады. А тут пачалі круціць галовы няроўня яму. Урэшце, што яму да Карнука, трэба дбаць пра сябе, думае Сцяпан Мінавіч. У іх артыкулы аднолькавыя, а тэрмін у Карнука ўдвая меншы. Мусіць, нядоўга

ён будзе памочнікам на свінаферме. Лёгка жыў Вікенцій Пятровіч, быў у сябрах у абкомаўскага начальства.

«У фаварытах быў, як у мяне цяпер Карл»,— думае Сцяпан Мінавіч. А побач зноў рохкае парсючок, падліза... Няйнакш і ён кілбасы хоча.

Каля Карнука на газеце ляжыць яшчэ ладны кавалак сервелату. Сцяпан Мінавіч бярэ яго і кідае парсючку, які есць яе, здаецца ажно прытанцоўваючы ад шчасця. «Фаварыты... Любіце кілбасу, сервелат любіце... Ха-ха-ха...»

Ну, пасядзелі, і хопіць. Гной хто будзе за іх выкідваць са свінарніка?

Сонца хавалася за хмарамі, і холад палез пад ватоўку, пагнаў мурашоў па целе. Карнук нібыта прыдрамаў, разявіў рот, дыхае спакойна. Проста шкада яго чапаць. Мо няхай паспіць... Але не, няблага, калі і рукі трохі памазоліць, раптам злуе Сцяпан Мінавіч. Таксама мне фаварыт... Тут я начальнік, а не Карнук.

— Гною шмат! — крычыць, каб разбудзіць Карнука. А той — нават не варушыцца. Потым мармыча і мыляе губамі:

— Гм-гм...

Мо сніцца, што есць сервелат? Ці бачыць сваю чарнявенькую? Нядобра думае ўжо пра Карнука Сцяпан Мінавіч, але нічога не можа зрабіць з сабою. Чорныя думкі лезуць у галаву. Яму ўжо хочацца паздзекавацца з гэтага былога начальніка, паганяць да сёмага поту.

— Устаць! — амаль істэрычна крычыць, і Карнук імгненна ўскоквае і есць яго вачамі. У іх страх, рукі ходзяць ходырам. Радасна думае Сцяпан Мінавіч: сувязі ў цябе і тут ёсць, але ж мяне баішся. Тут свае законы, свае правілы гульні...

— Што, што такое? — пытаецца Карнук. Сцяпан Мінавіч не адказвае, глядзіць, як да яго, пыхкаючы, падыходзіць Карл. З газеты забірае рэшткі кілбасы, чаўкае. Яшчэ хвіліна, і, мусіць, Карнук ударыць яго нагой у жывот. Узнімае нагу...

— Пайшоў, пайшоў! — перацягвае парсючка Сцяпан Мінавіч дубцом упоперак спіны. Сваім віскам Карл палохае ўсіх свіней, і яны з рохканнем пачынаюць насіцца па двары.

— У нас, Вікенцій Пятровіч, хто не працуе, той не

есць,— гаворыць Сцяпан Мінавіч, але яму чамусьці сорамна глядзець у вочы Карнуку.

Ужо без перапынку яны дзяруць і дзяруць гной у свінарніку, складваюць яго ў кучы. Цяпер Сцяпан Мінавіч ні аб чым не думае. Ён прымушае сябе ні аб чым не думаць, бо тут тває думкі нікому не патрэбны. На Карнука не глядзіць, неяк ўсё роўна ёсць ён ці не. Падняць галаву ад зямлі прымушае свінячы віскат. Так можа толькі вішчаць Карл — тоненька, пакрыўджана. Незразумела, хто яго пакрыўдзіў. Сцяпан Мінавіч набліжаецца да варот і, прыкрыўшы далонню вочы ад сонца, якое ўзнялося вышэй хмар, бачыць, што на двары гаспадарыць прапаршчык Зухвец. З салдатам яны заганяюць парсючка ў кузаў грузавога «уазіка». Карл вішчыць так, нібыта просіць дапамогі. Сцяпан Мінавіч сціскае рукі ў кулакі, адварочваецца ад дзвярэй. Нейкі момант стаіць, прыслухоўваючыся, пасля апантана працуе, каб толькі больш не чуць гэтага амаль чалавечага крыку... Здаецца, мала паветра ў свінарніку, з усіх бакоў толькі краты, краты. Побач, з пабялелым ад стомы тварам, крэкчучы, цягае гной Карнук. У Сцяпана Мінавіча раптам мільгае жарсткавата-здзеклівая думка: ці ёсць у яго яшчэ кілбаса? Урэшце, хто тут начальнік? На неба яны яшчэ доўга будуць глядзець праз краты...

А на двары зноў ціха, свінні ляжаць ў лужах, грэюцца на сонцы. Нібы і не было ніколі сярод іх Карла, парсючка з ружовенькім лычом, ягонага фаварыта. Цішыня...

# НАБАТ

## 1

Макар шмат паездзіў па белым свеце. Была ў яго сям'я, але разышоўся з жонкай. І апошнія пяць гадоў жыў адзін. Столькі ж часу не быў дома, у роднай вёсцы. Нават калі памерла маці, не змог прыехаць на пахаванне. Урэшце надакучылі далёкія дарогі, гарады, якія не сталі блізкімі, і аднойчы, сабраўшы рэчы і доўга не разважаючы, Макар сеў на цягнік, што ішоў у Беларусь.

Цяпер ён сапраўды адчуў тое, што называюць смуткам па радзіме. Аб будучым пакуль не думаў. Пераканаўся, што само жыццё часта вырашае ўсё лепш за чалавека.

У вёску ён прыехаў на золаку. Але ўжо, як і многа гадоў, рыпелі вароты, бразгаталі вёдры і чуўся звон малака. Вёска была, здавалася, тая ж, што і пяць гадоў назад, калі апошні раз быў тут. Нічога нібыта не змянілася, але ён усё-ткі шукаў вачыма змен, якія, магчыма, адбыліся за яго адсутнасць.

Макар зайшоў у двор сваёй хаты не з вуліцы, а як звычайна, калі прыязджаў, з агарода. Любіў незаўважна з'яўляцца перад бацькамі.

На двары сакаталі куры, дзяўблі ў бляшанцы з-пад кансерваў проса. Ён зазірнуў у адзін хлеў, у другі — яны былі пустыя, пахла мышамі, струхлелай саломай. Бацька пісаў яму, што не трымае свіней, карову даўно збыў.

Сад быў белы ад цвету. Багаты будзе на яблыкі год, падумаў Макар. Яго толькі ўразіла, што не чуваць гуду пчол. Хіба мо яшчэ сядзяць у вуллях.

Пастукаўшы ў акно, ён разбудзіў бацьку. Яны абняліся, пацалаваліся і потым доўга сядзелі за сталом, усё гаварылі, гаварылі. Пасля абеду схадзілі на маціну магілу. Макар, гледзячы на фотакартку, на якой быў такі блізкі і родны твар, заплакаў. Яго нібыта кальнула: мо калі б часцей ездзіў дахаты, і маці яшчэ жыла б. Хоць прымусіў бы яе легчы ў бальніцу, бо яна да самай смерці ні разу не была ў доктара. Гэтая думка так усхвалявала Макара, што ажно забалела сэрца, і ён вымушаны быў прысесці на траву, каб трохі супакоіцца. Бацька, прывыклы да сваёй адзіноты, маўчаў, толькі хітаў галавой і гладзіў схуднелай старэчай рукой сына па спіне.

З могілак яны пайшлі не дахаты, а да рэчкі. Макару хацелася пастаяць на старэнькім мосце, памыць стомленыя ногі ў халоднай вадзе. Яго здзівіла толькі, што бацька, пачуўшы гэта, неяк здзекліва ўсміхнуўся і сказаў:

— Але ж, пастаіш...

— А што? — спытаўся ён.

— Пабачыш,— загадкава адказаў бацька.

Яшчэ здалёк убачыў жоўта-шэрую паласу, нібыта пляж ля мора. Макар помніў, што там быў лес, які называўся Падверб'е. Ён пачынаўся з невялікай горкі

Канторы, на ёй раслі чырвонагаловікі, баравікі. За Падверб'ем быў Вялікі лес, потым — Сапажынскі, Дулі, Дабрахіны, Сімонікі... Разгублена глядзеў, глядзеў, але нічога гэтага не было: там-сям тырчалі гарэлыя пні, ляжалі абпаленыя бярвенні, і зямля была чорная, быццам спаленая,— ні жывой травінкі. На шмат кіламетраў перад Макарам распасцерлася створаная чалавекам пустыня. За жоўтым бугром роў бульдозер, сваім рылам дратаваў зямлю, здалося, ірваў жывое цела.

Таго моста не было, як і рэчкі. Замест яе выцягнуўся роўным шнурочкам канал з пустымі тарфянымі берагамі, якія пачыналі ўжо зарастаць асотам.

Ад гэтай карціны ў Макара ажно перахапіла дыханне. Ён стаяў сцяўшы зубы і глядзеў на ваколіцу, па якой нібыта прайшоўся смерч, агонь, навала.

— Даўно гэта ўсё? — нарэшце вымавіў.

— Тры гады ўжо,— уздыхнуў бацька.— Колькі лесу знішчылі, а колькі спалілі, каму расказаць — не паверацць. Усё роўна як татара-мангол прайшоў... Возера, маўляў, трэба. Ды дзесяць кіламетраў адсюль Белае, Чорнае, Спораўскае азёры, што моры. Пазарасталі травой... Новае давай... Яці іх у душу...

— Чаму ж не перашкаджалі? Не спынілі?

— А хто?

— Як хто? Трэба было ўсёй вёскай выйсці і легчы на дарозе,— сказаў Макар, ужо злуючыся на сваіх землякоў.

— Ну і што? Што зменіцца...— бацька махнуў рукой.— Я сваё аджыў, хай маладыя думаюць. А ім, гляджу, усё роўна, ніхто анічога...

Яны пасядзелі моўчкі ля канала. Бульдозер варочаў зямлю, уздымаючы агромністы хвост пылу, які засцілаў, здавалася, паўнеба. Было горача, але лезці ў канал, па дне якога струменіў кволы ручай, не хацелася. Макар сядзеў з цяжкай галавой, з болем у сэрцы. Ён цяпер адчуваў сябе гэтак жа, як і ля магілы маці: што не паспеў, што кепскі сын...

— Няма гаспадара,— прамовіў бацька.— Хто што ўдумае, тое і робіць.

— Як — няма гаспадара? — не згадзіўся Макар.— А людзі, народ...

— Нехта іх слухае! Старшыня вырабляе, што хоча.

— Канечне, калі ўсе маўчаць.

— А ты што рабіў бы? Ва ўсіх адно жыццё.

— Адно. Але і сумленне таксама адно...

Тыдзень Макар палоў з бацькам агарод, пілаваў дровы, дапамагаў сястры касіць сена. У суботу, ушчэнт стомлены, брудны ад поту і пылу, ён дастаў з чамадана чыстую бялізну, свежую кашулю, спартыўны касцюм — усё склаў у сетку.

— Куды ты? — спытаўся бацька.

— Пойдзем у лазню. Дзе твая чыстая бялізна?..

— У лазню? — бацька сумна засмяяўся.— Зачынілі ўжо шэсць гадоў назад на рамонт.

— Дык дзе вы мыецеся? — не зразумеў Макар.

— Забыў, дзе мыўся ў дзяцінстве?

— Помню. У начоўках, у балеі...

— Вось так і мы цяпер. У механізатараў на мехдвары ёсцека душавая, у даярак — таксама. А мы, старыя, і астатні народ плаваем у балеі.

Макар са злосцю глянуў на бацьку, кінуў сетку з бялізнай на канапу і панура сеў на ўслон ля парога. Настрой быў сапсаваны, і ўсё вакол здалося непрыемным, кепскім, сумным. Макар успомніў горад, у якім жыў нядаўна, сваю ўтульную кватэру і работу, якая яшчэ тыдні два назад была яму нецікавая і хацелася звольніцца. Цяпер усё тое стала нібыта лепшым, патрэбным.

Бацька спадылба паверх акуляраў пазіраў на сына, рабіў выгляд, што чытае газету. Але твар быў устрывожаны і нават разгублены. Было крыўдна за сваю вёску, за суседзяў. Атрымлівалася, што сын кажа праўду, хоць і горкую.

## 2

Гарачыня апала ўжо, і прахалода праз адчыненае акно памалу запоўніла хату. Па вуліцы раз-пораз праязджалі машыны, уздымаючы пыл, які ляцеў у двор, на яблыні, вішні. І хоць на вокнах была марля, пыл трапляў і ў хату. Толькі ўчора Макар памыў падлогу, выцер мокрай анучкай падаконнікі, і зноў можна было апратваць.

— Не рады, што прыехаў? — бацька зняў акуляры, акуратна згарнуў газету.— Чалавек да ўсяго прывыкае: і да добрага, і да благога. Да добрага хутчэй...

— Ды не тое, не тое,— ускрыкнуў Макар і, ускочыў-

шы з услона, узбуджана захадзіў па хаце. Яму не спадабалася, што бацька здагадаўся, аб чым ён думаў.— Я здзіўляюся, што не знайшлося ў вёсцы ні аднаго чалавека, які б запратэставаў.

— Што зменіцца з таго? — сказаў бацька і стукнуў рукою па стале.— Ат, гаварыў і гаварыць буду: няма гаспадара ў калгасе, у вёсцы.

Макар раптам адчуў моцную смагу. Здалося, нібы склеілася горла і дыхаць стала цяжка. Ён набраў паўлітровы кубак вады і залпам выпіў. Стомлены, стары твар бацькі быў спакойны, выцвілыя блакітныя вочы глядзелі сумнавата, быццам вось-вось заблішчаць у іх слёзы. І адразу адхлынула жорсткасць ад сэрца, зніклі з галавы непрыемныя словы, якія Макар толькі што ледзь не выказаў.

— Хочаш ведаць праўду? — ціха гаманіў бацька.— Магу сказаць...

— Чаму ж не...

— Дык слухай. Ты, мусіць, не помніш, калі наш старшыня Іван Іванавіч прыйшоў у калгас, дык ён быў худы, як трэска, і з усімі вітаўся за руку. Цяпер ён такі таўстун, што ледзьве ўлазіць у машыну. Калі ж едзе па вёсцы, дык не тое што не вітаецца, нават не глядзіць на людзей. Горш, чым які пан! Адкуль, што тут будзе? Ён клапоціцца толькі пра сябе. Калі расказваюць, што недзе ёсцека добрыя старшыні, слухаеш, як казку.

— Няўжо ён такі? Нешта не веру...— Макар зноў выпіў вады, але смага не зменшылася, толькі твар стаў мокры ад поту.— Ладна... Пайшлі хоць крыху ў канале абмыемся.

— Не, я ўжо ў балеі. Мо і ты?

— Не, не, не,— схапіўшы мыла і ручнік, Макар выбег з хаты.

У гэтую ноч яму не спалася. Было вельмі крыўдна за родную вёску, за людзей. Не мог зразумець, што з імі, адкуль такая ўсеагульная, як здавалася, абыякавасць.

Макар асцярожна, каб не разбудзіць бацьку, які соладка спаў, пасвістваючы носам, падняўся, хуценька апрануўся.

Месяц на небе і ліхтары на слупках ператварылі ноч у дзень. Толькі святло было жоўтае, нейкае нежы-

вое. Па дарозе Макар не сустрэў ніводнага чалавека. Спалі нават сабакі.

Ён помніў, дзе была старая лазня: у кустах за раўчуком, які таксама ўжо стаў канальчыкам. Знайшоў лазню адразу. Густа пахла язмінам, маладой травой. Недзе зусім побач заспяваў салавей, потым яшчэ адзін. Макар слухаў іх, баючыся крануцца з месца. Салаўіная песня абарвалася гэтак жа нечакана, як і пачалася.

Макар падышоў да лазні. На дзвярах вісеў вялізны замок. У вокнах былі выбіты шыбіны. Пад нагамі ляжалі кучы смецця, друзу. Усё гэта ён разгледзеў, абышоўшы будынак вакол. Той жа дарогай праз кустоўе вярнуўся на вуліцу.

Ён да ранку пратупаў у двары. Хадзіў па залітым месячным святлом садзе, слухаў салаўёў, якія спявалі і ля хаты, але гаркота з душы не знікала. Нарэшце прысеў пад сцяной хлява на калодцы і задрамаў. Прачнуўся ад таго, што сонца свяціла яму ў вочы, а здалося, нейкі настырны чалавек утаропіўся на яго. І хоць паспаў, але галава ўсё роўна была як не свая, ціснула ў скронях, і ён падумаў, што мо захварэў: у гарачыню таксама бывае запаленне лёгкіх. Мабыць, усё-ткі ён адвык ад сялянскай працы.

Папіўшы гарбаты, Макар пераадзеўся ў святочны касцюм і нават завязаў гальштук. Наваксаваў туфлі, папырскаўся адэкалонам. Каб менш сонца пякло ў галаву, надзеў светлы капялюш з шырокімі палямі. Бацька дапытваўся, куды сабраўся, але ён не адказаў, толькі пажартаваў, што ідзе ў сваты.

Хутка зразумеў, як недарэчы яго святочная вопратка, асабліва гальштук. І так было горача: сонца зноў караскалася на чысцюткае бліншчастае неба. Але вяртацца дамоў не стаў.

Ён помніў, дзе кантора калгаса, і лёгка знайшоў яе, двухпавярховую будыніну, некалі пафарбаваную ў чырвонае, а цяпер — брудна-жоўтую. Перад канторай стаялі дзве легкавушкі, трактар і грузавік. Нават падумаў, на якой ездзіць старшыня, і вырашыў, што на зялёнай «Ніве». Ля ўвахода ў кантору ён спаткаў суседку, якая працавала тут прыбіральшчыцай, і ад яе даведаўся: вось-вось у старшыні скончыцца нарада і тады ўжо яго сёння не зловіш. Макар заспяшаўся, бегма рушыў на другі паверх.

Ён не спазніўся, паспеў якраз, таму што нарада

ўжо скончылася і старшыня крычаў праз акно шафёру, каб той рыхтаваў машыну ў дарогу.

Жыццё навучыла Макара, як дзейнічаць у такіх сітуацыях. Наогул, калі трэба, ён мог набрацца смеласці і нахабства і падысці да любога начальніка. Ён адсунуў крэсла ад стала і рашуча сеў насупраць старшыні. Гэта быў чалавек сталага веку, з густымі напалавіну пасівелымі чорнымі валасамі. Пад маленькімі вачыма набрынялыя пухліны, і твар нездаровы, шэры. Пагляд у старшыні непрыязны, калючы. Канцы губ незадаволена апушчаны ўніз і пераходзяць у глыбокія зморшчыны, з якіх тырчыць сівое шчаціннe. Відаць, спяшаўся, таму і пагаліўся неахайна.

— Што ў вас? — схаваў вочы пад цяжкімі павекамі і забарабаніў кароткімі тоўстымі пальцамі па бліскучым паліраваным стале. Усім сваім выглядам паказваў: нецікавы яму Макар чалавек. Аднак на Макара гэта не дзейнічала.

— Лазня ў вёсцы на замку ўжо шэсць гадоў. Людзям няма дзе памыцца. Гэта нармальна? — пачаў Макар.— Гэта ж здзек з людзей.

Старшыня расплюшчыў вочкі, шырокай мясістай далонню правёў па стале. І нечакана ўсміхнуўся хітраватай асцярожнай усмешкай.

— Лазню я не замыкаў. Дый, мабыць, ім лепш мыцца ў балеі.

— А дзе вы мыецеся?

— У мяне асабістая лазня, у двары...— старшыня падціснуў вузкія губы, і яны зніклі ў складках скуры.— Дый чаму калгас павінен яе рамантаваць? Унь колькі мужчын у вёсцы, хай збяруцца на суботнік і падладзяць лазню. Я — не супраць!

— Але ж у вас — улада,— Макар, болей не слухаючы старшыню, амаль крычаў.— Вам лазня не трэба, але яна трэба людзям. Людзям! Разумееце гэта?!.

— Разумею, чаму ж не,— раўнадушна сказаў старшыня. А Макар загарачыўся і ўспомніў усё, што здавалася яму, не так, як трэба, рабілі ў калгасе. Выказаў пачутае ад бацькі, суседзяў. Але ніякага ўражання на старшыню не зрабіў. Не слухаючы болей Макара, ён накіраваўся з кабінета.

— Калі трэба табе лазня, вазьмі і адрамантуй,— сказаў старшыня, агледзеўшы свайго наведвальніка знізу ўверх.

— А як вы дазволілі знішчыць лес вакол вёскі?! — выгукнуў Макар.

— У мяне ніхто не пытаўся. Дый якая розніца,— старшыня надзіва порстка для сваёй камплекцыі спусціўся па лесвіцы на першы паверх, сеў у зялёную «Ніву», і Макар, пэўна, перастаў для яго існаваць.

«Што, атрымаў?.. Навошта ўсё гэта мне? Як жылі, хай і далей так жывуць. Але ж балюча за вёску, за бацьку...» — падумаў Макар. І нібыта ўсім яны задаволены, маўчаць, як праглынуўшы языкі. Да іх вяртаецца мова ў сваіх хатах, дзе-небудзь за сталом, вечарам на лаўцы ля варот. Вось калі яны ўсё аналізуюць, крытыкуюць, здымаюць з пасад і прызначаюць на новыя пасады. Палітыканы хлеўчуковыя... Колькі можна цярпець і колькі можна гаварыць па завуголлі. Толькі скардзяцца адзін аднаму, каб трэці не чуў. Што ў іх за душой, няўжо так зацісну́ў страх? Але за што, чаго баяцца? Не, гэтага ён не разумеў. Многія з дзядоў былі ў партызанах, ваявалі на фронце, параненыя. Хадзілі ў атаку, біліся насмерць з фашыстамі і не баяліся, рызыкавалі сваім жыццём і жыццём сваіх сем'яў. Хоць, канечне, іх ужо мала, іх слова — не галоўнае. Цяпер у сіле іхнія дзеці і ўнукі, у якіх такі ж незразумелы страх.

## 3

Вярнуўшыся дамоў, Макар папрасіў у бацькі сякеру, пілу-нажоўку, цвікоў. У кішэню штаноў паклаў скібку хлеба з салам, цыбуліну. Ён адчуў раптам у сабе столькі энергіі, што быў здольны працаваць і працаваць. Здавалася, рукі самі прасілі работы, і ён ледзь не бег.

Ужо ля лазні ён пашкадаваў, што не ўзяў рыдлёўкі, каб трохі расчысціць ад смецця і друзу панадворак. Лёгка, адным ударам сякеры, Макар выбіў прабой з дзвярэй, і замок упаў на зямлю. Дзверы, зарыпеўшы, адчыніліся, і з памяшкання патыхнула сырасцю і цвіллю.

Макар зазірнуў ва ўсе куткі лазні, амаль што абмацаў рукамі сцены, падлогу, столь. Ужо гаспадарыў тут грыбок, еў дрэва, але паднавіць будынак яшчэ можна было. Толькі папрацаваць трэба. Замяніўшы дошкі на падлозе, столі, падрамантаваўшы дзверы

і вокны, палкі ў парыльні, якія быццам знарок хто паламаў папалам,— можна было запальваць агонь у лазні. І Макар уявіў, як шугае полымя, чырванее каменне і — пайшла пáра. Ён назапасіць бярозавых венікаў, прыйдуць з бацькам увечары — во будзе любата!

Ён доўга прыкідваў, што і як рабіць, каб закончыць рамонт за дзён пяць-шэсць. Мабыць, трэба спярша зняць струхлелыя дошкі з падлогі і столі, потым вокны, дзверы.

У зарасніках, якія Макар не паспеў падцерабіць, затрашчала сухое галлё. Нехта, пэўна, сюды ішоў. І Макар узрадаваўся: чым больш будзе рук, тым хутчэй адчыніцца лазня. Ён выйшаў на ганак, нагамі паскідаў на зямлю друз, смецце.

— Што тут робіце? — неспадзеўкі пачуў ззаду. Адразу хацеў пажартаваць, што хату сабе рамантуе, але змоўчаў, бо ўбачыў маладога і худога, як сцябліна, міліцыянера з зорачкай малодшага лейтэнанта на пагонах і сівога дзядзьку, твар якога ў дробных парахавых кропельках здаўся знаёмым. І праз імгненне Макар успомніў, што гэта старшыня сельсавета: некалі ў яго нават браў даведку, каб купіць бацькам дровы ў райтопе.

— Што раблю?..— думаючы, з якой нагоды прыйшлі сюды прадстаўнікі ўлады, сказаў ён.— Ды вось здзіўляюся, што ні ў кога рукі не дайшлі да лазні. І сельсавет нібыта ёсць, і калгас,— дадаў праз паўзу, а потым даўмеўся, што зрабіў глупства. Бо ў старшыні пачырванеў твар, нервова затрэсліся рукі: пэўна, словы Макара пра сельсавет ён успрыняў як асабістую абразу. Дый малодшы лейтэнант натапырыўся таксама, пачаў расшпільваць сваю афіцэрскую сумку.

— Ёсць у нас усё,— прамовіў старшыня сельсавета,— усё! Але хто дазволіў ламаць замок, хто, вас пытаюся?!. Вы што, не ведаеце, што гэта грамадская маёмасць? А ведаеце, што бывае за шкодніцтва? Калі забыліся, напомнім! — гучаў голас, і так сорамна было слухаць, нібыта ён, Макар, стаяў на гэтым ганку голы, а усе бачылі і смяяліся з яго.

— Мы вымушаны скласці пратакол і на першы раз папярэдзіць вас,— сказаў густым сакавітым басам малодшы лейтэнант і неяк вінавата скасіў вочы ўбок.

— Ну што ж, калі ласка...— Макар палажыў сяке-

ру, цвікі і нажоўку ў торбу, зачыніў дзверы ў лазню.— Здзіўляюся, як выбралі вас старшынёй сельсавета...

— Цябе не спыталі. Пагавары яшчэ тутака, умэнт на пятнаццаць сутак.

Макар, не чытаючы, падпісаў пратакол і без загаду забіў назад у шула прабой з замком. Потым прысеў на ганку, закурыў. Спяшацца не было куды, усё роўна дзень праходзіў дарма.

Ён застаўся адзін. Здалося, што, адыходзячы, малодшы лейтэнант па-змоўніцку падміргнуў яму. Ён зноў закурыў цыгарэту і ўпершыню за шмат гадоў жыцця брудна вылаяўся. Не мог ён зразумець, што гэта з людзьмі робіцца, мазгі ў іх павысыхалі, ці як? Са старшынёй — ясна, але ж астатнія людзі... А можа, ён сам звар'яцеў? Страціў меру рэальнага, канкрэтнага, жыве яшчэ літара ў літару па школьных і інстытуцкіх падручніках. Менавіта з-за яго «прынцыповасці» і жонка развялася з ім. Яна называла прынцыповасць дурнотай. Але ж усё-ткі гэта ненармальна, што ў сучаснай вёсцы няма лазні, што вакол знішчылі сотні гектараў лесу, які ствараў клімат, трымаў у зямлі вільгаць і захоўваў глебу. «Ненармальна!» — Макар стукнуў сябе кулаком па калене і, пакуль не ведаючы, што рабіць далей, пацягнуўся прэч ад лазні.

## 4

У іхняй вёсцы была невялікая плошча з клубам, паркам, царквой і магазінам, які толькі што адчынілі пасля перапынку на абед. Відаць, прывезлі хлеб, а мо і яшчэ што, бо людзей сабралася багата. Доўгі хвост чаргі вылез ажно на вуліцу. Мужчыны, узбуджаныя і нецярплівыя, голасна абмяркоўвалі: хопіць ім тавару ці не. Макар прыпыніўся, паслухаў гэтыя размовы, думаў ужо пачаць гамонку пра лазню, але вырашыў, што цяпер яго не зразумеюць.

Адразу за магазінам ля студні з вядром вады стаяў невысокі мужчына з чорнай кучаравай барадой. У майцы, салдацкіх галіфэ і ў тапках на босую нагу. Вочы вясёлыя і нахабныя. Як старому знаёмаму, усміхнуўся Макару.

— Вялікая чарга, га? — спытаўся і сам адказаў: — Дужа вялікая. Хоць, калі трэба, пастаіш. Я ўчора тры гадзіны стаяў, але ўзяў. Цяпер ёсцека, магу прыняць

гасцей. Гляджу, няўжо я вас, пане дабрадзею, не ведаю?

— Мо і ведаеце,— сказаў Макар і назваў свайго бацьку.

— Ну, канечне, як жа ж... Ваша матухна «почила в бозе».

— Памерла...

— Я ж тутэйшы поп, айцец Мікалай. Што, не відаць па выгляду? Дык сёння бывае пастух апрануты, як начальнік, а начальнік — як пастух. Усе роўныя перад богам і кіраўніцтвам. Цікава пазнаёміцца з вамі, цікава! Куды гэта вы з сякерай, з пілой? А што, заходзьце, паглядзіце, як жыве сучасны поп на Беларусі. З інтэлігентным чалавекам прыемна пагаварыць.

І Макар зайшоў з айцом Мікалаем, які быў, напэўна, падпіўшы, бо пахла ад яго вінам, у двухпавярховы, з маленькім балкончыкам, цагляны дом. Насустрач выскачылі два чарнявыя хлопчыкі, а за імі нетаропка ступала поўная, ажно круглая, жанчына з вельмі сімпатычным тварам... Макар апынуўся ў прасторным пакоі, аклееным блакітнымі шпалерамі з залатымі каласамі. У куце ля ўвахода былі прыладжаны паліцы з кнігамі. Пасярэдзіне пакоя стаяў стол, а на ім — гладышка і кубак.

— Частуйцеся, калі ласка,— айцец Мікалай наліў у кубак малака.— У нас свая кароўка. Малако тлустае, смачнае. Матушка Людміла любіць. Штодня два літры выпівае. Таму і гладкая ў мяне. Як і трэба быць пападдзі,— ён зарагатаў, запрасіў за стол. У хаце пахла сасновымі галінкамі і язмінам. Макар папіў малака, агледзеўся: у гасцях у папа не даводзілася быць раней. Айцец Мікалай пытаўся, дзе працуе, якую пасаду займае і чаму сумны. І Макар — чалавек не надта адкрыты перад сябрамі, не кажучы пра незнаёмых.

— У мяне было такое, было. Мо перакусіш...— перайшоў ужо на «ты» айцец Мікалай.— Павер, усё дробязь у параўнанні з добрым сталом.

— Не хачу,— адмовіўся Макар і пажартаваў: — Жывеш ты багата, як куркуль. Абіраеш людзей памалу.

— Жыву нішто сабе, але нікога не абіраю,— не пакрыўдзіўся поп.— Самі даюць. Чалавек спакон веку імкнуўся да веры. Як сказана ў Бібліі: «...блуждающие духом познают мудрость, и непокорные научатся по-

слушанню». Альбо: «Душа надменная не успокоится, праведный своей верою жив будет». Ты паглядзі, што ў нашай вёсцы, акрамя кінафільмаў, прапануюць людзям у якасці духоўнай ежы. Абсалютна нічога. Дый фільмы ў большасці амерыканскія і індыйскія. Ну і што прапануе мясцовае кіраўніцтва маім парафіянам? Гарэлку забралі, але замест яе нічога не далі. Вот царква, а вот клуб. У царкве прыгажосць, а ў клубе выбіта шкло ў вокнах, паламаная падлога і ніякага парадку. Што гэта такое? Мне і то абрыдла на гэта глядзець.

— Усё гаварыльня. Рабіць трэба, а не языком маладзіць,— сказаў Макар, і ўспомніліся сустрэчы са старшынямі калгаса і сельсавета, але не стаў пра гэта гаварыць папу. Надта той ужо лез у душу. У сяброўства з першага позірку Макар не верыў і з падазронасцю ставіўся да людзей, якія перад кожным сустрэчным мякка сцелюць.— Пара мне... Пайду...

— Калі не хочаш праснак пакаштаваць у маёй хаце, тады пайшлі. Правяду,— айцец Мікалай тут жа ў пакоі, не саромеючыся госця, скінуў з сябе галіфэ і апрануў цёмна-сіні спартыўны касцюм.

— Навошта мяне праводзіць. Я сам,— аднекваўся Макар, але поп вывеў яго са свайго двара і, не адстаючы ні на крок, ішоў следам.

Чарга ля магазіна яшчэ пабольшала, выпаўзла з вуліцы аж у парк. Пасоўвалася марудна, нібыта не рухалася зусім. За магазінам пад старымі ліпамі прыпынілася некалькі трактароў, машына.

— Шукаюць супакаенне для душы,— сказаў айцец Мікалай, хмыкнуў і спытаў: — Быў у нашай царкве калі-небудзь?

— Здаецца, у дзяцінстве з мамай...

— Шмат страціў. У нашай царкве ёсць іконы, напісаныя ў шаснаццатым стагоддзі рукой невядомага майстра. Якая прыгажосць! А калі заспявае хор, тады гэтыя іконы наогул здаюцца бессмяротнымі.

— Ат, твае байкі! — Макар хацеў сказаць штонебудзь рэзкае, каб адчапіўся гэты настырны, самазадаволены поп.— Што твая царква...

— Гэта не толькі мая. Зірні хоць вокам на гэты цуд, створаны рукамі чалавечымі.

— Навошта?

— Для душы,— айцец Мікалай глядзеў на яго стро-

га, нават сурова.— Я ж не агітую цябе за бога, гэта ўсё на тваім сумленні: верыць альбо не верыць. Лічы, прапаную табе экскурсію ў мастацкі музей.

5

Макар заходзіў у царкву з пачуццём непрыязнасці, якое выхоўвалася ў ім яшчэ з дзяцінства. На столі, сценах было шмат золата, усё блішчэла ад святла дзесяткаў электрычных лямпачак вялізнай люстры. Макар слухаў айца Мікалая, які да драбніц расказваў пра кожную ікону, але гэта не затрымлівалася ў галаве, бо памяць зноў вяртала да няўдалага рамонту лазні, да жоўтае пустэчы, якая была на месцы лясоў, да кволага раўчука... У царкве было прыгожа, але гэтая прыгажосць прыгнятала, прыціскала душу, і тое, што трывожыла, гняло, спакваля выплывала наверх. Макару ўжо было сорамна, што ён спалохаўся, адступіў перад пратаколам, які склаў малодшы лейтэнант. Відавочна, што праўда за ім, і гэтай праўды чакаюць людзі.

— У нашай царквы званы чыстага, амаль салаўінага голасу. Рабілі іх беларускія майстры. Геніі, можна сказаць. На жаль, званара ў нас няма. Званю толькі, калі пажар у вёсцы здарыцца. Тады ўсе бягуць на плошчу. Можна сказаць, пажарныя ў нас званы.

— І часта бываюць пажары?

— Ды не... Раз-два ў год, а то і меней,— гаварыў айцец Мікалай.— Пайшлі наверх, убачыш на званах аўтограф майстра.

Па крутых драўляных прыступках яны падняліся да званоў, і Макар прачытаў напісанае стараславянскай вяззю: Вітаўт Рудаміна... Ён лёгенька хітнуў рукою язычок звана, і пачулася чыстае, мяккае: дзын-дзын-дзын.

Адсюль, з вышыні, уся вёска была перад ім. Ён знайшоў кантору калгаса, перад якой ўсё яшчэ стаялі машыны, лазню ў кустах. Вочы яго спыніліся на даўжэзнай чарзе ля магазіна, пазнаў у ёй свайго бацьку, суседа. Яны аб нечым размаўлялі, абапёршыся на кульбакі. За сваё нялёгкае жыццё старыя стаміліся, ім не было ўжо куды спяшацца. Але ў чарзе стаялі і маладыя, чамусьці, здавалася, яшчэ больш стомленыя, і ім нібыта ўсё роўна, што робіцца вакол.

— Пакажу я табе рэч...— пачуўся знізу голас папа,— ідзі сюды...

Раптам нейкая злосць, дзікая ярасць ахапіла Макараву душу, захацелася крычаць, плакаць, каб толькі пачулі ўсе гэтыя людзі. Ужо не думаючы, ён схапіў абедзвюма рукамі вяроўку і з усяе сілы пацягнуў на сябе. Пачуўся глухі, магутны звон. І тады Макар, не спыняючыся, пачаў званіць. Айцец Мікалай спрабаваў адарваць яго ад вяроўкі, але Макара было не спыніць. Ён убачыў, як чарга ад магазіна рассыпалася і рушыла на плошчу. З усіх бакоў сюды беглі людзі, і гэта надало яму яшчэ большай сілы. Макар званіў да той пары, пакуль на плошчы не сабраўся натоўп людзей: збеглася, мусіць, уся вёска. Тады толькі, нарэшце, змоўклі званы.

## ДАМОЎ

— І раз, і два, і раз, і два! Левай, правай, левай!..— пакрыкваў сяржант-недаростак у расхрыстанай на грудзях спяцоўцы. Рота ішла на абед у гарнізонную з бруднa-чырвонай цэглы сталоўку. Нікога з калоны Лаўрэн не ведаў, ён служыў не ў гэтай роце, але часць у іх была адна. Яна мела назву: будаўнічы батальён.

Рота прайшла міма, нехта свіснуў, рагатнуў, дружна ўдарылі падкаваныя жалезам абцасы аб брук. Няйнакш здагадаліся, што перад імі дэмбіль: у руках — чамадан, кірзавыя боты блішчаць, як хромавыя. Адразу відаць, што выстраіўся дамоў. Крокаў дваццаць адгрукала рота, паядаючы вачыма Лаўрэна, і знікла ў чорнай пройме сталоўкі.

Атрымаўшы дакументы, Лаўрэн хацеў як найхутчэй апынуцца на вакзале, каб болей не бачыць казармы, не адчуваць яе абрыдлага масціка-ваксавага паху. Тое, што рота павітала яго як афіцэра, штосьці змяніла ў настроі, і ён, павесялелы, памалу ішоў па тэрыторыі гарнізона, азіраўся па баках, напаследак разглядваючы будынкі санчасці, клуба, сустрэчных.

Раптам ён пачуў наперадзе рэзкія гукі трубы і барабана, маршавую музыку. Справа ад дарогі ля салдацкага клуба было ажно чорна ад «Волг». Гэта насцярожыла яго, і ён падумаў, як лацвей абмінуць плац, на якім зараз нешта адбывалася і дзе было шмат афі-

цэраў. Але калі Лаўрэн убачыў тое, што было на плацы, цікавасць узяла верх над перасцярогай. Ён прыпыніўся і пачаў назіраць. На плацы, дзе штораніцы развод, стоўпіліся, менавіта стоўпіліся, а не выстраіліся сотні з дзве афіцэраў.

За паўкіламетра ад іх гарлапаніў-лаяўся высозны, цыбаты, на доўгіх танклявых нагах чалавек з генеральскімі лампасамі. Вось ён закрычаў, і Лаўрэн выразна пачуў: «У калону па чатыры ста-на-ві-ся!!!» І ўвесь натоўп тоўстых і худых, высокіх і маленькіх, пажылых і маладых, палкоўнікаў і маёраў, здаецца, афіцэраў ніжэйшых чынам не было відаць,— загрукаў па плацы. Яны прабеглі гэтыя пяцьсот метраў так хутка, як, мусіць, не бегалі даўно. Імгненна ўтварылі маналітную калону, бяздумную і паслухмяную волі даўгалыгага. А яму зноў нешта не спадабалася, бо да Лаўрэна даляцела фальцэтнае: «Разайдзіся!!!» Падатная камандам машына развалілася, ператварыўшыся ў натоўп разгубленых людзей. Лаўрэн здагадаўся, што афіцэры гарнізона рыхтуюцца да сустрэчы важнага госця. Пра яго прыезд апошнія дні толькі і было гаворак у роце. Лаўрэн, заняты сваімі клопатамі, афармленнем дакументаў на звальненне з арміі, зусім забыўся пра гэту падзею. Дый яму, зрэшты, усё роўна хто прыязджае.

Зараз канца муштры не было відаць, і Лаўрэн, шчаслівы і вясёлы, што яму не трэба маршыраваць разам з ротай (яны таксама збіраліся сустракаць важнага госця), слухаць мацюкі старшыны, падаўся прэч ад плаца. За КПП ён сцішыў хаду і ўжо зноў паволі пацягнуўся да вакзала. Білет быў у кішэні, а да вечара, калі адыходзіў цягнік на Маскву, яшчэ далёка. Ён углядаўся ў дамы, у сустрэчных людзей, як бы развітваўся з горадам, з якім лёс звязаў яго на два гады. Горад яму спадабаўся, і да яго людзей ён адчуваў павагу і нават удзячнасць, бо ўбачыў шмат чаго, што мог бы ніколі не ўбачыць, калі б не служба тут. Аднак цяпер ён пра гэта не думаў, проста ўсё нібы фатаграфаў, занатоўваў у памяці. Прыгажосць і незвычайнасць архітэктуры горада,раслiннасць, дагэтуль невядомая яму — гэта Лаўрэн асэнсуе і ацэніць пасля, праз шмат гадоў ужо сталым чалавекам. Памяць будзе нібы выкідваць са сваіх каморак малюнкі таго часу, выклікаючы сум і жаданне хоць раз вярнуцца ў горад.

Мінуўшы раён, які меў назву Канакер, Лаўрэн

насцярожыўся: па вуліцах туды-сюды лёталі на матацыклах у белых шлемах, у белых куртках, у белых штанах міліцыянты. Важна крочылі тройкі ваенных патрулёў. На вуліцы, па якой ішоў Лаўрэн, міліцыянты стаялі, мабыць, праз тры-чатыры крокі. Іх было так многа, што ён разгубіўся, палохала, каб штосьці не затрымала яго ад'езд. Было адчуванне, што сустракалі не важнага госця, а чакалі нейкага перавароту ці мяцяжу. Ну, як паказваюць па тэлевізары аб падзеях у афрыканскіх і лацінаамерыканскіх краінах.

Лаўрэн перайшоў на другую вуліцу, але і там было тое ж: кругом міліцыянты і ваенныя патрулі, якія ўжо двойчы спынялі яго. На шчасце, калі вымаўляў слова «дзембіль», махалі рукой, прапануючы барзджэй выбірацца адсюль.

І на вакзале была адна гамана: што на свята рэспублікі ў горад увечары прыляціць сам таварыш Брэжнеў. Яго патрэты, каляровыя і чорна-белыя, маленькія і вялікія, здаецца, віселі на сценах усіх будынкаў. Дзядзька, які сядзеў побач з Лаўрэнам, пачаставаў яго кілбасой з памідорамі і, нахіліўшыся да вуха, цішком сказаў, што ўчора ў горадзе быў грандыёзны скандал.

— Вось тут,— ён паказаў пальцам на прывакзальную плошчу, і Лаўрэн убачыў высока ўзнятыя ў неба велічэзныя партрэты Брэжнева і Леніна,— нехта пажартаваў, мо і цяпер шукаюць гэтага жартаўніка.— І амаль уткнуўшыся вусамі Лаўрэну ў вуха, дзядзька апавядаў, што ўначы нейкі смяльчак-адчаюга ўзлез да партрэта Леніна і намаляваў на пінжаку правадыра Зорку Героя. Раніцай людзі ўбачылі, што не толькі Брэжнеў з медалямі, але і ў Леніна ёсць. За дзень увесь мільённы горад пабыў тут.

— А цяпер глядзі! — выцягнуў палец дзядзька, нібы паказваючы фокус, і Лаўрэн нічога не ўбачыў на грудзях ні ў Брэжнева, ні ў Леніна.— Вось так...— засмяяўся дзядзька, схаваў рэшткі свайго абеду ў торбу і праз хвіліну як растаў у вакзальным віры.

Хіліла на сон, і Лаўрэн задрамаў. Уначы ён амаль не спаў, мо прыкімарыў з паўгадзіны, наўрад больш. Проста яму не было часу заставацца ў казарме. Адчуваў, калі затрымаецца трошкі, можа прыехаць камандзір роты альбо дзяжурны па часці, а гэта яшчэ горш. Тады будзе кепска. Хоць,зрэшты,такая ўжо віна, можна

сказаць, змусілі яго... Сяржанты Аліеў, Каўбаеў і Мацюрупа падышлі да яго ўначы, ведалі, што атрымаў грошы. Канечне, была такая завядзёнка: той, хто ад'язджае, частуе сяржантаў і «дзядоў». Яму нікога не хацелася паіць, але ж падумаў, што служыць ім найменш паўгода, а ён шчаслівы — едзе дамоў і чаму не падзяліцца хоць трошкі гэтым шчасцем. І Лаўрэн адразу згадзіўся адсвяткаваць свой ад'езд.

Іх рота стаяла ў гарах, за тры кіламетры ад яе ўправа і ўлева былі дзве вялікія вёскі Ашнар і Куназ. У Ашнары прадавалі чырвонае віно па рублю за літр, а ў Куназе — белае. Лаўрэн даў грошай на чырвонае і на белае, а таксама на памідоры і на лаваш. Вырашылі сабрацца ў сталоўцы пасля адбою. Кухар Маныраў пакінуў Лаўрэну ключы ад склада прадуктаў і на стол узялі мясных кансерваў, цыбулі, хлеба. На кухні пакінулі бульбы, на гэты раз яна была патоўчаная з мясам.

Калі Лаўрэн увайшоў у сталоўку пасля капцёркі, там ужо сядзела чалавек трыццаць. Дзесяцілітровыя тэрмасы з віном стаялі на сталах. У Лаўрэна на душы было трывожна, не верылася, што гэта апошняя ноч у казарме, магчыма, больш гэтых хлопцаў не ўбачыць ніколі ў жыцці. Ён пільна агледзеў салдат, што сядзелі разам з ім за развітальным сталом. Насупраць усміхаўся Казбек Назарбекаў з Грознага. Яны не былі сябрамі, нават аднойчы ледзь не пабіліся з-за нейкай дробязі. І гэтая бойка была б не на карысць Лаўрэну, бо за Казбекам яшчэ чалавек трыццаць землякоў, якія ніколі не далі б яго ў крыўду. А ў Лаўрэна толькі два землякі: Васіль Камарэвіч з Лунінца і Казік Капурка з-пад Баранавіч. Сілы няроўныя, і таму, сціснуўшы зубы, давялося знесці абразу. Цяпер Казбек шчыра і амаль па-сяброўску яму ўсміхаецца, будзе піць віно, купленае на яго грошы. Яны забылі ўсё кепскае, што было між імі, сёння свята, якога дачакаўся першым Лаўрэн.

— Салага, давай! — крычыць Юра Антонаў, б'е рукой па стале, і на падлогу падае жалезная міска. Лаўрэн уздрыгвае, ён крыху асцерагаецца Антонава, ля якога таксама пяць землякоў з Краснаводска. Яны, мусіць, ужо накурыліся анашы, бо ўчора Антонаў атрымаў з дому пасылку. Лаўрэн бачыў, як Антонаў мяшаў табаку з травой, пасля набіваў папяросныя гільзы. Раней у іхняй кампаніі быў Аляксей Мурзаў, таксама

з Краснаводска, але яго забрала ваенная пракуратура. Мурзаў цяпер у дысбаце.

— Давай, давай, салага! — рагоча Антонаў, адбівае на гітары акорд сваёй любімай песні, якая вельмі не падабаецца Лаўрэну, але ён слухае і ведае ўжо на памяць «Дваццацігадовых нас пад сто шасты загад падстрыглі нагала пад барабан...» «Толькі б цяпер не завыў... Крычаць пачне»,— з сумам думае Лаўрэн. А на табурэтцы ў цэнтры сталоўкі ўжо «салага» адэсіт Валік Кірзуйка, хлапчыска пад два метры ростам, вечна галодны. Ён адзін можа з'есці бачок грэцкай кашы, бачок салдацкага баршчу на дзесяцярых і вып'е чайнік кампоту. Амаль штовечар Кірзуйка добраахвотна мые разам з народам посуд на кухні, гэта дае яму магчымасць сабраць недаедзеныя лусты хлеба. Ён мог бы на сняданак, на абед і на вячэру папрасіць дзве порцыі, але тыя, хто служыць у будаўнічым батальёне, павінны разлічвацца за харч, вопратку і абутак са свайго заробку. Кірзуйка ўжо больш з'еў, чым зарабіў, і баіцца стаць даўжніком у арміі.

Цяпер ён на табурэтцы чытае загад міністра абароны аб чарговым звальненні з радоў Узброеных Сіл і сквапна глядзіць на стол, ад якога пахне мясам, цыбуляй і хлебам. Кірзуйка радасна дзярэ горла, і яго крык перакрывае бяседу, панылы спеў Антонава, які ўжо курыць сваю папяросу.

На ўваходзе ляпаюць дзверы, і ўсё ўмэнт сціхае, затойваецца як мыш пад венікам. Ва ўсіх адна думка: хто? а калі дзяжурны па часці? Першае жаданне ў Лаўрэна выскачыць у акно. Дзеля таго каб паехаць дахаты, ён здольны і на такое. Змоўк Кірзуйка, саскочыў з табурэткі і, выкарыстаўшы разгубленасць, ухапіў са стала мяса і хлеба. Толькі чуваць, як ён прагна грызе здабытую ежу, ніхто яму з «дзядоў» не перашкаджае. У калідоры рыпяць ужо нейчыя боты, відаць, новыя, абцасы на падкоўках. «Рып-скрып, рып-скрып, рып-скрып...» Каб не іранічны позірк Казбека, які здагадваецца аб пачуццях Лаўрэна, ён бы зараз уцякаў адсюль. Унь, у кутку адчынена палова акна. Толькі цыгнуць, і ён на двары...

Расчыняюцца дзверы, і Лаўрэн нават перастае дыхаць: на парозе намеснік камандзіра роты старшы лейтэнант Анціпаў. Учора Лаўрэн казаў яму аб сваім ад'ездзе і намякаў пра лаваш з памідорамі, але не

думаў, што той прыйдзе. Прыйшоў, але ж ён афіцэр і раптам... Што ў ягонай галаве... Ён, здаецца, здзекліва акідвае ўсіх позіркам, і зараз пачуецца: «Устаць! Пастроіцца!..» Уключыць усе лямпачкі, дастане з кішэні блакнот. З паўзмроку блішчаць на ім рамяні, новыя боты, казырок шапкі. Ён вельмі прыгожы, гэты афіцэр, і ўсе салдаты ведаюць, што, калі камандзір суседняй роты ў камандзіроўцы, Анціпаў у час дзяжурства ўначы заходзіць да яго на кватэру і затрымліваецца на дзве-тры гадзіны.

— Ну што? — зусім строга пытаецца старшы лейтэнант.— Дамоў, Лаўрэн?

— Дамоў...— з цяжкасцю вымаўляе ён і чакае, што скажуць далей, але ўсё-ткі супакойваецца, адлягае трывога ад сэрца.

— Што ж ты забыўся пра свайго камандзіра? — праз паўзу кажа Анціпаў, і яму не даюць закончыць фразу, дружнае, хоць і прыглушанае «ўра» ўзрывае напятую цішыню.

Намкамроты ўсаджваецца на пачэснае месца між Лаўрэнам і Казбекам, а насупраць іх — Антонаў, які налівае ў паўлітровы кубак чырвонага віна. Ад Анціпава пахне жаночымі духамі, няйнакш сусед у камандзіроўцы. Але пра гэта нікому не прыходзіць у галаву. Галоўнае, каб старлей быў задаволены. Ён п'е віно, і праз колькі хвілін у сталоўцы ўсё па-ранейшаму, кожны нешта выказвае, алкаголь бярэ перамогу над усімі. Толькі Лаўрэн ужо і ў губы не бярэ. У яго задача, каб пад раніцу незаўважна знікнуць з роты.

Да яго лезе, чапляецца Казбек. Ён успомніў аб сваім земляку Аліку Мусараву, які павінен быў звальняцца з арміі разам з Лаўрэнам. Але што зробіш, яго ўжо няма. Слухае Лаўрэн Казбека, і слёзы нагарнуліся на вочы. Дзейнічае алкаголь на нервы, але і хлопца шкада. Ужо мінулі тры месяцы, як забралі Аліка бацькі і недзе пахавалі ў сваёй Чэчні. Разам яны былі з Антонавым на балконе на чацвёртым паверсе. Алік адтынкаваў сцяну, а Антонаў страхаваў яго. Пакінуў аднаго, кажа, мо на хвіліну, а дошка кульнулася пад нагамі, і Мусараў з чацвёртага паверха ўпаў на камение... Ён пражыў яшчэ паўгода, і ўсё. «Чаму ён пакінуў Аліка?» — пытаецца Казбек у Лаўрэна і плача, скіскае кулакі. Малоціць імі па сталe, брудна лаецца, крычыць.

— Ты знарок пакінуў Аліка!!! — выгуквае ён і раптам хапае Антонава за плечы, цягне яго да сябе і перакульвае кубкі з віном. Старшы лейтэнант нешта спрабуе скамандаваць, але ён на моцным падпітку і яго ніхто не слухае ўжо. Казбек б'е з размаху Антонава ў твар і вылівае яму на галаву кубак віна. У сталоўцы пачынаецца вэрхал, усе крычаць: адны супакойваюць забіякаў, другія пераходзяць у іхніх саюзнікаў, раздзяляючыся на варожыя лагеры. І толькі Кірзуйка спакойны, у яго свой інтарэс: рукі і рот заняты ежай.

Апошні раз глядзіць на былых аднапалчан Лаўрэн, няма сэнсу развітвацца: усім ужо не да яго. Ён спыняецца ля адчыненага акна і нечакана ўспамінае першы дзень службы, калі іх, страшэнна стомленых за восем дзён дарогі, яшчэ ў цывільнай вопратцы, адразу з цягніка прывялі ў гэту сталоўку. Яны паабедалі, і добрую гадзіну касавокі падпалкоўнік, як кажуць, на «дэсерт» расказваў пра «Малую зямлю» і яе агромністую ролю ў Вялікай Айчыннай вайне. Лаўрэн чуў толькі ўступ, а потым, знясілены дарогай, разморany салдацкай кашай і словамі падпалкоўніка, нібы праваліўся ў бездань, заснуў і ачнуўся, калі прамоўца заканчваў сваё выступленне. Спалі амаль усе навабранцы, і іх пабудзіла ўжо каманда: «Устаць! Выходзь строіцца!» Гэты малюнак узнавіўся ў памяці Лаўрэна як бы на нейкую долю хвіліны і знік, пакінуўшы рэальнасць: вось-вось у сталоўцы пачнецца бойка і ў гэтым будзе павінен ён. Адно ратуе: тут намкамроты старшы лейтэнант Анціпаў, які мо праявіць сваю волю.

Лаўрэн выскачыў праз акно і звычнай дарогай, міма вышкі вартавога, праз дзірку ў плоце, па цясніне, якая ўпрытык да іхняга гарадка, шыбануў да горада. Якраз паспяваў на першы ранішні аўтобус. І вось цяпер сядзіць на вакзале. Толькі неспакойна на душы, вельмі неспакойна... А калі зараз з'явіцца дзяжурны з часці і верне яго, Лаўрэна, у роту...

На вакзале, як заўсёды, было тлумна. Проста над Лаўрэнам вісеў дынамік, які маўчаў, бы даючы людзям удосталь пагаманіць, падзяліцца з выпадковым суседам па лаўцы нечым сваім, якое часам не выкажаш знаёмаму чалавеку. І неспадзеўкі дынамік захрыпеў, адразу перакрываючы ўсю вакзальную гаману, адкашляўся і гучна заспяваў барытонам: «Малая зямля, вялікая зямля... Малая зямля, вялікая зямля...» І гэтак хвіліну-

другую. Іншых слоў не было чуваць, пэўна, заела магнітафон ці прайгравальнік. Калі людзі спярша пачціва слухалі, дык потым пачалі смяяцца. Нарэшце ў дынаміку шчоўкнула, змоўк барытон, і ўсе пачулі лаянку з мацюкамі, акрэсленымі выразным каўказскім акцэнтам: відаць, нейкі начальнік выгаворваў таму, хто адказваў за музыку. Цяпер ужо людзі ледзь не клаліся ад смеху. Здалося, хваля рогату пакацілася на перон і, набыўшы яшчэ большую сілу, панеслася па вуліцы. Толькі не смяяўся Лаўрэн, не мог забыць казарму, вячэру ў сталоўцы...

Але вось тэхніку наладзілі, і праз паўзу зноў паляцела з дынаміка: «Малая зямля, вялікая зямля...»

— Ачысціць памяшканне, ачысціць памяшканне! — у вакзал увайшлі чалавек з пяць міліцыянтаў у белым і пачалі вытуpваць людзей з залы. Навошта гэта яны рабілі, Лаўрэн зразумеў, калі ўбачыў, што сюды нясуць некалькі патрэтаў. Іх, напэўна, збіраліся прымацоўваць да сцяны, а мо і на столь, а людзі замінаді.

На шчасце, аб'явілі пасадку на маскоўскі цягнік. І Лаўрэн разам з іншымі пасажырамі пабег на платформу. Калі ўвайшоў у вагон, з дынамікаў грымела: «Малая зямля, вялікая зямля...» І Лаўрэн засмяяўся. Ён ехаў дамоў назаўсёды.

## НАШ АДАМ

Раніца.

Тэлефонны званок. Доўгі, зацяты.

— Алё, алё...

— Адам Восіпавіч, заўтра на юбілей да таварыша Івановіча. Так, так, Івана Ільіча,— у трубцы голас рэдактара.

— Зайсці да вас? Іду ўжо... Іду.

Ідзе па калідоры Адам Восіпавіч, і ўсе з ім радасна вітаюцца. О, які ён цікавы чалавек! «Наш Адам!» — называюць яго ў рэдакцыі. Можна абысці ўвесь Мінск, але такога чалавека, як ён, і блізка не знойдзеце. Адама Восіпавіча і цяпер у любым раёне нашай Беларусі помняць і ведаюць. Ведаюць і помняць...

Ён ужо даўно сівы і лысы, ходзіць цяжкавата, падцягваючы правую нагу. Гэта яму недзе пад Варшаваю

ў сорак чацвёртым секанула асколкам ля ступні. І можна не сумнявацца, што Адам Восіпавіч па законе мае трэцюю групу інваліднасці. Ён калі ўжо кульгае на правую нагу, дык колькі будзе жыць, так і будзе. Не тое што Леанід Сымонавіч, які інвалідам Вялікай Айчыннай стаў праз трыццаць пяць гадоў пасля вайны. І кульгае то на правую нагу, то на левую, калі раптам забудзе, дзе ў яго раненне. Але, зрэшты, хай і яму добра будзе. Праўда, Адам Восіпавіч моцна злаваў на Леаніда Сымонавіча, а пад чаркаю нават лаяўся на яго мацюкамі. Тады Леанід Сымонавіч, зусім не кульгаючы, уцякаў ад Забарэвіча. Што было, тое і было. Леанід Сымонавіч, адскочыўшы метраў за дваццаць, крычаў, каб не было чуваць у кабінетах:

— П'яніца, прахвост!..

Усё гэта адбывалася ў далёкія ўжо часы застою, альбо, як людзі кажуць, запою. І Адам Восіпавіч нічым не адрозніваўся ў сваіх паводзінах ад некаторых іншых людзей. Ён жыў так, як амаль усе мы...

Адам Восіпавіч — фотакарэспандэнт адной невялічкай газеты рэспубліканскага маштабу. Некалі гэтая газета была большай, але паступова змізэрнела, хоць былая слава яшчэ грэла трохі. У многіх чытачоў яна была знітавана з імем Адама Восіпавіча, здымкі якога друкаваліся на кожнай старонцы.

Аднойчы рэдактар хацеў абвясціць Забарэвічу вымову, але не знайшоў слоў, як сфармуляваць яе. На Адама Восіпавіча цішком, па-сяброўску, каб не дай бог не ўведалі дзе наверсе, паскардзіўся першы сакратар Ляскоўскага райкома партыі. Тыдзень перад тым фатограф рабіў здымкі ў гэтым раёне. У адным калгасе яго пачаставалі ад душы. І ён сабраўся ўжо ад'язджаць у Мінск. Але як ехаць, не развітаўшыся з гаспадаром. Адам Восіпавіч на добрым падпітку зайшоў да першага сакратара і разыграў такую сцэнку.

На вачах здзіўленага гаспадара шаноўнага кабінета наліў паўнюткую шклянку гарэлкі.

— Пі!

— Ды што вы, Адам Восіпавіч, як можна! Я на працы. Праз гадзіну бюро...

— Пі! — настойвае Забарэвіч.— Пі!

Што рабіць? Раптам хто зойдзе і ўбачыць, як сакратара райкома частуюць гарэлкай. Лепш, мусіць, выпіць. Ён бярэ шклянку і глытае пякучку. Забарэвіч налівае

зноў і, калі сакратар дапівае апошнія кроплі, смяецца. Дробненькім, непрыемным смехам.

— Хі-хі-хі... Цяпер нікому не скажаш, што я быў на падпітку. Бо сам піў гарэлку,— рагоча і пальцам яшчэ паказвае на сакратара. Але ж той быў знаёмы з рэдактарам і неяк між іншым расказаў пра гэты выпадак. Ну і што, з Адама Восіпавіча як з гуся вада: сёння вымову абвясцілі, а заўтра — знялі. Усё — у руках чалавечых. Нават рэдактар не хацеў канфліктаваць з Адамам Восіпавічам. Яго ж ведалі не толькі ў калгасах і саўгасах, але і ў найвялікшым доме ў Мінску. На найважнейшых нарадах і на партыйных з'ездах прэзідыум фатаграфаў толькі Адам Восіпавіч. І не было яшчэ такога, каб у аддзеле прапаганды не зацвердзілі для друку ягоны здымак кіраўнікоў партыі і ўрада рэспублікі.

Часам у камандзіроўцы Адам Восіпавіч, седзячы за юшкаю з якім-небудзь старшынёй калгаса альбо сакратаром райкома, распавядаў пра свае поспехі ў фатаграфіі. Уся публіка, вядома, пільна слухала, і нават баяліся есці, каб не збіць яго з тропу. Любімай гісторыяй у Адама Восіпавіча было тое, як ён браў удзел у міжнародным фотаконкурсе.

— Я за сваю фатаграфію прыгажуні Марылі,— казаў ён, жуючы курыную нагу альбо кавалак шашлыка,— атрымаў на выстаўцы ў Ландоне пяцьдзесят тысяч стэрлінгаў,— вытрымаўшы паўзу, дадаваў: — І ў Гаване таксама пяцьдзесят стэрлінгаў,— ужо забываючы пра тысячы. Ён так шчыра хлусіў, што некаторыя, магчыма, і верылі. Хоць ёсць фунты стэрлінгаў, а не проста стэрлінгі. І як было не верыць, калі Адам Восіпавіч паказваў пасведчанне заслужанага дзеяча культуры.

І вось у жыцці фатографа Забарэвіча адбылася падзея, якая яшчэ больш узвысіла яго аўтарытэт у вачах многіх людзей. Той-сёй з калег зайздросціў Адаму Восіпавічу і мо кусаў сябе за локаць, што не мог быць там, дзе быў Адам Восіпавіч. А быў ён у таварыша Памялушы. Так, так, у Васіля Макаравіча. У якога кабінет у найвышэйшым доме на чацвёртым паверсе. Дарэчы, ад аднаго імя Памялушы халодныя дрыжыкі беглі па скуры амаль ва ўсіх старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў. І не толькі ў іх адных...

Неяк прыгожым вясёлым ранкам пазванілі з пры-

ёмнай таварыша Памялушы рэдактару і загадалі, каб фатограф Адам Восіпавіч праз паўгадзіны з усім сваім начыннем быў на чацвёртым паверсе найвышэйшага дома. Праз колькі хвілін Адам Восіпавіч быў гатовы. Начынне ў яго заўсёды было пад рукой. Сеў у рэдактарскую машыну і праз пяць хвілін стаяў на парозе найвышэйшага дома.

— Значыць, так,— казаў памочнік, ведучы з сабою Адама Восіпавіча,— будзеце стаяць тут... і фатаграфаваць моманты віншавання Васіля Макаравіча з днём нараджэння. Ясна? Выбірайце самі зручнае месца. Я пакуль пайшоў...

Застаўшыся адзін, Адам Восіпавіч агледзеўся ў вялікім прасторным кабінеце. Праз высокія і шырокія вокны ярка свяціла сонца. Аднак, каб было болей святла, ён яшчэ ўключыў і дзве агромністыя, кожная на дзесятак лямпачак, крыштальныя люстры.

Адам Восіпавіч туды-сюды пахадзіў па кабінеце і нарэшце выбраў сабе месца ля рабочага стала. Хоць разумеў, што давядзецца яго і мяняць. Усё залежыць, як гаспадар будзе прымаць гасцей.

Роўна а дзесятай гадзіне ўвайшоў у свой кабінет Васіль Макаравіч Памялуша.

— Як, гатовы да працы? — весела спытаўся Памялуша ў Забарэвіча і працягваў гаворку далей.— Ведаеце, я хацеў бы, каб з усіх здымкаў, што сёння будуць, вы зрабілі мне альбом. Я — удзячны! — падміргнуў ён Адаму Восіпавічу. Яны як роўныя паціснулі адзін аднаму рукі, і кожны заняўся сваёй справаю.

У кабінет зазірнуў памочнік і, бліснуўшы вачыма на Адама Восіпавіча, спытаўся ў гаспадара:

— Пачынаем?

— Але ж,— адказаў Васіль Макаравіч, і на твары ўзнік той халодны выраз, якога баяліся старшыні калгасаў і іншыя людзі, якім даводзілася сутыкацца з Памялушам.

У Адама Восіпавіча на шыі ўжо віселі і «Кодак» і «Нікан», імпартныя і дагэтуль надзейныя апараты. Ён толькі, як кажуць, папрасіў бога, каб і сёння яны былі надзейнымі.

Асцярожна адчыняюцца дзверы, і — на парозе міністр сельскай гаспадаркі са сваім першым намеснікам.

Не паспелі гэтыя госці выйсці, як з падарункамі

ў кабінет — міністр нарыхтовак таксама з намеснікам. І ў кожнага па падарунку. Адзін з падарункаў — куртаты алень. Толькі з ім ужо — міністр, а намеснік — з доўгай і шырознай, як руля гарматы, крыштальнай вазай, на якой партрэт юбіляра. Працэдура амаль паўтараецца, Адам Восіпавіч націскае на затворы сваіх апаратаў, толькі зрэдзь мяняючы месца.

Недзе праз гадзіну Забарэвіч адчуў, як пацяжэлі ногі і рукі стаміліся. Мацней пачаў ён накульгваць на правую нагу, перабягаючы па кабінеце з кута ў кут. А госці да юбіляра ішлі і ішлі. Даўжэзны стол для пасяджэнняў ледзь стаяў пад цяжарам падарункаў, з якіх найбольш было куртатых аленяў. Мусіць, найлепшы падарунак быў ад таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Іхні старшыня адстаўны генерал, але ў параднай форме, прамаршыраваў ад дзвярэй да Памялушы. «Бач, які яшчэ жвавы»,— падумаў Адам Восіпавіч. Падабраўшы жывот, генерал выцягнуўся, як у маладыя гады, і бадзёра, камандзірскім голасам вымавіў:

— Здароўя юбіляру! Гадоў да ста расці вам без старасці! Паляўнічыя і рыбаловы рэспублікі сардэчна і шчыра віншуюць вас з днём нараджэння! Дазвольце ўручыць наш сціплы паляўнічы падарунак і залічыць вас у свае ганаровыя члены.

Памялуша на плячы трымаў стрэльбу, а ў руцэ — рэмень-патранташ з кінжалам. Ён нібы сышоў з якойсьці класічнай карціны.

— Ну, як паляўнічы? — ганарліва ўскінуўшы галаву з трохі разбэрсанай чупрынаю, спытаўся Памялуша ў Адама Восіпавіча.— Ці паспелі зрабіць гістарычны здымак?

— Канечне ж...

— Малайцом, малайцом! Радзіма вас не забудзе.

Паляўнічыя выйшлі з кабінета. Яны засталіся ўдвух. Настрой у Памялушы быў святочны, і яму хацелася пагаманіць. Дый Адам Восіпавіч — не супраць, стаміўся, бегаючы па кабінеце. Параненая нага заныла, але ён, высільваючыся, стаяў з ліслівым тварам, як і тыя, хто толькі што віншаваў юбіляра. Нічога, ён згодзен месяц бегаць вакол Памялушы, зазіраючы ў вочы. Нічога, горш не стане. Затое, ён амаль упэўнены: дачка, якая жыве з мужам і двума дзецьмі ў аднапакаёўцы, атрымае кватэру. Памялуша яму не адмовіць у просьбе. Хоча мець альбом з фотакарткамі, калі

ласка. Адам Восіпавіч ноч ці дзве не будзе спаць, каб толькі дагадзіць Памялушу.

Прыйшлі павіншаваць юбіляра і рэдактар са сваім намеснікам. Прынеслі крыштальную вазу з кветкамі і гадавую падшыўку газеты ў тоўстых кардонных вокладках. «Няўжо ён будзе гэта чытаць?..» — пасміхаўся ў думках Адам Восіпавіч, але ж рэдактара не спытаеш. Хоць гэткае пытанне ён прачытаў і на твары Памялушы, які, праўда, трохі праяснеў, калі рэдактар сказаў, што газета друкуецца пад наймудрэйшым кіраўніцтвам таварыша Памялушы. Тады юбіляр узяў падшыўку і паклаў яе зверху ўсіх падарункаў. Узняўшы палец угору, шматзначна прамовіў: «Сувязь тэорыі з практыкай!» Пасля чаго абняў рэдактара, а намесніка, прывабную саракагадовую жанчыну з пульхнымі яркімі вуснамі, нават пацалаваў...

Адам Восіпавіч моцна стаміўся, але вяртаўся дахаты шчаслівы не менш за Памялушу. Ён быў упэўнены, што той ужо не адмовіць з кватэраю. І пра кватэру Адам Восіпавіч скажа, калі будзе аддаваць альбом, які зробіць за гэтыя два дні. Нічога, ён вытрымае дзеля вялікай мэты. Затое якая радасць наперадзе ў дачкі. Ён нават уявіў радасныя твары дачкі і ўнукаў.

Праз тры ночы і два дні, як мінуў юбілей, альбом быў гатовы. Адам Восіпавіч у сваёй лабараторыі снедаў, абедаў і начаваў. Альбом быў вельмі прыгожы, і, галоўнае, на ўсіх фотакартках у цэнтры — Памялуша. Адразу было відаць, што ён не абы-якая асоба, а асоба з найвышэйшага дома.

Калі Адам Восіпавіч прывёз альбом, памочнік Памялушы ўжо чакаў. Папярэдзіўшы, што шэф у кепскім настроі, адразу правёў фатографа ў кабінет. Так і было, Памялуша некаму злосна выгаворваў па тэлефоне і ажно рукой паляпваў па стале. А памочнік як увёў Адама Восіпавіча ў кабінет, адразу знік за дзвярыма, пакінуўшы яго сам-насам з гаспадаром.

— Што ў вас? — нібы не пазнаючы, спытаў Памялуша.

— Альбом вось...— сціпла вымавіў Адам Восіпавіч.

— Альбом? — неяк адразу ажывіўся Памялуша.— Пакажыце.

Забыўшы аб параненай назе, Адам Восіпавіч у два крокі апынуўся ля стала і паклаў альбом. Памялуша гартануў яго раз-другі, потым хмыкнуў, пачаў уважна

разглядаць здымкі. Зрэдзь уздымаў галаву, пазіраў на Адама Восіпавіча, які не вытрымаў і сам, без дазволу сеў у крэсла. Ацэньваў работу Памялуша не менш гадзіны і ўрэшце прамовіў:

— Няблага, няблага... Хоць, канечне, магло быць і лепш. Але няблага, няблага... Мне даўно вас рэкамендавалі як кваліфікаванага фатографа. Дзякую! — не ўстаючы з крэсла, ён працягнуў руку Адаму Восіпавічу, які з радасцю паціснуў яе. Потым Памялуша выйшаў з кабінета і вярнуўся праз якую хвіліну з немалым пакункам у чорнай блішчастай паперы.

— Гэта ад мяне,— сказаў і ўзняў перасцерагальна руку,— Зразумела?..

— Быў рады...— прамармытаў Адам Восіпавіч, але ў яго хапіла смеласці, каб вымавіць.— У мяне просьба вялікая, Васіль Макаравіч...

— Што такое? — на твары ў Памялушы адразу незадаволенасць.

— З кватэрай у дачкі праблема,— і Адам Восіпавіч усё выказаў, што хацеў.

Памялуша паслухаў, памаўчаў. Пасля некуды пазваніў.

— Віншую, Іван Ільіч, з надыходзячым юбілеем. Фатограф трэба? Няма праблемы. Запішы прозвішча. Ага, што мяне фатаграфаваў. Адам Восіпавіч Забарэвіч. Ага, будзе наш Адам. Дык ён да цябе зойдзе. Дарэчы, зрабі яму двухпакаёўку... Для дачкі. Ну, усё...

Паклаўшы трубку, Памялуша строга паглядзеў на Адама Восіпавіча. Аднак той ужо яго не баяўся.

— Размову чулі?

— Чуў.

— Вось і ідзіце да гэтага чалавека. Праз тры дні і ў яго юбілей. Таксама зрабіце яму альбом...

Ужо ў лабараторыі Адам Восіпавіч разгарнуў пакунак, які атрымаў ад Памялушы. Там былі дзве пляшкі «Белавежскай», бляшанка чорнай ікры, палка кілбасы «Паляўнічай», і між імі ляжала візітная картка, з аднаго боку якой буйнымі літарамі было напісана «З павагаю В. Памялуша». О, гэта даражэй за гарэлку і ікру! Адам Восіпавіч, асцярожна ўзяў картку двума пальцамі і паклаў яе ў партбілет, які насіў з левага боку ва ўнутранай кішэні каптана.

Назаўтра ўся рэдакцыя ведала, што фатограф мае візітную картку асабіста ад Памялушы. Вітаючыся,

рэдактар першы працягваў ужо руку і запрашаў да сябе на чай.

У камандзіроўках на бяседах цяпер Адам Восіпавіч не распавядаў аб удзелах у конкурсах на лепшы фотаздымак, а моўчкі, з таямнічым выглядам паказваў візітную картку Памялушы. Уражанне заўсёды было незвычайнае: у субяседнікаў, здавалася, аднімала мову. Адам Восіпавіч успамінаў аб сустрэчах з Памялушам, дадаючы між іншым, што яны кожную пятніцу разам мыюцца ў лазні.

З Памялушавай візіткай фатограф стаў найдаражэйшым госцем у кожным раёне, куды б ні прыязджаў у камандзіроўку. Канечне, гасцяваць ён гасцяваў, але і справу ніколі не забываў. У рэдакцыі не маглі паскардзіцца, што ён не зрабіў здымкаў альбо яны не якасныя.

І вось неяк ранняй вясной, калі ў небе ўжо спявалі жаўрукі, Адам Восіпавіч сабраўся ў камандзіроўку. У лабараторыі, як звычайна, гаманіла радыё, бо яго фатограф ніколі не выключаў. Часам нават дзеля канспірацыі: каб не было чуваць галасоў. Сяды-тады да яго заходзілі знаёмыя выпіць бутэльку-другую віна. І раптам Адам Восіпавіч пачуў, што адбыўся пленум, на якім вызвалілі ад пасады таварыша Памялушу. У канцы паведамлення дыктар абвясціў, што замест яго выбралі таварыша Івановіча Івана Ільіча...

Ад такой навіны ў Адама Восіпавіча нават знікла жаданне ехаць у камандзіроўку. Ён разгублена прысеў ля стала, чамусьці дастаў з кішэні візітную картку Памялушы, чытаў, што на ёй напісана, і ў нейкае імгненне падумаў разарваць гэты невялічкі кавалак паперы. Аднак ён не зрабіў гэтага. Адчыніўшы свой стары груваcткі сейф, Адам Восіпавіч кінуў візітку на дно, дзе ляжалі розныя паперы, якія даўно былі непатрэбныя.

Зусім механічна Адам Восіпавіч узяў з сейфа цёмнасінюю папку, развязаў яе. У ёй таксама былі паперы. Зверху ляжаў вялікі блакітны канверт з крывулістым надпісам: «Тав. Забарэвічу!!!» Адам Восіпавіч паціху расклеіў яго і зарагатаў. Ён рагатаў да слёз, да знямогі. Нарэшце, супакоіўшыся, зноў узяў у рукі канверт. У ім ляжала візітная картка, з аднаго боку якой крывулістымі літарамі было накрэслена: «Дарагому нашаму Адаму. З павагаю Іван Ільіч Івановіч».

# ЗМЕСТ

*Аповесць*

Банальны дэтэктыў — 3

*Раман*

З плоці і крыві — 53

*Апавяданні*

Фаварыт Карл — 300
Набат — 308
Дамоў — 321
Наш Адам — 328

*Литературно-художественное издание*

*Супрунчук Виктор Петрович*

**ИЗ ПЛОТИ И КРОВИ**

*Повесть, роман, рассказы*

Минск,
издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

*Супрунчук Віктар Пятровіч*

**З ПЛОЦІ І КРЫВІ**

*Аповесць, раман, апавяданні*

Рэдактар *І. І. Кананові*ч. Мастак *А. М. Грышкевіч.*
Мастацкі рэдактар *А. І. Цароў.* Тэхнічны рэдактар *І. І. Дуброўская.*
Карэктар *Л. А. Дзядзюля.*

ІБ № 3485

Здадзена ў набор 22.08.90. Падп. да друку 28.10.91. Фармат 84×108 1/32. Гарнітура школьная. Высокі друк з ФПФ. Ум. друк. арк. 17,64. Ум. фарб.-адб. 17,64. Ул.-выд. арк. 18,58. Тыраж 25 500 экз. Зак. 653.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.